ЗБОР ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ НАРОДАЎ СССР
ЗБОР ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

АКАДЕМИЯ НАУК СССР
МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ СССР
ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ СССР ПО ДЕЛАМ ИЗДАТЕЛЬСТВ, ПОЛИГРАФИИ И КНИЖНОЙ ТОРГОВЛИ

СВОД ПАМЯТНИКОВ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ НАРОДОВ СССР

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЗБОР ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

С. В. МАРЦЭЛЕЎ (галоўны рэдактар), М. В. БІРЫЛА, В. І. БОРЫС, В. Б. КАРАТКЕВІЧ, І. Ф. КУДРАЎЦАЎ, Л. Г. ЛАПЦЭВІЧ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, Л. Д. ПОБАЛЬ, Т. І. ЧАРНЯЎСКАЯ, К. І. ШАБУНЯ, І. П. ШАМЯКІН, М. М. ЯНІЦКАЯ.

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1984

ББК 63.3 (2Б)
З — 41

З-41 **Збор помнікаў** гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць /АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш.— Мн.: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1984.— 368 с., іл.

У пер.: 8 р. 00 к.

З $\frac{0505040000-006}{М\ 318(05)-84}$ 6—83 ББК 63.3 (2Б)

ПРАДМОВА

Помнікі гісторыі і культуры — своеасаблівы летапіс жыцця народа, яскравыя сведкі яго працоўнай, рэвалюцыйнай і баявой славы. У лепшых творах архітэктуры, скульптуры, манументальна-дэкаратыўнага жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўвасоблены важнейшыя гістарычныя падзеі. У іх адлюстраваны гістарычны лёс народа, развіццё яго матэрыяльнай і духоўнай культуры, барацьба працоўных за светлую будучыню.

Савецкі народ з надзвычайнай увагай ставіцца да спадчыны, якую пакінулі нам папярэднія пакаленні. Без вывучэння і дэталёвага высвятлення сутнасці спадчыны мінулага немагчыма ўявіць гісторыю чалавечага грамадства, а тым больш вытлумачыць шляхі яго развіцця. Помнікі памагаюць выявіць заканамернасці грамадскага развіцця, яго рухаючыя сілы, даюць магчымасць глыбей асэнсаваць сучаснае, вызначыць шляхі ў будучыню.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад бачаць у помніках гісторыі і культуры важны сродак ідэалагічнага і мастацкага выхавання працоўных. Яшчэ ў першыя гады Савецкай улады быў прыняты шэраг заканадаўчых актаў Савета Народных Камісараў, падпісаных У. І. Леніным, а таксама адозваў і заклікаў цэнтральных і мясцовых органаў Савецкай улады аб захаванні і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры.

5.10.1918 г. У. І. Ленін падпісаў дэкрэт Саўнаркома РСФСР «Аб рэгістрацыі, узяцці на ўлік і ахове помнікаў мастацтва і старадаўнасці, якімі валодаюць прыватныя асобы, таварыствы і ўстановы». Гэты дэкрэт паклаў пачатак дзяржаўнаму ўліку і сістэматычнаму вывучэнню помнікаў, азнаямленню шырокіх мас насельніцтва з мастацка-гістарычнымі скарбніцамі. У 1918—19 гг. па ініцыятыве У. І. Леніна распрацавана сістэма мерапрыемстваў па збудаванню помнікаў выдатным дзеячам рэвалюцыйнага руху, навукі, літаратуры і мастацтва, па мастацкаму афармленню гарадоў. Гэтыя мерапрыемствы ўвайшлі ў гісторыю як ленінскі план манументальнай прапаганды, які меў на мэце зрабіць мастацтва даступным і карысным народу.

Ленінскія палажэнні аб ахове помнікаў гісторыі і культуры развіты ў заканадаўчых актах Савецкага ўрада і саюзных рэспублік, у т. л. і БССР. 30.1.1919 г. Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад БССР прыняў пастанову «Аб перадачы культурных каштоўнасцей навукі і мастацтва, якія знаходзяцца ў маёнтках і розных установах, Камісарыяту асветы і аб арганізацыі іх уліку, аховы і збірання». 24.12.1923 г. ўрад БССР прыняў пастанову «Аб рэгістрацыі, узяцці на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, старадаўнасці, быту і мясцовасцей прыроды, што знаходзяцца ў валоданні ўстаноў і таварыстваў, а таксама прыватных асоб». Пытаннямі аховы культурных каштоўнасцей непасрэдна займаўся Наркамат асветы БССР (пададдзел аховы помнікаў аддзела мастацтва, Навукова-тэрміналагічная камісія Наркамата асветы БССР). Выяўленнем, улікам і вывучэннем помнікаў архітэктуры, мастацтва і археалогіі займаўся таксама Інстытут беларускай культуры, дзе ў 1925 г. была створана спецыяльная камісія па ахове помнікаў старадаўнасці, мастацтва і прыроды.

Яшчэ больш увагі ахове і выкарыстанню помнікаў аддаецца ў пасляваенныя гады. 14.4.1945 г. СНК БССР прыняў пастанову «Аб ахове і аднаўленні гістарычных і архітэктурных помнікаў і ўвекавечанні знамянальных месц і падзей, якія звязаны з вызваленнем Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Пасля прыняцця гэтай пастановы, а таксама закона БССР ад 3.7.1945 г. «Аб азнаменаванні перамогі і ўшанаванні памяці воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза» ў рэспубліцы пастаўлена шмат помнікаў баявой славы, асабліва ў 1970—80-я гады. Створаны мемарыяльныя комплексы Брэсцкая крэпасць-герой, Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі (на 18-м км шашы Мінск — Масква), Хатынь, на плошчы Перамогі ў Віцебску, «Прорыў» ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., Ману-

 мент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў Жодзіне і многія інш.

Паводле прынятага 26.12.1969 г. Вярхоўным Саветам БССР закона «Аб ахове помнікаў культуры», «усе размешчаныя на тэрыторыі Беларускай ССР помнікі культуры, якія маюць гістарычную, навуковую або мастацкую каштоўнасць і з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю, уласнасцю калгасаў, іншых кааператыўных арганізацый, іх аб'яднанняў, уласнасцю грамадскіх арганізацый або асабістай уласнасцю грамадзян, знаходзяцца на ўліку і ахоўваюцца дзяржавай. Клопаты па захаванню помнікаў культуры з'яўляюцца ганаровым, патрыятычным абавязкам усіх грамадзян». У 1978 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў новы закон «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры». Палажэнне аб ахове помнікаў замацавана і ў новай Канстытуцыі БССР: «Захаванне гістарычных помнікаў і іншых культурных каштоўнасцей — доўг і абавязак грамадзян Беларускай ССР» (арт. 66). Неабходнасць паляпшэння аховы і прапаганды помнікаў гісторыі, культуры і прыроды адзначыў XXVI з'езд КПСС у прынятых ім «Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—85 гады і на перыяд да 1990 года». На паляпшэнне аховы помнікаў накіравана і пастанова Савета Міністраў БССР «Аб мерах па паляпшэнню аховы, рэстаўрацыі і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры ў Беларускай ССР», прынятая ў жніўні 1980 г.

Ахова помнікаў з 1967 г. ўскладзена на Міністэрства культуры БССР, а таксама на выканкомы мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Актыўны ўдзел у ахове помнікаў прымае грамадскасць. Паводле пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19.6.1965 г. арганізавана Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое садзейнічае ажыццяўленню мерапрыемстваў партыі і ўрада па ахове помнікаў і выкарыстанню іх у камуністычным выхаванні працоўных. Яно аб'ядноўвае больш за 1,5 мільёна чалавек.

Гісторыя вельмі жорстка абышлася на помніках Беларусі. Тэрыторыя Беларусі неаднаразова была арэнай ваенных, палітычных і рэлігійных сутыкненняў, у выніку чаго стваральнай дзейнасці чалавека, у т. л. помнікам, нанесліся велізарныя страты. Суровы гістарычны шлях Беларусі адзначаны вялікай колькасцю помнікаў, якія ўвекавечваюць многія значныя падзеі з жыцця не толькі беларускага, але і суседніх народаў.

З мэтай выяўлення, сістэматызацыі і вывучэння помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, іх шырокай папулярызацыі Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР надрыхтаваў «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Артыкулы пра помнікі археалогіі зроблены Аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР. У падрыхтоўцы да выдання «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» — дапаўненні і ўдакладненні звестак пра помнікі і навуковым рэдагаванні матэрыялаў прымалі ўдзел супрацоўнікі выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі — частка Збору помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР. Яго выданне — канкрэтнае ажыццяўленне палажэнняў Канстытуцыі СССР і Канстытуцыі БССР аб ахове гістарычных помнікаў і іншых культурных каштоўнасцей, закона СССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» і адпаведнага закона Беларускай ССР. «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» — афіцыйны дакумент, які ўключае помнікі, што ўзяты або павінны быць узяты пад дзяржаўную ахову.

У «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ўключаны толькі нерухомыя помнікі, у іх ліку:

помнікі археалогіі — рэшткі старажытных паселенняў, стаянкі, гарадзішчы, селішчы і гарады, старажытныя помнікі вытворча-працоўнай дзейнасці чалавека, могільнікі, надмагільныя і рытуальныя збудаванні;

помнікі гісторыі — помнікі вытворчай (працоўнай) дзейнасці людзей розных гістарычных фармацый, памятныя месцы і помнікі, звязаныя з дзяржаўным будаўніцтвам, з адлюстраваннем класавай барацьбы і барацьбы за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, за незалежнасць, з абаронай сацыялістычнай Айчыны, развіццём культуры, навукі, мастацтва;

помнікі архітэктуры — горадабудаўнічае мастацтва, жыллёвая, грамадзянская і культавая архітэктура, помнікі ваенна-абарончага дойлідства, прамысловай архітэктуры, інжынернага і садова-паркавага мастацтва, архітэктурныя манументы;

помнікі манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва — манументальная скульптура, манументальны жывапіс, творы дэкаратыўнага мастацтва.

У выданне ўключаны ўсе ўцалелыя помнікі архітэктуры з часоў старажытнасці да сярэдзіны 19 ст., найбольш характэрныя для 2-й палавіны 19 — пачатку 20 ст., а таксама помнікі архітэктуры савецкага даваеннага перыяду (1917—41 гг.) і лепшыя архітэктурныя збудаванні пасляваеннага часу (1950—80-я гг.), якія адлюстроўваюць дасягненні савецкай архітэктуры ў прамысловым, жыллёвым, грамадскім і сучасным сельскім будаўніцтве. У выданне не ўключаны помнікі гісторыі і культуры, якія не захаваліся, яны толькі разглядаюцца пры агульнай характарыстыцы развіцця культуры вобласці, горада ці асобнага архітэктурнага комплексу.

Кожнаму помніку прысвечаны артыкул з характарыстыкай яго гістарычных і мастацкіх каштоўнасцей. Многія артыкулы суправаджаюцца фотаздымкамі, чарцяжамі, схемамі, картамі. Кожны

том мае паказальнікі — храналагічны, імянны, геаграфічны, а таксама пералік абласных і раённых бібліятэк, музеяў і архіваў з кароткім апісаннем фондаў. Кожнай вобласці рэспублікі і сталіцы г. Мінску прысвячаецца асобны том.

Сістэматызацыя помнікаў у кожным томе праведзена паводле тэрытарыяльнага прынцыпу — матэрыял размяшчаецца па раёнах (у алфавітным парадку іх назвы). Як самастойная тэрытарыяльная адзінка вылучаецца абласны горад, звесткі пра які змяшчаюцца ў пачатку тома. Унутры раёнаў першымі разглядаюцца матэрыялы пра адміністрацыйныя цэнтры, а потым — матэрыялы па алфавіце населеных пунктаў. Артыкулы пра помнікі аднаго населенага пункта падаюцца ў алфавітным парадку назваў помнікаў.

Многія помнікі, асабліва архітэктуры, манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, раней не былі ўлічаны і не даследаваліся. Таму пры падрыхтоўцы выдання неабходна было пачынаць з іх выяўлення, абмераў, фатаграфавання, складання навуковых пашпартоў і г. д. Аўтарскі калектыў правёў усебаковае комплекснае даследаванне ўсіх выяўленых помнікаў. Вывучаліся таксама матэрыялы, якія захоўваюцца ў архівах, бібліятэках і музеях рэспублікі, а таксама Масквы, Ленінграда, Вільнюса, Львова, Падольска, у бібліятэках і архівах ПНР.

Матэрыялы гэтага выдання з'явяцца базай для шырокай папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, распаўсюджвання ведаў аб выдатных падзеях у жыцці і дзейнасці нашага народа.

Рэдакцыйная калегія спадзяецца, што выхад у свет гэтай працы будзе мець важнае значэнне ў развіцці беларускай савецкай культуры, гістарычных і мастацтвазнаўчых навук, адыграе важную ролю ў патрыятычным выхаванні народа, паляпшэнні аховы і прапаганды помнікаў гісторыі і культуры.

* *
*

Помнікі гісторыі і культуры Брэсцкай вобл., якім прысвечаны гэты том, сваім зместам адлюстроўваюць аб'ектыўны ход гісторыі, паступальнае развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры ў гэтым рэгіёне. З'яўляючыся грамадскім асэнсаваннем жыцця, сродкам эмацыянальнай і ідэйнай яго ацэнкі, яны ўвасобілі думкі і пачуцці, пакуты і падзеі народа, яго працавітасць, патрыятызм і дасягненні мастацтва і архітэктуры.

Вялікае месца ў томе займаюць помнікі, якія адлюстроўваюць самаадданую барацьбу працоўнага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, супраць іншаземных захопнікаў на нашу Айчыну. Асаблівае месца сярод іх займаюць помнікі, што ўвекавечваюць падзеі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, гераізм і мужнасць савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, раскрываюць грандыёзную карціну бітваў Савецкай Арміі супраць гітлераўскіх войск, усенароднай барацьбы супраць акупантаў.

Калектыў, які працаваў над матэрыяламі гэтага тома, выказвае глыбокую падзяку партыйным і савецкім органам Брэсцкай вобл., актывістам Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, а таксама прадстаўнікам навуковай грамадскасці рэспублікі за актыўную дапамогу ў падрыхтоўцы да выдання тома.

УКАЗАМ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР АД 17 ЛІПЕНЯ 1967 г. ЗА АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ПАРТЫЗАНСКІМ РУХУ, МУЖНАСЦЬ І СТОЙКАСЦЬ, ПРАЯЎЛЕНЫЯ ПРАЦОЎНЫМІ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў БАРАЦЬБЕ З НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, І ЗА ПОСПЕХІ, ДАСЯГНУТЫЯ Ў АДНАЎЛЕННІ І РАЗВІЦЦІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ, БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ССР УЗНАГАРОДЖАНА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА.

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Раёны

БАРАНАВІЦКІ
БРЭСЦКІ
БЯРОЗАЎСКІ
ГАНЦАВІЦКІ
ДРАГІЧЫНСКІ
ЖАБІНКАЎСКІ
ІВАНАЎСКІ
ІВАЦЭВІЦКІ
КАМЯНЕЦКІ
КОБРЫНСКІ
ЛУНІНЕЦКІ
ЛЯХАВІЦКІ
МАЛАРЫЦКІ
ПІНСКІ
ПРУЖАНСКІ
СТОЛІНСКІ


НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ
ад 100 000 да 500 000
ад 50 000 да 100 000
ад 10 000 да 50 000
менш за 10 000
БРЭСТ
ПІНСК
СТОЛІН
Лагішын
Лінова
ГРАНІЦЫ
ШЛЯХІ ЗНОСІН
Бязрэйкавыя дарогі
БРЭСТ
ПІНСК
БАРАНАВІЧЫ
КОБРЫН
ЛУНІНЕЦ
ПРУЖАНЫ
БЯРОЗА
ІВАЦЭВІЧЫ
ЛЯХАВІЧЫ
ГАНЦАВІЧЫ
ДРАГІЧЫН
ІВАНАВА
ЖАБІНКА
КАМЯНЕЦ
МАЛАРЫТА
СТОЛІН
ДАВЫД-ГАРАДОК
КОСАВА
БЕЛААЗЕРСК
СЛОНІМ
СЛУЦК
СТОЎБЦЫ
НЯСВІЖ
КЛЕЦК
САЛІГОРСК
КАМЕНЬ-КАШЫРСКІ
ДУБРОВІЦА
ВАЛЫНСКАЯ ВОБЛ.
РОВЕНСКАЯ ВОБЛ.
МІНСКАЯ ВОБЛ.
ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛ.
ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛ.
П О Л Ь Ш Ч А
У К Р А І Н С К А Я   С С Р
24°
25°
26°
27°
52°
53°
МАШТАБ
15
0
15
30
45 км

УВОДЗІНЫ

Брэсцкая вобласць размешчана на паўднёвым захадзе Беларускай ССР паміж рэкамі Заходні Буг і Случ, каля дзяржаўнай граніцы СССР з ПНР. Утворана 4.12.1939 г. У сучасных граніцах з студзеня 1954 г., калі да яе былі далучаны ўсе раёны Пінскай і 4 раёны Баранавіцкай абласцей. Плошча 32,3 тыс. км². Насельніцтва 1 млн. 391 тыс. чалавек (на 1.1.1983 г.). Цэнтр вобласці г. Брэст. Уключае 16 раёнаў: Баранавіцкі, Брэсцкі, Бярозаўскі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Жабінкаўскі, Іванаўскі, Івацэвіцкі, Камянецкі, Кобрынскі, Лунінецкі, Ляхавіцкі, Маларыцкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі; 20 гарадоў, 7 гарадскіх і 2 рабочыя пасёлкі.

На значнай тэрыторыі паверхня нізінная — на паўднёвым захадзе Брэсцкае Палессе, на ўсходзе Прыпяцкае Палессе, паміж якімі раўніна Пінскае Загароддзе і Дняпроўска-Бугскі водападзел. На захадзе вобласці Прыбугская, на поўначы — Баранавіцкая раўніна і частка Навагрудскага ўзвышша. Галоўная водная артэрыя — р. Прыпяць са шматлікімі прытокамі: Піна, Ясельда, Бобрык, Цна, Лань, Случ (злева), Стыр, Гарынь, Сцвіга (справа) і іншымі. На поўначы цячэ прыток Нёмана Шчара, на захадзе — Буг з прытокамі Мухавец і Лясная. На паўночным захадзе вобласці раскінулася Белавежская пушча — адзін з найстаражытных лясных запаведнікаў Еўропы.

Багацце археалагічных помнікаў на Брэстчыне дае магчымасць вывучыць гістарычнае мінулае тэрыторыі з часоў з'яўлення тут чалавека. Самыя старажытныя археалагічныя помнікі Брэстчыны — стаянкі першабытнага чалавека эпохі верхняга палеаліту. У сувязі з адступаннем апошняга ледавіка і змякчэннем клімату ў 10—9-м тысячагоддзях да н. э. пачалося засяленне поймаў рэк плямёнамі свідэрскай культуры, якія рухаліся на поўнач па далінах Заходняга Буга, Гарыні, Стыры (Бабровічы Івацэвіцкага р-на, Опаль Іванаўскага р-на).

У эпоху мезаліту (9—5-е тысячагоддзі да н. э.) тэрыторыя вобласці была заселена амаль поўнасцю. З помнікаў гэтага часу, выяўленых на поймавых выдмах і надпоймавых тэрасах, найбольш вядомыя Дабрынёва (Івацэвіцкі р-н), Зарэчча (Бярозаўскі р-н), Опаль. Макралітычныя (масіўныя) крамянёвыя прылады працы (грубаабітыя трапецападобныя і авальныя сякеры, трохгранныя пікі, скрэблы, разцы, цёслы і скоблі) маюць агульныя рысы з прыладамі, знойдзенымі на паселішчах паўночнай Валыні, у басейнах рэк Вісла і Нёман. Насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам, на невялікіх паселішчах будавала жыллё ў выглядзе буданоў з агнішчамі ў сярэдзіне, карысталася лукам і стрэламі. Развіваўся родаплемянны лад, умацоўвалася мацярынская родавая абшчына, фарміраваліся плямёны.

У эпоху неаліту (5-е — канец 3-га тысячагоддзя да н. э.) колькасць паселішчаў значна павялічылася. Як і мезалітычныя, яны размяшчаліся пераважна на пясчаных узгорках забалочаных рачных поймаў і прыазёрных выдмах, асобныя — на першай надпоймавай тэрасе і нават на ўчастках высокай поймы. Большая частка тэрыторыі вобласці была заселена плямёнамі нёманскай культуры (4—3-е тысячагоддзі да н. э.): Добры Бор (Баранавіцкі р-н), Спорава (Бярозаўскі р-н), Бакінічы, Церабень (Пінскі р-н), Дабрынёва, Любішчыцы (Івацэвіцкі р-н), больш за 20 стаянак у ваколіцах вёсак Пагост-Загародскі і Камень (Пінскі р-н). Насельніцтва карысталася пераважна вастрадонным ляпным посудам, упрыгожаным арнаментам з наколак, насечак, пракрэсленых рысак, грабеньчатых адбіткаў, трохвугольнымі наканечнікамі стрэл, каменнымі сякерамі з шліфаваным лязом, серпападобнымі нажамі, разнастайнымі скрабкамі і іншымі прыладамі. Шмат рэчаў, асабліва для апрацоўкі дрэва, рабілі з рогу і косці. Прылады працы звычайна выраблялся на тэрыторыі паселішчаў, пра што сведчыць выяўленая археолагамі майстэрня на паселішчы каля в. Опаль. Асновай гаспадаркі неалітычных плямён засталася паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва, аднак пачалі зараджацца прымітыўнае земляробства і жывёлагадоўля.

На мяжы 3-га і 2-га тысячагоддзяў да н. э. пачаўся бронзавы век. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі абумовіла захаванне на тэрыторыі Беларусі каменных прылад працы, але яны былі лепш апрацаваныя. У раннім бронзавым веку тэрыторыю Брэстчыны насялялі плямёны палескай групы культуры шнуравой керамікі (канец 3 — сярэдзіна 2-га тысячагоддзя да н. э.). Іх асноўныя помнікі — Здзітава (Бярозаўскі р-н), Востраў (Пінскі р-н), Велямічы (Столінскі р-н),

Камень, Церабонь і інш. Насельніцтва карысталася крамянёвымі чатырохграннымі сякерамі, сярпамі, кінжаламі з трохвугольным лязом і інш., вырабляла посуд з акрэсленай шыйкай, званападобныя і шарападобныя гаршкі, упрыгожаныя кароткімі і дугападобнымі адбіткамі шнура. Паселішчы размяшчаліся на пясчаных узвышшах па берагах рэк і азёр. У сярэднім бронзавым веку на Палессі жылі плямёны тшцінецкай культуры (15—11 ст. да н. э.). На Брэстчыне вядома больш за 30 помнікаў гэтай культуры, у т. л. Прылукі (Брэсцкі р-н), Бяроза і Горбаў (Бярозаўскі р-н), Востраў. Плямёны выраблялі крамянёвыя сярпы, скрабкі, шліфаваныя і свідраваныя сякеры, матыкі, апрацаваныя з абодвух бакоў тронкавыя і трохвугольныя наканечнікі стрэл і дроцікаў, пазней — бронзавыя кінжалы, шылы, бранзалеты з завіткамі на канцах, шпількі з спіральнай галоўкай, пярсцёнкі. Посуд — высокія цюльпанападобныя гаршкі з вузкім дном, упрыгожаныя ў верхняй частцы жалабковым арнаментам. Пахавальны абрад — трупапалажэнне і трупаспаленне на курганных і бескурганных могільніках. Пашырэнне земляробства і жывёлагадоўлі, паяўленне металічных рэчаў садзейнічалі развіццю абмену. Зараджалася маёмасная няроўнасць. Асноўную ролю ў гаспадарчым і грамадскім жыцці роду і племя паступова пачалі адыгрываць мужчыны — склаўся патрыярхальна-родавы лад.

У 7—6 ст. да н. э. на тэрыторыі Беларусі пачаўся жалезны век, які характарызаваўся пашырэннем металургіі жалеза і вырабам з яго рэчаў. Жалеза здабывалася з балотных жалезных руд сырадутным плаўкай у невялікіх гліняных печах-домніцах. Зробленыя з яго прылады працы і зброя былі значна мацнейшыя за каменныя і бронзавыя, што адыграла вялікую ролю ў развіцці прадукцыйных сіл. Ствараліся ўмовы для атрымання прыбавачнага прадукту і накаплення матэрыяльных каштоўнасцей, у выніку чаго паглыбіўся распад першабытнаабшчынных адносін. Неабходнасць процістаяць ворагам паскорыла фарміраванне племянных саюзаў. З мэтай абароны замест адкрытых паселішчаў будаваліся ўмацаваныя гарадзішчы.

У 7—3 ст. да н. э. большую частку тэрыторыі вобласці насялялі плямёны мілаградскай культуры. Яны жылі ў паўзямлянках і жытлах слупавой канструкцыі на паселішчах і гарадзішчах. Пры раскопках помнікаў знойдзены жалезныя нажы, наканечнікі коп'яў, сярпы, сякеры, шылы, шпількі, бронзавыя ўпрыгожанні (бранзалеты, трапецападобныя і трохвугольныя падвескі, скроневыя кольцы), гліняныя арнаментаваныя грузікі, лепны кругладонны гладкасценны посуд. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на курганных (Дубой, Бор Дубнецкі Столінскага р-на) і трупаспаленне на бескурганных могільніках.

У 4—2 ст. да н. э. з захаду на паўд. захад Брэстчыны перасяліліся плямёны паморскай (усходне-паморскай) культуры. Для іх характэрны неўмацаваныя паселішчы з наземнымі жытламі і каменнымі агнішчамі ўсярэдзіне (Агароднікі, Хмялі Камянецкага р-на). Насельніцтва вырабляла жалезныя нажы, сякеры кельты, іголкі, долаты, бронзавыя сярпы, каменныя зерняцёркі, карысталася лепным посудам, металічнымі і шклянымі ўпрыгожаннямі. Пахавальны абрад — трупаспаленне на бескурганных могільніках (Дружба Брэсцкага р-на, Трасцяніца, Ратайчыцы Камянецкага р-на, каля ст. Драгічын, т. Пінска і інш.). Вядомы 4 віды пахаванняў: абкладзеныя камянямі, падклёшавыя (урна накрыта вялікім гаршком — «клёшам»), урнавыя і ямныя.

У 2 ст. да н. э.—4 ст. н. э. амаль усю тэрыторыю вобласці насялялі плямёны зарубінецкай культуры. Яны займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, рамёствамі, выраблялі жалезныя прылады працы (сякеры-кельты, сярпы, нажы) і зброю (наканечнікі коп'яў, стрэл, дроцікі), упрыгожанні (развастаныя фібулы, бранзалеты, падвескі, пярсцёнкі, шпількі, шкляныя пацеркі), грубалепны і глянцаваны посуд, гліняныя прасліцы, каменныя зерняцёркі. Насельніцтва будавала наземныя слупавыя і паўзямлянкавыя жытлы на неўмацаваных паселішчах, побач з якімі звычайна былі бескурганныя могільнікі з пахавальным абрадам трупаспалення (Атвержычы, Велямічы, Рубель Столінскага р-на), трапляюцца могільнікі з пахавальным абрадам трупапалажэння, пахаванні урнавыя і ямныя. Зарубінецкія плямёны мелі сувязі з Паўночным Прычарнамор'ем.

У 2-й палавіне 2 ст. — канцы 4 ст. н. э. на захадзе Палесся пашырыліся помнікі тыпу брэсцкага бескурганнага могільніка з пахавальным абрадам трупаспалення (Вялічкавічы Камянецкага р-на, Дружба Брэсцкага р-на і інш.); пахаванні ямныя і урнавыя. Пры раскопках знойдзены біканічныя гаршкі, міскі, кубкі, гліняныя прасліцы, касцяныя грабяні, металічныя спражкі, шкляныя і бурштынавыя пацеркі, бронзавыя фібулы і інш. Мяркуюць, што помнікі належалі да вальбарскай групы палёў пахаванняў.

З сярэдзіны 6 ст. тэрыторыю на поўдзень ад Ясельды і Прыпяці насялялі славянскія плямёны пражскай культуры (або культуры тыпу Карчак). Яны займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, рамёствамі, выраблялі жалезныя нажы, сярпы, сашнікі, наканечнікі стрэл, коп'яў, упрыгожанні. Посуд лепны, без арнаменту, са слаба акрэсленымі плечыкамі і з невысокім адагнутым венчыкам. Насельніцтва жыло на паселішчах і круглых у плане гарадзішчах, умацаваных валамі і равамі, якія ў час небяспекі служылі сховішчамі, будавала невялікія паўзямлянкі і зямлянкі прамавугольнай формы з глінабітнымі печамі ўсярэдзіне (Хатомель Столінскага р-на). Могільнікі бескурганныя з пахавальным абрадам трупаспалення (Хорск, Хатомель Столінскага р-на).

У 8—10 ст. асноўным насельніцтвам тэрыторыі Брэстчыны былі дрыгавічы. Яны ўпершыню ўпамінаюцца ў «Аповесці мінулых часоў», дзе сказана: «...а друзии седоша межи Припетью и Двиною и нарекошася дреговичи...». Археалагічныя помнікі дрыгавічоў — курганныя могільнікі з пахавальным абрадам трупаспалення (Ясянец Ганцавіцкага р-на) і трупапалажэння (Агарэвічы, Дзянісавічы, Малыя Круговічы Ганцавіцкага р-на). На падставе пісьмовых і археалагічных звестак можна сцвярджаць, што дрыгавічы ў сацыяльна-палітычных адносінах належалі да найбольш развітых груп усходніх славян і яшчэ да ўключэння ў Кіеўскую Русь мелі сваё «княжанне».

На паўднёвым захадзе вобласці жылі валыняне. Іх могільнікі — земляныя насыпы, у якіх выяўлены драўляныя дамавіны (Ратайчыцы Камянецкага р-на).

Невялікую тэрыторыю на поўнач ад Брэста займала балцкае племя яцвягаў. Іх курганы складзены з камянёў або абкладзены вялізнымі валунамі; пахавальны абрад трупапалажэнне (Войская, Ратайчыцы, Трасцяніца, Гуркі, Свішчова Камянецкага р-на). У пачатку 2-га тысячагоддзя яцвягі ў значнай ступені асіміляваны славянамі.

Пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму ў плямён, якія засялілі тэрыторыю Беларусі, адбываўся ў 6—9 ст. Пачала развівацца папарная сістэма земляробства, хатнія рамёствы паступова ўтварылі асобную галіну рамеснай вытворчасці — апрацоўку жалеза, каляровых металаў; наладжваліся знешнія сувязі. Узнікненне адасобленай гаспадаркі малой сям'і і развіццё прыватнай уласнасці прывялі да стварэння тэрытарыяльнай сельскай абшчыны, у аснове якой ляжалі эканамічныя сувязі. У 9—10 стагоддзях у межах Старажытнарускай дзяржавы пачалося зліццё родасных усходне-славянскіх плямён у адзіную старажытнарускую народнасць, што абумоўлівалася адноснымі эканамічнымі сувязямі, этнічнай, тэрытарыяльнай, культурнай і моўнай супольнасцю. Гэтаму спрыяла прыняцце хрысціянства ў 988—989 г.

У канцы 1-га тысячагоддзя тэрыторыя Брэсцкай вобл. ўвайшла ў Кіеўскую Русь, да сярэдзіны 12 ст. была ў складзе Тураўскага княства, з якога пазней вылучыліся Пінскае, Давыд-Гарадоцкае і інш. княствы. З 2-й палавіны 12 ст. Берасцейская зямля і суседнія тэрыторыі ў складзе Уладзіміра-Валынскага княства. На працягу 11—13 стагоддзяў тут сутыкаліся інтарэсы кіеўскіх, тураўскіх, пінскіх, галіцка-валынскіх князёў з інтарэсамі польскіх феадалаў, якія спрабавалі захапіць Берасцейшчыну.

Аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі садзейнічала ўзнікненню і хуткаму развіццю гарадоў. Старажытнарускія летапісы называюць гарады Брэст (Берестье, 1019 г.), Пінск (Пинеск, 1097 г.), Здітаў (1252 г.), Камянец (1276 г.), Кобрын (1287 г.). Яны былі цэнтрамі гандлю і рамяства. Паводле археалагічных даследаванняў, у Брэсце і Пінску ў 11—13 стагоддзях былі развіты кавальскае, ганчарнае, ювелірнае, гарбарнае, шавецкае і іншыя рамёствы. Гараджане займаліся таксама сельскай гаспадаркай, паляваннем, рыбалоўствам і бортніцтвам. Гарады былі асяродкам высокаразвітай на той час культуры, пра што сведчаць помнікі пісьменнасці і мастацтва, якія да нас дайшлі. У Пінску знойдзены фрагмент глінянай амфары з надпісам «(я)рополче вино», на Берасцейскім гарадзішчы — самшытавы грэбень з выразаным на ім з 2 бакоў алфавітам (ад А да Л). Гэта своеасаблівы самы старажытны на тэрыторыі Беларусі «буквар». Можна меркаваць, што ў Пінску вялося летапісанне. На той час прыпадае дзейнасць старажытнарускага пісьменніка і царкоўнага дзеяча Кірылы Тураўскага (каля 1130 г.— каля 1182 г.). «Словы» і прытчы яго сведчаць пра высокую культуру красамоўніцкага мастацтва ў Старажытнай Русі.

Рэшткі язычніцтва яшчэ доўга захоўваліся ў духоўным жыцці старажытных славян, пра што сведчаць каменны ідал, знойдзены ў в. Астрамечава (Брэсцкі р-н), і 2 каменныя бабы, выяўленыя каля вёсак Грабаўцы і Залуззе (Жабінкаўскі р-н).

У канцы 13—1-й палавіне 14 ст. Берасцейская зямля ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. Пастаянная пагроза агрэсіі з боку Тэўтонскага ордэна і сацыяльна-палітычнае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім і Польшчы прывялі да заключэння ў 1385 г. паміж апошнімі саюза Крэўскай уніі. У Грунвальдскай бітве 15.7.1410 г. аб'яднаныя войскі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага разграмілі крыжакоў, гэтым спынілі іх агрэсію на ўсход. У бітве прымалі ўдзел харугвы (палкі) з Брэста і Пінска.

Тэрыторыя Брэстчыны з 1413 г. знаходзілася ў складзе Трокскага ваяводства. Асобныя княствы (Пінскае, Кобрынскае, Давыд-Гарадоцкае) да 15 ст. захоўвалі аўтаномію. У 1520 г. заходняя частка Брэстчыны ўвайшла ў Падляшскае, а паўночна-ўсходняя — у Навагрудскае ваяводствы. У 1566 г. створана Берасцейскае ваяводства. У Брэсце перасякаліся гандлёвыя шляхі, што звязвалі беларускія землі з Украінай, Польшчай і паўднёвай Прыбалтыкай. У 14—16 стагоддзях гарады Брэст і Пінск сталі важнымі адміністрацыйна-эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі. Развіваючы гандаль і рамяство, гарады Брэстчыны імкнуліся да незалежнай ад феадалаў сістэмы кіравання і суда. У канцы 14 ст. першым з беларускіх гарадоў атрымала кіраванне на аснове магдэбургскага права Бярэсце (1390 г.), пазней — Камянец (да 1492 г.), Пінск (1581 г.), Пружаны, Кобрын, Гарадзец (усе ў 1589 г.), Дзівін (1642 г.), Лагішын (1643 г.), Мальча (1645 г.) і інш. Некаторыя вёскі сталі мястэчкамі. У ліку значных сярэдневяковых пасяленняў Брэстчыны па пісьмовых крыніцах вядомы Шарашова (з 1380 г.), Драгічын (з 1452 г.),

Гербы гарадоў паводле прывілеяў на магдэбургскае права і пячатак на дакументах 16—18 ст. (злева направа) Пінска, Брэста, Камянца.

Бяроза (з 1477 г.), Пружаны (Дабучын, з 1487 г.), Лушнец (з 1540 г.), Лагішын (з 1552 г.), Малара (з 1566 г.) і інш. Вядучую ролю ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў адыгрывалі феадальна-купецкія вярхі, вышэйшае духавенства. Сярод гараджан пераважалі рамеснікі, гандляры, дробныя і сярэднія купцы, землярobы, значную праслойку складалі неМаемныя вольныя гараджане. У гарадах жылі і феадальна-залежныя людзі, якіх феадалы перасялялі на ўласныя землі ў гарадскіх межах (т. зв. юрыдыкі).

У 14—16 стагоддзях фарміравалася беларуская народнасць. Беларуская мова была афіцыйнай у Вялікім княстве Літоўскім. На ёй пісаліся летапісы і хронікі, свецкія і царкоўныя творы, статуты, граматы, сеймавыя пастановы, вялося справаводства і судаводства.

На працягу 16 — пачатку 17 ст. на захадзе Беларусі, у т. л. на Брэстчыне, праводзілася аграрная рэформа, т. зв. валочная памера. Рэформа пачалася ў 1530 — 40-я гады і асабліва пашырылася пасля замацавання яе ў законе 1557 г.— «Уставе на валокі». Вынікам рэформы было пашырэнне фальварковых панскіх гаспадарак, павышэнне іх даходнасці з адначасовым узмацненнем феадальнага прыгнёту сялян. Іх зямельныя надзелы скараціліся, сяляне прымацоўваліся да зямлі, павялічвалася паншчына.

Паводле Люблінскай уніі (1569 г.) Вялікае княства Літоўскае і Польшча аб'ядналіся ў федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Беларускія землі засталіся ў складзе Вялікага княства Літоўскага, якое захавала свае вышэйшыя органы ўлады, фінансы, войска, заканадаўства. Аднак з гэтага часу на беларускіх землях актывізаваў свае пазіцыі каталіцызм. На Брэстчыне з'явілася шмат каталіцкіх ордэнаў, якія будавалі свае касцёлы, кляштары, засноўвалі школы і пры іх дапамозе намагаліся акаталічыць мясцовае насельніцтва. На царкоўным саборы ў Брэсце 6.10.1596 г. заключана Брэсцкая унія, паводле якой праваслаўная і каталіцкая цэрквы былі аб'яднаны на ўмовах падпарадкавання праваслаўнай царквы папе рымскаму і прызнанні асноўных догматаў каталіцызму, але пры захаванні праваслаўнай абраднасці. Кіруючыя колы Польшчы і каталіцкая царква з дапамогай уніі імкнуліся дамагчыся паланізацыі беларускага і ўкраінскага народаў, разрыву іх гістарычных сувязей з рускім народам, умацавання пазіцый каталіцызму на Беларусі і Украіне, аслаблення антыфеадальнага руху народных мас. Ахвярай нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту сталі шырокія слаі насельніцтва. Гвалтоўнае насаджэнне уніі ўзмацніла імкненне народных мас Беларусі да ўз'яднання з рускім народам. Узмацненне феадальнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту абвастрыла класавыя супярэчнасці. У канцы 16 — 1-й палавіне 17 ст. барацьба сялян, гарадской беднаты супраць магнатаў і шляхты, прымусовага акаталічвання ахапіла ўсю тэрыторыю Беларусі. Вялікую ролю ў гэтай барацьбе адыгрывалі брацтвы, якія ўзнікалі пры праваслаўных манастырах і цэрквах. Яны засноўвалі брацкія школы (у Брэсце, Пінску і інш.), друкарні, імкнуліся захаваць беларускую мову і культуру, умацоўвалі сувязі з Рускай дзяржавай. У брэсцкай брацкай школе ў 1592—95 гг. працаваў выкладчыкам беларускі гуманіст-асветнік Лаўрэнцій Зізаній (Тустаноўскі). Яго брат Стэфан Зізаній (Тустаноўскі) — пісьменнік-палеміст і царкоўны прапаведнік — быў аўтарам і выдаўцом кніг, выступаў з пропаведзямі супраць каталіцкай царквы, езуітаў, уніі, караля. Асноўная рыса яго вучэння, якое мела рэлігійна-містычную форму,— цесная сувязь з нацыянальна-вызваленчай барацьбой народных мас Беларусі і Літвы.

Барацьба супраць феадальнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту з боку шляхецкай Польшчы, за ўз'яднанне з Расіяй перарасла ў вызваленчую вайну ўкраінскага і беларускага народаў у 1648—54 гг. У маі 1648 г. на тэрыторыю Беларусі прыбылі казацкія атрады, пасланыя Б. Хмяльніцкім. Гэта паслужыла штуршком да ўздыму вызваленчай барацьбы беларускага народа. Жорсткія баі ішлі і на тэрыторыі Брэстчыны. Летам 1648 г. сялянскія паўстанні ахапілі Пінскі і Кобрынскі паветы. Шляхта сабрала сваё апалчэнне, якое стала лагерам каля Брэста. У верасні 1648 г., пакараўшы западозраных у падрыхтоўцы паўстання ў Брэсце, шляхецкія харугвы накіраваліся да Кобрына, каб задушыць паўстанне ў павеце, а потым намагчы феадалам Піншчыны. У гэты ж час Б. Хмяльніцкі накіраваў новыя казацкія атрады да Брэста, Пінска, Мазыра. Казацка-сялянскія атрады нанеслі паражэнне шляхецкім войскам каля Брэста, знішчылі буйны атрад на чале з брэсцкім кашталянам К. Тышкевічам, акружылі Кобрын і разграмілі кавалерыйскую харугву стольніка В. Корвін-Гансеўскага, захапілі многа трафеяў. У кастрычніку паўсталі гараджане Пінска. Разам з казакамі пад кіраўніцтвам А. Нябабы жыхары Пінска і сяляне з наваколля перабілі шляхту і каталіцкае духавенства, грамілі іх дамы, касцёлы, кляштары, знішчалі даўгавыя запіскі і кабальныя абавязацельствы. На задушэнне паўстання гетман польны Я. Радзівіл накіраваў войскі з шляхты і

наёмнікаў на чале са стражнікам Мірскім. Атрады Мірскага занялі Хомск, у канцы кастрычніка авалодалі Пінск. Неаднаразова ў 1648 г. і 1649 г. ваўставалі жыхары Брэста. Паўстанні ў Пінску і Брэсце былі задушаны, іх удзельнікі жорстка пакараны. Баі паміж войскамі Я. Радзівіла і паўстанцамі ў Брэсцкім ваяводстве працягваліся ўвосень і снежні 1648 г. У выніку ваенных дзеянняў былі моцна разбураны Брэст, Пінск, Кобрын і іншыя населеныя пункты Брэстчыны. Ваенныя дзеянні адбываліся на тэрыторыі вобласці і ў час руска-польскай вайны 1654—67 гг., што прычыніла вялікія страты гаспадарцы краю. У Паўночную вайну 1700—21 гг. шведскія войскі разрабавалі і спустошылі ў 1706 г. Брэст, Бярозу, Пінск, многія мястэчкі і вёскі. Усё гэта прывяло да эканамічнага і культурнага заняпаду краю. Толькі ў 2-й палавіне 17 ст. пачалося яго эканамічнае адраджэнне. У 1770-я гады А. Тызенгаўз заснаваў у Брэсце суконную, а ў 1776 г. ва ўрочышчы Рудня каля Маларыты — жалезаробчую мануфактуры. Развіццю прамысловасці і гандлю садзейнічала будаўніцтва дарог і водных шляхоў. У гэты час праз палескія балоты пракладзены 2 тракты — Пінска-Слонімскі і Пінска-Валынскі, пабудаваны Агінскі канал, што злучыў басейны Нёмана і Дняпра (праз Шчару і Ясельду), і ў 1775—1884 гг. Днепроўска-Бугскі канал.

Развівалася культура беларускага народа. Вялікую ролю ў фарміраванні яе адыграў рост гарадоў. У 16—17 ст. у асяроддзі гараджан узнікла апазіцыя пануючай феадальнай ідэалогіі, паявіліся гуманістычныя плыні. Прадстаўнікі передавой грамадскай думкі выступалі супраць царкоўных аўтарытэтаў, традыцый, догмаў, крытыкавалі феадальна-прыгонніцкую сістэму, дзяржаўны лад. Вырас інтарэс да чалавека, лесу радзімы, да культуры. У Брэсце, Пінску і іншых гарадах існавалі бібліятэкі і цэнтры рукапіснага майстэрства. У сярэдзіне 16 ст. ў Брэсце створана друкарня — адна з першых на Беларусі. У 1558 г. ў Брэсце выдадзены першы ва Усходняй Еўропе спеўнік з нотамі — «Канцыянал», у 1563 г.— брэсцкая «Біблія».

Развіваліся літаратура, мастацтва, дойлідства. У канцы 16 — пачатку 17 ст. напісаны «Дзённік» Ф. Еўлашоўскага (ураджэнец Ляхавіч) — твор свецкай мемуарнай літаратуры, які адлюстраваў жыццё і побыт прадстаўнікоў розных саслоўяў і перш-наперш дробнай шляхты. Значны след у жанры палемічнай літаратуры пакінула творчасць Л. Карповіча (ураджэнец Пінскага павета), які выступаў супраць Брэсцкай царкоўнай уніі. Прадстаўнік дэмакратычнага крыла ў палемічнай літаратуры А. Філіповіч змагаўся супраць уніі і каталіцызму, быў прыхільнікам уз'яднання Беларусі з Расіяй. З Брэстчынай звязана жыццё і творчасць выдатнага беларускага мысліцеля атэіста К. Лышчынскага. У 1680-я гады ён напісаў трактат «Аб неіснаванні бога». За адмаўленне існавання бога каталіцкая царква пакарала Лышчынскага смерцю. Асветнік, публіцыст і палітычны дзеяч 2-й палавіны 18 ст. М. Карповіч (ураджэнец Камянца) адзін з першых на Беларусі выступіў з крытыкай прыгонніцтва, невуцтва і марнатраўства магнатаў

Аблога Брэста шведамі ў 1657 г. З гравюры 18 ст.

Брэстчына дала такіх класікаў польскай літаратуры эпохі Асветніцтва, як Ю. Нямцэвіч, А. Нарушэвіч. Тут нарадзіліся польскі паэт А. Міцкевіч і палітычны і ваенны дзеяч, кіраўнік нацыянальна вызваленчага паўстання 1794 г. Т. Касцюшка З Брэстчынай звязаны жыццё і творчасць польскага пісьменніка Ф. Карпінскага.

У развіцці беларускай культуры 2-й палавіны 18 ст. значнай з'явай была дзейнасць прыгонных (прыдворных) тэатраў і школьных тэатраў пры духоўных навучальных установах. Такія тэатры дзейнічалі пры двары князёў Сапегаў у Ружанах, пры манастырскіх калегіях у Брэсце і Пінску

Вялікі ўплыў на эканамічнае, сацыяльна палітычнае і культурнае развіццё Беларусі мела уз'яднанне з Расіяй. Яно вызваліла беларускі народ ад прымусовага акаталічвання, стварыла ўмовы для гаспадарчай спецыялізацыі, спрыяла аб'яднанню разрозненых сіл рускага, украінскага, беларускага і іншых народаў Расіі ў барацьбе супраць царызму, памешчыкаў і капіталістаў. Тэрыторыя Брэсцкай вобл. ўз'яднана з Расіяй паводле 2-га (1793 г.) і 3-га (1795 г.) падзелаў Рэчы Паспалітай. Яна ўваходзіла ў склад Мінскай (з 1793 г.), Слонімскай (з 1795 г.), Літоўскай (з 1797 г.), Гродзенскай (з 1801 г.) губерняў

Нашэсце арміі Напалеона на Расію ў 1812 г сустрэла ўпартае супраціўленне на тэрыторыі Брэстчыны. 3-я руская армія пад камандаваннем генерала А. П. Тармасава вяла баі супраць саксонскага корпуса Ж. Рэнье і аўстрыйскага корпуса К. Шварцэнберга. 15 ліпеня каля Кобрына авангард 3-й рускай арміі ў жорсткім баі акружыў і прымусіў капітуляваць 4-тысячны атрад генерала Клінгеля з корпуса Ж. Рэнье. У Кобрынскім баі рускія войскі атрымалі першую значную перамогу ў Айчыннай вайне 1812 г. 25 ліпеня перадавыя часці 3-й рускай арміі нанеслі паражэнне кавалерыйскім часцям напалеонаўскай арміі пад Брэстам 31 ліпеня каля вёсак Паддубна, Гарадзечна і Стрыгава Кобрынскага пав. адбылася Гарадзечанская бітва, у выніку якой рускія войскі паспяхова адбілі атакі карпусоў Ж. Рэнье і Шварцэнберга і адышлі за р. Стыр. Шварцэнберг быў вымушаны адмовіцца ў жніўні — верасні 1812 г. ад актыўных баёў супраць арміі А. П. Тармасава. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Брэстчыны вяліся ў кастрычніку — лістападзе 1812 г. ў час уцёку напалеонаўскай арміі з Расіі.

1-я палавіна 19 ст. ў Расіі характарызавалася распадам феадальна-прыгонніцкага ладу і развіццём капіталістычных адносін. У гэты час Гродзенская губерня, у склад якой уваходзіла і тэрыторыя Брэстчыны, па развіццю прамысловасці была на першым месцы ў Беларусі. У сярэдзіне 19 ст. дзейнічалі некалькі мануфактур у Пінску, суконныя мануфактуры ў Бярозе-Картузскай, Ружанах, Шарашове, Парэччы, Лапаціне Пінскага пав. і інш На суконных прадпрыемствах Пуслоўскага ў Ко-

Дом Верашчакаў у маёнтку Тугановічы (цяпер в. Карчова Баранавіцкага р-на), у якім бываў А. Міцкевіч Гравюра 19 ст

саве і Хомску ўпершыню на Беларусі пастаўлены паравыя машыны.

У сельскай гаспадарцы расла таварнасць памешчыцкіх гаспадарак на аснове узмацнення паншчыны, пашырэння панскіх ворных зямель за кошт скарачэння сялянскіх зямель, лугоў і пашы Беззямелле і малазямелле сялян, а таксама частыя неўраджаі ў канцы 18 — 1-й палавіне 19 ст. абумовілі занянад сялянскіх гаспадарак і рэзкае збядненне сялян. Памешчыцкія гаспадаркі не мелі асновы для далейшага развіцця прадукцыйных сіл. Пачаўся крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Апошнія дзесяцігоддзі напярэдадні рэформы 1861 г. характарызаваліся вострай барацьбой сялянскіх мас супраць памешчыкаў. У 1819—20 гг у хваляваннях удзельнічалі некалькі тысяч сялян Брэсцкага, Кобрынскага і Пружанскага паветаў

Замак Пуслоўскага і сядзіба Т Касцюшкі ў в. Косава Івацэвіцкага р-на 19 ст. Малюнак з натуры Н Орды

Летам 1820 г. яны пашырыліся амаль на ўвесь Брэсцкі пав., у сувязі з гэтым улады прыслалі сюды салдат і пад канвоем ганялі прыгонных на паншчыну. Увосень 1846 г. хваляванні ўзмацніліся, асабліва ў Кобрынскім павеце.

У 1830—40-я гады ў грамадскай думцы Беларусі вылучаецца рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак. Адзін з выдатных яго прадстаўнікоў — ураджэнец в. Вяляцічы Пінскага пав. беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, паэт і публіцыст Ф. А. Савіч. Ён быў пераканаварым рэспубліканцам, прыхільнікам узброенага паўстання сялян, галоўнай мэтай якога лічыў знішчэнне паншчыны, сацыяльнае вызваленне народа. За сваю дзейнасць Савіч быў арыштаваны, потым здадзены ў салдаты. Трагічным быў і лёс беларускага сялянскага паэта П. Багрыма, ураджэнца в. Крошын Баранавіцкага р-на. За антыпрыгонніцкія вершы ён быў таксама здадзены на 25 гадоў у салдаты.

На Пружаншчыне жыў польскі пісьменнік, гісторык, мастак, грамадскі дзеяч ліберальнага кірунку Ю. Крашэўскі, які вывучаў жыццё і звычаі жыхароў Палесся і апісаў іх у шэрагу нарысаў. У Людвінове на Палессі з 1858 г. да 1864 г. жыла польская пісьменніца-дэмакратка Э. Ажэшка. У сваіх творах яна апісала цяжкае жыццё беларускага сялянства, раскрыла лепшыя рысы нацыянальнага характару і духоўнае багацце беларускага народа.

Рэвалюцыйная сітуацыя 1859 — 61 гг. у Расіі дала штуршок да ўзброенага нацыянальна-вызваленчага паўстання на тэрыторыі Польшчы, Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны. Паўстанне 1863—64 гг. па сваёй праграме і рухаючых сілах мела характар буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Асаблівая заслуга ў падрыхтоўцы і ў кіраўніцтве паўстаннем на Беларусі і ў Літве належыць беларускаму рэвалюцыйнаму дэмакрату К. Каліноўскаму, які трымаў курс на аграрную рэвалюцыю, вёў агітацыйную работу сярод сялян. З сярэдзіны 1862 г. К. Каліноўскі разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім выдавалі «Мужыцкую праўду» — першую на беларускай мове нелегальную рэвалюцыйна-дэмакратычную газету, якая распаўсюджвалася амаль па ўсёй Беларусі. Тэрыторыя Брэстчыны была арэнай шматлікіх баёў паміж паўстанцкімі атрадамі і царскімі войскамі. Найбольшыя з іх адбыліся ў Пружанах, пад Мілавідамі (Баранавіцкі р-н), Адрыжынам (Івацэвіцкі р-н), пад Столінам. Тут дзейнічалі мясцовыя і іншыя паўстанцкія атрады. Сярод іх — Брэсцкі атрад Я. В. Ваньковіча, які разам з Кобрынскім атрадам Р. Л. Траўгута арабіў рэйд на Піншчыну і Валынь. Праз Брэстчыну прайшоў рэйдам з Польшчы атрад Р. Рагінскага, які 13.2.1863 г. захапіў Пружаны. Атрады В. А. Урублеўскага доўгі час дзейнічалі ў Белавежскай, Пружанскай і Ружанскай пушчах, адзін з іх — конны атрад К. Кабылінскага — захапіў 2.6.1863 г. Ружаны і раззброіў там салдат. Пры ажыццяўленні рэформы 1861 г. царскі ўрад мусіў пайсці на некаторыя ўступкі ў губернях, ахопленых паўстаннем, каб адцягнуць ад удзелу ў ім шырокія колы сялян.

Адмена прыгоннага права паскорыла развіццё капіталізму. Да канца 19 ст. былі пабудаваны чыгункі, якія звязалі Брэстчыну з цэнтральнымі раёнамі Расіі, Прыбалтыкай, Украінай, Польшчай. Павялічылася колькасць прадпрыемстваў, што працавалі на прывазной сыравіне. На тэрыторыі Брэстчыны развівалася лесапільная, вінакурная, запалкавая, фанерная, тэкстыльная вытворчасць. У Пінску, напрыклад, у 1890-я гады створаны чыгуначныя майстэрні (600 рабочых), запалкавая фабрыка «Прагрэс-Вулкан» (590 рабочых), суднаверф, тытунёвая фабрыка і інш. У 1873 г. на цагельным заводзе ў Брэст-Літоўскай крэпасці адбыліся выступленні рабочых, выкліканыя невыноснымі ўмовамі жыцця і жорсткай эксплуатацыяй, у 1882 г. баставалі сталяры вагонных майстэрняў Брэст-Літоўска. Масавымі стачкамі ў чыгуначных майстэрнях Пінска ў 1893 г. (у 3 стачках удзельнічала 1700 чалавек) кіравалі перадавыя рабочыя, якія выпрацоўвалі патрабаванні і вялі перагаворы з адміністрацыяй. За 1890—95 гг. у Пінску адбылося 10 стачак, за 1894—1900 гг. у Брэсце — 5 стачак. У 1890-я гады пад уплывам Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» па Беларусі ўзніклі сацыял-дэмакратычныя гурткі (у Брэсце — тайнае таварыства рабочых і рамеснікаў), распаўсюджваліся лістоўкі і пракламацыі. Сярод найбуйнейшых стачак пачатку 20 ст. былі: у 1901 г. стачка рабочых фанернай фабрыкі ў Пінску (удзельнічала 300 чалавек), у 1902 г. - рабочых запалкавай фабрыкі ў Пінску (665 чалавек) і рабочых прамысловых прадпрыемстваў у маёнтку Альбрэхтава Пінскага пав., у 1903 г.— у Ружанах і Картуз-Бярозе. У 1904 г. антыўрадавыя выступленні мелі месца ў Пінску і Лунінцы.

Працоўныя Брэстчыны прынялі актыўны ўдзел у Рэвалюцыі 1905—07 гг. У гады рэвалюцыі ў Брэсце і Пінску дзейнічалі арганізацыі РСДРП, а ў Брэсце — і ваенная рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП. Пад кіраўніцтвам бальшавікоў у Брэсце, Пінску, Баранавічах, Лунінцы і ў іншых населеных пунктах адбыліся рэвалюцыйныя выступленні рабочых. Працоўныя актыўна падтрымалі Снежаньскае ўзброенае паўстанне ў Маскве. У многіх вёсках Пінскага, Кобрынскага, Пружанскага і іншых паветаў сяляне захоплівалі панскія землі, сенажаці, самавольна секлі лес. У панскіх маёнтках адбываліся шматлікія забастоўкі батракоў і падзёншчыкаў. Баранавіцкае ўзброенае выступленне рабочых-чыгуначнікаў падтрымалі салдаты мясцовай чыгуначнай брыгады. Двойчы ў 1905 г. і 1906 г. паўставалі салдаты Брэсцкай крэпасці, адбыліся хваляванні салдат у Пінскім гарнізоне.

Пад уплывам рэвалюцыйнай барацьбы працоўных рос і шырыўся нацыянальна-вызваленчы рух рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку. Сярод яго ідэйных выразнікаў былі беларускія пісьменнікі

Я. Купала і Я. Колас. У гарадах, мястэчках і нават у асобных вёсках ствараліся культурна-асветніцкія гурткі, бібліятэкі, клубы, кнігарні. У в. Астрамечава Брэсцкага пав. ў 1905 г. на сродкі прагрэсіўнага рускага кнігавыдаўца Ф. Ф. Паўленкава была адкрыта бясплатная народная бібліятэка адна з першых на Беларусі. У яе стварэнні прымалі ўдзел М. Горкі і Я. Купала.

З наступленнем рэакцыі ў сувязі з масавымі арыштамі ў 1907 г. спынілі дзейнасць Брэсцкая і Пінская арганізацыі РСДРП. Новы ўздым рэвалюцыйнага руху пачаўся з 1910 г.

У 1-ю сусветную вайну на тэрыторыі Брэстчыны ў 1915 г. пачаліся ваенныя дзеянні. Тысячы жыхароў вымушаны былі пакінуць родныя мясціны і эвакуіравацца на ўсход. Да кастрычніка 1915 г. лінія фронту стабілізавалася і праходзіла на ўсход ад Пінска і Баранавіч. У чэрвені 1916 г. каля Баранавіч войскі Заходняга фронту, каб падтрымаць наступленне на Паўднёва-Заходнім фронце, правялі Скробава-Гарадзішчанскую наступальную аперацыю, але беспаспяхова.

* *
*

Мастацкая культура Брэстчыны знайшла сваё яркае адлюстраванне ў самабытных помніках драўлянага і мураванага дойлідства, манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Спецыфіка краю, багатага лясамі, абумовіла фарміраванне і развіццё пераважна драўлянага дойлідства. Дрэва на працягу стагоддзяў было асноўным матэрыялам, з якога будаваліся сялянскія сядзібы, храмы, палацы, абарончыя ўмацаванні. Сярод помнікаў драўлянага дойлідства, якія дайшлі да нашага часу, найбольш пашыраны культавыя пабудовы. У іх яскрава адлюстраваны багаты будаўнічы і творчы вопыт народных майстроў. Будаўнікамі іх былі народныя дойліды, выхадцы з сялян і гарадскіх рамеснікаў, якія з пакалення ў пакаленне перадавалі сваё майстэрства. У аснове фарміравання гарадоў 11—13 стагоддзяў ляжалі прынцыпы старажытнарускага горадабудаўніцтва. Звычайна гарады развіваліся вакол умацаванага дзядзінца, які размяшчаўся часцей за ўсё ў сутоку 2 рэк. Дзядзінец і гандлёвую плошчу горада акружаў гандлёва-рамесніцкі пасад. Буйныя гарады, апрача замкавых умацаванняў, мелі ўмацаваныя пасады (Брэст, Камянец, Пінск і інш.). Абарончаму будаўніцтву было ўласціва спалучэнне мураванай вежы (данжона) і драўляных умацаванняў (Камянец, Брэст). Большасць гарадоў у сярэдзіне вякі набыла радыяльна-веерную ці радыяльна-кальцавую планіроўку (Пінск, Кобрын, Давыд-Гарадок і інш.). Культавыя абудаванні размяшчаліся ў цэнтры гарадоў ці на важнейшых магістралях. Мастацтва гэтага часу развівалася ў рэчышчы старажытнарускай культуры, пра што сведчаць уцалелыя помнікі — выява «Купяціцкай маці боскай»,



Мітынг рабочых і салдат у Лунінцы ў дні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

(1182 г.) на роўнаканцовым металічным крыжы і каменныя абразкі 12 ст., знойдзеныя пры раскопках у Пінску. Першыя мураваныя храмы на тэрыторыі вобласці вядомы з канца 12 ст. (у Пінску). У 2-й палавіне 13 ст. пабудаваны абарончая вежа (данжон) у Камянцы, мураваная вежа і Мікалаеўская царква ў Брэсце. У Кобрыне з канца 15 ст. вядомы мураваны Спаскі манастыр.

У 13—16 стагоддзях у беларускай архітэктуры быў пашыраны стыль готыкі, які меў тут своеасаблівую трактоўку. Ён унёс змены ў тэхніку будаўніцтва мясцовых храмаў: шырока сталі выкарыстоўвацца прагрэсіўныя ў той час рабрыстыя нервюрныя скляпенні. Найважнейшыя рысы готыкі перш за ўсё выявіліся ў своеасаблівай каркаснай канструкцыйнай сістэме, у якой нагрузкі ад перакрыцця перадаваліся з дапамогай нервюр на асобныя вузлавыя часткі сцен, умацаваныя контрфорсамі, і слупы. Гэта дазваляла палегчыць канструкцыю сцен і перакрыцця, значна павялічыць пралёты. Склалася цікавая трактоўка архітэктурнага вобраза гатычнага збудавання. Фасады аздаблялі дэкаратыўнымі нішамі і аркатурай, паглыбленыя плоскасці якіх атынкоўвалі вапнай. Гэта кантраставала з выступамі неатынкаваных сцен, ствараючы двухколерную бела-чырвоную гаму. Нервюр-



Камянецкая вежа ў сучаснай забудове горада.

Сядзіба ў в. Моладава Іванаўскага р-на. 19 ст. Малюнак з натуры Н. Орды.

ныя скляпенні ў інтэр'еры ў 15—16 стагоддзях набылі складаны малюнак, які нагадваў шматканцовую зорку. Своеасаблівасць беларускай готыкі — скульптурнасць форм пабудовы (касцёл у в. Ішкалдзь Баранавіцкага р-на). У 16 ст. на тэрыторыі вобласці паявіліся пабудовы з элементамі рэнесансу ў аздобе інтэр'ераў і фасадаў. У некаторых будынках элементы готыкі спалучаліся з асобнымі элементамі рэнесансу (царква ў в. Шумакі, касцёл у в. Чарнаўчыцы Брэсцкага р-на).

У 15—16 стагоддзях даволі хутка раслі існаваўшыя, узніклі новыя гарады і мястэчкі, многія з іх належалі буйным феадалам (Ружаны, Пружаны) або манастырам (Бяроза). Планіроўка мястэчак і многіх гарадоў была пераважна лінейная, яны развіваліся ўздоўж гандлёвых трактаў. Так, на буйным гандлёвым тракце Брэст—Пінск узніклі Антональ, Іванава, Драгічын. Цэнтральнае месца ў гарадах і мястэчках займала гандлёвая плошча з крамамі. Пашыралася мураванае будаўніцтва, у якім выкарыстоўваліся буйнапамерная цэгла і валуны. Значнае месца займала абарончае і культавае будаўніцтва.

Станаўленне мастацтва беларускага народа ў 13—16 стагоддзях адбывалася пры інтэнсіўным развіцці рамяства, звязанага з ростам гарадоў, пашырэннем эканамічных і культурных сувязей з суседнімі народамі. Буйным мастацкім цэнтрам у 14—16 стагоддзях стаў Пінск. Пісьмовыя крыніцы захавалі імёны беларускіх рамеснікаў: разьбяра Ананія, жывапісца Навошы (Нявона), які, як мяркуюць, у 1-й палавіне 16 ст. прымаў удзел у аздабленні замкавага палаца князя Фёдара Яраславіча ў Пінску. У пачатку 17 ст. ў горадзе існаваў цэх ювеліраў. Вядомым майстрам залатых спраў быў Я. Пархвяновіч. У 1-й палавіне 16 ст. ў Брэсце дзейнічалі цэхі па вырабу мастацкіх тканін, рэчаў для літургіі, аздобленай дэкорам зброі і інш. Сярод майстроў брэсцкага і пінскага цэхаў ювеліраў у 16—17 стагоддзях вядомы залатых спраў майстры С. Радванскі, Пятроўскі, Дамнік, Баркоўскі, М. Гранастайскі, С. Гутроўскі, С. Сапальскі, Я. Дрызнер і інш.

У [illegible] мастацтва Брэстчыны 14—16 стагоддзяў [illegible] старажытнарускага і [illegible] мастацтва. Найбольш поўна прасочваецца сувязь са старажытнарускім і візантыйскім мастацтвам у абразах «Маці боская Замілаванне» з Мікалаеўскай царквы ў Маларыце (14—15 стагоддзі), «Маці боская Іерусалімская» з Варварынскай царквы ў Пінску (16 ст.), «Адзігітрыя» з царквы ў в. Дубенец (Столінскі р-н, 16 ст.). Значную цікавасць мае абраз «Раство Марыі» (канец 16 — пачатак 17 ст.) з в. Ляхаўцы (Маларыцкі р-н), напісаны ў стылі Адраджэння. Высокага ўзроўню развіцця дасягнула скульптура, у якой выявіліся мясцовыя мастацкія рысы і уплыў раманскай і гатычнай пластыкі. Скульптурныя творы выконваліся пераважна з дрэва, радзей з каменю і металу і прызначаліся для афармлення палацаў і культавых збудаванняў (касцёлы, прыдарожныя капліцы, уніяцкія цэрквы). Найбольш раннія ўцалелыя помнікі — драўляныя паліхромныя фігуры святых у Мікітаўскай царкве ў в. Здзітава Жабінкаўскага р-на, выкананыя ў стылі готыкі. Гатычнай скульптурай быў аздоблены інтэр'ер Троіцкага касцёла ў в. Ішкалдзь Баранавіцкага р-на.

Асноўным мастацкім кірункам у архітэктуры 17—18 стагоддзяў на Брэстчыне было барока. Стыль барока найбольш пашырыўся ў мураваным будаўніцтве сядзібных ансамбляў і храмаў. Для сядзібна-паркавых ансамбляў характэрны ў той перыяд восевыя рэгулярныя і пейзажныя кампазіцыі з курдонёрамі, алеямі, баскетамі, лабірынтамі і г. д. (в. Скокі Брэсцкага і в. Дубай Пінскага р-наў). У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі інтэр'ера палацаў шырока выкарыстоўваліся прыёмы вылучэння цэнтральнай парадчай групы залаў і анфіладнай узаемасувязі жылых памяшканняў (палац у Пінску). Храмы перыяду ранняга беларускага барока звычайна былі аднанефавыя, з вежай на галоўным фасадзе. Маляўнічы сілуэт збудаванні спалучаўся са строгімі формамі абарончай архітэктуры. Аздабленню фасадаў уласцівы стрымананасць дэкору і спрошчанасць ордэрных дэталей (Пакроўская і Петрапаўлаўская цэрквы ў в. Бухавічы Кобрынскага р-на і г. п. Ружаны). Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя і сілуэт збудавання паступова ўскладняліся, пластычнае вырашэнне набывала большую выразнасць і рэльефнасць. У гэты перыяд будаваліся і аднанефавыя і трохнефавыя базілікальныя храмы, якія мелі двухвежавы, аднавежавы і бязвежавы галоўныя фасады. Аднавежавае вырашэнне галоўнага фасада характэрна для аднанефавых храмаў (Троіцкі касцёл у в. Лыскава Пружанскага р-на, касцёл Карла Барамея ў Пінску), двухвежавыя фасады — для трохнефавых базілік (касцёл Івана Хрысціцеля ў в. Сталовічы і Троіцкая царква ў в. Вольна Баранавіцкага р-на, францысканскі касцёл у Пінску). Бязвежавыя храмы мелі франтоннае завяршэнне галоўнага фасада (Варварынская і Крыжаўзвіжанская цэрквы

ў Пінску і в. Вітычы Брэсцкага р-на). Не-калькі адыходзіць ад традыцыйнай мясцовай архітэктуры храм у в. Воўчын Камянецкага р-на, які мае цэнтрычную васьміграпную кампазіцыю, вырашаную пад уплывам італьянскага барока.

У 14—18 стагоддзях на тэрыторыі вобласці было пашырана будаўніцтва манастыроў. Вядомы праваслаўныя манастыры: драўляныя Лешчынскі пад Пінскам, у в. Купяцічы Пінскага, в. Дзятлавічы Лунінецкага р-наў, мураваны Спаскі ў Кобрыне і інш. З канца 14 ст. кляштары пачалі будаваць каталіцкія ордэны. Найбольшы размах будаўніцтва кляштараў і калегіумаў набыло ў 17—18 стагоддзях (кляштар картэзіянцаў у г. Бяроза, езуіцкі калегіум у г. Пінск і інш.). На тэрыторыі вобласці ў 18 ст. працавалі такія вядомыя архітэктары, як Я. Бекер, І. Глаўбіц, І. Фантана (г. п. Ружаны Пружанскага, в. Сталовічы Баранавіцкага р-наў).

Масавым тыпам народнага жылля была двухкамерная хата з жылым памяшканнем і сенцамі. Найбольш старажытны тып сялянскага двара — вянковы, у якім жылыя і гаспадарчыя пабудовы ствараць замкнёную кампазіцыю. З 16 ст. ў выніку правядзення валочнай памеры пашырыліся пагонныя двары, дзе ўсе пабудовы былі выцягнуты ў адну лінію. Характэрнымі комплексамі таго часу былі феадальныя сядзібы. Яны ўключалі двор з жылым панскім домам, гумнішча і сад. У дробных сядзібах да пачатку 20 ст. захоўваўся традыцыйны тып трохкамернага жылля (хата+сенцы+камора; хата+сенцы+хата). Багатыя рэзідэнцыі магнатаў і шляхты набылі складаную планіроўку, завяршаліся ламанымі дахамі, часам фланкіраваліся альтанкамі. Галоўныя ўваходы падкрэслівалі слупавыя ганкі. Блізкія выглядам да заможных магнацкіх сядзіб многія драўляныя замкі і палацы. З дрэва ставіліся і буйныя грамадскія будынкі — ратушы і гандлёвыя рады. Яны звычайна складалі адзіны ансамбль. Найбольш характэрнымі тыпамі гандлёвых радоў можна лічыць замкнёныя, што арганізоўвалі прастору гандлёвай плошчы (Давыд-Гарадок), і рады з 2 паралельных карпусоў, якія ўтваралі гандлёвую вуліцу (Пінск).

Драўляныя культавыя помнікі па кампазіцыйных адзнаках можна падзяліць на 3 асноўныя групы: храмы падоўжна-восевай кампазіцыі без вярхоў, ярусныя глыбінна-прасторавай кампазіцыі, крыжовыя. Для першай групы характэрна сувязь з народным жыллёвым будаўніцтвам. На Брэстчыне былі пашыраны аднаўрубныя храмы (Ільінская царква ў в. Бялавічы Івацэвіцкага, Петрапаўлаўская царква ў в. Шарашова Пружанскага і царква Раства Багародзіцы ў в. Рухча 1-я Столінскага р-наў), двухзрубныя з вылучаным алтарным зрубам (царква Раства Багародзіцы ў в. Вавулічы Драгічынскага і Міхайлаўская царква ў в. Рамель Столінскага р-наў) і трохзрубныя з дадаткова вылучаным зрубам бабінца (Мікітаўская царква ў в. Здзітава Жабінкаўскага р-на) збудаванні. У храмах яруснай глыбінна-прасторавай кампазі-

Пінск. Езуіцкі касцёл. 17 ст. (не зберогся)

цыі зрубы завяршаліся чацверыковымі вярхамі, якія ў 18 ст. пад уплывам стылю барока ўскладніліся, сталі васьміграннымі. Найбольш былі пашыраны трохзрубныя храмы з цэнтральным верхам (Георгіеўская царква ў в. Сінкевічы Лунінецкага р-на). Найвышэйшае дасягненне ў развіцці ярусных трохзрубных кампазіцый — пабудовы з 3 вярхамі (Міхайлаўская царква ў в. Рубель Столінскага р-на). Пад уплывам мураваных храмаў стылю



Пінск. Гандлёвыя рады. 19 ст. (не зберагліся)

 барока ў 18 ст. ўзніклі двухзрубныя пабудовы з 2 вежамі на галоўным фасадзе (Георгіеўская царква ў в. Валавель і Троіцкая царква ў в. Бездзеж Драгічынскага р-на, царква Параскевы Пятніцы ў в. Дзівін Кобрынскага і Спаса Праабражэнская царква ў в. Хаціслаў Маларыцкага р-наў), а таксама трохнефавыя базілікі (цэрквы Параскевы Пятніцы і Мікалая ў в. Опаль Іванаўскага і в. Спяшанкі Жабінкаўскага р-наў). Цікавымі помнікамі з'яўляюцца драўляныя званіцы. Прасцейшыя з іх — слупавыя канструкцыі пад двух ці чатырохсхільнымі дахамі (в. Стрыгінь Бярозаўскага і в. Ражкоўка Камянецкага р-наў). Трапляюцца ашаляваныя знадворку каркасныя пабудовы з адкрытай галасніковай часткай (в. Хмелева Жабінкаўскага р-на). У выніку злучэння зрубнай і каркаснай частак узніклі двух'ярусныя зрубна-каркасныя званіцы (в. Сінкевічы Лунінецкага і в. Шарашова Пружанскага р-наў). Своеасаблівыя формы мае трох'ярусная званіца ў в. Чэрск Брэсцкага р-на.

Важная роля ва ўбранстве інтэр'ераў палацаў і храмаў належала скульптуры (статуі, рэльефы), якой аздабляліся алтары, амбоны, дарахавальніцы, спавядальні. Характар скульптуры гэтага часу ў многім вызначаўся архітэктурай. Скульптуры ўключаліся ў ансамбль інтэр'ера або ставіліся ў спецыяльных нішах на фасадах будынкаў. Прыклад гарманічнага спалучэння манументальна-дэкаратыўнай скульптуры з архітэктурай — афармленне інтэр'ера францысканскага касцёла ў Пінску, у якім размешчана каля 100 скульптурных выяў. Багата дэкарыраваны разной драўлянай скульптурай алтары і амбоны Праабражэнскага касцёла ў в. Новая Мыш і Троіцкай царквы ў в. Вольна (усе Баранавіцкага р-на). Сярод помнікаў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва — шмат'ярусныя разныя іканастасы Васкрасенскай і Юр'еўскай цэркваў у в. Альгомель і г. Давыд-Гарадок Столінскага р-на, разныя царскія вароты Спаса-Праабражэнскай царквы ў в. Шумакі Брэсцкага р-на.

Тагачасны манументальны жывапіс падзяляўся на роспіс храмаў, у які ўсё часцей пранікалі свецкія матывы і рэалістычнае светаадчуванне, і манументальна-дэкаратыўны роспіс палацаў, які меў свецкі змест і ў якім антычныя міфалагічныя сюжэты, алегарычныя вобразы спалучаліся з арнаментальнымі кампазіцыямі. Фрэскавыя роспісы выконвалі пераважна майстры жывапіснага цэха г. Брэста. Вядомы імёны жывапісцаў О. Лукшы, які працаваў на Піншчыне, П. Гарэлічава — аўтара роспісаў у Сталовіцкім палацы (Баранавіцкі р-н, 1775 г.), Ю. Міслангевіча і інш. У станковым жывапісе склаўся самабытны стыль, які спалучыў эмацыянальную насычанасць старажытнарускага мастацтва з выяўленчымі прыёмамі мастацтва Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Дэкаратыўнасць жывапісных твораў узмацняюць разныя па ляўкасу арнаментальныя вохрыста-залацістыя і серабрыстыя фоны.

У фарміраванні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва важнае значэнне мела інтэнсіўнае развіццё рамесстваў у гарадах і сядзібах 17—18 стагоддзяў. Вядомы мануфактуры 18 ст.: суконная і палатняная ў г. п. Ружаны, тэкстыльная ў г. п. Камянец, суконная ў г. Брэст, фаянсавая ў г. п. Целяханы, шкларобчая ў в. Новая Мыш (Баранавіцкі р-н), металаапрацоўчая ў в. Рудня (Маларыцкі р-н) і інш. Захаваліся цікавыя ўзоры вырабаў мастацкіх мануфактур і рамеснікаў таго часу — ювелірныя, ткацтва і вышыўкі, у т. л. залатое шыццё. Да нашых дзён дайшлі ўшытыя ў арнаты фрагменты літых слуцкіх паясоў, узоры мастацкай коўкі. Вядомы імёны майстроў: брэсцкага ювеліра А. Якубовіча (1720 г.), чаканшчыка Крэўскага з Ружан (пачатак 18 ст.), разьбяра Войцеха са Сталовіч (1755 г.) і інш.

У 2-й палавіне 18—1-й палавіне 19 ст. на тэрыторыі вобласці ў будаўніцтве мураваных палацавых і сядзібных ансамбляў пашырыўся новы стыль — класіцызм. Сярод помнікаў пераходнага тыпу ад барока да класіцызму — палацы ў Пінску і Ружанах. Рысы класіцызму ярка выявіліся ў сядзібна-паркавых ансамблях (в. Скокі Брэсцкага і в. Паланэчка Баранавіцкага р-наў). Гэтым збудаванням уласцівы выразная планіроўка, трохчасткавае сіметрычнае вырашэнне аб'ёмаў, лаканізм дэкаратыўных сродкаў, выкарыстанне класічных ордэрных кампазіцый. Класіцыстычнае аблічча маюць многія драўляныя сядзібныя дамы, хоць асобныя рысы барока захаваліся ў іх і ў 19 ст. (в. Старыя Пескі Бярозаўскага р-на).

Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй у канцы 18 ст. горадабудаўніцтва і манументальная архітэктура Беларусі развіваліся ў традыцыях рускага класіцызму. На тэрыторыі вобласці пачалася перапланіроўка гарадоў на аснове прынцыпаў класіцызму. Ставілася мэта ўпарадкаваць гарадскую структуру, стварыць новыя гарадскія раёны з рэгулярнай забудовай. Найбольш цікавымі былі генеральныя планы Брэста (1811 г.) і Пінска (1800, 1842 і 1856 гг.). Захоўваючы гістарычную планіроўку, яны прадугледжвалі рэканструкцыю вулічнай сеткі і рэгуляванне забудовы гарадскіх цэнтраў. У 2-й палавіне 19 ст. ў сувязі з пракладкай чыгунак узнік шэраг новых гарадоў і гарадскіх пасёлкаў (Баранавічы, Ганцавічы, Жабінка і інш.). Планіроўка іх рэгулярная, з густой сеткай вуліц і дробнымі прамавугольнымі кварталамі. Асобныя элементы класіцызму адлюстраваны ў архітэктуры паштовых станцый, пабудаваных у сярэдзіне 19 ст. на тракце Масква — Варшава (в. Няхачава Івацэвіцкага р-на, в. Мілавіды Баранавіцкага р-на, г. Кобрын). Гандлёвыя рады вядомы ў 2 варыянтах планіроўкі: замкнёная кампазіцыя з унутраным дваром (г. п. Антопаль Драгічынскага р-на) і выцягнуты пагон (Пружаны, Брэст). Стыль класіцызму ў культавым мурава-

ным дойлідстве выявіўся ў архітэктуры храмаў з купальным завяршэннем у цэнтральнай частцы (в. Дубай Пінскага р-на) або без купала — з порцікам і 2 вежамі на галоўным фасадзе (Пружаны, в. Шарапова Пружанскага р-на).

У культавым драўляным дойлідстве 19 ст. працягвалі развівацца старажытныя традыцыі. Узводзіліся традыцыйныя ярусныя абудаванні з верхам у цэнтры (царква Параскевы Пятніцы ў в. Беражное Столінскага р-на), павялічылася колькасць крыжовых храмаў. Прыклад пяцізрубнай пабудовы з 5 вярхамі — Мікалаеўская царква ў в. Кажан-Гарадок (Лунінецкі р-н), дзе творча увасоблены традыцыі мясцовай школы 18 ст. Гэтыя традыцыі ў Прыпяцкім Палессі захоўваліся да канца 19 ст. (Ільінская царква ў в. Велямічы Столінскага р-на). Аб творчай перапрацоўцы форм муравапай архітэктуры класіцызму сведчыць крыжова-купальная Троіцкая царква ў в. Золава (Драгічынскі р-н). Спаса-Праабражэнская царква ў в. Дзятлавічы (Лунінецкі р-н), фланкіраваная па вуглах 4 вежамі, адлюстравала зварот да архітэктурных форм абарончых храмаў 16 ст.

Паступова меншала залежнасць мастацтва ад царквы, траціла эстэтычную і сацыяльную каштоўнасць рэлігійная тэматыка. У жывапіс, скульптуру і графіку ўвайшла свецкая тэма, якая адлюстроўвала рэальнае жыццё народа. З'явіліся сатырычныя творы, якія выкрывалі заганы тагачасных сацыяльных парадкаў. Шырока развівалася кніжная і асабліва станковая графіка. Характэрная ў гэтых адносінах творчасць мастака А. Бартэльса (1818—85 гг.). На Брэстчыне працавалі А. Дамапскі, М. Кулеша, Н. Орда і іншыя, якія пакінулі нам малюнкі Пінска, Камянца, Іванава, сядзіб у в. Дубай, Мерачоўшчына (г. Косава), кляштара ка[illegible]у у Бярозе і інш.

У пачатку 20 ст. па ініцыятыве рускай і беларускай інтэлігенцыі настаўлена (пераважна на грамадскія грошы) некалькі помнікаў у гонар перамог над арміяй Напалеона. Сярод іх — помнік у Кобрыне, які па задуме яго стваральнікаў павінен быў выразіць сілу і веліч рускай зброі, гераізм рускага і беларускага народаў пры абароне радзімы. У манументальным жывапісе 19 — пачатку 20 ст. выявіліся свабода і майстэрства выканання, тонкія колеравыя спалучэнні: роспіс францысканскага касцёла і Варварынскай царквы ў Пінску, Петрапаўлаўскай царквы ў Ружанах, мазаікі Пакроўскага сабора ў Баранавічах пачатку 20 ст. і інш. Адпак у тэматыцы і кампазіцыі твораў адчувалася пэўная акадэмічная ідэалізацыя.

Архітэктуры канца 19 — пачатку 20 ст. уласцівы супярэчлівыя фармалістычныя і эклектычныя тэндэнцыі развіцця. На яе станоўча ўплывала развіццё будаўнічай тэхнікі (укараненне новых будаўнічых матэрыялаў, канструкцый), горадабудаўніцтва, прамысловасці, чыгуначнага транспарту (буйнамаштабныя будынкі запалкавай ф[illegible] ў Пінску, чыгуначнага вакзала ў Брэсце і інш.). Пашы-

Царква ў в. Гарадзішча Пінскага р-на. 19 ст. Малюнак з натуры Н. Орды

ралася будаўніцтва навучальных устаноў (гімназіі ў Пінску і Брэсце), адміністрацыйных будынкаў, даходных дамоў. Аднак пры гэтым парушалася стылявое адзінства архітэктуры, уласцівае мінулым эпохам. Архітэктары імкнуліся адрадзіць мастацкія прыёмы гістарычных стыляў (готыкі, барока, класіцызму). Мураваныя касцёлы будаваліся ў формах псеўдаготыкі. У архітэктуры цэркваў выявіліся псеўдарускі і псеўдавізантыйскі стылі (сабор у Баранавічах, царква ў Камянцы). Неакласіцызм адлюстраваны ў архітэктуры сядзібы ў в. Нача Ляхавіцкага р-на. У пачатку 20 ст. развіўся новы стыль «мадэрн», які выявіўся пераважна ў будаўніцтве гарадскога жылля (Брэст, Пінск і інш.). Драўляная архітэктура гэтага часу захоўвала старадаўнія мясцовыя традыцыі. У сядзібных будынках выкарыстоўваліся асобныя элементы класіцызму (порцікі на галоўным фасадзе — сядзіба ў в. Агарэвічы Ганцавіцкага р-на), у культавай архітэктуры развіваліся тыпы храмаў падоўжна-восевай і крыжова-цэнтрычнай кампазіцый.

* *
*

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі на неакупіраванай частцы Пінскага і іншых паветаў Брэстчыны была ўстаноўлена Савецкая ўлада. II Усерасійскі з'езд Саветаў па прапанове У. І. Леніна прыняў Дэкрэт аб міры. У адпаведнасці з ім у снежні 1917 г. на Заходнім фронце быў падпісаны дагавор аб перамір'і. У лютым 1918 г. германскія войскі, парушыўшы перамір'е, перайшлі ў наступленне і захапілі ўсю Брэстчыну. Пасля падпісання Брэсцкага мірнага дагавора (3.3.1918 г.) паміж Савецкай Расіяй і Германіяй (і яе саюзнікамі) Пінскі павет і некалькі валасцей іншых паветаў паўднёвай Брэстчыны адышлі да т. зв. Украінскай народнай рэспублікі. На акупіраванай тэрыторыі ствараліся падпольныя камуністычныя арганізацыі (у Брэсце, Лунінцы, Пін-

ску і інш.), якія кіравалі разгортваннем вызваленчай барацьбы беларускага народа супраць акупантаў. 13.11.1918 г. Савецкі ўрад ануляваў Брэсцкі мірны дагавор, пачалося аднаўленне і ўстанаўленне Савецкай улады ў вызваляемых раёнах. 1.1.1919 г. абвешчана Беларуская ССР. Брэстчына ўвайшла ў яе склад як Баранавіцкі р-н з падраёнамі: Баранавіцкім, Брэсцкім, Кобрынскім, Пінскім і Пружанскім. З канца лютага 1919 г. тэрыторыя Брэстчыны ў складзе Літоўска-Беларускай ССР, у межы якой уварваліся войскі буржуазнай Польшчы. Да жніўня 1919 г. польскія акупанты захапілі ўсю Брэстчыну. На акупіраванай тэрыторыі разгарнуўся партызанскі рух, якім кіраваў Брэсцкі падпольны камітэт КП(б)ЛіБ. У ліпені 1920 г. Чырвоная Армія вызваліла тэрыторыю Брэстчыны ад акупантаў, была адноўлена Савецкая ўлада. Для ажыццяўлення рэвалюцыйных пераўтварэнняў створаны Баранавіцкі, Брэст-Літоўскі, Кобрынскі, Пінскі, Пружанскі ракомы. Яны падтрымлівалі парадак, памагалі фронту, бралі на ўлік фабрыкі, заводы, памешчыцкія маёнткі. 19.8.1920 г. польскія войскі зноў занялі Брэст, а да канца кастрычніка 1920 г. - і ўсю Брэстчыну. Паводле Рыжскага мірнага дагавора (сакавік 1921 г.) тэрыторыя Брэсцкай вобл. адышла да Польшчы і ўваходзіла ў склад Палескага (цэнтр г. Брэст, паветы Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі і Столінскі) і часткова Навагрудскага (Баранавіцкі павет) ваяводстваў. Як і ва ўсёй Заходняй Беларусі, тут была адноўлена ўлада буржуазіі і памешчыкаў, усталяваны жорсткі рэжым бяспраўя, эксплуатацыі і нацыянальнага прыгнёту працоўных. У эканамічных адносінах Брэстчына была аграрным прыдаткам Польшчы, крыніцай сыравіны і таннай рабочай сілы, рынкам збыту для польскай прамысловасці. Мясцовая прамысловасць складалася з асноўным з невялікіх прадпрыемстваў будаўнічых, па вырабу керамікі, лесапільных, гарбарных, харчовых і інш. Польскі ўрад праводзіў вялікадзяржаўна-шавіністычную палітыку прымусовай паланізацыі, выкаранення беларускай культуры.

На працягу амаль 2 дзесяцігоддзяў працоўныя Брэстчыны вялі барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. У пачатку 1920-х гадоў на Палессі разгарнуўся партызанскі рух, кіраўнікамі якога былі К. П. Арлоўскі, В. З. Корж, С. А. Ваўпшасаў і інш. Найбольш значныя аперацыі партызаны правялі ў в. Чучавічы Столінскага пав. і в. Добрае Дрэва Лунінецкага павета (1922 г.), у Целяханах і Пружанах (1923—24 гг.), на ст. Парахонск Лунінецкага пав. (1924 г.), у Ляхавічах Баранавіцкага павета (1925 г.). Рэвалюцыйная барацьба ўзмацнілася пасля стварэння Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ, 1923 г.) У Палескім (і часткова Навагрудскім) ваяводстве дзейнічалі Брэсцкі, Пінскі і Слонімска-Баранавіцкі акруговыя і 43 раённыя і падраённыя камітэты КПЗБ. Пад кіраўніцтвам КПЗБ дзейнічалі Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), а таксама рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі — Беларуская сялянска-рабочая грамада, «Змаганне», Таварыства беларускай школы (ТБШ). Партыя ўзначальвала рэвалюцыйныя выступленні рабочых, барацьбу сялян за зямлю, супраць непасільных падаткаў, нацыянальнага ўціску, за школу на роднай мове. КПЗБ стварала падпольныя друкарні, нелегальна выдавала і распаўсюджвала сярод працоўных перыядычныя выданні, пракламацыі, прапагандавала дасягненні савецкага народа ў сацыялістычным будаўніцтве. Найбуйнейшыя выступленні працоўных Брэстчыны: дэманстрацыя рабочых і сялян у Косаве ў 1927 г., якую расстраляла паліцыя, забастоўкі рабочых драваапрацоўчай прамысловасці і лесараспрацовак у Белавежскай і Ружанскай пушчах у 1932—34 гг.; узброенае выступленне сялян Кобрынскага павета ў 1933 г. і інш. На тэрыторыі Брэстчыны барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне вялі такія актыўныя дзеячы КПЗБ і КСМЗБ, як В. З. Харужая, А. А. Альшэўскі, С. Я. Багданчук, М. М. Дворнікаў, І. П. Урбановіч, С. С. Панкова, У. З. Царук і інш. Для палітычных вязняў польскі буржуазны ўрад стварыў у 1934 г. Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.

У верасні 1939 г., пасля нападу фашысцкай Германіі на Польшчу, паводле распараджэння ўрада СССР Чырвоная Армія перайшла (17 верасня) савецка-польскую граніцу і ўзяла пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Працоўныя Брэстчыны актыўна памагалі Чырвонай Арміі: стваралі атрады рабочай гвардыі, часовыя гарадскія ўпраўленні і сялянскія камітэты, якія падаўлялі супраціўленне эксплуататарскіх класаў, устанаўлівалі рэвалюцыйны парадак. 22 кастрычніка адбыліся выбары дэпутатаў у Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі, які працаваў 28—30.10.1939 г. ў Беластоку. Ён прыняў Дэкларацыю пра абвяшчэнне Савецкай улады, уключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанне яе з БССР, дэкларацыі аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці, выбраў паўнамоцную камісію (60 чал.) і паслаў яе ў Маскву на сесію Вярхоўнага Савета СССР і ў Мінск на сесію Вярхоўнага Савета БССР, каб перадаць рашэнне Сходу прасіць прыняць Заходнюю Беларусь у склад СССР і ўз'яднаць з БССР. 2.11.1939 г. 5-я (пачарговая) сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла закон «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і ўз'яднанні яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай». 14.11.1939 г. 3-я (пачарговая) сесія Вярхоўнага Савета БССР пастанавіла прыняць Заходнюю Беларусь у склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. З утварэннем у Заходняй Беларусі абласцей (4.12.1939 г.) і раёнаў (15.1.1940 г.) тэрыторыя

Брэстчыны ўвайшла ў склад Брэсцкай (18 раёнаў), Пінскай (11 раёнаў) і часткова Баранавіцкай (4 раёны) абласцей. 24.3.1940 г. у Заходняй Беларусі адбыліся выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР, а 15.12.1940 г. — у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Пачалося сацыялістычнае будаўніцтва. За кароткі час былі ажыццяўлены вялікія сацыяльныя і эканамічныя пераўтварэнні.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны тэрыторыя вобласці стала месцам жорсткіх баёў савецкіх войск супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Легендарнай славай пакрылі сябе абаронцы Брэсцкай крэпасці, якія больш за месяц змагаліся з ворагам. Мужна трымаліся пагранічнікі 17-га Чырвонасцяжнага пагранатрада, абаронцы Брэсцкага вакзала. Жорсткія баі адбыліся на тэрыторыі Пружанскага, Кобрынскага, Маларыцкага і інш. раёнаў. З самага пачатку нямецка-фашысцкай акупацыі зарадзіўся партызанскі рух. На Піншчыне быў створаны адзін з першых на Беларусі партызанскі атрад, які ўзначаліў у чэрвені 1941 г. В. З. Корж. У чэрвені 1941 г. ў Жабінкаўскім р-не пачаў дзейнічаць Старасельскі атрад (пазней імя М. М. Чарнака), у ліпені 1941 г. ў Бярозаўскім р-не — атрад на чале з В. М. Манахавым і інш. У пачатку 1942 г. на тэрыторыі вобласці змагаліся 23 партызанскія атрады. Арганізатарам і кіраўніком барацьбы савецкага народа ў варожым тыле была Камуністычная партыя. На тэрыторыі вобласці дзейнічалі: у ліпені — верасні 1941 г. і з верасня 1942 г. Пінскі падпольны абком КП(б)Б (сакратары П. Г. Шаналаў, М. К. Зайцаў да верасня 1941 г., А. Я. Кляшчоў у красавіку — кастрычніку 1943 г., С. Р. Вайцаховіч з красавіка 1943 г.), з сакавіка 1943 г. Баранавіцкі падпольны абком КП(б)Б (сакратары В. Я. Чарнышоў, Ф. А. Баранаў), з красавіка 1943 г. Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б (сакратары С. І. Сікорскі, І. І. Баброў). Падпольныя абкомы КП(б)Б накіроўвалі дзейнасць Брэсцкага, Баранавіцкага і Пінскага партызанскіх злучэнняў, якія летам 1944 г. налічвалі каля 50 тыс. чалавек, стварылі на Брэстчыне сетку падпольных міжрайкомаў, гаркомаў, райкомаў КП(б)Б. Пад кіраўніцтвам падпольных абкомаў партыі працавалі Брэсцкі, Баранавіцкі і Пінскі падпольныя абкомы ЛКСМБ, якія кіравалі работай камсамольскіх арганізацый. Герaічна змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў камсамольцы Сінкевіцкай (Лунінецкі р-н), Блудзенскай (цяпер в. Першамайская Бярозаўскага р-на), Мотальскай (Іванаўскі р-н) і іншых падпольных арганізацый. Сетка падпольных арганізацый уключала і масавыя антыфашысцкія групы, якія пачалі складвацца з восені 1941 г. У маі 1942 г. створаны міжраённы антыфашысцкі Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі, які кіраваў дзейнасцю антыфашысцкіх арганізацый у Бярозаўскім, Камянецкім, Косаўскім, Пружанскім, Ружанскім і іншых раёнах. У чэрвені 1943 г. міжраённы камітэт рэарганізаваны ў Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт. Яго ўзначальвалі І. П. Урбановіч, М. Е. Крыштафовіч, І. І. Жышка і інш. З мая 1942 г. дзейнічала Баранавіцкая акруговая антыфашысцкая арганізацыя, камітэт якой узначальвалі Г. М. Картухін, А. Ф. Манкевіч. На тэрыторыі вобласці выдаваліся 3 падпольныя абласныя газеты: «Заря» Брэсцкага, «Чырвоная звязда» Баранавіцкага і «Палеская праўда» Пінскага падпольных абкомаў КП(б)Б, 9 падпольных раённых газет, антыфашысцкая маладзёжная газета Баранавіцкай вобл. «Молодой мститель», газета «За Родину» — орган Брэсцкага антыфашысцкага камітэта. Нямецка-фашысцкія захопнікі ўстанавілі на Брэстчыне жорсткі акупацыйны рэжым беззаконня, гвалту, грабяжу і крывавага тэрору. За час акупацыі ў Пінску знішчана 59 тыс. мірных жыхароў і ваеннапалонных, у Баранавічах 31 тыс., у Століне 8 тыс., у Лясянскім лагеры смерці (Баранавіцкі р-н) больш за 88 тыс., у Калдычэўскім лагеры смерці (Баранавіцкі р-н) 22 тыс., каля в. Броная Гара (Бярозаўскі р-н) больш за 50 тыс. і тысячы ў інш. месцах масавай загубы савецкіх людзей. Карнікі знішчылі разам з насельніцтвам 102 вёскі вобласці, 5 з іх не адрадзіліся. Былі разбураны амаль усе прамысловыя прадпрыемствы, абрабаваны калгасы і саўгасы, МТС, навучальныя і культурныя ўстановы.



Партызаны слухаюць радыёперадачу з Масквы. Атрад імя М. М. Чарнака брыгады імя І. В. Сталіна

Пасля Мазырска-Калінкавіцкай аперацыі (студзень 1944 г.) 61-я армія Беларускага фронту за зіму і вясну 1944 г. прасунулася ўздоўж правага берага р. Прыпяць і на захад да г. Ратна (на поўнач ад Ковеля). Утварыўся 350-кіламетровы выгіб лініі фронту па ўчастку 61-й і 70-й арміі. Насупраць стаяла 2-я нямецкая армія, асноўныя сілы якой замацаваліся на левым беразе Прыпяці. Амаль увесь гэты час, асабліва ў сакавіку 1944 г., тут вяліся баі мясцовага значэння, у т. л. і



ПРИКАЗ

Начальника Центрального Штаба Партизанского Движения

при Ставке Верховного Главнокомандования

№ 0042

г. Москва

О ПАРТИЗАНСКОЙ РЕЛЬСОВОЙ ВОЙНЕ НА КОММУНИКАЦИЯХ ВРАГА

Загад № 0042 начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху аб правядзенні «рэйкавай вайны».

па тэрыторыі паўднёвых раёнаў Брэстчыны. У ліпені 1944 г. войскі 1 га Беларускага фронту (камандуючы Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі) у выніку Баранавіцка-Слонімскай і Люблінска-Брэсцкай аперацый вызвалілі Брэстчыну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Значную дапамогу Чырвонай Арміі аказалі партызаны. У красавіку 1944 г. яны змагаліся каля в. Здітава Бярозаўскага р-на, з 21 лютага да 30 сакавіка 1944 г. ішлі баі партызан з буйной групоўкай ворага на Дняпроўска-Бугскім канале. За 3 дні да Беларускай аперацыі партызаны ў «рэйкавай вайне» нанеслі масавы ўдар па чыгуначных камунікацыях ворага. Партызаны Пінскага злучэння памагалі часцям Чырвонай Арміі вызваляць Лагішын, Лунінец, Пінск. У разгроме варожай групоўкі ў Маларыцкім р-не і ў баях за вызваленне Брэста ўдзельнічалі партызаны брыгады імя У. І. Леніна.

У аднаўленні разбуранай гаспадаркі Брэстчыны вялікую дапамогу аказалі народы ўсіх брацкіх рэспублік СССР. Працоўныя вобласці ў сваю чаргу памагалі лесаматэрыяламі і рабочай сілай у аднаўленні разбуранай прамысловасці ў гарадах і абласцях, якія найбольш пацярпелі ў гады вайны. Гераічнымі намаганнямі працоўных вобласці да 1948 г. адноўлена прамысловасць, наладжвалася работа аўтамабільнага і чыгуначнага транспарту, сродкаў сувязі, гідратэхнічных збудаванняў. Адраджаліся разбураныя гарады і вёскі. Велізарныя сацыяльна-эканамічныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ажыццяўляўся пераход вёскі да калектыўнага вядзення гаспадаркі. Да 1951 г. амаль закончана калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У студзені 1954 г. Брэсцкая вобл. узбуйнена, да яе далучаны ўсе раёны скасаваных Пінскай і 4 раёны Баранавіцкай абл. За пасляваенны перыяд вобласць стала краем высокаразвітай прамысловасці і перадавой сельскай гаспадаркі. Тут пабудавана і рэканструявана каля 240 прамысловых прадпрыемстваў і буйных цэхаў. Створаны новыя галіны прамысловасці: электратэхнічная, дываноўая, баваўняная, металаапрацоўчая, будаўнічая, цукровая і інш. Да ліку буйнейшых на Беларусі аднесяцца брэсцкія электралямпавы і газавай апаратуры заводы, дывановы і панчошны камбінаты, пінскія камбінат верхняга трыкатажу, фабрыка трыкатажных спартыўных вырабаў і завод штучных скур, Баранавіцкі баваўняны камбінат. У вобласці створана магутная энергетычная база. Пабудавана Бярозаўская ДРЭС, якая па магутнасці займае 2-е месца ў Беларусі (пасля Лукомскай ДРЭС), павялічылася магутнасць электрастанцый у Брэсце, Баранавічах, Пінску. Прамысловаму развіццю вобласці садзейнічала пракладка газаправодаў Дашава — Мінск (з адгалінаваннем на Брэст) і Таржок — Івацэвічы. Створана буйная будаўнічая індустрыя, працуюць камбінаты жалезабетонных канструкцый у Баранавічах, будаўнічай індустрыі ў Пінску, домабудаўнічы ў Брэсце, заводы жалезабетонных вырабаў у Брэсце, Баранавічах, Бярозе, Кобрыне, Івацэвічах, Іванаве, Ляхавічах, Высокім, камбінаты будаўнічых матэрыялаў у Пружанах, Кобрыне, Бярозе, Брэсце, у в. Даманава Івацэвіцкага р-на. У рабочым пасёлку Рэчыца Столінскага р-на працуе завод абліцовачнафасаднай керамікі. Для здабычы граніту створаны камбінат нярудных матэрыялаў «Мікашэвічы» (Лунінецкі р-н). Развіваецца і дасягнула высокага ўзроўню механізацыі лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасць. Прадпрыемствы вобласці выпрабляюць мэблю, запалкі, драўнінна-стружкавыя пліты, буддэталі, піламатэрыялы і інш. Новыя мясакамбінаты, кансервавыя і малочныя заводы пабудаваны ў Баранавічах, Брэсце, Пінску, Кобрыне, Пружанах, Століне, Давыд-Гарадку, Камянцы, Маларыце, Драгічыне і інш. У Жабінцы дзейнічае адзін з буйнейшых у рэспубліцы цукровы завод.

Сельская гаспадарка вобласці спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, развітым ільнаводстве ў спалучэнні з бураководствам.

За актыўны ўдзел у партызанскім руху, мужнасць і стойкасць працоўных Брэсцкай вобл. ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны і за поспехі ў аднаўленні і развіцці народнай гаспадаркі 17.7.1967 г. Брэсцкая вобл. узнагароджана ордэнам Леніна.

Брэстчына — край высокай культуры. Асабліва вялікіх поспехаў дасягнула вобласць у пасляваенныя гады. У Брэсце працуюць педагагічны імя А. С. Пушкіна і інжынерна-будаўнічы інстытуты, у вобласці 18 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 1001 агульнаадукацыйная школа, 21 прафесійна-тэхнічнае вучылішча. Дзейнічае 1147 бібліятэк, 935 клубных устаноў, 426 дзіцячых дашкольных устаноў, 1030 кінаўстановак, 126 бальнічных устаноў.

У 1956 г. ў Брэсце адкрыты Музей Брэсцкай крэпасці-героя, у 1957 г.— абласны краязнаўчы музей, у экспазіцыях і фондах якога захоўваюцца унікальныя рэчы з археалагічных раскопак, этнаграфічныя і гістарычныя матэрыялы. У Пінску з 1926 г. дзейнічае адзін з старэйшых на Палессі краязнаўчых музеяў з унікальным этнаграфічным аддзелам (з 1979 г. Беларускі дзяржаўны музей сацыялістычнага пераўтварэння Палесся). Краязнаўчыя музеі ёсць у Баранавічах (з 1952 г.), Століне (з 1955 г.), ваенна-гістарычны імя А. В. Суворава ў Кобрыне (з 1946 г.), гісторыка-рэвалюцыйны ў Бярозе (з 1961 г.), музей прыроды «Белавежская пушча» ў Камянюках.

У вобласці працуюць абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі, абласны тэатр лялек. Дзейнічаюць шматлікія самадзейныя калектывы — народныя тэатры, народныя хоры, ансамблі, аркестры; абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культасветработы. На Брэстчыне ёсць абласныя аддзяленні Саюза мастакоў БССР, Саюза пісьменнікаў БССР, Саюза журналістаў БССР, Саюза архітэктараў БССР. У скарбніцы беларускай савецкай літаратуры ёсць творы і пісьменнікаў з Брэсцкай вобл. Вядомы беларускі паэт і празаік П. Пестрак стварыў шэраг твораў аб барацьбе працоўных Заходняй Беларусі, паэт М. Засім прысвяціў роднай Брэстчыне старонкі сваіх кніг.

Савецкі перыяд у горадабудаўніцтве Брэсцкай вобл. вызначаецца шырокім развіццём прамысловай індустрыі, на базе якой многія гарады сфарміраваліся ў буйныя прамысловыя цэнтры (Брэст, Баранавічы, Пінск), а невялікія мястэчкі ператварыліся ў гарады або пасёлкі гарадскога тыпу (Івацэвічы, Жабінка, Лагішын і інш.). Рэканструкцыя Дняпроўска-Бугскай воднай сістэмы і пракладка новых магістралей садзейнічаюць далейшаму развіццю эканомікі вобласці. Разам з будаўніцтвам фабрык і заводаў ажыццяўляюцца новыя прынцыпы іх размяшчэння ў планіровачнай структуры горада: ствараюцца спецыяльныя прамысловыя раёны і вузлы, якія маюць зручныя сувязі з жылымі раёнамі і аддзяляюцца ад іх зялёнымі ахоўнымі паласамі (пабудаваны ў Брэсце, Бярозе, Пінску). У іх выкарыстоўваюцца прагрэсіўныя прынцыпы планіроўкі і архітэктурна-канструкцыйнага вырашэння. Так, у Брэсцкім прамысловым вузле ўпершыню скарыстана максімальнае кааперыраванне розных прамысловых прадпрыемстваў і іх дапаможных службаў, што, апрача значнага эканамічнага эфекту, адкрыла дадатковыя магчымасці ў горадабудаўнічым і архітэктурным вырашэнні забудовы ўсяго раёна. У вялікіх гарадах (Брэст, Пінск, Баранавічы) фарміруюцца комплексныя сялібна-вытворчыя раёны, у межах якіх у асноўным задавальняюцца патрэбы гараджан у працаўладкаванні, культурна-бытавым абслугоўванні і адпачынку. Буйныя планіровачныя раёны ствараюцца ў Брэсце. Новае будаўніцтва вядзецца ва ўсходняй частцы горада, дзе размешчаны прамысловыя будынкі, вучэбны гарадок інжынерна-будаўнічага інстытута, жылыя масівы. Узведзены шэраг цікавых па архітэктуры будынкаў: абкома КПБ, Дома палітасветы, гандлёвага цэнтра па вул. Маскоўскай і інш. У апошнія гады хутка добраўпарадкоўваецца Пінск, структура якога ў асноўным сфарміравалася гістарычна. Тут рэканструяваны раёны малапавярховай драўлянай забудовы. Новае будаўніцтва вядзецца і на свабодных тэрыторыях, дзе выкарыстоўваюць прагрэсіўныя прынцыпы комплекснай забудовы (паўночны раён), і ў раёнах, дзе ажыццяўляецца рэканструкцыя ўстарэлага жылога фонду (цэнтральны і заходні раёны). Непазнавальна змянілася архітэктурнае аблічча іншых гарадоў вобласці: забудаваны новыя мікрараёны, рэканструяваны кварталы аднапавярховай забудовы, добраўпарадкавана гарадская тэрыторыя. Пры рэканструкцыі гарадоў галоўная ўвага аддаецца развіццю жыллёвага будаўніцтва. У малых і сярэдніх гарадах пераважна будуюць 3—9-павярховыя, а ў вялікіх і 9—16-павярховыя добраўпарадкаваныя жылыя дамы. У жылых і адміністрацыйных будынках выкарыстоўваюць новыя будаўнічыя і аддзелачныя матэрыялы. Развіваецца і ўдасканальваецца камунальная гаспадарка і транспарт, інжынернае абсталяванне, добраўпарадкоўваюцца вуліцы і плошчы гарадоў. Вядзецца рэканструкцыя старых паркаў, сквераў, бульвараў, набярэжных. На берагах рэк ствараюцца зоны адпачынку, будуюцца спартыўныя комплексы (Брэст, Кобрын, Столін і

Брэст. Вуліца Набярэжная

Цэнтральная сядзіба саўгаса «Малеч» Бярозаўскага р-на

інш.). Ідзе працэс рэканструкцыі гарадскіх грамадскіх цэнтраў, дзе сканцэнтраваны асноўныя адміністрацыйныя, гандлёвыя і культурна-асветныя ўстановы. У г. п. Камянец, г. Кобрын і інш. населеных пунктах, гістарычныя цэнтры якіх склаліся ў мінулыя стагоддзі і не адпавядаюць патрабаванням сучаснага горадабудаўніцтва, ствараюцца новыя грамадска-адміністрацыйныя комплексы непадалёку ад галоўных магістралей. Пры рэканструкцыі такіх гарадоў вырашаецца ўзаемасувязь новых ансамбляў з існуючай забудовай, уключэнне помнікаў архітэктуры ў сучасную забудову. Так, у Брэсце фарміруецца новы грамадска-адміністрацыйны цэнтр, які мае выхад да набярэжнай р. Мухавец і звязаны з мемарыяльным комплексам Брэсцкая крэпасць-герой.

Развіваюцца і добраўпарадкоўваюцца сельскія населеныя пункты вобласці. Замест дробных вёсак узнікаюць перспектыўныя ўзбуйненыя пасёлкі, у якіх горадабудаўнічыя праблемы вырашаны ў комплексе з арганізацыяй усёй гаспадаркі населенага пункта. Ажыццяўляецца эксперыментальна-паказальнае будаўніцтва пасёлкаў новага тыпу з поўным інжынерным абсталяваннем і належнымі бытавымі ўмовамі для насельніцтва (в. Малеч Бярозаўскага і в. Новая Расна Камянецкага р-наў). Тут створаны новыя грамадскія цэнтры, у якіх канцэнтруюцца гандлёвыя і культурна-бытавыя ўстановы. Добрую ацэнку атрымалі забудаваныя ў гэтых пасёлках двухкватэрныя жылыя дамы з кватэрамі на двух узроўнях і чатырохкватэрныя дамы з асобным уваходам у кожную кватэру. Пры рэканструкцыі і добраўпарадкаванні сучасных гарадоў і сельскіх населеных пунктаў вырашаецца асноўная сацыяльная задача — павышэнне жыццёвага ўзроўню, усебаковае задавальненне культурна-бытавых патрэб насельніцтва.

Забудова вёскі Клепачы Пружанскага р-на.

У 1960—80-я гады шырока развіваецца манументальнае мастацтва. Яго росквіту садзейнічалі мерапрыемствы Савецкага ўрада па стварэнню помнікаў выдатным дзеячам рэвалюцыйнага руху, навукі, літаратуры і мастацтва, героям Вялікай Айчыннай вайны, у гонар найважнейшых гістарычных падзей. У стварэнні помнікаў на Брэстчыне ўдзельнічалі вядомыя беларускія майстры З. Азгур, А. Бембель, У. Кароль, І. Міско і інш., а таксама мастакі і архітэктары з Масквы — А. Кібальнікаў, М. Мілавідаў, М. Альтшулер. У вобласці ўстаноўлены шэраг помнікаў правадыру сусветнага пралетарыяту і стваральніку Савецкай дзяржавы У. І. Леніну. Выразнай пластыкай, манументальнасцю і лаканізмам форм, глыбокім унутраным зместам вылучаюцца помнікі ў Брэсце і Баранавічах. Арыгінальнымі па кампазіцыі і рамантычна вобразнаму вырашэнню з'яўляюцца помнікі У. І. Леніну ў Пінску, Пружанах і Століне. Стварэнне гэтых манументаў — значны ўклад у беларускую Ленініяну. На Брэстчыне створаны велічныя, глыбокага ідэйнага зместу архітэктурна-скульптурныя комплексы з даўгавечных матэрыялаў, архітэктурныя і скульптурныя манументы, абеліскі (у спалучэнні з Курганамі Славы, з рэаліямі мінулай вайны — танкамі, самалетамі, катэрамі і інш.). Беларускія скульптары стварылі бюсты-помнікі Героям Савецкага Саюза, якія ўстаноўлены ў абласных і раённых цэнтрах рэспублікі. Сярод іх бюсты двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца ў Баранавічах, Героя Савецкага Саюза В. З. Харужай у Пружанах і Пінску, двойчы Героя Савецкага Саюза П. І. Клімука ў Брэсце, двойчы Героя Сацыялістычнай Працы У. А. Ралько ў в. Аснежыцы Пінскага р-на. Назіраецца імкненне да сінтэзу архітэктурных і скульптурных форм, да ўзмацнення ролі архітэктурных элементаў у вобразным ладзе помнікаў. Гэта тэндэнцыя знайшла сваё ўвасабленне ў мемарыяльных комплексах. Самым буйным у вобласці з'яўляецца мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой, які ўвекавечыў беспрыкладны подзвіг, стойкасць і мужнасць савецкіх воінаў — абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Глыбокі патрыятычны змест, гарманічнае адзінства і рэалістычная выразнасць вылучаючых сродкаў робяць яго адным з найбольш значных ансамбляў у савецкай архітэктуры і манументаль-

ным мастацтве. Вялікае эмацыянальнае ўражанне свеёй выразнасцю, лаканізмам і драматычнасцю вырашэння тэмы выклікае мемарыяльны комплекс на месцы загубы 3 тыс. чэхаславацкіх грамадзян — ахвяр фашызму ва ўрочышчы Гай пад Баранавічамі. Вылучаюцца мемарыяльны комплекс на гарнізонных вайсковых могілках і помнік пагранічнікам у Брэсце, комплекс «Здітаўская абарона» (Бярозаўскі р-н), помнікі «Кулямётчык» у в. Камянюкі (Камянецкі р-н), юнаму партызану М. Гойшыку ў в. Міхнавічы (Івацэвіцкі р-н) і інш. У вобласці шмат Кургаяоў Славы (Бессмяротнасці) і Курганоў Памяці. Вылучаюцца Курганы Славы ва ўрочышчы Мелавая Гара (Маларыцкі р-н) і ў в. Мінічы (Ляхавіцкі р-н).

Гістарычныя, археалагічныя, архітэктурныя і мастацкія помнікі Брэстчыны яскрава адлюстроўваюць яе багатую шматвяковую гісторыю і культуру, рэвалюцыйна-вызваленчы рух, барацьбу народа за пабудову сацыялістычнага грамадства, за незалежнасць нашай Радзімы, услаўляюць змагароў за камуністычныя ідэалы.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы.— Мн., 1970; Ленін У. І. Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура — Тв., т. 10 (Полн. собр. соч., 12); яго ж. Крытычныя заметкі па нацыянальнаму пытанню — Тв., т. 20 (Полн. собр. соч., т. 24); яго ж. Аб пралетар[illegible] — Тв., т. 31 (Полн. собр. соч., т. 41); Антонович [illegible] Очерк истории Великого княжества Литовского до половины XV столетия. В. 1.— Киев, 1878. Архитектура и градостроительство Советской Белоруссии.— Мн., 1957; Арэхва М. С. Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі.— Мн., 1958. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 1—12. Мн., 1969—75; Белогорцев И. Д., Гурин П. И., Кустанович С. М. Развитие городов Белоруссии.— Мн., 1967; Белоруссия и Литва: Историческ[illegible] судьбы Северо-Западного края.— СПб., 1890. Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии 1860—1900.— Мн., 1978; яго ж. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.).— Мн., 1966; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы. Т. 1—2.— Мн., 1962—72; Брунoў М. І. Беларуская архітэктура XI—XII ст.— У кн.: Зборнік [illegible] тыкулаў. Этнаграфія. Антрапалогія. Псіхалогія. [illegible] навуковая арган зацыя працы. Гісторыя мастацтва. Мн., [illegible] Великая Октябрьская социалистическая революция в Б[illegible] Документы и материалы. Т. 1—2.— Мн., 19[illegible] История архитектуры Белоруссии (советский период).— [illegible] 1975; яго ж. Жилищное строительство в Белорусской ССР. Мн., 1981; Варанава А. І. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг.— Мн., 1960; Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.— Восстание в Литве и Белоруссии [illegible] туры. Т. 6.— М., 1968; Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1.— Мн., 1936; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. [illegible] Мн., [illegible]8; Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1—5.— Мн., [illegible] Грушевский А. С. Города Великого Княжества Литовского в XIV—XVI вв. Старина и борьба за старину.— Киев, 1918; Дробов Л. Н. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в.— Мн., 1974; Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии.— М., 1954; Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Ч. 1—2.— СПб.; М., 1882; Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья.— Мн., 1976; История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945. Т. 4.— М., 1962; Кацер М. С. Белорусская архитектура. Исторический очерк.— Мн., 1956; яго ж. Изобраз[illegible] Мн., 1969; Квитницкая Е. Д. Малоизвестные зальные сооружения Белоруссии конца XV — начала XVI в.— Архитектурное наследство, 1967, в. 16; Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII—XVIII в. (по материалам магнатских вотчин).— Мн., 1969; Копысский З. Ю. [illegible]номическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в.— Мн., 1966; яго ж. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в.— Мн., 1975; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года.— Мн., 1962; Король В. А. Комплексное экспериментально-показательное строительство в селах Белоруссии.— Строительство и архитектура Белоруссии, 1971, № 4; Короткевич В. Б. Памятники истории и культуры.— Мн., 1978; Кухаренко Ю. В. Зарубинецкая культура.— М., 1964; яго ж. Памятники железного века на территории Полесья.— М., 1961; яго ж. Первобытные памятники Полесья.— М., 1962; яго ж. Раскопки на городище и селище Хотомель.— М., 1957.— (Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры АН СССР; в. 68); яго ж. Средневековые памятники Полесья.— М., 1961; Лыпило П. П. КПБ — организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны.— Мн., 1959; Лиnинский Л. П., Лукьянов Е. П. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900—1907 гг.).— Мн., 1968; Лысенко П. Ф. Города Туровской земли.— Мн., 1974; Майзель Л. Н. 1905—1907 гг. на Беларусі: Хроніка па[illegible] Марцелеў С. В. [illegible] цвету.— Мн., 1974; яго ж. Художественная культура Белоруссии на современном этапе.— Мн., 1978; Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов.— Мн., 1968; Навечно в сердце народном.— 3 изд.— Мн., 1984; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1981 г.: Статистический ежегодник.— Мн., 1982; Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі.— Мн., 1968; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии.— М., 1960; Освобождение Белоруссии. 1944.— 2 изд.— М., [illegible] 2 изд.— Мн., 1968; Очерки по археологии Белоруссии. [illegible]— Мн., 1970—72; Пашуто В. Т. Образование Литовского государства.— М., 1959; Петриков П. Т. Организация и деятельность революционных комитетов на территории Белоруссии в 1920 году.— Мн., 1962; Пичета В. И. Белоруссия и Литва XV—XVI вв.— М., 1961; яго ж. Основные моменты исторического развития Западной Украины и Западной Белоруссии.— М., 1940; Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944).— Мн., 1976; Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944).— Мн., 1975; Полесье. (Лингвистика. Археология. Топонимика).— М., 1968; Рашевский Н. А. Брестская область. Белорусская ССР.— 2 изд.— Мн., 1975; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.).— Мн., 1966; [Романов] Е. Р. По Гродненскому Полесью. (Из записной книжки архео[illegible]).— Записки Северо-Западного отдела имп. Русского географического об-ва. Вильно, 1911, кн. 2; Ткачоў М. А. Замкі Беларусі (XIII—XVII ст.).— Мн., 1977; яго ж. Абарончыя збудаванні заходніх земель Беларусі XIII—XVIII ст. [illegible] Чантурия В. А. Архитектура Белоруссии [illegible] XIX века.— Мн., 1962; яго ж. История архитектуры Белоруссии.— 2 изд.— Мн., 1977; Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX ст.— Мн., 1978; Dmochowski Z. Sprawozdanie ze studjów nad polskiem budownictwem drzewnem w r. 1934—35.— Biuletyn Historii Sztuki [illegible] 1935. R. 3, № 4; Gloger Z. Geografia historyczna [illegible] dawnej Polski.— Kraków, 1900; Moszyński K. Kultura ludowa Słowian. T. 1—2 wyd.— Warszawa, 1967.

Г. І. Барышаў, В. Б. Караткевіч, Л. Г. [illegible]
В. В. Церашчатава, Т. І. Чарняўская, Ю. А. Якімовіч

БРЭСТ

I. БРЭСТ

Горад, цэнтр Брэсцкай вобл. Размешчаны на р. Мухавец пры ўпадзенні яе ў р. Заходні Буг. Буйны эканамічны і культурны цэнтр. Вузел чыгунак на Баранавічы, Лунінец, Ковель, Беласток, Варшаву і аўтамабільных дарог. Рачны порт, звязаны праз канал з басейнамі Дняпра і Буга. Аэрапорт. Насельніцтва 201 тыс. чалавек (на 1.1.1982 г.). Летапісная назва Берестье (Бярэсце), у 17 — пачатку 20 ст.— Брэст-Літоўск, у 1921—39 гг.— Брэст-над-Бугам, з верасня 1939 г.— Брэст. Мяркуюць, што старажытная назва Бярэсце паходзіць ад назвы мясцовай народы вяза ці ад бярозавай кары — бяросты.

Месца ў сутоку Мухаўца і Заходняга Буга, дзе размяшчалася старажытнае Бярэсце, знаходзілася на скрыжаванні 2 старажытных гандлёвых шляхоў праз землі ўсходніх славян у Польшчу, Прыбалтыку і Заходнюю Еўропу. Адзін з іх ішоў па Заходняму Бугу з Галіцкай Русі і Валыні, другі — па Мухаўцу, Валоні, Піне, Прыпяці, Дняпры і звязваў Бярэсце з Кіевам, Прычарнамор'ем і Блізкім Усходам.

Упершыню Бярэсце ўпамінаецца пад 1019 г. («Аповесць мінулых часоў»). Быў гандлёвым цэнтрам Старажытнарускай дзяржавы на мяжы з польскімі і літоўскімі ўладаннямі. У выніку пагранічнага становішча часта быў у цэнтры ваенных падзей. У 11 ст. належаў тураўскім, кіеўскім князям, з сярэдзіны 12 ст.— галіцка-валынскім. У 1020 г. захоплены польскім князем Баляславам Храбрым, у 1044 г. вернуты кіеўскім князем Яраславам Му[...]рым. Пра паходы на Бярэсце ўпамінае Уладзімір Манамах у сваім «Павучанні»: «...пасласта Берестию брата на головне, иде бяху Ляхове пожгли, той ту блюд город тих». У 1164 г. Бярэсцем завалодаў літоўскі князь Скірмунт. Горад не раз пераходзіў з рук у рукі, быў разрабаваны і разбураны. Але геаграфічнае становішча спрыяла яго адраджэнню і развіццю як гандлёвага і рамесніцкага цэнтра. Тут было пабудавана ўмацаванне для аховы гандлёвых караванаў, бралі мыту (пошліну) за правоз тавараў. У 13 ст. Берасцейская зямля знаходзілася пад пагрозай мангола-татарскага заняволення. У Іпацьеўскім летапісе ёсць [...]скоснае сведчанне пра бітву каля [...]: «Данилови же со братом пришедшу ко Берестью, и не возмогоста ити в поле смрада ради множества [...]ьеных». Летапісных звестак аб з[...] [...]нні горада у гэты час і яго заваяванні няма. У 2-й палавіне 13 ст. Бярэсцем валодаў валынскі князь Ула[...]імір Васількавіч, які пабудаваў у горадзе «столп камен» — высокую мураваную вежу. Паводле ўстаўной граматы другога валынскага князя Мсціслава Данілавіча ад 1289 г., гараджане Бярэсця плацілі яму падатак. Таго часу горад уяўляў сабою шчыльна забудаванае драўлянымі дамамі пасяленне, умацаванае землянымі валамі і частаколам з тоўстых бярвенняў. З ростам насельніцтва забудова вялася на прылеглых тэрыторыях.

У канцы 13 — 1-й палавіне 14 ст. Бярэсце імкнуліся захапіць літоўскія князі і польскія каралі. У 1319 г. горадам завалодаў вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Гедымін, але неўзабаве ўступіў яго валынскаму князю Андрэю Юр'евічу. Каля 1341 г. літоўскія князі зноў завалодалі Бярэсцем. У 1348 г. горад захапіў польскі кароль Казімір III, які ў 1366 г. заключыў дагавор з літоўскім князем Кейстутам, паводле якога Бярэсце адышло Вялікаму княству Літоўскаму. У 1379 г. на Бярэсце напалі тэўтонскія рыцары, разрабавалі і спалілі яго, але горад быў хутка адноўлены, стаў гандлёва-прамысловым цэнтрам Вялікага княства Літоўскага. У 1390 г. ён першым з беларускіх гарадоў атрымаў самакіраванне на аснове магдэбургскага права, якое не раз пацвярджалася (1408, 1511, 1554, 1580, 1607, 1614, 1661 гг.). У пачатку 15 ст. над горадам зноў навісла пагроза з боку Тэўтонскага ордэна. На тайнай нарадзе ў Бярэсці ў снежні 1409 г. польскі кароль Уладзіслаў II Ягайла і вялікі князь Літоўскі Вітаўт распрацавалі план сумеснага паходу супраць крыжакоў. Гараджане выставілі ім харугву (полк), якая гераічна змагалася ў бітве 1410 г. пад Грунвальдам. У 1500 г. горад разрабаваны войскамі крымскага хана Менглі Гірэя.

У 14—15 стагоддзях Бярэсце — адзін з буйнейшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага. Прывілеем 1441 г. ён афіцыйна аднесены да галоўных гарадоў княства. Быў цэнтрам рамяства і гандлю. Высокага ўзроўню дасягнулі апрацоўка дрэва, кавальскае, ювелірнае, ганчарнае, гарбарнае, шавецкае і іншыя рамёствы. Былі развіты земляробства і жывёлагадоўля, жыхары займаліся таксама рыбалоўствам, паляваннем, бортніцтвам. Мясцовыя купцы вывозілі ў Заходнюю Еўропу футра, скуры, лес, пянька, збожжа, прывозілі соль, цукар, паперу, сукно, шоўк і г. д. Праз Бярэсце ў Польшчу везлі тавары маскоўскія купцы. Тут праводзіліся кірмашы. У 1380 г. ў горадзе паявіўся гасціны двор. З 1413 г. Бярэсце — цэнтр Берасцейскага староства, якое ўвайшло ў склад Трокскага ваяводства, з 1520 г.— цэнтр павета Падляшскага ваяводства. У 1554 г. зацверджаны герб горада: на чырвоным полі замак у сутоку 2 рэк. З 1566 г.— цэнтр Берасцейскага ваяводства. Паводле звестак на той час, у Бярэсці каля 7 тыс. ж.; сярод іх на[...]зываюцца імёны муляраў, друкароў, дактароў, кавалёў, златнікаў, ювелі[...]шчыкаў, мечнікаў, бляхароў, шкляробаў, буднікаў, ганчароў, іголынікаў, шапачнікаў, 3 скамарохаў (Цыт, Герасім і Герман). Тут працавалі дойліды, майстры станковага і манументальнага жывапісу. У 1553 г. брэсцкі староста М. Радзівіл (Чорны) заснаваў у горадзе кальвінскі збор і друкарню, у якой у 1563 г. надрукавана Брэсцкая «Біблія». У 1569 г. адкрыта першая аптэка. У канцы 16 ст. ўзнікла праваслаўнае брацтва, пры ім у 1591 г.— школа. У Апісанні Берасцейскага староства 1566 г. ўпамінаюцца «шпіталь месцкій» і «шпіталь з касцёлам», друкарня, ратуша, Віленская брама, касцёл Барбары, кляштар з касцёлам (вул. Прэорская), мураваная царква і фарны касцёл (вул. Мікулінская), «двор владычны с царквою мурававай», цэрквы Троіцкая, Спаская і Чэснага Крыжа, царква і манастыр Раства, Сямёнаўскі манастыр і інш. Замак быў абкружаны сцяною з 5 вежамі (на адной з іх быў устаноўлены гадзіннік) і 3 уязнымі брамамі. На яго тэрыторыі былі цэйхгауз, 2 вадзяныя млыны, вадзяная лесапільня, піваварня, вадакачка, саляны склад, за сценамі замка — гандлёвая плошча, ратуша, прадмесці, дзе жылі мяшчане, рамеснікі, гарадская беднага. Усяго ў Бярэсці налічвалася 928 дамоў (пераважна драўляных). Вуліцы масцілі дрэвам (першыя звесткі пра іх брукаванне адносяцца да 1588 г.). У горадзе адбываліся важныя [...] [...]рычныя падзеі: праходзілі сеймы і з'езды беларускіх і літоўскіх феадалаў (1446, 1454, 1460, 1478, 1505, 1511, 1515, 1518 гг.).

Паводле Люблінскай уніі 1569 г. Бярэсце — у складзе Рэчы Паспалітай. У 1596 г. на царкоўным саборы, які праходзіў у горадзе, абвешчана Брэсцкая унія праз аб'яднанне на тэрыторыі Рэчы Паспалітай праваслаўнай і каталіцкай цэркваў.

У вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54 гг. су

I. Мікалаеўская царква 16—18 ст. Малюнак са старажытнага абраза.

1. Мемарыяльная капліца на Трышынскіх могілках. Чыгуннае ліццё. 19 ст.

...рацъ феадальна-прыгонніцкага ўціску, нацыянальных і рэлігійных ганенняў з боку шляхецкай Польшчы, за ўз'яднанне з Расіяй актыўна ўдзельнічалі і жыхары Берасця. Паўстанні гараджан 1648 і 1649 гг. былі бязлітасна задушаны, горад разбураны, загінула каля 2 тыс. чалавек. У 1659 г. ў Берасці заснаваны манетны двор, дзе ў 1664—66 гг. чаканілі дробныя медныя манеты (солиды) з выявай «Пагоні» — герба Вялікага княства Літоўскага. Ад прозвішча арандатара манетнага двара Ціта Лівія Бараціні манеты называлі таксама бараціпкамі. У 17 ст. горад быў месцам збору вайсковых канфедэрацый (1605, 1612 гг.), сейма Рэчы Паспалітай (1653 г.). На гравюры 1657 г. паказаны план і агульны выгляд тагачаснага горада. Цэнтр яго сфарміраваўся на востраве (цяпер цэнтральны востраў Брэсцкай крэпасці). Тут былі гандлёвая плошча з ратушай і крамамі, мураваныя будынкі кляштара езуітаў (1623 г., разбураны ў 1660 г., адбудаваны ў 1678 г.), базыльян (1629 г., пазней вядомы пад назвай Белы палац), бернардзінцаў (1... г.), а таксама уніяцкая царквы, спіталі і інш. За востравам, на берагах Буга і Мухаўца, знаходзіліся кляштары бернардзінак (з 1624 г. драўляны, з 17.. г. мураваны), трынітарыяў (1628 г., касцёл з 1651 г.), касцёл брыгітак (1621 г.). Амаль усе гэтыя будынкі разбураны пры будаўніцтве крэпасці.

У Паўночную вайну 1700—21 гг. Брэст-Літоўск захапілі (1706 г.) шведскія войскі і спустошылі яго. 2-я палавіна 17—1-я пал. 18 ст. ў гістарычным лёсе горада характэрны рэзкім эканамічным заняпадам, выкліканым працяглымі войнамі, голадам і эпідэміямі. Зменшылася колькасць жыхароў, аб'ём рамесніцкай вытворчасці і гандлю. Толькі ў 2-й пал. 18 ст. пачалося эканамічнае ўзнаўленне. Горад становіцца рачным портам. У 1770-я гады падскарбі надворны літоўскі А. Тызенгаўз заснаваў суконную фабрыку (7 ткацкіх станкоў). У канцы 18 ст. ў Брэст-Літоўску каля 3,5 тыс. ж. У 1792 г. тут была рэзідэнцыя Таргавіцкай канфедэрацыі — рэакцыйнага саюзу магнатаў і шляхты Рэчы Паспалітай, накіраванага на ліквідацыю прагрэсіўных рэформ Чатырохгадовага сейма 1788—92 гг. і Канстытуцыі 3 мая 1791 г.

Пасля ўз'яднання з Расіяй (1795 г.) Брэст-Літоўск — спачатку павятовы горад Слонімскай, потым Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У 1797 г. ў горадзе 623 дамы, з іх толькі 21 мураваны. Драўляная забудова была прычынай даволі частых пажараў: у 18[illegible] згарэла каля 160 дамоў, у 1822 г. [illegible] дамоў, у 1895 г. агонь знішчыў амаль палавіну забудовы.

З пачаткам Айчыннай вайны 1812 г. Брэст-Літоўск стаў арэнай ваенных дзеянняў, быў захоплены кавалерыйскімі часцямі напалеонаўскай арміі. 25 ліпеня часці 3-й рускай арміі пад камандаваннем генерал-маёра І. М. Шчарбатава вызвалілі горад.

Брэст-Літоўск у складзе Расійскай імперыі атрымаў магчымасць пашырыць свае сувязі з многімі яе губернямі. Хутка расла колькасць насельніцтва: у 1825 г. было каля 11 тыс., у 1845 г. каля 18 тыс. ж. У 1830-я гады на месцы старажытнага горада пабудавана Брэсцкая крэпасць. Было распрацавана некалькі праектаў, якія на аснове гістарычнай схемы прадугледжвалі далейшае развіццё планіроўкі і забудовы Брэст-Літоўска. Гэтыя планы не ажыццяўляліся. У 1860-я гады працавалі 5 тытунёвых фабрык, 8 заводаў па вырабу свечак, гарбарныя, шапачна-капялюшныя, мылаварныя, фарбавальныя і інш. майстэрні. У 1861 г. было 178 крам, 60 харчэўняў, 3 пастаялых і 2 заезныя двары, карчма, кандытарская. Пасля завяршэння будаўніцтва чыгунак Брэст — Варшава (1869 г.), Масква — Брэст (1871 г.), Кіеў — Брэст (1873 г.), Брэст — Гомель (1884 г.) горад стаў буйным чыгуначным вузлом. Паводле перапісу 1897 г. яго насельніцтва 46,6 тыс. чалавек. З 1865 г. дзейнічала чатырохкласная мужчынская прагімназія, з 1874 г. — прыватная бібліятэка, з 1885 г. — музычнае таварыства.

Горад інтэнсіўна забудоўваўся ў 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. Значна пашыралася яго тэрыторыя, ставіліся мураваныя жылыя і грамадскія будынкі. Цэнтральная частка фарміравалася ў межах сучасных вуліц Савецкай і Маскоўскай, дзе будаваліся пераважна двухпавярховыя мураваныя жылыя дамы з крамамі на першым паверсе. У цэнтры былі пабудаваны гасціны двор з крамамі (1842 г., не захаваўся), чыгуначны вакзал, мужчынская гімназія (1903 г., цяпер корпус педагагічнага інстытута), зімовы тэатр (пачатак 20 ст.), касцёл Святога Крыжа (1856 г.), Сімяонаўскі сабор (1862 г.), Мікалаеўская царква (1906 г.). Праводзілася добраўпарадкаванне і азеляненне горада. З ростам рабочага класа (у канцы 1890-х гадоў на прадпрыемствах, у рамесніцкіх майстэрнях было занята 4,1 тыс. рабочых) актывізавалася яго барацьба супраць бязлітаснай эксплуатацыі, за палітычныя і эканамічныя правы. Першыя выступленні пралетарыяту ў Брэсце адбыліся ў 1878 г. на цагельных заводах. У 1897 г. ў горадзе існавала тайнае таварыства рабочых і рамеснікаў. Першы сацыял-дэмакратычны гурток аформіўся ў канцы 19 ст. У Рэвалюцыю 1905—07 гг. дзейнічала Брэсцкая арганізацыя РСДРП, адбыліся выступленні рабочых і салдат. Палітычную работу сярод салдат гарнізона вяла Брэсцкая ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП. Яна кіравала выступленнямі салдат 1906 г.

Напярэдадні 1-й сусветнай вайны ў горадзе 53 тыс. ж., 30 дробных прадпрыемстваў і рамесных майстэрняў, 2 тэатры, кінематограф, музычна-драматычнае таварыства, чатырохкласнае і 6 прыходскіх двухкласных вучылішчаў, 2 гімназіі, прыватнае сямікла-



1. Мемарыяльная [illegible] на Трышынскіх могілках. Чыгуннае ліццё. 19 ст.

нае камерцыйнае вучылішча, таварыства выкладчыкаў, бібліятэка імя М. В. Гогаля, 2 урачы, 17 фельчараў і акушэрак.

У 1-ю сусветную вайну Брэст-Літоўск у ноч на 26.8.1915 г. акупіраваны нямецкімі войскамі. З 9(22).12.1917 г. да 3.3.1918 г. тут адбываліся мірныя перагаворы паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока. 3.3.1918 г. падпісаны Брэсцкі мірны дагавор. У лютым 1919 г. Брэст захоплены войскамі буржуазнай Польшчы. Тут дзейнічала падпольная камуністычная арганізацыя на чале з Я. Б. Быкіным. 1.8.1920 г. ў Брэст-Літоўск уступілі часці Чырвонай Арміі. Улада перайшла да Ваеннарэвалюцыйнага камітэта. 19.8.1920 г. горад зноў захоплены войскамі буржуазнай Польшчы. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Брэст-Літоўск у складзе Заходняй Беларусі адышоў да Польшчы. У 1921—39 гг.— цэнтр Палескага ваяводства.

Планіровачнае развіццё горада ішло ў заходнім напрамку. На тэрыторыі, абмежаванай сучаснымі вуліцамі Маскоўскай, Леніна, паркам імя 1 Мая, у 1922—39 гг. пабудаваны новы жылы раён (арх. Ю. Лісецкі). У цэнтральнай частцы горада узведзены шэраг грамадскіх будынкаў. У 1937 г. насельніцтва 31,2 тыс. чалавек. Працавалі чыгуначныя, кравецкія, зброевая і механічныя майстэрні, электрастанцыя, тытунёвая фабрыка, гарбарны завод акцыянернага таварыства «Познань», піваварны завод «Карона», лесапільныя заводы, млын. Страціў сваё значэнне разбураны расійскага рынку Дняпроўска-Бугскі канал і чыгуначны вузел. Занепад назіраўся і ў галіне асветы і культуры. Да 1939 г. ў Брэсце не было ніводнай беларускай школы. У 1936 г. з 18 агульнаадукацыйных школ — 10 ... ... (з іх ... ...асн...на ...) і 8 прыватных. З 5 гімназій толькі адна была дзяржаўная. Навучанне вялося ў асноўным на польскай мове. Працавалі гарадская бібліятэка і 3 кінатэатры. Матэрыяльнае становішча працоўных было цяжкім. У 1930—32 гг. колькасць беспрацоўных у горадзе павялічылася з 1,7 тыс. да 4,4 тыс. чалавек.

Амаль 20 гадоў працоўныя Заходняй Беларусі вялі барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. У 1921—22 гг. ёе ўзначальвала Камуністычная рабочая партыя Польшчы. У 1923 г. створаны Брэсцкі акруговы камітэт КПЗБ, у 1924 г.— брэсцкія акруговы і гарадскі камітэты КСМЗБ. Пад кіраўніцтвам камуністаў у 1922 г. баставалі рабочыя друкарняў горада, у 1923 г. — чыгуначнікі і рабочыя кравецкіх майстэрняў, тытунёвай фабрыкі, лесапільнага завода. 26.4.1925 г. адбылася дэманстрацыя рабочых у гонар 1 Мая, 21.2.1926 г. — буйная дэманстрацыя беспрацоўных. У 1927 г. створана падпольная друкарня ЦК КПЗБ. Летам 1928 і 1929 гг. баставалі рабочыя 3 лесапільных заводаў. 1930 год быў адзначаны буйнымі забастоўкамі чыгуначнікаў. Сярод актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху — С. А. Дубовік, З. Ф. Паплаўскі, Р. Л. Каплан, П. А. Руцкі, Л. А. Посік, П. М. Козел. У студзені 1927 г. тут адбыўся палітычны працэс 31-го, на якім былі прыгавораны да катаржных работ вядомыя дзеячы КПЗБ В. З. Харужая, З. Ф. Паплаўскі, Р. М. Калечык, Л. П. Герасімук і інш.

Калі 1.9.1939 г. Германія напала на Польшчу, Савецкі ўрад прыняў рашэнне ўзяць пад абарону насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. 17 верасня Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую граніцу, 22 верасня ўступіла ў Брэст. Жыхары горада з радасцю сустрэлі армію-вызваліцельніцу.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР пачалася работа па сацыялістычнай перабудове гаспадаркі Брэста, паляпшэнню эканамічных і культурных умоў жыцця працоўных. Як і ў іншых гарадах Заходняй Беларусі, у Брэсце было ліквідавана беспрацоўе. У пачатку 1940 г. ў горадзе дзейнічалі 24 прамысловыя прадпрыемствы, адноўлены рух па Дняпроўска-Бугскім канале. На 1.9.1940 г. працавалі 17 агульнаадукацыйных школ, педагагічны і чыгуначны тэхнікумы, 3 тэхнічныя вучылішчы. У 1940 г. пачаў дзейнічаць Рускі драматычны тэатр. Адкрываліся новыя медыцынскія і дзіцячыя ўстановы. З 4.12.1939 г. Брэст — абласны цэнтр БССР. У 1939 г. 41,4 тыс. жыхароў.

22.6.1941 г. Брэст і крэпасць адными з першых прынялі на сябе удар нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Упартыя баі ішлі на вуліцах горада. Блокіраваныя ворагам, нячасныя абаронцы крэпасці, якія больш за месяц у цяжкіх умовах блакады адбівалі атакі ворага. Нямецка-фашысцкія захопнікі ўстанавілі ў горадзе бязлітасны акупацыйны рэжым. Імі знішчаны больш за 34 тыс. грамадзян, знішчылі ўсе прадпрыемствы, культурна-асветныя ўстановы, 48,7 % жыллёвага фонду. У Брэсце дзейнічалі партыйнае, камсамольскае і антыфашысцкае падполле.

У выніку Люблінска-Брэсцкай аперацыі 28.7.1944 г. горад вызвалены войскамі 1-га Беларускага фронту (камандуючы Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі). 47 воінскім злучэнням і часцям нададзена ганаровае найменне «Брэсцкіх». Пачалося аднаўленне гаспадаркі горада. У першую чаргу наладзілі работу чыгункі. 2.8.1944 г. ў Брэст прыбыў першы эшалон. Уся краіна дапамагала брэстчанам. Быў адбудаваны чыгуначны мост цераз Заходні Буг. 1.9.1944 г. пачалі працаваць школы, дзіцячыя сады, бальніцы. У кароткі тэрмін наладжана энерга- і водазабеспячэнне, поўнасцю здадзены ў эксплуатацыю чыгуначны вузел, порт і Дняпроўска-Бугскі канал. У першыя пасляваенныя гады рэканструяваны і пабудаваны новыя прамысловыя прадпрыемствы, шмат увагі аддавалася жыллёваму будаўніцтву, рабоце культурна-асветных устаноў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Брэст адбудоўваўся паводле генеральнага плана, распрацаванага ў 1948 г. ў інстытуце «Белдзяржпраект». Захоўваецца гістарычная схема планіроўкі, ствараюцца прамысловыя і новыя жылыя раёны, удасканальваюцца транспартныя сувязі. Галоўныя магістралі — вул. Леніна (поўнач — поўдзень), якая злучыла Прывакзальную пл. з набярэжнай р. Мухавец, і вул. Маскоўская (захад — усход) ад Брэсцкай крэпасці да Мінскай шашы. Рэ

I. Забудова вуліцы Савецкай

1. Бульвар Шаўчэнкі. Від з боку р. Мухавец.

канструяваны вуліцы Пушкінская, Савецкая, Камсамольская, Дзяржынскага. Тут у 1951—57 гг. пабудаваны жылыя дамы (арх. А. Сувораў, З. Леўчанка). Добраўпарадкавана Прывак- [illegible]

тарадыягальная (арх. А. Гарбачоў, З. Леўчанка, А. Сувораў, Р. Шылай, А. Шкляр). Узведзены грамадскія будынкі ў цэнтральнай частцы горада: універмаг (1965 г.), швейнае атэлье [illegible]

Шаўчэнкі. У 1962—65 гг. устаноўлены бюсты М. В. Гогаля і А. Міцкевіча. У 1965 г. ў скверы на пл. Свабоды ўзведзены помнік Вызвалення. У 1960-я гады закончана [illegible]

вальны цэнтр — помнік У. І. Леніну. У заходняй частцы плошчы будынкі Ленінскага райкома КПБ і райвыканкома, аблвыканкома, банка, у паўднёвай — Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. Усходняя частка плошчы забудавана ў 1961—63 гг. (будынак аблсаўпрофа, шматкватэрныя жылыя дамы з гандлёвымі і грамадскімі ўстановамі на першых паверхах; арх. Р. Будзько, З. Лёўчанка, І. Маскалевіч, А. Суворау). У планіровачнай структуры горада важнае месца займае афармленне набярэжнай р. Мухавец. На вул. Набярэжнай склаўся выразны архітэктурны ансамбль жылых дамоў. Цэнтр кампазіцыі — два 9-павярховыя жылыя дамы (1961 г., арх. А. Гарбачоў, Р. Шылан), якія архітэктурна афармілі ўезд у горад з захаду. У ансамбль уваходзяць шырокі сквер на беразе Мухаўца, 12-павярховыя жылыя дамы, якія стварылі выразны сілуэт забудовы.

Новы генплан, распрацаваны ў 1965 г. ў «Белдзяржпраекце», прадугледжвае далейшае развіццё горада ва ўсходнім напрамку. У 1960—70-я гады тут пабудаваны прамысловы вузел: дыванова і панчошны камбінаты, электраламповы і электрамеханічны заводы і інш. Разам з прамысловым вузлом з 1967 г. вядзецца забудова новага жылога раёна Усход (арх. В. Анікін, А. Кудзінецкі, Н. Лагуноўская), які ўключае 7 мікрараёнаў і грамадскі цэнтр. На Партызанскім пр. пабудаваны ансамбль 9-павярховых жылых дамоў, Палац культуры (у парку адпачынку), на вул. Маскоўскай — студэнцкі гарадок Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. У цэнтральнай частцы горада новыя будынкі гасцініцы «Беларусь» (1971 г., арх. З. Лёўчанка), музычнай школы (1973 г., арх. Р. Шылай), абкома камсамола (1974 г., арх. Р. Будзько), абкома партыі, вытворча-тэхнічнага упраўлення сувязі (1975 г.) і кінатэатра «Беларусь» (1977 г.), сфарміраваны новы культурна-бытавы цэнтр. Узведзены 10-павярховая гасцініца «Інтурыст», Дом гандлю. Цэнтр забудовы — чатыры 10-павярховыя жылыя дамы (арх. Р. Будзько, Л. Маскалевіч, А. Суворау), новыя 9-павярховыя 200-кватэрныя жылыя дамы з магазінамі (арх. В. Анікін, А. Ляшук, Р. Шылай). У пачатку вуліцы Маскоўскай афармлены цэнтральны ўезд у Брэсцкую крэпасць, дзе ў 1971 г. адкрыты мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

У 1975 г. Беларускім дзяржаўным навукова-даследчым і праектным інстытутам горадабудаўніцтва закончана карэкціроўка генплана, паводле якога Брэст, акрамя ўсходняга, атрымлівае тэрытарыяльнае развіццё і ў паўднёвым напрамку. Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр, які склаўся на пл. Леніна, развіваецца па вул. Леніна, дзе ўзведзены будынак вылічальнага цэнтра. Планіровачная структура горада складаецца з 4 раёнаў (цэнтральны, усходні, паўднёвы і паўночны). У кожным, акрамя жылля, арганізоўваюцца культурна-бытавыя цэнтры, зоны адпачынку, прадугледжваюцца зручныя транспартныя сувязі з прамысловымі прадпрыемствамі.

1. *Плошча Леніна*

Сучасны Брэст — адзін з буйных прамысловых цэнтраў рэспублікі. На яго долю прыпадае 1/4 валавой прадукцыі вобласці. Значнае месца ў прамысловай структуры горада займаюць электрапрыладабудаванне (электраламповы і электрамеханічны заводы), машынабудаванне і металаапрацоўка (заводы газавай апаратуры, аўтарамонтны, металавырабаў, сельскагаспадарчага машынабудавання). Шырока вядомы прадпрыемствы лёгкай прамысловасці: дываново-суконнае аб'яднанне (дывановы камбінат і суконная фабрыка), панчошны камбінат, фабрыкі верхняга трыкатажу, абутковая, швейная, сувеніраў і інш., прамысловасці будаўнічых матэрыялаў (камбінаты будаўнічых матэрыялаў і домабудаўнічы, заводы жалезабетонных вырабаў, зборнага жалезабетону і інш.), дрэваапрацоўчай (мэблевая фабрыка), хімічнай (завод бытавой хіміі), харчовай (мясакамбінат, малочны і хлебапрадуктаў камбінаты, хлебазавод, піваварна-вінаробчы, лікёра-гарэлачны, віна-сокавы заводы і інш.).

Брэст — буйны транспартны вузел знешнегандлёвых сувязей СССР з краінамі Захаду. Тут сыходзяцца важнейшыя чыгуначныя і аўтамабільныя магістралі саюзнага значэння. Чыгуначны вузел поўнасцю рэканструяваны, механізаваны Брэсцкі рачны порт.

На 1.1.1981 г. ў Брэсце 2 ВНУ (педагагічны імя А. С. Пушкіна і інжынерна-будаўнічы інстытуты), 4 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (будаўнічы і чыгуначнага транспарту тэхнікумы, медыцынскае і музычнае вучылішчы), 5 прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, 29 агульнаадукацыйных школ, 51 дзіцячая дашкольная ўстанова. Працуюць абласныя тэатры (драматычны імя Ленінскага камсамола, лялек), 30 клубных устаноў, 24 кінаўстаноўкі, 90 масавых бібліятэк, музей абароны Брэсцкай крэпасці-героя і абласны краязнаўчы, абласныя аддзяленні Саюза архітэктараў БССР, Саюза журналістаў БССР, Саюза мастакоў БССР, Саюза пісьмен

1. *Панарама забудовы уздоўж р. Мухавец*

I. *Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі*

I. *Гасцініца «Беларусь»*

ніка БССР. Дом народнай творчасці, народны тэатр і народная харавая капэла клуба чыгуначнікаў, народная харавая капэла настаўнікаў, народны ансамбль песні і танца «Брастчанка», народны ансамбль песні і танца «Прыбужжа», народны гарадскі ансамбль танца «Радасць», народны хор аблсаўпрофа, народны духавы аркестр электрамеханічнага завода. Выходзяць абласная газета «Заря» і раённая «Заря над Бугом». Працуюць абласныя радыевяшчанне і студыя тэлебачання.

У горадзе 10 бальнічных і 30 амбулаторна-паліклінічных устаноў і кансультацый (у т. л. 6 дыспансераў), 15 фельчарскіх пунктаў, санітарна-эпідэміялагічная станцыя, 10 апте… Дом санітарнай асветы.

Уздоўж р. Мухавец ствараецца паркавая зона. На паўднёвы ўсход ад Бреста на азёрах Белае, Рагазнянскае, Чорнае — турысцкія базы, дамы адпачынку.

Літ.: Белогорцев И. Д. Развитие западных городов Белоруссии (Методический материал в помощь лектору). Брест, 1971; Белоруссия и Литва: Исторические судьбы Северо-Западного края. СПб., 1890; Бескровный Л. Г. Отечественная война 1812 года.— М., 1968; Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1.— Мн., 1936; Зонненберг Х. История города Брест-Литовска. 1016—1907.— Варшава, 1908; Науменко В. Я. Брест: Историко-экономический очерк.— Мн., 1973; Рашевский Н. А. Брестская область: Белорусская ССР. 2 изд.— Мн., 1975; Саркисов П., Горбачев А., Кузнецова С. Бресту — 950 лет.— Архитектура СССР, 1960, № 8.

М. І. Алексяюк, І. Д. Белагорцаў, В. Б. Караткевіч, А. Д. Кудзі…, Г. І. Чар…

I. АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ БУДЫНАК (архіт., гіст.). На скрыжаванні вуліц Будзённага і 17 Верасня (вул. Будзённага, 41). Пабудаваны ў 1920-я гады і цэглы як будынак гарадскога суда. Цяпер у ім размешчана ўпраўленне юстыцыі Брэсцкага аблвыканкома.

Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак. Галоўны ўваход з вул. Будзённага вылучаны рызалітам, завершаным прамавугольным атыкам. Фасады раскрапаваны спаранымі лапаткамі і радамі гарызантальных паясоў. Фасад на вул. 17 Верасня сіметрычны, фланкіраваны рызалітамі. Унутраная планіроўка калідорная. У ёй вылучаецца прамавугольная зала пасяджэнняў. Дзве міжпаверховыя лесвічныя клеткі размешчаны па вуглах дваровага фасада.

10—17.1.1927 г. ў будынку адбыўся палітычны працэс над 31 членам КПЗБ (працэс 31-го). Каб задушыць рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, польскія буржуазныя ўлады ў ноч на 7.11.1925 г. правялі ў Брэсце і навакольных вёсках масавыя арышты. За краты трапіла каля 200 членаў КПЗБ і спачуваючых. 31 член КПЗБ прыцягнуты да судовай адказнасці. Сярод іх В. З. Харужая

З. Ф. Паплаўскі, Л. П. Герасімук, Р. М. Калепік, Х. Д. Шэрцман, Ф. С. Строкач і інш.

В. З. Харужая была накіравана на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь у лютым 1924 г. Адважная падпольшчыца распаўсюджвала нелегальную партыйную літаратуру, арганізоўвала камсамольскія канферэнцыі і сходы, выступала на мітынгах, пісала адозвы і артыкулы для падпольных газет, арганізавала выданне газеты ЦК КСМЗБ «Малады камуніст». У чэрвені 1924 г. выбрана сакратаром ЦК КСМЗБ, членам ЦК КПЗБ і ЦК камсамола Польшчы. У верасні 1925 г. у час падрыхтоўкі Беластоцкай акруговай канферэнцыі КПЗБ арыштавана.

Працэс 31-го выліўся ў пратэст падсудных і працоўных горада супраць буржуазна-памешчыцкага ладу. Пасля абвяшчэння прыгавору (В. З. Харужая, З. Ф. Паплаўскі, Л. П. Герасімук, Х. Д. Шэрцман, А. Х. Раф — 6 гадоў зняволення, Ф. С. Строкач — 5, астатнія — 4 гады) асуджаныя заспявалі «Інтэрнацыянал».

У 1965 г. на будынку, дзе адбыўся працэс, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: У суровыя гады падполля: Успаміны былых членаў КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Мн., 1958.

І. Б. Ватковіч, А. М. Кулагін

2. АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ БУДЫНАК (архіт.). Вул. Леніна, 11. Пабудаваны ў 1938 г. з цэглы як ваяводскае ўпраўленне. Цяпер будынак аблвыканкома. Чатырохпавярховы аб'ём меў спачатку прамавугольную форму з выступаючымі на галоўным і дваровым фасадах цэнтральнымі рызалітамі. У 1960 г. прыбудавана чатырохпавярховае крыло, якое надало плану Г-падобную форму. Цэнтральная частка на ўсю вышыню будынка вылучана пілонамі. Перад уваходам — дэкаратыўныя газоны. Першы паверх аддзелены ад верхніх шырокім гарызантальным поясам. Рыфленая тынкоўка сцен прарэзана рустам. Планіроўка калідорная з двухбаковым размяшчэннем памяшканняў. Прастора вестыбюля члянíцца 2 радамі круглых абліцаваных штучным чорным мармурам калон. Шырокая трохмаршавая лесвіца ў вестыбюлі вядзе на другі паверх, дзе размешчана зала пасяджэнняў. Ніжняя частка сцен цэнтральнага хола і парэнчаў лесвіцы абліцавана мармурам карычневых таноў. Сцены хола другога паверха і вестыбюля руставаныя. Столь залы пасяджэнняў расчлянёна глыбокімі кесонамі.

Будынак помнік грамадзянскай архітэктуры, створаны пад уплывам канструктывізму. *А. А. Міцкевіч*

3. АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ БУДЫНАК (архіт.). Вул. Энгельса, 3. Узведзены ў 1977 г. (арх. Р. Шылай, інж. Г. Кароль, І. Дулайка) як будынак абкома КПБ. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя ствараецца на кантрастным процістаўленні высокага 8-павярховага Г-падобнага ў плане корпуса і нізкага шматграннага аб'ёму залы пасяджэнняў на 520 месцаў. Галоўны фасад з высокім абліцаваным цёмным паліраваным гранітам цокалем арыентаваны ў бок плошчы Леніна. Яго рытм ствараецца пілонамі з алюмініевымі рэбрамі на ўсю вышыню будынка і чаргаваннем аконных праёмаў. Асноўны корпус мае калідорную сістэму планіроўкі. Зала пасяджэнняў далучана да кароткага крыла, мае выхад ва ўнутраны дворык адпачынку. У дэкаратыўнай аздобе інтэр'ера выка

1. Адміністрацыйны будынак. План 1-га паверха

1. Адміністрацыйны будынак

2. Адміністрацыйны будынак на вуліцы Леніна

3. Адміністрацыйны будынак на вуліцы Энгельса

4. *Ансамбль жылых дамоў на бульвары Касманаўтаў*

4. *План 1-га паверха жылога дома № 96 на бульвары Касманаўтаў*

рыстаны граніт, мармур, мастацкі паркет, дэкаратыўная тынкоўка. У парадным вестыбюлі першага паверха ўстаноўлены бюст У. І. Леніна.

Будынак — узор новага тыпу адміністрацыйных збудаванняў савецкай архітэктуры. *Т. І. Чарняўская*

4. АНСАМБЛЬ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ (архіт.). Бульвар Касманаўтаў. Сфарміраваны ў 1979 г. (арх. Р. Шылай, А. Казюкоў, Р. Будзько) з 3 аднолькавых па свайму архітэктурна-планіровачнаму вырашэнню 9-паверхowых дамоў (№ 92, 94, 96), аб'яднаных аднапавярховымі блокамі гандлёва-бытавых устаноў. Кожны 60-кватэрны дом складаецца з 2 аб'яднаных лесвічна-ліфтавым вузлом карпусоў. Тыпавыя паверхі карпусоў уключаюць аб'яднаныя вакол калідора кватэры з утульнымі жылымі пакоямі, прасторнымі кухнямі, убудаванымі шафамі, балконамі ці лоджыямі. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя ансамбля ствараецца кантрастным процістаўленнем высокіх і нізкіх аб'ёмаў. Сцены жылых будынкаў абліцаваны керамічнай пліткай цёмна-ружовага колеру.

Ансамбль — прыклад новага аб'ёмна-прасторавага вырашэння магістральнай забудовы галоўных вуліц жылымі дамамі. *Т. І. Чарняўская*

5. АНСАМБЛЬ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ (архіт.). Вул. Набярэжная. Сфарміраваны ў 1978 г. (арх. Р. Шылай, інж. С. Мартынаў, І. Дунайка) з 3 аднолькавых 12-павярховых дамоў (№ 28, 32, 38), да першых паверхаў якіх прыбудаваны аднапавярховыя карпусы грамадскіх і гандлёва-бытавых устаноў (прадуктовы магазін, бібліятэка, Дом шлюбу).

Планіровачная структура жылых дамоў вырашана блакіроўкай 2 жылых карпусоў на 55 кватэр кожны з выхадам на лесвічную клетку з 2 ліфтамі. На кожным паверсе 10 кватэр (па 5 у кожным корпусе) палепшанай планіроўкі. Пластыку фасадаў ствараюць вертыкальныя канструкцыйныя рабры, а таксама размешчаныя ў шахматным парадку балконы і лоджыі. Фасады абліцаваны светлай керамічнай пліткай.

Ансамбль — прыклад комплексу жылых дамоў, характэрных для новых мікрараёнаў. *Т. І. Чарняўская*

6. АСАБНЯКІ ГАРАДСКІЯ (архіт.). Пабудаваны ў 1-й палавіне 19 ст. з цэглы, маюць аналагічную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, вызначаюць фронт забудовы вул. А. Міцкевіча.

6а. Асабняк на скрыжаванні вуліц А. Міцкевіча і Камсамольскай, 23/20. У ім размешчана адміністрацыйная ўстанова. Цэнтральная частка двухпавярховая з двухсхільным дахам, 2 бакавыя — аднапавярховыя з вальмавымі дахамі

5. *Жылы дом на вуліцы Набярэжнай, 32.*

5. *План 2-га паверха жылога дома № 32 на вуліцы Набярэжнай*

Галоўны (паўднёвы) фасад вылучаны чатырохкалонным порцікам з драўляным трохвугольным франтонам над уваходам. На 2-м паверсе на ўсю шырыню порціка балкон з драўлянай балюстрадай. Дваровы фасад аформлены 4 паўкалонамі, якія адпавядаюць камлазіцы порціка галоўнага фасада. Вонкавы дэкор: руставаны цокаль, прафіляваны карніз і сандрыкі над прамавугольнымі аконнымі праёмамі. У цэнтры 1-га паверха быў вестыбюль, да якога прылягалі жылыя памяшканні, на 2-м — парадная зала і пакоі (унутраная планіроўка часткова зменена). Будынак мае цокальны паверх.

6б. Асабняк на скрыжаванні вул. А. Міцкевіча і Савецкай, 26/13. У ім размешчана медыцынская ўстанова. Мае сіметрычную кампазіцыю: цэнтральная частка двухпавярховая, 2 бакавыя — аднапавярховыя. Галоўны фасад вылучаны чатырохкалонным порцікам з франтонам і балконам. Уваход на лесвіцы, прыбудаванай да тарца. Унутраная планіроўка зменена.

Асабнякі — помнікі жылой архітэктуры з рысамі класіцызму.

Т. І. Чарняўская

7. БЕРАСЦЕЙСКАЕ ГАРАДЗІШЧА (археал.). На тэрыторыі Валынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. У час будаўніцтва крэпасці рэльеф мясцовасці зменены, зніклі прыкметы, характэрныя для гарадзішчаў старажытнарускіх гарадоў. Таму пытанне аб месцы размяшчэння старажытнага Берасця доўгі час было нявырашаным. Выявіў у 1969 г. і даследаваў на працягу 1969—81 гг. П. Ф. Лысенка. Раскопкамі 1969—70 гг. было [illegible] меркаванне, што дзядзінец старажытнага Берасця знаходзіўся на мысе, утвораным правым берагам Заходняга Буга і левым берагам левага рукава Мухаўца. Шурфы і раскопы, закладзеныя каля падножжа гарадзішча і на паверхні пяцівугольнага бастыёна, выявілі культурны пласт (да 7 м) старажытнага горада. Трохвугольная форма гарадзішча, рэшткі абарончага рова з боку поля, археалагічныя знаходкі сведчаць аб тым, што дзядзінец знаходзіўся менавіта на мысе і яго рэшткі пры будаўніцтве крэпасці былі выкарыстаны як падножжа бастыёна. Культурны пласт дзядзінца мае высокую вільготнасць і добра захаваў рэшткі арганічнага і неарганічнага паходжання. Пры раскопках выяўлены рэшткі жылых і гаспадарчых пабудоў, насцілы ў дварах, паркалы. На плошчы раскопу (26×54 м) ускрыта 4 паралельныя вуліцы, накіраваныя з усходу на захад; вулічны насціл з тоўстых колатых дошчак на падоўжных падваліннах, над якімі ляжалі папярок бярвенні. Асноўным планіровачным элементам былі вуліцы. У 1969—81 гг. выяўлена больш за 200 пабудоў 12 будаўнічых ярусаў. Усе тыпу наземных аднакамерных будынкаў зрубнай канструкцыі, квадратныя ў плане. Даўжыня сцен жылых пабудоў 3,2—6 м, гаспадарчых — 2,6—3,4 м. У жылых (часам і гаспадарчых) будынках падлога з дошак, печы глінабітныя і з выкарыстаннем цэглы. Забудова шчыльная. Ёсць пабудовы, у якіх захавалася па 12 вянкоў зруба. У 3 будынках цалкам зберагліся дзвярныя праёмы. Меткі-насечкі на сценах некаторых пабудоў сведчаць аб тым, што будынкі перанесены на пастаяннае месца пасля ўзвядзення зруба.

У культурным пласце знойдзены прылады працы (нарог сахі, сярпы, косы, акоўка рыдлёўкі, нажы, нажніцы, ліцейная формачка, жорны, драўляная важная ступа і інш.), прадметы ўзбраення, амуніцыя коніка і збруя (фрагмент пласціністых даспехаў, наканечнікі коп'яў, стрэл, шпоры, фрагменты стрэмя і цугляў, ка



6а. *Гарадскі асабняк. План 1-га паверх*



6а. *Гарадскі асабняк. Галоўны фасад*

7. *Берасцейскае гарадзішча. Схема размяшчэння дзядзінца*

7. *Берасцейскае гарадзішча. Рэшткі пабудой 13 ст.*



7. З раскопак Берасцейскага гарадзішча: рэчы гаспадарчага прызначэння, самшытавы грабеньчык з алфавітам, вязаная рукавіца, бранзалеты.

валы кальчугі, крыжавіна мяча), рэчы бытавога прызначэння (замкі і ключы да іх, крэсівы, дзвярныя кольцы і прабоі, клямкі і інш.), жаночыя ўпрыгожанні (бранзалеты, падвескі, спражкі, заходнелітоўская фібула, біконныя калт), Шмат вырабаў з дрэва (вёслы, абады і спіцы ад колаў, часткі санак, ткацкага станка, верацёны, лыжкі, кавалкі посуду і інш.), скуры (пожны, футаралы, кашалькі, абутак). Найбольш цікавыя знаходкі — самшытавы грабеньчык з выразанымі на абодвух баках літарамі кірыліцы ад А да Л (напісанне, характэрнае для пачатку 13 ст.), запоўненая фарбай касцяная пласцінка, накіпталт мастацкага мастака, вязаная шарсцяная рукавічка. Гарадзішча датуецца 11—13 стагоддзямі. Упершыню ў СССР раскапаныя пабудовы закансерваваны (1971 г.) у палявых умовах. Кансервацыя вялася пад кіраўніцтвам прафесара В. Я. Віхрова. На аснове выяўленай забудовы на тэрыторыі старажытнага Берасця створаны археалагічны музей.

Літ.: Лысенко П. Ф. Города Туровской земли. — Мн., 1974; яго ж. Раскопкі Берасця — Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1971, № 1; яго ж. Раскопки древнего Берестья. — У кн.: Археологические открытия 1969 года. М., 1970; яго ж. Археологическое изучение древнего Берестья. — У кн.: Тезисы докладов [illegible] IV Международном конгрессе славянской археологии [illegible], сент. 1980 г. М., 1980; Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 2. Мн., [illegible]. П. Ф. Лысенка.

8. БРАЦКАЯ МАГІЛА БУДАЎНІКОЎ КАНАЛА (гіст.). На беразе р. Мухавец, каля шлюза Дняпроўска-Бугскага канала. Пахаваны галоўны інжынер будаўніцтва канала Р. І. Шыфрын, начальнікі атрадаў І. І. Абрадзін і У. М. Кудыш, галоўны інжынер атрада Л. К. Папоў і начальнік ахоўы гідравузла І. М. Бачкоў, якіх у кастрычніку — лістападзе 1944 г. забілі ворагі Савецкай улады. У 1945 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Літвін А. М. Дняпроўска-Бугскі... — Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1977, № 4. А. С. Барысаў.

9. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Вул. Маскоўская, на Трышынскіх могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі 7.7.1945 г. ў барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады. У 1945 г. на магіле пастаўлены 3 абеліскі.

10. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У [illegible] Рэчыца. Пахаваны 88 савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёсак Рэчыца і Клейнікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

11. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўднёвай ускраіне горада, у скверы. Пахаваны воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1[illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

12. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Леніна, у гарадскім парку імя 1 Мая. Пахаваны 72 воіны і сакратар Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б Іван Іванавіч Баброў, якія загінулі у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Васіль Іванавіч Аляксандраў, Сяргей Нікіфаравіч Бамбураў, Віктар Аляксандравіч Малясаў, Павел [illegible] Матвееў, Сямён Нікіфаравіч Мірвода, Валянцін Ягоравіч Ситноў, Георгій Ільіч Скрыпнікаў, Міхаіл Міхайлавіч Сцяжкін, Абрам Ісакавіч Тарнапольскі, Аляксандр Ігнатавіч Ш[illegible].

12. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.

В. І. Аляксандраў нарадзіўся 7.4.1919 г. у в. Загор'е Удомельскага р-на Калінінскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1943 г. У Вялікую Айчынную вайну з верасня 1941 г. на Паўднёвым, Крымскім, Паўднёва-Усходнім, [illegible], Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным, 1-м Беларускім франтах. Гвардыі старшы сяржант В. І. Аляксандраў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і ў баях за вызваленне Брагінскага р-на Палескай вобл. (верасень 1943 г.). Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г. Загінуў у баі 29.7.1944 г.

І. І. Баброў нарадзіўся ў сакавіку 190[illegible] г. у в. Малыгіна Калінінскага р-на [illegible] вобл. Член КПСС з [illegible] гг. рабочы [illegible] на партыйнай рабоце у Ленінградзе. У 1940 г. скончыў Вышэйшую школу партарганізатараў пры ЦК ВКП(б). З сакавіка 1940 г. загадчык прамысловага аддзела, з сакавіка 1941 г. сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на Заходнім фронце, палітработнік, з ліпеня 1942 г. ў Цэнтральным штабе партызанскага руху, з лістапада 1942 г. ў распараджэнні Беларускага штаба партызанскага руху, з сакавіка 1943 г. намеснік упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба на Брэ[illegible] сакратар Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б. Загінуў [illegible] у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у в. Бялавічы Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.

С. Н. Бамбураў нарадзіўся 10.9.1914 г. ў с. Варашылава Севернага р-на Арэнбургскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1938 г. У Чырвонай Арміі з 1936 г. У жніўні 1938 г. ў баі супраць японскіх захопнікаў каля воз. Хасан праявіў мужнасць і адвагу, вывеў з варожага акружэння [illegible]. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 25.10.1938 г. У 1941 г. скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Ленінградскім і 1-м Беларускім франтах, намеснік камандзіра палка па палітчасці, з лістапада 1944 г. камандзір палка. Загінуў 6.2.1945 г. ў баі за г. Гнезна (ПНР).

В. А. Малясаў нарадзіўся 4(17).11.1917 г. у Ташкенце. З рабочых. Член КПСС з 1942 г. У 1942 г. скончыў Ташкенцкае пяхотнае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 г. на Заходнім, Цэнтральным, Бранскім, 1-м Беларускім франтах, капітан. 28.9.1943 г. ў час баёў за вызваленне Брагінскага р-на Палескай вобл. батальён пад камандаваннем В. А. Малясава першым фарсіраваў



13. *Брацкая царква. План*

13. *Брацкая царква. Фрагмент бакавога фасада*

13. *Брацкая царква. Галоўны фасад*

Дняпро, захапіў плацдарм і ўтрымліваў яго, пакуль пераправіліся іншыя падраздзяленні палка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г. Удзельнік фарсіравання Прыпяці, Заходняга Буга, вызвалення Брэста. Загінуў у баі 17.10.1944 г. на тэрыторыі Польшчы.

П. Я. Мацвееў нарадзіўся ў 1915 г. ў в. Паляпскае Саспоўскага р-на Горкаўскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1940 г. У Чырвонай Арміі з 1937 г. Скончыў ваеннае авіяцыйнае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1941 г., камандзір атрада авіяпалка далёкага дзеяння. Зрабіў 200 начных баявых вылетаў, бамбіў ваенныя аб'екты і аэрадромы праціўніка ў Польшчы і Германіі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 13.3.1944 г. Загінуў у баі 9.4.1945 г.

С. П. Мірвода нарадзіўся ў 1904 г. ў г. Піраціп Палтаўскай вобл. Член КПСС з 1928 г. У Чырвонай Арміі з 1926 г. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Крымскім, Сталінградскім і 2-м Украінскім франтах. У пачатку сакавіка 1944 г. ў баях на подступах да г. Умань камандзір танкавай брыгады палкоўнік С. П. Мірвода паказаў прыклад мужнасці і адвагі, быў паранены. 18.3.1944 г. з групай танкаў і аўтаматчыкаў фарсіраваў Днестр. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 12.5.1944 г. Загінуў у баі 3.8.1944 г. на тэрыторыі Польшчы.

В. Я. Сітноў нарадзіўся 5.12.1918 г. ў с. Сырасева Дзівееўскага р-на Горкаўскай вобл. З сялян. У 1938 г. скончыў Дзяржынскі хімічны тэхнікум, у 1939 г. авіявучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 г., камандзір эскадрыллі бамбардзіровачнай авіяцыі. Зрабіў 222 баявыя вылеты. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 20.6.1942 г. У 1943 г. збіты ў баі, паранены, трапіў у палон. Быў у канцлагерах Асвенцім, Бухенвальд. У красавіку 1945 г. ўдзельнічаў у паўстанні вязняў Бухенвальда. Пасля вызвалення ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Загінуў 20.12.1945 г. пры выкананні службовых абавязкаў.

Г. І. Скрыпнікаў нарадзіўся 1.5.1908 г. ў с. Султан Курсаўскага р-на Стаўрапольскага краю. З сялян. Член КПСС з 1942 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г., камандзір стралковага батальёна. У ліпені 1944 г. батальён пад камандаваннем капітана Г. І. Скрыпнікава першым фарсіраваў Заходні Буг, захапіў плацдарм, адбіў 7 контратак праціўніка, пад Брэстам разграміў каля 2 варожых батальёнаў. Быў паранены, але не пакінуў поля бою. Загінуў 15.8.1944 г. ў баі пад Варшавай. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

М. М. Спяжкін нарадзіўся 12.11.1920 г. ў с. Улалушка Маймінскага р-на Горна-Алтайскай аўтаномнай вобл. Член КПСС з 1942 г. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942 г., камандзір гарматы, сяржант. 28.6.1944 г. каля в. Княжыцы Магілёўскага р-на агнём з гарматы адбіў контратаку ворага, знішчыў некалькі гармат і аўтамашын, нанёс страты жывой сіле праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.8.1944 г. Загінуў 24.12.1944 г. ў баі на тэрыторыі Польшчы.

А. І. Тарнапольскі нарадзіўся 28.2.1912 г. ў г. Ножын Чарнігаўскай вобл. ў сям'і служачых. Член КПСС з 1943 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942 г. 28.9.1943 г. пры вызваленні Брагінскага р-на Палескай вобл. батальён пад камандаваннем гвардыі капітана А. І. Тарнапольскага фарсіраваў Дняпро, захапіў плацдарм, адбіў контратаку праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г. Гвардыі маёр А. І. Тарнапольскі загінуў 27.7.1944 г. ў баі за вызваленне Брэста.

А. І. Уласавец нарадзіўся 26.7.1901 г. ў в. Лапацічы Слуцкага р-на Мінскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1925 г. У Грамадзянскую вайну партызан у Слуцкім пав. З 1922 г. ў Чырвонай Арміі. У 1928 г. скончыў Ленінградскую школу ваенных зносін. З ліпеня 1942 г. на Сталінградскім, Сцяпным, 2-м Украінскім франтах, камандзір стралковага палка, гвардыі падпалкоўнік. 26.9.1943 г. полк пад камандаваннем А. І. Уласаўца фарсіраваў Дняпро ў раёне Новы Орлік — Барадаеўка Днепрапятроўскай вобл., захапіў плацдарм, нанёс ворагу вялікія страты. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.10.1943 г. Загінуў 23.1.1945 г. пры вызваленні Польшчы.

У 1945 г. на брацкай магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Навечно в сердце народном.— 3 изд.— Мн., 1984. *В. В. Караткевіч*

13. БРАЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Вул. Савецкая, 10. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з цэглы. Цяпер у будынку размешчаны Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобл.

Пабудова крыжова-купальная з пяцігранная апсідай, ў дэкоры выкарыстана форма какошніка. У кампазіцыі будынка дамінуе высокая шатровая званіца з галоўкай на васьмігранным барабане. Над цэнтральным аб'ёмам пяцікупалле. Цэнтральны шлемападобны купал — на цыліндрычным барабане. Галоўны ўваход вылучаны шырокім ганкам з трохпралётнай аркадай.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ— ГЕРОЙ



- Галоўны ўваход
- Усходняя частка галоўнага вала. Казематы
- Скульптурная кампазіцыя „Смага"
- Руіны Белага палаца
- Плошча Цырыманіяў
- Галоўны манумент „Мужнасць"
- ⑦ Ш[illegible]
- ⑧ [illegible]
- ⑨ Во[illegible]
- ⑩ Руіны будынка інжынернага ўпраўлення
- ⑪ Холмскія вароты
- ⑫ [illegible]
- ⑬ [illegible]
- ⑭ Руіны [illegible]
- ⑮ Руіны [illegible]
- ⑯ Мес[illegible]
- ⑰ Музей абароны Брэсцкай крэпасці-героя
- ⑱ Усходні форт

14. БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ (гіст., арх., маст.). На заходняй ускраіне г. Брэста. Комплекс помнікаў гісторыі, архітэктуры і манументальнага мастацтва.

14а. Крэпасць пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. на месцы старажытнага горада, на астравах, утвораных рэкамі Буг, Мухавец і сістэмай каналаў. Складалася з 4 умацаванняў: Цэнтральнага (Цытадэлі), Цярэспальскага (Заходняга), Валынскага (Паўднёвага), Кобрынскага (Усходняга).

Важнае ваенна-стратэгічнае становішча, якое займаў Брэст-Літоўск на захадзе Расійскай імперыі, абумовіла выбар яго месцам для будаўніцтва крэпасці. Стварыць фартыфікацыйныя умацаванні менавіта ў сутоку Буга і Мухаўца прапанаваў у 1797 г. ваенны інжынер Дэвален. Праект крэпаснога ўмацавання распрацавалі (зацверджаны ў 1830 г.) рускія ваенныя інжынеры — генералы К. І. Оперман і Маленкі, палкоўнік А. І. Фельдман. Спачатку былі ўзведзены часовыя умацаванні, якія ў 1832—42 гг. перабудаваны. 1.6.1836 г. закладзены першы камень будучай крэпасці. Адкрыта 26.4.18[illegible] г., агульная плошча 4 км², даўжыня галоўнай крэпаснай лініі 6,4 км.

Галоўны абарончы вузел — Цытадэль — [illegible] двухпавярховая абарончая казарма даўжынёю 1,8 км са сценамі амаль двухметровай таўшчыні і 500 казематамі, у якіх маглі размясціцца 12 тыс. чалавек з неабходным для ваенных дзеянняў рыштункам. Нішы сцен казармы з байніцамі і амбразурамі былі прыстасаваны для артылерыі і стралкоў. З Кобрынскім умацаваннем Цытадэль злучалася праз Брэсцкія і Беластоцкія вароты і мост цераз Мухавец, з Цярэспальскім — праз аднайменныя вароты і самы вялікі на той час у Расіі канатны мост цераз Буг, з Валынскім — праз Холмскія вароты і разводны мост праз Мухавец. Холмскія вароты мелі 4 вежы з зубцамі. Пяціярусная вежа з газорнай пляцоўкай над Цярэспальскімі варотамі надбудавана пазней. Над уязным праёмам былі 4 ярусы вузкіх акон-байніц. У будынку кляштара езуітаў (пабудаваны ў 1623 г., адноўлены ў 1679 г.) размяшчалася канцылярыя каменданта крэпасці. Будынак кляштара базыльян (1629 г., пазней вядомы пад назвай Белы палац) быў перабудаваны пад афіцэрскае казіно. Архітэктурны цэнтр Цытадэлі — пабудаваная на самым высокім месцы гарнізонная Мікалаеўская царква (1876—79 гг., арх. Д. Грым). У былым кляштары бернардзінак (на Валынскім умацаванні) у 1841—60 гг. размяшчаўся Брэсцкі Аляксандраўскі кадэцкі корпус, пазней — ваенны шпіталь. Цярэспальскае, Кобрынскае, Валынскае прадмаставыя ўмацаванні з рэдутамі, сістэмай бастыёнаў, валоў і водных перашкод прыкрывалі Цытадэль з усіх бакоў. Па знешняй лініі крэпасці праходзіў земляны вал вышынёю да 10 м з цаглянымі казематамі, за ім — каналы з перакінутымі цераз іх мастамі, якія вялі за межы крэпасці. У пачатку свайго існавання Брэсцкая крэпасць была адным з найбольш дасканалых крэпасных умацаванняў Расіі. Крымская вайна 1853—56 гг. паставіла перад фартыфікацыяй новыя патрабаванні. У 1857 г. генерал Э. І. Татлебен падрыхтаваў запіску аб мадэрнізацыі рускіх умацаванняў у адпаведнасці з узрослай магутнасцю артылерыі. У 1864 г. пачалася рэканструкцыя Брэсцкай крэпасці. Пабудаваны Заходні і Усходні рэдуты (форты) — падковападобныя валы з казематамі, траверсы, парахавыя склепы, у 1878—88 гг. яшчэ 10 фортаў. Абарончая лінія дасягнула 30 км. У выніку 2-й рэканструкцыі (1911—14 гг.) Брэсцкага абарончага комплексу, у якой прымаў удзел ваенны інжынер Д. М. Карбышаў, цалкам мадэрнізавана лінія ўмацаванняў. На адлегласці 6—7 км ад крэпасці стваралася другая лінія, частка якой знаходзілася за жылымі кварталамі горада. Будаўніцтва і рэканструкцыя фортаў крэпасці да пачатку 1-й сусветнай вайны не былі завершаны.

У 1-ю сусветную вайну рускае камандаванне, каб пазбегнуць акружэння, эвакуіравала з крэпасці гарнізон і ўзарвала (жнівень 1915 г.) некаторыя яе ўмацаванні. У 1918 г. на тэрыторыі Цытадэлі, у Белым палацы, надпісаны Брэсцкі мір.

У верасні 1939 г., калі войскі фашысцкай Германіі напалі на Польшчу, частка Цытадэлі разбурана, пашкоджаны будынкі Белага палаца і інжынернага ўпраўлення.

З павышэннем мабільнасці і ўдасканаленнем тэхнічнай узброенасці армій Брэсцкая крэпасць як ваенна-абарончы комплекс паступова страціла сваё ранейшае значэнне. Да Вялікай Айчыннай вайны выкарыстоўвалася [illegible] расквартаравання часцей Чырвонай Арміі.

22.6.1941 г. гарнізон крэпасці першым прыняў удар нямецка-фашысцкай арміі, больш месяца гераічна трымаў абарону. У вайну крэпасць моцна разбурана. Знішчаны або пашкоджаны амаль усе будынкі, якія мелі гістарычную і мастацкую каштоўнасць.

І. Да. Белагорцаў

14б. Месца рэвалюцыйных выступленняў салдат гарнізона ў 1905 і 1906 гг. Рэвалюцыйны рух рабочых і сялян у 1905—07 гг. зрабіў уплыў і на армію. Пры Брэсцкай арганізацыі РСДРП з канца 1905 г. да кастрычніка 1906 г. дзейнічала ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП, якая вяла работу сярод салдат гарнізона крэпасці. У яе ўваходзілі рабочы І. І. Знаўчук (кіраўнік), салдаты М. М. Кавалёў і Ащ[illegible]



14а. *Крэпасць Брэст-Літоўск у 1840 годзе. З карціны мастака Б. Залескага*



14а. *Межавы знак паміж Брэсцкай крэпасцю і горадам Брэстам*

14а. Брэсцкая крэпасць. Холмскія вароты.

[illegible] варотах [illegible] [illegible] [illegible] салдат [illegible] [illegible] «20 патрабаванняў салдат [illegible] начальства» [illegible] 1906 [illegible] артылерыстаў [illegible] старым [illegible] арганізавала мітынг [illegible] роты 7, 11, 12, 14 і

14а. Брэсцкая крэпасць. [illegible] Цярэспальскіх варот.

16-я роты. Салдаты патрабавалі вызваліць севастопальскіх і кранштацкіх рэвалюцыйных матросаў, якія адбывалі пакаранне ў Брэсцкай крэпасці, і салдат-агітатараў гарнізона, палепшыць умовы службы і г. д. Гучалі заклікі змагацца з царызмам, браць прыклад з паўстаўшых салдат Харкава і Гродна. Выступленне артылерыстаў не падтрымала пяхота, і яно было задушана.

Пад уплывам рэвалюцыйных падзей у краіне 9—10.7.1906 г. выступілі салдаты 2-га асаднага артылерыйскага палка Брэсцкага гарнізона. Яны адмовіліся ісці супраць бастуючых, патрабавалі вызваліць арыштаваных таварышаў, дазволіць атрымліваць газеты і г. д. Калі пачаліся арышты, салдаты спалілі памяшканне ляцернага афіцэрскага сходу, паранілі некалькі афіцэраў. Пагледзячы на падтрымку іншых часцей, сувязь з батальёнамі у крэпасці усталяваць не ўдалося. Выступленне было задушана, 700 яго ўдзельнікаў далявалены.

У памяць аб рэвалюцыйных выступленнях салдат на сцяне каля Паўночных варот крэпасці ў 1967 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі.— Мн., 1955; Липинский Л. П., Лукьянов Е. П. Брестлитовск и солдатское движение в Белоруссии (1905—1907 гг.).— Мн., [illegible]; [illegible] 1905—1907 гг. на Беларусі. Хроніка падзей.— Мн., 1934.

И. Б. Варатяевич

14в. Месца падпісання Брэсцкага міру 1918 г.

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі [illegible] 11 Усерасійскім з'ездам Саветаў 26.10 (8.11) 1917 г. быў [illegible] Дэкрэт аб міры. У ім Савецкі ўрад прапанаваў усім дзяржавам, якія удзельнічалі у 1-й сусветнай вайне, спыніць ваенныя дзеянні і пачаць перагаворы аб міры. Дзяржавы Антанты не адказалі на гэту прапанову. Савецкі ўрад быў вымушаны адзін пайсці на перагаворы з Германіяй і яе саюзнікамі. 2(15) снежня падпісана пагадненне аб перамір'і, 9(22) снежня ў будынку інжынернага упраўлення крэпасці пачаліся мірныя перагаворы. Кіраўнік савецкай дэлегацыі А. А. Іофэ прапанаваў мір без анексій і кантрыбуцый. Выкарыстаўшы цяжкае становішча Савецкай рэспублікі, Германія запатрабавала тэрыторыю больш за 150 тыс. км² (Польшча, Літва, частка Украіны, Беларусі, Латвіі, Эстоніі). У. І. Ленін лічыў, што неабходна прыняць гэтыя умовы міру, каб даць краіне перадышку, захаваць Савецкую ўладу. Супраць іх выступіла група «левых камуністаў» на чале з М. І. Бухарыным. 10.2.1918 г. Германія выставіла ультыматум. Замест таго, каб выканаць дырэктыву Саўнаркома аб заключэнні дагавору

Л. Троцкі, які на той час узначальваў дэлегацыю, заявіў, што Савецкая рэспубліка спыняе ваенныя дзеянні, дэмабілізуе армію, але мір падпісваць не будзе. 18.2.1918 г. нямецкія войскі перайшлі ў наступленне. У выніку вострай і ўпартай барацьбы У. І. Леніна і яго прыхільнікаў супраць «левых камуністаў» большасць членаў ЦК выказалася за падпісанне міру на германскіх умовах. Атрымаўшы згоду Савецкага ўрада, прадстаўнікі Германіі выставілі больш жорсткія ўмовы міру, далі на яго падпісанне 48 гадзін. 3.3.1918 г. ў будынку Белага палаца быў падпісаны дагавор паміж Савецкай Расіяй з аднаго боку і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Турцыяй, Балгарыяй з другога. Паводле ўмоў Брэсцкага міру Савецкая Расія траціла значную частку тэрыторыі (каля 1 млн. км²), паводле руска-германскага фінансавага пагаднення, падпісанага 27.8.1918 г., павінна была выплаціць кантрыбуцыю ў 6 млрд. марак. Нягледзячы на цяжкія ўмовы Брэсцкі мір даў маладой Савецкай рэспубліцы перадышку, дапамог сабраць сілы, каб адстаяць рэвалюцыю. Пасля Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. ў Германіі Брэсцкі дагавор быў ануляваны.

У 1976 г. на руінах Белага палаца, дзе быў падпісаны Брэсцкі мір, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Майоров С. М. Борьба Советской России за выход из империалистической войны.— М., 1959; Почвинин С. З. В грозовом восемнадцатом [illegible] борьбе за власть Советов в 1918 году. Мн., 1969. В. В. Каратке[illegible].

14г. Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г. На дзень вераломнага нападу гітлераўскай Германіі на СССР у крэпасці дыслацыраваліся падраздзяленні 6-й і 42-й стралковых дывізій, 33-га інжынернага палка і 17-га пагранічнага атрада, часткі батальёна войск НКУС. Часці былі ўкамплектаваны па штатах мірнага часу. Частка іх знаходзілася ў лагерах, на будаўніцтве ўмацаванага раёна, на палігонах. З пачаткам баявых [illegible] асабовага [illegible] выйсці з крэпасці [illegible] нанесці [illegible]

14а. Брэсцкая крэпасць. Паўночныя [illegible].

[illegible] цэнтральныя войскі, у крэпасці асталося крыху больш за 3 тыс. чалавек. Акружаныя ворагам, ва ўмовах вострага недахопу, а потым і адсутнасці боепрыпасаў, медыкаментаў, вады і прадуктаў, воіны гарнізона здзейснілі несмяротны подзвіг.

Штурм Брэсцкай крэпасці пачала 45-я пяхотная дывізія 12-га корпуса 4-й нямецкай арміі. Сілы ворага перавышалі сілы гарнізона амаль у 10 разоў. Нямецкае камандаванне меркавала авалодаць крэпасцю адразу. Пасля інтэнсіўнай артылерыйскай падрыхтоўкі і бамбардзіроўкі вораг перайшоў у наступленне, уварваўся на тэрыторыю Цярэспальскага і Валынскага ўмацаванняў. Асобныя штурмавыя групы [illegible] ў Цытадэль. Савецкія воіны [illegible] нямец[illegible]

14а. Брэсцкая крэпасць. Руіны Мікалаеўскай царквы.

14а. Брэсцкая крэпасць. Фрагмент казармы (паміж Холмскімі і Цярэспальскімі варотамі).

14в. *Брэсцкая крэпасць. Белы палац. Здымак пачатку 20 ст.*

на фашысцкім захопнікам умацаванні супраціўленне. Яны мужна адбівалі атакі ворага, а і самі неаднаразова пераходзілі ў контратаку. Каля [illegible] ва[illegible] раптоўнасць была сарвана. Першы бой у Цытадэлі прынялі байцы 84-га стралковага палка на чале з палкавым камісарам Я. М. Фаміным. На Кобрынскім умацаванні [illegible] ў контратаку чырвонаармейцы 125-га стралковага палка з камандаваннем капітана У. В. Шаблоўскага, на Валынскім — група курсантаў палкавой школы 84-га стралковага палка і пагранічнікі, на Цярэспальскім пагранічнікі, якіх узначалілі старшыя лейтэнанты Ф. М. Мельнікаў і А. С. Чорны, лейтэнант А. М. Кіжаватаў. Пакінуўшы на полі бою забітых і параненых, гітлераўцы вымушаны былі адступіць. Яны утрымалі толькі невялікія участкі перадмастовых умацаванняў крэпасці. У наступныя дні баі мелі яшчэ больш жорсткі характар. Савецкім воінам даводзілася адбіваць у дзень па 6—8 атак. Фашысты пусцілі ў ход танкі і агнямёты, у кароткія праменькі адноснага зацішша праз рэпрадуктары гучалі іх заклікі здавацца ў палон. 29—30 чэрвеня цаною вялікіх страт гітлераўцам удалося захапіць Цярэспальскае, Валынскае ўмацаванні і заходнюю частку Кобрынскага. У Цытадэлі і на астатняй тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання прадаўжаліся ўпартыя баі. Два тыдні моцным вузлом абароны былі Усходнія валы. Тут самаадданa змагаліся артылерысты 98-га асобнага супрацьтанкавага артылерыйскага дывізіёна на чале з намеснікам камандзіра па палітчасці старшым палітруком М. В. Несцерчуком і начальнікам штаба лейтэнантам І. Ф. Акімачкіным. На Кобрынскім умацаванні найбольш буйным участкам баёў стаў Усходні форт, дзе камандзір 44-га стралковага палка маёр П. М. Гаўрылаў сфарміраваў з байцоў розных падраздзяленняў атрад з 400 чалавек і узначаліў абарону. На чале партыйнай арганізацыі, створанай у час баёў, стаў палітрук С. С. Скрыпнік. Абавязкі начальніка штаба выконваў капітан К. Ф. Касаткін. Каб зламаць супраціўленне абаронцаў, гітлераўцы ужылі газы, агнямёты, скідалі з земляных валоў падпаленыя бочкі з бензінам. Але мужныя патрыёты працягвалі барацьбу. Пасля 13 ліпеня невялікая група абаронцаў на чале з П. М. Гаўрылавым вырвалася з Усходняга форта і працягвала барацьбу ў знешняга вала. 23 ліпеня цяжка паранены П. М. Гаўрылаў трапіў у палон.



14д. *Брэсцкая крэпасць. Памятны знак на месцы казармы 9-й заставы 17-га Чырванасцяжнага пагранатрада*

Жорсткія баі разгарэліся ў Цытадэлі. Штурмавыя групы ворага імкнуліся захапіць будынак чырвонаармейскага клуба, ператварыць яго у свой апорны пункт, але да канца першага дня ваяны былі выбіты. 24.6.1941 г. адбылася нарада камандзіраў і палітработнікаў, на якой створаны штаб абароны, зводная баявая група (камандзір — капітан І. М. Зубачоў, намеснік камандзіра палкавы камісар Я. М. Фамін) і аддадзены «Загад № 1». Пасля разгрому штаба атрад абаронцаў на чале з лейтэнантам А. А. Вінаградавым 26 чэрвеня пайшоў на прарыў. За межы крэпасці былі вынесены з акружэння астатнія групы гарнізона, але далейшыя спробы прарвацца аказаліся беспаспяховымі. Праз варожае кальцо прабіліся толькі нешматлікія групы. Некаторыя з іх дайшлі да лініі фронту і злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі, астатнія пайшлі ў партызанскія атрады.

Групы, якія засталіся ў крэпасці, працягвалі барацьбу. Не хапала боепрыпасаў, прадуктаў, вады. Побач з байцамі былі жанчыны і дзеці. Яны памагалі параненым, падносілі патроны, самі вялі агонь па фашыстах. Не вытрымлівалі мураваныя сцены, плавілася цэгла, але савецкія воіны не скараліся. Нават вораг быў уражаны

14в. *Брэст. Белы палац. Мірныя перагаворы. 1918 г.*

14г. *Брэсцкая крэпасць. Памятны знак на месцы прарыву 26 чэрвеня 1941 г. групы абаронцаў.*

стоі[illegible]ю і героям абаронцаў крэпасці. У сваім данясенні камандзір 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі генерал Шліпер вымушаны быў прызнаць, што «рускія ў Брэст-Літоўску змагаліся выключна ўпарта і настойліва. Яны паказалі выдатную вывучку пяхоты і праявілі незламную волю да барацьбы». Нямыя сведкі гераізму і мужнасці апошніх абаронцаў крэпасці — палымяныя надпісы, якія героі пакінулі на сценах крэпасных казематаў і сутарэнняў: «Загінем, але з крэпасці не пойдзем...», «Паміраем не ганьбячы...», «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма. 20.VII.41 г.». У дні абароны Брэсцкай крэпасці яскрава выявілася непарушнае адзінства народаў СССР. Пляччо ў плячо тут змагаліся прадстаўнікі больш як 30 нацыянальнасцей. Абарона Брэсцкай крэпасці прыклад мужнасці і стойкасці савецкага народа, легендарная старонка яго барацьбы за свабоду і незалежнасць Радзімы.

У старых мурах крэпасці, якая [illegible] мо[illegible] савецкія воіны на працягу [illegible] іх тыдняў скоўвалі дзеянні 45-й нямецкай дывізіі. Толькі за 9 дзён абароны гэта дывізія страціла 482 забітымі і больш як 1000 параненымі салдат і афіцэраў. Савецкія воіны да канца выканалі свой абавязак перад Радзімай: яны [illegible] да таго часу, пакуль рукі [illegible] зброю, пакуль білася іх [illegible]. Абарона Брэсцкай крэпасці — адзін з [illegible]ных подзвігаў савецкага народа ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гэта прыклад воінскай славы і доблесці, бязмежнай адданасці ідэям камунізма, палымянай любві да сацыялістычнай Радзімы. Савецкі народ, Камуністычная партыя, Савецкі ўрад высока ацанілі выключны гераізм абаронцаў крэпасці. У 1957 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР маёру П. М. Гаўрылаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасмяротна званне Героя Савецкага Саюза прысвоена лейтэнанту А. М. Кіжэватаву. Каля 200 удзельнікаў абароны ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. 8.5.1965 г. крэпасці прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-герой» з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». На тэрыторыі крэпасці створаны велічны архітэктурна-скульптурны мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой.

Літ.: Брестская крепость: Путеводитель по местам боев. — 7 изд. — М., 1967; Брестская крепость-герой: Фотоповесть. [Мн., 1969]; Буг в огне: [Сб. успаміна[ў]] — 3 изд. [illegible] оборона Брестской крепости в июне — июле 1941 г. — 4 изд. Мн., 1971; Непокорённая Белоруссия: Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы [illegible] Отечественной войны (1941 — [illegible]) [illegible] и народов [illegible] Мн., 1969. [illegible]

14ц. Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой

Ва ўсходняй частцы цэнтральнага вострава. Адкрыты 25.9.1971 г. Аўтарскі калектыў: народны мастак СССР скульптар А. Кібальнікаў (галоўны мастацкі кіраўнік), народны архітэктар СССР У. Король, народны мастак БССР скульптар А. Бембель, скульптар У. Бабыль, архітэктары В. Волчак, В. Занковіч, Ю. Казакоў, А. Стаховіч, Г. Сысоеў.

Комплекс уключае манументальны галоўны ўваход, пад'езды і плошчы, галоўны манумент «Мужнасць», [illegible] Цырымані[illegible] тэрасы трыбуны, некропаль-ка[illegible]мбарыі, скульптурную кампазіцыю «[illegible]смага», ўцалелыя абудаванні і руіны крэпасці. Галоўны ўваход уяўляе сабой урэзаны ў вал маналіты бетонны масіў з праёмам у цэнтры ў выглядзе зоркі. Сколы перакрыкоўваюцца ў складанай дынамічнай форме, што



14д. *Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой. Галоўны ўваход.*

14д. *Брэсцкая крэпасць. Мемарыяльная дошка на будынку, у якім 24.6.1941 г. быў падпісаны «Загад № 1».*



14д. *Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой. Дошка з тэкстам Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Брэсцкай крэпасці ганаровага звання «Крэпасць-герой».*

стварае святлоценявыя кантрасты, узмацняе напружанасць і імклівасць. Бетонны масіў галоўнага ўвахода падтрымліваюць адхоны вала і цагляныя сцены ўцалелых казематаў. На сцяне каля ўвахода металічная дошка з тэкстам Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Брэсцкай крэпасці ганаровага звання «Крэпасць-герой». Ад галоўнага ўвахода ўрачыстая алея вядзе цераз мост да плошчы Цырыманіялаў. Злева ад моста — скульптурная кампазіцыя «Смага» — фігура савецкага воіна, які, абапіраючыся на аўтамат, з каскай у руцэ цягнецца да вады. Выразны сілуэт, дынаміка, напружанасць кампазіцыі, насычанасць формы ствараюць вобраз вялікай эмацыянальнай сілы. У планіровачным і вобразным вырашэнні ансамбля важная роля належыць плошчы Цырымaніялаў (разлічана на 2[illegible] тыс. чалавек), на якой адбываюцца ўрачыстыя рытуалы. Плошчу з боку р. Мухавец замыкаюць уцалелыя будынкі казарм з казематамі, з процілеглага — будынак музея і руіны [illegible]. Кампазіцыйны цэнтр комплексу — манумент «Мужнасць» (бетон колерам і фактурай нага[illegible]

14д. *Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой. Від на плошчу Цырыманіялаў.*

каменны мал (выш. 33,5 м) і штык-абеліск (вышыня 100 м). Манумент — пагрудная скульптура савецкага салдата, высечаная быццам са скалы. Схіленая галава воіна, магутныя плечы, адкрыты мужны твар ствараюць абагульнены вобраз савецкага воіна-пераможцы, абаронцы Савецкай Радзімы, гатовага змагацца за родную зямлю да канца. На адваротным баку манумента — рэльефныя кампазіцыі, якія адлюстроўваюць эпізоды абароны крэпасці. Уверсе — сюжэт «Атака»: выявы воінаў перад рыўком у атаку, фігура камандзіра дадзена больш маштабна. Унізе — гарэльеф «Партыйны сход» і рэльефы «Апошняя граната», «Подзвіг артылерыстаў» «Кулямётчыкі». Над пляцоўкай мемарыяльнага комплексу дамінуе абліцаваны тытанам штык-абеліск. З манументам арганічна звязаны трыбуна і некропаль — 3 галерэі-калумбарыі, у якіх урны з прахам 853 загінуўшых абаронцаў крэпасці. Іх імёны (207, астатнія невядомыя) выкладзены аб емнымі металічнымі літарамі. Некропаль абліцаваны плітамі лабрадарыту, 3 уступамі ўздымаецца да пляцоўкі каля галоўнага манумента. Перад руінамі інжынернага ўпраўлення ў абліцаваным гранітам паглыбленні праз бронзавую пліту з выразанай у ей пяціканцовай зоркай прабіваецца полымя Вечнага агню славы і народнага смутку. Перад плітой адлітыя з бронзы словы: «Стаялі насмерць, слава героям!». На месцах канкрэтных падзей у крэпасці ўстаноўлены памятныя дошкі — Мемарыяльны каляндар 1941 г., які расказвае аб асноўных эпізодах абароны, і каменная глыба з умацаванай у ёй бронзавай зоркай і мемарыяльнай дошкай (на месцы былой 9-й пагранічнай заставы).

Схіленыя над каналам і р. Мухавец вербы, зарослыя хмызняком адхоны валоў, алеі руж узмацняюць эмацыянальнае ўздзеянне мемарыялу. Усе элементы кампазіцыі звязаны дарожкамі з чырвонага пластабетону. Дэкаратыўнае падсвечванне — чырвонае зарыва за галоўным манументам, глыбокія цені на яго блоку, барвовая падсветка руін, светлавыя пункціры нізкіх паў круглых свяцільняў, зеленаватае свячэнне скульптурнай кампазіцыі «Смага», а таксама прыглушанае гучанне «Летуценняў» Р. Шумана і «Свяшчэннай вайны» А. Аляксандрава надаюць асаблівую вастрыню ўспрыманню комплексу. Глыбокі філасофскі сэнс, арыгінальная рэалістычная выразнасць выяўленчых сродкаў робяць яго адным з значных ансамбляў савецкага манументальнага мастацтва. Багаты фактычны матэрыял аб абароне крэпасці ў Вялікую Айчынную вайну знаходзіцца ў Музеі Брэсцкай крэпасці-героя.

[illegible] ов Г. В., Казаков Ю. П. [illegible]

14д. *Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-гер[illegible]. Галоўны манумент [illegible]*

хитектура Белоруссии, 1971, № 4. Белоусова О. Памятники войне и миру [illegible] декоративное искусство СССР. [illegible]

Г. Лапцэвіч.

15. БУДЫНАК БАНКА (архіт.) Вул. Леніна, 9. Пабудаваны ў 1926 г. з цэглы.

Трохпавярховы будынак з высокім цокальным паверхам. Вуглавая частка вырашана ў выглядзе дамінуючай над усёй пабудовай ратонды з высокім сферычным купалам. Цэнтральная частка крыла, што выходзіць на вул. Леніна, крыху выступае наперад і мае двухпавярховы аб'ём з высокімі вокнамі на 2-м паверсе, дзе размешчана галоўная аперацыйная за[illegible]

14і. *Мемарыяльны комплекс [illegible] Скульптурная [illegible]*



14д. *Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Галоўны манумент «Мужнасць». Рэльефныя кампазіцыі*

...ла. Архітэктурны акцэнт зроблены на арыентаваных на плошчу і вул. Леніна аб'емах, сцены якіх членяюцца пілястрамі з іанічнымі капітэлямі і калонамі ў 3/4 (ратонда). У дэкаратыўнай апрацоўцы фасадаў выкарыстаны сферычныя нішы, сандрыкі на фігурных кранштэйнах, лепныя элементы. Будынак увянчае развіты карніз, над якім парапет-балюстрада. Унутраная планіроўка калідорная з двухбаковым размяшчэннем службовых памяшканняў. Цокальны паверх перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. На астатніх паверхах столь плоская. Па перыметры круглага ў плане вестыбюля размешчаны гранёныя слупы. Сцены вестыбюля і яго парадная вітая лесвіца дэкарыраваны рустам. Асаблівай урачыстасцю вызначаецца фае на 2-м паверсе ратонды і аперацыйная зала. Іх сцены расчлянёны пілястрамі і ўпрыгожаны лепнымі элементамі.

Будынак — помнік грамадзянскай архітэктуры неакласіцызму.

... Мнясоў, М. В. Чэр...

16. БУДЫНАК ДЗІЦЯЧАГА САДА (архіт., маст.). Вул. Героеў абароны Брэсцкай крэпасці, 69. Пабудаваны ў 19.. г. (арх. Р. Будзько, А. Ляшук, інжынер І. Дулацка).

У аснову планіроўкі пакладзены тыпавы праект дзіцячага сада-яслей на 280 месцаў з некаторымі прыбудовамі (адкрытыя веранды, плавальны басейн). Для кожнай узроставай дзіцячай групы прызначаны самастойны блок (спальні, сталовыя, пакоі для гульняў) з асобным уваходам. Усе блокі аб'яднаны гаспадарчымі і службовымі памяшканнямі, а таксама вялікай музычнай залай. На 2-м паверсе — адкрытая веранда для гульняў. На тэрыторыі двара — паветкі. Пл...

15. *Будынак банка*

14д. *Будынак музея Брэсцкай крэпасці-героя*

15. *Будынак банка. Фрагмент інтэр'ера*



16. [illegible]

вальны басейн злучаецца з корпусам надземным пераходам. У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі будынка выкарыстаны каляровыя мазаічныя пано. На гладкіх тарцовых сценах пры ўваходзе ў кожны групавы блок і на фрызе басейна 6 кампазіцый: «Салют Перамогі», «Вясёлка над горадам», «Сонечны дзень», «Кветкі на акне», «Падводнае царства», «Плыўцы» (мастакі В. Пучкоў, Я. Русаў), а таксама мазаічнае пано ў інтэр'еры басейна (мастак Я. Аракчэеў). Казачныя сюжэты мазаік па характару набліжаны [illegible] дзіцячых малюнкаў, [illegible] маляўнічасць і святочнасць усяму будынку. [illegible] кампазіцыі на ма[illegible] дзіцячых [illegible] упрыгожваюць інтэр'ер будынка (мастак Я. Русаў). У холе музычнай залы [illegible] дэкаратыўны каляровы вітраж.

Будынак дзіцячага сада — прыклад удалага спалучэння архітэктурных форм і дэкаратыўнага афармлення. [illegible] Г. М. Я[illegible]

17. БУДЫНАК ПОШТЫ (архіт.). Вул. Маскоўская, 32. Пабудаваны ў сярэдзіне 19 ст. з цэглы. Цяпер у правым крыле будынка службы міжгародняй

16. [illegible]

16. [illegible]

17. *Будынак пошты*

тэлефоннай станцыі, тэлеграфа і АТС, у левым — паштовае аддзяленне.

Двухпавярховы выцягнуты ў плане аб'ём з невялікімі бакавымі і развітым з боку дваровага фасада цэнтральным рызалітамі. Спачатку складаўся з 2 карпусоў, аб'яднаных пераходам са скразным праездам. Планіроўка анфіладная. Будынак накрыты вальмавым дахам, прарэзаным паўкруглымі дахавымі вокнамі. Паверхі дзеліць крапаваны пояс, які праходзіць па ўсім перыметры абудавання. Плоскасці сцен левай палавіны забудовы апрацаваны рустам, аконныя праёмы аздоблены фігурнымі ліштвамі. Сцены правага крыла выдзяляны вузкімі палічкамі і шырокімі ліштвамі ў верхняй, паўцыркульнай частцы акон 1-га паверха. Уваход вырашаны ў выглядзе партала, ахарашанага шырокімі пілястрамі, з трохвугольным франтонам над ім.

Будынак — помнік грамадзянскай архітэктуры канца 19 — пач. 20 ст.

18. БУДЫНКІ ІНЖЫНЕРНА-БУДАЎНІЧАГА ІНСТЫТУТА (архіт.). Вул. Маскоўская, 267. Уваходзяць у ансамбль мікрараёна № 1. Пабудаваны ў 1965—80 гг. [illegible] праекта.

Галоўны пяціпавярховы корпус (1965—67 гг.) — буйнамаштабны будынак, архітэктура якога заснавана на рытме вертыкальных [illegible]. Двухступеньчатая кампазіцыя галоўнага (паўночнага) фасада асіметрычная. З усходняга боку выступае глухі тарэц крыла з аўдыторыямі, з захаднягa — корпус актавай залы. У афармленні маналітнай [illegible] выкарыстана пано (чаканка), для дакаратыўнай апрацоўкі канструкцыйных элементаў — керамічная плітка. Асіметрычна размешчаны галоўны уваход выдзелены шырокім ганкам і казырком. З двара да галоўнага корпуса прымыкаюць крылы адміністрацыйных памяшканняў і спартзалы, якія утвараюць прасторны унутраны двор. Лесвічныя клеткі і вестыбюлі ўбудаваны ў месцах злучэння крылаў з галоўным корпусам.

У аснову планіроўкі галоўнага корпуса пакладзена калідорная схема з двухбаковым размяшчэннем аўдыторый. У дэкоры ўваходнага вестыбюля пано (чаканка), паліхромная падлога з мармуровай крошкі, зялёны газон. У галоўным корпусе 80 аўдыторый, 2 лекцыйныя залы, вырашаныя амфітэатрам, на 200 месцаў кожная, больш за 60 лабараторый, спартыўная і актавая залы, бібліятэка, кнігасховішча, чытальня.

Крыты пераход на ўзроўні 2-га паверха злучае галоўны корпус з чатырохпавярховым навучальна-лабараторным, у якім 20 аўдыторый і 30 лабараторый.

Архітэктура будынкаў інстытута адпавядае функцыянальным і эстэтычным патрабаванням сучасных навучальных устаноў.

І. Д. Белагорцаў, А. М. Кулагін.

19. БЮСТ КЛІМУКА Пятра Ільіча (гіст., маст.). На скрыжаванні вул. Маскоўскай і бульвара Касманаўтаў. Устаноўлены ў 1978 г. ў гонар двойчы Героя Савецкага Саюза генерал-маёра авіяцыі лётчыка-касманаўта СССР П. І. Клімука.

П. І. Клімук нарадзіўся 10.7.1942 г. у в. Камароўка Брэсцкага р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1963 г. У 1963 г. скончыў Чарнігаўскае вышэйшае авіяцыйнае вучылішча, у 1977 г.— Ваенна-паветраную акадэмію імя Ю. А. Гагарына. У атрад касманаўтаў залічаны ў 1965 г., прайшоў поўны курс падрыхтоўкі да касмічных палётаў. Першы арбітальны палёт у якасці камандзіра карабля «Саюз-13» разам з бортінжынерам В. В. Лебедзевым ажыццявіў 18—26.12.1973 г. За 8 сутак касманаўты паспяхова правялі навуковa-тэхнічныя і медыка-біялагічныя даследаванні і эксперыменты. Праводзілася спектраграфаванне асобных участкаў зорнага неба і фатаграфаванне актыўных участкаў Сонца. За паспяховае выкананне арбітальнага палёту П. І. Клімуку 28.12.1973 г. прысвоены званні лётчыка-касманаўта СССР і Героя Савецкага Саюза.

Другі, 63-сутачны, палёт у космас у якасці камандзіра касмічнага карабля «Саюз-18» здзейсніў 24.5—26.7.1975 г. разам з бортінжынерам В. І. Севасцьянавым. На арбітальнай станцыі «[illegible]лют-4», састыкаванай з касмічным караблём «Саюз-18», упершыню ў практыцы касмічных палётаў выканана комплекснае фота- і спектраграфічнае даследаванне палярных ззянняў і серабрыстых воблакаў. Палёт у космас П. І. Клімука і В. І. Севасцьянава стаў чарговым этапам на шляху вырашэн



18. *Галоўны корпус інжынерна-будаўнічага інстытута*

ка адной з галоўных задач касманаўтыкі — навуковае абгрунтаванне палётаў, адаптацыі чалавека ў космасе і рэадаптацыі яго ў зямных умовах пасля палёту. Экіпаж «Саюза-18» двойчы выходзіў на сувязь з касманаўтамі карабля «Саюз-19», якія ўдзельнічалі ў праграме «Саюз — Апалон». 27.7.1975 г. за паспяховае выкананне палёту на арбітальным комплексе «Салют-4» — «Саюз-18» П. І. Клімук узнагароджаны ордэнам Леніна і 2-м медалём «Залатая Зорка».

У 3-м палёце 27.6—5.7.1978 г. П. І. Клімук узначальваў міжнародны экіпаж на касмічным караблі «Саюз-30» разам з грамадзянінам ПНР М. Германшэўскім правеў стыкоўку з арбітальным навуковым комплексам «Салют-6» — «Саюз-29». На працягу 7 сутак касманаўты У. В. Кавалёнак, А. С. Іванчанкаў, П. І. Клімук і М. Германшэўскі вялі візуальныя назіранні і фатаграфаванне розных раёнаў паверхні Зямлі, праводзілі тэхналагічныя і медыка-біялагічныя эксперыменты, падрыхтаваныя вучонымі і спецыялістамі СССР і ПНР. 5.7.1978 г. за паспяховае выкананне праграмы палёту П. І. Клімук быў узнагароджаны 3-м ордэнам Леніна. Дзяржаўны Савет ПНР узнагародзіў яго ордэнам «Крыж Грунвальда» 1-й ступені. П. І. Клімук — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1979 г., лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР 1978 г.

Пагрудны бюст касманаўта ўстаноўлены на высокім гранітным пастаменце (скульпт. І. Міско, арх. С. Батькоўскі; бронза, чырвоны граніт; вышыня пастамента 3 м, бюста 1,1 м). У развароце выпрастаных плячэй, павароце галавы, выразных рысах твару — рашучасць і цвёрдасць. Мундзір, вынвы ўзнагарод удакладняюць характарыстыку героя. Ніз пастамента абвіты бронзавым вянком. Асіметрычны гранітны стылабат з 3 прыступкамі але ва агінае бардзюр. На пастаменце рэльефная выява 2 ордэнаў Леніна і 2 медалёў «Залатая Зорка». Ніжэй накладнымі бронзавымі літарамі дадзены тэкст Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні П. І. Клімука ордэнам Леніна і 2-м медалём «Залатая Зорка».

Спалучэнне паліраванага чырвонага граніту пастамента і стылабата з цёмнай бронзай бюста надае яму дэкаратыўны эфект і ўмацоўвае яго геральдычнае гучанне. Вакол разбіты газоны, высаджаны дрэвы.

Літ.: Клімук П. І. Зоры — побач: Кніга аднаго палёту. — Мн., 1977; Ваганова И. И., Панасюк Н. В. П. И. Климук. — Мн., 1976.

В. М. Васкова, Л. Г. Л[illegible]

20. ГАНДЛЁВА-БЫТАВЫ ЦЭНТР (архіт.). Вул. Маскоўская, 19. Пабудаваны ў 1978 г. на месцы былых гандлёвых радоў. У аснове пабудовы жалезабетонны каркас і тыпавыя будаўнічыя канструкцыі (арх. С. Неумыва-

19. *Бюст П. І. Клімука*

кін, Г. Кісялёва, А. Фядорчанка, інжынеры У. Касцючкова, М. Гелер, М. Ба[illegible]ка).

Кампазіцыйна і функцыянальна комплекс аб'ядноўвае 3 розназалыя кубы-блокі: універмаг з выставачнай залай, блок бытавога абслугоўвання, гандлю і грамадскага харчавання. Корпус універмага, блок бытавога абслугоўвання і бетонная пергала абмяжоўваюць унутраны дворык, адкрыты ў бок вул. Маскоўскай. У [illegible] кампазіцыі дамінуе [illegible] квадратная ў сячэнні рэкламная вежа, якая адначасова ўраўнаважвае масіўны аб'ём універмага.

Аб'ёмна-прасторавую структуру комплексу вызначае характар прадпрыемстваў. Корпус універмага прамавугольны ў плане. На першых 2 паверхах — гандлёвыя залы, у падвале і на 3-м паверсе — складскія, дапаможныя і тэхнічныя памяшканні. Адміністрацыйна-бытавыя памяшканні размешчаны ў паўднёвай частцы 3 паверхаў. Рытм фасадаў кубападобнага корпуса універмага створаны габрыстымі навяснымі панелямі і вертыкальнымі аконнымі праёмамі. У аздабленні выкарыстана [illegible] тынкоўка, мармур, керамічная плітка, алюмініевыя пераплёты. Два ўваходы (прамавугольныя парталы) з боку вул. Маскоўскай выкладзены белым мармурам.

Трохпавярховы кубападобны блок бытавога абслугоўвання размешчаны ў сярэдзіне комплексу, 2 ўваходамі звязаны з унутраным дворыкам. Фасады суцэльнага зашклення рытмічна дзеляцца вертыкальнымі рэбрамі. У аснову планіроўкі пакладзены прынцып групоўкі памяшканняў вакол вестыбюляў. Да паслуг наведвальнікаў салоны прыгажосці, пракату, выставачны салон мэблі, фотастудыя, атэлье трыкатажных вырабаў і пашыву адзення, а таксама службы рамонту і майстэрні рознага профілю, дэманстрацыйная зала.

Ва ўсходнім крыле комплексу двухпавярховы блок прадпрыемстваў грамадскага харчавання, універсам і магазін агародніны (цокальны паверх). Уваход у рэстаран і кафэ з боку галоўнага фасада. Прадпрыемствы гра



20. *Гандлёва-бытавы цэнтр*

21. Гарнізонныя [illegible]

[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] вы карыстаны [illegible] тынкоўка [illegible] [illegible] [illegible] бовы шпон, белы мармур.

Гандлёва-бытавы цэнтр у Брэсце — [illegible] функцыянальных аб'ёмаў [illegible] у адзіны гарманічны ансамбль.

[illegible]

21 ГАРНІЗОННЫЯ МОГІЛКІ [illegible] маст[illegible]. На вул. Герояў абароны Брэсцкай крэпасці. Пахаваны воіны Савецкай Арміі, Героі Савецкага Саюза П. М. Гаўрылаў, [illegible] М. Р. Макараў, А. [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] -вызваленчага ру[illegible] [illegible] Беларусі [illegible] [illegible]

Магіла [illegible] [illegible] бая[illegible] пахаваны [illegible] воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх [illegible] на тэрыторыі Брэсцкай [illegible] У 1958 [illegible] установлены абеліск [illegible] У адной з брацкіх магіл пахаваны Герой Савецкага Саюза [illegible] [illegible] Барысавіч [illegible]

[illegible] Запарожскай вобл. [illegible] [illegible] [illegible] вайну [illegible] на 2-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах. [illegible] на тэрыторыі Валынскай [illegible] пры фарсіраванні р. [illegible] ў баях на плацдарме, а таксама пры фарсіраванні [illegible] [illegible] Ротна рота пад камандаваннем старшага лейтэнанта П. Б. Лаўдзетава адна з першых узарвалася ў варожыя траншэі. Камандзір асабіста з агнявыя кропкі, захапіў 2 кулямёты. 21.7.1944 г. каля в. Рагозна Брэсцкага р-на з групай байцоў фарсіраваў Заходні Буг і забяспечыў пераправу батальёна. Загінуў у баі 27.7.1944 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

Магіла Гаўрылава Пятра Міхайлавіча. П. М. Гаўрылаў нарадзіўся [illegible].1900 г. у в. Альведзіна Пестрачынскага р-на Татарскай АССР у сялянскай сям'і. Член КПСС з 1922 г. З 1918 г. у Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1939 скончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе. Вялікую Айчынную вайну маёр П. М. Гаўрылаў сустрэў у Брэсцкай крэпасці камандзірам 44-га палка 42-й стралковай дывізіі. З 22.6.1941 г. ўзначаліў абарону Усходняга форта. 23.7.1941 г. цяжка паранены трапіў у палон. Вызвалены савецкімі войскамі ў маі 1945 г. Да 1946 г. служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі жыў у Краснадары. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 3.1.1957 г. Быў членам Савецкага камітэта ветэранаў вайны, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР у 1958—62 гг. Памёр 26.1.1979 г. у Краснадары. На магіле ў 1979 г. пастаўлены абеліск. Яго імем названы вуліцы у Брэсце і Краснадары [illegible] на радзіме.

Магіла Макарава Мікалая Рыгоравіча. М. Р. Макараў нарадзіўся 25.12.1917 г. ў г. Сярдобск Пензенскай вобл. ў сям'і рабочых. Член КПСС з 1942 г. У 1937 г. скончыў Сярдобскі паатэхнікум і быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1941 г. скончыў [illegible] ваеннае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Калінінскім, Варонежскім, 1-м Белрускім франтах. Камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка маёр М. Р. Макараў вызначыўся пры

22. [illegible] «Буг»



22. Гасцініца «Буг». План 1-га паверха.



22. Гасцініца «Інтурыст». План тыпавога паверха

вызваленні Гарадка, Езярышча, Віцебска, Полацка, Бешанковіч. Зрабіў 115 баявых вылетаў, знішчыў 8 танкаў, 10 аўтамашын, паравоз, 15 вагонаў, 6 [illegible] з боепрыпасамі, 30 агнявых кропак праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.6.1945. Да 1958 г. палкоўнік М. Р. Макараў служыў у Савецкай Арміі, [illegible] дэмабілізацыі жыў у Брэсце. Памёр 15.5.1974 г. У 1975 г. на магіле ўстаноўлена пліта.

Магіла Скрылёва Аляксея Канстанцінавіча. А. К. Скрылёў нарадзіўся 17.3.1918 г. ў с. Міхайлаўка [illegible] раёна Краснаярскага краю ў сям'і служачых. Член КПСС з 1942 г. У Чырвонай Арміі з 1937 г. У 1939 г. скончыў 1-e Кіеўскае артылерыйскае [illegible] вучылішча. На фронце [illegible] 1941 [illegible] 1945 г. у баі за прыгарад Берліна камандзір артылерыйскага палка гвардыі маёр А. К. Скрылёў забяспечыў выхад палка на [illegible] канал Берлін-Шпандау. Толькі 16 [illegible] 1945 г. [illegible] знішчыла 58 гармат, 2 [illegible] кулямётныя кропкі, 9 артылерыйскіх і мінамётных батарэй праціўніка. [illegible] Героя Савецкага Саюза [illegible] 5.1945 [illegible]

Магіла Гулава Паўла Марк[illegible]вавіча. П. М. Гулаў нарадзіўся 1.7.1893 г. у в. Жураўлёўка Рузскага р-на Маскоўскай вобл. ў сям'і селяніна. Член КПСС з 1917 г. З 1914 г. на франтах 1-й сусветнай вайны. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі старшыня ротнага, намеснік старшыні палкавога салдацкіх камітэтаў, член Савета салдацкіх [illegible] Вяземскага [illegible] гарнізона. Удзельнік устанаўлення Савецкай улады ў Вязьме, ад мясцовага Савета накіраваны [illegible] на II Усерасійскі з'езд Саветаў. [illegible] старшыня Вяземскага павятовага выканкома, рэвалюцыйнага трыбунала, ваяваў на Паўднёвым фронце. З 1923 г. ў Крыме на партыйнай і савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну быў ваенным пракурорам [illegible] г. намеснік пракурора [illegible] вобл. Ганаровы грамадзянін Брэста (1969 г.). Памёр 19.12.1972 г. У 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск.

23. Гасцініца «Інтурыст»

Магіла Н[illegible] Захара Філімонавіча. З. Ф. [illegible] нарадзіўся 28.2.1898 г. у в. [illegible] р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС [illegible]. У юнацтве быў парабкам. У 1917 г. мабілізаваны ў армію, ваяваў на Заходнім фронце. [illegible] у рэвалюцыйных выступленнях салдат. З 1918 г. ў Чырвонай Арміі. Вярнуўся на Брэстчыну ў 1921 г., актыўна ўключыўся ў рэвалюцыйную [illegible] барацьбу. [illegible] 1926 г. сакратар [illegible] камітэта [illegible]. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР З. Ф. [illegible] на гаспадарчай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну з сакавіка 1943 г. ў тыле ворага, упаўнаважаны Брэсцкага абкома КП(б)Б у Паўднёвай зоне Брэсцкай вобл. па кіраўніцтву партызанскім рухам. З 1946 г. працаваў інструктарам Брэсцкага абкома КПБ. Памёр 11.8.1965 г. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск. Яго імем названа вуліца ў Брэсце.

Помнік савецкім воінам. Пастаўлены ў 1948 г. У аснову планіроўкі гарнізонных могілак пакладзены прынцып восевай сіметрычнай кампазіцыі. Цэнтральную алею, якая пачынаецца ад галоўнага ўвахода, замыкае скульптурны помнік — фігура воіна-вызваліцеля (скульпт. Л. Кербель; бетон; вышыня помніка 9 м, скульптуры 2,5 м). Строгая вертыкаль скульптуры воіна з плашч-палаткай за плячыма і аўтаматам у руках, высокі пастамент надаюць помніку велічнасць і ўрачыстасць. Абапал яго на [illegible] Да помніка вядзе шырокая лесвіца.

[illegible]

[illegible] В. В. Каротчыкаў, [illegible] Лапацін, Т. А. Сасеврык

22. ГАСЦІНІЦА «БУГ» (арх[illegible]). Вул. Леніна, 2. Пры ўездзе ў горад [illegible] Прывакзальнай пл. Пабудавана ў 1958 г. з цэглы (арх. Г. Беніяцэктаў).

Чатырохпавярховы Г-падобны ў плане будынак. Скруглены [illegible] выходзіць на плошчу [illegible] транспартную развязку [illegible] на шляхавы мост. На 1-м паверсе — парадны вестыбюль [illegible] формы з 6 калонамі па крузе. [illegible] шырокая трохмаршавая [illegible] вядзе на паверхі, дзе размешчаны нумары на 200 месцаў. Архітэктурнае аздабленне будынка спрошчана, з выкарыстаннем элементаў [illegible] ордэрнай архітэктуры. Тры верхнія паверхі цэнтральнай закругленай часткі [illegible] карынфскага ордэра.

Будынак характэрны для савецкай архітэктуры 1950-х гадоў.

Т. І. Чарняўская

23. ГАСЦІНІЦА «ІНТУРЫСТ» (архіт., маст.). Вул. Маскоўская, 7. Пабудавана ў 1975 г. (арх. Г. Бенідзіктаў, В. Астаповіч, А. Лукомская). Дзесяціпавярховы будынак разлічаны на 300 месцаў. Прасторавы эфект дасягаецца кантрасным спалучэннем вышыннага жылога корпуса-пласціны і

23. *Гасцініца «Інтурыст». Інтэр'ер рэстарана*

У вялікай зале 2-га паверха ў ажурную металічную перагародку асіметрычна ўкампанаваны прамавугольныя барэльефныя кампазіцыі розных памераў: «Паляванне ў Белавежскай пушчы», «Вяселле» (разьба па дрэве; мастак І. Хоміч). Манахромную плоскасць сцяны банкетнай залы ажыўляе пано на тэму княжацкага вясельнага балявання (маркетры; мастакі У. Ізергін, В. Сабалеўскі)

Будынак гасцініцы характэрны для савецкай архітэктуры 1970-х гадоў.

І. М. Кулагін, Г. М. Ярмоленка

24. ЖЫЛЫ ДОМ (архіт.). Вул. Леніна, 39. Пабудаваны ў 1-й палавіне 19 ст. з цэглы. Скампанаваны з 2 аднолькавых двухкватэрных жылых секцый. Накрыты агульным мансардавым дахам. Уваходы вылучаны вынасным мезанінам на 2 калонках. З дваровага фасада ў кожнай секцыі выступае трохгранны двухпавярховы эркер з балконам. Планіроўка функцыянальна падзелена на жылую і гаспадарчую часткі. Гаспадарчая мае самастойны ўваход з тарцовага фасада. Мансардавы паверх ідэнтычнай планіроўкі.

25. ЖЫЛЫ ДОМ, МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АРЖАНАВАЙ Галіне Аляксандраўне (архіт., гіст.). Вул. Пушкінская, 18.

Жылы дом пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы. На 1-м паверсе была аптэка, пінер магазін.

Прамавугольны ў плане трохпавярховы будынак (3-і паверх надбудаваны пазней) гарызантальна вылучаны блокам чарчэння. Шматпавярховы аб'ём пастаўлены тарцом да вуліцы, мае развіты ніжні паверх, у якім размешчана вестыбюльная група з прасторным холам. Жылая частка будынка аформлена з панельных канструкцый, навешаных на двухкансольныя рамы, вертыкалі якіх ствараюць асноўны рытм замкнёнай фасаднай плоскасці. У будынку калідорная планіроўка з двухбаковым размяшчэннем нумароў, ёсць холы, ліфтавыя вестыбюлі. Кожны нумар (пакой з калідорам-нішай) разлічаны на 1–2 чалавек. Інтэр'ер нумароў вызначаецца добрымі праглюрцыямі, высокай якасцю аздабленчых работ і зручнай мэбляй. У дэкаратыўным афармленні залаў рэстарана выкарыстаны нацыянальныя традыцыі. У зале 1-га паверха фраўляная абліцоўка пілонаў пакрыта разным раслінным і геаметрычным арнаментам (мастак І. Сідараў). Уваходы з залы ў рабочыя памяшканні аформлены дэкаратыўнымі перагародкамі, у металічны каркас якіх на 1-м паверсе ўмантаваны прамавугольныя кампазіцыі са стылізаванымі выявамі ... (чаканка па медзі; мастак У. Ізергін).

24. *... «Інтурыст». Інтэр'ер рэстарана. Кампазіцыя «Вяселле». Разьба па дрэве*

23. *Гасцініца «Інтурыст». Інтэр'ер рэстарана. Фрагмент калоны. Разьба па ...*

... у 1960-я гады) мае з двара кароткае крыло з мансардавым дахам. Вуглы і цэнтр галоўнага фасада скругленыя, апрацаваны рустам. Тарцы 1-га паверха апрацаваны рустам і трактаваны як цокальны. Фасад завяршае высокі парапет з трохвугольным атыкам у цэнтры. Прамавугольныя аконныя праёмы верхніх паверхаў дэкарыраваны прафіляванымі ліштвамі з сандрыкамі. Сіметрыю фасаду надаюць раўнамерна размешчаныя 3 балконы з ажурнай агароджай. Планіроўка будынка сіметрычная з цэнтрам у зоне цэнтральнага вестыбюля.

24. *Жылы дом на вуліцы Леніна, 39.*

Мемарыяльная дошка ўстаноўлена ў 1964 г. па ушанаванне памяці Г. А. Аржанавай, якая працавала ў гады акупацыі Брэста нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў аптэцы па заданню партыйнага падполля.

Г. А. Аржанава нарадзілася 5.1.1922 г. у с. Іванаўскае Валакаламскага р-на Маскоўскай вобл. У 1940 г. пасля заканчэння Маскоўскага фармацэўтычнага тэхнікума накіравана ў Брэст. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўключылася ў барацьбу супраць ворага. Была сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі, у якую ўваходзіла каля 20 чалавек. З 1942 г. партызанская сувязная. Здабывала бланкі пашпартоў, наладжвала канспіратыўныя сустрэчы партызанскіх сувязных з падпольшчыкамі горада, удзельнічала ў арганізацыі ўцёкаў савецкіх ваеннапалонных з канцлагераў. У снежні 1943 г. па даносу правакатара фашысты арыштавалі патрыётку і пасля жорсткіх катаванняў павесілі. Г. А. Аржанава пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

Літ.: Воровский А. И. ... сердца. [Брест ...] — 3 изд. — Мн., 1977.

Г. І. Дыябо, А. М. Кулагін.

26. ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ 17 ВЕРАСНЯ (архіт.). Ансамбль гарадской забудовы склаўся ў канцы 19 — 1-й палавіне 20 ст., уключае жылыя дамы № 29, 31, 33, 35. Будынкі маюць характэрную для таго часу бланіроўку, аб'яднаны ў самастойныя фрагменты. Галоўныя фасады выходзяць на чырвоную лінію забудовы. Уваходы з двара. Праезд паміж дамамі № 33 і 35.

Дом № 29. На скрыжаванні вул. 17 Верасня і Дзяржынскага. Рэканструяваны ў 1980 г. Вуглавое размешчэнне абумовіла форму плана ў выглядзе няправільнага прамавугольніка з закругленым вуглом. Плоскасныя атынкаваныя фасады двухпавярховага будынка дзеляцца прамавугольнымі аконнымі праёмамі, завершаны развітым прафіляваным карнізам. Асіметрыю фасадам надае вуглавое размяшчэнне балкона з ажурнай агароджай. У правым крыле галоўнага фасада



24. *Жылы дом на вуліцы Леніна, 39. План 1-га паверха.*

25. *Жылы дом на вуліцы Н...скай, 1б.*



25. *Мемарыяльная дошка Г. А. Аржанавай.*

захаваліся рэзныя бакавыя філенгі. Бакавы фасад завершаны трохвугольным шчытом з вокнамі мансардавага паверха. Дом падзелены капітальнай унутранай сцяной на 2 секцыі з самастойнымі ўваходамі з вуліцы і з двара. Між паверхамі ... лесвіца ў вуглавой частцы дома пры дваровым уваходзе.

Дом № 31. Аднапавярховы. Тарцовымі сценамі састыкаваны з дамамі № 29 і 33, што стварае адзіны фронт забудовы. Архітэктура без элементаў дэкору. Галоўны фасад з 4 прамавугольнымі вокнамі. Унутраная прастора падзелена капітальнымі сценамі на кватэры.

Дом № 33. Часткай тарцовай сцяны прымыкае да дома № 31. Яго двухпавярховы аб'ём развіты ў глыбіню двара і блізкі па форме да квадрата. Галоўны фасад мае плоскаснае вырашэнне, рытмічна падзелены прамавугольнымі вокнамі. Асіметрыю надае бакавы балкон. Элементы архітэктурнага дэкору — часткова ўцалелыя сандрыкі і карнізы. Тарцовы фасад, расчлянёны лучковымі і прамавугольнымі вокнамі, выходзіць на дваровы праезд. Унутраныя сцены дзеляць дом на 2 кватэры з лесвічнай клеткай пры дваровым уваходзе.

Дом № 35. Двухпавярховы компактны прамавугольны ў плане аб'ём

26. Забудова вуліцы 17 Верасня. Фрагмент.

[illegible] Галоўна[illegible] [illegible] фаса[illegible] [illegible] [illegible] ланкам [illegible] [illegible] [illegible] на [illegible] [illegible] чым воемам лесвічнай клеткі і за[illegible] [illegible] 2-м паверсе.

Дом № [illegible] [illegible] [illegible] галоўнага фас[illegible] а балкон [illegible] ным аб[illegible] вакары[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] лянная галерэя.

Фрагмен[illegible] забудовы [illegible] архітэк[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]

27. Вуліца Карла Маркса. Дамы № 53, 55.

26. Забудова вуліцы 17 Верасня. Фрагмент плана.

насць і маляўнічасць агульнай гара[illegible] [illegible] камяніцы.

А. М. Кулагін.

27. ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ КАРЛА МАРКСА (архіт.). Вялася ў 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. Ува[illegible] [illegible]раваныя будынкі (№ 43, [illegible] 66, 70) ствараюць ансамбль. У забудове вуліцы вылучаюцца таксама дамы № 11 і 20.

Дом № 43. Трохпавярховы, прамавугольны ў плане. Цэнтральная і бакавыя часткі галоўнага фасада акцэнтаваны рызалітамі, фланкіраваны лапаткамі. Паверхі аддзелены карнізнымі паясамі. Сцяна галоўнага фасада на 1-м паверсе пакрыта рустам і прарэзана прамавугольнымі аконнымі праёмамі, на 2-м — дэкарыравана балюстрадай у неглыбокіх нішах, над аконнымі праёмамі — сандрыкі і дэкаратыўныя ракавіны.

Дом № [illegible] Трохпавярховы [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] ны аконны праём, багата дэкарыравана[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] паверха [illegible] балюстрады [illegible] [illegible]ных нішах, балконы на кранштэйнах і [illegible] чыгуннай літай агароджай.

Дом № 55. Двухпавярховы, з [illegible]метрычным складаным планам. Галоўны сіметрычны фасад фланкіраваны неглыбокімі рызалітамі з руставанымі лапаткамі і багата аздобленымі аконнымі праёмамі (ляпныя картушы, карынфскія пілястры). Пад карнізам па ўсім фасадзе праходзіць дэкаратыўны пояс з сухарыкамі. Балконы з чыгуннай літай агароджай апіраюцца на кранштэйны.

27. Вуліца Карла Маркса. План 1-га паверха дома № 53.



27. *Забудова вуліцы Карла Маркса. План дома № 60*

27. *Забудова вуліцы Карла Маркса Дом № 66*

Дом № 57. Двухпавярховы, з несіметрычным планам. Дэкаратыўная аздоба галоўнага сіметрычнага фасада аднатыпная з аздобай дамоў № 53 і 55. У цэнтры галоўнага фасада рызаліт з паўцыркульнымі праёмамі, якія дэкарыраваны ліштвамі і ляпнымі сандрыкамі. Над аконнымі праёмамі — дэкаратыўная балюстрада.

Дом № 60. Двухпавярховы будынак мае складаную форму плана. Багатая дэкаратыўная аздоба сканцэнтравана на сіметрычна вырашаным галоўным фасадзе. Сцяна галоўнага фасада падзелена карнізным паяском. Над карнізам — пояс сухарыкаў. Першы паверх пакрыты рустам, 2-і — багата дэкарыраваны іанічнымі пілястрамі, ляпнымі картушамі, дэкаратыўнымі ракавінамі. Цяпер корпус Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна.

Дом № 66. Будынак двухпавярховы са складаным планам і сіметрычным фасадам. Дэкаратыўная аздоба і пластыка галоўнага фасада вырашана ў тых жа формах, што і папярэдніх дамоў (неглыбокія рызаліты, міжпаверхавы карнізны паясок, руставаныя лапаткі і дэкаратыўныя сандрыкі). Над уваходам двухсхільны брыль на ажурных кранштэйнах (чыгуннае ліццё). Тарцовыя фасады завершаны трохвугольнымі франтонамі з паўцыркульнымі праемамі ў тымпанах.

Дом № 70. Двухпавярховы Г-падобны ў плане будынак з цэглы. Мае сіметрычны галоўны фасад. Цэнтральная частка вылучана руставанымі пілястрамі, паміж якімі галоўны ўваход. Над ім паўцыркульны аконны праём. Пластыку фасада ўзбагачаюць ступеньчатая і фігурная муроўкі, паяскі геаметрычнага арнаменту, руставаныя лапаткі.

Дом № 11. Двухпавярховы будынак з цэглы. У дэкаратыўнай аздобе шырока выкарыстана цэгла крывалінейнага абрысу (лякальная). Галоўны фасад фланкіраваны 2 рызалітамі, завершанымі атыкавымі сценкамі з шпакламі. У кожным рызаліце на 2-м паверсе балкон на масіўных кранштэйнах. У дэкаратыўнай аздобе фасада выкарыстаны фігурныя калоны, руставаныя лапаткі, фігурная і арнаментальная муроўкі.

Дом № 20. Аднапавярховы мураваны будынак. Пабудаваны як гарадскі асабняк. Вылучаецца з усёй забудовы вуліцы. Кампазіцыйны акцэнт дома — чатырохкалонны дарычны порцік з трохвугольным франтонам, у тымпане якога лучковы аконны праём. На бакавых фасадах несапраўдныя порцікі з дарычнымі пілястрамі. Галоўны фасад фланкіраваны 2 паўкруглымі эркерамі, паміж якімі трохчвэртныя калоны дарычнага ордэра. Будынак завершаны карнізам з паяском сухарыкаў. Цяпер у ім размешчаны дзіцячы сад.

Забудова вул. К. Маркса ўключае дамы розных архітэктурна-стылявой трактоўкі, характэрны помнік горадабудаўніцтва Брэста таго часу.

А. Ю. Пятросава

28. ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ ЛЕВАНЕЎСКАГА (архіт.). У жылым раёне, абмежаваным вуліцамі Леніна, Маскоўскай, паркам імя 1 Мая, забудаваным у 1921—39 гг. на прамавугольнай сістэме вуліц (праект арх. Ю. Лісецкага). У аснову планіроўкі і забудовы пакладзены комплексны метад з выкарыстаннем тыпавых дамоў 2 відаў тыпа двух-, шматсекцыйных і асабнякоў.

Аднасекцыйны жылы дом № 3. Пабудаваны ў 1928 г. з цэглы. Аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак з невялікім прысядзібным участкам. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя грунтуецца на кантрасце пры



27. *Забудова вуліцы Карла Маркса План 1-га паверха дома № 11*

27. *Забудова вуліцы Карла Маркса Дом № 11*

28. Забудова вуліцы Леванеўскага. Дом № 3.

сэмістага паверха і высокага пластычнага даху. Бакавыя фасады і фігурныя атыкі мезаніна, якія выходзяць на галоўны фасад, дэкарыраваны лапаткамі, люкарнамі, сандрыкамі. На 1-м паверсе трохпакаёвая кватэра, у мансардзе — двухпакаёвая. Асобныя ўваходы ў кватэры размешчаны ў нішах галоўнага фасада. Нішы створаны 2 аркамі з вуглавой апорай, маюць крыжовыя скляпенні.

Асабняк. Дом № 5. У радзе аднатыпнай забудовы. Пабудаваны ў 1930-я гады з цэглы. Аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак з высокім мансардавым дахам. Цэнтральны ўваход размешчаны ў глыбокай лоджыі з трохпралётнай аркадай на 2 калонках. Сіметрыя пластычнага даху з боку галоўнага (паўднёва-усходняга) фасада падкрэслена 3 люкарнамі. Вуглавыя нішы і шырокія лапаткі ў прасценках паміж прамавугольнымі вокнамі надаюць фасадам пластычнасць. У калідорнай планіроўцы будынка вызначаецца цэнтральны вестыбюль з лесвіцай на мансардавы паверх.

28. Забудова вуліцы Леванеўскага. Дом № 5. Фрагмент галоўнага фасада.

Будынкі № 9, 11 на вул. Леванеўскага аднатыпныя з дамамі № 3, 5. Яны ствараюць своеасаблівы ансамбль — характэрны прыклад тыпавой секцыйнай і асабняковай забудовы гэтага раёна. *В. М. Чарнатай*

29. ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ САВЕЦКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ (архіт.).

У канцы 19—1-й палавіне 20 ст. ўздоўж вуліцы склалася рэгулярная сетка капітальнай жылой забудовы. Захаваўся толькі яе фрагмент — тыповыя дамы № 21, 23, 25, 27, 29, раздзеленыя дваровымі праездамі.

Дом № 21. Невялікі двухпавярховы блізкі ў плане да квадрата аб'ём з



28. Забудова вуліцы Леванеўскага. План дома № 5.



28. Забудова вуліцы Леванеўскага. План дома № 3.

двухсхільным дахам. Галоўны фасад выходзіць на чырвоную лінію забудовы, мае плоскаснае вырашэнне, падзелены прамавугольнымі аконнымі праемамі ў простых ліштвах. Уваходы ў дом з боку ўнутранага двара і бакавога фасада. Капітальная сцяна падзяляе ўнутраную прастору на 2 палавіны. Жылыя і гаспадарчыя пакоі аб'яднаны агульным калідорам. Міжпаверхавая лесвіца прыбудавана з двара.

Дом № 23. Прымыкае да дома № 21, складае з ім адзін корпус. Прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак развіты ў глыбіню двара, на вуліцу выходзіць вузкім тарцовым фасадам. Кампазіцыя мае асіметрычны характар. Прамавугольныя аконныя праёмы ўпрыгожаны пластычнымі ліштвамі. У пластычным атынкаванага фасада выкарыстаны вуглавыя лапаткі, міжпаверхавы пояс. Уваходы ў будынак зроблены з двара і з бакавога фасада. На бакавым шчыце вокны мансардавага паверха. Цэнтральны калідор і міжпаверхавая лесвіца дзеляць дом на 2 палавіны, у якіх трох- і двухпакаёвыя кватэры з сумежнымі пакоямі.

29. Забудова вуліцы Савецкіх пагранічнікаў. Дамы № 21—27.

Дом № 25. Двухпавярховы прамавугольны ў плане аб'ём выходзіць



30. *Будынак казармы. План.*

тарцовым фасадам на «чырвоную лінію» забудовы. Яго атынкавалі плоскасць падзелена прамавугольнымі аконнымі праёмамі, вугла́вымі лапаткамі і міжпаверхавым поясам. Дом на 2 палавіны з 2 асобнымі уваходамі — бакавым і з двара. Лесвіца на 2-і паверх — у прыбудове.

Дом № 27. Прамавугольны ў плане двухпавярховы аб'ём накрыты пакатым дахам. Цэнтр кампазіцыі галоўнага фасада вылучаны лоджыяй, завершаны фігурным раскрапаваным атыкам. Манументальнасць цэнтральнай часткі падкрэслена спакойнай роўнядззю сцен бакавых крылаў. Сіметрыя галоўнага фасада парушана скразным праездам у форме лучковай аркі. Архітэктурны дэкор уключае канеліраваныя слупы і пілястры, нішы, руст. Пластыка-арнаментальны акцэнт стварае цэнтральны балкон з ажурнай металічнай агароджай. Вылучаюцца арачныя праёмы лоджыі. Цэнтральнае месца ў плане будынка займае вялікі вестыбюль з трохмаршавай лесвіцай. Планіроўка калідорна-анфіладная.

Дом № 29. На скрыжаванні вуліц Савецкіх пагранічнікаў і Свярдлова. Трохпавярховы будынак (3-і паверх надбудаваны пазней) мае прамавугольны план. Галоўны фасад з руставаным 1-м паверхам вылучаны ў цэнтры ўваходным праёмам з філёнгавымі дзвярамі і пластычным парталам з руставанымі лапаткамі. Галоўная вось фасада на 2-м паверсе падкрэслена высокім арачным акном у прафіляванай ліштве з пілястрамі. Арачны праём фланкіраваны скругленымі балконамі з выпуклай кра- цістай агароджай. Пластычная выразнасць фасадаў дасягаецца выкарыстаннем ліштваў, балюстрад, сандрыкаў, карнізаў. Вуглавая частка дома вырашана ў выглядзе вузкай грані з балконам. Фасады завершаны антаблементамі.

Нягледзячы на розны стыль, дамы складаюць своеасаблівы ансамбль, характэрны для горадабудаўніцтва Брэста 2-й палавіны 19 — пачатку 20 ст. *А. М. Кулагін*

30. КАЗАРМА (архіт.). Вул. Леніна, 25. Пабудавана ў 1840-я гады з цэглы для гарнізона крэпасці. Цяпер жылы дом.

Аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак накрыты вальмавым

30. *Будынак казармы*

дахам. Мае нізкі цокаль, дваровыя прыбудовы-тамбуры. Плоскі галоўны фасад рытмічна расчляняюць 13 лучковых праёмаў. Архітэктурна-дэкаратыўная выразнасць дасягаецца арнаментальнай і лякальнай муроўкамі, клінападобнымі вушакамі, падаконнымі завяршальнымі карнізамі, вугла́вымі лапаткамі, нішамі. Памяшканні (планіроўка часткова зменена) звязаны калідорамі, якія маюць самастойныя уваходныя вестыбюлі.

Казарма - помнік пашыранай на той час «цагляная архітэктуры».
А. М. Кулагін

31. КАФЕДРАЛЬНЫ КАСЦЕЛ (архіт.). Вул. Леніна, 34. Цяпер у ім размешчаны абласны краязнаўчы музей. Пабудаваны ў 1856 г. з цэглы. Разбураны ў Вялікую Айчынную вайну. У 1950–57 гг. адноўлены і перабудаваны. Базілікальнае збудаванне. Галоўны фасад раней завяршалі 2 бакавыя вежы з трохвугольным франтонам паміж імі (вежы не адноўлены). Касцел — помнік архітэктуры позняга класіцызму.
Т. І. Чарняўская

32. КІНАТЭАТР «БЕЛАРУСЬ» (архіт., маст.). Вул. Савецкая, 17. Пабудаваны ў 1977 г. (арх. Р. Шылан, інж. У. Самцоў, С. Мартынаў).

Трохпавярховы будынак кінатэатра ўваходзіць у ансамбль новай забудовы вул. Савецкай. У аснову аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі закладзены ўцалелы васьмігранны будынак 19 ст., на аснове якога ўзведзены сцены з высокім зашкленымі плоскасцямі (акрамя дваровай часткі, дзе зроблены надбудовы). На 1-м паверсе касавы вестыбюль свабодна пераходзіць у фае малой залы на 400 месцаў. Тут жа 2 лесвіцы, якія вядуць на 2-і паверх у фае вялікай залы на 400 месцаў. На 3-м паверсе — тэхнічныя памяшканні, кінапраекцыйны комплекс. Пры будаўніцтве кінатэатра выкарыстаны прагрэсіўныя канструкцыі і новыя матэрыялы — ажурныя жалезабетонныя рамы, веерападобныя бэлькі перакрыцця, ганчарныя трубкі. У фае — панельная сістэма ацяплення, у залах — кан-



31. *Будынак былога кафедральнага касцёла. План*

31. *Будынак былога кафедральнага касцёла. Галоўны фасад*

31. К натэатр «Белар...»



32. Кінатэатр «Беларусь». План

...інэеры. Для ўнутранай аздаблення выкарыстаны граніт і мармур. У фае 2-га паверха, на тарцовай сцяне, якая ... (мастак І. Крупско, сграфіта). У цэнтры кампазіцыі — жаночая фігура ў акружэнні алегарычных вобразаў, якія адлюстроўваюць мінулае, сучаснае і будучае краю. Пано вытрымана ў блакітна-шэрай гаме. У 2 паўцыркульных нішах фае каляровыя вітражы (маст. М. Клімаў, У. Ткалаеў).

Кінатэатр «Беларусь» прыклад савецкай архітэктуры 1970-х гадоў.

Т. І. Чарняўская, Г. М. Ярмоленка.

33. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ... на 4-м км шашы Брэст — Ковель. Пахаваны 15 тыс. савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў, расстраляных і закатаваных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941—44 гг. у канцэнтрацыйным лагеры. У 1... г. на магіле ўстаноўлены мемарыяльны знак (арх. В. ...ан).

33. К... ...

34. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На Плоскіх могілках. Пахаваны савецкія грамадзяне, закатаваныя нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1943 г. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

35. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Вул. Маскоўская, на Трышынскіх могілках. Пахаваны 24 жыхары г. Брэста, якія ад іпулі у першы дзень Вялікай Айчыннай вайны ... 1941 г. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

36. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Вул. Маскоўская, на Трышынскіх могілках. Пахаваны савецкія грамадзяне, загубленыя нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941—44 гг. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

37. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Вул. Цагельная, на тэрыторыі былога цагельнага завода № 22. Пахаваны рабочыя і служачыя завода, якіх 22.6.1941 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі за дапамогу савецкім воінам абаронцам Брэста. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

38. МАГІЛА ЗАСІМА Міхаіла Арцемавіча (гіст.). Вул. Маскоўская, на Трышынскіх могілках.

Беларускі паэт М. А. Засім нарадзіўся 1911 1908 г. у в. Шаш Пружанскага р-на. Член КПСС з 1956 г. У 1-ю сусветную вайну разам з бацькамі эвакуіраваўся ў Саратаўскую губерню. У 1922 г. вярнуўся на радзіму, уступіў у КПЗБ. За падпольную рэвалюцыйную дзейнасць не раз быў арыштаваны ўладамі буржуазнай Польшчы. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў у Пружанскім часовым упраўленні, у 1940 г. выбраны старшынёй Шашоўскага сельсавета. У Вялікую Айчынную вайну змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у партызанскіх

атрадах, быў інструктарам Антыфашысцкага камітэта Брэсцкай вобл. У 1944—46 гг. загадчык аддзела Пружанскага райвыканкома. У 1948 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б. У 1948—[illegible] у рэдакцыі брэсцкай абласной газеты «Заря». Друкавацца пачаў з 1926 г. у часопісах і газетах «Наша воля», «Наша праца», «Маланка», «Асва» «Беларускі летапіс» і інш. (псеўданімы Хлапец, Агонь, Ацот, Міз, М. Асот). У вайну друкаваўся ў падпольных газетах «Заря», «За Родину». Выдадзены зборнікі вершаў «Ад шчырага сэрца» (1947 г.), «Вершы» (1954 г.), «Выбранае» (1960 г.), «Вершы» (1973 г.). У сваіх творах услаўляў родны край, пісаў аб жыцці сялян Заходняй Беларусі, пра будні і гераізм партызанскай барацьбы з ворагам у Вялікую Айчынную вайну, мірную працу савецкіх людзей. На рускую мову вершы М. Засіма перакладалі А. Твардоўскі, М. Луконін. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 19.7.1957 г. У 1957 г. на магіле пастаўлена стэла.

[illegible] Аўтабіяграфія [illegible] Мн., 1968.

В. Б. Караткевіч

39. МАГІЛА ІШКОВЫХ Міхаіла Кузьміча і Еўдакіі Міхайлаўны (гіст.). На захад ад былой в. [illegible]ка, дзе да Вялікай Айчыннай вайны была 10-я пагранічная застава. Начальнік заставы М. К. Ішкоў і яго жонка загінулі 22.6.1941 г. ў баі з групай нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

40. МАГІЛА СТАРАЖЭНКІ Аляксея Пятровіча (гіст.). Вул. Маскоўская, на Трышынскіх могілках.

Украінскі пісьменнік, музыкант, скульптар А. П. Старажэнка нарадзіўся 24.11.1805 г. ў в. Лысагоры на Чарнігаўшчыне. Пачаў пісаць на рускай мове, друкаваўся ў газеце «Северная пчела», часопісе «Библиотека для чтения». У 1863 г. выдадзены двухтомнік украінскіх апавяданняў. Многія з іх напісаны на аснове народных паданняў, легенд, этнаграфічнага і гістарычнага матэрыялу. Высмейваў бюракратызм, фармалізм, панства. Памёр 19.11.1874 г. на хутары Гарошына пад Брэстам. У 1874 г. ўстаноўлены надмагільны камень.

41. МАГІЛА СТАРЧАКОВА Уладзіміра Васілевіча (гіст.). Вул. Маскоўская, на Трышынскіх могілках.

Мастак У. В. Старчакоў нарадзіўся 20.3.1911 г. ў с. Рочань Харкаўскай [illegible] у сям'і будаўніка. У 1930—[illegible] вучыўся ў Харкаўскім мастацкім інстытуце. Працаваў мастаком-пастаноўшчыкам у Харкаве, Яраслаўлі, Барысаглебску, Варонежы, з 1951 г. у Брэсце, член Саюза мастакоў СССР. Удзельнік 6-й Усеўкраінскай выстаўкі ў Харкаве (1935 г.). З 1950 г.



33. Помнік на месцы былога канцэнтрацыйнага лагера і магіле ахвяр фашызму

[illegible] удзельнічаў у мастацкіх [illegible] выстаўках. Удзельнік [illegible] экспазіцыі Музея [illegible] Брэсцкай крэпасці-героя. У Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі яго дыярама «Белавежская пушча» (1967 г.). Аўтар палотнаў «Старыя гнёзды», «Сакавіцкае сонца», «Валуны» «Свяшчэнныя камяні», «Першая вясна», «Індустрыяльная сімфонія» і інш. (у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР і музеях Брэсцкай вобл.). Памёр У. В. Старчакоў 6.1.1968 г. У 1972 г. на магіле пастаўлена стэла з барэльефам.

Літ.: Художники Советской Белоруссии. [illegible]

В. Б. Караткевіч

42. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БАЗАНАВАЙ Лідзіі Андрэеўны і **СЯМ'І ГРЫГАРУКА** Спірыдона Сяргеевіча (гіст.). Вул. К. Лібкнехта, 17. Са снежня 1943 г. да красавіка 1944 г. тут у сям'і Грыгарукоў жыла савецкая разведчыца Л. А. Базанава.

Л. А. Базанава нарадзілася ў май 1919 г. ў пас. Рэдкіна Канакоўскага р-на Калінінскай вобл. Пасля заканчэння тэхнікума працавала на тэкстыльнай фабрыцы. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны добраахвотна ўступіла ў Чырвоную Армію, скончыла курсы радыстаў. У 1943 г. накіравана ў тыл ворага (Бабруйск, потым Брэст). Разведчыца наладзіла сувязь з падпольшчыкамі М. Крылюком, І. Д. Філіпуком і А. Шым, сістэматычна перадавала ў цэнтр звесткі аб дыслакацыі і перамяшчэнні ваенных частак праціўніка, размяшчэнні складоў, умацаванняў і інш. Арыштавана вясной 1944 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі, мужна трымалася на допытах, адмаўляла праціўніку супрацоўнічаць з варожай разведкай.

У красавіку 1944 г. Л. А. Базанава, гаспадар дома С. С. Грыгарук, яго жонка Надзея Васілеўна і дачка Ніна расстраляны. У 1964 г. Л. А. Базанава пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Мемарыяльная дошка на доме С. С. Грыгарука ўстаноўлена ў 1964 г.

Літ.: Боровской А. П. О них молвили сводки. Брест [illegible] — Мн., 1976.

Г. І. Дулеба

43. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ГУЛАВУ Паўлу Мартынавічу (гіст.). Вул. Маякоўскага, 6. Устаноўлена ў 1974 г. па ўшанаванне памяці ганаровага грамадзяніна г. Брэста П. М. Гулава, які жыў у гэтым доме. Гл. артыкул № 21 «Гарнізонныя могілкі».

44. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЖУЛІКАВУ Пятру Георгіевічу (гіст.). На будынку чыгуначнага вакзала.

Былы сакратар парткома чыгуначнага вузла П. Г. Жулікаў з першых дзён акупацыі горада нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўключыўся ў барацьбу з ворагам. Пад яго кіраўніцтвам створана падпольная арганізацыя, у жніўні 1941 г. [illegible] партыйны цэнтр, які аб'ядноўваў 7 арганізацый (125 камуністаў) [illegible] распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных, пераправалялі іх у партызанскія атрады. У снежні 1943 г. фашысты арыштавалі П. Г. Жулікава і яго сям'ю. Пасля катаванняў на допытах Пётр Георгіевіч памёр у турме. Жонку і яе маці [illegible] расстралялі. П. Г. Жулікаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. [illegible] на будынку вакзала ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Смирнов С. С. Были великой войны. М., 1966; Гречнева Л. Брестский вокзал — Неман, 1977, № 6.

М. А. Балашевіч

45. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КАРБЫШАВУ Дзмітрыю Міхайлавічу (гіст.). Вул. Карбышава, 26. Савецкі [illegible] інжынерных войск (з 1940 г.), доктар ваенных навук (з 1941 г.), прафесар (з 1938 г.), Герой Савецкага Саюза. Дз. М. Карбышаў у 1911—14 гг. жыў і працаваў у Брэсце.

Дз. М. Карбышаў нарадзіўся 26.10.1880 г. ў Омску. Член КПСС з 1940 г. Удзельнік руска-японскай і 1-й сусветнай войнаў. Пасля заканчэння ў 1911 г. Мікалаеўскай інжынернай акадэміі ў Брэсцкай крэпасці кіраваў нерабудовай 7-га форта, праектаваў і узначальваў будаўніцтва форта «[illegible]», работы па ўмацаванню [illegible] пазіцый, удзельнічаў ва ўзвядзенні іншых аб'ектаў. З снежня 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі. Шмат сіл аддаваў рэарганізацыі інжынерных войск, ума

цаванню граніц Савецкай дзяржавы, над вытворцы ваенна-інжынерных кадраў. Вялікую Айчынную вайну сустрэў у раёне Гродна. З баямі прайшоў нялёгкі шлях адступлення. Пад Магілёвам цяжка кантужаны трапіў у палон. Фашысты спрабавалі прымусіць Дз. М. Карбышава здрадзіць Радзіме, але не скарылі яго волю. У лагерах смерці Асвенцім, Майданек, Заксенхаўзен, Маўтхаўзен і інш. вёў антыфашысцкую прапаганду сярод вязняў, быў для іх сімвалам стойкасці і вернасці патрыятычнаму абавязку. 18.2.1945 г. па-зверску замардаваны фашыстамі ў канцлагеры Маўтхаўзен. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 16.8.1946 г. У Брэсце і Маскве яго імем названы вуліцы. У 1964 г. ў Брэсце на доме, які пабудаваны на месцы, дзе была кватэра Дз. М. Карбышава, устаноўлена мемарыяльная дошка. У Омску, Маскве Талине і ў Аўстрыі, на тэрыторыі былога лагера Маўтхаузен, пастаўлены помнікі, у Гродне і Ваўкавыску — мемарыяльныя дошкі.

Літ.: Решин Е. Г. Генерал Карбышев [illegible] изд.— М., 1980. Солдат, герой, учёный: Воспоминания о Д. М. Карбышеве. М., 1961; Голубов С. Когда крепости не сдаются.— М., 1970.

46. МЕСЦА БОЮ 1812 г. (гіст.). На вул. Герояў абароны Брэсцкай крэпасці. 25.7.1812 г. перадавыя часці 3-й рускай арміі пад камандаваннем генерала А. Р. Шчарбатава нанеслі паражэнне буйным кавалерыйскім атрадам напалеонаўскай арміі і выбілі іх з горада. У памяць аб гэтай падзеі справа ад Паўночных варот Брэсцкай крэпасці ў 1962 г. ўстаноўлены мемарыяльны знак.

47. МЕСЦА БОЮ 1941 г. (гіст.). На вул. Дзяржынскага. Напярэдадні вайны будынак аблваенкамата, цяпер на гэтым месцы жылы дом. Тут 22.6.1941 г. пад камандаваннем аблваенкома маёра М. Я. Стафеева вялі бой супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў салдаты і камандзіры Чырвонай Арміі, партыйныя, камсамольскія і савецкія работнікі горада. Фашысты не змаглі зламаць супраціўлення абаронцаў, і тады яны разбамбілі будынак. Многія ўдзельнікі бою загінулі. У 1964 г. на ўшанаванне іх памяці на доме № 7 устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Буг в огне: [Зб. успамінаў]. 3 изд. Мн., 1977.

48. МЕСЦА БОЮ ПАГРАНІЧНІКАЎ (гіст.). На захад ад былой в. Валынка, дзе была 10-я пагранзастава.

Раніцай 22 чэрвеня 1941 г. нямецка-фашысцкія захопнікі абрушылі на заставу шквал артылерыйскага і мінаметнага агню. Пагранічнікі мужна абараняліся. У баі загінулі начальнік заставы М. К. Ішкоў і 19 пагранічнікаў. У 1968 г. на ўшанаванне іх памяці на месцы бою пастаўлены абеліск.

46. Месца бою 1812 г. Мемарыяльны знак.

49. МЕСЦА, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЛАСЯ ПАДПОЛЬНАЯ ДРУКАРНЯ ЦК КПЗБ (гіст.). На рагу вуліц Маскоўскай і 17 Верасня, дзе цяпер пабудаваны жылы дом, у 1927—38 гг. працавала падпольная друкарня.

У 1924—29 гг. у выключна цяжкіх умовах КПЗБ наладзіла выпуск партыйнай літаратуры ў нелегальных друкарнях Вільнюса і Беластока. У Брэсце падпольная друкарня знаходзілася ва кватэры члена КПЗБ Івана Раманавіча Валошкі.

І. Р. Валошка — сын беднага селяніна з в. Рачкі Жабінкаўскага р-на. У 1921 г. пераехаў у Брэст, уладкаваўся вартаўніком дома, на 2-м паверсе якога была гімназія. У 1923 г. ўступіў у КПЗБ. Яго кватэра стала месцам сходаў падпольшчыкаў і сховішчам нелегальнай літаратуры. Пазней тут абсталявалі друкарню, наладзілі выпуск падпольнай літаратуры на 5 мовах. У стварэнні друкарні і распаўсюджванні літаратуры актыўны ўдзел прымаў гаспадар кватэры. Друкарня дзейнічала да 1938 г. І. Р. Валошка захаваў яе да верасня 1939 г. і пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР перадаў палітаддзелу пагранічнага атрада. Памёр І. Р. Валошка ў г. Брэсце ў 1967 г.

У 1963 г. на доме № 42 па вул. Маскоўскай у памяць аб дзейнасці падпольнай друкарні ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Ракевич Н. Вдохновитель и организатор [illegible] Коммунист Белоруссии, [illegible], № 5; Слесарук Т. А., Барысавец А. С. Падпольная друкарня КПЗБ — Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1973, № 1. *Т. А. Слесарук.*

50. МЕСЦА ЖЫЦЦЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ФІЛІПОВІЧА Афанасія (гіст.).

Беларускі грамадскі, палітычны і царкоўны дзеяч А. Філіповіч нарадзіўся каля 1597 г. на Брэстчыне ў сям'і рамесніка. Атрымаў добрую на той час адукацыю. Быў настаўнікам пры шляхецкіх дварах. З 1620 г. пры двары магната К. Л. Сапегі, выхавацель Я. Ф. Лубы, якога ўрад Рэчы Паспалітай меў намер выдаць за прэтэндэнта на маскоўскі трон. Калі пераканаўся, што выхоўвае ілжэцаравіча, пастрыгся ў манахі (1627 г.). Жыў у віленскім Свята-Духаўскім і інш. манастырах. У 1633 г. прызначаны намеснікам ігумена ў Дубайскі манастыр (каля Пінска). У гэты час А. Філіповіч апынуўся ў гушчыні антыфеадальнай барацьбы. Выгнаны з Дубая Альбрэхтам Радзівілам, перайшоў у 1636 г. ў Купяціцкі манастыр. У 1637—38 гг. ездзіў у Маскву да цара Міхаіла Федаравіча, раскрыў яму тайну Я. Ф. Лубы, напісаў гісторыю свайго падарожжа ў Маскву. У 1640 г. брэсцкія братчыкі выбралі А. Філіповіча ігуменам Сімяонаўскага манастыра (Брэст). Вёў актыўную дзейнасць супраць уніятаў. У 1641 і 1643 гг. выступаў на дзяржаўных сеймах у Варшаве з выпадамі ў адрас караля. У 1643 г. сасланы ў Кіеў, неўзабаве вярнуўся ў Брэст. У 1644 г. арыштаваны. Вызвалены ў пачатку 1647 г. 1.7.1648 г. арыштаваны па даносу за дапамогу казакам Багдана Хмяльніцкага і распаўсюджванне агітацыйных лісткоў. 5.9.1648 г. расстраляны каля в. Гершоны Брэсцкага р-на.

Публіцыстыка А. Філіповіча аб'яднана ў адзіны твор — «Дыярыуш» («Дзённік», 1646 г.), які па задуме аўтара павінен быў даць грунтоўнае тлумачэнне сутнасці яго барацьбы і пакут. У «Дыярыушы» выкладзены патрабаванні рашучых змен ва ўнутранай і знешняй палітыцы караля і сейма.

А. Філіповіч быў мужным змагаром за сацыяльныя інтарэсы люду беларускага і ўкраінскага народаў, за саюз з рускім народам. У «Дыярыушы» змешчаны запісаны кіеўскай пяцілінейнай натацыяй адзін з найбольш ранніх нотных узораў беларускай музыкі — напеў гімнападобнага канта А. Філіповіча.

Літ.: Коршунов А. Ф. Афанасий Филиппович: Жизнь и творчество.— Мн., 1965. *В. Б. Караткевіч.*

51. МЕСЦА ЖЫЦЦЯ РАШЭТНІКАВА Фёдара Міхайлавіча (гіст.). У 1867—69 гг. у Брэсце жыў рускі пісьменнік-дэмакрат Ф. М. Рашэтнікаў (1841—71 гг.). Уражанні і назіранні з тутэйшага жыцця адлюстраваны ў яго нарысах «Ад Брэст-Літоўска да Пецярбурга», камедыі «Прагрэс у павятовым горадзе» і шэрагу апавяданняў.

52. МЕСЦА ЗАГУБЫ АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На вул. Маскоўскай,

паміж валамі былога форта № 3. Тут у 1942—43 гг. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі каля 1000 савецкіх патрыётаў — вязняў брэсцкай турмы. На ўшанаванне іх памяці ў 1965 г. на корпусе № 1 электрамеханічнага завода (вул. Маскоўская, 202) устаноўлена мемарыяльная дошка.

А. С. Барысавец.

53. МЕСЦА СТВАРЭННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ БРЭСЦКАЙ ГРУПЫ РСДРП (гіст.). Першы сацыял-дэмакратычны гурток узнік у Брэсце ў 2-й палавіне 1890-х гадоў. У 1897 г. паліцыя раскрыла тайнае таварыства рабочых і рамеснікаў, многія яго члены былі арыштаваны. У канцы 1905 г. аформілася Брэсцкая група РСДРП, якая мела сувязь з Паўночна-Заходнім камітэтам РСДРП. У снежні 1905 г. група выпусціла адозву «Да ўсіх грамадзян горада Брэста», у якой заклікала да узброенага паўстання. У 1-й палавіне 1906 г. брэсцкія бальшавікі арганізавалі шэраг забастовак працоўных горада і выступленняў сялян павета. Палітычную работу сярод салдат гарнізона вяла створаная пры групе РСДРП ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя. Пад яе кіраўніцтвам у лістападзе 1905 г. і ў ліпені 1906 г. адбыліся найбольш буйныя хваляванні салдат. У маі 1907 г. большасць членаў групы арыштавана. У памяць аб дзейнасці Брэсцкай групы РСДРП на доме № 42 па вул. К. Маркса ў 1977 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: История Коммунистической партии Советского Союза: В 6 т. Т. 1—2.— М., [illegible] КП(б)Б у рэвалюцыях. Ч. 1 (1903—1921 гг.).— Мн., 1934; Кузнецов А. А. На пути к Октябрю: Из истории [illegible] в Белоруссии 1884—1917 гг.— Мн., 1970; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 1. 2 изд.— Мн., 1968; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы.— Мн., [illegible]

Э. М. Савіцкі.

54. МЕСЦА СЛУЖБЫ ГРЫБАЕДАВА Аляксандра Сяргеевіча (гіст.). У 1813—16 гг. у Брэсце служыў ад'ютантам камандзіра рэзервовага кавалерыйскага корпуса рускі пісьменнік і дыпламат А. С. Грыбаедаў (1795—1829 гг.). Тут ён блізка пазнаёміўся з жыццём беларусаў, іх побытам, вуснай народнай творчасцю, напісаў свае першыя творы «Пісьмо з Брэст-Літоўска да выдаўца» [«Веснік Еўропы»] і «Пра кавалерыйскія рэзервы» (1814 г.), камедыю «Маладыя муж і жонка» (1815 г.).

Літ.: Науменко В. Я. Брест: Историко-экономический очерк.— Мн., 1970.

55. МУЖЧЫНСКАЯ ГІМНАЗІЯ (архіт.). Вул. Міцкевіча, 28. Пабудавана ў 1903 г. з цэглы. Цяпер вучэбны корпус педагагічнага інстытута. Спачатку П-падобны ў плане двухпавярховы аб'ём. Пазней надбудаваны 3-і паверх. Галоўны фасад (на «чырвоную лінію» вул. Міцкевіча) мае трохчастковую кампазіцыю, завяршаецца ў цэнтры і па краях трохвугольнымі франтонамі над рызалітамі. Розпавялікія бакавыя фасады утвараюць унутраны двор. Фасады дэкарыраваны цаглянай муроўкай арак, франтонаў, нішаў, машыкуляў. Другі паверх завяршае магутны карніз на кранштэйнах. Рытм фасадаў ствараецца чаргаваннем лучковых аконных праёмаў і лапатак у прасценках. Планіроўка калідорная. Лесвічныя вестыбюлі у цэнтры бакавых крылаў. Галоўная лесвіца вынесена у самастойны дваровы рызаліт.

55. *Будынак былой мужчынскай гімназіі.*

Будынак — помнік грамадзянскага будаўніцтва, у якім шырока выкарыстаны элементы «цаглянай архітэктуры», характэрнай для канца 19 — пачатку 20 ст.

В. М. Чарнатаў.

56. ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ МІКРАРАЁНА УСХОД (архіт.). Вул. Маскоўская, 260. Пабудаваны ў 1980 г. (арх. Г. Чыжыкоў). Фарміруе добраўпарадкаваную плошчу з дэкаратыўнымі сценамі-панорамі, лесвіцамі, газонамі, кветнікамі. Кубападобны аб'ём на калонах, над якім выступае прамавугольнае у плане памяшканне глядзельнай залы. Галоўны фасад вырашаны лаканічна ў выглядзе расчлянёнай калонамі плоскасці з суцэльным зашкленнем. Усе фасады апрацаваны тэразітавай тынкоўкай, галоўны вылучаны вітражом. Ва ўнутраным двары — фантан, газоны, дарожкі выкладзены бетоннымі плітамі. У Палацы 3 залы: глядзельная на 760 месцаў, спартыўная з балконам для гледачоў, лекцыйная на 350 месцаў. Уваход у апошнюю праз шырокі вестыбюль 1-га паверха і двухсветлавое

56. *Палац культуры ў мікрараёне Усход.*

57. *Помнік Вызвалення*

фае 2-га. На 3-м паверсе мастацкая студыя, танцавальная зала, пакоі для гуртковай работы. На 1-м паверсе клубнай часткі памяшканні для адміністрацыі, бібліятэка. У дваццатым сектары бібліятэка, зала для гульняў, пакоі для работы гурткоў. У падвале гардэроб, санвузлы, майстэрні, тэхнічныя службы. У інтэр'еры выкарыстаны чырвоны і зялёны граніт, белы мармур, наборны паркет. У фае зал і бары мастацкая ...

Лаканічная архітэктура будынка, асаблівасці функцыянальнага вырашэння робяць яго адным з удалых гарадскіх грамадска-культурных абу... пасляваеннага часу.

І. М. Кал...

57. ПОМНІК ВЫЗВАЛЕННЯ (гіст., маст.). На пл. Свабоды, у скверы. Узведзены ў 1965 г. ў гонар войск 1-га Беларускага фронту, якія вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

58. *Помнік М. В. Гогалю*

27.7.1944 г. ў ходзе наступальнай Люблінска-Брэсцкай аперацыі войскі 70-й арміі (генерал-лейтэнант В. С. Папоў) абышлі горад з поўдня і злучыліся з часцямі 28-й арміі (генерал-лейтэнант А. А. Лучынскі). Адначасова на ўсходнія подступы да Брэста выйшлі войскі 61-й арміі (генерал-палкоўнік П. А. Белаў). Брэсцкая групоўка праціўніка апынулася ў... галыш. У ноч на 28.7.1944 г. савецкія войскі зламалі ўпартае супраціўленне ворага, авалодалі горадам і крэпасцю. За мужнасць і гераізм 18 злучэнням і 29 вайсковым часцям прысвоены ганаровыя найменні «Брэсцкіх», 28 воінам — званне Героя Савецкага Саюза.

Помнік (арх. А. Гарбачоў і М. Мацвядаў, скульпт. М. Альтшулер; бетон, граніт; вышыня 8,7 м) — высокая, расшыраная ўверсе стэла на шырокім стылабаце. У верхняй частцы яе рэльефныя выявы галавы салдата ў каскецы і галавы дзяўчыны. Стэла абліцавана чырвоным паліраваным гранітам, пліты стылабата пакрыты ...ран мармуровай крошкай. На помніку высечаны надпіс: «28 ліпеня 1944 г. доблесныя войскі 1-га Беларускага фронту штурмам авалодалі горадам і крэпасцю Брэст, завяршыўшы поўнае вызваленне беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945. Т. 4. М., 1962. *Г. І. Сухляк, І. М. Ялатомцава.*

58. ПОМНІК ГОГАЛЮ Мікалаю Васілевічу (гіст.). На бульвары М. В. Гогаля. Пастаўлены ў 1952 г. да 100-годдзя з дня смерці пісьменніка (скульпт. А. Шмакаў, бетон; вышыня бюста 1,1 м, пастамента 2 м).

59. ПОМНІК КІЖАВАТАВУ Андрэю Мітрафанавічу (гіст.). Недалёка ад Брэсцкай крэпасці.

Герой Савецкага Саюза Кіжаватаў А. М. нарадзіўся 20.8.1907 г. ў с. Селішча Пензенскага р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1939 г. У Чырвонай Арміі з 1929 г. Напярэдадні вайны быў начальнікам 9-й заставы 17-га Брэсцкага Чырванасцяжнага пагранічнага атрада, якая размяшчалася ў цытадэлі Брэсцкай крэпасці. 22.6.1941 г. лейтэнант А. М. Кіжаватаў і воіны яго заставы прынялі першы бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Разам з лейтэнантамі А. А. Патапавым і А. А. Саніным кіраваў участкам абароны каля Цярэспальскіх варот, удзельнічаў у смелых вылазках. Быў некалькі разоў паранены. 29 чэрвеня з невялікай групай пагранічнікаў астаўся прыкрываць групы прарыву і загінуў у баі.

На месцы былой казармы заставы пастаўлены памятны знак — гранітны камень з пяціканцовай зоркай і вянком і надпісам на мармуровай дошцы: «Тут, у былым будынку 9-й за-

59. *Помнік А. М. Кіжаватаву*

ставы 17-га Чырванасцяжнага пагранатрада, па-геройску змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў савецкія пагранічнікі пад камандаваннем начальніка заставы лейтэнанта А. М. Кіжаватава». 6.5.1965 г. А. М. Кіжаватаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названы вуліцы ў Брэсце і Мінску, пагранічная застава, цеплаход Дунайскага параходства; с. Селішча перайменавана ў Кіжаватава. У 1965 г. на заставе пастаўлены помнік — бюст героя (скульпт. А. Шмакаў).

Літ.: Навечно в сердце народном. 3 изд. Мн., 1984. *Т. М. Х...*

60. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст., маст.). На пл. Леніна. Пастаўлены ў 1958 г. (скульпт. М. Лапачкін, арх. Г. Заборскі; бронза, граніт; вышыня пастамента 6 м, фігуры 3,8 м).

Бронзавая фігура У. І. Леніна ўстаноўлена на вертыкальным пастаменце са ступеньчатым стылабатам. Правадыр паказаны ў энергічным, стрыманым руху. Правая рука указальным жэстам выцягнута наперад. Скульптар беражліва захаваў індывідуальныя рысы твару У. І. Леніна, адначасова даў абагульнены вобраз правадыра, падкрэсліўшы яго велізарную волю, мэтанакіраванасць, непахіснасць у справядлівасці сваіх

60. *Помнік У. І. Леніну*

дэй. Строгасць і стрыманасць мастацкіх прыемаў дапамаглі аўтарам раскрыць агульную задуму помніка. Пастамент абліцаваны шэравата-чырвонымі плітамі граніту, на ім высечаны надпіс «У. І. Ленін».

Помнік размешчаны побач з адміністрацыйнымі будынкамі горада, добра звязаны з навакольнай архітэктурай, з'яўляецца мастацка-кампазіцыйным акцэнтам плошчы.

Т. І. Лапцэвіч

61. ПОМНІК МІЦКЕВІЧУ Адаму (гіст.). На бульвары А. Міцкевіча. Пастаўлены ў 1965 г. да 110-х угодкаў з дня смерці польскага паэта (скульпт. А. Шмакаў; бетон; вышыня бюста 1,1 м, пастамента 2 м).

62. ПОМНІК НАГАНАВУ Аляксею Фёдаравічу (гіст., маст.). На вул. Наганава, перад Домам піянераў і [illegible]

А. Ф. Наганаў нарадзіўся 25.2.1915 г. ў с. Красная Рэчка Старамайнскага р-на Ульянаўскай вобл. Член ВЛКСМ. З 1937 г. ў Чырвонай Арміі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны служыў у вайсковай часці, дыслацыраванай у Брэсцкай крэпасці. 22.6.1941 лейтэнант А. Ф. Наганаў гераічна абараняў Цярэспальскія вароты, загінуў у баі. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны 1-й ступені. У экспазіцыі Музея Брэсцкай крэпасці героя захоўваецца камсамольскі білет А. Ф. Наганава. Яго імем названы вуліцы ў Брэсце і Мінску.

Помнік пастаўлены ў 1974 г. (граніт, бетон, цэгла; вышыня бюста 0,5 м, пастамента 2 м). Падораны гораду заслужаным скульптарам з Арменіі Міхаэлам Манукянам да 30-годдзя вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ўмацаванай на прамавугольным пастаменце глыбе граніту высечаны партрэт А. Ф. Наганава. Мужны твар увасабляе высакароднасць савецкага афіцэра. Бетонны пастамент абкружаны выкладзенай з цэглы сцяжкай з паўцыркульным завяршэннем, нагадвае скляпенне каземата Брэсцкай крэпасці.

Літ.: Героическая оборона. Сборник воспоминаний об обороне Брестской крепости в июне — июле 1941 г.— 4 изд.— Мн., 1971. *Л. Г. Лапцэвіч*

63. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст., маст.). На скрыжаванні вуліц Леніна і Маскоўскай, арыентаваны ў бок вул. Маскоўскай, якая вядзе да Брэсцкай крэпасці. Пастаўлены ў 1972 г. (скульпт. М. Альтшулер, арх. А. Гарбачоў і М. Мілавідаў) на ўшанаванне памяці пагранічнікаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

На стылабаце з рознымі ўзроўнямі закругленых паверхняў, аб'яднаных 2 лесвіцамі, устаноўлены ступенчата ўздоўж вертыкальнай восі 3 жалезабетонныя двухметровыя кубы. У тоўшчы сярэдняга — гарэльеф з выявай пагранічніка, які сціскае ў руках зброю. Суровы позірк воіна, энергічная мадэліроўка скул, падбародка, пальцаў рук ствараюць вобраз мужнага вартавога граніц. Гарэльеф нібы адухаўляе камень, надае усей кампазіцыі ўнутраную сілу. На верхнім кубе надпіс «Вартавым граніц», каля падножжа, на гранітнай пліце — «Героям пагранічнікам, якія загінулі ў баях за Радзіму ў 1941—1945 гадах». Кубы і лесвіцы абліцаваны ружавата-шэрым гранітам.

Літ.: Бүг в огне. [illegible] 3 изд.— Мн., 1977; Платонов [illegible] Они первыми приняли удар.— М. [illegible]

А. С. Барысаў, Л. Г. [illegible]

64. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). На захад ад гарадской ускраіны Бялынка, на тэрыторыі былой 10-й пагранзаставы. На ўшанаванне памяці начальніка заставы малодшага лейтэнанта Міхаіла Купрыянавіча Ішкова і 19 пагранічнікаў, якія мужна змагаліся і загінулі ў чэрвені 1941 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

65. ПОМНІК САВЕЦКІМ ТАНКІСТАМ (гіст.). На паўднёвай ускраіне горада, каля дарогі Пугачова — Герчоны.

Адными з першых прынялі на сябе удар нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну воіны 22-й танкавай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра В. П. Пугачова

61. *Помнік А. Міцкевічу*

62. *Помнік А. Ф. Наганаву*



63. [illegible]

[illegible] ... ных умовах В. И. Пуганаў уме а ар[illegible] ... 14-га танкавага палка пад камандаваннем капітана М. І. Кудраўцава. 24 чэрвеня ў раёне в. Імянін Кобрынскага р-на В. И. Пуганаў патэрмеў катастрофу. У 1967 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых танкістаў устаноўлены мемарыяльны знак.

Літ.: Бут в огне [illegible] Мн., 1977; Сандалов Л. М. Пережитое. — М., [illegible]. *А. С. Варысевіч*

66. ПРАМЫСЛОВЫ ВУЗЕЛ (архіт.) ва усходняй частцы горада. Тэрыторыя абмежавана вуліцамі Маскоўскай, Піянерскай і Я. Купалы. Арганічна ўваходзіць у агульны ансамбль забудовы раёна. Праект схемы генеральнага плана прамысловага вузла распрацаваны ў інстытуце «Белпрампраект». Уключае 3 прамысловыя зоны: паўднёвую з прадпрыемствамі электратэхнічнай прамысловасці (электрамеханічны завод, 1963—72 гг., арх. І. Боўт, Л. Афанасьева, М. Буйнава; электралямпавы завод, 1963—70 гг., арх. І. Боўт, С. Корчык, Л. Сагалаў), паўночную з прадпрыемствамі лёгкай прамысловасці (дыванновы камбінат, 1961—65 гг., арх. І. Боўт, Н. Шпільман, Л. Міцкевіч, панчошны камбінат, 1965—67 гг., арх. І. Боўт, І. Кітаева, Ж. Сахарава), цэнтральную з гаспадарчым комплексам (аб'екты энергетычнага, складскога і інжынернага забеспячэння).

[illegible] заводаў. У вырашэнні іх ужыты [illegible] ... це са зборных папярэдне напружаных жалезабетонных ферм. Пясучыя і агароджвальныя канструкцыі зборныя.

66. *Дыванновы камбінат*

Узбуйненая сетка калон, адсутнасць капітальных перагародак даюць магчымасць лёгка змяняць унутраную планіроўку і размяшчэнне абсталявання. Каб палепшыць [illegible] цэху ў летні перыяд, дахавае покрыцце арашаецца вадой. Тэхнічны шум паглынае перфараваная падвесная столь з тонкіх алюмініевых лістоў.

Трохпавярховы будынак дыванновага камбіната мае ў плане форму выцягнутага прамавугольніка. [illegible] ны аб'ём галоўнага фасада рытмічна [illegible] [illegible] ... тамбура чаргаваннем служмавых паласоў заціснення і глухіх напелей. [illegible] ... кія сцены, падвесная столь, каларовая [illegible] разны інтэр'ер.

Побач з дыванновым пабудаваны панчошны камбінат. Будынак мае аналагічнае вобемна-прасторавае вырашэнне. Галоўныя вытворчыя памяшканні электрамеханічнага і электралямпавага заводаў [illegible] ... Адміністрацыйна-бытавыя, інжынерныя карпусы, сталовыя, канферэнц-залы вынесены на лінію з цэнтральных магістраляў горада — вул. Маскоўскую.

Брэсцкі прамысловы вузел — адзін з першых прамысловых комплексаў у СССР, дзе выкарыстана тэрытарыяльнае аб'яднанне некалькіх прадпрыемстваў пры [illegible] ... службаў, інжынерных і энергетычных аб'ектаў. Такая забудова забяспечвае [illegible] эфект, стварае магчымасць для [illegible] ... праблемы кампазіцыйных задач. *Л. І. Пом[illegible]*

67. РАДЗІМА ЭСЕН Марыі Маісееўны (гіст.). Удзельніца рэвалюцыйнага руху ў Расіі М. М. Эсен нарадзілася 21.11.1872 г. У 1890-я гады жыла на Украіне, член Кіеўскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага кла

66. *Электрамеханічны завод*

сах. У 1899 г. арыштавана і саслана на пасяленне ў Якуцію. У 1902 г. уцякла за мяжу. У Жэневе сустракалася з У. І. Леніным. У 1903 г. член Пецярбургскага камітэта РСДРП. У 1904 г. кааптавана ў ЦК РСДРП. У 1905 г. член Пецярбургскага, у 1906 г. Маскоўскага камітэтаў партыі. У 1907 г. ад партыйнай дзейнасці адышла. Удзельнічала ў падрыхтоўцы Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1920 г. уступіла ў РКП(б). У 1921—25 гг. на партыйнай рабоце ў Грузіі. З ... у Маскве, працавала ў Дзяржаўным выдавецтве, Камакадэміі, Дзяржлітвыдзе. Памерла 4.2.1956 г. ў Маскве.

Літ.: Славные большевички. — М., 1958.

В. В. Семянюк

68. РЭУКОМ (гіст.). Вул. Пушкінская, 23. У жніўні 1920 г. тут знаходзіўся рэвалюцыйны камітэт — часовы надзвычайны орган Савецкай улады ў Брэсце і павеце. Цяпер у доме паліклініка.

1.8.1920 г. часці Чырвонай Арміі вызвалілі Брэст ад войск буржуазнай Польшчы. У горадзе была ўстаноўлена Савецкая ўлада і створаны рэўком. Яго першым старшынёю быў начальнік палітаддзела 57-й стралковай дывізіі А. І. Угараў, потым М. Мароз. 19.8.1920 г. ў выніку новага наступлення польскіх войск Чырвоная Армія пакінула горад, рэўком эвакуіраваўся і пазней быў расфарміраваны.

У 1967 г. на фасадзе будынка ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: В памяти народной. — Мн., 1969; Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению Советской власти и организации социалистического строительства (июль — декабрь 1920 г.): Сборник документов и материалов. — Мн., 1957.

Т. А. Слесарук

69. СІМЯОНАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Вул. К. Маркса, 84. Пабудавана ў 1865 г. з цэглы.

Будынак цэнтрычнай кампазіцыі. Квадратны ў плане аб'ём пастаўлены на высокі цокаль, аблицаваны ружовым гранітам. У аб'ёме дамінуюць 4 вуглавыя шатровыя вежы і цэнтральны васьмігранны барабан з шатровым завяршэннем, праемы якога дэкарыраваны какошнікамі. Паўкруглая апсіда фланкіравана галоўкамі. Матыў какошніка выкарыстаны таксама ў афармленні галоўнага і тарцовых уваходаў, арачных аконных праёмаў. Па перыметры будынак абрамляе высокі карніз і філёнгавы парапет з трохвугольнымі франтонамі. Прастора інтэр'ера падзелена слупамі на 3 нефы, перакрытыя крыжовымі цыліндрычнымі скляпеннямі, якія дэкарыраваны паліхромным арнаментам. Галерэя хораў злучаецца з нефам шырокім арачным праёмам.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

А. М. Кулагін

70. ЧАСОВАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ (гіст.). Вул. Савецкая, 53. Выконваючы вызваленчую місію, войскі Чырвонай Арміі 22.9.1939 г. ўвайшлі ў Брэст. З

68. *Будынак, у якім знаходзіўся рэўком*

прадстаўнікоў Чырвонай Арміі і мясцовага насельніцтва ў горадзе было створана Часовае ўпраўленне, якое да ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (лістапад 1939 г.) выраша... пытанні палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця, усталявання рэвалюцыйнага парадку. За кароткі тэрмін наладзіла работу камунальнай гаспадаркі, забеспячэнне насельніцтва горада прадуктамі, бясплатным медыцынскім угоўваннем. У 1954 г. на доме, дзе працавала Часовае ўпраўленне, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Рашевский Н. А. Брестская область Белорусская ССР ... изд. — Мн., 1975; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.). — Мн., 1966.

71. ЧЫГУНАЧНЫ ВАКЗАЛ (архіт., маст., гіст.). У паўночна-заходняй частцы горада. Ад вакзала разыходзяцца пуці ў Маскоўскім, Гомельскім, Кіеўскім, Варшаўскім і інш. напрамках.

Вакзал пабудаваны ў 1886 г. з цэглы ў псеўдарускім стылі (арх. В. Лорберг, Л. Ніколаі, Я. Гарбуноў). Быў адным з буйнейшых вакзалаў у Расіі. У Вялікую Айчынную вайну вакзал паўразбураны. У 1956 г. адноўлены ў старых параметрах са змененай планіроўкай (інжынер І. Пестраkоў). У 1975 г. з маскоўскага напрамку да вакзала прыбудаваны новы павільён. Вызначаецца ўдалым вырашэннем складаных функцыянальна-тэхнічных задач (адпачынак пасажыраў, пасадка і адпраўленне цягнікоў па ўсіх напрамках, зручнасць захавання і перамяшчэння багажу). Сувязь з горадам ажыццяўляецца па пуцеправоду. Аб'ёмная кампазіцыя падпарадкавана функцыянальнаму падзелу памяшканняў. Цэнтральнае становішча займае вестыбюль. Па перыметры да яго прымыкаюць залы чакання, службовыя і дапаможныя памяшканні. На сцяне залы чакання новага павільёна мазаіка «Брэсцкая крэпасць-герой». Шматфігурная кампазіцыя складаецца з асобных сцэн «Сустрэча з касманаўтамі», «Сустрэча з абаронцамі крэпасці», «Вяселле», «Шчаслівае юнацтва» і інш. Кампазіцыя разгорнута на фоне панарамы Брэсцкай крэпасці як апавяданне пра мірнае і шчаслівае жыццё жыхароў горада. На абодва бакі яе — сімвалічныя выявы 2 воінаў над сцягам і жанчыны-маці з дзіцем на руках. Мазаічная кампазіцыя ўвасабляе патрыятычную ідэю — імкненне савецкага народа да міру, яго гатоўнасць абараніць заваяванае дэрамога.

Месца гераічнай абароны 1941 г. Вакзал 22—29 чэрвеня, у Вялікую Айчынную вайну, быў адным з вузлоў супраціўлення нямецка-фашысцкім захопнікам. Пасля першай бамбёжкі і артылерыйскага абстрэлу горада тут былі створаны баявыя групы з байцоў, якія ў той час знаходзіліся на станцыі Брэст-Цэнтральны, а таксама з работнікаў міліцыі, чыгуначнікаў. Абаронцаў узначалілі начальнік лінейнага аддзялення міліцыі А. Н. Вараб'ёў, старшына звыштэрміновай службы



69. *Сімяонаўская царква. План*



69. *Сімяонаўская царква*

71. *Чыгуначны вакзал*

П. П. Басвеў і артылерыст лейтэнант М. Шымчанка. Групы атрымалі са склада ваенізаванай аховы зброю, занялі падыходы да вакзала і адбілі некалькі атак праціўніка. Калі гітлераўцы пачалі абыходзіць абаронцаў, яны забарыкадзіраваліся ў падвалах будынка вакзала, вялі агонь па ворагу з акон. Становішча ўскладнялі пасажыры, якія з налетам варожай авіяцыі перабеглі ў падвалы. Абаронцы вывелі жанчын і дзяцей наверх, самі вырашылі змагацца да апошняга патрона. Пацярпеўшы няўдачу пры спробе ўварвацца ў падвалы, гітлераўцы затапілі іх. Многім абаронцам удалося выратавацца. Потым яны змагаліся супраць ворага ў радах Чырвонай Арміі і партызанскіх атрадах. У памяць аб абаронцах вакзала на яго будынку ў 1984 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941—1944 гг.): Сборник воспоминаний.— Мн., 1961; Смирнов С. С. Были великой войны. М., 1966; Гречкова Л. Брестский вокзал.— Неман, 1977, № 6.

Г. І. Дулеба, В. М. Чарнавіч.

72. ЯВАЧНАЯ КВАТЭРА БАЛЬШАВІКОЎ (гіст.). Вул. Куйбышава, 47. У час акупацыі Брэста войскамі буржуазнай Польшчы ў 1919—20 гг. тут была падпольная кватэра бальшавікоў.

8.3.1919 г. ЦК КП(б) Літвы і Беларусі прыняў рашэнне аб стварэнні ў тыле ворага камуністычнага падполля і партызанскіх атрадаў. У Брэсце падпольная арганізацыя бальшавікоў створана ў красавіку 1919 г. Яе ўзначаліў Якаў Барысавіч Бэкін (у 1912 г. у эміграцыі ў Швейцарыі не раз выконваў даручэнні У. І. Леніна). У арганізацыю ўваходзілі адзін з стваральнікаў у дні Кастрычніцкай рэвалюцыі Рагачоўскай бальшавіцкай ячэйкі М. Н. Хаўкін (пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Брэсце ўзначальваў гарадскую міліцыю, адначасова быў камісарам Брэсцкай крэпасці), А. Іваноў (партыйная клічка Ваня) і інш. Падпольшчыкі наладзілі сувязь з ЦК Камуністычнай рабочай партыі Польшчы, вялі прапагандысцкую работу сярод насельніцтва горада і польскіх легіянераў, распаўсюджвалі пракламацыі і лістоўкі. У адной з іх пад назвай «Бальшавікі змагаюцца» ад 30.6.1919 г. былі змешчаны заклік да рабочых чыгункі і саматужнай прамысловасці аб'ядноўвацца і разам весці рашучую барацьбу супраць акупантаў, за ўстанаўленне Савецкай улады.

У 1978 г. на доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

І. С. Бэрасевіч, Т. А. [illegible]

БАРАНАВІЦКІ
РАЁН
Гарадзішча
Перхавічы
Цешаўля
Гірмантаўцы
Лебяжаны
Забалацце
Мал. Каўпеніца
Крошын
Палонка
Лотвічы
Нов. Мыш
БАРАНАВІЧЫ
Русіна
Завоссе
Паланечка
Мілавіды
Могільнік (грунтавыя, курганныя) курганы
Цэнтры рамёстваў
Помнікі і месцы рэвалюцыйнага руху (Рэвалюцыя 1905–07 гг. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, Грамадзянская вайна, барацьба працоўных Заходняй Беларусі)
Палацы, сядзібы, асабнякі
Культавая архітэктура
Адміністрацыйныя і грамадскія збудаванні дасавецкага перыяду

11. БАРАНАВІЧЫ

[illegible] абласнога [illegible] падпарадкавання, цэнтр раёна. За 206 км на паўночны ўсход ад Брэста. Вузел [illegible] на Мінск, Брэст, Слуцк, Лунінец, Ліду, Ваўкавыск) і [illegible] 141 тыс. жыхароў (1982 г.).

Узнікненне Баранавіч звязана з будаўніцтвам [illegible] пачатку [illegible] начале сялілся чыгуначныя служачыя і рабочыя. [illegible] 1884 г. надання пасёлку статуса мястэчка [illegible] Развадова.

У снежні 1884 г. пачаў дзейнічаць участак дарогі Вільня — Лунінец [illegible] станцыя Баранавічы Палескія. [illegible] Баранавічы. Былі пабудаваны [illegible] 4-га чыгуначнага батальёна. [illegible] ле перапісу 1897 г., у Баранавічах [illegible] прыемствы, двухкласныя школы (чыгуначнага і дабрачыннага таварыства). Перспектывы развіцця ў сувязі са зручным размяшчэннем і адсутнасць сродкаў на добраўпарадкаванне вы[illegible] 20 ст. хадайнічаць перад царскім урадам аб пераводзе мястэчка ў разрад горада. [illegible] вырашана.

[illegible] 1906—07 гг. у Баранавічах дзейнічаў гурток РСДРП чыгуначнікаў, які падтрымліваў [illegible] Петраградам [illegible] лі выступленне.

[illegible] Баранавічах [illegible] яная працягвалася з восені 1915 г., [illegible] 1919 г. Чырвоная Армія вызваліла Баранавічы. Тут была ўстаноўлена Савецкая ўлада. Паводле пастановы [illegible] Мінскай губерні» Баранавічам на[illegible] Савецкай улады ў горадзе і наваколлі [illegible] Баранавіцкі [illegible] рэвалюцыйны камітэт.

[illegible] ку 1919 г. — ліпені 1920 г. і з верасня [illegible] польскімі [illegible] скамі. У 1921—39 гг. у складзе бур[illegible] вагрудскага ваяводства. Пад кіраўніцтвам КПЗБ працоўныя горада вялі ўпартую барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР Баранавічы [illegible] (1939—54 гг.).

У Вялікую Айчынную вайну Баранавічы [illegible] нямецка-фашысцкімі захопнікамі Гітле[illegible] 80 % прамысловых прадпрыемстваў, [illegible] і культурна-асветныя [illegible] рад вызвалены 8.7.1944 г. ў выніку Баранавіцкай [illegible] «Баранавіцкіх»

З 8.1.1954 г. Баранавічы ў Брэсцкай [illegible] мынскага, з 8.4.1957 г. — Баранавіцкага р-наў. У 1959 г. — 58,1 тыс., у 1970 г. — 101,5 тыс. жыхароў.

[illegible] структура горада [illegible] неральны план адпаўлення і далей[illegible] спектыў будаўніцтва ў Беларускім [illegible] на гістарычная прамавугольная сетка вуліц [illegible]

[illegible] цэнтр горада — пл. Леніна на скрыжаванні галоўных магістралей — вуліц Леніна, Савецкай і Камсамольскай. Яе кампазіцыйны цэнтр — помнік У. І. Леніну. Дамінанта забудовы плошчы 9-павярховы будынак гасцініцы «Гарызонт» (1979 г.). Асноўныя грамадскія і жылыя збудаванні ўзведзены ў цэнтральнай частцы горада ў 1940—70-я гады: гарком КПБ на пл. Леніна (1946 г.), Дом культуры будаўнікоў на вул. Камсамольскай (1956 г.), 136-кватэрны жылы дом (1960 г.), [illegible] Дом культуры на вул. Леніна [illegible], Дом спорту на вул. Дзімітрова (1966 г.), Дом Саветаў на вул. Савецкай (1970 г.), кінатэатр «Кастрычнік» на вул. Леніна (1975 г.) і інш. У цэнтральнай частцы горада ўстаноўлены бюст двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца (вул. Камсамольская), перад Домам культуры (вул. Леніна) — помнік Вызвалення. Ва урочышчы Гай, на месцы [illegible] нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 194[illegible] тыс. [illegible] грамадзян, створаны мемарыяльны комплекс.

У 1960—80-я гады пабудаваны новыя прамысловыя прадпрыемствы, жылыя раёны і мікрараёны. Вырас

11. *Плошча Леніна.*

мікрараён па вул. Кірава, дзе знаходзіцца баваўняны камбінат. Сучаснымі 5—9-павярховымі жылымі дамамі забудоўваюцца мікрараёны Паўночны 1, Усходні 1, Паўднёвы 3. Добраўпарадкоўваецца парк імя 30-годдзя [illegible].

Атрымала развіццё лёгкая прамысловасць (баваўняны камбінат, швейная, трыкатажная, абутковая фабрыкі, філіял мінскага вытворчага аб'яднання цацак «Мір»), машынабудаванне (заводы аўтаагрэгатаў, аўтаматычных ліній, станкапрылад, [illegible] машынабудавання, [illegible] электраагрэгатовак, рамонтна-механічны, камбінат сілавых вежаў), харчовая прамысловасць (мясакансервавы камбінат, віна-кансервавы, малочны, піваварны заводы, хлебазавод, камбінат хлебапрадуктаў і інш.). Дзейнічаюць камбінат жалезабетонных канструкцый, завод бытавой хіміі, 2 заводы жалезабетонных вырабаў, вытворчае [illegible] аб'яднанне, фабрыка мастацкіх вырабаў, мэблевая і інш., меттастанцыя.

У горадзе ёсць тэхнікумы тэхналагічны і лёгкай прамысловасці, музычнае і медыцынскае вучылішчы, 4 прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, [illegible] агульнаадукацыйныя школы, 50 дашкольных устаноў, 42 бібліятэкі, 11 стацыянарных кінаўстановак, 9 клубных устаноў, краязнаўчы музей, 10 медыцынскіх устаноў. Выдаецца аб'яднаная газета «Знамя коммунизма».

Зоны адпачынку за межамі горада: штучнае возера Баранавічы па р. Мышанка, возера Жлобін, турбаза «Ляснное возера» на вадасховішчы Гать, урочышча Гай.

Літ.: Торговля и промышленность Европейской России [illegible] Полоса.— СПб., [1912]; Фонв[illegible] Об образовании Барановичского [illegible] уезда [illegible] губернии [illegible] Богодина В. П. Промышленность Бе[illegible] Брестская область. [illegible] 2 изд.— Мн., 1975.

[illegible] Ю. Пятровава, С. А. Шчарбакоў.

73. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны Л. П. Барадзінскі, Г. М. Герасімук, Т. І. Дземідовіч, А. М. Дзяніцчык, А. А. Доўгер, К. М. Доўгер, Г. А. Лапкевіч, І. А. Лапкевіч, А. Ю. Шырко — члены падпольнай групы, якая дзейнічала у [illegible] 1943 г.— сакавіку 1944 г. пад кіраўніцтвам А. І. Крыштофіка. Падпольшчыкі рабілі дыверсіі, пераправілі [illegible] у партызанскія атрады, [illegible] перадавалі партызанам [illegible] боепрыпасы, медыкаменты [illegible]. Акупанты высачылі патрыётаў і [illegible] 1944 г. закатавалі іх.

У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

77. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.

74. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны К. [illegible], Я. М. Карпенка, А. В. Ягораў — члены падпольнай групы, якая дзейнічала [illegible] з чэрвеня 1943 г. Групу з 5 чалавек узначальваў К. [illegible] Падпольшчыкі [illegible] збіралі і перадавалі партызанам [illegible] ваенных [illegible] [illegible]

У [illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

75. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны 30 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У 1972 г. на магіле пастаўлены абеліск.

76. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны [illegible] воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г.

77. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны [illegible] воінаў, 294 з іх загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—1944 гг. Сярод пахаваных Героі Савецкага Саюза Іван Пятровіч Лесін, Васіль Іванавіч Матронін, Аляксандр Георгіевіч Наканечнікаў. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

І. П. Лесін нарадзіўся 15.10.[illegible] ў с. Мала-Нікольск Муромцаўскага р-на Омскай вобл. у сялянскай сям'і. У 1930—35 гг. працаваў у калгасе на радзіме, з 1937 г.— лесарубам на Далёкім Усходзе. З ліпеня 1941 г. ў Чырвонай Арміі. Ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, Беларускім франтах. У кастрычніку 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра на тэрыторыі Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. І. П. Лесін з групай воінаў пераправіўся цераз раку, захапіў плацдарм і ўтрымліваў яго да падыходу падмацавання. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 30.10.1943 г. Загінуў 7.7.1944 г. пры вызваленні г. Баранавічы. Яго імем названа вуліца ў Баранавічах. У 1963 г. на магіле ўстаноўлена пліта.

В. І. Матронін нарадзіўся ў 1904 г. ў с. Паноўка [illegible] р-на Ульянаўскай вобл. З рабочых. Член КПСС з 1927 г. З 1919 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1927 г. скончыў ваеннае вучылішча ў Тбілісі, у 1947 г. — вышэйшую паграншколу. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1943 г. Камандзір стралковай дывізіі палкоўнік В. І. Матронін вызначыўся ў 1944 г. ў баях за вызваленне г. Бельск і ва ўтрыманні плацдармаў на р. Нараў (Польшча). Загінуў [illegible].11.1944 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.10.1945 г. У 1963 г. на магіле ўстаноўлена пліта.

А. Г. Наканечнікаў нарадзіўся 16.9.1915 г. ў г. п. Дзяргачы Саратаўскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1940 г. З 1933 г. ў Чырвонай Арміі. [illegible] нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі (1936—[illegible]). У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным, 1-м Беларускім франтах. Камандзір штурмавога авіяпалка гвардыі падпалкоўнік А. Г. Наканечнікаў асабіста зрабіў 81 баявы вылет, полк пад яго камандаваннем — 2028 вылетаў. За гераізм і адвагу, умелае камандаванне палком А. Г. Наканечнікаву [illegible] 1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны ў Савецкай Арміі. Памёр 10.11.1946 г. Яго імем названа вуліца ў Баранавічах.

У 1963 на брацкай магіле пастаўлены абеліск.

78. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны 21 воін, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

79. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКІ КАСЦЁЛ (архіт.). Вул. Куйбышава, 34. Пабудаваны ў 1924 г. з дрэва. Трохнефавая базіліка з [illegible]. Галоўны фасад завершаны васьмігранным [illegible].

80. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. Пахаваны польскія грамадзяне,



79. *Крыжаўзвіжанскі касцёл*

79. *Крыжаўзвіжанскі касцёл. План*

расстраляныя 13.7.1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. Колькасць ахвяр не ўстаноўлена. У 1971 г. на магіле пастаўлены абеліск.

81. МАГІЛА ДАРАШЭВІЧА Мікалая Фёдаравіча (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. М. Ф. Дарашэвіч — удзельнік Баранавіцкага камуністычнага падполля у Вялікую Айчынную вайну. 3.6.1943 г. ён узарваў на ст. Баранавічы Цэнтральныя варожы эшалон з гаручым. Загінуў пры выкананні гэтага задання. У 1974 г. на будынку станцыі ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У 1978 г. на магіле пастаўлены абеліск. Яго імем названа вуліца ў Баранавічах.

82. МАГІЛА ЗВЕРАВА Васіля Андрэевіча (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках.

Герой Савецкага Саюза В. А. Звераў нарадзіўся 20.7.1923 г. ў [illegible] Скопінскага р-на [illegible]. З сялян. Член КПСС з [illegible] г. З 1937 г. працаваў трактарыстам у калгасе на радзіме. У Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з мая 1942 г.— радавы, малодшы сяржант, каманлір пантоннага маставога батальёна. Удзельнік вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы, разгрому ворага ў Германіі. Фарсіраваў 36 рэк, у т. л. Дняпро ў раёне Кіева. У адной з баявых аперацый вясной 1945 г. [illegible] пераплыў Одэр, захапіў катэр праціўніка і пераправіў на ім савецкіх дэсантнікаў на варожы бераг. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1945 г. Пасля вайны працаваў на мясакамбінаце ў г. Баранавічы. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—51 гг. Памёр 13.10.1971 г. У 1972 г. на магіле пастаўлены абеліск.

83. МАГІЛА КАДАЧНІКАВА Івана Пятровіча (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках.

Герой Савецкага Саюза І. П. Кадачнікаў нарадзіўся 19.6.1911 г. ў в. Вядзернікі Верашчагінскага р-на Пермскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1944 г. У 1935—41 гг. працаваў электразваршчыкам у Свярдлоўскай вобл. З чэрвеня 1941 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце са студзеня 1943 г. — гвардыі яфрэйтар, сапёр. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Арлом, Чарнігавам, вызвалення Беларусі, Польшчы. Скончыў вайну ў Берліне. Гераічны подзвіг здзейсніў у верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра на тэрыторыі Камарынскага р-на Палескай вобл. Трое сутак пад агнём праціўніка перапраўляў на правы бераг ракі артылерыю і пяхоту. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г. Пасля вайны працаваў электразваршчыкам на Баранавіцкім заводзе жалезабетонных канструкцый. Памёр 25.8.1967 г. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

84. МАГІЛА КАЛОЛЫ Праскоўі Лазараўны (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках.

Герой Сацыялістычнай Працы П. Л. Калола нарадзілася 8.3.1[illegible] ў в. Падкасоўе [illegible]. Член КПСС з 1952 г. З 1949 г. звеннявая [illegible], з 1953 г. намеснік старшыні калгаса імя Леніна Навагрудскага р-на. У 1958—60 гг. звеннявая паляводчай брыгады гэтай гаспадаркі. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1949 г. Памерла 23.8.1976 г.

У [illegible] г. на магіле пастаўлена [illegible].

85. МАГІЛА МАЛЕНА Арсенія Антонавіча (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках.

Герой Савецкага Саюза А. А. Мален нарадзіўся 20.4.1921 г. ў с. Грачанас Валачыскага р-на Хмяльніцкай вобл. З сялян. Член КПСС з 1942 г. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942 г.— гвардыі маёр, камандзір эскадрыллі. Вызначыўся ў баях на тэрыторыі Германіі. 17.2.1945 г. група самалётаў на чале з А. А. Маленам пад шквальным зенітным агнём праціўніка апішчыла 2 варожыя танкі, самаходную [illegible], 10 аўтамашын [illegible], 2 зенітныя батарэі ворага, [illegible] каля 18 аўтамашын, 2 артылерыйскія батарэі праціўніка. За гады вайны А. А. Мален зрабіў 185 баявых вылетаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г. Памёр 3.2.1950 г.

У 1[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

86. МАГІЛА ЦАРУКА Уладзіміра Зянонавіча (гіст.). На вул. Загараднай, на могілках. У. З. Царук — дзеяч рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, [illegible] з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Баранавіцкай вобл. ў Вялікую Айчынную вайну.

Нарадзіўся 20.12.1899 г. ў в. Вялікае Вобрына Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. З сялян. Член КПЗБ з 1924 г. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці вёскі, працаваў сакратаром ваўкома. У Грамадзянскую вайну добраахвотнік Чырвонай Арміі, палітрук роты на Заходнім фронце. З 1920 г. на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. З 1924 г. сакратар Мірскага падпольнага райкома КПЗБ. У 1926 г. арыштаваны. 13 гадоў правёў у турмах буржуазнай Польшчы. Вызвалены Чырвонай Арміяй у 1939 [illegible] актыўна ўдзельнічаў ва ўсталяванні Савецкай улады ў Заходняй Беларусі, працаваў у партыйных і савецкіх органах. У Вялікую Айчынную вайну [illegible] Стаўбцоўскага падпольнага міжраённага партцэнтра, сакратар, першы сакратар Стаўбцоўскага падпольнага райкома КП(б)Б, член Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б, намеснік упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху па Баранавіцкай вобл., камандзір Стаўбцоўскага партызанскага [illegible] За мужнасць і гераізм, асабістыя заслугі ў арганізацыі [illegible] партызанскага руху ў Баранавіцкай [illegible] [illegible] У. З. Царуку 15.8.1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны працаваў сакратаром Стаўбцоўскага райкома КП(б)Б, намеснікам старшыні Баранавіцкага [illegible]выканкома, старшынёй Баранавіцкага гарвыканкома. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1946—54 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1940—47 і 1955—57 гг. Памёр 27.1.1957 г.

Яго імем названа вуліца ў Баранавічах, калгас у Карэліцкім р-не Гродзенскай вобл., дзе ўстаноўлены бюст У. З. Царука. На радзіме мемарыяльны музей. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: В памяти народной.— Мн., 1969. Подпольные партийные органы Компартии [illegible] (1941—1944).— М[illegible] [illegible] Агапов С. А. Бел[illegible] [illegible] Царуке).— М., 1970. *Г. I. Дулеба*.

87. МАГІЛА ЧОРНАГА Фёдара Васілевіча (гіст.). Вул. Загарадная, на могілках. Савецкі воін Ф. В. Чорны загінуў у баі супраць нямецка-фа-

тысцых захопнікаў у 1941 г. У 1946 г. на магіле пастаўлены абеліск.

88. МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС «УРОЧЫШЧА ГАЙ» (гіст., маст.). Знаходзіцца на ўскраіне горада, ва урочышчы Гай.

У чэрвені 1942 г. фашысты даставілі на ст. Баранавічы эшалон з чэхаславацкімі грамадзянамі. Невялікімі групамі гітлераўцы выводзілі людзей ва ўрочышча і расстрэльвалі, [illegible] скідвалі ў 2 вялікія равы.

У 1971—72 гг. на месцы гібелі 3 тыс. чэхаславацкіх грамадзян створаны мемарыяльны комплекс (арх. М. Мілавідаў, А. Макараў, А. Марозіч, скульпт. М. Альтшулер; бетон, медзь, бронза, мармур, бутавы камень). Дамінанта кампазіцыі комплексу — 2 пілоны (13 і 14 м), якія нагадваюць слупы агароджы канцлагера. [illegible] блок [illegible] са спецыяльнай сістэмай падвескі, якая чуйна рэагуе на самы слабы [illegible] ушчэ. [illegible] блок з медных лістоў (2,7×2,6 м), з рэльефнай выявай мноства рук, узнятых і сціснутых у пратэсце, болі і адчаі. Пілоны пастаўлены на месцы, дзе ў час расстрэлу быў кулямет. Ад галоўнага манумента праглядаюцца паласы пліт да 2 равоў-магіл, паміж імі — бетонная пліта з надпісам-прысвячэннем. За магіламі «Сцяна загінуўшых» з 3 тыс. бутавых камянёў. Да яе прымацавана мармуровая дошка з выбітымі імёнамі загінуўшых і надпісам на рускай і чэшскай мовах: «Светлай памяці чэхаславацкіх братоў». У кампазіцыю комплексу ўключаны адрэзак палявой дарогі, па якой ахвяр вялі да месца расстрэлу. Дарогу перагароджвае сімвалічны «Парог жыцця і смерці» — рассечаны бетонны брус. Фактура бетону стварае ўражанне слядоў, пакінутых людзьмі, што пераступілі парог жыцця. Дакладная перадача абставін трагедыі, журботныя гукі звана робяць вялікае эмацыянальнае ўражанне.

Мемарыяльны комплекс значны твор манументальнага мастацтва.

[illegible] 1944 — 2 выд.]. Мн., 1965.

Г. І. Дулеба, Л. Г. Ланковіч.

89. МЕСЦА ВЫСТУПЛЕННЯ РАБОЧЫХ І САЛДАТ 1905 г. (гіст.). Ст. Баранавічы Палескія.

7.12.1905 г. Маскоўскі Савет абвясціў палітычную стачку, якая праз 2 дні перарасла ва ўзброенае паўстанне. Выступленне маскоўскага пралетарыяту падтрымаў пралетарыят Беларусі. 8 снежня пад кіраўніцтвам групы РСДРП пачалася палітычная стачка баранавіцкіх чыгуначнікаў. 9 снежня рабочыя на чале з старшынёй камітэта Баранавіцкага аддзялення Усерасійскага чыгуначнага саюза [illegible]

88. *Мемарыяльны комплекс «Урочышча Гай». [illegible] манумента.*

88. *Мемарыяльны комплекс «Урочышча Гай». Галоўны манумент.*

нерам М. М. Длыко вынеслі са строю апаратуру паштова-тэлеграфнай канторы. Спыніўся рух паяздоў. На мітынгах і дэманстрацыях з заклікам да ўзброенай барацьбы выступілі прадстаўнікі Маскоўскага Савета. 11 снежня на плошчы сабраліся рабочыя дэпо, салдаты чыгуначнага батальёна, моладзь. Генерал Артэм'еў загадаў разагнаць удзельнікаў мітынгу. Рабочыя сарвалі з яго пагоны, паламалі шашку. Калі афіцэры, якія суправаджалі генерала, пачалі страляць і паранілі некалькі чалавек, узброеныя рабочыя адказалі агнём. З загадам задушыць выступленне ў Баранавічы 12 снежня прыбыў атрад палкоўніка Рэрберга, 13 снежня – карны атрад генерала Арлова. У горадзе ўвялі ваеннае становішча, пачаліся масавыя арышты. У Віленскую турму кінуты кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі выступлення К. Гайдамовіч, М. Мухін, А. Друкаў, І. Базаусы, С. [illegible], М. Длыко і [illegible]. Рух на чыгунцы быў адноўлены 16 снежня, [illegible]

[illegible] мемарыяльная дошка.

Літ.: Майзель Л. Н. 1905–1907 гг. [illegible]

М. І. Алексяюк, С. А. Шчарбакоў.

90. МЕСЦА ЗАГУБЫ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ (гіст.). На вул. Горкага (былая Рынкачная пл.). Тут 11.3.1944 г. нямецка-фашысцкія акупанты закатавалі падпольшчыкаў Л. П. Барадзінскага, Г. М. Герасімук, Т. [illegible] Дземідовіча, А. М. Давыдовіча, [illegible] Доўгер, К. М. Доўгера, Г. А. Лішкевіч, І. А. Лішкевіча, Ю. А. Шырко. У 1966 г. на доме № 10 устаноўлена мемарыяльная дошка.

91. МЕСЦА ЗАГУБЫ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ (гіст.). Чыгуначная ст. Баранавічы Цэнтральныя, тэрыторыя паравознага дэпо. Тут 20.4.1944 г. нямецка-фашысцкія акупанты пасля жорсткіх катаванняў павесілі падпольшчыкаў К. П. Бодака, Я. М. Карпенку і А. В. Ягорава. У 1964 г. на будынку клуба паравознага дэпо ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

92. МЕСЦА ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ І МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ (гіст.). Вул. Брэсцкая. У 1941 [illegible] ты стварылі на тэрыторыі турмы ф[illegible] [illegible] лагера смерці. [illegible] катаржных умовах знаходзіліся та[illegible] [illegible] фізічныя пакаранні зняволеных. Зімой іх трымалі пад адкрытым небам, забаранялі раскладаць агонь. Ад холаду, голаду, хвароб, непасільнай працы штодня гінула шмат людзей. Тут загублена каля 31 тыс. ваеннапалонных і мірных жыхароў.

У 1964 г. на месцы загубы ахвяр [illegible] бетонныя сцяны з жалезнымі кратамі [illegible] Б. Ягадзін.

Літ.: Преступления немецко-фашистских [illegible] (2 выд.).— Мн., 196[illegible]



92. Помнік на месцы загубы савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў

89. Чыгуначны вакзал станцыі Баранавічы-Палескія. Месца выступлення рабочых і салдат у 1905 г.



93. *Пакроўскі сабор. Фрагмент іканастаса. Разьба па дрэву*

93 Пакроўскі сабор Агульны выгляд



93. Пакроўскі сабор. План



93. Пакроўскі сабор. Мазаіка «Маці боская [illegible]»

93 ПАКРОЎСКІ САБОР (архіт., маст.). Вул. Куйбышава. [illegible]бу[illegible]даваны ў 1924—31 гг. з цэглы ў стылі [illegible] [illegible].

Чатырохстоўпны [illegible] [illegible] [illegible] асноўны аб'ём храма [illegible] [illegible] круглымі апсідамі накрыты паўсферычным купалам з люкарнамі. Паўночны і паўднёвы фасады вылучаны чатырохкалонным порцікамі [illegible] [illegible] ордэра. З захаду асноўны аб'ём злучаны тамбурам з трох'яруснай квадратнай у плане званіцай, завершанай шлемападобным купалам са [illegible]. Ярусная будова званіцы над крэслена архітэктурным дэкорам: купалавымі [illegible] [illegible], лапаткамі, з [illegible] праёмамі, прафіляванымі карнізамі. Вокны і нішы сабора абрамлены прафіляванымі ліштвамі з франтонамі. Звонку і ўнутры будынак дэкарыраваны мазаічнымі кампазіцыямі (захаваліся фрагментарна [illegible] [illegible] стратамі смальты). Мазаіка выкананы ў 1902—11 гг. у пецярбургскай прыватнай майстэрні У. Фралова для сабора Аляксандра Неўскага ў Варшаве. Пазней прывезены ў Баранавічы.

Мазаіка «Маці боская з дзіцем» [illegible] у [illegible] апсіды — фрагмент вялікай кампазіцыі «Аб [illegible]» выкананы па кардоне В. Васняцова. Выявы ў цішнёвым, [illegible] і светла-вохрыстым адзенні [illegible] вылучаюцца на залатым [illegible]. Трактоўка твараў аб'ёмная. На кардонах М. Кошалева зроблены мазаікі «Спас з данатарамі» (у тымпане франтона паўднёвага порціка) і «Дэісус» (у інтэр'еры над паўночным уваходам). У вобразе данатара паказаны [illegible] [illegible] Л. Бенуа з мадэллю Варшаўскага сабора. У [illegible] [illegible] мазаіка сінія [illegible] пераважаюць над светлымі ружовымі, зялёнымі і вохрыстымі; другая мазаіка выканана ў спалучэнні [illegible] і [illegible] колераў.

На кардонах М. Бруні выкананы мазаікі «Маці боская з анёламі» (у інтэр'еры над паўднёвым уваходам) і фрагмент кампазіцыі «Сабор архістратига Міхаіла» (у тымпане франтона паўночнага порціка). На паўночным апорным слупе — выява Іосіфа Валоцкага, на паўднёвым — мітрапаліта Алексія (абедзве паводле кардонаў В. Думітрашкі). У інтэр'еры разны драўляны іканастас канца 19 — пачатку 20 ст. *Г. М. Ломаск[illegible]*

93. Пакроўскі сабор. Мазаіка «Спас з данатарамі»

94. ПОМНІК ВЫЗВАЛЕННЯ (гіст., маст.). На вул. Леніна, перад будынкам Дома культуры.

У пачатку ліпеня 1944 г. савецкія войскі пачалі наступленне ў раёне Баранавіч. Надаючы вялікае значэнне гэтаму ўчастку фронту, гітлераў

ка ператварыў горад у моцны вузел абароны з развітай сістэмай траншэй, дотаў, вялікай колькасцю мінных палёў і драцяных загарод. 6 ліпеня савецкія войскі акружылі баранавіцкую групоўку праціўніка і пасля 2 дзён жорсткіх баёў разграмілі яе. 8 ліпеня Баранавічы былі поўнасцю вызвалены.

У баях за горад удзельнічалі 15-я, 20-я, 69-я, 130-я, 193-я стралковыя, 37-я, 44-я, 50-я, 75-я гвардзейскія стралковыя дывізіі, 9-я гвардзейская кавалерыйская дывізія, 6-ы і 8-ы знішчальныя авіяцыйныя корпусы і іншыя часці і злучэнні 1-га Беларускага фронту. 28 з іх прысвоена ганаровыя найменні «Баранавіцкіх». Імёны генерал-маёраў І. У. Саннікоўскага, І. Л. Рагулі і Героя Савецкага Саюза малодшага лейтэнанта І. П. Лісава ўвекавечаны ў назвах гарадскіх вуліц. Вызваленню горада актыўна садзейнічалі падпольшчыкі. Яны перадавалі савецкаму камандаванню звесткі аб дыслакацыі варожых часцей, арыентавалі перадачу ваенных грузаў праціўніка, дэзарганізоўвалі работу транспарту.

У 1964 г. ў гонар 20-годдзя вызвалення Баранавіч ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пастаўлены помнік (арх. М. Мілавідаў, А. Марэвіч, А. Макараў, скульпт. М. Альтшулер; граніт, памер стэлы 2,9×2,6 м). На невысокім прамавугольным стылабаце на 2 апорах пастаўлена стэла. На яе фасаднай плоскасці — вывавымагавая на штыку чырвонага сцяга з зоркай. Перад стэлай гарыць Вечны агонь. Каларыстычна помнік выраашаны на кантрастным сунастаўленні чырвонага і шэрага граніту. Да помніка вядуць асфальтаваныя дарожкі. Навокал разбіты газоны, пасаджаны дэкаратыўныя кусты.

Літ.: Освобождение Белоруссии. 1944. 2 изд. — М., 1974. *М. А. Багдановіч, Г. І. Дрэеба, Л. Г. Лапцэвіч.*

94. *Помнік Вызвалення*

95. ПОМНІК ГРЫЦАВЦУ Сяргею Іванавічу (гіст., маст.). На вул. Камсамольскай, каля ўваходу ў парк імя 30-годдзя ВЛКСМ.

Двойчы Герой Савецкага Саюза С. І. Грыцавец нарадзіўся 23.6.1909 г. у в. Бараўцы Баранавіцкага р-на ў сялян. Член КПСС з 1931 г. У 1932 г. скончыў Арэнбургскае лётнае вучылішча. Удзельнічаў у нацыянальна-рэвалюцыйнай вайне ў Іспаніі (1936—39 гг.), збіў 30 варожых самалётаў. За мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў баях з фашыстамі, С. І. Грыцаўцу 22.2.1939 г. прысвоена званне Героя. Ваяваў з японскімі мілітарыстамі ў 1939 г. на р. Халхін-Гол. Збіў 12 самалётаў праціўніка. У адным з баёў камандзір вымушаны быў выкінуцца з парашутам з падбітага самалёта і трапіў на варожую тэрыторыю. С. І. Грыцавец пасадзіў сваю машыну каля камандзіра, узяў яго на борт і пад агнём праціўніка ўзняўся ў паветра. За гэты подзвіг С. І. Грыцаўцу ў жніўні 1939 г. ў 2-і раз прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Загінуў 16.9.1939 г. пры выкананні службовых абавязкаў у в. Балбасава Аршанскага р-на. Імем С. І. Грыцаўца названы вуліцы ў Баранавічах, Ленінградзе, Маскве, Мінску, Оршы, яго імя прысвоена Харкаўскаму ваеннаму авіяцыйнаму вучылішчу.

Помнік пастаўлены ў 1949 г. (скульпт. З. Азгур, арх. У. Корман; бронза, чырвоны граніт; вышыня пастамента 3,4 м, бюста 1,45 м). На чатырохгранным пастаменце паграднны бронзавы бюст С. І. Грыцаўца. Мужны, энергічны твар, расправленыя плечы падкрэсліваюць героіку вобраза. Світар з высокім каўняром і тужурка з 2 Зоркамі Героя Савецкага Саюза — дэталі, якія ўдакладняюць характарыстыку героя. Помнік пастаўлены ў цэнтры газона на восі цэнтральнай алеі. Нізкія пілоны ўваходу фланкіруюць строгую вертыкаль помніка.

Літ.: В памяти народной. — Мн., 196[illegible]; Григорьев Г. Две звезды. Документальная повесть. — М., 1970. *Г. І. Дрэеба, Л. Г. Лапцэвіч.*

96. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). На вул. Камсамольскай, на тэрыторыі школы-інтэрната. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1971 г.

97. ПОМНІК КРУПСКАЙ Надзеі Канстанцінаўне (гіст.). На вул. Камуністычнай, на тэрыторыі сярэдняй школы № 16. Бюст Н. К. Крупскай устаноўлены ў 1972 г.

98. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст., маст.). На пл. Леніна. Кампазіцыйны цэнтр плошчы. Пастаўлены ў 1960 г. (скульпт. М. Альтшулер, арх. М. Мілавідаў, С. Ожагаў, А. Марэвіч; бронза, граніт; агульная вышыня 11,2 м, вышыня фігуры 4,6 м).

Скульптурную фігуру У. І. Леніна, пастаўленую на высокім пастаменце, і асіметрычна размешчаную выцягнутую па гарызанталі трыбуну аб'ядноўвае пашыраны ў плане ступеньчаты стылабат. Фігура ў стрымным руху. Твар у дакладных партрэтных рысах, разам з тым абагульненых формах. Пры сціплых памерах і лаканічнай прапрацоўцы дэталей помнік вызначаецца манументальнасцю. *Л. Г. Лапцэвіч, У. С. Марозаў.*

99. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Камсамольскай, у парку культуры і адпачынку. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1962 г.

100. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Пралетарскай, на тэрыторыі завода станкапрылад. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1976 г.

101. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Фабрычнай, на тэрыторыі сярэдняй школы № 6.

95. *Помнік С. І. Грыцаўцу*

98. Помнік У. І. Леніну на плошчы Леніна

Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1960 г.

102. ПОМНІК ПЕРАМОГІ (гіст.). На вул. Фабрычнай, на тэрыторыі тэкстыльнага камбіната. У 1969 г. ў гонар 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў пастаўлена стэла.

103. РАДЗІМА ТАЎЛАЯ Валянціна Паўлавіча (г.ст.)

Беларускі савецкі паэт, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі В. П. Таўлай (літаратурныя псеўданімы Янка Дзвінацаты, Паўлюк Страта, В. Тарскі, партыйныя мянушкі Васіль, Канстанцін, Якімчык) нарадзіўся 8.2.1914 г. З сям'і чыгуначніка. Дзіцячыя гады прайшлі на радзіме бацькі ў в. Рудаўка на Слонімшчыне. Вучыўся ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі, у 1927—29 гг. у Віленскай гімназіі. У гэты час напісаў яго паэма «...». У 1929 г. за ўдзел у вучнёўскіх хваляваннях выключаны з гімназіі, у ... 19.. г. за падпольную камсамольскую работу арыштаваны. У 1930 г. камуністычным падполлем накіраваны ў БССР. Працаваў у газеце «Звязда», вучыўся ў БДУ. У 1932 г. адкліканы ЦК КПЗБ у Заходнюю Беларусь. З снежня 1932 г. член КПЗБ. Некаторы час жыў у Варшаве. Член цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ, потым супрацоўнік легальнага неафіцыйнага органа КПЗБ «Беларуская газета» (Вільня), прадстаўнік ЦК КПЗБ у Цэнтры нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Адзін з арганізатараў Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў (снежань 1933 г.). 4.1.1934 г. арыштаваны ўладамі буржуазнай Польшчы, засуджаны на 8 гадоў турмы. У верасні 1939 г. вызвалены Чырвонай Арміяй з Гродзенскай турмы. Працаваў у Лідскай раённай газеце «Уперад». У Вялікую Айчынную вайну сувязны атрада імя Р. І. Катоўскага партызанскай брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага Баранавіцкага злучэння, разведчык спецгрупы «Буравеснік». У 1944—45 гг. адказны сакратар навагрудскай раённай газеты «Звязда», у 1945—47 гг. старшы навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара Літаратурнага музея Я. Купалы. Памёр 27.1.1947 г. Пахаваны ў Мінску на Вайсковых могілках.

В. Таўлай паэт героічнай тэмы. Друкаваўся з 1928 г. Яго паэзія вызначаецца высокай грамадзянскасцю, рэвалюцыйным гуманізмам, прасякнута духоўнай еднасцю з народам і яго лёсам (паэма «Таварыш», вершы «Лісты з турмы», «Таварышу маёй вясны» і інш.). У вершах, паэмах даў рэалістычную карціну мужнай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі за ўз'яднанне з БССР. Нарыс «...» «Марыя Гурына» і інш. прысвечаны лёсу таварышаў па партызанскай барацьбе, іх мужнасці. Аўтар літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў «Янка Брыль», «Янка Купала і Заходняя Беларусь» (1945 г.), «Творчасць Янкі Купалы ў барацьбе за ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай Савецкай дзяржаве» (1948 г., апубл. 1949 г.). Перакладаў на беларускую мову творы А. Міцкевіча, І. Крылова і інш. Асобныя творы В. Таўлая перакладзены на рускую, украінскую, грузінскую і інш. мовы. Выдадзены кнігі: «Выбранае» (1947 г.), «Выбраныя творы» (1951 г.), «Вершы і паэмы» (1955 г.), «Творы» (1961 г.), «Выбраныя вершы і паэмы» (1967 г.).

Літ.: Арочка М. Валянцін Таўлай: Крытыка-біяграфічны нарыс. — Мн., 1969; Пра час і пра сябе: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / Склад. Я. Казека. — Мн., 1966; У суровыя гады падполля: Успаміны былых членаў КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. — Мн., 1958.

В. Б. Караткевіч

в. Ачмнявічы
Гарадзішчанскі пасялковы Савет

104. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 5 жыхароў вёскі, забітых у 1941 ... нямецка-фашысцкімі ... у Ачмнявічах ... У 1965 ... помнік ...

в. Бараўцы. Навамышскі сельсавет

105. РАДЗІМА ГРЫЦАЎЦА Сяргея Іванавіча — двойчы Героя Савецкага Саюза (гіст.). Гл. артыкул № 35 «Помнік Грыцаўцу Сяргею Іванавічу».

в. Белалесце.
Цешаўлянскі сельсавет

106. КУРГАН (археал.) За 1 км на паўночны захад ад вёскі, каля дарогі Белалесце — Цешаўля. Вышыня 1,5 м, дыяметр 2 м. Выяўлены ў 1951 г. У ... Астаў ... у 1969 г. В. Р. Сугруп, у 1980 г. Т. С. Бубенька.

в. Баразаўка. Лясненскі сельсавет

107. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І ВАЕННАПАЛОННЫХ (гіст.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 828 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг., а таксама ваеннапалонныя, закатаваныя гітлераўцамі ў Лясненскім лагеры смерці. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. Гл. таксама арт. № 153 «Месца загубы савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян. Брацкая магіла савецкіх воінаў і ахвяр фашызму».

108. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. ... 1 ... установлены ...

в. Вольна, цэнтр сельсавета

109. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўднёвай ускраіне вёскі, у пейзажным парку былой сядзібы. Пабудавана ў 1768 г. з цэглы.

Двухвежавая трохнефавая ... з ... паўкруглай апсідай, вонкава якой размешчаны сакрысціі. Фасады вырашаны розныя па форме і вышыні аконнымі праёмамі, паўцыркульнымі, лучковымі, круглымі. Двухсхільны дах закруглены над апсідай, упрыгожаны фігурамі ... Архітэктурны ... сканцэнтраваны на галоўным захадным фасадзе. Складаны ўвагнута-выпуклы ... падзелены на 2 ярусы. Сілуэт верхняга яруса ўтвараюць васьмігранныя трох'ярусныя вежы са шлемападобнымі завяршэннямі і фігурны шчыт паміж імі. Вертыкальнасць кампазіцыі галоўнага фасада падкрэсліваюць пучкі пілястраў і ступеньчатыя контрфорсы, якія ўмацоўваюць сцены. Цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі. Архітэктурна-дэкаратыўны акцэнт інтэр'ера — галоўны алтар, вырашаны ў выглядзе каланады з крывалінейнымі антабламентамі, упрыгожаны скульптурнымі групамі анёлаў. На паўночнай сцяне апсіды ўсталяваны амбон з балдахінам. Над ім узвышаецца статуя Маісея. У аздобе інтэр'ера шырока выкарыстана тэхніка стука (фігуры пудзі, вазы, фестоны). У нартэксе на 2 калонах — хоры.

Царква — помнік архітэктуры позняга барока. *А. М. Ку...*

109. Троіцкая царква. Фрагмент ... алтара ...

в. Вялікае Сяло.
Гарадзішчанскі пасялковы Савет

110. ГАРАДЗІШЧА (археал.). За 1 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Маянтк... каля балота. Абследавалі ў 1969 В. Р. Сугруп, у 1980 Т. С. Бубенька. Памеры 90 × 80 м. Вышыня пляцоўкі ... меншым ... вада ... ручая каля 6—7 м. Пляцоўка ... ўсходняя частка ... вал ... кустамі ... Культурны пласт не выяў...



109. Троіцкая царква. План.



109. Троіцкая царква. Галоўны фасад.

... чыма, на час небяспекі гарадзішча было сховішчам. Раскопы не праводзіліся.

в. Вялікая Валахва, Малахоўскі сельсавет

111. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля школы. Пахаваны 14 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Вялікая Кайнаўка,
Кайнаўскі сельсавет

112. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 58 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Вялікія Лукі, цэнтр сельсавета

113. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 38 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

114. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы, каля школы. На ўшанаванне памяці 69 аднавяскоўцаў, якія загінулі у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

г. п. Гарадзішча

115. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Вул. 17 Верасня, каля будынка сярэдняй школы. Пахаваны 262 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза Пётр Пятровіч Едуноў.

П. П. Едуноў нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Золіна Клінскага р-на Маскоўскай вобл. Кандыдат у члены КПСС. З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1941 г.— старшы сяржант, камандзір узвода аўтаматчыкаў. Удзельнік баёў на Заходнім, Цэнтральным франтах, вызвалення Беларусі. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра (10.1943 г. 5 воінаў на чале з П. П. Едуновым пад артылерыйскім агнём праціўніка пераплылі на лодцы на правы бераг ракі, разведалі размяшчэнне агнявых кропак ворага і шляхі падыходу да іх. 12.10.1943 г. ў баі за вышыню двойчы паранены не пакінуў поля бою. Загадаў гранатамі і гарматным разлікам, падбіў матацыкл і аўтамашыну, захапіў 4 палонных. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 20.12.1943 г. Загінуў 8.7.1944 г. пры вызваленні г. п. Гарадзішча.

У 1956 г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптурныя фігуры 2 воінаў. На пастаменце 2 дошкі, на адной з іх імёны 40 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

116. ГАРАДЗІШЧА (археал.). За 0,8 км на захад ад пасёлка, ва ўрочышчы Гарадок, на правым беразе р. Сэрвач. Выявіў у 1951 г. У. С. Астапаў, даследавалі ў 1957 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1964 г. Л. Д. Побаль, у 1976 М. М. Чарняўскі, у 1980 г. Т. С. Бубенька. Авальная пляцоўка памерам 28×50 м арыентавана з поўдня на поўнач з нязначным адхіленнем на паўднёвы захад ад восі на захад. Уезд з паўночнага боку. Найбольш стромкія схілы гарадзішча — з усходу, дзе пляцоўка ўзвышаецца на 6—7 м. З боку поля роў шырынёй 6—7 і глыбінёй 1,3—1,7 м. На захадзе пераходзіць у поплаў, над якім карэнны бераг узвышаецца на 5 м. Даўжыня ўмацаванага ўчастка каля 200 м, шырыня 130 м. Культурны пласт шэрага колеру таўшчынёй да 1,0 м. Каля паўночна-заходняга краю гарадзішча знойдзена некалькі неапрацаваных крамянёвых адшчэпаў і ножападобных пласцінак, што сведчыць пра наведанне гэтых мясцін чалавекам каменнага веку, а на гарадзішчы — гладкасценная і штрыхаваная кераміка, жалезныя прылады працы і зброя, бронзавыя упрыгожанні.

На аснове знаходак, знешняга выгляду і памераў умацавання помнік можна аднесці да культуры штрыхаванай керамікі і да эпохі ранняга феадалізму. Знаходкі зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

М. М. Чарняўскі.

117. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АРЦІМЕНЮ Марку Аляксеевічу (гіст.). Вул. Гуцева, 2.

М. А. Арцімень нарадзіўся ў 1900 г. ў в. Станкі Баранавіцкага р-на. Член КПСС з 1940 г. Удзельнік рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У 1940—41 гг. працаваў інструктарам Гарадзішчанскага райвыканкома Баранавіцкай вобл. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1940 г. У 1941 г. закатаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў турме г. Баранавічы. У 1969 г. на ўшанаванне яго памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

118. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ГУЦЕВУ Ульяну Аляксеевічу (гіст.). Вул. Гуцева, 2. Устаноўлена ў 1969 на ўшанаванне памяці першага сакратара Гарадзішчанскага райкома КП(б)Б У. А. Гуцева, які загінуў у 1941 г. пры выкананні службовых абавязкаў.

119. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЗАРАГАЦКАМУ Ільі Восіпавічу (гіст.). Вул. Гуцева, 1. Устаноўлена ў 1969 г. на ўшанаванне памяці сакратара Гарадзішчанскага райкома КП(б)Б І. В. Зарагацкага, які загінуў у 1941 г. пры выкананні баявога задання. Яго імем названа вуліца ў г. п. Гарадзішча.

120. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Вокзальнай, у скверы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1963 г.

в. Гарапавічы,
Гарадзішчанскі пасялковы Савет

121. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1950 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Гірмантаўцы, цэнтр сельсавета

122. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 50 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1970 г. пастаўлена стэла.

123. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1967 г.

в. Дамашэвічы, Сталовіцкі сельсавет

124. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Паха-



116. *Гарадзішча*

ваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Добры Бор, Падгорнаўскі сельсавет

125. ГАРАДЗІШЧА (археал.). За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, справа ад дарогі Падгорная — Добры Бор, ва ўрочышчы Маргач. Займае паўночна-ўсходнюю частку лясістай грады, якая прымыкае да р. Гарадзянкі і невялікага балота. Адкрыў у 1951 г. А. Р. Мітрафанаў, абследавалі ў 1959 г. В. Р. Супрун, у 1980 г. Т. С. Зубенька. Пляцоўка авальнай формы памерам 71×80 м, выцягнутая з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, у цэнтры крыху выпуклая. Па краі ўмацавана валам вышынёю 0,8 м (з паўднёвага боку вал прасочваецца слаба). Вышыня пляцоўкі над поплавам ракі каля 30 м. З захаду роў глыбінёю каля 0,7 м. Шырыня ўваходу каля 3 м. Пляцоўка зарасла лесам і моцна апшыла. Раскопкі не праводзіліся.

126. СТАЯНКА (археал.). За 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на шырокім поплаве правабярэжжа р. Шчара, ва ўрочышчы Гарадок. Выявіў у 1951 г. А. Р. Мітрафанаў. У 1960 г. раскопкі вяла І. М. Цюрына. Плошча 5500 м². Вядома пад назвай Добры Бор-1. Ускрыта 984 м². Культурны пласт цёмна-шэрага колеру, таўшчынёй 0,5–0,8 м. Знойдзена 12 агнішчаў круглай і авальнай формы дыяметрам ад 1 да 2,3 м. Добра акрэсліваецца 5 ям. Тры з іх амаль прамавугольнай формы з арыентацыяй на поўдзень і паўднёвы ўсход, відаць, рэшткі паўзямлянкавага жылля. У ямах знойдзены крамянёвыя прылады працы і фрагменты керамікі. Дзве конусныя ямы, як мяркуюць, гаспадарчага прызначэння. Сабрана вялікая калекцыя керамікі (каля 2 тыс. абломкаў посуду), крамянёвых і каменных прылад працы (каля 900), наканечнікі стрэл пераважна трохвугольнай формы (2 тронкавыя), наканечнікі коп'яў з масіўных пласцінак з рэтушшу па краях, скрабы разнастайнай формы, нажы з гарбатай спінкай і ўвагнутым лязом. Знойдзены таксама разцы, праколкі, нуклеусы, крамянёвыя цяслы і сякеры, свідраваныя сякеры і іх абломкі, шліфавальныя пліткі, адбойнікі. З керамікі выяўлены абломкі вастрадонных гаршкоў позняга неаліту з S-падобным профілем сценак. Арнамент — узоры з наколак, насечак і рысак. Амаль на ўсіх венцах пад краем венчыка глыбокія ямкі або наколы. Сярод знаходак абломкі пласкадоннага керамічнага посуду бронзавага веку. Добра абпаленыя вырабы арнаментаваны пальцамі ў елачку і шнуравымі адбіткамі.

Паселішча Добры Бор-1 адносяць да 2-й палавіны 3—2-га тысячагоддзя



126. *Рэчы са стаянкі.*

да н. э., асноўную частку знаходак — да позняга этапа нёманскай культуры.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Дзяржаўным музеі БССР.

М. М. Чарняўскі

в. Дубава, Каўпеніцкі сельсавет

127. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 28 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1944 гг. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Забалацце, Цешаўлянскі сельсавет

128. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 76 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1972 г. пастаўлены абеліск.

хутар Завоссе (не існуе)

129. РАДЗІМА МІЦКЕВІЧА Адама (гіст.). Урочышча Завоссе (раней быў фальварак), за 4 км на поўнач ад в. Мядзведзевічы. Тут 24.12.1798 г. нарадзіўся польскі паэт, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху Адам Міцкевіч. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што ён нарадзіўся ў Навагрудку ці ў в. Асаўцы. Аднак найбольш верагоднымі з'яўляюцца звесткі брата А. Міцкевіча — Аляксандра, які ў 1861 г. ў пісьме да маршалка Навагрудскага павета У. Р. Брахоцкага сцвярджаў, што А. Міцкевіч нарадзіўся ў Завоссі, дзе на той час гасцілі бацькі. У 1799 г. яны атрымалі ў спадчыну частку фальварка Завоссе і жылі там да 1801 г.

Дзяцінства А. Міцкевіча прайшло ў Навагрудку, дзе яго бацька працаваў адвакатам. Скончыў дамініканскую школу (1815 г.), Віленскі універсітэт (1819 г.). У 1819—23 гг. настаўнічаў у Коўне. Адзін з арганізатараў тайных таварыстваў патрыятычнай моладзі («філаматы» і «філарэты»). У 1823 г. арыштаваны. З 1824 г. ў ссылцы. Жыў у Пецярбургу, Маскве, Адэсе. Пазнаёміўся і пасябраваў з К. Рылеевым, А. Бястужавым, А. Пушкіным, П. Вяземскім і інш. У 1829 г. выехаў за мяжу. З 1832 г. жыў у Парыжы, чытаў курс лекцый па славянскіх літаратурах у Калеж дэ Франс (1840—44 гг.). Быў адным з палітычных кіраўнікоў левага крыла польскай эміграцыі. У пачатку 1840-х гадоў знаходзіўся пад уплывам рэлігійна-містычных настрояў. У пачатку 1840-х гадоў адмежаваўся ад шляхецкай рэвалюцыйнасці да рэвалюцыйнай дэмакратыі. У 1848 г. арганізаваў польскі легіён для падтрымкі руху карбанарыяў у Італіі. У 1849 г. рэдагаваў у Парыжы інтэрнацыянальную газету «La Tribune des peuples» («Трыбуна народаў»). Вызваленне Польшчы звязваў з нацыянальна-вызваленчай і сацыяльнай барацьбой іншых народаў Еўропы. Памёр 26.11.1855 г. ад халеры ў Канстанцінопалі, пахаваны ў Парыжы. У 1890 г. астанкі паэта перавезены ў Кракаў.

Першыя творы А. Міцкевіча напісаны ў час вучобы ў Віленскім універсітэце («Мешка, князь Навагрудка», 1817 г.; «Бульба», 1819 г.). Заснавальнік рэвалюцыйнага рамантызму ў польскай літаратуры (кн. «Паэзія», т. 1—2, 1822—23 гг.). Уплыў беларускіх казак і легенд асабліва адчувальны ў баладах і рамансах («Свіцязь», «Свіцязянка», «Рыбка»). У 2-й частцы паэмы «Дзяды» (1823 г.) намаляваны беларускі абрад памінання нябожчыкаў. Найбольш значныя творы рускага перыяду — «Крымскія санеты» (1826 г.), паэма «Конрад Валенрод» (1828 г.). У эміграцыі напісана 3-я частка паэмы «Дзяды» (1832 г.) пра мужнасць змагароў супраць царызму. Вяршыня творчасці А. Міцкевіча — паэма «Пан Тадэвуш» (1834 г.). У ёй рэалістычна паказана жыццё народа і шляхты, апаэтызаваны беларускія краявіды. Яшчэ пры жыцці А. Міцкевіч быў прызнаны найвялікшым польскім паэтам. Яго творчасць зрабіла ўплыў на развіццё ўсіх славянскіх літаратур, асабліва на беларускую. Пад яго непасрэдным уздзеяннем пачыналі літаратурную дзейнасць Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, У. Сыра



129. *Помнік на радзіме А. Міцкевіча.*

135. *Троіцкі касцёл*

[illegible] Маршакевіча, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. Творы А. Міцкевіча перакла[illegible] Марцінкевіч, [illegible] Я. Ку-[illegible] М. Танк, У. Караткевіч і інш. У Навагрудку створаны літаратурна-мемарыяльны музей паэта, у яго гонар на Замкавай гары насыпаны мемарыяльны курган, у Брэсце ўстаноўлены бюст. У 1927 г. на месцы фальварка [illegible] рыраваны ў 19[illegible] г.).

[illegible] Ф. Мицкевич и прогрессив[illegible] общественность. М., 1955.
[illegible] Мальдзіс.

в. Залессе. Вольнаўскі сельсавет

130. МАГІЛА ВІЛЕНКІ Мікалая [illegible] (гіст.). На могілках.

Герой Сацыялістычнай Працы М. Л. Віленка нарадзіўся 24.4.1898 г. ў в. Залессе Баранавіцкага р-на ў [illegible] батрачыў у мясцовых памешчыкаў. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі [illegible] БССР [illegible] «Вольна Чэрніхава» Баранавіцкага р-на. Званне Героя Са[illegible] 19[illegible] Памёр 27.[illegible] магіле пастаўлена стэла.

Літ.: Земные звёзды.— Мн., 1978.

в. Застарынне. Пачапаўскі сельсавет

131. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 17 партызан, якія загінулі 2.5.1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У ноч на 2.5.1943 г. партызаны атрада імя А. В. Суворава Першамай[illegible] урачысты сход жыхароў в. Застарынне [illegible] акупантам. Раніцай 2 мая ў вёску ўварваліся карнікі. Рота партызан пад камандаваннем І. С. Кірыка за[illegible] лых атак. На дапамогу фашыстам падышло падмацаванне. У баі загінулі 17 партызан.

У 1944 г. на магіле пастаўлены абеліск.

[illegible] Белоруссии. 1941—1944.— Мн., 1971.
М. А. Багдашэвіч

132. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На [illegible] Пахаваны мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору.

[illegible] 2. 194[illegible] расправіўся з яе жыхарамі. Карнікі зганялі ў хаты па 15—20 чалавек [illegible] падпальвалі. Загінулі 382 жыхары [illegible] спалена 25 дамоў.

У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. 2 изд.— Мн., 1965; Раманоўскі В. П. [illegible]

в. Зорная. Навамышскі сельсавет

133. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 22 воіны, якія загінулі ў [illegible] нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік скульптура [illegible]

в. Зялёная.
Гарадзішчанскі пасялковы Савет

134. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ [illegible] У цэнтры вёскі. На ўшанаванне па[illegible] мецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1973 г. пастаўлены абеліск.

135. Троіцкі касцёл. Алтар.



135. Троіцкі касцёл. План.

135. Троіцкі касцёл. Аксанаметрыя.

в. Ішкалдзь, Савіцкі сельсавет

135. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудаваны ў 1472 г. з цэглы.

Складаецца з прамавугольнага асноўнага аб'ёму і няцэнтральнай алтарнай апсіды. З паўночнага ўсходняга боку — сакрысція і вежа з вінтавой лесвіцай. Галоўны заходні фасад завершаны шчытом фігурнага ступеньчатага абрысу. Асноўныя дэкаратыўныя элементы фасада плоскія нішы (круглыя і з паўцыркульным завяршэннем). Над стральчатым парталам — вузкае акно. Такія ж вокны на паўднёвым фасадзе і апсідзе. Паўночная сцяна без акон. Бакавыя фасады і апсіда пазбаўлены дэкору. Сцены ўмацаваны ступеньчатымі контрфорсамі. Першапачаткова былі атынкаваныя, унізе аздоблены каляровым ромбічным узорам з цэглы жалезняку. Атынкаваныя дэкаратыўныя нішы кантрастна вылучаліся на чырвоным цагляным фоне. Інтэр'ер касцёла з заходняга памяшкання падзелены 4 слупамі на 3 нефы, з якіх цэнтральны значна шырэйшы за бакавыя; бакавыя сцены з гранёнымі паўкалонамі. Травеі нефаў перакрыты [illegible] крыжовымі, [illegible] зорчатымі. [illegible] упрыгожаны [illegible] кратамі.

Касцёл — помнік архітэктуры готыкі на Беларусі.

[illegible] Малоизвестные зальные сооружения Бело[illegible] [illegible] архитектура [illegible] Чернявская.

в. Калдычава, Мядзведзіцкі сельсавет

136. ЛАГЕР СМЕРЦІ (гіст.). [illegible] Баранавічы — Навагрудак.

[illegible] нямецка-фашысцкімі акупантамі для [illegible] Тэрыторыя яго была абгаро[illegible] размяшчалася [illegible] ніцы на торфараспрацоўках і іншых работах, іх расстрэльвалі, вешалі, катавалі ў спецыяльных камерах. Нярэдка фашысты практыкавалі варварскую экзекуцыю над зняволенымі, названай «танцаваць жабку». Вязняў выганялі на плац, ставілі паўкругам ці карэ, «вінаватых» прымушалі скакаць перад імі з вывернутымі назад рукамі. Калі знясілены чалавек падаў, яго забівалі гумавымі дубінкамі або прыстрэльвалі. Перад адступленнем у ноч на 30.6.1944 г. гітлераўцы расстралялі вязняў лагера і ўзарвалі асноўныя памяшканні. Усяго ў лагеры загінула больш за 22 тыс. савецкіх грамадзян.

У 1964 г. на яго месцы пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

Літ.: В память о погибших [illegible] валтов в Белоруссии 1941—1944. [illegible] Мн., 19[illegible]

137. ПОМНІК ВЯЗНЯМ ЛАГЕРА СМЕРЦІ (маст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. У памяць аб ахвярах Калдычаўскага лагера смерці ў 1964 г. пастаўлена стэла з рэльефам (скульпт. А. Курачкін, бетон, чыгун, вышыня стэлы 4 м). На вышыні $^2/_3$ ад асновы ў стэлу ўрэзаны чыгунны рэльеф — пагрудная выява вязня, які разрывае ланцугі. Перад стэлай манументальныя бетонныя чашы з жывымі кветкамі, што сімвалізуюць жыццё. Побач 2 каменныя блокі з надпісамі, прысвечанымі савецкім грамадзянам, якія загінулі ад рук фашыс-

іх катаў. Гл. таксама артыкул № 136 «Лагер смерці».

в. Карчова, цэнтр сельсавета

138. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 19 воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

139. ТУГАНАВІЦКІ ПАРК (гіст., архіт.). На левым беразе р. Сэрвач, 1 км ад вёскі. Створаны ў 2-й палавіне 18 ст. Акружаў дваровыя збудаванні маёнтка Туганавічы (назва ад імя ўладальніка князя Тугана). У 19 ст. маёнткам валодалі Верашчакі.

Пейзажны парк плошчай каля 5 га высаджаны па ўзгорыстай мясцовасці. Асноўныя элементы (шматпланавыя палянкі з курцінамі і далёкімі перспектывамі) пабудаваны ... Уязная алея вяла да ансамбля ... пабудоў (не зберагліся). На 2 узгорках размяшчаліся мураваныя альтанкі. У паўночна-ўсходняй частцы парку 2 сажалкі. Пераважаюць ясень, клён, вярба, дуб, ліпа еўрапейская.

У Туганавічы да свайго сябра па Навагрудскай ... М. Верашчакі, часта наведваўся Адам Міцкевіч. Паэт захапляўся паркам і яго наваколлем. Паводле сцвярджэння даследчыкаў, апісанне ў паэме «Пан Тадэвуш» Сапліцова цалкам адпавядае тапаграфіі Туганавіцкай сядзібы і яе ваколіц. Адсюль і прататыпы герояў многіх твораў А. Міцкевіча. «Нідзе на зямлі няма весялейшага жыцця...» — успамінаў паэт. «І нідзе там радасці, любасці, чалавечага бясконцага шчасця... Такога жыцця шчодра спазнаў я паміж 1815 і 1820 гадамі, асабліва ў доме Верашчакаў...» Частымі гасцямі гаспадароў сядзібы былі Ян Чачот, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка.

У глыбокім яры недалёка ад парку ляжыць валун — «Камень філарэтаў», каля якога праводзілі сходкі ўдзельнікі тайнага таварыства патрыятычнай моладзі. З Туганавічамі звязаны некаторыя падзеі ... паўстання 1863—64 гг. Уладальнік маёнтка К. Тугаоўскі падтрымліваў цесныя сувязі з К. Калиноўскім, памагаў яму. У парку была створана майстэрня па вырабу зброі, якая перапраўлялася ў «цэнтр» в. Мілавіды.

Літ.: Антипов В. П. Парки Белоруссии.— Мн., 1975; Мірачыцкі Л. П. Сцежкамі вялікага паэта.— Мн., 1957.

Л. П. Мірачыцкі.

в. Колбавічы, Падгорнаўскі сельсавет

140. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 41 аднавяскоўцаў, якія загінулі у барацьбе за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну, у 1980 г. пастаўлены абеліск.

в. Крошын, цэнтр сельсавета

141. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У скверы. Пахаваны 16 воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

142. КАСЦЁЛ (архіт., маст.). Пабудаваны ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Прамавугольны ў плане будынак. Галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам і дэкарыраваны нішамі. У інтэр'еры — люстра (чыгун, ліставая бронза; ручное каванне) работы беларускага паэта П. В. Багрыма. Люстра аднаярусная, з 2 абручоў, якія трымаюцца на 3 металічных жгутах з каронападобным завяршэннем. Лёгкасць і ажурнасць каванай люстры надаюць арабескі, якія вобразам-малюнкам прыкрываюць па перыметры усе элементы канструкцыі.

143. МАГІЛА БАГРЫМА Паўлюка Восіпавіча (гіст.). На могілках. Беларускі паэт П. В. Багрым нарадзіўся ў 1813 г. (?) у в. Крошын. Вучыўся ў парафіяльнай школе пры мясцовым касцёле. Меў сувязь з сялянамі, якія былі настроены супраць прыгонніцтва і ў 1828 г. ўзнялі ў Крошыне бунт. Чытаў аднавяскоўцам «крамольныя» вершы, за што быў аддадзены ў рэкруты. Пасля вяртання на радзіму працаваў кавалём. ... касцёле зберагаецца металічная люстра, выкаваная П. В. Багрымам (гл. ў артыкуле № 142 «Касцёл»). Захаваўся адзін верш паэта «Заграй, заграй, хлопча малы». Ён ... пратэсту супраць прыгонніцкай ... бяднейшай пачуццяў. Памёр каля 1891 г.

136. *Помнік ахвярам Калдычэўскага лагера смерці.*

139. *Туганавіцкі парк. Фрагмент.*

139. *Тугана... ...раць.*



139. *Туганавіцкі парк. Камень ...рэтаў.*

У 1968 г. на магіле пастаўлены помнік. Надпіс на помніку [illegible] аараджэння паэта (1811 г.) патрабуе удакладнення. У следчай справе П. В. Багрыма адзначана, што ён нарадзіўся у 1813 г. [illegible] легенда [illegible] не на 1865 г.

Александровіч С. Х. [illegible] па ты [illegible] легенды.— М [illegible] Гісторыя беларускай дакастрычніцкай [illegible] аратуры. Т. 2.— Мн., 1969. *А. І. М[illegible]*

144. МАГІЛА МАЦКОЎСКАГА Абрама Аронавіча (гіст.). На могілках

Героя Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР (з 1973 г.) А. А. Мацкоўскі нарадзіўся 20.7.1917 г. ў г. Клімавічы Магілёўскай вобл. З рабочых. У 19[illegible]7 гг. працаваў машыністам на [illegible] заводзе, [illegible] на дрэваапрацоўчай мэблевай фабрыцы ў Клімавічах. З 1937 г. у Чырвонай Арміі. Член КПСС з 1944 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі паступіў у Чэрыхаўскую [illegible] школу (1947 г.), дырэктар Гарадзішчанскай электрастанцыі, з 1957 г. старшыня калгаса «Перамога» Баранавіцкага р-на. Пад яго кіраўніцтвам гаспадарка стала адной з передавых у рэспубліцы, у 1967 г. калгас узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Званне Героя Сацыялістычнай Працы А. А. Мацкоўскаму прысвоена ў 1976 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1971—75 гг. Памёр 12.11.1978 г. У 1980 г. на магіле пастаўлена стэла.

[illegible] М[illegible] 1978 [illegible]
Г. І. Дралюба

145. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка клуба. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1970 г.

в. Лебяжаны, Цешаўлянскі сельсавет

146. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 39 воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1962 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

в. Ліхасельцы, Вольнаўскі сельсавет

147. ДВОР З НЯЗВЯЗАНЫМІ ПАБУДОВАМІ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў пачатку 2[illegible].

Хата зрублена з бярвён «у лапу». Да вуліцы павернута тарцовым фасадам з 2 вокнамі. У паўднёвай сцяне з заходняга боку акно. Кух[illegible] у асобным памяшканні. Да ян[illegible] прыбудаваны сенцы. Ад хаты да ву[illegible] іцы 5—6 м. У двары паралельна з хатай, за 35 м ад вуліцы — хлеў. Уваход у яго — з заходняга боку.

142. [illegible] ра[illegible] ра[illegible] П[illegible] [illegible] *[illegible] в. Крывошын*

Прыкметы размяшчэння гаспадарчых будынкаў на адлегласці ад жылых [illegible] з'яўляюцца прыкметамі [illegible] жарскай блізкасці. Двор тыповы для Брэстчыны. *У. С. Гур[illegible]*

148. МАГІЛА КАЛОШЫ Васілія Васілевіча (гіст.). На могілках. Сакратар былога Галаўкаўскага сельсавета В. В. Калоша забіты ворагамі Савецкай улады ў 1948 г. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

139. *Т[illegible]цкі парк. Фрагмент*



143. *Помнік на магіле П. Багрыма*

в. Лотвічы, Палонкаўскі сельсавет

149. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 20 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941—44 гг. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Люшнева, Цешаўлянскі сельсавет

150. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 29 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941 і 1944 гг. У 1963 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура партызана.

151. КУРГАН (археал.). За 1,8 км ад вёскі, м ад дарогі на в. Цешаўля. Вышыня 1,7 м, дыяметр 9 м. Адкрыў у 1951 г. У. С. Астапаў, абследавалі ў 1969 г. В. Р. Супрун, у 1970 г. М. М. Чарняўскі, у 1980 г. Т. С. Бубенька.

в. Лясная, цэнтр сельсавета

152. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ускраіне вёскі. Пахаваны 80 савецкіх грамадзян, якіх у 1941 г. загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1979 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ст. Лясная

153. МЕСЦА ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ І МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля чыгуначнай ст. Лясная нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1941—44 гг. расстрэльвалі савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў. Тут пахаваны 50 тыс. чалавек, закатаваных у Лясянскім лагеры смерці, і 47 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. ў баях за вызваленне Баранавіцкага р-на ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У верасні 1941 г. нямецка-фашысцкія акупанты стварылі каля в. Лясная лагер смерці № 337. У ім пастаянна знаходзілася каля 55 тыс. чалавек. Вязні ўтрымліваліся ў бесчалавечных умовах, свядома разлічаных на масавую гібель людзей. Большасць з іх жыла ў вялікія марозы былі пад адкрытым небам, і штодня ад голаду, інфекцыйных і прастудных хвароб гінула па некалькі дзесяткаў зняволеных. Фашысты праводзілі масавыя расстрэлы, ... У лагеры загублена каля 88,5 тыс. чалавек.

У 1968 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

Літ.: В памяти народной. — Мн., 1985 ...

154. РАДЗІМА ГАЛУБКА Уладзіслава Іосіфавіча (гіст.). У. І. Галубок

153. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і ахвяр фашызму*

беларускі савецкі пісьменнік, адзін з заснавальнікаў беларускага савецкага тэатра, рэжысёр, акцёр, мастак, першы народны артыст БССР (1928 г.).

У. І. Галубок (сапраўднае прозвішча Голуб) нарадзіўся 1.5.1882 г. Скончыў царкоўнапрыходскую школу ў Мінску, 2 гады вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы. Пасля смерці бацькі працаваў грузчыкам, прыказчыкам, слесарам. Адначасова займаўся самаадукацыяй, браў урокі ў ма-



157. *Помнік Б. Б. Вільчкоўскаму*

стакоў. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1906 г. як паэт і празаік. Друкаваўся на старонках беларускіх перыядычных выданняў «Наша ніва» і «Лучынка». З 1917 г. вядомы як драматург. Напісаў каля 40 драм і камедый. Найбольш значныя «Пан Сурынта», «Суд», «Ганка», «Пісаравы імяніны», «Пінская мадонна», «Плытагоны». У 1917—20 гг. акцёр і рэжысёр Першага таварыства беларускай драмы і камедыі. Тут пастаўлены яго п'есы «Апошняе спатканне» і «Пісаравы імяніны» (1917 г.), «Бязвінная кроў» (1918 г.), «Бязродны» (1919 г.). У 1920 г. стварыў тэатр (трупа Галубка, пазней Беларускі 3-і дзяржаўны тэатр), аснову рэпертуару якога складалі яго п'есы: «Суд» (1920 г.), «Душагубы» (1921 г.), «Пан Сурынта» і «Плытагоны» (1923 г.), «Ганка» (1924 г.), «Пінская мадонна» (1927 г.) і інш. Яны ставіліся і ў Беларускім дзяржаўным тэатры (пазней імя Я. Купалы). Творча развіваў традыцыі беларускага народнага тэатра (батлейкі, народнай драмы), першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага. Шырока выкарыстоўваў песенна-музычную і харэаграфічную народную творчасць. Сам выконваў драматычныя і характарныя ролі, выступаў як тэатральны мастак і жывапісец-пейзажыст. Надаваў вялікае значэнне асветніцкай і агітацыйнай дзейнасці тэатра. Памёр у 1942 г.

Літ.: Атрошчанка А. Уладзіслаў Галубок. — Мн., 1969; Лойка А. Уладзіслаў Галубок. — У кн.: Слова пра майстроў сцэны. Мн., 1967; Нефёд В. Н. ... — Мн., 1965; Архіўныя звесткі ... Успаміны пра Уладзіслава Галубка. — Мн., 1975; Карабанава Л. В. Драматургия Уладислава Голубка. — Мн., 1982.

в. Малахоўцы, Малахоўскі сельсавет

155. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 11 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

156. РАДЗІМА КАБУШКІНА Івана Канстанцінавіча — Героя Савецкага Саюза (гіст.). Гл. артыкул № 164 «Помнік Кабушкіну Івану Канстанцінавічу».

в. Малая Сваротва, Моўчадскі сельсавет

157. ПОМНІК ВІЛЬЧКОЎСКАМУ Багуславу Багданавічу (гіст.). На ўскраіне. Пастаўлены ў 1966 г. па ўшанаванне памяці старшыні калгаса «Іскра» Героя Сацыялістычнай Працы Б. Б. Вільчкоўскага (скульпт. В. Ягадніцкі; чыгун, бетон; вышыня бюста 1,3 м, пастамента 5 м). Бюст пастаўлены на пастаменце з двух ступеньчатым стылабатам. Гл. таксама артыкул № 196 «Магіла Вільчкоўскага Багуслава Багданавіча».

158. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.) Каля будынка праўлення калгаса імя Б. Б. Вільчкоўскага. На ўшанаванне памяці 48 землякоў, якія загінулі ў барацьбе за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлена стэла.

в. Мілавіды, цэнтр сельсавета

159. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 79 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—44 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

160. МЕСЦА БІТВЫ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЎСТАННЯ 1863—64 гг. (гіст., архіт.). На Брэсцкай шашы, за 1,5 км ад вёскі.

У сярэдзіне мая 1863 г. пад Мілавідамі, паблізу стратэгічна важнай дарогі Брэст — Бабруйск, сканцэнтравалася некалькі паўстанцкіх атрадаў: Слонімскі — Ф. Юндзіла, Ваўкавыскі — Г. Стравінскага (Млотака), Гродзенскі — А. А. Лянкевіча (Ядзвіра), Навагрудскі — В. Міладоўскага, Пружанскі — Ф. Улодака, усяго каля 800 чалавек. Камандаванне аб'яднанымі сіламі ўзяў на сябе А. Лянкевіч. Паўстанцы ўстанавілі кантроль над значным раёнам, знаёмілі сялян з мэтамі паўстання, выступалі за надзяленне іх зямлёй і спыненне феадальных павіннасцей. 20 мая мілавідскі лагер інспектаваў К. Каліноўскі. Царскія ўлады кінулі супраць паўстанцаў войскі. Першай падышла калона са Слоніма (3 роты пяхоты і 4 гарматы), якая 22 мая атакавала лагер. Бой працягваўся некалькі гадзін. Слабаўзброеныя паўстанцы адбілі ўсе атакі, нанеслі царскім значныя страты (паводле афіцыйнага данясення, 50 забітых і параненых). Аслабелыя і дэмаралізаваныя царскія войскі мусілі адступіць на зыходныя пазіцыі. Неузабаве на дапамогу ім падаспела калона з Нясвіжа (2 роты). Назаўтра наступленне ўзнавілася. Але паўстанцы за той час пакінулі лагер.

160. *Мемарыяльная капліца на месцы Мілавідскай бітвы.*

Мілавідская бітва была адной з буйнейшых на Беларусі ў час паўстання 1863—64 гг. На месцы яе ў 1930—33 гг. пабудавана мемарыяльная капліца. Вытрымана ў архітэктурных формах неакласіцызму. Ідэя і мастацкі змест увасоблены ў цэнтрычнай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі. На квадратным у плане цокалі ўстаноўлены 4 калоны, якія нясуць пліту антаблемента. Завяршае капліцу сферычны гранёны купал з ажурным крыжам. У дэкоры збудавання выкарыстаны толькі архітэктурныя элементы. Унутраная прастора абмежавана міжкалоннымі арачнымі прасценкамі. У філёнгах цокаля і пастамента — памятныя надпісы. Заняты помнікам прамавугольны участак тэрыторыі адзначаны гранёнымі нізкімі слупкамі і зялёнымі насаджэннямі.

Літ.: Паўстанне 1863—1864 гг. ... Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг.— М., 1965; Смирнов А. Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии.— М., 1963.

Г. В. Кісялёў, А. М. Кулагін.

161. ПАШТОВАЯ СТАНЦЫЯ (архіт.). На ўскраіне вёскі, на шашы Івацэвічы — Слуцк. Пабудавана па «узорнаму» праекту 1843 г. з цэглы. Выкарыстоўваецца як рамбаза дарожнай установы.

Тры мураваныя будынкі ствараюць сіметрычную франтальную кампазіцыю. Цэнтральны звернуты да шашы галоўным фасадам, службовыя — тарцамі. Прамавугольныя ў плане будынкі пакрыты вальмавымі дахамі. Цэнтр кампазіцыі падкрэслены рызалітам галоўнага ўваходу, завершана га прафіляваным карнізам з сухарыкамі і трохвугольным франтонам. У цэнтральным будынку былі жылыя памяшканні для праезджых, кухня, кватэра наглядчыка, у бакавых — каратэтная і пуня.

Станцыя — характэрны помнік дарожнага будаўніцтва з элементамі класіцызму.

Літ.: Сардаров А. С. История и архитектура дорог Белоруссии.— Мн., 1978.

А. С. Сардараў.



161. *Паштовая станцыя. Схема [illegible] роук.*



161. *Паштовая станцыя. План*



161. *Паштовая станцыя*



164. *Помнік І. К. Кабушкіну. Фрагмент.*

162. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Фелiксу Эдмундавiчу (гiст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Ф. Э. Дзяржынскага. Бюст Ф. Э. Дзяр[illegible].

163. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гiст.). На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, каля сярэдняй школы. На ўшанаванне памяці 60 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. [illegible] абеліск.

пас. Мірны,
цэнтр Малахоўскага сельсавета

164. ПОМНІК КАБУШКІНУ [illegible] Канстанцінавiчу (гiст., маст.). На ўсходняй ускраіне пасёлка, перад будынкам сельскага Савета.

Герой Савецкага Саюза І. К. Кабушкін нарадзіўся 15.2.1915 г. ў в. Малахоўцы Баранавіцкага р-на. Служыў з 1935 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў курсы малодшых лейтэнантаў. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў у акружэнне. З восені 1941 г. ў Мінску. Арганізаваная ім група патрыётаў збірала зброю, распаўсюджвала лістоўкі, праводзіла дыверсіі, толькі ў кастрычніку — лістападзе 1941 г. знішчыла 8 нямецкіх аўтамашын, 16 гітлераўцаў. У канцы 1941 г. І. К. Кабушкін (падпольныя клічкі Жан, Бабушкін, Сашка Парфёнаў) [illegible] М[illegible] падпольным гаркомам КП(б)Б. Выконваў адказныя даручэнні гаркома і камандавання партызанскіх атрадаў. З мая 1942 г. ўзначальваў аператыўную групу гаркома. Удзельнічаў у арганізацыі друкавання і распаўсюджвання газеты «Звязда», зводак Саўінфармбюро, лістовак. 4.2.1943 г. гітлераўцы арыштавалі І. К. Кабушкіна і закатавалі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 8.5.1965 г. [illegible] у Мінску і Баранавічах. На будынку 1-га вагоннага дэпо ў Казані, дзе працаваў І. К. Кабушкін, устаноўлена мемарыяльная [illegible].

Помнік пастаўлены ў 1974 г. (скульптар І. Міско, арх. Л. Левін; алюміній, цэмент; агульная вышыня 5,17 м). У цэнтры прамавугольнага стылабата з алюмініевых пліт узвышаецца прамавугольная высокая стэла, завершаная сюрэльефным ... [illegible] галавы), адметны дакладнасцю партрэтнай характарыстыкі, пластычнай выразнасцю ў мадэліроўцы твару. На стэле 2 пліты з памятнымі надпісамі.

Літ.: Дорога в бессмертие.— М., 1967. Люди легенд. В. 4. М., 1971.

М. К. Ковалев, М. М. Яницкая.

в. Міцкевічы, Моўчадскі сельсавет

165. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гiст.). Каля клуба. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1967 г.

в. Моўчадзь, цэнтр сельсавета

166. КУРГАН (археал.). За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, злева ад дарогі на Слонім. 1 насып. Вышыня 1,7 м, дыяметр 8—9 м. Адкрыў у 1951 г. У. А. Асташоў, абследавалі ў 1969 г. В. Р. Супрун, у 1970 г. М. М. Чарняўскі, у 1980 г. [illegible].

167. ПОМНІК ГРЫЦАВЦУ [illegible] Іванавічу (гiст.). На тэрыторыі школы-інтэрната. Скульптура двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца ўстаноўлена ў 1975 г. Гл. артыкул № 95 «Помнік Грыцаўцу Сяргею Іванавічу».

168. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гiст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 108 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1977 г. [illegible] каменная стэла з імёнамі загінуўшых.

в. Наторная, Гірмантаўскі сельсавет

169. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гiст.). Каля школы. На ўшанаванне памяці 27 адцаўскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. ўстаноўлены абеліск.

в. Новая Мыш, цэнтр сельсавета

170. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН [illegible] ку. Пахаваны 28 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата з аўтаматам у руках.

171. ПРААБРАЖЭНСКІ КАСЦЁЛ (архіт., маст.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 1825 г. з цэглы. Агароджаны парканам з трохарачнай мураванай брамай. Прамавугольны ў плане аб'ём з трохграннай алтарнай часткай накрыты агульным двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром. Галоўны фасад — васьмікалонны порцік, характэрны для позняга класіцызму. Стральчатыя вокны з простымі ліштвамі, як і контрфорсы, якія ўмацоўваюць прасценкі бакавых фасадаў, вынік уплыву неаготыкі. Шырокі неф касцёла, дзе вылучаны самастойныя аб'ёмы сакрыстый, перакрыты [illegible] скляпеннем. На хорах, што абапіраюцца на 2 калоны, пры ўваходзе стаяць сцішла дэкарыраваны расліп



168. *Помнік землякам.*

...ным арнаментам арган. У канцы 19 — пачатку 20 ст. ў касцёле ўстаноўлены 3 драўляныя разныя алтары і амбон. Алтары выкананы ў 17 ст. (перабудаваны і ўпрыгожаны скульптурамі ў 18—19 ст.), амбон — у 1745 г. (перанесены з касцёла бернардзінцаў у Нясвіжы). Галоўны алтар — двух'ярусны, на высокім пастаменце. Чатыры калоны першага яруса па 2 абапал алтарнай карціны «Праабражэнне» пышна расфарбаваны, прафіляваны антабламент з накладной разьбой. У нішах паміж калонамі — драўляная скульптура. У другім ярусе (вакол алтарнай карціны «Святая сям'я») — скульптурная група анёлаў у дынамічных пастаях. Вянчае алтар таксама скульптурная група анёлаў. Бакавыя алтары па кампазіцыі аналагічныя цэнтральнаму, але меншыя памерамі. Матывы разьбы: вінаградная лаза з гронкамі, разеткі, ракавіны, пальметы і інш. стылізаванае лісце, галоўкі [illegible] і фантастычныя рыбы. Сярод скульптур 18 ст. найбольш цікавыя «Святы Станіслаў» і «Маці боская з дзіцем», усталяваныя на кранштэйнах абапал цэнтральнага алтара. Амбон у стылі ракако, дэкарыраваны скульптурамі 4 евангелістаў у экспрэсіўных ракурсах, херувімамі, маскаронамі, палкаводчымі атрыбутамі, а таксама картушамі і медальёнамі. Вянчае амбон скульптурная група анёлаў у палёце.

І. М. [illegible], Г. М. [illegible]

в. Пагулянка, Моўчадскі сельсавет

172. РАДЗІМА ВІЛЬЧКОЎСКАГА Багуслава Багдановіча, Героя Сацыялістычнай Працы (гіст.). Гл. артыкул № 190 «Магіла Вільчкоўскага Багуслава Багдановіча».

в. Падгорная, цэнтр сельсавета

173. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 90 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1963 г. пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. П[illegible]ачка, Савіцкі сельсавет

174. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 35 воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

171. *Праабражэнскі касцёл. Арган.*



171. *Праабражэнскі касцёл. План.*

171. *Праабражэнскі касцёл.*

171. *Праабражэнскі касцёл. Фрагмент амбона.*

175. ВАДЗЯНЫ МЛЫН (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі, на р. Змейка. Пабудаваны ў 1810 г. з цэглы (рэканструяваны ў 1895 г.). Прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак сціпла дэкарыраваны на галоўным (усходнім) фасадзе разетка [illegible] Млын [illegible] будаўніцтва.

176. ПАЛАЦ (архіт.). У цэнтры вескі, на левым беразе р. Змейка. Па[illegible] будаваны [illegible] 18 [illegible] 19 ст. з цэглы. Часткова рэканструяваны у пачатку 20 ст. Разбураны у 1943 г. Пасля вайны адноўлены. Цяпер у ім размяшчаецца школа-інтэрнат.

Уваходзіў у палацава-паркавы ан[illegible]

175. *Вадзяны млын.*



175. [illegible]

цала з планіровачнай восю ансамбля і завяршалася капліцай. Сістэма сажалак жывілася рачкай, якая абмяжоўвала тэрыторыю парку з паўднёвага захаду.

Палац сіметрычна-восевай трохчасткавай кампазіцыі. Яе цэнтр двухпавярховы, блізкі да квадрата аб'ём, да якога бакавыя крылы-галерэі далучаюць аднапавярховыя флігелі. Усе 3 корпусы цэнтрычнага характару, накрыты пакатымі вальмавымі дахамі. Дэкаратыўны акцэнт у цэнтральнай частцы галоўнага фасада, дзе пастаўлены тэрмы, якія нясуць магутны антаблемент. Вокны аканімоўваюць плоскія ліштвы з сандрыкамі, кранштэйнамі, разеткамі. Першапачатковая кампазіцыя памяшканняў інтэр'ераў значна зменена. Замест парадная лесвіца у цэнтральным корпусе зроблены бакавыя лесвічныя маршы. У 19 ст. у палацы была бібліятэка, архіў, нумізматычная калекцыя, збор твораў мастацтва. Палац прыклад характэрнай пабудовы буйнога сядзібна-паркавага ансамбля, у якім выявіліся рысы архітэктуры позняга класіцызму.

Літ.: Кулагин А. Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII — нач. XIX в. Мн., 198[illegible]. А. М. Ку[illegible]

177. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). [illegible] памяці 71 аднавяскоўца, якія загінулі ў баях за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну [illegible] 198[illegible] [illegible] лена стэла.

178. ПОМНІК ЧАПАЕВУ Васілю Іванавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя В. І. Чапаева. Бюст героя Грамадзянскай вайны В. І. Чапаева ўстаноўлены у 1968 г.

179. ЮРЭУСКІ КАСЦЁЛ [illegible] 18[illegible] [illegible]

Прамавугольны [illegible] ступаюць аднасхільныя дахі 2 нізкіх сакрысцій, якія прылягаюць да алтарнай апсіды. З захаду на галоўным фасадзе 2 вежы, завершаныя глухімі чацверыкамі з высокімі пірамідальнымі шатрамі. Паміж вежамі франтон з люнетам. Галоўны ўваход афармлены дэкаратыўным аркай з двухсхільным навесам на 2 калонках. Сцены тарыза-стальнае ашаляваныя. Франтон, чацверыкі вежы і вокны аздоблены накладнымі дэкаратыўнымі дэталямі геаметрычнай формы. Бакавыя сцены [illegible] ступеньчатымі контрфорсамі. Да галоўнага ўвахода вядзе лесвіца. Інтэр'ер залы перакрыта бэлечнай з плоскай падшыўной столлю. У заходняй частцы б ка

[illegible] падтрымліваюць хоры з арганам, зробленым віленскім майстрам Ф. Астрымескім (18[illegible]7 г.).

Аднаярусны алтар — узор народнага мастацтва разьбы па дрэву. На [illegible] пышным прафіляваным цокалі [illegible] ніш алтару, якія абрамлюць алтарныя карціны.

Касцёл — помнік архітэктуры неаготыкі, адметны цікавым дэкаратыўным афармленнем інтэр'ера.

Т. І. Чарнявская, М. М. Яніцкая.

в. Паланэчка, цэнтр сельсавета

180. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны [illegible]2 воіны і партызаны, якія [illegible] 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх [illegible]. У 19[illegible] [illegible] на магіле [illegible] [illegible]ены помнік — скульптура (ал[illegible]).

181. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 14 жыхароў вёскі, расстраляных у 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1[illegible]67 г. на магіле пастаўлены абеліск.

182. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва. Да квадратнага ў плане зруба прылягаюць: з усходу — пяцісценная апсіда з 2 ры́зніцамі, з захаду — бабінец і трох'ярусная званіца з шатровым пакрыццём. У цэнтры галоўнага зруба на васьмігранным светлавым барабане — невысокі шацёр з галоўкай. Такія ж галоўкі на 4 вуглах зруба.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

в. Пастарына, Павамышскі сельсавет

183. МАГІЛА ТУРКАТАВА Уладзіміра Ігнатавіча, **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. Маёр Чырвонай Арміі У. І. Туркатаў загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. На ўшанаванне яго памяці і 25 жыхароў в. Пастарына, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Пачапава, цэнтр сельсавета

184. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны партызаны атрада імя Р. І. Катоўскага А. Зубаваў і П. Зубчанка, якія загінулі ў 1943 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

185. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 84 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

176. *Палац. Фрагмент дэкора [illegible] нага фасада*



176. *Палац. План 1-га павер[illegible]*

176. *Палац. Агульны выгляд.*

179. *Юр'еўскі касцёл. Агульны выгляд.*



179. *Юр'еўскі ка[illegible] П[illegible]*

182. *Царква.*

в. Перхавічы, цэнтр сельсавета

186. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.) Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 69 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

в. Петкавічы, Савіцкі сельсавет

187. МАГІЛА ВАРАНКОВІЧА Івана Вікенцьевіча (гіст.). На могілках. Партызан І. В. Варанковіч загінуў 20.3.1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1950 г. на магіле пастаўлены абеліск.

188. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.) У цэнтры вёскі, каля будынка канторы саўгаса імя В. Я. Чарнышова. На ўшанаванне памяці 2[illegible] землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1973 г. пастаўлены абеліск.

в. Прыазёрная, Павамышскі сельсавет

189. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 19 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні раёна ў ліпені 1944 г. У 1959 г. на магіле пастаў[illegible] з аўтаматам у руках.

в. Цурпевічы, Пачапаўскі сельсавет

190. ГАРАДЗІШЧА, КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.)

190а. Гарадзішча. За 0,8 км [illegible] р. Сва[illegible] [illegible] краю ў 1969 г. В. Р. [illegible], абследавала ў 1980 г. Т. С. [illegible]. Пляцоўка авальнай формы, памерам 4[illegible] узвышаецца над поймай ракі на 1[illegible] 18 м, выцягнута з усходу на захад (у заходняй частцы [illegible] 15 м). Умацавана валам вышынёю 2 м у паўночнай частцы 1,4 м.)



182. *Ц[illegible] П[illegible]*

заўднаван і паўднёва-заходнім. Зарасла кустамі і рэдкім хвойнікам асвоены не праводзіліся.

190б. Курганны могільнік. За 1 км на поўдзень ад вескі, справа ад дарогі на в. Дубнякаўцы, на левым беразе р. Сваротва, на ўзлеску. Мясцовыя назвы Капцы, Бугры. 1 круглых у плане насыпаў вышынёю 1,3—3,5 м, дыяметрам 3—10 м на асобных асталіся сляды ям, на адным траншэя. Зарос кустамі і рэдкім хвойнікам. Выявіў у 1969 г. В. Р. Супрун, абследавала у 1980 г. Г. С. Бубенька. Раскопкі не праводзіліся. Т. С. Бу...

в. Родкавічы, Савіцкі сельсавет

191. **МАГІЛА СТАШЫНСКАГА** Івана Іванавіча (гіст.). На могілках. Старшыня бюлога Гальнякаўскага сельсавета І. І. Сташынскі забіты 17.9 1948 г. ворагамі Савецкай улады. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Русіно, Вялікалуцкі сельсавет

192. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.) Непадалёку ад школы. Пахаваны 41 воін, якія загінулі у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941 і 1944 гг. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Савічы, цэнтр сельсавета

193. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст., маст.). У скверы, насупраць адміністрацыйнага будынка саўгаса «Савіцкі». Пастаўлены ў 1973 г. на ўшанаванне памяці 85 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (скульпт. І. Хоміч, Г. Пясецкі, бетон; вышыня стэлы 2 м, барэльефа 1,5 м). На прамавугольнай гарызантальнай цэментнай стэле з фактурнай апрацоўкай паверхні асіметрычна прымацавана падобная формай па асноўную стэла з барэльефамі. Трапецыевыя над алюмініевай панеллю выявы партызана, салдата і жанчыны, сімвалізуючыя непераможнасць народа. Справа па помніку 2 гранітныя дошкі. На адной высечаны імёны загінуўшых, на другой — словы: «Вечная слава мужным патрыётам, якія аддалі жыццё за нашу Радзіму 1941—1945». В. Я. Л...

в. Свірана, Перхавіцкі сельсавет

194. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 63 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1972 г. пастаўлены абеліск.

г. Скробава, Карчоўскі сельсавет

195. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 32 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

193. *Помнік землякам*

в. Соргавічы, Моўчадскі сельсавет

196. **МАГІЛА ВІЛЬЧКОЎСКАГА** Багуслава Багданавіча (гіст.). На могілках.

Герой Сацыялістычнай Працы Б. Б. Вільчкоўскі нарадзіўся 17.3. 1928 г. ў в. Пагулянка Баранавіцкага р-на. Член КПСС з 1959 г. У Вялікую Айчынную вайну 14-гадовым падлеткам пайшоў у партызаны, змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1959—64 гг. старшыня калгаса «Іскра» Баранавіцкага р-на. Пад яго кіраўніцтвам адсталая гаспадарка стала адной з перадавых. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1963 г. Загінуў 27.11.1964 г. пры выкананні службовых абавязкаў. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена 22.3.1966 г. Яго імем названы калгас, які ён узначальваў, вуліца ў Баранавічах. На цэнтральнай сядзібе калгаса ў в. Малая Сваротва пастаўлены помнік. У 1966 г. на магіле пастаўлена стэла.

Літ.: Сцяганосцы новага, перадавога. Мн., 1967.



198. *Касцёл Іаана Хрысціцеля. План*

198. *Касцёл Іаана Хрысціцеля*

198. *Касцёл Іаана Хрысціцеля. Фрагмент [illegible]ер'ера*

в. Сталовічы, цэнтр сельсавета

197. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вескі. Пахаваны 8 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск. На 2 мемарыяльных плітах каля абеліска імёны 8 [illegible], якія ў Вялікую Айчынную вайну аддалі сваё жыццё за Радзіму.

198. КАСЦЁЛ ІААНА ХРЫСЦІЦЕЛЯ (архіт., маст.). [illegible]

[illegible] г. на [illegible] камандора мальтыйцаў [illegible] пабудавана мураваная [illegible] капліца [illegible] мураванага касцёла [illegible] 17[illegible] г. [illegible] будаўніцтва [illegible] 17[illegible] 18[illegible] перабудаваны [illegible] праваслаўную [illegible] царкву.

Трохнефавая [illegible] з [illegible] імі прэсбітэрыем і сакрысціямі. Галоўны фасад складаецца з [illegible] кампаніцы з [illegible] падзелены раскрапаванымі антаблементамі на 3 ярусы. Яго асноўны дэкаратыўны матыў [illegible] пілястры. Уваход падкрэслены [illegible] паўкалонамі. Бакавыя фасады расчлянёны пілястрамі. Высокія аконныя праёмы з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі аздоблены ліпнымі абрамленнямі. Двума радамі слупоў інтэр'ер падзелены на 3 нефы. Цэнтральны перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі на падпружных арках, завершаны трохярусным алтаром і злучаны з [illegible] капліцай. Бакавыя нефы перакрыты крыжовымі скляпеннямі і заканчваюцца двухяруснымі алтарамі. Пры ўваходзе ў касцёл [illegible] вялікі тамбур. Хоры падтрымліваюць 2 калоны.

Дэкаратыўнае аздабленне інтэр'ера (арх. І. К. Глаўбіц) выканана ў тэхніцы стука. Першы ярус галоўнага алтара аформлены спаранымі калонамі карынфскага ордэра і развітым антаблементам, у другім вертыкальны рытм калон паўтараюць [illegible] пілястры з раскрапаванымі карнізамі. Трэці ярус завяршае кампазіцыю алтара глорыяй. У цэнтры алтара над дзвярамі барочны картуш з рэльефнай выявай адсечанай галавы Іаана Хрысціцеля.

Касцёл — помнік архітэктуры «віленскага барока».

[illegible] Glaubitz [illegible] XVIII w. [illegible] 1977. *Г. І. Чарняўская, М. М. Ивікова*

199. *Рэшткі каралеўскага ўмацавання*

в. Старая Мыш.
Цешаўлянскі сельсавет

199. РЭШТКІ КАРАЛЕЎСКАГА ЎМАЦАВАННЯ (гіст.). На [illegible] вескі, на правым беразе р. Мышанкі. Дата пабудовы невядома. Ёсць звесткі, што кароль Польшчы і вялікі князь Літоўскі Жыгімонт II Аўгуст у 1568 г. перадаў навакольныя землі магнату Яну Хадкевічу, [illegible] пабудаваў тут замак. Каралеў[illegible]



199. *Рэшткі каралеўскага ўмацавання. План*

скае ўмацаванне каля Старой Мышы адзначана на карце Вялікага княства Літоўскага 16 ст. Разбурана ў 1654 г. у час руска-польскай вайны.

Амаль правільная чатырохвугольная пляцоўка (50×50 м) абкружана валам вышынёю 2 м і ровам шырынёю каля 20 м пры глыбіні 7—8 м. З боку поля пляцоўка мае паглыбленні, з паўднёвага захаду — невялікі пераколп вала, з поўдня — прыкметы засыпанага калодзежа.

Літ.: Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх земель Беларусі XIII—XVIII стст.— Мн., 1978; Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 6. Warszawa, 1885. М. М. Чарняўскі

в. Стралава, Мілавідскі сельсавет

200. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1 км на захад ад вёскі, на ўсходніх схілах мяжы каталіцкіх могілак. У вялікай курганнай групе каля 45 круглых у плане насыпаў вышынёй да 1,5 м, дыяметрам 6—10 м. Большасць курганоў добра захавалася. У заходняй частцы насыпы пашкоджаны больш познімі пахаваннямі. Курганы вядомы пад назвай Турэцкія могілкі. Выявіў у 1969 г. В. Р. Сухіна, абследавалі ў 1970 г. М. М. Чарняўскі, у 1980 г. Т. С. Бубенька. Раскопкі не праводзіліся.

в. Тартакі, Лясняцкі сельсавет

201. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 10 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

202. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ВАЕННАПАЛОННЫХ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 59 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у 1941 і 1944 гг., а таксама ваеннапалонныя, закатаваныя гітлераўцамі ў Лясняцкім лагеры смерці. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Уласы, Крошынскі сельсавет

203. ВЕТРАНЫ МЛЫН (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудаваны ў сярэдзіне 19 ст. з дрэва ў в. Ястрамбель. У 1935 г. перавезены ва Уласы.

Высокі, квадратны ў плане двух'ярусны каркасны аб'ём вертыкальна абшыты дошкамі і накрыты двухсхільным дахам. Мае 4 шырокія крылы. Корпус млына насаджаны на стрыжань, умацаваны на крыжавіне з адкосамі, і злучаецца з ім на 2 узроўнях. Гэта забяспечвае ўстойлівасць і неабходны паварот корпуса млына. На першы ярус вядзе лесвіца з пляцоўкай пры ўваходзе. На другім ярусе знаходзяцца жорны, зубчастая перадача да цэнтральнага камення, барабан для падняцця мяшкоў са збожжам. Мука ссыпаецца ў спецыяльны прыёмнік на першым ярусе, дзе ёсць адсекі для мяшкоў са збожжам і мукой.

Млын — [illegible] помнік народнай архітэктуры. *С. Г. Багласаў*

в. Уцёс, цэнтр сельсавета

204. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У скверы. Пахаваны 32 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата са сцягам.

205. КУРГАН СЛАВЫ (гіст.). У цэнтры вёскі. Курган насыпаны ў 1970 г. ва ўшанаванне памяці 112 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні Кургана — абеліск.

206. МАГІЛА КУЗЬМІНОЙ Лізаветы Сцяпанаўны (гіст.). На могілках. Л. С. Кузьміна нарадзілася ў 1907 г. ў в. Уцёс Баранавіцкага р-на. З сялян. Пасля Вялікай Айчыннай вайны актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці, арганізацыі мясцовага калгаса, у барацьбе з бандытызмам. Забіта ворагамі Савецкай улады ў снежні 1950 г. У 1979 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Цешаўля, цэнтр сельсавета

207. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля адміністрацыйнага будынка птушкафабрыкі «Першамайская». Пахаваны 27 воінаў і партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза Рыгор Анатолевіч Чакмянёў.

Р. А. Чакмянёў нарадзіўся ў 1916 г. ў с. Якуль Курсаўскага р-на Стаўрапольскага краю. Член КПСС з 1936 г. У Чырвонай Арміі з 1936 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 г. Удзельнік баёў за вызваленне Украіны і Беларусі, старшы лейтэнант, камандзір узвода. 6—8.7.1944 г. ўзвод на чале з Р. А. Чакмянёвым перарэзаў чыгунку Баранавічы — Вільнюс, фарсіраваў р. Мышанка, захапіў абарончы пункт праціўніка — в. Цешаўля, адбіў 2 контратакі, знішчыў шмат тэхнікі і жывой сілы ворага. Калі скончыліся снарады і патроны, 6 воінаў пад камандаваннем Р. А. Чакмянёва з гранатамі кінуліся на ворага. Загінуў у баі 8.7.1944 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 25.9.1944 г.

У 1963 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

208. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Ва ўшанаванне памяці [illegible] землякоў з саўгаса «Цешаўля», якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1972 г. пастаўлены абеліск.

200. *Курганны могільнік. План.*

в. Чэрніхава, Вольнаўскі сельсавет

209. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Яжона, Падгорнаўскі сельсавет

210. МАГІЛА ІЯСЯЛЕВІЧА Віктара Іванавіча (гіст.). У заходняй частцы вёскі. Савецкі лётчык В. І. Інсялевіч загінуў у чэрвені 1941 г. ў паветраным баі з нямецка-фашысцкімі за

203. *Ветраны млын*

213. *Сядзібны дом. Бакавы фасад.*



213. *Сядзібны дом. План 1 га паверха*

[illegible] У 1980 г. на магіле пастаўлены абеліск.

211. ЦЭНТР РАМЯСТВА (гіст.). Ся[illegible] пашырана ручное пляценне вырабаў з лазы і каранёў дрэў. [illegible] умельцы [illegible] вырабаў. Кошыкі, кашпо, жаночыя сумкі, сухарніцы, цукерніцы, [illegible]цы, падносы, латочкі для садавіны і агародніны і інш. вырабы адметныя багаццем фантазіі, лёгкасцю ажурных малюнкаў.

в. Ямічна, Мілавідскі сельсавет

212. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі Пахаваны 58 савецкіх грамадзян, закатаваных у 1941 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Ястрамбель, Малахоўскі сельсавет

213. **СЯДЗІБА** (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудавана на мяжы 19–20 стагоддзяў. Цяпер тут размяшчаецца школа-інтэрнат. Комплекс уключае мураваны дом, стайню і іншыя гаспадарчыя будынкі. Вакол іх пейзажны парк з сажалкай.

Дом асіметрычнай ступеньчатай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі з вертыкальнай дамінантай у выглядзе чатырох'яруснай шатровай вежы. Цэнтр кампазіцыі — двухпавярховы корпус, да якога прымыкаюць рознапавярховыя аб'ёмы з самастойнымі дахамі. Галоўны фасад вылучаны неглыбокім рызалітам з балконам на 2 масіўных слупах. Да параднага ўвахода вядзе двухбаковы пандус з балюстрадай. З дваровага фасада будынак агінае тэраса. Фасады аздоблены рустам, карнізамі з сухарыкамі; прамавугольныя і паўцыркульныя аконныя праёмы дэкарыраваны пілястрамі, [illegible] каменнем, ракеткамі. [illegible] дома



213. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — сядзібны дом; 2 — свіран; 3 — стайня*

заснавана на кампаноўцы розпавялікіх памяшканняў вакол вестыбюля і калідора з тарцовай лесвіцай. У некаторых памяшканнях захавалася керамічная і паркетная падлога. Будынак мае скляпеністы падвал.

Сядзіба — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры, у якім яскрава выявіўся эклектычны кірунак, характэрны для архітэктуры таго часу.

А. М. Кулагін

в. Ятвезь, Падлясейскі сельсавет

214. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). На могілках. Пахаваны 45 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

БРЭСЦКІ
РАЁН
Астрамечава
Лышчыцы
Покры
Чарнаўчыцы
Каплевічы
Вялікія Матыкалы
Клейнікі
Чэрнi
Брэст
Мухавец
Вялікія Радванічы
Страдзеч
Знаменка
Медна
Дубіца
Лялеўка
Дамачава
Прыбарава
Камароўка
Стаяннi, паселiшчы, гарадзiшчы
(грунтавыя, курганныя), курганы
Помнікі гаспадарчай дзейнасці, прамысловая архітэктура, гідратэхнічныя збудаванні
дасавецкага перыяду
савецкага перыяду
(Рэвалюцыя 1905–07 гг. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя Грамадзянская вайна, барацьба працоўных Заходняй Беларусі)
воінскай славы
Помнікі сацыялістычнага будаўніцтва
Ваенна-абарончыя збудаванні
Палацы, сядзібы, асабнякі
Жылыя дамы, забудова вуліц
дасавецкага перыяду
Адміністрацыйныя грамадскія збудаванні
дасавецкага перыяду
БРЭСЦКАЯ
ВОБЛ
БРЭСТ

215. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*

в. Астрамечава, Лышчыцкі сельсавет

215. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 119 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вёсак Астрамечава, Кашылава, Малыя Сухарэвічы, Рудавец. У 1947 г. на магіле пастаўлены абеліск.

216. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На вул. Брэсцкай, каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 61 земляка (вёскі Астрамечава, Кашылава, Рудавец, Уладычыцы, Цюпрыкі), якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Буякі, Тэльмінскі сельсавет

217. РАДЗІМА ПАПЛАЎСКАГА Захара Філімонавіча, дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі (гіст.). Гл. артыкул № 21 «Гарнізонныя могілкі».

в. Ваўкі, Мухавецкі сельсавет

218. МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА (гіст.). За 300 м на ўсход ад вёскі. У лесе пахаваны воін, які загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 г.

220. *Царква Ушэсця. Фрагмент бакавога фасада.*

в. Вельямовічы, Лышчыцкі сельсавет

219. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На ўсходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 146 землякоў (1 жанчына ... лавек), якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

220. ЦАРКВА УШЭСЦЯ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1899 г. з цэглы. Асноўны прамавугольны аб'ём завершаны чатырохсхільным дахам з 5 галоўкамі, да яго далучаюцца паўцыліндрычная апсіда, бабінец і трох'ярусная шатровая званіца. Фасады царквы багата дэкарыраваны. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. *Т. І. Чарнядская*

в. Вістычы, Чарнаўчыцкі сельсавет

221. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На невялікім узгорку ў цэнтры вёскі, каля дарогі Чарнаўчыцы — Матыкалы. Пабудавана ў 1678 г. з цэглы як касцёл дзісэрцыянцаў. З 19 ст. вядома як Крыжаўзвіжанская царква.

Будынак трохнефавая базіліка з паўцыркульнай апсідай у завяршэнні цэнтральнага нефа. Сцены бакавых нефаў падоўжаны сакрысціямі, каля ўваходу — 2 бакоўкі, што выступаюць за сцены бакавых нефаў. Галоўны ўсходні фасад мае сіметрычную кампазіцыю. Вось сіметрыі падкрэсліваецца арачным парталам уваход, аконным праёмам над ім, вышэй з лучковым завяршэннем і люкарнай у тымпане франтона. Магутныя парныя паўкалоны тасканскага ордэра абапал партала прадаўжаюцца паўкалонамі верхняга яруса, завершанага атыкавым франтонам. Бакавыя фасады раскрапаваны спаранымі пілястрамі. Сцены цэнтральнага нефа прарэзаны лучковымі аконнымі праёмамі, бакавых — паўцыркульнымі са спаранымі лапаткамі у прасценках.

Інтэр'ер падзелены 2 радамі слупоў складанага сячэння, якія ўтвараюць манументальную аркаду, за вяршаную антаблементам. Галоўны і бакавыя нефы перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. Сцены расчлянёны спаранымі пілястрамі. Над галоўным уваходам размешчаны хоры, якія падтрымлівае лучковая арка. На хоры вядзе вітавая лесвіца ў тоўшчы сцяны.

Царква - помнік архітэктуры барока. *Ю. Ф. Вердніхай*



220. *Царква Ушэсця. План*

в. Вычулкі, Тэльмінскі сельсавет

222. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля школы. Пахаваны 45 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск з надпісам, які ўшаноўвае таксама памяць землякоў, загінуўшых у вайну.

в. Вялікія Матыкалы, цэнтр Матыкальскага сельсавета

223. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1977 г.

в. Вялікія Радванічы, цэнтр Радваніцкага сельсавета

224. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 16 воінаў і 5 партызан разведчыкаў атрада імя М. М. Чарнака партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

225. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 35 савецкіх грамадзян, загубленых нямецка-фашысцкімі акупантамі ў кастрычніку 1943 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Вялонь, Чэрнінскі сельсавет

226. РАДЗІМА МАЙСЕЕВА Івана Цімафеевіча (гіст.).

Герой Савецкага Саюза І. Ц. Майсееў нарадзіўся 16.8.1910 г. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1939 г. З 1932 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у вызваленні Украіны, Румыніі, Чэхаславакіі. 6.11.1944 г. батальён капітана І. Ц. Майсеева ў час баёў за вызваленне Венгрыі фарсіраваў р. Цыса, выбіў ворага з траншэй і прасунуўся ўперад на 18 км, захапіў у палон 180 нямецкіх салдат і афіцэраў. 24.3.1945 г. за геразім і мужнасць І. Ц. Майсееву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Памёр 12.2.1976 г. Пахаваны ў г. Марыінск Кемераўскай вобл.

Літ.: Навечно в сердце народном. 3 изд.— Мн., 1984. *В. В. Семанюк*

в. Гершоны, цэнтр сельсавета

227. КРАПАСНЫ ФОРТ № 5 (гіст., архіт.). За 2 км на поўдзень ад вёскі. Пабудаваны ў 1878—88 гг. на поўдзень ад Брэсцкай крэпасці.

Будаўніцтва форта было выклікана неабходнасцю ўдасканаліць умацаванні Брэсцкай крэпасці адпаведна зменам, якія адбыліся ў ваеннай тэхніцы. У 1862 г. рускі фартыфікатар генерал-ад'ютант Э. І. Татлебен распрацаваў агульны план паляпшэння ўмацаванняў крэпасці, які прадугледжваў стварэнне асобных

221. *Крыжаўзвіжанская царква. Выгляд з боку апсіды*

221. *Крыжаўзвіжанская царква. Скляпенні цэнтральнага нефа*



221. *Крыжаўзвіжанская царква. План*

[illegible]рапасных фортаў. У 1876 г. камісія пад старшынствам генерал-лейтэнанта інжынерных войск М. М. Абручова вызначыла пункты іх узвядзення. З 1878 г. на адлегласці 3,5—4 км ад галоўных умацаванняў крэпасці і з такімі ж інтэрваламі пачалося будаўніцтва 9 фортаў. Найбольш захаваўся форт № 5. Пяцівугольны ў плане, аднавалавы, цагляны. Над валам з цэнтральным траверсам размешчаны казармы з анфіладнай сістэмай памяшканняў і скляпеністым перакрыццем. Роў з эскарпамі (2 двайныя і 2 адзінарныя) запаўняўся вадой. У 1903 г. пачаліся работы па ўдасканаленню фортаў. Цагляныя скляпенні казематаў былі ўмацаваны бетонным [illegible] таўшчынёю [illegible] 8 2 м. На [illegible] адхону зроблены спецыяльныя ніпы для 2 3 стралкоў [illegible] адхону [illegible] ніпамі [illegible] траверсам [illegible] ад флангавага агню. У 1913—14 гг. форт [illegible] перабудаваны. Пад [illegible] і сховішчамі для пяхоты [illegible] склады [illegible] амуніцыі. Таўшчыня сцен сховішчаў 5—6 м. Памяшканні над [illegible], валам [illegible] выхад у двор форта.

Форт № 5 прыклад буйнога фартыфікацыйнага збудавання, дае ўяўленне аб характары і маштабах крапасного будаўніцтва 19 ст.

А. С. Барысавец

228. МАГІЛА САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ (гіст.). За 0,5 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны экіпаж савецкага самалёта (3 чалавекі), які загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у маі 1944 г. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

229. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АДАМЧУКУ Аляксею Данілавічу (гіст.). Вул. Цэнтральная, 82. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, у якім жыў савецкі патрыёт А. Д. Адамчук, закатаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў лютым 1943 г.

230. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АНДРАЮКУ Івану Мікітавічу (гіст.). Вул. Цэнтральная, 91. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, у якім жыў савецкі патрыёт І. М. Андраюк, закатаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1943 г.

231. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КЛАЧКО Кірылу Харытонавічу (гіст.). Вул. Цэнтральная, [illegible]. Устаноўлена ў 1976 г. на доме, дзе жыў савецкі патрыёт [illegible] антыфашысцкай барацьбы К. Х. Клачко, які працаваў у той час на лесапільні ў Брэсце. У сакавіку 1944 г. арыштаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі і закатаваны.

232. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). На будынку [illegible]. Тут да Вялікай Айчыннай вайны размяшчалася 11-я пагранічная застава. 22.6.1941 г. воіны-пагранічнікі праявілі мужнасць і гераізм у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. [illegible] 8 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

233. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СТРАЧУКАМ (гіст.). [illegible] 8. Устаноўлена ў 196[illegible] г. на доме, у якім жылі савецкія патрыёты [illegible] Васілевіч [illegible], яго жонка Хрысціна [illegible] Уладзімір. Загінулі ў 194[illegible] г. [illegible] засценках.

234. *Царква*



234. *Царква. План*

234. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Асноўны квадратны ў плане аб'ём пакрыты чатырохсхільным дахам з галоўкай. Да яго далучаны пяцісценная апсіда і праз вузкі пераход — двух'ярусная шатровая званіца.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

г. п. Дамачава,
цэнтр пасялковага Савета

235. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Вул. Камуністычная. Пахаваны 77 воінаў і партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баях за выхад да Заходняга Буга.

У ходзе Люблінска-Брэсцкай аперацыі войскі левага крыла 1-га Беларускага фронту нанеслі ўдар па ворагу з раёна г. Ковеля, 18.7.1944 г. прарвалі абарону праціўніка. 20 ліпеня вызвалілі г. п. Дамачава і на ўчастку Дамачава — чыгуначная станцыя Уладава выйшлі да Заходняга Буга і фарсіравалі яго.

У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск і скульптура воіна з аўтаматам у руках.

236. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўднёвай ускраіне гарадскога пасёлка. Пахаваны 3800 жыхароў г. п. Дамачава і былога Дамачаўскага р-на, загубленых нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну.

У канцы 1941 г. акупанты стварылі ў гарадскім пасёлку гета для яўрэйскіх грамадзян. Тэрыторыя лагера была абнесена калючым дротам, ахоўвалася. 18.9.1942 г. акупанты за 0,5 км на поўдзень ад гарадскога пасёлка расстралялі групамі па 45—50 чалавек больш за 2700 вязняў гета. Маленькіх дзяцей кідалі ў ямы жывымі. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.



240. *Помнік А. А. Новікаву*

237. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У скверы. Скульптура У. І. Леніна пастаўлена ў 1953 г.

238. СВЯТАЛУЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры пасёлка. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва. Трохзрубны храм, у ім дамінуе высокая шатровая званіца. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

в. Дружба, Чарнаўчыцкі сельсавет

239. СЕЛІШЧЫ (археал.)

239а. С е л і ш ч а - 1. Размешчана за 0,2 км на поўнач ад вёскі, справа ад дарогі Дружба — Нясвіла, над ручаём. Памеры 150×80 м. Выявіла ў 1966 г. І. П. Русанава, абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся.

239б. С е л і ш ч а - 2. На поўнач ад Селішча-1, за ручаём. Памеры 140×35—40 м. Адкрыла і даследавала І. П. Русанава ў 1966 г. У раскопе плошчай 360 м² выяўлены культурны пласт магутнасцю 0,3—0,5 м. Выяўлены драўляныя, наземныя злёгку паглыбленыя ў зямлю жылыя дамы, якія былі размешчаны групамі на адлегласці 5—10 м адзін ад аднаго. Знойдзены рэшткі ганчарных гаршкоў з моцна адагнутым венчыкам упрыгожаных лінейным і хвалістым арнаментам, жалезныя нажы і цвікі крэсіва, шкляныя пацеркі. У 1980 г. селішча абследавала Т. М. Каробушкіна. Культурны пласт захаваўся толькі ў паўднёвай частцы. Сабрана ганчарная кераміка, рэшткі ляпных сасудаў паморскай культуры, гладкаваная кераміка добрага абпалу. Помнік 9—10 ст. У ніжніх пластах трапляюцца рэшткі керамікі паморскай культуры 4—2 ст. да н. э.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Р у с а н о в а И. П. Славянские древности VI—IX вв. между Днепром и Западным Бугом. М., 1973.

Т. М. Каробушкіна

чыг. ст. Дубіца,
Дамачаўскі пасялковы Савет

240. ПОМНІК НОВІКАВУ Аляксею Аляксандравічу (гіст.). Непадалёку ад чыгуначнай станцыі.

А. А. Новікаў нарадзіўся 2.2.1920 г. ў в. Грязнуха Алапаеўскага р-на Свярдлоўскай вобл. У 1938 г. скончыў Пермскі педагагічны тэхнікум, працаваў настаўнікам. З 1940 г. ў пагранвойсках. 22.6.1941 г., калі нямецка-фашысцкія захопнікі пад прыкрыццём артылерыйскага і мінаметнага агню пачалі фарсіраваць Заходні Буг, малодшы сяржант А. А. Новікаў знаходзіўся ў нарадзе. Пачуўшы страляніну, ён са сваім напарнікам устанавіў кулямёт каля дуба і пад агнём праціўніка ўтрымліваў пераправу на працягу ўсяго дня і ночы. Пагранічнік патапіў 3 варожыя лодкі. Толькі раніцай наступнага дня гітлераўцы пераправіліся цераз раку. Цяжка паранены і непрытомны воін быў захоплены ў палон і памёр ад страты крыві. Сяляне в. Яблечна (ПНР) пахавалі героя. Пасля вайны астанкі адважнага пагранічніка перанесены ў брацкую магілу каля г. Бяла-Падляска. У 1965 г. малодшы сяржант А. А. Новікаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

У 1968 г. яго імем названа адна з застаў Заходняй пагранічнай акругі. У 1969 г. на месцы бою ўстаноўлена стэла.

Літ.: Буг в огне. [Зб. успамінаў]. - 3 изд. Мн., 1977. *Т. М. Ходцава*

241. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). За 800 м на захад ад станцыі, на беразе Заходняга Буга, ва ўрочышчы Дубовы Гай. На ўшанаванне памяці савецкіх пагранічнікаў, якія загінулі ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 22.6.1941 г., у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Дубок, Дамачаўскі пасялковы Савет

242. ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў канцы 18 — пачатку 19 ст. з дрэва.

Будынак складаецца з асноўнага прамавугольнага аб'ёму з трохграннай алтарнай часткай і двух'яруснага бабінца, накрытых агульным двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і галоўкай. З заходняга боку да бабінца праз невялікі тамбур далучана квадратная ў плане трох'ярусная званіца, накрытая шатровым дахам. Сцены гарызантальна ашаляваны і прарэзаны невялікімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Апсіда асветлена цэнтральным паўцыркульным акном.

Царква — помнік народнага дойлідства Беларускага Палесся.

С. Ф. Самбук

в. Жыравецкая Камяніца, Мухавецкі сельсавет

243. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны партызаны атрада імя М. М. Чарнака



242. *Ільінская царква. План*

партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна — У. М. Шабуня і Т. Я. Чарбакова, якіх у сакавіку 1944 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

244. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 74 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных воіны 415-й стралковай дывізіі. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

245. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 49 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск.

246. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На галоўнай вуліцы. Пабудавана ў 19 ст. з дрэва. Яе аб'ёмная кампазіцыя складаецца з цэнтральнага прамавугольнага зруба пад двухсхільным дахам, да якога прылягаюць прытвор і апсіда. Помнік народнага дойлідства.

в. Заказанка, Гершонскі сельсавет

247. СТАЯНКА (археал.). За 2 км на поўнач ад вёскі, у даліне р. Заходні Буг. На пясчаных узгорках, ва ўрочышчах Гарадзішча і Міжазер'е. Выявіў у 1898 г. і даследаваў М. Ф. Бяляшэўскі. Сярод знаходак каля 200 крамянёвых прылад працы: разнастайныя наканечнікі стрэл, скрабкі розных тыпаў, вастрыі, нажы, пілкі, шліфаваныя свідраваныя сякеры і сякеры-клінны з розных парод каменю, абломкі гліняннага ляпнога посуду. Стаянка адносіцца да мезаліту (8—5-е тысячагоддзі да н. э.), перыядаў ранняга і позняга неаліту (5—3-е тысячагоддзі да н. э.), ранняй і сярэдняй бронзы (2—1-е тысячагоддзі да н. э.).

Літ.: Беляшевский Н. Ф. Древние стоянки неолитической эпохи на берегах р. Западного Буга в среднем его течении // Труды одиннадцатого Археологического съезда в Киеве 1899. М., 1901. Т. 1. *Л. Д. Поболь*

в. Збірагі, Чэрнінскі сельсавет

248. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля школы. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

249. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабу-



242. *Ільінская царква*

давана ў 1610 г. з дрэва. Неаднаразова абнаўлялася.

Прамавугольны ў плане асноўны зруб мае трохсхільны дах з вальмай над галоўным заходнім фасадам. З усходу да асноўнага зруба прылягае алтарны з бакавымі прыбудовамі, накрыты таксама трохсхільным дахам з вальмай з усходняга боку. Над асноўным аб'ёмам, на месцы злучэння зрубаў, гранёная галоўка. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі і прарэзаны высока размешчанымі прамавугольнымі вокнамі. Унутры асноўнае памяшканне зальнае, перакрыта бэлечнае з плоскай падшыўной столлю. У заходняй частцы на 2 драўляных калонках узвышаюцца хоры. Каля ўвахода ў царкву стаіць каркасная квадратная ў плане званіца, накрытая шатровым гонтавым дахам. Званіца вертыкальна ашалявана, у верхняй частцы — скразныя арачныя праёмы.

Ансамбль вызначаецца цэласнасцю кампазіцыі, суразмерным маштабам і мастацкай выразнасцю архітэктурнага вырашэння. *С. Ф. Самбук*

в. Збунін, Знаменскі сельсавет

250. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля павароту дарогі на воз. Белае. Пахаваны 15 савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1970 г. на магіле ўстаноўлена стэла.

251. СТАЯНКА (археал.). За 2 км на поўнач ад вёскі, на пясчаным узгорку, каля р. Заходні Буг. Выявіў і даследаваў у 1898 г. М. Ф. Бяляшэўскі. Даўжыня стаянкі ўздоўж берага ракі каля 300 м. Культурны пласт часткова выходзіць на паверхню. Знойдзены рэшткі вогнішчаў, абкладзеных камянямі, ракавіны, вуголле, шмат апрацаваных крэмнеў, аблом

249. *Царква Параскевы Пятніцы і званіца.*

249. *Царква Параскевы Пятніцы і званіца. План.*

кі гліпянага ляпнога посуду, крамянёвыя наканечнікі стрэл, нажы, вастрыі, скрабкі, скоблі, адбойнікі з пясчаніку і кварцыту, гліняныя праслíцы, рэчы з бронзы. Адносіцца да позняга неаліту і бронзавага веку (3—2-е тысячагоддзі да н. э.)

Літ.: Беляшевский Н. Ф. Древние стоянки неолитической эпохи на берегах р. Западного Буга в среднем его течении.— У кн.: Труды одиннадцатого Археологического съезда в Киеве, 1899. М., 1901, т. 1; Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. В. 1.— Мн. 1968. *У. Ф. Ісаенка*

в. Знаменка, цэнтр сельсавета

252. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У паўночнай частцы вёскі. Пахаваны 35 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

253. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). За 3 км на захад ад вёскі. Пры ахове дзяржаўнай граніцы 22.6.1941 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў геройчна змагаліся і загінулі 16 пагранічнікаў. На ўшанаванне іх памяці ў 1968 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

254. МЕСЦА БОЮ ПАГРАНІЧНІКАЎ (гіст.). За 3,5 км на паўднёвы захад ад вёскі. Тут знаходзілася пагранічная застава. 22.6.1941 г. з 3 гадзін 30 мін да 22 гадзін байцы заставы вялі няроўны бой супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. астанкі 14 пагранічнікаў, якія загінулі ў гэтым баі, былі перанесены ў брацкую магілу ў в. Знаменка. У 1968 г. на месцы бою пастаўлены абеліск.

в. Казловічы, Клейнікаўскі сельсавет

255. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 13 пагранічнікаў і начальніка заставы лейтэнанта М. І. Аўлава, якія загінулі ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 22.6.1941 г., у 1965 г. устаноўлена стэла.

в. Казловічы, Чарнаўчыцкі сельсавет

256. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 93 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены помнік. Абапал скульптуры воіна на чатырохгранным пастаменце знаходзяцца 2 пліты з мармуровымі дошкамі і надпісамі «Людзі! Памятайце, якой цаной заваявана шчасце!» і «Аднавяскоўцам, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ад жыхароў вёсак Вялікая Сухарэвічы, Смуга, Вулька, Малая Курніца, Нясвела, Чарнакі, Дружба, Казловічы». *А. С. Барысавец*

в. Камароўка, Тамашоўскі сельсавет

257. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля дарогі на Брэст. Пахаваны жыхары вёскі, якіх у 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія акупанты. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

258. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). Каля клуба. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

259. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 40 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлена стэла.

260. РАДЗІМА КЛІМУКА Пятра Ільіча, лётчыка-касманаўта СССР, двойчы Героя Савецкага Саюза (гіст.). Гл. артыкул № 19 «Бюст Клімука Пятра Ільіча».

в. Каменка, Лышчыцкі сельсавет

261. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Мясцовая назва Шведскія магілы. За 1,5 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Задняя Рыска. Сярод разаранага поля — 7 абкладзеных камянямі насыпаў. Вышыня 0,2—0,5 м, дыяметр 4—5 м. Частка насыпаў выдавочна, знішчана. Адкрыла і абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся.

в. Клейнікі, цэнтр сельсавета

262. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 77 землякоў — жыхароў вёсак Казловічы, Клейнікі, Костычы, Некрашы, Пескі, Рэчыца, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлена стэла.

в. Лішнікі,
Дамачаўскі пасялковы Савет

263. МАГІЛА ЗАВІДАВА Аляксандра Абрамавіча (гіст.). Непадалёку ад вёскі, на месцы былой пагранзаставы.

А. А. Завідаў нарадзіўся ў 1924 г. у в. Заболоты Таржокскага р-на Калінінскай вобл. Пасля сканчэння сярэдняй школы працаваў муляром у Петразаводску. З 1942 г. служыў у пагранвойсках. 23.1.1945 г., калі ўзброеная банда з 15 чалавек перасекла граніцу і імкліва прасоўвалася па савецкай тэрыторыі, яфрэйтар А. А. Завідаў першы дагнаў ворага і, уступіўшы ў адзінаборства, затрымаў іх да падыходу асноўнай групы праследавання. У 2 няроўных сутычках пагранічнік знішчыў некалькі бандытаў, але сам быў смяротна паранены. Яфрэйтар А. А. Завідаў у 1968 г. пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны 1-й ступені.

На магіле ў 1951 г. пастаўлены абеліск, на месцы гібелі мемарыяльная дошка. Яго імем названы адна з застаў на заходняй граніцы, вуліцы ў г. Высокае, г. п. Дамачава Брэсцкай вобл. *Т. М. Ходзьцава*

256. *Помнік землякам*

в. Лышчыцы, цэнтр сельсавета

264. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км ад вёскі, каля лесу. У 1942 [illegible] нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 758 мірных жыхароў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

265. РАДЗІМА ЛЫШЧЫНСКАГА Казіміра (гіст.).

Беларускі мысліцель, атэіст і матэрыяліст К. Лышчынскі нарадзіўся 4.3.1634 г. ў сям'і службовага шляхціца. Вучыўся ў езуіцкім калегіўме у Брэсце, Кракаўскім ун-це, працаваў выкладчыкам. Сумненні ў існаванні бога ў юнака ўзніклі яшча ў час вучобы. Атэістычныя погляды з цягам часу сталі больш глыбокімі і ён парваў з езуітамі. Лышчынскі вярнуўся у родныя мясціны [illegible] даў філасофію ў Брэсцкім ка[illegible]уме. У сакавіку 1682 г. на брэсцкім сеймiку выбраны падсудкам земскага суда. Свае погляды на рэлігію, навакольны свет і тагачасныя парадкі выклаў у трактаце «Аб неіснаванні бога» (захаваліся фрагменты). Лышчынскі адзначаў сапраўдную рэальнасць матэрыяльную прыроду, а бога — фантастычным стварэннем чалавечага розуму, адмаўляў бессмяротнасць душы, сцвярджаў, што ў прыродзе ўсе змены адбываюцца не з боскай ласкі, а па законах развіцця матэрыі. К. Лышчынскі падышоў да патрабавання знішчэння прыгонніцтва і ўсталявання грамадства, заснаванага на грамадзянскіх свабодах. У 1687 г. па даносу браслаўскага стольніка, які выкраў частку трактата (15 сшыткаў), [illegible] Лышчынскі быў зняволены [illegible] 28.2.1689 г. сеймавы суд прыгаварыў абезгаловіць і спаліць атэіста на кастры. 30.3.1689 г. на плошчы Старога Места ў Варшаве адбылося пакаранне.

Літ.: Из истории философской и общественно-[illegible] мысли Белоруссии. Избранные произведения XVI — начала XIX [illegible] Мн., 1962; История философии в СССР. Т. 1. М., 1968; Идеи материализма и [illegible] в Белоруссии: (дооктябрьский период).— Мн. [illegible]

С. Ф. Цярохін

в. Ляплёўка,
Дамачаўскі пасялковы Савет

266. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 400 м на захад ад вёскі, каля дарогі Брэст — Тамашоўка.

23.9.1942 г. гітлераўцы вывезлі з Дамачаўскага дзіцячага дома за межы пасёлка 55 дзяцей, выхавальніцу П. Грахольскую і расстралялі іх. Удалося выратавацца толькі дзевяцігадовай Тасі Шахметавай. У 1952 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Малыя Зводы, цэнтр сельсавета

267. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у грабовым лесе.

19 насыпаў сферычнай формы вышынёй 0,25—0,5 м, дыяметрам 3—5,5 м. Большасць курганоў абкладзена валунамі. Абследавалі ў 1978 г. Ю. М. Кухарэнка, у 1980 г. Т. М. Каробушкіна. У 1981 г. Каробушкіна даследавала [illegible] 4 з іх былі выкладзены пад дзернам невялікімі камянямі і звонку абкладзены валунамі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. У 2 курганах двайныя пахаванні. Нябожчыкі ляжалі галавой на захад. У 2 курганах каля ног знойдзены пабітыя гаршкі з рыфленнем, зробленыя на ручным ганчарным крузе. Выяўлены свінцовыя паўтараабаротныя скроневыя кольцы (па 4 у пахаванні), бронзавае плоскае скроневае кольца дыяметрам 1 см (у дзіцячым пахаванні). Могільнік датуецца 11 ст. Верагодна, належаў дрыгавічам.



267. *Курганны могільнік. Схема плана*

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Т. М. Каробушкіна

268. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 43 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

269. СЯДЗІБА (архіт.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Сядзібны дом пабудаваны ў 1875 г. з цэглы (рэканструяваны ў 1971 г.). У 1890 г. паводле праекта В. Кроненберга дом акружаны пейзажным паркам плошчай каля 7 га. Цяпер у былой сядзібе размешчана школа-інтэрнат.

Пабудовы сядзібнага ансамбля — дом, карэтная, свіран — размешчаны па баках цэнтральнай алеі. Галоўны фасад дома адкрываецца ў бок усадзі. Перад ім — газон. Г-падобны ў плане двухпавярховы дом фланкіраваны розвінутымі рызалітамі, завершанымі дахам з выступам-скатам на фігурных кранштэйнах, і вылучаны у цэнтры балконам. Разнастайныя акон-



269. *Сядзібны дом. План 1-га паверха*

269. *Сядзіба*

269. *Сядзіба. Гаспадарчая пабудова*

ныя праёмы дэкарыраваны сандрыкамі. Цэнтральны ўваход вылучаны балконам на 4 капеліраваных пілонах. Дадатковыя ўваходы зроблены ў паўднёва-ўсходнім рызаліце і дваровым лицгранным эркеры з вінтавой лесвіцай.

У аснову планіроўкі дома накладзены анфіладны прынцып узаемасувязі памяшканняў. Цэнтральнае месца належыць вестыбюлю з трохмаршавай лесвіцай, зале, гасцінай. У бакавым крыле знаходзілася кухня і сталовая. Другі паверх меў калідорную планіроўку, тут размяшчаліся жылыя пакоі. Аздоба інтэр'ера не захавалася.

Службовыя цагляныя пабудовы вырашаны ў простых формах. Аднапавярховая карэтная — прамавугольны ў [illegible] абʼём пад двухсхільным дахам з рытмічным чаргаваннем аконных праёмаў. Двухпавярховы свіран мае галерэю па фронту галоўнага фасада і рытм праёмаў з лапаткамі ў прасценках.

У архітэктуры сядзібы адчуваецца пошук будаўнікамі 19 ст. новых выразных сродкаў праз асваенне стыляў мінулага.

Літ.: Loza S. Architekci i budowniczowie w Polsce. Warszawa, [illegible]
[illegible]

в. Малыя Радванічы, Радваніцкі сельсавет

270. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

271. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Тут 27.10.1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 35 членаў сем'яў ваеннаслужачых Чырвонай Арміі. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

272. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). За 3 км на паўночны захад ад вёскі. Тут [illegible] 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі партызанскага разведчыка І. А. Гаўрылюка і членаў яго сям'і, а таксама сям'ю савецкага патрыёта П. Белавежа (усяго 7 чалавек). У 1965 г. на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

в. Малыя Сухарэвічы, Лышчыцкі сельсавет

273. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1955 г. пастаўлены абеліск.

в. Малыя Шчыткікі, Лышчыцкі сельсавет

274. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Мясцовая назва Шведскія магілы. За 1 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе, на урочышчы Курганы. Да 1970 г. тут налічвалася больш за 10 курганоў, абкладзеных буйным каменнем. У 1970 г. камяні

271. *Помнік на магіле ахвяр фашызму*

выкарысталі як будаўнічы матэрыял, курганы часткова зраўнялі. Захаваліся 4 курганы. Вышыня 0,[illegible] 6 м, дыяметр 6—7 м. Абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся. *Т. М. Каробушкіна*

275. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У парку, на тэрыторыі колішняй сядзібы. Пабудавана ў 1742 г. з цэглы.

Прамавугольны выцягнуты па падоўжнай восі храм накрыты вальмавым дахам. Галоўны (усходні) фасад мае двух'ярусную кампазіцыю з гарызантальнымі і вертыкальнымі чляненнямі і ўвенчваецца франтонам з шпаклямі па баках. Галоўны ўваход вырашаны ў выглядзе прамавугольнага ў плане тамбура з лучковым праёмам. Яго кампазіцыя паўтарае вырашэнне галоўнага фасада — франтон з фланкіруючымі слупамі. Сцены бакавых фасадаў расчлянёны пілястрамі і прарэзаны высокімі лучковымі вокнамі. Інтэр'ер пазбаўлены пластычнага дэкору, за выключэннем 2 пілястраў абапал увахода і 2 лучковых ніш на алтарнай сцяне.

Архітэктура будынка мае рысы стылю барока. *С. Ф. Самбук*

в. Медна, Знаменскі сельсавет

276. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 36 воінаў і партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 г.

На подступах да Заходняга Буга вораг аказаў моцнае супраціўленне. Вёску Медна гітлераўцы ператварылі ў апорны пункт, які прыкрываў Брэст з поўдня. Авалодаць вузлом абароны фашыстаў было даручана стралковаму палку 1-га Беларускага фронту. У полк прыбыў конны раз'езд партызан Брэсцкага злучэння, які даставіў звесткі пра абарону ворага і прапанаваў правесці воінаў ў тыл праціўніка. 21.7.1944 г. пасля кароткага артналёту падраздзяленні палка пачалі атаку. У гэты час батальён палка з групай партызан нанес удар з тылу. У напружаным баі в. Медна была вызвалена, абарона ворага прарвана. Раніцай 22 ліпеня часці палка з ходу фарсіравалі Заходні Буг.

У 19[illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Буг в огне. [Зб. успамінаў] [illegible] Мн., 1977. *М. К. Кішалёў*

277. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору. 25.2.1943 г. фашысцкі карны атрад уварваўся ў вёску. Фашысты сагналі ў хлеў 126 чалавек рознага ўзросту і расстралялі, вёску (212 двароў) спалілі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

278. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўднёвай ускраіне вёскі, на могілках. Пабудавана ў канцы

… з дрэва. Адназрубны будынак і цыбуленадобнай галоўкай у цэнтры даху. Да асноўнага аб'ёму прылягаюць 2 прыбудовы - бакавы алтар і адна'ярусная званіца. Помнік народнага дойлідства.

в. Міхалін, Радваніцкі сельсавет

279. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Ва ўрочышчы Дуброва. Пахавана сям'я партызана Грудніка (5 чалавек), якая была расстраляна 2.10.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

280. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Ва ўрочышчы Дуброва. Пахаваны 13 мірных жыхароў, якіх 2.10.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

пас. Мухавец, цэнтр сельсавета

281. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 3 км ад пасёлка, ва ўрочышчы Плянта. Пахаваны 8 чалавек — члены сем'яў ваеннаслужачых і мясцовыя жыхары, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

282. ПОМНІК БАГДАНЧУКУ Сяргею Якімавічу (гіст., маст.). У скверы.

Актыўны дзеяч рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі С. Я. Багданчук (партыйны псеўданім Жанька) нарадзіўся ў 1911 г. у в. Касцяні Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. ў сям'і чыгуначніка. З 16 гадоў звязаў сваё жыццё з вызваленчым рухам у Заходняй Беларусі. У 1927 г. выбраны сакратаром Слонімскага падпольнага акруговага камітэта КСМЗБ, з 1928 г. член КПЗБ. Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні нелегальных камсамольскіх арганізацый. Неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі. Па рашэнню ЦК КПЗБ накіраваны на вучобу ў СССР. Пасля сканчэння ў 1932 г. Камуністычнага універсітэта нацыянальных меншасцей Захаду імя Ю. Мархлеўскага ў Маскве вярнуўся ў Заходнюю Беларусь. З ліпеня 1932 г. сакратар Брэсцкага падпольнага акруговага камітэта КПЗБ. 4.4.1933 г. быў схоплены паліцыяй у в. Радванічы і пасля жорсткіх катаванняў забіты.

У 1970 г. па ініцыятыве і на сродкі камсамольцаў Брэсцкага р-на С. Я. Багданчуку пастаўлены помнік (скульпт. Н. Дапелян; бетон, мармуровая крошка, вышыня пастамента 2,8 м, бюста 0,7 м). Бюст устаноўлены на пастаменце прызматычнай формы, на ім высечаны надпіс-прысвячэнне. Да двухступеньчатага стылабата прымыкае гарызантальна накладзены бетонны брус. Каля падножжа помніка — клумбы і дэкаратыўныя кусты.

Літ.: Революционное движение в Западной Белоруссии (1921–1939 гг.). — Мн., 1966; Вотковић Г. Б., Коротк е в и ч В. Б. Пусть помнят все: Памятники и памятные места революционной и национально-освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. — Мн., 1979. *А. С. Барысевец, М. М. Казлоўская, Л. Г. Лапцэвіч.*

283. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст., маст.). У цэнтры пасёлка. Пастаўлены ў 1976 г. на ўшанаванне памяці 164 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (скульпт. Ю. Рычкоў, арх. Ю. Ціханаў; бетон з мармуровай крошкай; вышыня пастамента 1 м, скульптуры 5,6 м).

Помнік — архітэктурна-скульптурная кампазіцыя, ідэйна-мастацкім і пластычным цэнтрам якой з'яўляюцца гарэльефы 2 воінаў у рост. Яны нібы вырываюцца з каменнай глыбы, якая ўстаноўлена на пастаменце. Адзін з воінаў бесстрашна кідаецца ў атаку з аўтаматам у руках, другі скошаны куляй, падае са сцягам у правай руцэ. Драматычны парыў, увасоблены ў пластычных вобразах гарэльефаў, падкрэслены абагульненай мадэліроўкай формы — вуглатымі плоскасцямі, што ўтвараюць неспакойны рытм, кантрастамі святлацені. Помнік завяршаецца прамавугольным блокам, на адной з граней якога, нібы на сцягу, высечаны серп і молат. Злева ад скульптуры — гарызантальная стэла з імёнамі загінуўшых і прысвячэннем. Яе замыкае масіўны блок з лічбамі 1941—1945. Усю кампазіцыю аб'ядноўвае трохступеньчаты стылабат і выкладзеная квадратнымі плітамі пляцоўка. *Л. Г. Лапцэвіч.*

282. *Помнік С. Я. Багданчуку*

275. Пакроўская царква. План

275. Пакроўская царква

283. *Помнік землякам*

в. Невлі, Клейнікаўскі сельсавет

284. МЕСЦА ГІБЕЛІ ПАГРАНІЧНІКАЎ (г.ст.). За 1,5 км на захад ад вёскі. Тут 22.6.1941 г. пры ахове дзяржаўнай граніцы СССР загінулі начальнік заставы М. І. Аксёнаў і 13 пагранічнікаў. У 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Орхава, Тамашоўскі сельсавет

285. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). За 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва урочышчы Аляксандраўка. На ўшанаванне памяці пагранічнікаў, якія 22.6.1941 г. праявілі мужнасць і гераізм у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлена стэла.

в. Падлессе Радванiцкае, Мухавецкі сельсавет

286. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На ўсход ад вёскі, каля лесу. Пахаваны 52 воіны і партызаны, якія загінулі ў 1941—44 гг. У 1961 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Покры, Чарнаўчыцкі сельсавет

287. ГАРАДЗІШЧА, МОГІЛЬНІКІ (арх.). Размешчаны за 2 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Лясная, на астраўку паміж яе рэчышчам і старыцай.

287а. Г а р а д з і ш ч а. Выцягнута з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Глыбокая ўпадзіна дзеліць яго на 2 часткі: паўднёва-заходнюю, амаль авальную ў плане, і паўднёва-ўсходнюю — доўгую, вузкую. Даўжыня гарадзішча 250 м, шырыня ў паўднёва-заходняй частцы 65 м, у паўднёва-ўсходняй — 35 м. Вышыня над узроўнем поплава ракі на паўднёвым усходзе — 3,5 м. Калісьці гарадзішча было абнесена ровам, сляды якога захаваліся і цяпер. Даследавалі І. А. Іофе (1955 г.), І. В. Біруля (1959 г.), Ю. У. Кухарэнка (1966 г.), Г. М. Каробушкіна (1980 г.). У культурным пласце магутнасцю 0,4—1,2 м знойдзена шмат фрагментаў ганчарнага посуду. Датуецца 10—14 ст.

287б. К у р г а н н ы м о г і л ь н і к знаходзіцца ў паўночна-заходняй частцы астраўка. 2 насыпы з каменным пакрыццём. Вышыня 0,5 м, дыяметр 3—4 м. Адзін з курганоў раскапаў І. В. Біруля ў 1959 г. Выяўлены пахаванні з абрадам трупаспалення. Датуецца 11—13 ст.

287в. Г р у н т а в ы м о г і л ь н і к. Размешчаны ў паўднёва-ўсходняй частцы гарадзішча, каля курганнага могільніка. Даследавалі І. А. Іофе (1955 г.), Ю. У. Кухарэнка (1966 г.), Г. М. Каробушкіна (1981 г.). Знойдзены 11 пахаванняў з абрадам трупапалажэння. Амаль у цэнтры раскопу стаяў гліняны гаршчок, зроблены на ганчарным крузе. Вакол яго было 5 пахаванняў. Нябожчыкі ляжалі ў вузкіх прамавугольных ямах галовамі на захад. Глыбіня ям 0,6—0,7 м ад узроўню сучаснай паверхні. Поўнасцю раскапана пахаванне № 3. У ім нябожчык ляжаў на спіне. Каля яго ног быў чэрап другога дарослага чалавека. Тут знойдзены 4 жалезныя цвікі. Могільнік датуецца 11—12 ст. Аналагічных пахавальных абрадаў не выяўлена. Этнічная прыналежнасць помніка не ўстаноўлена.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Древньоруське городище Покри — У кн.: Слов'яно-руські старожитності. Київ, 1969.

В. В. Караткевіч

287. Г[illegible]

288. МАГІЛА ТРОМЗЫ Дамітрыя Мікалаевіча (гіст.). На могілках. Сакратар Чарнаўчыцкага райкома КПЗБ Дз. М. Тромза загінуў у верасні 1939 г. пры вызваленні Заходняй Беларусі. У 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск.

289. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (арх.т.). На поўнач ад вёскі. Пабудавана ў 1739 г. з дрэва, часткова перабудавана ў 19 ст.

Крыжападобны ў плане будынак з пяцігранай апсідай накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі двухсхільнымі дахамі, якія ўтвараюць франтоны на галоўным і бакавым фасадах. Сярэдкрыжжа завершана фігурнай галоўкай. Да апсіды прылягаюць 2 маленькія рызніцы. З захаду да царквы прыбудавана двухярусная званіца.



289. *Пакроўская царква. План.*



289. *Пакроўская царква*

(васьмярык на чацверыку), пакрытая васьміграпным шатровым дахам. Сцены будынка вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. Вуглы апрацаваны драўлянымі разнымі накладкамі. Асноўнае зальнае памяшканне з бабінцам і столлю аддзелена ад алтара разным іканастасам. Хоры ў верхняй частцы бабінца апіраюцца на 2 калонкі.

Царква — узор драўлянай забудовы цэнтрычнай кампазіцыі, у архітэктуры якой адзначаюцца асобныя рысы барока. *С. Ф. Самбук*

в. Прыбарава, Тамашоўскі сельсавет

290. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). За 1,5 км на захад ад вёскі. Пахаваны 18 пагранічнікаў, якія загінулі 22.6.1941 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1956 г. на магіле ўстаноўлена стэла.

291. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахавана сям'я Карпюкоў (5 чалавек), расстраляная нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1979 г. на магіле пастаўлены абеліск.

292. МАГІЛА ПАРТЫЗАНА (гіст.). На могілках. Пахаваны партызан, які загінуў у Вялікую Айчынную вайну. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

293. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі. На ўшанаванне памяці 2 пагранічнікаў, якія 22.6.1941 г. знішчылі на гэтым месцы 13 нямецка-фашысцкіх акупантаў і самі загінулі. У 1970 г. пастаўлены абеліск.

294. СТАЯНКІ (археал.).

294а. Стаянка Прыбарава-1. За 3 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Гарынец, на невялікім пясчаным узгорку сярод даліны Заходняга Буга. Выявіў М. Ф. Беляшэўскі ў 1898 г. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, нажы, вастрыі, большай часткай мікралітычныя, а таксама абломкі гліпянага посуду. Стаянка адносіцца да неаліту і, магчыма, больш ранняга часу (5—3-е тысячагоддзі да н. э.).

294б. Стаянка Прыбарава-2. За 3 км на поўнач ад вёскі на пясчаных узгорках, сярод пойменных балот, ва ўрочышчах Крынічка, Падзамжны, Плоціча. Выявіў і даследаваў у 1898 г. М. Ф. Беляшэўскі. Знойдзены пешматлікія крамяневыя прылады працы і абломкі посуду эпохі неаліту і бронзавага веку (3—2-е тысячагоддзі да н. э.).

Літ.: Беляшевский Н. Ф. Дюнные стоянки неолитической эпохи на берегах Западного Буга в среднем его течении // Труды одиннадцатого Археологического съезда в Киеве 1899. М., 1901, т. 1. *У. Ф. Ісаенка*



294. Рэчы са стаянкі: 1, 2 — гліняны посуд, 3 — наканечнікі стрэл.

в. Прылукі, Гершонскі сельсавет

295. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,5 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны 6 пагранічнікаў, якія загінулі 22.6.1941 г. пры ахове дзяржаўнай граніцы СССР, і 7 мірных жыхароў вёскі, што былі закатаваны і кінуты ў калодзеж нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў лютым 1942 г. У 1975 г. на магіле з левага боку пастаўлена стэла з каскай наверсе, з правага — сімвалічны бетонны зруб калодзежа.

296. СТАЯНКА (археал.). За 2 км на поўдзень ад вёскі, на пясчаным узгорку на правым беразе р. Заходні Буг. Выявіў і даследаваў у 1898 г. М. Ф. Беляшэўскі. Даўжыня помніка каля 300 м. Культурны пласт месцамі выходзіць на паверхню. Знойдзена больш за 100 крамянёвых прылад: трохвугольныя з выемкай на аснове, трохкавыя, трапецападобныя наканечнікі стрэл, пілка, нажы, вастрыі. Сабраны абломкі посуду неалітычнай эпохі, 2 таркі тшцінецкай культуры (знойдзены ў разбураных пахаваннях перыяду сярэдняй бронзы). Стаянка належыць да эпохі мезаліту (8—5-е тысячагоддзі да н. э.), неаліту (5—3-е тысячагоддзі да н. э.), сярэдняй бронзы (1600—1200 г. да н. э.).

Літ.: Беляшевский Н. Ф. Дюнные стоянки неолитической эпохи на берегах Западного Буга в среднем его течении // Труды одиннадцатого Археологического съезда в Киеве. 1899. М., 1901, т. 1. *У. Ф. Ісаенка*

в. Рагозна, Знаменскі сельсавет

297. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 5 лётчыкаў, якія загінулі ў баі, 14 партызаны і жыхары в. Рагозна, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1977 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Скокі, Матыкальскі сельсавет

298. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 50 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

299. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 16 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

300. СЯДЗІБА НЯМЦЭВІЧАЎ (гіст., архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 18 ст. (цяпер размешчана школа-інтэрнат).

Тут 16.2.1757 г. (паводле некаторых крыніц, 1758 г.) нарадзіўся польскі пісьменнік і публіцыст Юльян Урсын Нямцэвіч. У 1777 г. скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус. Быў ад'ютантам Т. Касцюшкі ў час паўстання 1794 г. У бітве з царскімі войскамі пад Мацяёвіцамі паранены, трапіў у палон і зняволены на 2 гады ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення ў 1796 г. выехаў з Т. Касцюшкам у



300. Сядзіба Нямцэвічаў. Схема планіроўкі.

300. Алея ў парку сядзібы Нямцэвічаў.

300. *Сядзібны дом Нямцэвічаў. Галоўны фасад*



300. *Сядзібны дом Нямцэвічаў. План 1-га паверха*

[illegible] ША, дзе зблізіўся з Дж. Вашынгтонам. У 1802 г. вярнуўся на радзіму. [illegible] 1827 [illegible] варшаўскага [illegible] вараства сяброў навук. Удзельнік паўстання 1830—31 [illegible] паражэння паўстання жыў у Парыжы. Памёр 21.5.1841 г.

Ю. У. Нямцэвіч выступаў за развіцце асветы, правядзенне буржуазна-дэмакратычных рэформ. У палітычнай камедыі «Вяртанне пасла» [illegible] ві ад прыгону. Пісаў сатыры на [illegible] парады, байкі, раманы, [illegible] мы, трагедыі і інш. Аўтар раманаў «Два паны Сяцехі» (1815 г.), «[illegible] Тэнчына» (1825 г.), паэтычнай [illegible] «Гістарычныя песні» (1816 г.). [illegible] гістарычным [illegible] на польскіх землях, якія [illegible] 1811 [illegible] 1828 [illegible]

[illegible] сядзібна-паркавага ан[illegible] двухпавярхова палац [illegible] флігель (не захаваўся) стваралі пе[illegible] боку агароджай з варотамі. За палацам парк рэгулярнага тыпу планіроўкі з цэнтральнай алеяй, якая выходзіць да ручая. Драўляны касцёл па[illegible] не захаваўся. Палац — пра[illegible] будынак з бакавымі прыбудовамі. Мае [illegible] аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. [illegible] поўны аб'ём будынка пакрыты [illegible] кім дахам з заломам. Цэнтральныя ўваходы ў дом з галоўнага і [illegible] га фасадаў акцэнтаваны вынас[illegible] балконамі на слупах. Плоскасна трак[illegible] ны рытм прамавугольных акон і згрупаваныя ў цэнтры лапаткі. Цэнтральнае месца ў планіроўцы дома займае вестыбюль і вялікая зала з выхадам у парк. Планіроўка на ўсіх паверхах была анфіладная.

[illegible]

Літ.: Czartoryski A. Żywot J. U. Niemcewicza. Paryż, 1860.

[illegible]

[illegible] Гершонскі сельсавет

301. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ [illegible] хаваны 73 воіны 160-й стралковай [illegible] загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза Міхаіл Яфімавіч Аляксандраў.

М. Я. Аляксандраў нарадзіўся 14.9.1919 г. ў в. Галееўка Пачынкаўскага р-на Смаленскай вобл. ў сялянскай сям'і. На фронце з мая 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Заходняга Буга. 22.7.1944 г. яфрэйтар М. Я. Аляксандраў адзін з першых пера[illegible] праўся цераз Заходні Буг, захапіў плацдарм, кулямётным агнём адбіў [illegible] нескалькі атак праціўніка і утрымаў плацдарм. Загінуў 15.8.1944 г. пры вызваленні Гольчыц. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Навечно в сердце народном.— 1 изд.— Мн., 1984. *Т. А. Слесарук.*

302. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ ([illegible]). У цэнтры вёскі. Пахаваны 86 савецкіх грамадзян, забітых нямецка-фашысцкімі захопнікамі восенню 1943 г. Вёска (280 двароў) была спалена. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

303. МАГІЛА МАРКОВА М[illegible] Пятровіча (гіст.). На могілках. Малодшы сяржант М. П. Маркаў загінуў у баі [illegible].7.1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

304. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). Да Вялікай Айчыннай вайны на захад ад вёскі размяшчалася 13-я пагранзастава. 22.6.1941 г. тут геранчна абаранялі [illegible] жаную граніцу СССР воіны-па[illegible] нікі на чале з начальнікам заставы [illegible] лейтэнантам [illegible] У 1968 г. [illegible] лена мемарыяльная дошка.

305. МЕСЦА ГІБЕЛІ ПАГРАНІЧНІКАЎ (гіст.). За 3 км на захад ад вёскі. 22.6.1941 [illegible] граніцы СССР тут [illegible] заставы лейтэнантам П. М. Шчогале[illegible]

306. МЕСЦА ПОДЗВІГУ АЛЯКСАНДРАВА Міхаіла Яфімавіча (гіст.). [illegible] 3,5 км на захад ад вёскі. Тут 22.7.1944 г. здзейсніў подзвіг [illegible] яфрэйтар

М. Я. Аляксандраў. У час наступлення савецкіх войск ён адзін з першых пераправіўся цераз Заходні Буг, захапіў плацдарм і забяспечыў пераправу байцоў, за што яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1974 г. пастаўлены абеліск.

307. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 27 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1960 г. устаноўлены скульптура воіна і 2 стэлы.

308. СТАЯНКА (археал.). За 1 км на поўнач ад вёскі, ва урочышчы Субіты, на пясчаным узгорку. Выявіў і даследаваў у 1898 г. М. Ф. Белашэўскі. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, скрабкі, нажы, вастрыі, абломкі глінянага ляпнога посуду. Помнік эпохі позняга неаліту і пачатку сярэдняй бронзы.

в. Сычы, Лышчыцкі сельсавет

309. СЯДЗІБНЫ ДОМ (архіт.). На ускраіне вёскі ў пейзажным парку (захаваўся часткова). Пабудаваны на мяжы 19—20 ст. з дрэва. Аднапавярховы будынак з мансардавым паверхам мае асіметрычную кампазіцыю, накрыты вальмавым дахам з паўвальмамі на тарцах. Цэнтральная частка галоўнага фасада вылучана двухпавярховым рызалітам, завершаным трохвугольным франтонам. На дваровым фасадзе на 2-м паверсе рызаліта балкон. Унутраная планіроўка анфіладнага тыпу. У цэнтральнай частцы на 1-м паверсе 2 парадныя залы.

Помнік сядзібнай драўлянай архітэктуры. *А. Ю. Пятросава*

310. ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Уяўляе сабой прамавугольны ў плане аб'ём, да якога далучаецца трох'ярусная квадратная ў плане званіца, пакрытая невысокім шатровым дахам.

в. Тамашоўка, цэнтр сельсавета

311. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі.

Пахаваны 22 пагранічнікі, якія загінулі ў баі 22.6.1941 г. пры абароне дзяржаўнай границы СССР,— лейтэнант В. В. Кірухін, малодшы сяржант А. В. Філатаў і 20 радавых. У першы дзень вайны на світанні батальён гітлераўцаў пад прыкрыццём артылерыйскага агню пачаў пераправу цераз Заходні Буг у раёне в. Уладава. У пачатку бою загінуў начальнік 5-й рэзервовай заставы лейтэнант Кірухін. Пасля шэрагу беспаспяховых атак фашысты стварылі дымавую заслону і зноў рынуліся на палацы пагранічнікаў. Сакратар камсамольскай арганізацыі А. В. Філатаў з ручнога кулямёта паліваў агнём варожыя ланцугі. Калі ён загінуў, яго месца заняў радавы Ф. М. Ермакоў. Бой ішоў 11 гадзін.

За мужнасць і адвагу 6 пагранічнікаў, удзельнікаў гэтага бою, былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і 2 — ордэнам Чырвонай Зоркі.

У 1969 г. на магіле ўстаноўлена стэла (скульпт. І. Хоміч і В. Андрусчанка). *Т. М. Ходчава*

312. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля шашы Брэст — Уладава (за 2 км ад павароту на в. Тамашоўка). Пахавана 2200 мірных жыхароў.

Летам 1942 г. ў Тамашоўцы нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі гета. На тэрыторыі каля 1,5 км² знаходзілася больш за 2 тыс. чалавек. У канцы лютага 1942 г. фашысты пачалі масавае знішчэнне вязняў гета. Іх вывозілі за вёску. Адных атручвалі ў душагубках, другіх расстрэльвалі каля загадзя выкапаных ям.

У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

313. МАГІЛА БАЛБЕРАВА (гіст.). На могілках. Пагранічнік Балбераў расстраляны ў 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

311. *Помнік на брацкай магіле савецкіх пагранічнікаў*

314. МОГІЛКІ САЛДАТ 1-Й СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (гіст.). У цэнтры вёскі. У 1262 магілах (у т. л. 12 брацкіх) пахаваны 1346 салдат рускай арміі і арміі кайзераўскай Германіі, якія загінулі ў баях у 1915—16 гг. Могілкі упарадкаваны на сродкі Міжнароднага Чырвонага Крыжа ў 1919 г.

в. Харсы, Тамашоўскі сельсавет

315. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля школы. На ўшанаванне памяці 10 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялі-

309. *Сядзібны дом. План*

309. *Сядзібны дом. Дваровы фасад*



319. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан*

кую Айчынную вайну, у 1957 г. устаноўлена стэла

в. Харытоны, Чэршінскі сельсавет

316. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Мясцовая назва Ш в е д с к і я м а г і л ы. За 0,4 км на паўночны ўсход ад вёскі, на могілках. 7 круглых, пакрытых дзірваном пясчаных насыпаў. Вышыня 0,6—0,8, дыяметр 5—7 м. Адкрыла і абследавала ў 1980 г. Т. М. Карабушкіна. Раскопкі не праводзіліся

в. Церабунь, Клейнікаўскі сельсавет

317. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). На захад ад вёскі да Вялікай Айчыннай вайны размяшчалася 6-я пагранічная застава. 22.6.1941 г. воіны пагранічнікі праявілі мужнасць і гераізм у баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1968 г. на ўшанаванне іх памяці на будынку былой заставы ўстаноўлена мемарыяльная дошка

318. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Краіна Саветаў». На ўшанаванне памяці 51 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. устаноўлена стэла

в. Чарнаўчыцы, цэнтр сельсавета

319. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 416 воінаў і партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза Васіль Іванавіч Загародні.

В. І. З а г а р о д н е ў нарадзіўся 29.12.1919 г. ў в. Лох Новабураскага р-на Саратаўскай вобл. Член КПСС з 1943 г. На фронце з 1942 г. Падраздзяленне гвардыі капітана В. І. Загароднева атрымала загад пераправіцца цераз Заходні Буг і перарэзаць шашу каля в. Зачэпкі (ПНР). Нягледзячы на бесперапынныя атакі ворага, гвардзейцы ўтрымлівалі занятыя пазіцыі да падыходу асноўных сіл. У гэтай аперацыі 29.7.1944 г. В. І. Загароднеў загінуў. 24.3.1945 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названы вуліцы ў Брэсце і Саратаве

У 1945 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата з вінтоўкай у руцэ.

Побач пахаваны старшыня калгаса «Іскра» І. А. Крупскі (1885—1949 гг.), якога забілі ворагі Савецкай улады

Літ.: В памяти народной.— Мн., 1969

А. С. Вярхсавец

320. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. 23.6.1941 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі групу мірных жыхароў. У 1950 г. на магіле пастаўлены абеліск.

321. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ (архіт., маст.). У цэнтры вёскі. Галоўным заходнім фасадам выходзіць на шашу Брэст—Камянец. Пабудаваны ў 1583 г. (па іншых звестках у 1585 г.) з каменю. На паўночным захадзе ад касцёла на высокім цокалі стаіць трох'ярусная званіца з шатровым дахам.

Будынак — аднанефавы бясслупавы храм з трансептам. Неф, трансепт і аднолькавая з ім па вышыні паўкруглая апсіда накрыты высокім дахам, які ўступам пераходзіць у паўшатровае завяршэнне апсіды. Да крылаў трансепта і бакоў апсіды прылягаюць больш нізкія прыбудовы з аднасхільнымі дахамі, якія ствараюць паступовае нарошчванне аб'ёмаў і надаюць кампазіцыі мастацкую выразнасць. З паўднёвага боку да апсіды прымыкае цыліндрычная вежа з самастойным шатровым пакрыццём і вінтавой лесвіцай унутры. Да галоўнага фасада прыбудаваны ўваходны тамбур. У дэкаратыўным вырашэнні галоўнага (заходняга) фасада — асобныя элементы рэнесансу: плоскія прамавугольныя і круглыя нішы, прафіляваны карніз, вертыкальныя цягі. Атынкаваныя масіўныя сцены бакавых фасадаў (таўшчыня сцен 1,3 м) умацаваны контрфорсамі, праразаны



321. *Троіцкі касцёл. План*



321. *Троіцкі касцёл. Разрэз*

321. *Званіца Троіцкага касцёла*

321. *Троіцкі касцёл. Бакавы фасад*

вузкімі паўцыркульнымі аконнымі праемамі. Цыліндрычнае склепенне ў распалубках аздоблена ляпнымі нервюрамі геаметрычнага малюнка — матыў архітэктуры ранесансу. Сцены апрацаваны пілястрамі. У інтэр'еры 3 барочныя драўляныя паліхромныя



321. *Фрагмент скляпення Троіцкага касцёла.*

скульптуры 18 ст.: 1 у алтары ... ... скульптур захаваліся сляды афарбоўкі залаціста-карычневых і чырвоных тонаў.

Касцёл — унікальны помнік беларускай архітэктуры з элементамі готыкі і рэнесансу, мае выразныя рысы абарончага дойлідства сярэдневечча.

Літ.: Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период.— Мн., 1969.

Л. Г. Лапцэвіч, У. А. Чантурыя

322. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі, каля шашы Брэст — Камянец. Пабудавана ў 1733 г. з дрэва, перабудоўвалася ў 19 ст.

Будынак крыжападобны ў плане. Да галоўнага, выцягнутага ў папярочным напрамку зруба з захаду прылягае прамавугольны зруб бабінца, з усходу — пяцігранная апсіда з 2 бакоўкамі. Дах паўтарае крыжовы план збудавання. Перасячэнне грабнёў даху завершана двух'ярусная вежачкай. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, умацаваны брусамі і прарэзаны спаранымі прамавугольнымі вокнамі. Вуглы бабінца ... ... брусам. Інтэр'ер залы, перакрыццё бэлечнае з падшыўной столлю. У верхняй частцы бабінца размешчаны хоры. Асноўнае памяшканне ад алтара аддзелена разным іканастасам канца 19 ст.

Царква — помнік архітэктуры пераходнага тыпу ад трохзрубнага восевага кампазіцыі да крыжова-цэнтрычнага, якая склалася пад уплывам традыцый народнага дойлідства і стылю барока.

С. Ф. Сямбук

в. Чэрні, цэнтр сельсавета

323. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля школы. Пахаваны 263 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёсак Баранаўка, Збірагі, Малыя Косічы, Чэрні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

324. МАГІЛА САВАНЕЎСКАГА Аляксандра Паўлавіча (гіст.). На могілках.

Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі А. П. Саванеўскі нарадзіўся 13.3.1904 г. ў в. Даманевічы Брэсцкага р-на. Член КПЗБ з 1923 г. У 2.1927 г. арганізаваў у в. Булькова Брэсцкага р-на дэманстрацыю. Арыштаваны 29.8.1927 г. Пінскім акруговым судом прыгавораны за прыналежнасць да КПЗБ на 4 гады зняволення. Знаходзячыся ў кобрынскай турме, арганізаваў мітынг палітвязняў, за што тэрмін пакарання быў павялічаны яшчэ на год. Пасля вызвалення з турмы з канца лістапада 1931 г. да 13.12. 1932 г. А. П. Саванеўскі (псеўданім



322. *Царква Параскевы Пятніцы. План.*

322. *Царква Параскевы Пятніцы. Агульны выгляд.*

326. *Званіца Міхайлаўскай царквы*

Колька) быў сакратаром Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ. 7.12.1932 г. за рэвалюцыйную дзейнасць зноў быў зняволены на 4 гады і пазбаўлены правоў на 5 гадоў. 3.1.1936 г. па амністыі выйшаў з турмы. Памер у 1941 г.

У 1976 г. на магіле пастаўлены абеліск.

В. В. [illegible]

в. Чэрск, Дамачаўскі пасялковы Савет

325. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 51 воін, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

326. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На галоўнай вуліцы вёскі. Пабудавана да 1701 г. з дрэва.

Першапачатковы будынак царквы складаўся з квадратнага ў плане асноўнага і пяціграннага алтарнага зрубаў, накрытых агульным вальмавым дахам. Вяршыні вальмаў і гранёнага накрыцця апсіды завершаны з бакоў фігурнымі барочнымі вежачкамі. У 19 ст. да царквы з захаду прыбудаваны квадратны ў плане бабінец. Унутры асноўны зруб мае скляпенне [illegible] [illegible] -болечнае з падшыўной столлю. [illegible] іканапісу 17—18 ст.



326. *Міхайлаўская царква. План*

Асобна ад царквы стаіць трох'ярусная званіца. Першы і трэці ярусы чацверыкі, другі — неразвіты прамежкавы ярус, дзве баковыя грані якога захоўваюць характар прычолкаў, а дзве другія на ўсходнім і заходнім фасадах маюць вертыкальныя плоскасці, афармленыя арачнымі праёмамі.

Царква — помнік архітэктуры, які адлюстроўвае характэрныя рысы палескай школы драўлянага дойлідства.

С. Ф. Сембер



326. *[illegible] Міхайлаўскай царквы.*



327. *Праабражэнская царква. Падоўжны разрэз і план*

327. *Праабражэнская царква. [illegible] з боку апсіды*

328. [illegible]



330. [illegible]

330. [illegible]

в. Шумакі, Клейнікаўскі сельсавет

327. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА [illegible] 1689. [illegible]

Прамавугольны ў плане аснове [illegible] барабан [illegible] двухсхільным дахам [illegible] лубкамі. У інтэр'еры — разныя царскія вароты, выкананыя [illegible] 18 ст.

Царква [illegible] рэстаўрацыю.

А. Я. Міцянін

328. СТАЯНКА [illegible] 30 м. [illegible] Варшава [illegible]

М. Ф. [illegible]

в. Шобрын, Тэльмінскі сельсавет

329. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК [illegible] За 0,4 км на паўночны ўсход [illegible] на левым беразе р. Мухавец, у лесе. 12 паўсферычных пясчаных насыпаў вышынёй 0,6—1,2 м, дыяметрам [illegible] ныя рэшткі дровы, кальцыраваныя [illegible] 8—10 ст.

Матэрыялы [illegible] АН БССР.

331. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА [illegible] за 2 км [illegible] у 1793 [illegible]

[illegible] двухсхільным дахам [illegible] двухсхільным дахам.

Царква [illegible] форм барока.

С. Ф. Самбук

БЯРОЗАЎСКІ РАЁН

ІІІ. БЯРОЗА

Горад (да 1940 г. Бяроза Картузская, [illegible] Картуз-Бяроза) цэнтр раёна. Размешчана на р. Ясельда, на раўніннай мясцовасці з невялікім паніжэннем у бок р. Крачат. За 102 км на паўночны ўсход ад Брэста, на шашы Брэст — Мінск, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Бяроза-Картузская [illegible] Брэст — Мінск.

[illegible] 1477 [illegible] 1521 г. [illegible] ва Літоўскага. Належала феадалам Гамшэям, Вештартовічам, Гастоўскім, Рудамінскім, з канца 16 ст. — Сапегам. [illegible] 1648—89 гг. тут пабудаваны кляштар ордэна картэзіянцаў, які валодаў значным зямельным надзелам, 800 сялянскімі дварамі і з'яўляўся асноўным горадабудаўнічым ядром Бярозы. У Паўночную вайну 1700—21 гг. шведскія войскі на чале з Карлам XII [illegible] 1795 г. [illegible] 1871 г. [illegible] з 180[illegible] Гродзенская губерня [illegible]

ІІІ. *Плошча Леніна.*

[illegible] гандлю і прамысловасці. У 1-й [illegible] 19 [illegible] (18[illegible]) [illegible] 2000 [illegible] суконная мануфактура — каля 10 тыс. аршынаў сукна (1830 г.). У 1843 г. у Бярозе больш за 200 драўляных дамоў, 1,2 тыс. жыхароў.

Хуткі рост мястэчка пачаўся з 1870-х гадоў у сувязі з будаўніцтвам Маскоўска-Брэсцкай чыгункі і адкрыццём у 1871 г. руху па ўчастку Смаленск — Брэст. Паводле перапісу 1897 г. ў Бярозе было 6226 жыхароў [illegible] 30 [illegible] вы рамеснага тыпу. Напярэдадні 1-й сусветнай вайны іх было 19 з 65 рабочымі, самыя значныя: гарбарны завод (у 1914 г. — 7 рабочых), 2 [illegible] сапальныя (14 рабочых) і завод па ачыстцы мелу (8 рабочых).

З 1915 г. Бяроза акупіравана нямецкімі войскамі, а 1919 г. да ліпеня 1920 г. [illegible] 1920 [illegible] войскамі буржуазнай Польшчы. У ліпені 1920 [illegible] Савецкая ўлада. З 1921 [illegible] буржуазнай Польшчы [illegible] У 1934 [illegible] буржуазнай Польшчы

ІІІ. *Забудова вуліцы Савецкай*

створаны Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.

З 1939 г. Бяроза ў складзе БССР, [illegible] тыс. жыхароў. З 1940 г. цэнтр раёна.

У Вялікую Айчынную вайну з 23.6.1941 г. да 16.7.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У раёне дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (снежань 1943 г. — 12.7.1944 г.), ЛКСМБ (1.9.1943 г. — 12.7.1944 г.), з студзеня 1944 г. выдавалася падпольная газета «Пламя». У 1959 г. ў Бярозе 5,6 тыс. жыхароў.

У канцы 1950-х гадоў распрацаваны першы пасляваенны генеральны план забудовы горада. У 1974 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва распрацаваны новы генеральны план, паводле якога архітэктурна-планіровачная структура [illegible] лінейнай сеткі з 2 узаемна перпендыкулярнымі восямі — вуліцамі Леніна і 17 Верасня. Сялібная зона развіваецца ў існуючых гарадскіх межах. Ажыццяўляецца добраўпарадкаванне [illegible] (вуліцы Леніна і Савецкая) забудаваны 3—5-павярховымі дамамі. Грамадска-адміністрацыйны цэнтр горада — пл. Леніна — фарміруюць будынкі гарвыканкома, універмага і рэстарана. Перад будынкам гарвыканкома пастаўлены помнік У. І. Леніну. У цэнтральнай частцы горада разбіты сквер, у якім на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан пастаўлены помнік і запалены Вечны агонь.

Прамысловыя прадпрыемствы: заводы жалезабетонных вырабаў і маторарамонтны, вытворчае металаапрацоўчае аб'яднанне, камбінаты сельскагомабудаўнічы, будаўнічых матэрыялаў, Новабярозаўскі вапнавы завод (в. Самойлавічы), маласырзавод, мясакансервавы камбінат, хлебазавод, завод «Ветсанутыль» (вытворчасць касцявой мукі, кармавых тлушчаў і інш.), вытворчы ўчастак Пінскага віназавода. Працуюць камбінат бытавога абслугоўвання, аб'яднанне Дзяржсельгастэхнікі.

У горадзе сярэдняе прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў, 2 сярэднія, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат, Дом піянераў і школьнікаў, 7 дашкольных устаноў, 2 бібліятэкі, гісторыка-рэвалюцыйны музей, бальніца і паліклініка. Выдаецца раённая газета «Маяк коммунизма».

Захаваліся помнікі архітэктуры: кляштар картэзіянцаў (17 ст.) і Петрапаўлаўская царква (18 ст.). Пастаўлены абеліск вязням Бяроза-Картузскага канцэнтрацыйнага лагера, помнік савецкім лётчыкам.

Зона адпачынку знаходзіцца на беразе р. Ясельда.

Літ.: Селевич Е. В., Сикорин И. [illegible] Береза. Мн., 1977; Rewieński W. Bereza Kartuska, wybrane rozdziały z antropogeografii miasteczka. — Wilno, 1934.

А. А. Міцкевіч, Э. М. Спецкі, М. Да. Сікорын.

331. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У Камсамольскім скверы, насупраць Дома культуры. Пахаваны 308 воінаў і партызан. Сярод іх — воіны, якія загінулі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, і воіны 20-га стралковага корпуса 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні г. Бярозы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна на высокім пастаменце. На 21 мармуровай пліце [illegible]

Літ.: Буг в огне. [illegible] 3 изд. Мн., 1977; Освобождение Белоруссии 1944. — 2 изд. — М., 1974.

У. С. Пага, А. А. Фактаровіч.

332. БЯРОЗА-КАРТУЗСКІ КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫ ЛАГЕР (гіст.). На паўд[illegible]

[illegible]

332. [illegible] канцэнтрацыйнага лагера.

[illegible] таў. Размяшчаўся ў колішніх ваенных казармах. Сюды знявольвалі без суда і следства, па падставе даклаў [illegible]

331. *Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.*

333. Кляштар картэзіянцаў. [illegible] 18.. г.

333. Кляштар картэзіянцаў. Будынак шпіталя.

нага руху ў Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне, Польшчы. Сістэма жорсткага катаржнага рэжыму, строгая ізаляцыя ад знешняга свету была разлічана на тое, каб фізічна і маральна зламаць вязняў. Але з першых дзён існавання канцэнтрацыйнага лагера ў ім дзейнічала законспіраваная камуністычная арганізацыя. Працоўныя Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, СССР, прагрэсіўныя сілы ўсяго свету рашуча выступалі супраць існавання канцлагера, вялі барацьбу ў абарону вязняў, памагалі сем'ям зняволеных. Канцлагер ліквідаваны ў верасні 1939 г. ў выніку вызвалення Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй. Па няпоўных звестках за 5 гадоў праз лагер прайшло больш за 10 тыс. вязняў.

У 1962 г. на тэрыторыі былога канцлагера пастаўлены абеліск.

Літ.: Гаврилюк А. Песни из Берёзы.— М., 1954; Они не стали на колени. Сборник воспоминаний и документов о концлагере Береза Картузская.— Мн., 1966; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.).— Мн., 1966. *У. С. Пась, А. А. Фактаровіч.*

333. КЛЯШТАР КАРТЭЗІЯНЦАЎ (арxiт.). На паўночна-заходняй ускраіне горада. Пабудаваны ў 1648—89 гг. У будаўніцтве прымалі ўдзел італьянскія архітэктары. У час Паўночнай вайны 1700—21 гг. і [illegible] канфедэрацыі (у 1772 г.) разбураны. У 1831 г. закрыты за ўдзел манахаў у паўстанні 1830—1831 гг. У 1866 г. часткова разабраны, цэгла выкарыстана для будаўніцтва казарм. Захаваліся рэшткі паўднёвай і заходняй частак кляштара. Звесткі аб планіроўцы і забудове кляштарнага ансамбля даюць архіўныя чарцяжы 18 і пачатку 19 ст.

Комплекс уключаў мураваны будынак касцёла, адначасныя групы жылых карпусоў, бібліятэку, трапезную, шпіталь, аптэку, гаспадарчыя пабудовы і разам з прылеглым да яго садам і вадаёмам быў абнесены крапаснoй мураванай сцяной з вежамі і капліцамі. Галоўным уваходам у кляштар служыла магутная брама з байніцамі. Яна вяла ў двор, які ўтваралі карпусы келляў радавых манахаў, дапаможных і гаспадарчых службаў. Ян быў прызначаны для гаспадарчых



333. Кляштар картэзіянцаў. План.

333. Кляштар картэзіянцаў. Званіца.

333. *Кляштар картэзіянцаў. Брама.*

патрэб і абслугоўвання наведвальнікаў. Другі, замкнёны прамавугольны двор утваралі калідоры-галерэі, якія злучалі двухпавярховыя карпусы келляў манахаў-самотнікаў з касцёлам. Келлі выдзяляліся ў самастойныя жылыя ячэйкі з маленькімі ўнутранымі дворыкамі.

Касцёл — трохнефавы аб'ём з 3 апсідамі і гранёным барабанам пад купалам пры ўваходзе. Галоўны фасад касцёла меў барочны дэкор: пілястры, франтоны, нішы. Іншыя фасады па свайму вырашэнню блізкія да архітэктуры карпусоў келляў манахаў у больш простых формах, сцены upрыгожаны невысокімі пілястрамі. Унутры будынак касцёла падзелены на 2 часткі — для радавых манахаў і прыхаджан і для манахаў-самотнікаў. Сілуэт ансамбля фарміравала высокая васьмігранная шмат'ярусная вежа-званіца з фігурным купалам. Яна стаяла ўнутры прамавугольнага двара, прымыкала да сярэдзіны апсіды касцёла і з'яўлялася абарончай вежай з магутнымі сценамі і вузкімі вокнамі-байніцамі. Ярусы, прыстасаваныя для гармат, звязвала вітавая лесвіца ў тоўшчы сцяны. Паверхня сцен вежы дэкарыравана простымі неглыбокімі нішамі.

Кляштар — буйны архітэктурны комплекс з элементамі абарончага характару, у якім увасоблены кампазіцыйна-дэкаратыўныя прынцыпы сталага барока.

Літ.: Квитницкая Е. Д. Архитектура Белоруссии: Архитектура XIV—XVIII вв. - У кн.: Всеобщая история архитектуры. М., 1968, т. 6; Селеня Е. В., Сикорин Н. Д. Берёза. Историко-экономический очерк.— Мн., 1977.

У. А. Чантурыя.

334. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны савецкія грамадзяне, загубленыя гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну на тэрыторыі колішняга картэзіянскага кляштара. У Бярозаўскім р-не нямецка-фашысцкія акупанты ператварылі тэрыторыю колішняга картэзіянскага кляштара ў адно з месцаў масавых расстрэлаў савецкіх грамадзян. Усяго тут было загублена больш за 4,5 тыс. чалавек. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

335. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 96 жыхароў вёсак Алёхнавічы, Лукамер, Міхнавічы, Сасноўка Бярозаўскага р-на, якіх у 1942 г. расстралялі гітлераўцы каля колішняга картэзіянскага кляштара. У 1978 г. на магіле пастаўлены абеліск.

336. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 73 жыхары в. Осаўцы Бярозаўскага р-на (у т. л. 14 членаў сямей арганізатараў першага ў раёне калгаса), якіх у 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі каля колішняга картэзіянскага кляштара. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

337. МАГІЛА ПЯДЗЕЛЬСКАГА Юзафа Андрэевіча (гіст.). На могілках.

Ю. А. Пядзельскі нарадзіўся 5.7.1899 г. ў г. Лодзь. Член Кампартыі Польшчы. Працаваў рабочым, потым прафсаюзны лідэр на фабрыцы Клеймана ў Лодзі. З студзеня 1938 г. вязень Бяроза-Картузскага канцлагера. Памёр у лагеры [illegible] 1938 г. У 1977 г. на магіле пастаўлена стэла.

338. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АЛЬШЭЎСКАМУ Анатолю Адамавічу (гіст.). Вул. Альшэўскага, 55. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, дзе ён нарадзіўся.

Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі [illegible] А. А. Альшэўскі (партыйны псеўданім Юрка [illegible]) нарадзіўся 4.7.1904 г. Член КПСС з 1919 г. Скончыў рэальнае вучылішча ў Арзамасе, куды сям'я Альшэўскіх эвакуіравалася ў час 1-й сусветнай вайны. Удзельнічаў у стварэнні камсамольскай арганізацыі ў Арзамасе. У 1919 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, змагаўся за ўстанаўленне Савецкай улады на Палессі, на Паўднёвым фронце супраць войск Дзянікіна. У 1920 г. вучыўся ў Камуністычным універсітэце імя Я. М. Свярдлова. Працаваў у рэдакцыях газет у Туле, Разані і Ніжнім Ноўгарадзе. З пачатку 1925 г. на падпольнай камсамольскай рабоце ў Заходняй Беларусі. На II канферэнцыі КСМЗБ ([illegible] г.) выбраны сакратаром ЦК КСМЗБ. З'яўляўся членам ЦК КСМ Польшчы. На III канферэнцыі (1926 г.) і I з'ездзе (1928 г.) КПЗБ выбраны членам ЦК КПЗБ. Удзельнічаў у рабоце IV канферэнцыі КПП. Працаваў рэдактарам цэнтральных органаў ЦК КПЗБ «Бальшавік» і «Чырвоны сцяг». У студзені 1927 г. арыштаваны ў Варшаве. У студзені 1928 г. ў выніку абмену палітзняволенымі паміж Савецкім Саюзам і Польшчай вярнуўся ў СССР. У 1928—33 гг. працаваў у рэдакцыі Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б у Мінску, у 1933—37 гг. — на прафсаюзнай рабоце. Памёр у 1937 г. Яго імем названа вуліца ў Бярозе.

Літ.: Зоткович Г. Б., Короткевич В. Б. Пусть помнит все. Памятники и памятные места революционной и национально-освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии.- Мн., 1979; Калесвік У. А. Пасланец Праметэя.— Маладосць, 1979, № 5.

М. М. Козлаўская.

339. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ І ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). Вул. Леніна, 69, на будынку гісторыка-рэвалюцыйнага музея. Устаноўлена ў 1965 г.

У ходзе 2-га этапа Беларускай аперацыі 20-я, 48-я, 152-я стралковыя дывізіі 28-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант А. А. Лучынскі) 1-га Беларускага фронту 16.7.1944 г. вызвалілі Бярозу ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На часова акупіраванай тэрыторыі раёна дзейнічалі партызанскія брыгады «Савецкая Беларусь», імя Ф. Э. Дзяржынскага, імя П. К. Панамарэнкі.

Партызанская брыгада «Савецкая Беларусь» створана ў жніўні 1943 г. Камандзір М. У. Бабкоў, камісар П. І. Масалоў. Брыгада паўгода блакіравала дарогу Драгічын — Бяроза. У красавіку 1944 г. ўдзельнічала ў баях супраць карнікаў (Здзітаўская абарона). У час карных аперацый гітлераўцаў у зоне дзейнасці партызан ратавалася мірнае насельніцтва Бярозаўскага і Антопальскага р-наў. У чэрвені 1944 г. брыгада зрабіла баявы рэйд з Бярозаўскага ў Кобрынскі р-н, авалодала чыгуначным участкам Кобрын — Гарадзец і падарвала больш за 300 рэек. 12—17.7.1944 г. бры-

гада (853 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

Брыгада імя Ф. Э. Дзяржынскага створана ў снежні 1943 г. Камандзір В. М. Манахаў, камісар П. Р. Кавалёў. У красавіку 1944 г. партызаны вялі бai супраць карнікаў (Здзітаўская абарона). У ноч на 20.6.1944 г. удзельнічалі ў аперацыі «Рэйкавая вайна» на чыгуначным участку Бяроза — Івацэвічы. 12.7.1944 г. брыгада (1040 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

Брыгада імя П. К. Панамарэнкі створана ў чэрвені 1943 г. Камандзіры Е. П. Урбановіч, М. У. Сенькін, камісары С. П. Пацiруха, К. Дз. Таточка, М. Е. Крыштафовіч. Асноўныя баявыя дзеянні партызаны праводзілі на чыгуначных участках Брэст — Баранавічы, Ваўкавыск — Слонім, на шашэйных дарогах Косава — Слонім, Косава — Ружаны, Ружаны — Пружаны, знішчалі баявую тэхніку і жывую сілу ворага, ахоўвалі насельніцтва ад вывазу ў Германію. 11.7.1944 г. брыгада (1637 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

Літ.: Буг в огне. 3-е изд. Мн., 1977; Ковальский Н. М. В Брестских лесах: Записки партизана. Мн., 1976. *М. К. Кешишьян.*

340. ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На вул. Савецкай. Пабудавана ў 1772 г. з цэглы. Перабудавана напярэдадні 1-й сусветнай вайны.

Будынак падоўжаны ў плане, з нязначным пашырэннем памяшкання ад увахода да алтара. На галоўным фасадзе выступае двух'ярусная званіца з высокім шатровым верхам. Двухсхільны дах у цэнтральнай частцы асноўнага аб'ёму прарэзвае глухі васьмерыковы барабан з галоўкай. Сцены будынка члянiцца лапаткамі і прарэзаны паўцыркульнымі аконнымі праёмамі.

Царква — помнік архітэктуры неарускага стылю. *А. А. Мікеля.*

341. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На пл. Леніна. Скульптура У. І. Леніна пастаўлена ў 1961 г.

342. ПОМНІК САВЕЦКІМ ЛЁТЧЫКАМ (гіст.). На паўднёва-усходняй ускраіне горада, каля шашы Брэст — Баранавічы.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны ў раёне Бярозы разгарэліся жорсткія паветраныя баі. Лётчыкі 17-га, 121-га, 123-га, 130-га, 162-га, 207-га і 212-га бамбардзіровачных авіяцыйных палкоў нанеслі значныя страты наземным войскам праціўніка 24—25.6.1941 г. ў паветраных баях імі былі больш як 10 знішчальнікаў. У 1974 г. ў гонар савецкіх лётчыкаў пастаўлены помнік — самалёт на пастаменце.

Літ.: Селезнев Е. В. В суровом небе фронтовом. — Мн., 1980. *М. Дз. Сікорскі.*

343. РАДЗІМА ГОРЫНА Паўла Восіпавіча (гіст.).

Беларускі савецкі гісторык, дзяржаўны дзеяч БССР, акадэмік АН БССР (1931 г.), доктар гістарычных навук (1934 г.). П. В. Горын (К а л я д а) нарадзіўся ў студзені 1900 г. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1918 г. У лютым — снежні 1919 г. на палітрабоце ў Чырвонай Арміі, удзельнік Грамадзянскай вайны. Скончыў Камуністычны універсітэт імя Я. М. Свярдлова (1921 г.) і Інстытут чырвонай прафесуры (1925 г.). У 1927—30 гг. праўлення член, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі Камуністычнай акадэміі, вучоны сакратар Таварыства гісторыкаў-марксістаў. У 1927—30 гг. намеснік рэдактара часопіса «Пролетарская революция», адначасова ў 1926—28 гг. член рэдкалегіі часопіса «Историк-марксист», старшыня Таварыства палітэмігрантаў Заходняй Беларусі. У 1931—36 гг. прэзідэнт АН БССР, з 1936 г. загадчык кафедры гісторыі СССР Маскоўскага універсітэта. Даследчык гісторыі Саветаў і Кастрычніцкай рэвалюцыі, рэдактар перакла

342. *Помнік савецкім лётчыкам*



340. *Петрапаўлаўская царква. План*

340. *Петрапаўлаўская царква*

[illegible] перакладу У. І. Леніна [illegible] беларускую мову. Аўтар прац «Пралетарыят у 1917 г. ў барацьбе за ўладу» (1927 г.), «Табліцы па гісторыі ВКП(б) і рэвалюцыйнага руху ў Расіі [illegible] тыя падзей з 1898 г. па 1917 г.» (з М. [illegible] Самарнікам [illegible]), «М. М. Пакроўскі — бальшавік-гісторык» (1933 [illegible]), «Нарысы па гісторыі [illegible] рабочых [illegible] у 190[illegible] [illegible]. У 1927 [illegible] член ЦК [illegible] і Прэзідыума ЦВК [illegible].

Памёр [illegible] 1951 г. Яго імем названа вуліца ў Бярозе.

Літ.: Акадэмія навук Беларускай ССР. Мн. [illegible]

344. ПОМНІК ЧКАЛАВУ Валерыю Паўлавічу (гіст.). Перад будынкам вакзала. Помнік вядомаму савецкаму лётчыку Герою Савецкага Саюза В. П. Чкалаву ўстаноўлены ў 1957 г.

в. Агароднікі, Сакалоўскі сельсавет

345. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). На будынку школы. Устаноўлена ў 1970 г. у гонар [illegible] атрада Ю. А. [illegible] [illegible] партызан [illegible] М. Сяргеева [illegible] рычніку 1942 г. разграмілі ў вёсцы [illegible]

346. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ [illegible]. У мемарыяльным парку. На ўшанаванне памяці 91 земляка, які загінуў ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Бармуты, Сіпевіцкі сельсавет

347. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны савецкія грамадзяне, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1942 [illegible]. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

348. МАГІЛА ВЯЧОРКІ Марціна Якаўлевіча (гіст.). У цэнтры вёскі.

М. Я. Вячорка нарадзіўся ў 1911 г. ў в. Бармуты ў сялянскай сям'і. Рана стаў на шлях рэвалюцыйнай барацьбы, узначаліў камсамольцаў родных і суседніх вёсак, з'яўляўся сакратаром падпольнай ячэйкі КСМЗБ. Ён распаўсюджваў нелегальную літаратуру, вёў палітычную работу сярод юнакоў, якіх прызывалі у польскае войска. Напярэдадні 1 Мая 1932 г. М. Я. Вячорку арыштавалі і адвезлі у Картуз-Бярозу, дзе ён быў па-зверску закатаваны. Каб схаваць сляды злачынства, было інсцэніравана самагубства, яго труп павесілі на дрэве каля дарогі ва ўрочышчы В[illegible]. Пахаванне камсамольца вылілася у рэвалюцыйную маніфестацыю.

У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Сялеша И. [illegible] Чыю помнят сыны [illegible] — Помнім гісторыі і культуры Беларусі. 1977, № 3; Воткович Г. Б., Короткевич В. Б. Пусть помнят все: Памятники и памятные места [illegible] тельной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. Мн., 1979. *В. Б. Караткевіч*

IV. БЕЛААЗЕРСК

Горад (з 1970 г.), за 27 км на паўночны захад ад Бярозы [illegible], 19 км ад чыгуначнай станцыі [illegible]. [illegible] у 1958 г. як пасёлак у сувязі з будаўніцтвам [illegible] ДРЭС. [illegible] рабочы пасёлак Бярозаўскі, 25.6.1960 г. перайменаваны у Белаазерск.

Генплан горада распрацаваны ў 1975 г. Мінскім філіялам Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва. Мае выразную прамавугольную сістэму планіроўкі. [illegible] забудавана [illegible] жылымі дамамі і грамадскімі будынкамі (Дом гандлю, Дом культуры, камбінат бытавога абслугоўвання [illegible]). [illegible] Бярозаўская ДРЭС, [illegible] [illegible] школы, 4 дашкольныя ўстановы, Дом [illegible] 2 б[illegible] [illegible] лясны масіў. *А. Ю. Пятросава*

349. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У парку [illegible] Пахавана [illegible] партызан [illegible] вайны.

Сав[illegible] бамбардзіровачных авіяцыйных палкоў 130-га скарасных, 207-га і 212-га далёкага дзеяння 22.6.1941 г. нанеслі удары па нямецка-фашысцкіх захопніках у раёне Бяла-Падляскі. У наступныя дні яны [illegible] бамбардзіроўкам [illegible] цей праціўніка, які рухаўся па шашы [illegible] Масква [illegible] Бярозы [illegible] на пераправу цераз р. Ясельда. У [illegible] [illegible] У 1976 г. на брацкай магіле пастаўлена 8-метровая стэла і запалены Вечны агонь. *М. Дз. Скорын*

350. БЯРОЗАЎСКАЯ ДРЭС імя 50-годдзя БССР (гіст., архіт.). Пабудавана ў 1958—67 гг. Магутнасць [illegible] кВт [illegible] ІІНР, з 1965 г. — з Адзінай энергетычнай сістэмай Еўрапейскай часткі СССР, праз энергасістэму [illegible] [illegible] 1971 [illegible]

Асноўныя збудаванні комплексу [illegible] корпус — трохпавярховае прамавугольнае будынак [illegible] най этажэркай памяж машыннай залай [illegible] большая вышыня будынка каля 40 м. Усе [illegible] бетону. Вышыня дымавых труб 180 і

IV. *Забудова вуліцы Леніна.*

349. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан*

1,00 м. Абсталяванне скампанавана па блочнаму прынцыпу: у кожным з 5 блокаў [illegible] праматочныя катлы агрэгаты [illegible] турбіна, турбагенератар [illegible] трансфарматар, водаз [illegible] установка і дэаэратар. [illegible]

Адна з першых блочных электрастанцый у рэспубліцы, узор прамысловай архітэктуры 1960-х гадоў.

А. В. А[illegible]

в. Боркі, цэнтр сельсавета

351. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Ушанаванне памяці 54 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1955 г. пастаўлены абеліск, на ім — пліты з імёнамі загінуўшых.

пасёлак Бронная Гара. Сакалоўскі сельсавет

352. МЕСЦА МАСАВАЙ ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН (гіст.). За [illegible] м на паўночны захад ад пасёлка ва ўрочышчы Бронная Гара.

У маі — чэрвені 1942 г. па загаду гітлераўцаў ва ўрочышчы было выкапана 8 ям даўжынёй 45—60 м, шырынёй 6—6,5 м, глыбінёй 4 м. Цягнікамі [illegible] абрэчаных на смерць людзей з Брэста, Бярозы, Гарадца, Драгічына, Іванава, Кобрына, Пінска на чыгуначную ветку, якая праходзіла каля ям, [illegible] з ямамі магільнымі. Даставілі [illegible] з вагонаў, перавязалі з жан-

чынам, дзецьмі, старымі. Іх прымушалі распранацца, па драўляных кладках гналі да ям, загадвалі класціся радамі і расстрэльвалі з аўтаматаў. Да канца лістапада 1942 г. гітлераўцы загубілі тут больш за 50 тыс. чалавек. Каб замесці сляды сваіх злачынстваў у сакавіку 1944 г. яны прыгналі сюды 100 вязняў, якія 2 тыдні раскопвалі і палілі трупы, а потым самі былі расстраляны і спалены.

У 1978 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашысцкага тэрору пастаўлены абеліск.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. — 2 изд. — Мн., 1965. *М. Дз. Сокарын*

чыгуначная станцыя Бяроза-Картузская, Першамайскі сельсавет

353. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КАМСАМОЛЬЦАМ - ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). На будынку вакзала.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў в. Блудзень (з 1964 г. в. Першамайская) з чэрвеня 1941 г. да ліпеня 1944 г. дзейнічала камсамольскае падполле (кіруючае ядро — С. Н. Руцкі, У. К. Саўчук, В. М. Галеяка). Летам 1943 г. арганізацыя налічвала 21 чалавек. Падпольшчыкі здабывалі і перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, звесткі аб дыслакацыі варожых частак, размяшчэнні ваенных аб'ектаў, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, праводзілі дыверсіі на чыгуначнай станцыі Бяроза-Картузская. Толькі за 1943 г. яны вывелі са строю 13 паравозаў, падпалілі дэпо. Многія патрыёты загінулі ў барацьбе з ворагам, сярод іх В. С., М. С. і С. С. Барушкі, М. С. Жуковіч, М. А. і С. А. Колас, М. Р. Пі-

351. *Помнік [illegible]*

пновіч, А. І. Пінаека, В. І. Пешавіч, М. А. Пепавіч, А. В. Ракевіч, У. К. Саўчук, М. К. Хвядчэня.

У 1967 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Н[illegible] памяти [illegible] Мн., 19[illegible] Рутвіч С. Н. [illegible]

350. *Бярозаўская ДРЭС імя 50-годдзя БССР*

355. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

в. Ваццаныы. Пескаўскі сельсавет

354. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Горск, Малецкі сельсавет

355. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). За 1 км ад вёскі, на 84-м км шашы Брэст — Мінск. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 23.6.1941 г.

На другі дзень вайны 2 палкі 205-й матарызаванай дывізіі 4-й арміі Заходняга фронту блакіравалі непадалёку ад вёскі шашу Брэст — Мінск і 6 гадзін стрымлівалі наступленне праціўніка. У канцы дня, пасля 4 беспаспяховых атак, гітлераўцы абышлі заслон з флангаў. Узнікла пагроза акружэння. На змяркання палкі, па каманды для прыкрыцця падраздзяленне мотастралкоў пад камандаваннем малодшага лейтэнанта М. І. Навікава, адышлі і занялі абарону на р. Ясельда. Дзве гадзіны трымаліся байцы групы прыкрыцця і загінулі ў няроўным баі.

У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск. На надмагільнай пліце высечаны [illegible] М. І. [illegible] [illegible] М. М. [illegible] астатніх [illegible]

[illegible]

в. Зарэчча, Бярозаўскі сельсавет

356. СТАЯНКІ (археал.).

356. *Крамянёвыя прылады працы са стаянак Зарэчча.*

356 а. Стаянка 1. За 1 км на паўночны захад ад вёскі. Разбурана кар'ерам амаль па ўсёй даўжыні (200 м).

356 б. Стаянка-2. [illegible] на захад ад вёскі, на марэнным узгорку на левым беразе р. Ясельда, каля могілак. Выявіў у 1965 г. і даследаваў у 1965 і 1968 г. і 1970 г. У. Ф. Ісаенка. Даўжыня каля 300 м. На месцы стаянкі [illegible] 2 [illegible] [illegible] [illegible] грубыя аўтаваныя [illegible] з нызасцаў, [illegible] бакавых [illegible] [illegible] памераў, скоблі, нажы з рэтушшу, а больш рэдкіх знаходак — ромбавы наканечнік, трохгранны [illegible], прасколка мезалітычнага тыпу, мікраплацёнка з прытупленым краем. Адносяцца да мезаліту і нёманскай культуры неаліту.

356 в. Стаянка 3. За 0,5—1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на схіле марэннага узгорка каля ўсходняга берага р. Ясельда. Даўжыня 280 м. Культурны пласт захаваўся часткова. Выявіў і даследаваў у 1968 г. і 1977 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзена больш за тысячу апрацаваных крамянёвых прылад працы.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. [illegible] Ин-та археологии АН СССР [illegible]

в. Здзітава, цэнтр сельсавета

357. МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС «ЗДЗІТАЎСКАЯ АБАРОНА» (гіст., маст.). У цэнтры вёскі.

У Вялікую Айчынную вайну непадалёку ад вёскі базіраваліся Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б, штаб Брэсцкага партызанскага злучэння, партызанскія фарміраванні. Партызаны наносілі ўдары на чыгуначных камунікацыях, асабліва на лініях Брэст — Баранавічы, Брэст — Лунінец, [illegible] [illegible] нямецка-фашысцкіх войск. Каб засцерагчы свае тылы, у пачатку [illegible] 1944 г. гітлераўцы сцягнулі ў гэты раён атрады войск СС, 10 артылерыйскіх і мі

357. *Мемарыяльны комплекс «Здзітаўская абарона».*

358, 388. *План размяшчэння стаянак Здзітава і Спорава*

памётных батарэй, танкі, бронемашыны, бамбардзіроўшчыкі. З красавіка карнікі пачалі наступаць на пазіцыі партызан з некалькіх напрамкаў. Партызаны і 10 тыс. мірных жыхароў, якія знаходзіліся пад іх аховай апынуліся ў акружэнні. Партызанскія брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага (камандзір В. М. Манахаў, камісар П. Р. Кавалёў), «Савецкая Беларусь» (камандзір М. У. Бабкоў, камісар П. І. Масалоў), 345-ы атрад (камандзір С. А. Яроцкі, камісар В. М. Яроцкі) і атрад імя С. М. Будзённага (камандзір К. Е. Мерзлякоў, камісар П. К. Каламійцаў), які падышоў на дапамогу абаронцам, пад моцным артылерыйскім агнём і бамбардзіроўкай 7 дзён паспяхова адбівалі атакі карнікаў. У партызан канчаліся боепрыпасы. На загаду камандавання яны занялі другую лінію абароны. Гітлераўцы фарсіравалі р. Дарагабуж уварваліся ў вёскі Здзітава і Спорава, але другую лінію абароны штурмаваць не адважыліся.

У 1975 г. да 30-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі па будаваны мемарыяльны комплекс «Здзітаўская абарона» (скульпт. В. Дз. Клименка, арх. В. А. Пак; бетон). Кампазіцыйны цэнтр архітэктурна-скульптурнага ансамбля велізарная фігура партызана (вышыня 6 м) у дынамічным развароце, з узнятымі над галавой магутнымі рукамі (у правай руцэ аўтамат). Пластычнае вырашэнне вызначаецца манументальнасцю формы і выразнасцю сілуэта. У скульптуры увасоблены абагульнены вобраз народа-пераможцы. За галоўным манументам устаноўлена дугападобная ў плане сцяна-стала (вышыня з аднаго боку 2,4 м, з другога — 1,6 м) з барэльефамі, якія адлюстроўваюць эпізоды абароны, аб'яднаныя ў адзіную цэласную кампазіцыю. Справа ад скульптуры трохгранны блок з лаўровым вянком і імёнамі загінуўшых. З боку шашы Бяроза — Драгічын і ад цэнтральнай вуліцы вёскі да мемарыялу вядуць 2 пад'ходы, выкладзеныя бетоннымі плітамі. Пры ўваходзе на цэнтральную алею комплексу пастаўлена стэла з плітамі, на якіх выбіты тэкст, прысвечаны падзеям абароны.

Літ.: В памяти народной.— Мн., 197...; Буг в огне: [Зб. успамінаў]...— Мн., 1977; Сяленя Я. Н. У ...ным Здзітаве // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1976, № 1.

У. С. Пасэ, А. ... Фіктоловіч, В. В. Цярэшчатава.

358. СТАЯНКІ (археал.).

358а. Стаянка-1 (Гарбаў 1). За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на паўднёвым беразе воз. Чорнае. Даўжыня ўздоўж берага каля 300 м. Выявіў у 1910 г. Е. Р. Раманаў, даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі вогнішчаў, абломкі ляпнога посуду, сярод некалькіх соцень крамянёвых прылад сякеры і матыкі. Стаянка датуецца эпохамі неаліту і бронзавага веку, адносіцца да нёманскай, шнуравой керамікі і тшцінецкай культур.

358б. Стаянка-2 (Горбаў 2). За 1 км на поўнач ад вёскі, на левым беразе р. Дарагабуж. Даўжыня ўздоўж берага 120 м. Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзена больш за 300 апрацаваных крамянёў. Адносіцца да неаліту.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Первобытные памятники Полесья.— М., 1962.

У. Ф. Ісаенка.

в. Зубачы, Сялецкі сельсавет

359. КУРГАН СЛАВЫ (гіст.). За 3 км на паўночны захад ад вёскі, за урочышчы Буслаўка.

13.7.1944 г. часці 152-й стралковай дывізіі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту выйшлі да р. Ясельда ў раёне вёсак Зубачы, Сашыца, Сялец і Ясевічы. Пры фарсіраванні ракі разгарнуўся ўпарты бой. Гітлераўцы, якія акапаліся на не правым беразе, загадзя прыстралялі адкрытую балоцістую пойму. Воіны дывізіі пад агнём праціўніка пераправіліся на правы бераг ракі і 15.7.1944 г. выбілі гітлераўцаў з пазіцый. У выніку часці дывізіі вызвалілі шэраг населеных пунктаў Бярозаўскага р-на, г. Пружаны (17.7.1944 г.) і ў складзе войск правага крыла фронту выйшлі да р. Буг на поўнач ад Брэста.

У 1967 г. на ўшанаванне памяці савецкіх воінаў, якія загінулі ў тэтых баях, насыпаны 15-метровы Курган. На яго вяршыні ўстаноўлены 10-метровы штык-абеліск, абліцаваны нержавеючай сталлю. Каля падножжа Кургана ўстаноўлена пліта з памятным надпісам.

Я. В. Сяленя.

в. Капалёва, Боркаўскі сельсавет

360. МАГІЛА САВЕЦКІХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны адзін з першых старшынь Боркаўскага сельсавета Я. А. Качаржынскі, забіты 22.3.1943 г., і савецкія актывісты — бацька і дачка М. Д. і Н. М. Строкі, забітыя 23.7.1943 г. ворагамі Савецкай улады. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

360. *Помнік на магіле савецкіх актывістаў*

в. Малеч, цэнтр сельсавета

361. ЗАБУДОВА ЦЭНТРАЛЬНАЙ СЯДЗІБЫ САЎГАСА ІМЯ 60-ГОДДЗЯ КПБ (архіт.). За 20 км на захад ад Бярозы, 89 км ад Брэста, 10 км ад чыгуначнай станцыі Бяроза-Картузская.

На тэрыторыі саўгаса размешчана 11 вёсак і 59 хутароў. Перспектыўным для развіцця вызначаны цэнтр саўгаса в. Малеч (каля 2 тыс. чалавек) і в. Лукамер (каля 800 чалавек). У 1969—71 гг. інстытут «Белдзіпрасельбуд» распрацаваў праект планіроўкі і забудовы саўгаса (арх. Н. М. Пядзелька, інж. В. М. Хандогін). Забудова цэнтральнай сядзібы вядзецца на паўночны ўсход ад в. Малеч. Архітэктурна-кампазіцыйны цэнтр — плошча, размешчаная на злучэнні 2 галоўных вуліц. Тут узведзены грамадскія будынкі: Палац культуры з залай на 600 месцаў, гандлёвы цэнтр са сталовай, магазінамі, камбінатам бытавога абслугоўвання, гасцініцай. Пабудаваны бальніца, школа. Жылая забудова 2—5-павярховыя дамы. Дамы вырашаны прамавугольнымі у плане аб'ёмамі з плоскімі дахамі, гладкія сцены прарэзаны прамавугольнымі

361. *Забудова цэнтральнай сядзібы саўгаса імя 60-годдзя КПБ*

[illegible] вокнамі і [illegible] ўваходзімі. Будуюцца чатырохкватэрныя дамы, кожная кватэра на 2 узроўнях [illegible] [illegible] [illegible] доўка, на 2-м — 3 спальні і санітарны вузел. Дамы маюць цэнтральнае ацяпленне, водазабеспячэнне, газіфікаваны. У аздобе выкарыстаны сучасныя матэрыялы — дэкаратыўная тынкоўка, абліцовачная кераміка, што стварае гарманічнае колеравае вырашэнне фасадаў.

Цэнтральная сядзіба саўгаса — прыклад сучаснай планіроўкі і забудовы сельскіх пасёлкаў. *В. М. Назаранка.*

362. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка сельсавета. На ўшанаванне памяці 565 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Малыя Ляшковічы, Боркаўскі сельсавет

363. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,5 км на поўнач ад вёскі, у лесе, на могілках. Пахаваны 8 партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Мармажава, Бярозаўскі сельсавет

364. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). [illegible] 7 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе. Пахаваны 7 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі раёна ў Вялікую Айчынную вайну, і 9 мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору.

[illegible] пачатку 1943 г. праз вёску ажыццяўлялася сувязь падпольшчыкаў Бярозы з атрадамі партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Адсюль партызаны атрадаў імя Г. М. Дзімітрова і імя М. Ф. Гастэлы выходзілі на дыверсійныя аперацыі. Гітлераўцы схапілі членаў сямей партызан з в. Мармажава і расстралялі [illegible] на магіле насыпаны курган.

М. Д[illegible]

365. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 16 воінаў і партызан, у т. л. партызаны брыгады імя П. К. Панамарэнкі, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Ліны, Белаазерскі сельсавет

366. МАГІЛА САВЕЦКІХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 5 савецкіх актывістаў, забітых 30.3.1946 г. ворагамі Савецкай улады. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Новыя Пескі, цэнтр Пескаўскага сельсавета

367. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І САВЕЦКАГА АКТЫВІСТА (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 42 воіны і партызаны, у т. л. партызаны брыгад «Савецкая Беларусь», імя Ф. Э. Дзяржынскага і імя Я. М. Свярдлова, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля вёсак Сморава і Новыя Пескі ў Вялікую Айчынную вайну. Пахаваны таксама адзін з арганізатараў калгаса «Новае жыццё» А. А. Барычэўк, забіты ў 1949 г. ворагамі Савецкай улады.

У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

368. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЛУШЧУ Сцяпану Міхайлавічу (гіст.). На будынку школы. Устаноўлена ў 1967 г. на ўшанаванне памяці земляка — члена КПЗБ з 1924 г., удзельніка рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі С. М. Лушча, які быў па[illegible] забіты 25.5.1933 г. польскай дэфензівай.

в. Осаўцы, Парутаўскі сельсавет

369. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля будынка клуба. Пахаваны савецкія разведчыкі [illegible] тар І. К. Колчан і П. У. Мамечка, якія загінулі 12.7.1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

370. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ [illegible] У цэнтры вёскі. Увосень 1942 г. з вёскі [illegible] [illegible] і 73 мірных жыхароў, у т. л. членаў 14 сямей [illegible] [illegible] [illegible]

365. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

372. *Помнік землякам*

ых ко... нага карэзяніст... гара

У 1963 г. ва ўшанаванне памяці ахвяр фашысцкага тэрору пастаўлены ...

в. Нацкрачы, Малецкі сельсавет

371. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 100 воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1944 гг., у т. л. воіны 255-й мотастралковай дывізіі 4-й арміі Заходняга фронту. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

372. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 114 аднавяскоўцаў, ... якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна і партызана і 2 стэлы, на якіх выбіты імёны загінуўшых. Перад помнікам запалены Вечны агонь.

в. Паўлавічы, Малецкі сельсавет

373. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 6 савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 19... г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Першамайская, цэнтр сельсавета

374. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 66 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—44 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля вёсак Жычын і Першамайская. У 1966 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата са схіленым сцягам.

375. МАГІЛА ЯСІНСКАГА В... Герасімавіча (гіст.). На могілках.

Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі В. Г. Ясінскі нарадзіўся 14.1.1901 г. ў в. Першамайская (да 1964 г. в. Блудзень). З сялян. Член КПЗБ з 1924 г. Працаваў рабочым на чыгуначнай станцыі Бяроза-Картузская, служыў у польскай арміі. У 1927 г. за рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны польскімі буржуазнымі ўладамі і зняволены на 2 гады. У 193. г. зноў арыштаваны і засуджаны на 8 гадоў турэмнага зняволення. У ... г. вызвалены па амністыі. У 19..—33 гг. і ў 1936—39 гг. сакратар Бярозаўскага падпольнага райкома КПЗБ. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. В. Г. Ясінскі — начальнік народнай міліцыі, потым на савецкай рабоце ў Бярозаўскім р-не. 3 чэрвеня 1941 г. ў Чырвонай Арміі, у 1946—64 гг. старшыня Першамайскага сельсавета, загадчык аддзела Бярозаўскага райвыканкома, на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Памёр 8.2.1972 г.

У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск. У вёсцы на доме, дзе ... жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

376. РАДЗІМА ДРУЖЧЫЦА В... Данілавіча (гіст.).

Беларускі савецкі гісторык, прафесар (з 1927 г.) В. Д. Дружчыц нарадзіўся 8.2.1886 г. З сялян. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Юр'еўскага універсітэта (г. Тарту) у 1911 г. Працаваў настаўнікам у Літве і на Беларусі. З 1922 г. выкладаў у БДУ, з 1933 г. супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, прафесар гісторыі у Літаратурным інстытуце імя Горкага ў Маскве. Памёр 20.12.1937 г. Даследаваў гісторыю Беларусі эпохі феадалізму, пытанні магдэбургскага права ў гарадах Беларусі, гісторыю беларускага кнігадрукавання. Аўтар прац «Палажэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы пасля Люблінскай уніі» (Працы БДУ, 1925, № 6—7), «Войты і іх улада у беларускіх гаспадарскіх местах з магдэбурскім правам» (Запіскі аддзела гуманітарных навук, 1928, кн. 3), «Места Мінск у канцы XV і пачатку XVI ст.» (Працы БДУ, 1926, № 12), «Беларускія месты у гістарычнай літаратуры» (Гістарычна-археалагічны зборнік, 1927, № 1).

в. Равяцічы, Сігневіцкі сельсавет

377. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. П...

374. *Помнік на брацкай ма... савецкіх воінаў і партызан*

377. *Помнік на брацкай магіле савец-* [illegible]

[illegible] воіны, партызаны і мірныя жыхары, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible]7 г. на магіле [illegible]

в. Сакалова, цэнтр сельсавета

378. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 11 жы[illegible] [illegible] стаўлены абеліск.

379. ЦАРКВА МАЦІ БОСКАЙ [illegible] На [illegible] кай над алтаром. Царква помнік народнага дойлідства.

в. Сашыца, Сялецкі сельсавет

380. МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,3 км на поў[illegible]нач ад вёскі. Пахаваны 60 партызан і мірных жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

381. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СКРОБАТУ Макару Міхайлавічу (гіст.). У цэнтры вёскі на доме, дзе ён жыў. Устаноўлена ў 1976 г. па ўшанаванне памяці ўдзельніка рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, члена КПЗБ з 1924 г., сакратара Сашыцкага падпольнага падрайкома КПЗБ М. М. Скробата.

382. ПОМНІК ЗДАНОВІЧУ Ляvону Раманавічу (гіст.)

Л. Р. Здановіч нарадзіўся ў 1903 г. Член КПЗБ з 1924 г. Першы старшыня Сашыцкага [illegible] У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1942 г. адзін з кіраўнікоў Бярозаўскага падпольнага камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі, у лістападзе 1942 г.— ліпені 1944 г. ў атрадзе імя Г. М. Дзімітрова партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Загінуў у 1945 г. ў барацьбе з ворагамі Савецкай улады.

У 1978 г. на месцы дома, у якім жыў Л. Р. Здановіч, пастаўлена стэла.

383. ПОМНІК ХВЯДЧЭНЮ Івану М[illegible] і **СКРОБАТУ** Макару Міхайлавічу (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі, на магіле І. М. Хвядчэні.

Удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі І. М. Хвядчэня нарадзіўся 8.12.1901 г. у в. Сашыца. Член КПЗБ з 1[illegible] г. У грамадзянскую вайну [illegible] курсы чырвоных камандзіраў. Удзельнічаў у баях супраць войск Дзянікіна, ліквідацыі Кранштацкага антысавецкага мяцяжу, быў цяжка паранены. У 1921 г. вярнуўся на радзіму і ўключыўся ў рэвалюцыйную барацьбу. У 192[illegible] [illegible] польскімі буржуазнымі ўладамі і асуджаны па 4 гады турэмнага зняволення. Пасля выхаду з турмы працаваў сакратаром Сашыцкага падпольнага падрайкома КПЗБ. Па загаду забіты польскай дэфензівай 11.5.19[illegible] г. Сям'ю І. М. Хвядчэні расстралялі нямецка-фашысцкія акупанты ў Вялікую Айчынную вайну. У Бярозе яго імем названа вуліца.

[illegible] Беларусі М. М. Скробат нарадзіўся [illegible] [illegible] 1928 г. вызвалены па амністыі. У маі 1934 г. прыгавораны да 6 гадоў турмы, у студзені 1936 г. амніставаны, у верасні 1939 г. арыштаваны і кінуты ў Бяроза-Картузскі [illegible] рацыйны лагер. У 1933—34 гг. [illegible] 38 гг. [illegible] Сашыцкага [illegible] КПЗБ. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў загадчыкам аддзела Бярозаўскага райвыканкома (1940—41 гг.). У Вялікую Айчынную вайну [illegible] 1941 г. [illegible] Чырвонай Арміі. [illegible] 1942 г. загінуў на фронце. У вёсцы на доме, дзе ён жыў, у 1976 г. [illegible] мемарыяльная дошка.

У 1977 г. на [illegible] помнік І. М. Хвядчэні і М. М. Скробату [illegible] стаўлены абеліск і 2 стэлы з барэльефамі [illegible] С. [illegible] М. Б. [illegible]

383. *Помнік І. М. Хвядчэню і М. М. Скробату.*

384. *Пакроўская царква. Выгляд з боку апсіды.*



384. *Пакроўская царква. План.*

в. Сігневічы, цэнтр сельсавета

384. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У заходняй частцы вёскі. Пабудавана з цэглы ў 1795 г. як касцёл, пасля рэстаўрацыі ў 1848 г. вядома як Пакроўская царква.

Двухвежавы будынак з адпанефавым асноўным аб'ёмам са слаба развітым трансептам і паўцыркульнай апсідай. Бакавыя трансепта аб'яднаны з сакрысціямі ў невысокіх бакавых прыбудовах. Кампазіцыя галоўнага заходняга фасада трохчастковая, двух'ярусная. Цэнтральная частка завершана атыкавым франтонам, бакавыя — масіўнымі вежамі з шатровымі дахамі. Плоскасці фасадаў раскрапаваны пілястрамі і прарэзаны прамавугольнымі вокнамі. Унутры асноўнае зальнае памяшканне злучана арачнымі праёмамі з апсідай і бакавымі трансепта. Над бабінцам размешчаны хоры. Бакавыя сцены раскрапаваны пілястрамі, якія ўверсе злучаны паўцыркульнымі і лучковымі аркамі. Цераакрыццё бэлечнае, з падшыўной столлю.

Царква — помнік архітэктуры з элементамі барока.

Літ.: [illegible]

385. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 46 аднавяскоўцаў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлена стэла.

в. Спорава, Здзітаўскі сельсавет

386. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 14 партызан брыгады «Савецкая Беларусь», якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943—44 гг. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура партызана.

387. МЕСЦА ДЫСЛАКАЦЫІ БРЭСЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА КП(б)Б (гіст.).

У Вялікую Айчынную вайну недалёка ад вёскі, у лясах, у раёне воз. Спораўскае знаходзілася галоўная база Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б, які дзейнічаў з красавіка 1943 г. да вызвалення Брэсцкай вобл. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 г. Сакратары абкома С. І. Сікорскі, І. І. Баброў (загінуў 1.11.1943 г.), члены абкома (з 24.6.1943 г.) В. Ф. Калібераў, С. П. Пацяруха, А. І. Федасюк (да 30.3.1944 г.). Друкаваны орган падпольнага абкома — газета «Заря» (рэдактар В. Ф. Каліберау, выходзіла з мая 1943 г.).

У 1960 г. ў гонар Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б у цэнтры вёскі пастаўлены абеліск.

М. Б. Батвіннік

388. СТАЯНКІ (археал.).

388а. Стаянка-1. На захад ад вёскі, на пясчаных пагорках паўночнага берага воз. Збораўскае. Даўжыня каля 100 м. Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак некалькі дзесяткаў крамянёвых прылад працы. Адносіцца да эпохі неаліту (3-е тысячагоддзе да н. э.).

386. *Помнік на брацкай магіле партызан.*

388б. Стаянка-2. За 2,5—3 км на паўднёвы захад ад вёскі, на паўночна-заходнім беразе воз. Спораўскае, каля фермы. Даўжыня каля 150 м, культурны пласт каля 0,5 м. Выявіў і даследаваў у 1963 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі вогнішчаў, косці жывёл, абломкі ляпных гаршкоў, больш за 50 крамянёвых прылад працы. Стаянка адносіцца да немалкскай культуры.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР. План размяшчэння стаянак гл. ў артыкуле № 358 «Стаянкі».

Літ.: Кухаренко Ю. В. Первобытные памятники Полесья. М., 1962.

У. Ф. Ісаенка

в. Старыя Пескі, Пескаўскі сельсавет

389. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У двары школы. Пахаваны 15 мірных жыхароў вёскі, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1943 г. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

390. ПОМНІК У ГОНАР БЯРОЗАЎСКІХ ПАДПОЛЬНЫХ РАЙКОМАЎ КП(б)Б І ЛКСМБ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На скрыжаванні вуліц Партызанскай і Міру.

У Вялікую Айчынную вайну каля вёскі ў лесе базіраваліся Бярозаўскія падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, рэдакцыя друкаванага органа падпольнага райкома КП(б)Б — газеты «Пламя», партызанскія атрады імя С. М. Будзённага, імя М. І. Калініна, імя В. П. Чкалава, 345-ы і 347-ы Брэсцкага партызанскага злучэння.

Бярозаўскі падпольны райком КП(б)Б дзейнічаў з снежня 1943 г. да ліпеня 1944 г. Сакратары С. А. Яроцкі (да 10.6.1944 г.), В. М. Яроцкі (з 10.6.1944 г.). Падпольны райком КП(б)Б узначальваў камуністычнае падполле, партызанскі рух у раёне, праводзіў палітычную работу сярод насельніцтва. З студзеня 1944 г. выдаваў газету «Пламя», рэдактары А. С. Фацік, П. І. Братанаў.

Бярозаўскі падпольны райком ЛКСМБ дзейнічаў з верасня 1943 г. да ліпеня 1944 г. Сакратары П. К. Каламіцаў, Ф. І. Савін (да 22.11.1943 г.), С. А. Мядаведзь (Мядзведзеў, з 22.11.1943 г.).

Партызанскі атрад імя С. М. Будзённага створаны ў красавіку 1943 г., дзейнічаў асобна. Камандзіры А. Р. Журавеў, К. Г. Мелянеў, камісары Р. Ковалеў, І. Я. Адамевка, П. К. Каламіцаў. 1.8.1944 г. атрад (209 партызан) злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

Партызанскі атрад імя М. І. Калініна створаны ў маі 1943 г. У снежні 1943 г. ўвайшоў у склад партызанскай брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага. Камандзіры П. М. Ковальскі, Ф. К. Ляшчаў, камісар Ф. А. Бяляеў. 12.7.1944 г. ў складзе брыгады злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

Партызанскі атрад імя В. П. Чкалава створаны ў кастрычніку 1941 г. З лістапада 1943 г. ў складзе партызанскай брыгады імя Я. М. Свярдлова. Камандзіры Гарбуз (загінуў), П. Ф. Дружынін, Ю. А. Бярэзчык (загінуў), В. Т. Філінаў (загінуў), Ф. М. Какшараў, П. Л. Губараў, камісары Ю. А. Бярэзчык, П. Ф. Дружынін, Р. А. Дудко, І. Да. Сазонаў, А. І. Сямёнаў. 16.7.1944 г. ў складзе брыгады злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

Партызанскі атрад 345-ы створаны ў маі 1942 г. ў Магілёўскай вобл., дзейнічаў у складзе Клічаўскага аператыўнага цэнтра, у 3-й Бярэзінскай партызанскай брыгадзе, з мая 1943 г. дзейнічаў асобна, з жніўня 1943 г. у Бярэзінскай ваенна-аператыўнай групе. У кастрычніку — снежні 1943 г. зрабіў рэйд у Бярозаўскі р-н і ў студзені 1944 г. ўключаны ў Брэсцкае партызанскае злучэнне. Камандзіры С. А. Яроцкі, В. М. Буры, камісары К. А. Баранаў, В. М. Яроцкі. 12.7.1944 г. атрад (264 партызаны) злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

388. *Крамянёвыя прылады са стаянкі-2.*



392. *Уязная брама сядзібы*



392. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — сядзібны дом; 2 — стайня; 3, 4 — брамы; 5 — бровар*

Партызанскі атрад 347-ы створаны ў маі 1944 г., дзейнічаў асобна. Камандзір А. Дз. Арбузаў, камісар А. Я. Царыкаў. 12.7.1944 г. атрад (112 партызан) злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

392. *Сядзібны дом*

Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгунках, зрывалі варожыя перавозкі, знішчалі баявую тэхніку і жывую сілу, громілі апорныя пункты і гарнізоны праціўніка, ратавалі мірнае насельніцтва ад загубы і вывазу на катаржныя работы ў Германію. Пры атрадах імя М. І. Калініна, 345-м і 347-м былі сямейныя лагеры, працавалі «лясныя» школы.

У 1975 г. ў гонар падпольных райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ і партызан пастаўлена стэла.

Літ.: Залескі А. І. Дарогамі партызанскай Беларусі.— Мн., 1974; Буг в огне [зб. успамінаў]. 3 выд.— Мн., 1977; Ковальский Н. М. В Брестских ... партизан ...

І. І. Дулебін

391. РАДЗІМА ЛЮБАРСКАГА Сцяпана Іванавіча (гіст.).

Генерал-лейтэнант (з 1944 г.) С. І. Любарскі (Сырыська Сцяпан Францавіч) нарадзіўся 27.12.1896 г. ў сялян. Член КПСС з 1919 г. З 1911 г. працаваў на фабрыцы ў Беластоку. З 1915 г. ў арміі. У 1918 г. добраахвотна уступіў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у баях супраць войск Дутава і Калчака, супраць басмачоў у Туркестане. У 1932 г. скончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе, у 1938 г. Акадэмію Генеральнага штаба, працаваў на кафедры гэтай акадэміі. Удзельнічаў у баях супраць японскіх імперыялістаў каля р. Халхін-Гол, вызваленні Заходняй Украіны ... У Вялікую Айчынную вайну на Заходнім, 2-м Беларускім, 4-м і 1-м Украінскіх франтах: намеснік начальніка аператыўнага аддзела штаба фронту, намеснік начальніка, начальнік штаба арміі. Загінуў 16.4.1945 г. пры фарсіраванні р. Нейсе ў Германіі. Пахаваны ў Львове. Яго імем названа вуліца ў Бярозе.

У 1980 г. ў цэнтры вёскі па ўшанаванне памяці С. І. Любарскага пастаўлена стэла.

М. Б. Батвіннік

392. СЯДЗІБА (архіт.). На паўночным беразе воз. Чорнае.

Свабодна сплапаваны ансамбль уключае мураваны сядзібны дом на пакатым узгорку, 2 брамы, бровар, іншыя гаспадарчыя пабудовы. Перад домам — пейзажны парк і возера. У канцы 18 ст. пры палацы (не збярогся) пабудавана стайня, якая ў 1-й палавіне 19 ст. перароблена пад сядзібны дом. Цяпер размешчана медыцынская ўстанова.



392. *Сядзібны дом. План.*

393. *Троіцкая царква.*

393. *Троіцкая царква. План*

Дом прамавугольны ў плане, аднапавярховы, накрыты вальмавым дахам. Асноўны архітэктурна-кампазіцыйны акцэнт будынка — чатырохкалонны порцік у цэнтры галоўнага паўднёвага фасада. Плоскасці сцен рытмічна расчлянёны вялікімі прамавугольнымі вокнамі з простымі драўлянымі ліштвамі. Унутраная планіроўка дома заснавана па калідорнай сістэме. У заходнім тарцы будынка невялікая зала. Акрамя жылых пакояў, у доме былі кухня, сталовая, капліца і шэраг службовых памяшканняў. Два памяшканні маюць крыжовыя скляпенні. Пачатковая аздоба інтэр'ераў не захавалася. Дзве мураваныя брамы (уезд з вёскі і непасрэдна ў сядзібу) вырашаны ў псеўдаготычным стылі, фланкіраваны вежамі, маюць стральчатыя арачныя праёмы з зубчастымі завяршэннямі. Сцены упрыгожаны рэльефнымі паяскамі, нішкамі, крыжамі, гербамі, геаметрычным арнаментам.

Сядзіба — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры, у якім рысы класіцызму спалучаюцца з элементамі готыкі.

... М. Кь...

393. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1827 г. з дрэва.

Аднazрубная, накрыта двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай. На галоўным фасадзе дах эрэзаны чацверыковай вежай-званіцай з васьмігранным шатром. У цэнтры асноўнага аб-



396. *Царква Іаана Багаслова. Фрагмент ...*

му цыбуленападобная макаўка на васьмігранным барабане.
Царква — помнік архітэктуры класіцызму.

в. Стрыгінь, цэнтр сельсавета

394. МАГІЛА ПЯТРОВА Антона Васілевіча (гіст.). На могілках. Намеснік камандзіра эскадрыллі 96-га бамбардзіровачнага авіяпалка А. В. Пятроў загінуў 24.6.1941 г. ў паветраным баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 19.. г. на магіле пастаўлены абеліск.

395. ПОМНІК КІРАВУ Сяргею Міронавічу (гіст.). Каля Дома культуры. Помнік С. М. Кірава пастаўлены ў 1967 г.

396. ЦАРКВА ІААНА БАГАСЛОВА (архіт.). На могілках. Пабудавана ў 18.7 г. з дрэва ... зрубная, з трохграннай апсідай і невялікім тамбурам. Асноўны аб'ём завяршае чатырохгранная вежачка з макаўкай. Побач з царквой — званіца на 2 слупах, накрытая вальмавым дахам. Царква — помнік народнага дойлідства.



396. *Царква Іаана Багаслова. План.*

в. Сялец, цэнтр сельсавета

397. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 127 воінаў, у т. л. воіны 174-га стралковага палка, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні Бярозаўскага р-на ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1..5 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам.

398. КАСЦЁЛ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы. Трохнефавая базіліка сіметрычна восевай кампазіцыі. У сілуэце будынка дамінуе трох'ярусная шатровая вежа. У архітэктуры выкарыстаны гатычныя формы — стральчатыя вокны і нішы, контрфорсы. Касцёл — помнік архітэктуры неаготыкі.

399. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). На будынку клуба.
За 5—6 км на поўнач і паўночны захад ад вёскі, ва урочышчы Гута Міхалін у Вялікую Айчынную вайну дыслацыраваўся партызанскі атрад імя М. Ф. Гастэлы (камандзіры Р. Кандрацьеў, А. Дз. Маскоў, М. А. Чакін, камісар Ц. І. Саўчанка) брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Ва ўрочышчах Цемпы, Груд і Стублы размяшчаліся сямейныя лагеры.

397. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

У 1967 г. у гонар партызан устаноўлена мемарыяльная дошка.

400. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі, на плошчы. Пабудавана ў 1870 г. з цэглы.
Кампазіцыя плана падоўжана восевая, чатырохчастковая: тамбур, бабінец, алтар памяшканне з бакавымі парталамі і пяцігранная апсіда з бакавымі прыбудовамі. У сілуэце царквы дамінуюць шатровая званіца і асноўны аб'ём, завершаны чатырохсхільным дахам з цыбуленападобнай галоўкай на васьмерыковым барабане. Асаблівасцю архітэктуры з'яўляецца

396. *Царква Іаана Багаслова са званіцай.*

398. *Кас[illegible]*

400. *Успенская царква. Бакавы фасад*



400. *Успенская царква. План*

Герой Савецкага Саюза І. І. Валасевіч нарадзіўся 18.8.1909 г. З сялян. Член КПСС з 1929 г. З 1931 г. ў Чырвонай Арміі. У 1932 г. скончыў школу пілотаў імя А. Ф. Мяснікова. Служыў на Чарнаморскім і Балтыйскім флатах. [illegible] камісар авіяэскадрыллі І. І. [illegible] вызначыўся ў савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг. Зрабіў 69 баявых вылетаў, збіў адзін самалёт, знішчыў 7 зенітных [illegible]



398. *Касцёл. План*

спалучэнне разнастайных форм дэкору: пілястраў, [illegible] арак [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]

в. Ціхны, Пераламанскі сельсавет

401. РАДЗІМА ВАЛАСЕВІЧА Івана [illegible] (гіст.).



402. *Мікалаеўская царква. План*

402. *Мікалаеўская царква са званіцай*

заметных кроніх працаўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 21.4.1940 г. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце, ваяваў пад Ленінградам. Збіў некалькі варожых самалётаў. 29.9.1941 г. загінуў у баі.

У 1975 г. на доме, дзе нарадзіўся І. І. Валасевіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Чарнакава. Боркаўскі сельсавет

402. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (арх. т.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1825 г. з дрэва як касцёл. У 1864 г. ашалявана і пакрыта гонтай. У 1868 г. зроблены іканастас і прыбудаваны тамбур. З гэтага часу вядома як Мікалаеўская царква.

Да прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму прылягае бабінец, а з усходу — пяцігранная апсіда з прыбудовамі. Усе часткі аб'яднаны двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай. Дах утварае навес у месцах злучэння зрубаў і па баках бабінца. У цэнтры даху — васьмігранны барабан з галоўкай. Галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам з шырокім сцёсам. Інтэр'ер залы, перакрыцце бэлечнае. У верхняй частцы бабінца размешчаны хоры. З захаду каля царквы стаіць двух'ярусная каркасная званіца (чацверык на чацверыку). Сцены ніжняга яруса вертыкальна ашаляваны, завершаны гонтавым сцёсам. Верхні ярус складаецца з дашчанага парапета і калонак, якія падтрымліваюць пакаты шатровы дах.

Царква — помнік традыцыйнага драўлянага дойлідства. *М. С. К*[illegible]



403. Помнік на вайсковых могілках

в. Шылін, Углянскі сельсавет

403. ВАЙСКОВЫЯ МОГІЛКІ (гіст.). За 1 км на ўсход ад вёскі. У 18 брацкіх магілах пахаваны 8 афіцэраў, 177 сяржантаў і салдат 20-й стралковай дывізіі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні Бярозаўскага р-на ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Магілы размешчаны ўздоўж алеі, устаноўлены надмагільныя пліты. У 1966 г. ў цэнтры могілак пастаўлены абеліск.

Літ.: Салевя Я. В. Пад шхай Я. ельдай // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1972, № 3. *М. А. Багушэвіч*

ГАНЦАВІЦКІ РАЁН

V. ГАНЦАВІЧЫ

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны на р. Цна, за 250 км на паўночны ўсход ад Брэста. Чыгуначная станцыя на лініі Лунінец — Баранавічы.

У 2-й палавіне 19 ст. невялікая вёска Слуцкага павета Мінскай губерні, уладанне мясцовага памешчыка графа С. Чапскага. У 1857 г. налічвала [illegible] у 1897 г.— [illegible] што абумовіла перарастанне невялікай вёскі ў мястэчка. У канцы 19 — пачатку 20 ст. працавалі [illegible] прамыслоўцаў В. Краеўскага і І. Столя, дзе выраблялася аконнае, люстранное і высокагатунковае богемскае шкло. У 1909 г. са станцыі Ганцавічы было адпраўлена 45 273 пуды шкляных вырабаў. У 1909 г. ў мястэчку 157 двароў і 1026 жыхароў. У час Рэвалюцыі 1905—07 гг. Лідская арганізацыя РСДРП пасылала ў Ганцавічы сваіх агітатараў і нелегальную літаратуру.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1918 г. Ганцавічы акупіраваны нямецкімі, у 1919—20 гг.— польскімі войскамі. З 1921 г. Ганцавічы ў складзе буржуазнай Польшчы, мястэчка Лунінецкага павета Палескага ваяводства. У сакавіку — красавіку 1933 г. адбылася забастоўка [illegible] рабочых лесу. Барацьбу [illegible] сацыяльнае і нацыянальнае [illegible] група КПЗБ. У 1935 г.— 2300 жыхароў.

З 1939 г. Ганцавічы ў складзе БССР, з 1940 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна Піскай вобл.

У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. да 7.7.1944 г. Ганцавічы акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На тэрыторыі раёна з канца 1942 г. да 7.7.1944 г. дзейнічаў Ганцавіцкі падпольны райком КП(б)Б, з мая 1943 г. да 7.7.1944 г.— падпольны райком ЛКСМБ.

З 1954 г. Ганцавічы — цэнтр раёна ў Брэсцкай вобл. У 1959 г.— 3,5 тыс. жыхароў. У 1962—66 гг. уваходзілі ў Ляхавіцкі р-н. З 1966 г. [illegible] г. горад.

У 197[illegible] г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва створаны генплан Ганцавіч, у якім удакладнена схема планіроўкі 1967 г. У 1978 г. ў Беларускім навукова-даследчым і праектным інстытуце горадабудаўніцтва распрацаваны праект [illegible] планіроўкі цэнтральнай часткі горада.

Горад падзелены чыгункай на 2 планіровачныя раёны — заходні (раён асноўнага капітальнага будаўніцтва) і ўсходні. На скрыжаванні галоўнай вул. Кастрычніцкай — восевай магістралі заходняга планіровачнага раёна — і вул. Гагарына склалася цэнтральная плошча горада. Яе фарміруюць 3—5-павярховыя жылыя дамы і грамадскія будынкі: Дом Саветаў, Дом культуры, Дом быту, Дом сувязі, кінатэатр, гасцініца, рэстаран. На вул. Мантажнікаў сфарміраваўся сучасны жылы мікрараён з [illegible] павярховымі дамамі.

V. *Забудова вуліцы Кастрычніцкай. Фрагменты.*

Прамысловасць сканцэнтравана ў паўднёвай частцы заходняга планіровачнага раёна. Тут знаходзяцца заводы буйнапанельнага домабудавання і дрэваапрацоўчы, сельскі будаўнічы камбінат. Ва ўсходняй частцы пабудаваны эксперыментальны кансервава-агародніннасушыльны камбінат. У горадзе працуюць хлебазавод, маслазавод, прамкамбінат. Ёсць рабочае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі, лесгаспрамгас, лясгас, метэастанцыя.

У Ганцавічах 3 сярэднія, 2 вячэрнія школы з вочнай і завочнай формамі навучання, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізацыі меліярацыйных работ, Дом культуры, Дом піянераў і школьнікаў, кінатэатр, 5 бібліятэк, 6 дзіцячых дашкольных устаноў, бальніца. Выдаецца газета «Савецкае Палессе».

Устаноўлены помнікі: У. І. Леніну, на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, работнікам леспрамгаса, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, насыпаны Курган Славы ва

V. *Цэнтральная плошча.*

404. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

[illegible] зона [illegible] размешчана на [illegible] у хваёвым бары на р. Цна і ва ўрочышчы [illegible] ад горада.

Літ.: Жучкевич В. А., Малышев А. Я., Рогозин Н. Е. Города и села [illegible] ССР [illegible]

[illegible] N. Przewodnik po Litwie i Białejrusi. 3 wyd. Wilno, b. a.; Kalendarz ziem wschodnich na rok 1936.— Warszawa, 1935.

У. В. Алсейчык, В. Б. Караткевіч.

404. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На цэнтральнай плошчы. Пахаваны 88 воінаў і 99 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг.

Сярод пахаваных — экіпаж савецкага бамбардзіроўшчыка 39-га скараснога бамбардзіровачнага авіяпалка Заходняга фронту, які загінуў на 3-і дзень вайны ў паветраным баі над в. Люсіна. У брацкай магіле сярод пахаваных партызан 39 з брыгад імя П. К. Панамарэнкі, імя У. І. Леніна, 12-й кавалерыйскай імя І. В. Сталіна, якія загінулі ў 1943—44 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Агарэвіцкага, Любашаўскага, Малькавіцкага, Пінскага [illegible] Сярод пахаваных [illegible] 8 [illegible] механізаванай брыгады 1-га механізаванага корпуса 1-га Беларускага фронту, якая ў ліпені 1944 г. наступала ў напрамку Ганцавіч.

У 19[illegible] г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптуры 2 воінаў і пліта з імёнамі загінуўшых.

В. Б. Караткевіч.

405. КУРГАН СЛАВЫ (гіст.). На паўднёвай [illegible] ваннe памяці 8 тыс. жыхароў раёна, загубленых нямецка-фашысцкімі акупантамі, і 8,5 [тыс.] землякоў — воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні [illegible]

406. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны [illegible] жыхары, расстраляныя ў 1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1964 г. устаноўлена надмагілле.

407. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Вул. Чыгуначная, у скверы леспрамгаса. На ўшанаванне памяці 11 работнікаў леспрамгаса, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

408. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры горада, у парку. Скульптурная фігура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1957 г.

в. Агарэвічы, цэнтр сельсавета

409. КУРГАН (археал.). За 3 км на У ад вёскі, ва ўрочышчы Юлін. Вышыня 1,5 м, дыяметр 12 м, паўсферычнай формы, мае кальцавую канаўку, запоўненую попелам і вуголлем. Абследаваў у 1981 г. М. Ф. Гурын. [illegible] Б. В. Міралюбаў, раскопваў у 1955 г. Б. В. Міралюбаў і Ю. У. Кухарэнка (3 курганы). Курган датуецца 11 ст., належаў дрыгавічам.

Ма[illegible] Беларускім дзяржаўным музеі сам[illegible] дзейнасці[illegible] Пінску.

410. ПОМНІК САВЕЦКІМ ВОІНАМ І ПАРТЫЗАНАМ [illegible] воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. устаноўлена стэла з гарэльефам выявай салдата (скульпт. Я. А. Шупікоў).

411. СЯДЗІБА [illegible]

405. *Курган Славы.*

409. *Курган.*

2-й палавіне 19 ст., у 1911 г. дабудоўвалася. Цяпер тут дзіцячая ўстанова.

Комплекс уключае драўляны дом, мураваныя стайню і гумно. Вакол іх парк з пладовым садам і сажалкамі. Планіроўка ансамбля ўпарадкавана прамавугольнай сеткай алей, адна з якіх відаць ад уяўной двухкалоннай брамы да ганка парадкага ўвахода ў дом.

Сядзібны дом аднапавярховы, Г-падобны ў плане, з паўратондавай прыбудовай, накрыты двухсхільным дахам, закругленым з усходняга і паўвальмавым з заходняга бакоў і дэкарыраваным разнымі дахавымі вокнамі. Чатырохслуповы ганак завершаны двухсхільным дахам з трохвугольным франтонам. Фасады рытмічна падзелены прамавугольнымі аконнымі праёмамі і дэкарыраваны [illegible] палоскамі з выключэннем фрыза і цокаля. Планіроўка сядзібнага дома заснавана на анфіладнай [illegible] розпаведзеных памяшканняў вакол 2 вестыбюляў. У некаторых памяшканнях захаваліся рэшткі роспісу сцен і плафонаў.

Гаспадарчыя пабудовы — прамавугольныя ў плане аднапавярховыя

411. *Сядзібны дом*

аб'ёмы пад двухсхільным дахам. Іх архітэктурная [illegible] лапаткі, [illegible] кантраставымі [illegible] фоне муроўкі.

[illegible] традыцыйнай [illegible] дзіба паркавай архітэктуры Беларусі [illegible]



411. *Сядзібны дом. План*

411. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — сядзібны дом; 2 — гумно; 3 — стайня*

410. *Помнік савецкім воінам і партызанам*

в. Боркі. Любанаўскі сельсавет

412. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 14 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і 43 жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1942 гг. У 1967 г. насыпаны курган, на яго вяршыні пастаўлены абеліск.

в. Будча, Чудзінскі сельсавет

413. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 62 аднавяскоўцаў — воінаў Чырвонай Арміі, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1960 г. пастаўлены абеліск, у 1962 г. — скульптура воіна.

414. ЮРЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1896 г. з дрэва. Пяцізрубная, крыжападобная ў плане, мае цэнтрычна-восевую кампазіцыю. Да цэнтральнага квадратнага ў плане зруба, завершанага васьміграннымі барабанам з высокім шатром, далучаюцца 4 прамавугольныя аднолькавыя па памерах аб'ёмы бабінцаў і апсіды, пакрытыя двухсхільнымі дахамі. Перад 3 уваходамі

411. *Куток парку*

гапкі з навісамі. Сцены гарызантальна ашаляваны дошкамі і аздоблены дэкорам (разныя дошкі франтона, паяскі, накладныя элементы). У інтэр'еры асноўнае памяшканне злучана з іншымі шырокімі праёмамі з касымі зрэзамі ў верхніх вуглах.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства. *А. А. М[illegible]*

в. Востраў, Пацкі сельсавет

415. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі, каля будынка праўлення калгаса «Парыжская камуна». На ўшанаванне памяці 57 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1973 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Вялікія Круговічы, Агаровіцкі сельсавет

416. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 2 воіны і 2 партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

417. ГЕОРГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў канцы 19 ст. з дрэва. Двухзрубная пабудова з трохграннай апсідай і бакавымі прыбудоўкамі. У праставай кампазіцыі мінуе высокі васьмігранны барабан са шлемападобным завяршэннем. У дэкаратыўнай аздобе выкарыстаны разныя дэталі, ліштвы арачных акон[illegible] праёмаў. Перад царквой пастаўлена званіца. Царква — помнік драўлянага дойлідства.

418. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 75 ацэвіскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены абеліск.

в. Ганцавічы, Любашаўскі сельсавет

419. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, насупраць будынка праўлення калгаса «Рассвет». На ўшанаванне памяці 35 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1973 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна і партызанкі.

в. Дзяніскавічы, цэнтр сельсавета

420. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля Дома культуры. Пахаваны партызаны брыгад імя У. І. Леніна, імя П. К. Панамарэнкі, 12-й кавалерыйскай імя І. В. Сталіна, якія загінулі ў лютым 1944 г. пры разгроме варожага гарнізона ў вёсцы. Партызаны спалілі лесазавод, дэпо з рамонтнымі майстэрнямі, 4 паравозы для вузкакалейкі. Пахаваны таксама воіны 19-й механізаванай брыгады 1-га механізаванага корпуса 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1957 г. на магіле 11 воінаў і партызан пастаўлены помнік — скульптура воіна.

[illegible] упоминания в статьи о [illegible] партизанском движении в Белоруссии в годы [illegible]

421. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.).

421а. Могільнік-1 (мясцовыя назвы Капцы, Шведскія магілы). За 4 км ад вёскі, справа ад дарогі на в. Пач[illegible]. Больш за 20 насыпаў вышынёй 1,2—2 м, дыяметрам 8—18 м. Круглыя ў плане курганы паўсферычнай формы [illegible] у 1924 г. [illegible] П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся. Па знешніх адзнаках і па падабенству з суседнім Нявiнецкім могільнікам можна было датаваць як пахаванні дрыгавічоў 11—13 стагоддзяў.

421б. Могільнік-2. За 5 км ад вёскі, справа ад дарогі на в. Вялікія Круговічы, ва ўрочышчы Смалярня. 8 курганоў вышынёй 0,8—3 м, дыяметрам 7—10 м. Круглыя ў плане курганы паўсферычнай формы. Абследавалі ў 1935 г. П. Ф. Лысенка, у 1981 г. М. Ф. Гурын. Раскопкі не праводзіліся.

414. *Юр'еўская царква.*



414. *Юр'еўская царква. План.*

421в. Могільнік-3 (мясцовая назва Шведскія капцы). За 3 км на паўночны ўсход ад вёскі, 1,5 км на поўдзень ад дарогі Вялікія Круговічы — Будча, ва ўрочышчы Варацец. 9 насыпаў вышынёй 1—2,5 м, дыяметрам 7—15 м. Курганы паўсферычнай формы. Выявіў і абследаваў у 1981 г. М. Ф. Гурын. Раскопкі не праводзіліся.

П. Ф. Лысенка, М. Ф. Гурын.

422. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры, у скверы. На ўшанаванне памяці 150 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1964 г. насыпаны курган, на яго вяршыні пастаўлены абеліск.

в. Дубнікі, Агарэвіцкі сельсавет

423. МАГІЛА ПАРТЫЗАНА (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Партызан загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Прозвішча невядома. На магіле пастаўлены абеліск.

в. Задуб'е, Малькавіцкі сельсавет

424. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 61 аднавяскоўца, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і закатаваны гітлераўцамі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Красынічы, Агарэвіцкі сельсавет

425. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). За 7 км ад вёскі, ва ўрочышчы Чмелічча. Пахаваны партызаны брыгады імя У. І. Леніна В. П. Засмовіч і У. М. Уласовіч, якія загінулі тут у 1943 г. ў няроўным баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. ўстаноўлена надмагілле.

в. Кукава, Агарэвіцкі сельсавет

426. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст., маст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 14 савецкіх актывістаў — жыхароў в. Перадзелы, расстраляных гітлераўцамі 10.8.1941 г., і жыхароў в. Кукава (больш за 50 чалавек) — воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1975 г. пастаўлены помнік (скульпт. М. Ц. Палякоў; бетон; вышыня скульптуры 5 м, пастамента 1,7 м). На насыпным кургане скульптурная кампазіцыя: салдат і партызан са зброяй у руках на чатырохгранным пастаменце, на фасаднай плоскасці якога — 2 пліты з імёнамі загінуўшых. Помнік абгароджаны жалезнымі ланцугамі на невысокіх слупах.

В. Б. Каратыгін, В. В. [illegible]

в. Ліпск, Малькавіцкі сельсавет

427. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 47 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1960 г. пастаўлены абеліск.

в. Любашава, цэнтр сельсавета

428. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 40 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1973 г. пастаўлены помнік [illegible].

в. Люсіна, цэнтр сельсавета

429. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЯКУБУ КОЛАСУ (гіст.). У 1902—04 гг. у вёсцы жыў і працаваў настаўнікам Я. Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч), класік беларускай літаратуры, народны паэт БССР (1926 г.), акадэмік АН БССР (1928 г.), заслужаны дзеяч навукі БССР (1944 г.).

Я. Колас прыехаў у Люсіна пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Яго глыбока ўразіла беспрасветнае жыццё палешукоў. Малады настаўнік клапаціўся, каб усе дзеці наведвалі школу, наладжваў лекцыі для сялян. У Люсіне Я. Колас пачаў пісаць першую частку трылогіі «На ростанях» — аўтабіяграфічную аповесць «У палескай глушы», дзе паказаў жыццё сялян гэтай вёскі (у аповесці — в. Цельшына).

У 1966 г. на будынку сярэдняй школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Міраччыцкі Л. П. З незабыўных дарог. — Мн., 1961; Народны настаўнік Якуб Колас: Зб. артыкулаў. — Мн., 1966.

430. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 99 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. на-

426. *Помнік землякам*

сыпаны курган, на яго вяршыні пастаўлены абеліск.

в. Макава, Люсінскі сельсавет

431. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 3 партызаны брыгады імя У. І. Леніна Пінскага партызанскага злучэння, якія загінулі 9 мая 1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля чыгуначнай станцыі Люсіна. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

421. *Курганны могільнік [illegible]*

432. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 2 партызаны, якія загінулі ў 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Малыя Круговічы, Агаровіцкі сельсавет

433. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.)

433а. Могільнік-1. За 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі,ва ўрочышчы Матукоўшчына. 12 курганоў вышынёй 1—2,3 м, дыяметрам 8—18 м, паўсферычнай формы, здзірванелыя, добра захаваліся. Выявіў у 1929 г. С. Пшэворскі, абследавалі ў 1955 г. Ю. У. Кухарэнка і Б. В. Міралюбаў, у 1965 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

433б. Могільнік-2 (мясцовая назва Шведскія капцы). За 2 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Баркі. 27 курганоў вышынёй 0,7—2 м, дыяметрам 5—12 м, круглыя ў плане, паўсферычнай формы. Выявіў у 1929 г. С. Пшэворскі, даследавалі ў 1955 г. Ю. У. Кухарэнка і Б. В. Міралюбаў (імі раскапаны 3 курганы), абследавалі ў 1965 г. П. Ф. Лысенка, у 1970 г. В. Б. Караткевіч, у 1981 г. М. Ф. Гурын. Знойдзены гліняны посуд, зроблены на ганчарным крузе, жалезныя абручы і дужка ад вядра. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Могільнік належаў славянскім плямёнам 11—13 стагоддзяў. Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся ў Пінску.

433в. Могільнік-3. За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Бараціна. 18 насыпаў вышынёй 0,5—1,5 м, дыяметрам 6—12 м, паўсферычнай формы. Выявіў у 1929 г. С. Пшэворскі, абследаваў у 1981 г. М. Ф. Гурын. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. [illegible] Przew[illegible] St. Zbiorzeck[illegible] Światowit. 1929. t. 13.

М. Ф. Гурын, П. Ф. Лысенка.

в. Малькавічы, цэнтр сельсавета

434. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1 км ад вёскі, па дарозе на в. Лыск, ва ўрочышчы Гра[illegible]. [illegible] насыпаў вышынёй да 0,5 м, дыяметрам 6—8 м, маюць кальцавыя канаўкі. Выявіў Ю. У. Кухарэнка ў 1960 г. У 1956 г. быў разараны адзін курган [illegible] зямлі [illegible] знойдзены [illegible] кальцы [illegible] эмалі [illegible] бранзалеты, [illegible] 2 [illegible] Помнік [illegible] 10—13 стагоддзям [illegible] дрыгавічам. [illegible] зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

435. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Мясцовая назва Капцы. За 8 км на ПдУ ад вёскі, у лесе [illegible] насыпы вышынёй 0,5—1 м, дыяметрам 7—[illegible] м. Курганы круглыя ў плане, паўсферычнай формы. Выявіў і абследаваў у 1981 г. М. Ф. Гурын. Раскопкі не праводзіліся.

436. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля чыгуначнай станцыі. Пахаваны савецкія актывісты Малькавіцкага сельсавета А. Ф. [illegible], А. Ф. [illegible], М. Ф. [illegible], А. [illegible] Мыс[illegible], М. [illegible], [illegible] Якубук, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія акупанты 10.8.1941 г. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

437. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). [illegible] На ўшанаванне памяці 38 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 19[illegible] г. пастаўлены абеліск.

в. Нач, цэнтр сельсавета

438. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Праўда». На ўшанаванне памяці [illegible] вёсак [illegible] воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

в. Раздзялавічы, Хатыніцкі сельсавет

439. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). За [illegible] км на паўночны ўсход ад вёскі. Пахаваны 4 лётчыкі, якія загінулі ў паветраным баі з гітлераўцамі ў 1941 г. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

440. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1,5 км на поўнач ад вёскі, каля дарогі на Выганаўскае возера. Пахаваны 2 воіны і 5 мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Хатынічы, цэнтр сельсавета

441. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 18 воінаў Чырвонай Арміі і 3 партызаны, якія загінулі ў пачатку ліпеня 1944 г. пры вызваленні вёсак Раздзялавічы і Хатынічы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Чудзін, цэнтр сельсавета

442. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 6 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. устаноўлена надмагілле.

443. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 4 км на поўдзень ад вёскі, каля дарогі на в. Вялікія Чучавічы Лунінецкага р-на. Пахаваны 10 вясковых актывістаў, у т. л. старшыня калгаса Ф. А. Захарчэня, якіх на гэтым месцы ў 1941 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1967 г. на магіле насыпаны курган, каля яго падножжа пастаўлены абеліск, на якім высечаны імёны загінуўшых.

444. МЕСЦА БАЗІРАВАННЯ ГАНЦАВІЦКІХ ПАДПОЛЬНЫХ РАЙКОМАЎ КП(б)Б І ЛКСМБ, ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА (гіст.).

447. Юр'еўская царква. План

447. Юр'еўская царква са званіцай

У навакольных лясах у Вялікую Айчынную вайну базіраваліся Ганцавіцкія падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанская брыгада імя У. І. Леніна.

Ганцавіцкі падпольны райком КП(б)Б створаны ў канцы 1942 г., дзейнічаў да 7.7.1944 г. Сакратары М. М. Бандарэнка (да 17.2.1943 г., загінуў), М. С. Бяляй (з 16.7.1943 г.).

Ганцавіцкі падпольны райком ЛКСМБ дзейнічаў з мая 1943 г. да 7.7.1944 г. Сакратары Я. П. Узнюк, А. А. Замяцін (сакратар па прапагандзе).

Партызанская брыгада імя У. І. Леніна створана ў красавіку 1943 г. Камандзір В. А. Васільеў, камісар І. В. Зібараў. Народныя мсціўцы наносілі удары па чыгуначных камунікацыях праціўніка на ўчастках Баранавічы — Лунінец, Баранавічы — Івацэвічы, Пінск — Жыткавічы, праводзілі баявыя дзеянні на шашэйных і грунтавых дарогах. Толькі ў ноч на 3.8.1943 г. ў аперацыі «Рэйкавая вайна» на чыгуначным участку Баранавічы — Лунінец яны пашкодзілі больш за 1,9 тыс. рэек, у выніку рух быў спынены на 14 сутак. Усяго пусцілі пад адхон 110 чыгуначных эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка, падарвалі больш за 7 тыс. рэек, 15 чыгуначных мастоў, знішчылі каля 40 км тэлефонна-тэлеграфнай лініі, 26 гітлераўскіх гаспадарак, разграмілі варожыя гарнізоны ў вёсках Дзяніскавічы і Чудзін Ганцавіцкага р-на і інш. У студзені 1944 г. брыгада вяла баі з карнікамі каля в. Дзятлавічы, Малыя і Вялікія Чучавічы Лунінецкага р-на, Малькавічы Ганцавіцкага р-на. 7.7.1944 г. брыгада (1067 партызан) злучылася з часцямі Чырвонай Арміі і разам з імі ўдзельнічала ў вызваленні Лунінецкага р-на.

У 1977 г. на будынку Чудзінскага сельсавета ў гонар падпольных райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ і партызанскай брыгады ўстаноўлена мемарыяльная дошка. *Г. І. Дз...*



448. Рэчы з курганнага могільніка Ясянец.

445. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Ва ўшанаванне памяці 38 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1971 г. устаноўлены помнік — двухфігурная скульптурная кампазіцыя.

446. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1962 г.

447. ЮР'ЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На могілках. Пабудавана ў 1877 г. з дрэва. Аднаабрубны аб'ём з трохгранным алтарным часткай накрыты двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром. На галоўным фасадзе трохвугольны франтон. Пры ўваходзе — невялікі тамбур з ганкам з 2 калонкамі. Побач з царквой драўляная званіца з шатровым дахам. Царква — помнік народнага дойлідства Палесся. *Т. В. Габрусь*

в. Ясянец, Ляцкі сельсавет

448. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На поўдзень ад вёскі, у лесе, абапал дарогі на в. Вялікія Круговічы, на працягу 1,5—2 км уздоўж і ў асобных месцах збоку ад яе. Больш за 100 насыпаў размешчаны асобнымі групамі па 15—30 курганоў. У плане пераважна круглыя, паўсферычныя, трапляюцца блізкія да квадрата са зрэзанымі вугламі. Вышыня 0,8—1,5 м, асобных курганоў 2,2—2,5 м, дыяметр 7—15 м. Зарослыя лесам і хмызняком, здзірванелыя. Некаторыя пашкоджаны. Выявіў і раскапаў 3 курганы Б. В. Міралюбаў у 1955 г., у 1961 г. П. Ф. Лысенка раскапаў яшчэ 9. Пахавальны абрад — трупапалажэнне (трапляецца трупаспаленне) на спіне галавой на захад на ўзроўні рытуальнага вогнішча або ў неглыбокіх ямах (0,2—0,6 м). У некаторых пахаваннях выяўлены сляды спарахнелага дрэва (магчыма, рэшткі дамавін), у 4 знойдзены пахавальны інвентар — глiняныя ганчарныя гаршкі, жалезныя і бронзавыя нажы, баявыя сякеры, спражкі і інш. Могільнік датуецца 11—13 стагоддзямі, належаў дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся ў Пінску.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961; Лысенко П. Ф. Ясенецкий курганный могильник.— У кн.: Вопросы истории (Тезисы докладов XII конференции молодых ученых Белорусской ССР).— Мн., 1969. *П. Ф. Лысенка*

ДРАГІЧЫНСКІ РАЁН



VI. ДРАГІЧЫН

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны за 110 км на ўсход ад Брэста, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Драгічын на лініі Брэст — Гомель, на аўтамагістралі Брэст — Пінск.

У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1452 г. як в. Давячоравічы, з 1623 г. мястэчка Вялікага княства Літоўскага. З 1795 г. у складзе Расіі, мястэчка Кобрынскага павета Слонімскай, з 1797 г. Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У 1849 г. — 167 жыхароў, 18 драўляных будынкаў, у 1897 г. — 2268 жыхароў, 280 дамоў (з іх 140 жылых), царква, царкоўнапрыходская школа, 2 народныя вучылішчы, сельская лячэбніца. Прамысловыя прадпрыемствы напярэдадні 1-й сусветнай вайны: 2 маслабойні, завод па ачыстцы мелу, фабрыка саламяных брылёў, 7 мукамольняў, на якіх працавалі 36 рабочых. Самае вялікае прадпрыемства — фабрыка саламяных брылёў: у 1914 г. — 12 рабочых, выпушчана прадукцыі на 8 тыс. рублёў. У 1915—18 гг. Драгічын акупіраваны нямецкімі войскамі, у 1919—20 гг. — войскамі буржуазнай Польшчы. У 1921—39 гг. у складзе буржуазнай Польшчы, павятовы цэнтр Палескага ваяводства, каля 4 тыс. жыхароў. Тут у 1934 г. адбыўся працэс над 29 членамі КПЗБ. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (1939 г.) Драгічын увайшоў у Пінскую вобл. З 15.1.1940 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. да 17.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У раёне дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (26.6.1943 г. — 30.3.1944 г.) і ЛКСМБ (1.10.1943 г. — 30.3.1944 г.), у кастрычніку 1943 г. — сакавіку 1944 г. выдавалася падпольная газета «Красная заря». З 1954 г. Драгічын у Брэсцкай вобл., 3,5 тыс. жыхароў (1959 г.). З 1967 г. горад.

Планіровачная структура Драгічына традыцыйна фарміравалася ў напрамках асноўных пад'язных шляхоў. У 2-й палавіне 18 ст. забудова канцэнтравалася уздоўж вуліц, якія адыходзілі ад гандлёвай плошчы: Пінскай, Хомскай, Перкавіцкай і Брэсцкай. Вакол рынку сяліліся гандляры і рамеснікі. Тут былі 43 двары, з якіх 14 непасрэдна фарміравалі забудову плошчы і называліся «рынкавымі». У цэнтры плошчы была пабудавана драўляная ратуша, якая традыцыйна аб'ядноўвалася ў комплекс з аўстэрыяй, крамамі і складскімі будынкамі. Акрамя рамеснікаў і гандляроў, у горадзе сяліліся прыгонныя сяляне, таму яго забудова спалучала сельскі і гарадскі тыпы сядзіб, што было характэрна для невялікіх гарадоў і мястэчак Беларусі. У склад Драгічына ўваходзіла прадмесце Зарэчча

VI. *Плошча Леніна*

Тэрыторыя сучаснага горада падзелена аўтамагістраллю Брэст — Пінск на паўночны і паўднёвы планіровачныя раёны. Планіроўка квартальная. У 1971 г. ў Брэсцкім філіяле інстытута «Белдзяржпраект» распрацаваны генплан Драгічына. У цэнтры горада па вул. Леніна (участак аўтамагістралі) склалася цэнтральная плошча — пл. Леніна з будынкамі райвыканкома і райкома КПБ. Тут пастаўлены помнік У. І. Леніну. На вул. Леніна пабудаваны кінатэатр, Дом культуры, універмаг, рэстаран, камбінат грамадскага харчавання. Цэнтральныя вуліцы — Леніна, Савецкая, 17 Верасня, Вакзальная, В. Харужай — забудоўваюцца 2—5-павярховымі жылымі дамамі. Будуецца новы мікрараён у паўночнай частцы горада.

Асноўныя прамысловыя прадпрыемствы: маласырзавод, трактарарамонтны і камбікормавы заводы. Працуюць раённыя аб'яднанні Дзяржкамсельгастэхнікі і «Сельгасхімія», камбінат бытавога абслугоўвання.

У горадзе 2 сярэднія, завочная, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная

VI. *Забудова вуліцы Леніна. Фрагмент.*

школы, міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат, сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, 5 дзіцячых дашкольных устаноў, Дом піянераў і школьнікаў, Дом культуры, 2 кінатэатры, раённыя цэнтральная і дзіцячая бібліятэкі, бальніца, паліклініка. Выдаецца раённая газета «Запаветы Леніна».

Ёсць парк імя Горкага, скверы. Зона адпачынку — на р. Ясельда (за 20 км на поўнач) і на Дняпроўска-Бугскім канале (за 16 км на поўдзень).

Літ.: Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов. Т. 1. Вильно, 1865; Белогорцев И. Д. Развитие западных городов Белоруссии (Методический материал в помощь лектору). Брест, 1971; Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2. СПб., 1863; Городское хозяйство Белорусской ССР (Основные фонды по состоянию на 1 января 1966 г.). — Мн., 1967; Жучкевич В. А. Топонимика Белоруссии. Мн., 1968. У. В. Аляксеічык, ... М. ...

449. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). На могілках. Пахаваны 27 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1954 г. на магіле

449. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў

пастаўлены помнік — скульптура салдата.

450. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН** (гіст.). На вул. Леніна, у гарадскім скверы. Пахаваны 248 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

451. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). У скверы каля чыгункі. Пахаваны больш за 3 тыс. мірных жыхароў. На гэтае месца ў 1942 г. гітлераўцы сагналі жыхароў з Драгічына,



VI. Ратуша. 1779 г. Гравюра

VI. Дом культуры

навакольных вёсак і іншых раёнаў і ўсіх расстралялі; у т. л. старых, жанчын і дзяцей. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

452. **МАГІЛА ГУБАНКОВА** Івана Паўлавіча (гіст.). На заходняй ускраіне горада, каля чыгуначнага пераезда. Малодшы лейтэнант Чырвонай Арміі І. П. Губанкоў загінуў у Вялікую Айчынную вайну. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

453. **МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). Вул. Вызвалення, у скверы. Пахавана больш за 100 мірных жыхароў і партызан — вязняў гарадской турмы, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—42 гг. У 1968 г. на магіле пастаўлена стэла.

454. **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ І ПАРТЫЗАНАМ** (гіст.). Вул. Леніна, 138, на будынку райвыканкома.

У сярэдзіне ліпеня 1944 г. войскі правага крыла 1-га Беларускага фронту выйшлі на рубеж Свіслач — Пружаны. У гэты час у наступленне перайшлі войскі 61-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант П. А. Бялоў). Яны фарсіравалі р. Прыпяць і, авалодаўшы Пінскам, прадоўжалі наступаць у напрамку Драгічын — Кобрын — Брэст. 17.7.1944 г. Драгічын быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры вызваленні горада вялікую дапамогу савецкім воінам аказалі партызаны. На тэрыторыі раёна дзейнічалі партызанскія брыгады «Савецкая Беларусь», імя Я. М. Свярдлова, імя В. М. Молатава.

Брыгада «Савецкая Беларусь», створаная ў жніўні 1943 г., дзейнічала на тэрыторыі Брэсцкай і Пінскай (Драгічынскі р-н) абласцей. Камандзір М. У. Бабкоў, камісар П. І. Масалаў. У ліпені 1944 г. партызаны перарэзалі шляхі адступлення нямецкім войскам, занялі абарону каля в. Жытлін Косаўскага (цяпер Івацэвіцкага) р-на. 12—17.7.1944 г. брыгада ў складзе 3 атрадаў (863 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

Брыгада імя Я. М. Свярдлова дзейнічала на тэрыторыі Пінскай (Іванаўскі, Ганцавіцкі, Драгічынскі р-ны) і Брэсцкай абласцей. Створана ў лістападзе 1943 г. Камандзір І. П. Марыняка, камісар Р. А. Дудко. У 1943—44 гг. партызаны разграмілі больш за 20 апорных пунктаў ворага, знішчылі шмат варожых аб'ектаў, мастоў, у т. л. масты на р. Ясельда, на чыгуначнай станцыі Драгічын. 16.7.1944 г. брыгада ў складзе 4 атрадаў (1001 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

Брыгада імя В. М. Молатава дзейнічала на тэрыторыі Пінскай вобл. (Жабчыцкі, Пінскі, Лагішынскі, Столінскі, Іванаўскі, Драгічынскі р-ны) і Валынскай вобл. УССР. Створана ў

красавіку 1943 г. Камандзір М. І. Герасімаў, камісар Ф. С. Кунькоў. У лютым і сакавіку 1944 г. партызаны вялі баі з праціўнікам на Днепра-Бугскім канале і [illegible] Прыпяці, найбольш значныя — каля в. Белін і [illegible] [illegible] ... [illegible] 30.3.1944 г. брыгада ў складзе 5 атрадаў (1314 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

У 1965 г. ў гонар воінаў [illegible] і партызан брыгад «Савецкая Беларусь», імя Я. М. Свярдлова, імя В. М. Молатава ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Бугр в огне. 136 [illegible] — Минск, 1977; Непокоренная Белоруссия. Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной [illegible] ... [illegible] В Брестских [illegible]
М. К. [illegible]

455. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ТАРАСЮКУ Івану Паўлавічу і **ДАВІДОВІЧУ** Уладзіміру Іванавічу (гіст.). Вул. Леніна, 149. Тут у 1939 г. загінулі удзельнікі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі — сакратар Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ І. П. Тарасюк і член КПЗБ У. І. Давідовіч. [illegible] ... [illegible] Раніцай 23 верасня паўстанцы даведаліся, што ў адным з будынкаў на ўскраіне Драгічына зроблена засада палкоўнікаў, каб сустрэць агнём передавыя часці Чырвонай Арміі, што ішлі з Пінска. Паўстанцы разграмілі [illegible] У баі загінулі І. П. Тарасюк і У. І. Давідовіч.

У 1967 г. на будынку ўстаноўлена мемарыяльная дошка. [illegible] музеі баявой і рэвалюцыйнай славы захоўваюцца экспанаты, прысвечаныя [illegible] ... «Магіла Тарасюка Івана Паўлавіча і Давідовіча Уладзіміра Іванавіча».

Літ.: В памяти народной — Мн., 1969. [illegible]

456. *Помнік У. І. Леніну.*

456. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). [illegible] каля будынка райвыканкома. Скульптурная фігура У. І. Леніна ўстаноўлена ў [illegible]

в. Аляксеевічы,
Немяржанскі сельсавет

457. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У скверы. Курган насыпаны ў 1968 г. на [illegible] 38 [illegible] загінулі [illegible] ... На вяршыні кургана пастаўлена стэла з барэльефам воіна.

г. п. Антопаль,
цэнтр пасялковага Савета

458. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). [illegible] вул. Савецкай, у скверы. Пахаваны 78 воінаў і партызан, у т. л. воіны 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі 9-га корпуса, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баях за вызваленне Антопаля. У 1965 г. [illegible] помнік — скульптура салдата.

459. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І ПАЎСТАНЦАЎ (гіст.). [illegible] ... Барановскі, Мукін, Талстанятаў, Яфімаў і паўстанцы Воласаў, Загрэба, браты Марушкі, якія загінулі ў верасні 1939 г. пры вызваленні Заходняй Беларусі.

Як толькі падраздзяленні Чырвонай Арміі наблізіліся да Антопаля, яго жыхары стварылі паўстанцкі атрад для дапамогі вызваліцелям. У баі за пасёлак загінуў экіпаж танка і 5 паўстанцаў. У 1940 г. на магіле пастаўлены абеліск.
В. Л. [illegible]

460. ВАСКРАСЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Вул. Савецкая. Пабудавана ў 2-й пал. 19 ст. з дрэва.

Прамавугольная ў плане адназрубная пабудова, накрытая двухсхільным дахам з вальмай над алтарнай часткай. На галоўным фасадзе чатырохкалонны порцік, над франтонам якога узвышаецца цыбулепадобная галоўка на васьмігранным барабане. Такая ж невялічка [illegible] ... [illegible] двух'ярусная званіца.

Царква мае рысы традыцыйнага для драўлянага дойлідства і наватарскія элементы класіцызму.
А. М. [illegible]

461. КРАМЫ (архіт.). У цэнтры плошчы, якая прылягае да вул. Савецкай (адрэзак аўтамагістралі Брэст — Пінск), [illegible] ... левыя прадпрыемствы.

Аднапавярховы будынак у плане [illegible] ... Два рады калон дзеляць унутраную

461. *Крамы. Фрагмент фасада.*

461. *Крамы. Схема планіроўкі.*

461. *Крамы. Фрагмент плана.*

465. *Касцёл.*

прастору будынка на 3 пралёты. Інтэр'ер цымі ж калонамі вызначае памеры цэнтральнай зоны. Кожная з іх перакрыта трохпралётным бочкападобным скляпеннем. Функцыянальная сувязь складаецца з цэнтральнай залы, алтарнай і бакавых памяшканняў, арыентаваных на галоўны і бакавыя фасады. Будынак мае крыжападобны план: памяшканні — ва ўнутраны гаспадарчы двор. Сцены будынка па ўсім перыметры прарэзаны лучковымі акламі, праёмамі і завершаны прафіляваным карнізам і сухарыкамі.

Крамы — помнік грамадзянскай архітэктуры. У яго кампазіцыі і дэкаратыўных дэталях выкарыстаны элементы архітэктуры класіцызму.

Т. І. Чарняўская

462. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На поўнач ад пасёлка, ва ўрочышчы Хаміцкі. 2 насыпы вышынёй 1,5 і 2 м, дыяметрам 5 і 12 м. Выявіў у 1960 г. Ю. У. Кухарэнка, абследаваў у 1970 г. Л. Д. Побаль. Раскопкі не праводзіліся.



465. *Касцёл. План.*

463. МАГІЛА САВЕЦКІХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). На вул. Савецкай, насупраць сквера. Пахаваны савецкія актывісты Н. І. Кульбаеў, Г. Ф. Ларын, А. М. Трафімаў, І. Ф. Шкроб, А. Шумілін, якія загублены ў 1945—46 гг. ворагамі Савецкай улады. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Асінавічы, Галоўчыцкі сельсавет

464. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля праўлення калгаса імя К. Маркса. На ўшанаванне памяці 98 адназемкоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлена стэла, завершаная пагрудкам скульптурай жанчыны-маці ў жалобе, побач — мемарыяльная сцяна з імёнамі загінуўшых.

в. Бездзеж, цэнтр сельсавета

465. КАСЦЁЛ (архіт.). На галоўнай вуліцы вёскі. Пабудаваны да 1820 г. з цэглы.

Прамавугольны ў плане выцягнуты па падоўжнай восі будынак накрыты пакатым двухсхільным дахам з вальмай над алтаром. Галоўны фасад мае плоскаснае вырашэнне і завершаны трохвугольным франтонам з невялікай вежачкай. Галоўны ўваход аформлены парталам з паўкруглай люкарнай над ім. Сцены ўнутры і звонку апрацаваны плоскімі пілястрамі і завершаны развітым антаблементам. Інтэр'ер залы, з плоскай бэлечнай столлю. Над уваходам крывалінейныя ў плане хоры на 2 калонах.

Касцёл — помнік архітэктуры класіцызму.

Т. В. Габрусь



468. *Троіцкая царква. План.*

466. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ КАЛОНА (гіст.). За 1,5 км на паўночны захад ад вёскі, на могілках. Пастаўлена ў канцы 18 ст. ў памяць аб Канстытуцыі 3 мая 1791 г. — асноўным законе Рэчы Паспалітай, прынятым на сейме ў Варшаве.

Канстытуцыя 1791 г. з'явілася вынікам барацьбы буржуазіі, якая нараджалася, з феадалізмам. Яна расшырала правы багатых мяшчан, абмяжоўвала «апеку права» з урада над феадальна залежнымі сялянамі, скасоўвала унію Вялікага княства Літоўскага з Польшчай і аб'ядноўвала абедзве дзяржавы. Канстытуцыя ўводзіла спадчынную манархію, скасоўвала ў сейме «ліберум вета». Усе рашэнні павінны былі прымацца большасцю галасоў. З правам дарадчага голасу ў склад сейма уводзіліся прадстаўнікі гарадоў. Канстытуцыя 1791 г. была прагрэсіўнай для свайго часу, ствараля больш спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін. Канстытуцыя скасавана Гродзенскім сеймам 1793 г.

Літ.: Kaczmarczyk Z., Leśnodorski B. Historia państwa i prawa Polski od połowy XV w. do r. 1795.— Warszawa, 1957.

В. Б. Караткевіч

467. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 148 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам.

468. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі, на плошчы. Пабудавана ў 1784 г. з дрэва.

Будынак складаецца з 2 прамавугольных зрубаў — асноўнага і алтарнага. Двухсхільны дах мае 3 вальмы над алтаром і трохвугольны франтон з паўвальмай на галоўным заходнім фасадзе паміж 2 чацверыковымі вежамі з фігурнымі барочнымі завяршэннямі. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, аконныя праёмы прамавугольныя. Пластыка будынка узбагачаецца дэкаратыўнай шалёўкай франтона, разнымі ліштвамі, вокнамі і балясінамі ганка. Інтэр'ер залы, з 4 слупамі ў сярэдзіне. Перакрыццё бэлечнае, з плоскай падшыўной столлю. Рызніцы і ўваходны тамбур убудаваны ўнутры асноўнага аб'ёму. Над тамбурам размешчаны хоры. На восі ўвахода размешчана двух'ярусная брама-званіца.

У архітэктурным вырашэнні царквы традыцыйныя прыёмы народнага драўлянага дойлідства спалучаюцца з элементамі архітэктуры барока.

Т. В. Габрусь



468. *Троіцкая царква. Брама-званіца.*

в. Белін, Ачавецкі сельсавет

469. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса «Савецкая Беларусь». На ўшанаванне памяці 67 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Бешпок, Вулькаўскі сельсавет

470. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,4 км на захад ад вёскі, недалёка ад хутара Клімчука, у лесе 2 насыпы. Вышыня 2 і 1,5 м, дыяметр 10 і 15 м. Выявіў у канцы 19 ст. Ф. В. Пакроўскі, абследаваў у 1970 г. Л. Д. Побаль. Раскопкі не праводзіліся.

в. Брашэвічы, цэнтр сельсавета

471. КУРГАН (археал.). На ўсход ад вёскі, на урочышчы Брашаў Луг, у лесе. Памер кургана 18×15 м, вышыня 2,2 м. Выявіў у канцы 19 ст. Ф. В. Пакроўскі, абследаваў у 1960 г. Ю. У. Кухарэнка. Раскопкі не праводзіліся.

472. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У сквэры, каля будынка сельсавета. Курган насыпаны ў 1975 г. на ўшанаванне памяці 144 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні кургана пастаўлены абеліск, побач з ім — сцяна, на якой змешчаны пліты з імёнамі загінуўшых.

473. ЦАРКВА УШЭСЦЯ (архіт.). Пабудавана ў пачатку 20 ст. з цэглы. Складаецца з 3 аб'ёмаў: прытвора званіцы, асноўнага аб'ёму і трохграннай апсіды. У прасторавай кампазіцыі дамінуюць шацёр званіцы і цыбулепадобная васьміграння вежачка над асноўным аб'ёмам. У дэкоры выкарыстаны элементы старажытнарускага дойлідства: аркатура, закамары, паўкруглыя калоны.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. *А. М. [illegible]*

в. Вавулічы, Гутаўскі сельсавет

474. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). На заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1737 г. з дрэва, перабудавана пасля 1845 г.

Будынак складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага і пяціграннага алтарнага зрубаў, аб'яднаных агульным двухсхільным дахам, які мае 3 вальмы над апсідай і навіс у месцы злучэння зрубаў. Над цэнтральнай часткай царквы — барабан на васьмігранным пастаменце, завершаны цыбулепадобным купалам. Да апсіды з усходу прыбудавана нізкая рызніца з аднасхільным дахам. Галоўны паўднёвы фасад завершаны франтонам з гонтавым прычолкам. Уваходны тамбур каркаснай канструкцыі дабудаваны да галоўнага фасада пазней. Сцены вертыкальна апалява-



474. Царква Раства Багародзіцы. План.

ны дошкамі з нашчыльнікамі і ўмацаваны сцяжкамі. Інтэр'ер залы, перакрыццё бэлечнае. Над уваходам хоры, якія ўпіраюцца на 2 слупы.

З паўднёва-ўсходняга боку асобна ад царквы пабудавана двух'ярусная зрубна-каркасная званіца. Адпаведна яе памерах чацверыкі аддзелены прычолкам і накрыты шатровым гонтавым дахам.

Царква разам са званіцай складае архітэктурны ансамбль, у якім адлюстраваны тэндэнцыі развіцця мясцовага народнага дойлідства.

Г. В. Габрусь.

474. Царква Раства Багародзіцы. Выгляд з боку апсіды.

в. Валавель, Закозельскі сельсавет

475. ЮР'ЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1766 г. з дрэва.

Складаецца з прамавугольнага асноўнага з пяціграннага алтарнага зрубаў, аб'яднаных двухсхільным гонтавым дахам, які ўтварае трохвугольныя навісі ў месцы злучэння зрубаў. Галоўны заходні фасад мае крывалінейны франтон, па баках якога ўзвышаюцца 2 чатырохгранныя вежы, завершаныя васьміграннымі барабанамі з галоўкамі і шатрамі над імі. Дах над алтарным зрубам завершаны шасцігранным фігурным галоўкай. Нізкія рызніцы прыбудаваны абапал апсіды. Сцены вертыкальна апаляваны дошкамі з



475. Юр'еўская царква. План.



475. Юр'еўская царква.

вашчыльным кам. Аконныя праёмы прамавугольныя, на галоўным фасадзе паўкруглыя люкарны. Інтэр'ер зальны, перакрыцце бэлечнае. Над уваходам трапецападобныя ў плане хоры. Перад царквой каркасная двух'ярусная званіца, накрытая шатровым гонтавым дахам.

Царква — прыклад творчай перапрацоўкі ў драўляным дойлідстве форм мураванага двухвежавага храма ў стылі барока. *Т. В. Габрусь*

в. Вулька-Антопальская, Антопальскі пасялковы Савет

476. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі, каля чыгуначнага пераезда. На ўшанаванне памяці 4 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Вулька-Радавецкая, Закозельскі сельсавет

477. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Насупраць будынка праўлення калгаса імя У. І. Леніна. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1979 г.

в. Галік, Галоўчыцкі сельсавет

478. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі, каля Днепра-Бугскага канала. 2.6.1942 г. в. Галік была спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Загінулі 28 чалавек, згарэлі 16 двароў. Вёска Ямнік, якая знаходзілася за 3 км на захад ад в. Галік, знішчана захопнікамі ў жніўні 1943 г. Загінулі 10 чалавек, спалены 32 двары.

На ўшанаванне памяці загінуўшых жыхароў гэтых вёсак у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Галоўчыцы, цэнтр сельсавета

479. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 77 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлена стэла.

480. ПОМНІК ЧКАЛАВУ Валерыю Паўлавічу (гіст.). Насупраць будынка праўлення калгаса імя В. П. Чкалава.

490. *Пакроўская царква. Выгляд з бо...*



477. *Помнік У. І. Леніну*

Бюст лётчыка Героя Савецкага Саюза В. П. Чкалава ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Гаравіца, Радастаўскі сельсавет

481. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). За 0,4 км на поўдзень ад моста праз Белаазерскі канал. Пахаваны 39 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

482. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі, за 0,3 км на поўдзень ад моста праз Белаазерскі канал. Пахаваны 30 жыхароў вёскі, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Горыцы, Антопальскі пасялковы Савет

483. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы, каля шашы Брэст — Пінск. На ўшанаванне памяці 23 жыхароў вёсак Горыцы і Першамайск, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

490. *Пакроўская царква. План*

в. Гошава, Хомскі сельсавет

484. МАГІЛА САХАШЧЫКА Паўла Рыгоравіча (гіст.). На могілках. Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, партызан Вялікай Айчыннай вайны П. Р. Сахашчык (1910—43 гг.) загінуў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Губерня, Антопальскі пасялковы Савет

485. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «1 Мая». На ўшанаванне памяці 11 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

в. Гутава, цэнтр сельсавета

486. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У цэнтры вёскі. Курган насыпаны ў 1966 г. на ўшанаванне памяці воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні Кургана пастаўлены абеліск.

487. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,5 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны 45 мірных жыхароў в. Гутава, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Дзераўная, Іմянінскі сельсавет

488. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 6 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Дзеткавічы, цэнтр сельсавета

489. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 19 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і 8 партызан, што вясной 1942 г. былі акружаны гітлераўцамі ў вёсцы і загінулі ў няроўным баі. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

490. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1740 г. з дрэва.

Будынак складаецца з 2 прамавугольных у плане рознавялікіх зрубаў (асноўнага аб'ёму і апсіды), пакрытых агульным гонтавым дахам. Над галоўным фасадам на вільчыку даху — васьмігранная вежачка з цыбулепадобнай галоўкай. Над апсідай двухсхільны дах пераходзіць у трохграннае пакрыццё з застрэшкамі ў месцах злучэння зрубаў. Прытвор прыбудаваны ў выглядзе невялікага аб'ему з двухсхільным дахам. Апсіда мае сту...

490. Пакроўская царква. Звон. 18 ст

леньчатую кампазіцыю з... ...дпа зніжэння да ло тарца больш нізкага ...ба бовага памяшкання. Бакавыя ... гарызантальна ашаляваны, расчлянёны лапаткамі і прамавугольнымі вокнамі, завершаны бочным карнізам. Унутраная прастора царквы перакрыта плоскай столлю, над уваходам выступаюць хоры.

Перад царквой стаіць брама-званіца. Яе цэнтрычны чатырохгранны аб'ем завершаны пакатым шатровым дахам. Першы ярус вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, другі — адкрыты, умацаваны каркасным ...

Царква — арыгінальны помнік архітэктуры, у якім увасоблены харак-



492. Гліняны посуд з пахавання № 4

тэрныя рысы культавага драўлянага дойлідства Беларускага Палесся 18 ст.

Г. В. Габрусь

491. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя (воін і дзяўчына).

чыгуначная станцыя Драгічын

492. БЕСКУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2 км на паўночны захад ад станцыі, на ўзгорку абапал дарогі ў в. Шырковічы. З поўдня, захаду і поўначы ўзгорак акружае ... луг. Могільнік адкрыты ... 1962 г. праведзены раскопкі.

На ўскрытым участку выяўлены 5 пахаванняў з рэшткамі перапаленых касцей нябожчыкаў. У 3 пахаваннях косці знаходзіліся ў неглыбокіх ямах, у астатніх — у урнах. У пахаванні № 1 рэшткі касцей знаходзіліся ў гліняным гаршку-урне, накрытай зверху 2 перавернутымі міскамі. У пахаванні № 4 гліняная урна з рэшткамі касцей зверху пакрыта міскай, а паверх яе ... глінянай пасудзінай (...ам). Увесь посуд ... Могільнік належыць плямёнам паморскай культуры, што засялялі гэтую тэрыторыю ў 4—2 стагоддзях да н. э.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Дзяржаўным музеі БССР.

Літ.: Никитина В. Б. Памятники поморской культуры в Белоруссии и на Украине — Советская археология, 19.. № 1.

В. Б. Карaткевіч

в. Жабер, Хомскі сельсавет

493. РЭШТКІ ЗАМКА (гіст.). За ... на паўночны захад ад ... на правым беразе р. Ясельда.

Абарончы замак князёў Вішнявецкіх пабудаваны ў пачатку 17 ст. (паводле іншых звестак у 16 ст.). На той час гэта было першакласнае ўмацаванне з бастыёнамі галандскага тыпу па вуглах, у плане блізкае да чатырохвугольніка. Пляцоўка замка плошчай ... за 1,5 га была абнесена высокім земляным валам і дубовым частаколам. З захаду замак прыкрываўся Ясельдай з балоцістым правым берагам, з поўначы, усходу і поўдня — ровам з вадой (шырыня да 20 м, глыбіня 5 м). Ва ўмацаванні можна было трапіць толькі па мосце, які мог разбірацца ў час небяспекі.

У час Паўночнай вайны 1700—21 гг. войска караля Рэчы Паспалітай Станіслава Ляшчынскага, прыхільніка шведскага караля Карла XII, 13.5.1706 г. акружыла замак, яго абаронцам прапанавалі здацца. Гарнізон (700 чалавек, 40 гармат) на ультыматум адказаў гарматнымі залпамі. На дапамогу войску Ляшчынскага прыйшло падмацаванне на чале са шведскім генералам Майерфельдам, які таксама не дабіўся поспеху. Тады Карл XII сам



492. Бескурганны могільнік. План і разрэз пахавання № 4

прыбыў сюды з войскам. Шведы абкружылі крэпасць шчыльным кальцом, з ... падцягнулі цяжкую артылерыю, з дапамогай якой спадзяваліся разбурыць бастыёны і зламаць супраціўленне гарнізона, аднак гэта не спатрэбілася. Падкуплены камендант замка немец Ботман адчыніў вароты і здаў яго без бою. Карл XII загадаў



493. Рэшткі замка. Схема планіроўкі ўмацаванняў

495. *Помнік Г. М. Дзімітрову.*

зруйнаваць замак, а гарматы закляпаць і затапіць у абводным рове. Адна з іх захоўваецца цяпер у Музеі Войска Польскага ў Варшаве.

У час археалагічнага абследавання замкавага двара выяўлены керамика 17—18 стагоддзяў, каваліі цэглы і чарапіцы, паліванай і непаліванай кафлі, манета 1660 г.; захаваліся фундаменты.

500. *Помнік землякам*

Літ.: Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2. СПб., 1863. Ткачоў М. А. Абарончыя ... заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст.— Мн., 1978. *М. А. Ткачоў.*

в. Заверша, Бездзежскі сельсавет

494. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Г. М. Дзімітрова. Курган насыпаны ў 1970 г. па ўшанаванне памяці 131 аднавяскоўца, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні Кургана пастаўлены абеліск.

495. ПОМНІК ДЗІМІТРОВУ Георгію Міхайлавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Г. М. Дзімітрова. Бюст дзеяча балгарскага і міжнароднага рабочага руху Г. М. Дзімітрова пастаўлены ў 1970 г.

496. РАДЗІМА ЮСКАЎЦА Максея Каленікавіча (гіст.).

Беларускі савецкі эпізааталог, мікрабіёлаг і імунолаг, акадэмік АН БССР (1950 г.), акадэмік Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР (1957—61 гг.) М. К. Юскавец нарадзіўся 4.8.1898 г. ў сялянскай сям'і. У Грамадзянскую вайну ў партызанскім атрадзе, Чырвонай Арміі на Заходнім, Уральскім, Усходнім і Туркестанскім франтах. У 1925 г. скончыў Маскоўскі ветэрынарны інстытут. У 1925—35 гг. працаваў у гэтым інстытуце, а 1931 г. намеснік дырэктара па завочным навучанні і адначасова намеснік дырэктара Дзяржаўнай ветэрынарна-бактэрыялагічнай лабараторыі. Член КПСС з 1929 г. У 1935—41 гг. кіраўнік лабараторыі па вывучэнні туберкулезу, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі. Доктар ветэрынарных навук (1941 г.), прафесар (1943 г.). У 1942—43 гг. начальнік лячэбна эпізаатычнага аддзела Галоўнага ваеннага ветэрынарнага упраўлення, у 1943—52 гг. загадчык кафедры эпізааталогіі ветэрынарнага факультэта Маскоўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута мясной прамысловасці і загадчык дыягнастычнай лабараторыі Дзяржаўнага навукова-кантрольнага інстытута ветэрынарных прэпаратаў Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР. У 1952—56 гг. загадчык лабараторыі бруцэлёзу і туберкулёзу Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі, адначасова (у 1950—56 гг.) загадчык лабараторыі туберкулёзу і бруцэлёзу НДІ жывёлагадоўлі АН БССР. У 1957—61 гг. акадэмік-сакратар аддзялення жывёлагадоўлі і ветэрынарыі Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР, адначасова (у 1957—59 гг.) дырэктар Беларускага ветэрынарнага НДІ. Заслужаны дзеяч навукі БССР (1958 г.). У 1961—69 гг. загадчык аддзела мікрабіялогіі і імуналогіі гэтага інстытута. Распрацоўваў пытанні ліквідацыі бруцэлёзу сельскагаспадарчых жывёл, укараніў паскораны метад аздараўлення гаспадарак пры туберкулёзе буйной рагатай жывёлы, метад вырабу вакцыны з штаму бруцэл № 19. М. К. Юскавец памёр 23.4.1969 г. Пахаваны ў Мінску на могілках па Маскоўскай шашы. *А. Г. Шчарбатаў.*

в. Закляценне, Бездзежскі сельсавет

497. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны партызаны А. Гушчэня, І. Маёраў і А. Паўлючкоў, якія гераічна загінулі 21.6.1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

501. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — жылы дом, 2 — бровар, 3 — капліца-пахавальня.*



501. *Капліца-пахавальня. Разрэз.*

в. Заказель, цэнтр сельсавета

498. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,5 км на ўсход ад вёскі. Пахаваны 17 мірных жыхароў вёсак Вулька, Каралін і Паніна, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі. Сярод іх былі старыя, дзеці, жанчыны. У 1971 г. на магіле пастаўлены абеліск.

499. МЕСЦА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАРТЫЗАН (гіст.). На тэрыторыі За[illegible] на працягу 1942—43 гг. партызанскія атрады імя А. В. Суворава і М. Ц. Шчорса [illegible]скага партызанскага злучэння рэгулярна знішчалі варожыя гарнізоны. У 1974 г. ў памяць аб баявых дзеяннях партызанскіх атрадаў на будынку [illegible]заводa ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

500. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка канторы саўгаса «Заказельскі». На ўшанаванне памяці 83 жыхароў вёсак Валавель, Гурка, Заказель, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах, у партызанскай барацьбе, а таксама былі закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у 1974 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе, побач 2 мемарыяльныя пліты з імёнамі загінуўшых.

501. СЯДЗІБА [illegible]. На [illegible] ускраіне вёскі. Сфарміравалася на працягу 19 ст.

Пабудовы ансамбля — сядзібны дом, бровар, капліца-пахавальня — размешчаны ў парку пейзажнага тыпу з сістэмай вадаёмаў. Большасць паркавых куліс засявана на эфекце адлюстравання маляўнічых груп дрэў у вадаёмах. Ацалела галоўная уязная алея і авальны партэр перад домам. Сядзібны дом (не захаваўся) быў выкананы ў стылі класіцызму.

Будынак бровара двухпавярховы, прамавугольны ў плане, мае на фронце галоўнага фасада каланаду тасканскага ордэра, карнізы і сандрыкі над прамавугольнымі аконнымі праёмамі, што надае ўтылітарнай пабудове рэпрэзентатыўны характар. Шэраг пазнейшых прыбудоў парушыў пачатковы выгляд будынка.

Капліца-пахавальня, пабудаваная ў стылі неаготыкі, размешчана на узгорку паўднёва-заходняй ускраіны парку. Цэнтрычны квадратны ў плане будынак завершаны шпілем і пінаклямі па вуглах. Сцены звонку ўмацаваны ступеньчатымі контрфорсамі, аздоблены скульптурай, арнаментаванай лепкай і шчытамі з геральдыкай. Праёмы стральчатыя. У інтэр'еры скляпенні дэкарыраваны лепнымі дэкорамі.

У архітэктуры сядзібна-паркавага ансамбля спалучаны рысы класіцызму і неаготыкі. *А. М. Кан*[illegible]

501. *Капліца-пахавальня.*



501. *Капліца-пахавальня. План.*

501. *К*[illegible]

в. Заполесе, Драгічынскі сельсавет

502. ПОМНІК САВЕЦКІМ ВОІНАМ (гіст.). За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі. На [illegible] мясціны 25.6.1941 г. [illegible] стрымлівалі націск гітлераўскіх войск на [illegible]. У 1977 г. тут пастаўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам і звязкай гранат.

в. Заржэжа, Паніцкі сельсавет

503. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). [illegible] Пахаваны партызаны, якія [illegible] ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1944 г. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

504. ПОМНІК ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). На паўночным беразе Дняпроўска-Бугскага канала, за 0,5 км на ўсход ад вёскі.

У пачатку лютага 1944 г. камандаванню Брэсцкага партызанскага злучэння стала вядома, што гітлераўцы рыхтуюць буйную карную экспедыцыю з мэтай разгрому партызан, якія дыслацыраваліся ў раёне Сварынскіх лясоў і кантралявалі вялікую зону паміж Дняпроўска-Бугскім каналам і р.

501. *Капліца-пахавальня. Каваная краты акон.*



502. *Помнік савецкім воінам*

Прыпяць. 21 лютага супраць партызан былі накіраваны рэгулярныя часці нямецкай арміі, знятыя з фронту. Яны з баямі выйшлі да канала і імкнуліся з ходу фарсіраваць яго. Аднак працўнік напаткаў моцнае супраціўленне партызан, якія на паўднёвым беразе канала стварылі 50-кіламетровую лінію абароны з акопамі, дзотамі, траншэямі, бліндажамі і заваламі. Скарыстоўваючы выгадныя рубяжы і манеўруючы, партызаны каля 40 дзён паспяхова адбівалі атакі ворага, наносячы яму вялікія страты.

Асабліва цяжкія баі вяліся ў раёне вёсак Белін і Зарэчка. Партызаны атрымлівалі боепрыпасы і ўзбраенне з Вялікай зямлі. У канцы сакавіка 1944 г. фашысты накіравалі ў гэты раён новыя буйныя сілы, у т. л. шмат танкаў і артылерыі. 29 сакавіка ворагу удалося фарсіраваць канал і пачаць наступленне ўглыб абароны. Сілы былі няроўныя. У ноч на 30 сакавіка партызаны арганізавана адступілі за Прыпяць, дзе злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі, якія падышлі на дапамогу. Яны не толькі пазбеглі разгрому, але вывелі з сабой і выратавалі ад знішчэння тысячы мірных жыхароў.

У баях за Днепра-Бугскі канал пад камандаваннем П. М. Кавальчука ўдзельнічала 14 партызанскіх атрадаў Брэсцкага і Пінскага злучэнняў агульнай колькасцю каля 8 тыс. чалавек. Выключную стойкасць і гераізм праявілі партызаны брыгад імя В. М. Молатава (камандзір М. І. Герасімаў, камісар Ф. С. Куцькоў), 95-й імя Ф. М. Язьковіча (камандзір В. А. Рапецін, камісар С. М. Падута), Пінскай (камандзір І. Г. Шубітыдзе, камісар А. З. Пратасеня). У гісторыю Вялікай Айчыннай вайны гэта бітва ўвайшла пад назвай «Днепра-Бугская абарона».

У 1966 г. ў гонар подзвігу беларускіх партызан пастаўлены помнік — скульптура партызана з вінтоўкай у руцэ.

Лит.: Бур'я в огне. [illegible] Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.). Мн., 1963; Шубитидзе И. Г. Полесские были. Мн., 1974; В памяти народной. Мн., 1969.

І. І. Дулеба

в. Зелава. Іманінскі сельсавет

505. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт., маст.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1842 г. з дрэва.

Крыжападобны ў плане будынак складаецца з 5 зрубаў. Двух'ярусны цэнтральны зруб завершаны масіўным купалам з галоўкай і фланкіраваны на вуглах 4 квадратнымі ў плане вежамі з галоўкамі. З усходу і захаду да яго прылягаюць зрубы алтара і бабінца, з поўдня і поўначы — больш нізкія бакавыя прыбудовы. Асноўны зруб завершаны карнізам на мадульёнах. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, у ніжняй частцы — гарызантальная панель абшыўкі. Прамавугольныя аконныя праёмы размешчаны ў 2 ярусы. У інтэр'еры цэнтральны зруб злучаны шырокімі праёмамі з бабінцам і апсідай. Пераярхцце бэлечнае, а ўлоннай падшыўкай столлю, якая разам з хорамі падтрымліваецца калонамі карынфскага ордэра. Іканастас завяршае скульптурная група «Распяцце з прадстаячымі» (дрэва, разьба, ляўкас, танроўка).

На восі ўвахода ў царкву асобна пабудавана трох'ярусная каркасная званіца-брама, якая складаецца з 2 частак: верхняй (ніжнія ярусы) і васьмерыка (верхні ярус) і накрыта купалам. Ніжнія ярусы гарызантальна ашаляваны дошкамі, верхні — скразны.

У архітэктуры помніка ўвасоблены формы і прыёмы класіцызму.

Т. В. Габрусь

в. Іманін, цэнтр сельсавета

506. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 6 пар-

505. *Троіцкая царква і званіца*



505. *Троіцкая царква. План.*

[illegible] якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлена [illegible]

507. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны [illegible] савецкая воіны, якія загінулі у 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

508. МАГІЛА ТАРАСЮКА Івана Паўлавіча і **ДАВІДОВІЧА** Уладзіміра Іванавіча (гіст.). На могілках. Пахаваны [illegible] і рэвалюцыйнага [illegible] нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі — сакратар Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ І. П. Тарасюк і член ячэйкі КПЗБ в. Іменін У. І. Давідовіч (1909—33 гг.).

І. П. Тарасюк (партыйны псеўданім [illegible]) нарадзіўся 9.6.1902 г. [illegible] у сям'і чыгуначніка. Член ЛКСМ з 1923 г. У Грамадзянскую вайну ў атрадзе ЧОН. У 1921 г. на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, стварыў ячэйкі КПЗБ. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1925 г. арыштаваны ўладамі буржуазнай Польшчы. З палітвязніцы ў [illegible] у СССР, дзе скончыў ваенна-палітычныя курсы (1928 г.) і Ленінградскі камуністычны ўніверсітэт (1931 г.). Быў на палітычнай рабоце ў Чырвонай Арміі, на партыйнай рабоце ў Чачэ[illegible]. З 1932 г. зноў на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі [illegible] Віленскага акруговага камітэта КПЗБ. З канца 1932 г. да 1939 г. быў зняволены. Пасля выхаду з турмы выбраны сакратаром Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ. У верасні 1939 г. стварыў і ўзначаліў паўстанцкі атрад, які дапамагаў Чырвонай Арміі вызваляць Заходнюю Беларусь (у раёне Драгічына, Антопаля, Кобрына). Загінуў у Драгічыне ў баі супраць польскіх [illegible]. Яго імем названа вуліца ў Драгічыне. Гл. таксама артыкул № 455 «Мемарыяльная дошка Тарасюку Івану Паўлавічу і Давідовічу Уладзіміру Іванавічу».

У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: В памяти народной. Мн., [illegible] Т. [illegible]

509. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 246 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлена абеліск.

в. Какорыца, Белазёрскі сельсавет

510. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка васьмігадовай школы. На ўшанаванне памяці 19 землякоў — воінаў і партызан, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

511а. *Крамянёвыя [illegible]*

511. СТАЯНКІ (археал.)

511а. Стаянка І. За [illegible] км на [illegible] ад вёскі, на [illegible] вод. Спарадычна вывучалася ў 1963 і 1968 г. У. Ф. І[illegible] [illegible] стаянкі каля 200 м [illegible] [illegible] м. Выяўлены рэшткі [illegible] ных крамянёў [illegible] культурнага пласта 3 м [illegible]

511б. [illegible] паўднёва ад вытоку [illegible] [illegible] у 1963 г. і 1968 г. [illegible] 120 [illegible]

[illegible]

512. *Помнік землякам*



516. *Успенская царква.*

дзены крамянёвыя прылады працы, абломкі гліннага посуду, рэшткі вогнішчаў. Адносіцца да ранняга перыяду нёманскай культуры, датуецца 4-м тысячагоддзем да н. э.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья.— Мн., 1976. *У. Ф. Ісаенка*

в. Корсунь, Галоўчыцкі сельсавет

512. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі, каля шашы Брэст — Пінск. На ўшанаванне памяці 65 жыхароў вёсак Корсунь, Піганавічы, Толкава, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены [illegible] скульптурная кампазіцыя (воін і партызанка).

в. Ласінцы, Вулькаўскі сельсавет

513. МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА (гіст.). На могілках. Воін загінуў у 1944 г. У 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск.

514. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў 1-й палавіне 19 ст. з дрэва. Аднazрубная пабудова, накрытая высокім двухсхільным дахам з макаўкай над алтаром. У архітэктуры царквы адлюстраваны характэрныя прыёмы народнага дойлідства.

в. Лішнікі, Драгічынскі сельсавет

515. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Насупраць клуба. На ўшанаванне памяці 36 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.



516. *Успенская царква. План.*

516. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі, каля шашы Пінск — Брэст. Пабудавана ў 1792 г. з дрэва. У 1930-я гады да царквы прыбудавана званіца.

Царква складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага зруба і пяцісценнай апсіды, накрытых гонтавым дахам з хвалямі над трохвугольнымі і алтарнага зрубаў. На сярэдзіне вільчыка даху барабан па васьмерыку, завершаны галоўкай. Рызніцы, прыбудаваныя абапал алтара, маюць стромкае пакрыццё. Галоўны аб'ём падзелены 6 слупамі на 3 нефы, у паўднёвай частцы — хоры на 2 слупах.

Царква — прыклад драўлянай культавай пабудовы з выразнай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй і лаканічнымі архітэктурна-дэкаратыўнымі сродкамі. *Т. В. Габрусь*

в. Людвінова, Пацінскі сельсавет

517. МЕСЦА ЖЫЦЦЯ АЖЭШКІ Элізы (гіст.). Тут у 1858—64 гг. жыла вядомая польская пісьменніца Э. Ажэшка (дзявочае прозвішча Паўлоўская, 1841—1910).

У 1857 г. Э. Паўлоўская, вярнуўшыся з Варшаўскага пансіёна, пасябравала ў Гродне з уладальнікам маёнтка Людвінова Пятром Ажэшкам, у пачатку 1858 г. выйшла за яго замуж, пазней пераехала да мужа ў Людвінова. Тут яна бліжэй пазнаёмілася з жыццём прыгонных беларускіх сялян, дапамагала ім у час голаду і хвароб. У 1862 г. арганізавала сялянскую школу, у якой навучалася 20 хлопчыкаў. У доме Ажэшкаў збіралася прагрэсіўна настроеная шляхта. Малодшы брат П. Ажэшкі Фларыян (выхаванец Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі) пазнаёміў яе з поглядамі рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў, з нелегальнай літаратурай.

9.11.1862 г. ў Людвінове збіралася навакольная шляхта, каб вырашыць пытанне аб удзеле ў паўстанні. У час паўстання 1863—64 гг. Э. Ажэшка перадавала ў паўстанскі атрад Рамуальда Траўгута звесткі пра дыслакацыю царскіх войск, прыносіла прадукты харчавання. У Людвінове лячыўся параненаы Р. Траўгут (жыў у в. Востраў). У ліпені 1863 г. Э. Ажэшка дапамагла яму перабрацца ў Польшчу, дзе ён узначаліў штаб паўстання. За ўдзел у паўстанні Пятра і Фларыяна Ажэшкі былі арыштаваны і сасланы, а Людвінова секвестравана. У 1864 г. Э. Ажэшка пераехала ў Мількаўшчыну (Гродзеншчына), пазней жыла пераважна ў Гродне.

Э. Ажэшка называла Людвінова універсітэтам свайго жыцця. Тут яна пачала літаратурную дзейнасць, пісала «празаічныя страфы», перакладала Байрана (рукапісы спаліла). Людвінаўскія ўражанні пакладзены ў аснову апавядання «Малюнак з галодных гадоў» (1866 г.), аповесці «Пан Граба» (1870 г.) і іншых твораў. Імем Э. Ажэшкі названа вуліца ў в. Людвінова.

Літ.: Гапава В. І. Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць.— Мн., 1969; Jankowski E. Eliza Orzeszkowa.— 2 wyd.— Warszawa, 1966. *А. І. Мальдзіс*

в. Ляхавічы, Пацінскі сельсавет

518. ЦАРКВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з дрэва.

Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя складаецца з тамбура са званіцай, бабінца, залы, апсіды з прыдзеламі. Будынак мае 2 вертыкальныя дамінанты: трох'ярусную шатровую званіцу і васьмігранны светлавы барабан з шатром над галоўным аб'ёмам. Фасады апрацаваны гарызантальнай шалёўкай, прарэзаны прамавугольнымі вокнамі ў ліштвах.

Царква — прыклад драўлянага дойлідства. *А. М. Кулагін*

в. Маліваўка, Асавецкі сельсавет

519. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). За 2 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны 9 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Маркавічы, Немяржанскі сельсавет

520. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Маркавічы». На ўшанаванне памяці 40 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

526. *Міхайлаўская царква. Выгляд з боку апсіды.*



526. *Міхайлаўская царква. План.*

в. Новая Папіна, Папінскі сельсавет

521. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У скверы каля Дома культуры. Пахаваны члены сям'і партызана М. І. Боцеха, забітыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. пастаўлена надмагілле.

522. МАГІЛА ЖУКОЎ Яна і Стэфана (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны удзельнікі нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863—64 гг. Я. і С. Жукі. У канцы 19 ст. пастаўлены 2 надмагіллі з мармуровымі крыжамі.

523. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці землякоў — партызан і воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Нямерка, цэнтр сельсавета

524. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка сельсавета. На ўшанаванне памяці 36 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Осаўцы, цэнтр сельсавета

525. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У скверы насупраць школы. Курган насыпаны ў 1965 г. на ўшанаванне памяці воінаў, партызан і мірных жыхароў (усяго 41 чалавек), якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На Кургане пастаўлены абеліск.

526. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1780 г. з дрэва.

Будынак складаецца з 3 прамавугольных у плане зрубаў ад ніжэйшага да вышэйшага, над франтонам накрытых агульным дахам з хвалямі ў месцах іх злучэння. Вільчык даху над сярэднім зрубам праразаны барабанам з галоўкай. На баках алтарнага зруба невялікія сіметрычныя прыбудовы-рызніцы. Двухярусная чатырохгранная брамазвонніца каркаснай канструкцыі з гонтавым шатровым дахам стаіць асобна.

Царква — помнік драўлянага дойлідства.

Т. В. Габрусь

в. Падлессе, Антопальскі пасялковы Савет

527. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 14 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1964 г. пастаўлены абеліск.

в. Папіна, цэнтр сельсавета

528. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1810 г. з дрэва.

Царква двухзрубная. Прамавугольны асноўны і пяцігранны алтарны зрубы накрыты агульным вальмавым дахам, у цэнтры якога цыбулепадобная галоўка на чацверыку. З поўдня да алтара прыбудавана нізкая рызніца, пры галоўным уваходзе — тамбур з двухсхільным дахам. Перад царквой — двух'ярусная каркасная чацверыковая званіца.

Царква — помнік [illegible] дойлідства Палесся.

Т. В. Габрусь

в. Перашамань,
Антопальскі пасялковы Савет

529. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ [illegible] 0,8 км на поўнач ад вёскі. Тут у [illegible] нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі больш за 4 тыс. мірных жыхароў. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Пярковічы,
Драгічынскі сельсавет

530. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У скверы. Курган насыпаны ў 1968 г. на ўшанаванне памяці 21 воіна-аднавяскоўца, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні Кургана пастаўлены помнік — стэла з вобразам паплечнай скульптуры воіна.

528. Папіна. Праабражэнская царква.



528. Праабражэнская царква. План.

530. Курган памяці.

531. СЯДЗІБА (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў пачатку 19 ст. Цяпер тут размешчана санаторная лясная школа.

У аснову планіроўкі ансамбля пакладзена падоўжная восевая кампазіцыя з сядзібным домам у цэнтры рэгулярна-пейзажнага парку. Галоўная алея злучае сядзібны дом і царкву, арыентаваныя адзін да аднаго галоўнымі фасадамі. Пейзажная частка



531. Сядзіба. Схема планіроўкі. 1 — сядзібны дом, 2 — царква.

531. Сядзібны дом. Галоўны фасад



531. Сядзібны дом. План 1-га п[illegible]



531. Царква. План

нальу разбіта за сядзібным домам ва кол штучнага вадаема. Гаспадарчыя пабудовы не захаваліся.

Сядзібны дом прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак з мансардай і невялікім рызалітам з пілястрамі. Мансардавы паверх, накрыты ламаным вальмавым дахам, узвышаецца над цэнтральнай часткай і на галоўным фасадзе вырашаны фігурным трохступеньчатым атыкам з ромбічнымі вокнамі. Абодва паверхі маюць калідорную планіроўку з 2 тарцовымі двухмаршавымі лесвіцамі. Цэнтральную частку будынка займалі парадныя залы, выяўленыя на дваровым фасадзе трохгранным эркерам. Аздоба інтэр'ера не захавалася.

Царква — аднанефавы прамавугольны ў плане мураваны аб'ём пад двухсхільным дахам. Вырашана ў буйных манументальных формах позняга класіцызму. Сцены з высокімі аконнымі праёмамі расчлянёўваны магутнымі спаранымі пілястрамі. Галоўны ўваход вылучаны порцікам з франтонам на здвоеных паўкалонах. Інтэр'ер залы, сцены ўнутры расчлянёўваны парнымі пілястрамі. У пазадзяшні частцы інтэр'ера хоры, якія падтрыманы калонамі магутнымі [illegible].

У архітэктуры сядзібна-паркавага ансамбля выявіліся рысы позняга класіцызму. *А. М. Ку[illegible].*

в. Раины, Драгічынскі сельсавет

532. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Радастава, цэнтр сельсавета

533. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 18[illegible] г. з дрэва.

Будынак трохзрубны. Апсідны квадратны ў плане зруб накрыты чатырохсхільным дахам з 4 галоўкамі на вуглах і большай у сярэдзіне, большы шырокі алтарны зруб і бабінец — двухсхільнымі. Пры ўваходзе прыбудавана трох'ярусная шатровая званіца. Будынак гарызантальна ашаляваны і багата аздоблены разьбой.

Архітэктура царквы мае рысы псеўдарускага стылю. *Т. В. Га[illegible]рнс.*

в. Сварынь, Радастаўскі сельсавет

534. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля школы. Пахаваны 52 воіны і 3 партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

535. МЕСЦА РАЗМЯШЧЭННЯ ШТАБА БРЭСЦКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ І ШПІТАЛЯ (гіст.).

У час [illegible] акупацыі в. Сварынь была адным з [illegible] цэнтраў, вакол якога групаваліся больш за 20 атрадаў. Тут у 19[illegible] размяшчаліся штаб Брэсцкага партызанскага злучэння і партызанскі шпіталь. [illegible] абслугоўваўся партызанскім атрадам. У 1967 г. у гонар партызан Брэсцкага злучэння у скверы насупраць школы пастаўлены абеліск.

[illegible]

в. Свяконічы, Антопальскі пасялковы Савет

536. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі каля клуба. На ўшанаванне памяці 11 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлена стэла.

в. Сіманавічы, Вулькаўскі сельсавет

537. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У сквeры. Курган насыпаны ў 1967 г. на ўшанаванне памяці 1[illegible]8 савецкіх воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні Кургана пастаўлены абеліск.

в. Сорацаі, Гутаўскі сельсавет

538. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 144 мірных жыхароў в. Сорацаі, якія былі расстраляны гітлераўцамі 15.9.1943 г., у 1975 г. пастаўлены абеліск.



538. *Пакроўская царква. План*

538. *Пакроўская царква. Бакавы фасад*

в. Старамлыны, Хомскі сельсавет

539. ГАРАДЗІШЧА (археал.). За 0,3 км на поўдзень ад в. Старамлыны на правым беразе р. Ясельда, каля могілак.

Гарадзішча займае прыбярэжны ўзгорак. Авальнай формы (50×60 м), вышыня да 4 м. З паўднёвага захаду да ўзгорка прылягае крыху ніжэйшая пляцоўка, якая праз 20—30 м пераходзіць у кар'ер. Вядома з канца 19 ст. Даследавалі ў пачатку 20 ст. Е. Р. Раманаў, у 1970 г. П. Ф. Лысенка. У абрыве кар'ера прасочваецца культурны пласт інтэнсіўна-чорнага колеру. Выяўлены рэшткі ганчарнай керамікі 11—13 стагоддзяў, арнаментаванай рыфленнем і хвалістай лініяй. Знойдзена жыллё паўзямлянкавага тыпу і ямы гаспадарчага прызначэння. Гарадзішча адносіцца да паселішчаў 11—13 стагоддзяў.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Романов Е. Р. По Гродненскому Полесью (Из записной книжки археолога) // Записки Северо-Западного отдела Русского географического общества. Вильна, 1911, кн. 3. *П. Ф. Лысенка*

в. Субаты, Брашавіцкі сельсавет

540. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1797 г. з цэглы.

Будынак — прамавугольны ў плане аб'ём, накрыты двухсхільным дахам з вальмай над трохграннай апсідай. Вільчык даху завершаны 2 васьміграннымі драўлянымі барабанамі з галоўкамі. Сцены будынка з вялікімі паўцыркульнымі аконнымі праемамі раскрапаваны ў прасценках пілястрамі. Фрыз антаблемента раскрапаваны выступамі адпаведна пілястрам. Пластыка галоўнага фасада, завершанага трохвугольным шчытом з дзвюхгранай галоўкай, узбагачана паўцыркульнымі нішамі з кокашнікамі. Асноўны аб'ём перакрыты драўляным столлю на бэльках з невялікімі падугамі. Над уваходам — трапецападобныя ў плане хоры.

Царква — помнік архітэктуры класіцызму. *Т. В. Габрусь*



540. *Царква Раства Багародзіцы. План*

в. Татарнавічы. Антопальскі пасялковы Савет

541. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На ўскраіне вёскі, каля дарогі на Антопаль. На ўшанаванне памяці 6 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлена стэла.

в. Усходы, Немяржанскі сельсавет

542. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 25 мірных жыхароў, расстраляных 23.8.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Хомск, цэнтр сельсавета

543. КУРГАН (археал.). За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на полі каля балота. Вышыня да 1,7 м, дыяметр 7 м. Выявіў у канцы 19 ст. Ф. В. Пакроўскі, абследаваў у 1970 г. Л. Д. Побаль. Раскопкі не праводзіліся.

544. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны мірныя жыхары в. Хомск, загубленыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У Вялікую Айчынную вайну на тэрыторыі Хомскага сельсавета дзейнічала партызанская брыгада імя Я. М. Свярдлова. Яе атрады не раз нападалі на нямецкі гарнізон у Хомску і разграмілі яго. Усе спробы гітлераўцаў зноў размясціць у вёсцы гарнізон былі [illegible]. Летам 1943 г. акупанты спалілі в. Хомск, а жыхароў расстралялі.

У 1965 г. на магіле ахвяр фашызму пастаўлены абеліск. *В. Л. [illegible]*

545. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі каля дарогі Белаазёрск — Драгічын

540. *Царква Раства Багародзіцы*

548. *Святадухаўскі касцёл. Фрагмент франтона і навершша.*

548. *Святадухаўскі касцёл. План.*

Пахаваны 2 тыс. мірных жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

546. МАГІЛА МАКАРЭВІЧА Яўгена Георгіевіча (1943). На паўночнай ускраіне вёскі, каля дарогі Хомск — Белаазёрск.

Камандзір атрада Брэсцкага партызанскага злучэння Я. Г. Макарэвіч нарадзіўся 12.12.1921 г. ў г. Запарожжа. У пачатку 1941 г. скончыў Астраханскае стралкова-кулямётнае вучылішча, быў накіраваны ў г. Гомель. У першыя дні вайны трапіў у палон, уцёк. Арганізаваў партызанскую групу, потым атрад, гераічна змагаўся з акупантамі. Байцы атрада, якім ён камандаваў, ахоўвалі 4 сямейныя лагеры, грамілі варожыя гарнізоны ў Брашэвічах, Вавулічах, Бездзежы, Хомску, узрывалі чыгуначныя масты на перагоне Драгічын — Антопаль, на вузкакалейцы Целяханы — Іванава. Падрыўнікі атрада пусцілі пад адхон некалькі эшалонаў праціўніка. Я. Г. Макарэвіч загінуў летам 1943 г. У ліпені 1943 г. яго імя было прысвоена атраду.

У 1968 г. на магіле пастаўлена стэла.

Літ.: Залескі А. І. Дарогамі партызанскай Беларусі.— Мн., [illegible]; Шуб[illegible] [illegible] — Мн., [illegible]

В. Л. Шацілa.

547. ПОМНІК КІРАВУ Сяргею Міронавічу (1970). Каля будынка праўлення калгаса імя С. М. Кірава. Бюст савецкага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча С. М. Кірава ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Язвіны, Асавецкі сельсавет

548. СВЯТАДУХАЎСКІ КАСЦЁЛ (архіт.). На паўночны ўсход ад вёскі на ўзлессі. Пабудаваны ў 17[illegible]0 г. з цэглы.

Асноўны квадратны ў плане аб'ём невялікім уступам пераходзіць у паўкруглую апсіду, арыентаваную на ўсход. Уся пабудова накрыта стромкім двухсхільным дахам, паўкруглым над алтарнай часткай. Сцяна галоўнага фасада завершана франтонам малюнічага увагнута-выпуклага абрысу. Вось сіметрыі пабудовы падкрэслена праёмам увахода. Пры перабудове касцёла ў праваслаўны храм у сярэдзіне вільчыка даху была зроблена цыбулепадобная галоўка на высокім васьмерыковым барабане. Пластыку архітэктуры узбагачаюць скругленыя вуглы будынка, лапаткі і нішы з ракавінамі на галоўным фасадзе. Галоўнае памяшканне перакрыта цыліндрычным скляпеннем, апсіда — конхай. Будынак асветлены 4 лучковымі аконнымі праёмамі і круглым люнетам у апсідзе.

Касцёл — помнік архітэктуры барока.

Т. В. Габрусь.

в. Ялач, Асавецкі сельсавет

549. КУРГАН (архел.). На ўсходняй ускраіне вёскі, на лузе. Вышыня 2,[illegible] м, дыяметр 18 м. [illegible] 1,0 [illegible] Абследаваў у 197[illegible] г. І. Д. [illegible] Раскопкі не праводзіліся.

ЖАБІНКАЎСКІ РАЁН

VII. ЖАБІНКА

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны ў сутоку рэк Мухавец і Жабінка. За 30 км на ўсход ад Брэста. Чыгуначны вузел з напрамкамі на Мінск, Брэст, Гомель.

Жабінка адносіцца да населеных пунктаў, што ўзніклі ў апошняй чвэрці 19 ст. у сувязі з будаўніцтвам чыгункі Масква — Брэст, якая ў 1871 г. прайшла праз Кобрынскі павет. Была пабудавана чыгуначная станцыя Жабінка, пры ёй узнік пасёлак, які значна вырас пасля 1882 г., калі ад Жабінкі

VII. *Будынак райвыканкома*

да Пінска быў пракладзены ўчастак Палескіх чыгунак. У канцы 19 ст. Жабінка мела каля 30 двароў, некалькі крам, гасцініцу і пошту. У пачатку 20 ст. тут створаны першыя прамысловыя прадпрыемствы: суконная майстэрня і млын.

У час 1-й сусветнай вайны Жабінка ў 1915—18 гг. акупіравана нямецкімі войскамі, у 1919—20 гг. — войскамі буржуазнай Польшчы. Савецкая ўлада дзейнічала ў ліпені — жніўні 1920 г. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Жабінка адышла да буржуазнай Польшчы і ўваходзіла ў Кобрынскі павет Палескага ваяводства. Працоўныя змагаліся за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Барацьбу ўзначальвала мясцовая група КПЗБ. У 1933 г. баставалі рабочыя лесапільнага завода. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР пачаліся карэнныя сацыялістычныя пераўтварэнні. З 1940 г. цэнтр раёна, з 1970 г. горад.

У Вялікую Айчынную вайну Жабінка з 23.6.1941 г. да 18.7.1944 г. была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Дзейнічалі падпольныя міжрайком КП(б)Б Брэсцкага і Жабінкаўскага р-наў, Жабінкаўскі райком ЛКСМБ.

Сучасны горад развіваецца ў паўднёва-ўсходнім напрамку ўздоўж чыгункі, якая падзяляе гарадскую тэрыторыю на 2 часткі: паўднёвую — жылую і паўночную — прамысловую.

Будынкі адміністрацыйна-грамадскіх і культурна-асветных устаноў сканцэнтраваны на вул. Кірава — галоўнай вуліцы горада. Тут размешчаны будынкі райкома КПБ, райвыканкома, Дом культуры, кінатэатр, будынак вузла сувязі, універмаг, камбінат бытавога абслугоўвання, рэстаран і інш.

Капітальная забудова — у асноўным на вуліцах Кірава і Свабоды. Тут узведзены 3-павярховыя жылыя дамы. Да вул. Кірава прымыкае новы мікрараён, які забудоўваецца сучаснымі добраўпарадкаванымі жылымі дамамі. У цэнтральнай частцы горада на вул. Шевчэнка ўстаноўлены помнік У. І. Леніну. На вул. Кірава пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны.

VII. *Помнік У. І. Леніну*

Асноўныя прамысловыя прадпрыемствы горада: цукровы, камбікормавы, асфальтабітумны заводы. Працуюць раённыя аб'яднанні Дзяржкамсельгастэхнікі і «Сельгасхімія», будаўнічыя арганізацыі.

У горадзе 2 сярэднія, рабочай моладзі, музычная, дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, спецшкола-інтэрнат, 4 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, Дом піянераў і школьнікаў, 4 бібліятэкі, бальніца, паліклініка. Выдаецца раённая газета «Сельская праўда». Зона адпачынку размешчана каля р. Мухавец.

Літ.: Жучкевич В. А., Малышев А. Я., Рогозин Н. Е. Города и сёла Белорусской ССР: Историко-географические очерки. — Мн., 1959.

В. Б. Караткевіч, Т. І. Чарнякоўская.

550. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Кірава, у цэнтры горада. Пахаваны 249 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. на тэрыторыі раёна. Сярод пахаваных воіны 20-й стралковай дывізіі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, што загінулі 18.7.1944 г. пры вызваленні Жабінкі. У 1975 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна на пастаменце, перад якой запалены Вечны агонь.

Літ.: Бут в огне. [?] — 3 изд. — Мн., 1977. *М. А. Багданава.*

VII. *Будынак сярэдняй школы № 1*

551. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 360 мірных жыхароў — старых, жанчын, дзя

550. [illegible]

[illegible] загінуў у баі з нямецка-фашысцкімі акупантамі 27.9.1942 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

552. МАГІЛА ДЗМІТРУКА Аляксея Данілавіча (гіст.). На могілках. Партызан А. Д. Дзмітрук загінуў у баі з нямецка-фашысцкімі акупантамі 21.8.1942. У 1953 г. на магіле пастаўлены [illegible].

553. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АНУФРЫЮКУ Сяргею Сямёнавічу і **ДЗМІТРУКУ** Аляксею Данілавічу (гіст.). Вул. Нагапова, 2[illegible].

С. С. Ануфрыюк — член КПЗБ, у 1941 г. супрацоўнік Жабінкаўскага раааддзела міліцыі. Расстраляны гітлераўцамі ў 1942 г.

А. Д. Дзмітрук — член КПЗБ, у 1941 г. начальнік Жабінкаўскага раааддзела міліцыі, у Вялікую Айчынную вайну — партызан атрада імя М. М. Чарняка. Загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх [illegible] 1942.

У 1967 г. на ўшанаванне памяці С. С. Ануфрыюка і А. Д. Дзмітрука на будынку аддзела ўнутраных спраў Жабінкаўскага райвыканкома ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Імем А. Д. Дзмітрука названа вуліца ў Жабінцы. *М. М. [illegible]*

554. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). Вул. Кірава, 61. Устаноўлена ў 1965 г. на ўшанаванне памяці партызан І. В. Ватульчанкі, А. Кудзева, А. К. Кудзява, М. А. Пепіна, закатаваных у 1943 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

555. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Вул. Камсамольская. Пабудавана ў 1885 г. з дрэва.

Вялікі прамавугольны ў плане асноўны зруб накрыты чатырохсхільным дахам з гранёнай вежачкай у цэнтры. Да яго прылягаюць з усходу пяцігранная апсіда з прамавугольнымі рызніцамі па баках, з захаду — бабінец, завершаны двух'ярусная вежачка[illegible] з купалам. Уваходы з трох бакоў праз невялікія прытворы, афармленыя ў выглядзе порцікаў з трохвугольнымі франтонамі. У аздобе фасадаў шырока выкарыстаны элементы класіцыстычнага дэкору: рыштаваныя прафіляваныя карнізы з кранштэйнамі і метопамі, капітэлі, клінчатыя русты абрамленні акон.

Архітэктура царквы мае выразныя рысы неакласіцызму. *Т. І. Чарнаўская*

556. ПОМНІК АКТЫВІСТАМ (гіст.). На вул. Кірава. На ўшанаванне памяці савецкіх актывістаў М. Дзяркача, М. і У. Пракапчукоў, Б. Ячніка, расстраляных 20.5.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у 1954 г. на месцы расстрэлу пастаўлена стэла.

551. *Помнік [illegible] ахвяр фашызму.*

557. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля канторы саўгаса «Жабінкаўскі». На ўшанаванне памяці 50 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

555. *Пакроўская царква. Бакавы фасад.*



[illegible] царква. План.

558. *Помнік У. І. Леніну*

558. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля адміністрацыйнага будынка цукровага завода. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1976 г.

в. Агароднікі, Якаўчыцкі сельсавет

559. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пахаваны 6 савецкіх лётчыкаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. на магіле лётчыкаў і на ўшанаванне памяці 42 загінуўшых воінаў-землякоў пастаўлены абеліск.

в. Азяты, цэнтр сельсавета

560. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 16 жыхароў вёскі, расстраляных гітлераўцамі ў сакавіку 1944 г. ў час карнай аперацыі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

561. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва. Да асноўнага аб'ёму, квадратнага у плане, далучаны чатырохсценная апсіда і праз пераходны зруб трох'ярусная званіца, накрытая васьміграпным шатром. У цэнтры асноўнага аб'ёму — купал на васьміграпным светлавым барабане. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

562. РАДЗІМА КРАЧКОЎСКАГА Юліяна Фаміча (гіст.).

Беларускі і рускі этнограф, педагог і гісторык Ю. Ф. Крачкоўскі нарадзіўся 25.7.1840 г. ў сялянскай сям'і. Скончыў Літоўскую духоўную семінарыю і Пецярбургскую духоўную акадэмію. Адмовіўся ад духоўнага сана і стаў выкладчыкам рускай мовы. Каля 30 гадоў працаваў у Маладзечанскай і Полацкай настаўніцкіх семінарыях, інспектарам народных вучылішчаў Тульскай і Віленскай губерняў, дырэктарам Туркестанскай настаўніцкай семінарыі. У 1888–1902 гг. быў старшынёй Віленскай камісіі для разбору і выдання старажытных актаў.

Першы артыкул Ю. Ф. Крачкоўскага (апісанне вясельнай абраднасці беларусаў) з'явіўся ў 1868 г. Асноўныя этнаграфічныя працы: «Нарысы быту заходнерускага селяніна» (1869 г.), «Быт заходнерускага селяніна» (1874 г.). У сваіх працах ён знаёміў чытачоў з багаццем і разнастайнасцю побыту беларусаў, іх вуснапаэтычнай творчасцю. Беларускія фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы дасылаў беларускаму і рускаму этнографу і фалькларысту П. В. Шэйну. Ю. Ф. Крачкоўскі памёр 25.7.1903 г.

Літ.: Голуб В. Юлиан Фомич Крачковский: Биографический очерк.— Вильна, 1904; Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст.— Мн., 1964.

В. К. Бандарчык

в. Арэпічы, Сцяпанкаўскі сельсавет

563. МАГІЛА РАЦЮКА Фёдара Яўцуховіча (гіст.). За 1 км на захад ад вёскі, у лесе. Старшы лейтэнант Ф. Я. Рацюк загінуў у ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

564. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1761 г. з дрэва. Двух'ярусная званіца прыбудавана ў сярэдзіне 19 ст.

Асноўны зруб у плане мае форму выцягнутага прамавугольніка, да якога прыбудавана двух'ярусная званіца. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя грунтуецца на кантрасце нізкага падоўжанага зруба і высокай званіцы. Гладкая бэлька карніза, якую падтрымліваюць кранштэйны, алучае зруб з 1-м ярусам званіцы. У цэнтры даху узвышаецца макаўка пад невялікім шатром.

Царква — прыклад традыцыйных аднаэрубных культавых збудаванняў.

Т. І. Чарняўская



564. *Пакроўская царква. План*

560. *Помнік на магіле ахвяр фашызму*

в. Бусні, Ленінскі сельсавет

565. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 49 жыхароў вёскі, расстраляных у 1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 19.. г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Вежкі, Якаўчыцкі сельсавет

566. ПОМНІК ЧАПАЕВУ Васілю Іванавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя В. І. Чапаева. Бюст героя Грамадзянскай вайны В. І. Чапаева ўстаноўлены ў 1976 г.



564. *Пакроўская царква*

в. Вялікія Сяхновічы, Крыўлянскі сельсавет

567. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (ар[illegible]). У цэнтры вёскі. Пабудавана [illegible] з дрэва, [illegible] 1850-я гады.

Будынак — прамавугольны зруб з арыгінальнай алтарнай часткай у плане мнагагранніка (унутры па баках 2 ryзніцы), у верхнім трохграннай. З захаду да асноўнага аб'ёму прылягае аднапавярховы па вышыні квадратны бабінец, завершаны высокім чацверыком званіцы, накрытым шатром з галоўкай. Дах двухсхільны, над алтарнай часткай, дзе размешчана невысокая фігурная трохсхілы. Сцены вертыкальна ашаляваны. Аконныя праёмы з вуглавым завяршэннем, маюць вітражы з геаметрычным малюнкам пераплётаў. Інтэр'ер падзелены 4 калонамі на 3 нефы. У заходняй частцы хоры у выглядзе арачнай галерэі апіраюцца на 4 круглыя ў плане калоны.

Царква — прыклад драўлянага паркава дойлідства. Т. І. Чарняўская.

в. Вялікія Якаўчыцы, цэнтр Якаўчыцкага сельсавета

568. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Прамень». На ўшанаванне памяці [illegible] землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а таксама расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Верхі, Сцяпанкаўскі сельсавет

569. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка школы. На ўшанаванне памяці 13 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Глыбокае, Крыўлянскі сельсавет

570. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). За 0,7 км на паўднёвы захад ад вёскі. На ўшанаванне памяці 38 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Дзямянічы, Хмелеўскі сельсавет

571. РАДЗІМА ГЕРМАНОВІЧА Маркіяна Якаўлевіча (гіст.).

Савецкі ваенны дзеяч, герой Грамадзянскай вайны, камкор М. Я. Германовіч нарадзіўся 10.11.1895 г. Член КПСС з 1918 г. У Чырвонай Арміі з красавіка 1918 г. У Грамадзянскую вайну быў камандзірам палка, брыгады, дывізіі, удзельнічаў у разгроме англа-амерыканскіх інтэрвентаў на Поўначы, арміі Урангеля, бандаў Махно. Пасля вайны камандзір дывізіі, корпуса. З 19[illegible] г. памочнік камандуючага войскамі Беларускай, Сярэднеазіяцкай і Маскоўскай ваенных акруг. У 1934—37 гг. начальнік Акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА. З сакавіка 1937 г. намеснік камандуючага войскамі Ленінградскай ваеннай акругі. У 1925—27 гг. член ЦВК БССР, у 1927—28 гг. кандыдат у члены ЦВК БССР. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга. М. Я. Германовіч памёр 20.9.1937 г. Яго імем названа вуліца ў Жабінцы.



567. *Мікалаеўская царква. План.*

567. *Мікалаеўская царква. Выгляд з паўночнага захаду.*

в. Драмлёва (не існуе), Сцяпанкаўскі сельсавет

572. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Драмлёва знаходзілася за 1 км на ўсход ад в. Сцяпанкі. На світанку 11.9.1942 г. у вёску ўварваліся гітлераўцы. Карнікі сагналі вяскоўцаў у хлеў і сталі рабаваць вёску. Потым акупанты расстралялі жыхароў і падпалілі вёску. Усяго было забіта і спалена 283 чалавекі, знішчаны [illegible] двары. Вёска не адрадзілася.

У памяць аб загінуўшых людзях і спаленай вёсцы ў 1967 г. насыпаны курган, на вяршыні якога ўсталяваны гранітны валун. Вёска Драмлёва ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944 гг.— [2 изд.].— Мн., [illegible]. *[illegible]*

572. *Помнік на месцы спаленай нямецка-фашысцкімі акупантамі в. Драмлёва.*

в. Жыцін, Сцяпанкаўскі сельсавет

573. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1,5 км на захад ад вёскі, на дарозе на в. Лясоты. Пахаваны [illegible]0 савецкіх грамадзян, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі. 29.10.1942 г. атрад гітлераўцаў уварваўся ў вёску. Фашысты схапілі і расстралялі сем'і ваеннаслужачых і савецкіх актывістаў, абрабавалі іх ха

574. *Мікітаўская царква. Выгляд з боку апсіды.*

574. *Званіца Мікітаўскай царквы.*

ты. Сярод забітых 12 жанчын і 21 дзіця. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. *Г. І. Д...*

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944 гг. 2 изд. Мн., 1965.

в. Здзітава, Жабінкаўскі гарсавет

574. МІКІТАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўскраіне вёскі, на правым беразе р. Мухавец. Пабудавана з дрэва. Звесткі аб царкве вядомы з пачатку 16 ст. Капітальна перабудавана ў 1787 г.



574. *Мікітаўская царква. План.*

Будынак складаецца з трох частак асноўнага зруба, бабінца і апсіды, пакрытых высокім вальмавым дахам з галоўкай. Прамавугольны зруб бабінца з харамі прылягае да асноўнага з захаду. Рызніцы прыбудаваны да апсіды і пакрыты аднасхільнымі дахамі. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, умацаваны сцяжкамі і прарэзаны высока размешчанымі прамавугольнымі вокнамі. Каркасны тамбур прыбудаваны пазней (19 ст.).

Двух'ярусная званіца (чацверык на чацверыку), пакрытая шатром, стаіць асобна з паўднёва-ўсходняга боку ад царквы.

Царква вызначаецца манументальнасцю аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, дасканалымі прапорцыямі і багаццем традыцыйных дэкаратыўна-выяўленчых сродкаў. *Т. І. Чарняўская*

в. Крыўляны, цэнтр сельсавета

575. РЭШТКІ ЗАМКА (гіст.). Непадалёку ад вёскі, на правым беразе безыменнай балоцістай рэчкі. У 17 ст. тут знаходзіўся замак князёў Чартарыйскіх. Захаваліся рэшткі замчышча і земляныя ўмацаванні вонкавай лініі абароны — валы, бастыёны, равы. Замчышча, квадратнае ў плане, займае 10 га. З паўночнага ўсходу і поўдня замак падзейна прыкрывала бастыённая сістэма. Магутныя валы шырынёю 7—8 і вышынёю 4 м над пляцоўкай дзядзінца агінаюць абарончы роў. Захаваліся сляды колішняга уезда. Балоцісты поплаў і рэчка прыкрывалі замак з захаду, таму штучныя ўмацаванні тут значна слабейшыя. У заходнім кутку дзядзінца знаходзіцца невялікі вадаём, абнесены высокім земляным валам і злучаны спецыяльным ровам з рэчкаю. На замчышчы знойдзены абломкі паліванай кафлі і керамікі.

Літ.: Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии.— У кн.: Труды девятого археологического съезда в Вильне 1893. М., 1895. *М. А. Ткачоў*



575. *План умацаванняў замка.*

пас. Ленінскі, цэнтр сельсавета

576. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Справа ад шашы Брэст — Масква. На ўшанаванне памяці 62 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

в. Маціевічы, Крыўлянскі сельсавет

577. ПОМНІК КУЙБЫШАВУ Валерыяну Уладзіміравічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя В. У. Куйбышава. Бюст выдатнага савецкага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча В. У. Куйбышава ўстаноўлены ў 1967 г.

578. ЦАРКВА (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі, на могілках. Пабудавана ў 1720 г. з дрэва, часткова перабудавана ў 1860-я гады, тады ўзведзена званіца.

Будынак складаецца з прамавугольнага асноўнага зруба і невялікага квадратнага ў плане бабінца аднолькавай з ім вышыні. Над бабінцам чацверык званіцы, аддзелены ад яго шырокім гонтавым споўкам і завершаны шатром з галоўкай. Асноўны зруб пакрыты двухсхільным дахам. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі і ўмацаваны сцяжкамі. Аконныя праёмы з паўцыркульным завяршэннем размешчаны высока. Зальны інтэр'ер у заходняй частцы падзелены 4 слупамі.

Перад царквой захавалася асобная драўляная двух'ярусная каркасная званіца (чацверык на чацверыку), першы ярус якой вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, другі — адкрыты.

Для помніка характэрны цэласнасць архітэктурнага аблічча, дасканаласць прапорцый і мастацкая выразнасць форм. *Т. І. Чарняўская*

в. Мышчыцы, Ленінскі сельсавет

579. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,3 км на поўдзень ад вёскі, побач з могілкамі. 12 насыпаў вышынёй 0,3—0,7 м, дыяметрам 8—14 м. Выявіў у 1968 г. В. Р. Супрун, абследаваў у 1970 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

в. Падлессе, Хмелеўскі сельсавет

580. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 11 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Палявая Рэчыца, Сцяпанкаўскі сельсавет

581. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАНА (гіст.). Каля шашы Высокае — Пружаны, за 100 м ад вёскі.

24.6.1941 г. сем чырвонаармейцаў на чале з камандзірам уступілі ў няроўны бой з гітлераўцамі. Яны ўстанавілі на ўскраіне лесу гармату і адкрылі агонь па праціўніку. У жорсткім баі былі знішчаны 2 варожыя танкі і 2 аўтамашыны. Мужныя воіны загінулі. Пазней побач з імі былі пахаваны 2 савецкія воіны і партызан А. В. Шульган, якія загінулі ў баях за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну.

[illegible]

в. Пятровічы, цэнтр сельсавета

582. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У лесе за 0,3 км на поўнач ад вёскі. Пахавана больш за 30 мірных [illegible], расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў верасні [illegible]

в. Ракітніца, Пятровіцкі сельсавет

583. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У калгасным садзе. Па ўшанаванне памяці 82 [illegible] загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. [illegible] курган, [illegible]

584. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ [illegible] На могілках. Пахаваны 36 [illegible] і сям'і ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў верасні 1941 г. У 1.[illegible] г. на магіле пастаўлены [illegible]

в. Старое Сяло, Аздзяцкі сельсавет

585. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН [illegible] На могілках. Партызаны Стараселькага атрада (з чэрвеня 1943 г. імя М. М. Чарнака) М. Ануфрыюк, В. Курылаў загінулі ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў [illegible] У 1.[illegible]8 г. на магіле пастаўлены [illegible]

586. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва урочышчы Раслаўка, абапал лясной дарогі у в. Антонава. 22 курганы [illegible] за мастком па сярэдзіне [illegible] дарог). Курганы круглыя, [illegible] насыпаны з пяску, дыяметрам 8—10 м, вышынёй 1—1,5 м. Могільнік вядомы з 19 ст. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961; Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии // Тр. Труды [illegible] М., 1895. [illegible]

587. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.).

587а. Могільнік-1. За 7 км на ўсход ад вёскі, у лесе. 3 насыпы вышынёй 0,3, 0,7 і 0,8 м, дыяметрам 7,9 і 4 м. Курганы задзернаваны, моцна апылілі і пашкоджаны ямамі скарбашукальнікаў. Абследавала ў 1980 г. Н. М. Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

587б. Могільнік-2. За 10 км на паўдзень ад вёскі, 6 паўсферычных насыпаў, якія задзернаваны і зараслі соснамі. Вышыня курганоў 0,4—0,5 м, дыяметр 10—13 м. Абследавала ў 1980 г. Н. М. Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся. *Н. М. Дубіцкая.*

588. ПАРТЫЗАНСКІЯ МОГІЛКІ (гіст.). За 2 км на поўдзень ад вёскі у лясным урочышчы Забродддзе. Пахаваны 57 партызан Стараселькага пар-



578. Царква. План.

тызанскага атрада (з чэрвеня 1943 г. атрад імя М. М. Чарнака, з ліпеня 1944 г. у брыгадзе імя І. В. Сталіна Брэсцкага партызанскага злучэння).

Старасельскі атрад створаны ў чэрвені 194[illegible] [illegible] партызаны [illegible] было 40 партызан. У [illegible] 1944 г. у атрадзе 1[illegible]0 чалавек. Камандзіры атрада [illegible] Т. Блаеў [illegible] Ф. Хом[illegible] камісары І. В. Зіле[illegible] [illegible] Ар[illegible]

Атрад правёў [illegible] баявых аперацый. Партызаны рабілі засады на камунікацыях ворага, [illegible] дыверсіі [illegible] У кастрычніку 1943 г. [illegible] 27 баявых аперацый, пусцілі пад адхон 13 эшалонаў [illegible] прадукцыя[illegible]

578. Ц[illegible]

[illegible] разграмілі фашысцкія гарнізоны у вёсках Азяты, Антонава, Вялікарыта, Макраны, Навасёлкі, Ракітніца, Ратна, Старое Сяло, Чарняны і інш. Атрад імя М. М. Чарнака 22.3.1944 г. [illegible] тыл, злучыўся з 1295-м стралковым палком 160-й стралковай дывізіі і разам з воінамі змагаўся з ворагам у Любамльскім р-не Валынскай і Дзівінскім р-не Брэсцкай абласцей. 15 мая атрад вярнуўся ў варожы тыл. Удругі раз злучыўся з Чырвонай Арміяй 21.7.1944 г.

588. П[illegible]

589. *Помнік на магіле М. М. Чарнака і чатырох партызан*

У 1969 г. на партызанскіх магілах пастаўлены помнік у выглядзе будана, побач — стэла, на якой устаноўлена мемарыяльная дошка з імёнамі загінуўшых партызан.

Літ.: Боровский А. И. О них молчали сводки [Брестское антифашистское подполье]. — Мн., 1970; Буг в огне: [Зб. успамінаў]. 3 изд. — Мн., 1977.

Г. І. Дулеба

589. ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ ПАРТЫЗАН (гіст., маст.). У вясковым скверы. Пахаваны 5 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных Міхаіл Мікітавіч Чарнак, адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Жабінкаўскім р-не ў Вялікую Айчынную вайну.

М. М. Чарнак нарадзіўся 1.11.1911 г. ў в. Старое Сяло Жабінкаўскага р-на ў сялянскай сям'і. Удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Член КПЗБ. Перад вайной працаваў старшынёй Старасельскага сельсавета. Адзін з стваральнікаў у 1941 г. Старасельскага партызанскага атрада і да 2.5.1943 г. намеснік камандзіра па разведцы. Вызначаўся арганізатарскімі здольнасцямі, храбрасцю і знаходлівасцю. Партызаны пад яго камандаваннем правялі шэраг баявых аперацый. Ён асабіста ўдзельнічаў у разгроме 4 варожых гарнізонаў, знішчыў да 40 гітлераўцаў. Аднойчы пад выглядам селяніна-возчыка М. М. Чарнак пранік на фашысцкі зброевы склад у Брэсце і вывез у партызанскі атрад 6 станковых кулямётаў, 10 скрынак гранат і патронаў. Імя М. М. Чарнака стала легендарным, наводзіла жах на фашыстаў. Яны абяцалі за яго галаву вялікую ўзнагароду. 2.5.1943 г. М. М. Чарнак загінуў у баі. Старасельскаму партызанскаму атраду было прысвоена імя М. М. Чарнака. Яго імем названа вуліца ў г. Жабінка.

У 1975 г. на магіле М. М. Чарнака і 4 партызан пастаўлены помнік (скульпт. Г. Пясецкі, арх. В. Пак; бетон, вышыня бюста 2,1 м, пастамента 3,5 м).

Помнік уяўляе сабой архітэктурна-скульптурны ансамбль, які складаецца з бюста М. М. Чарнака, устаноўленага на чатырохгранным пастаменце з невялікім ступеньчатым выступам на фасаднай частцы, і кальца, што злучаецца з пастаментам, зверху прыўзнятым над зямлёй (0,2 м) і пастаўленым на 2 невялікія падстаўкі. У цэнтры кальцо разарвана і ўтварае праход да надмагілля. Пастамент і кальцо абліцаваны гранітным карычнева-чырвоным друзам. Перад уваходам — стэла з выявай ордэна Айчыннай вайны. Справа ад помніка — другая стэла з памятным надпісам. Бюст і архітэктурныя элементы (пастамент, кальцо і стэлы) прасторава і пластычна звязаны паміж сабой. Вобраз М. М. Чарнака вырашаны ў рэалістычнай манеры.

Літ.: Боровский А. И. О них молчали сводки [Брестское антифашистское подполье]. — Мн., 1970; Буг в огне: [Зб. успамінаў]. 3 изд. — Мн., 1977.

Г. І. Дулеба, В. В. Церашчатава

в. Сцяброва, Жабінкаўскі гарсавет

590. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 72 мірныя жыхары, расстраляныя

592. *Міхайлаўская царква. Бакавы фасад*



592. *Міхайлаўская царква. Папярочны разрэз і план*

намецка-фашысцкімі захопнікамі 27.10.1942 г. Гітлераўцы пад выглядам праверкі дакументаў сагналі ў цэнтр Сяброва ўсе жыхароў і насельніцтва навакольных вёсак. 8 чалавек ямы прымусілі капаць яму. Адвячоркам фашысты прыгналі да ямы мірных жыхароў і расстралялі.

У 1967 г. на магіле ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии... 12 вып. Мн., 1965.

Т. І. Д...

в. Сцяпанкі, цэнтр сельсавета

591. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 280 жыхароў в. Дзямлёва, загубленых гітлераўцамі 11.9.1942 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. Гл. таксама артыкул № 572 «Месца спаленай вёскі».

592. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана да 1780 г. з дрэва. У пачатку 20 ст. да ўвахода прыбудавана трохярусная званіца, ніжні ярус якой з'яўляецца бабінцам.

Будынак трохнефавая базіліка. Цэнтральны неф, які пераходзіць у алтарную частку, накрыты двухсхільным дахам, бакавыя аднасхільнымі. На галоўным паўднёвым фасадзе бакавыя нефы завершаны 2 чацверыковымі вежамі з купаламі. Такі ж купал узвышаецца на даху цэнтральнага нефа. Васьмігранная вежа званіцы завершана шатром з галоўкай і аздоблена дэкаратыўнымі элементамі. Інтэр'ер падзелены на 3 нефы 4 калонамі, на 2 з якіх абапіраюцца хоры ў паўднёвай частцы будынка. Памяшканне асвятляецца невялікімі прамавугольнымі вокнамі ўверсе цэнтральнага нефа, а з бакоў — вялікімі лучковымі вокнамі з каляровым шклом геаметрычным малюнкам пераплётаў.

Царква з'яўляецца інтэрпрэтацыяй муравнага базілікальнага двухвежавага храма ў драўляным дойлідстве.

Т. І. Чарняўская

592. *Міхайлаўская царква. Іканастас*



594. *Праабражэнская царква. План*

594. *Праабражэнская царква. Выгляд з боку апсіды*

в. Хадосы, Леніцкі сельсавет

593. КУРГАН (археал.). За 0,5 км на поўдзень ад вёскі. Падоўжанай формы (40×15 м), вышыня 2 м. Насып добра захаваўся, задзернаваны. Выявіў у 1968 г. В. Р. Супрун. Абследавала ў 1980 г. Н. М. Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

в. Хмелева, цэнтр сельсавета

594. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўскраіне вёскі, на могілках. Пабудавана ў 1725 г. з дрэва. У 19 ст. часткова перабудавана (перароблены тамбур, зменены верх і інш.). Тады ж побач з храмам пастаўлена драўляная каркасная двух'ярусная званіца (1-ы ярус шалёваны, 2-і адкрыты ў выглядзе арак).

Царква ў плане крыжовая з пяціграннай апсідай і 2 рызніцамі на ўсход. Да галоўнага заходняга фасада, які ўтварае бабінец, прыбудаваны тамбур з шырокай лесвіцай. Аб'ём царквы цэнтрычны, камплектны, што дасягаецца адносна кароткімі крыламі трансепта і асобнымі дахамі: трохсхільнымі над крыламі трансепта, двухсхільным над бабінцам і пяцісхільным над алтаром. У дэкоры вынарыстаны класіцыстычныя дэталі: масіўныя руставаныя лапаткі на вуглах і на галоўным фасадзе. Над сяродкрыжжам — фігурная пяцімат'ярус... над галоўка. У інтэр'еры вылучаецца асноўная пяцьярусная... 2 калонкамі аддзелена ад трансептаў. Перакрыцце плоскае, бэлечнае.

Царква — прыклад крыжовага драўлянага храма, у якім рысы барока спалучаюцца з элементамі класіцызму.

Т. І. Ба...

в. Чыжоўшчына, Леніцкі сельсавет

595. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 9 жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 10.9.1943 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

596. УЛАДЗІМІРСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1894 г. з цэглы, на ме-

594. Прая... Бакавы ф...

59... У... мірская царква

...ды касцёла манастыра ... 16 ст. ... у 1882 г.)

Царква ў плане крыжападобная, з масіўным купалам на ... барабане ... над бабінцам. Усходняя частка ... завершана



596. Узд...мірская царква. План

шатрам ... апсідай. Сцены ... вертыкальнымі ... фасадаў нагадваюць формы ... рамантычнага дойлідства (аркатурны пояс, ..., своеасаблівыя ...). У інтэр'еры храма ... ...насць цэнтральная прастора ... размешчаны ў цэнтры ... для ... края, што ... на ... .

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. *Т. І. Ч...*

в. Шпіталі, Сцяпанкаўскі сельсавет

597. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ў гонар стварэння калгаса (гіст.). На будынку праўлення калгаса «Усход». Восенню 1940 г. жыхары вёскі Шпіталі і ... арганізавалі першы ў Брэсцкай вобласці калгас. У гонар гэтага падзеі ў 1968 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Шчэглікі, Леніцкі сельсавет

598. МАГІЛА ФІЛІПУКА Івана Дзмітрыевіча (гіст.). На могілках.

І. Дз. Філіпук — член КПЗБ, удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, пацярпелы ад ... У Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся ў 1908 г. у сялянскай сям'і. ... юнаком уключыўся ў рэвалюцыйную барацьбу. Вёў агітацыйную і арганізацыйную работу, праводзіў ... распаўсюджваў лістоўкі. Вясною 1928 г. арыштаваны і засуджаны на ... гады зняволення. Пасля выхаду з турмы быў сакратаром Жабінкаўскага падпольнага райкома КПЗБ. У студзені 1932 г. ... засуджаны на ... гады пазбаўлення волі. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. працаваў загадчыкам ... аддзела Жабінкаўскага райвыканкома. У Вялікую Айчынную вайну па заданні падпольнага камітэта ... падтрымліваў сувязь з савецкай разведчыцай ... У красавіку 1944 г. быў арыштаваны гітлераўцамі і забіты ... .

У 1957 г. на магіле І. Дз. Філіпука пастаўлены абеліск. *Г. І. Д...*

ІВАНАЎСКІ РАЁН

VIII. ІВАНАВА

Горад, цэнтр раёна. Размешчана на р. Самараўка (басейн Прыпяці), за [illegible]2 км на ўсход ад Брэста. Чыгуначная станцыя Янаў Палескі на лініі Брэст — Пінск. Аўтобусная станцыя.

Вырас з вёскі Янава, якой у 15 ст. быў нададзены статус мястэчка (кс[illegible] шняя уласнасць Шуйскіх, потым Аг[illegible]нскіх). Да канца 18 ст. ў Вялікім княстве Літоўскім, з 179[illegible] г. у складзе Расійскай імперыі, мястэчка [illegible]скага павета Слонімскай, з 1797 г. Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У 1897 г. ў Іванаве 3041 жыхар, 721 дамы (у т. л. 9 мураваных), 935 гаспадарчых пабудоў, народнае вучылішча, царкоўнапрыходская [illegible]а, сукнавальная фабрыка, [illegible] [illegible]тацельныя заводы, [illegible] 5 млыноў. У 1914 г. было 11 дробных прамысловых прадпрыемстваў. Галоўны занятак насельніцтва — земляробства, дробны гандаль і часткова [illegible]ніцтва.

У 1915—18 гг. акупіравана германскімі, у 1919—20 гг. польскімі войскамі. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў 1920 г. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. увайшло ў склад буржуазнай Польшчы, у Пінскі павет Палескага ваяводства. Налічвала [illegible] тыс. жыхароў. З 1939 г. Іванава ў складзе БССР, з 1940 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна Пінскай вобл. У Вялікую Айчынную вайну (з чэрвеня 1941 г. да 16.7.1944 г.) акупіравана нямецка-фашысцкімі [illegible]. У раёне дзейнічалі [illegible] райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ [illegible] [illegible]0.3.1944 г.), выдавалася [illegible] [illegible]ная газета «Партызан Палесся». З 8.1.1954 г. цэнтр раёна Брэсцкай вобл. (у 1962—65 гг. ў Драгічынскім р-не), з 1971 г. горад. У 1974 г. ў Мінскім філіяле Беларускага дзяржаўнага [illegible] навукова-даследчага і праектнага [illegible] горадабудаўніцтва распрацаваны генеральны план горада. Сучасны горад захоўвае гістарычна складзеную квартальную планіроўку. Цэнтральны жылы раён з капітальнымі жылымі і адміністрацыйнымі будынкамі размешчаны ў паўночнай частцы горада. Развіццё горада прадугледжана ў паўночным напрамку. Ажыццяўляецца рэканструкцыя галоўных вуліц — Савецкай, Леніна, Карла Маркса.

Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр — пл. Кастрычніка, дзе пастаўлены помнік У. І. Леніну. Тут знаходзяцца будынкі райкома КПБ і райвыканкома, Дом культуры, кінатэатр, школа і інш. У скверы — помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан. На паўночнай ускраіне па вул. Пушкіна знаходзяцца магілкі ахвяр фашызму.

За гады Савецкай улады пабудаваны завод па вытворчасці масла і сухога абястлушчанага малака, кансервавы завод, цэх Пінскага хлебазавода, завод жалезабетонных вырабаў. Працуюць міжраённае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі, камбінат бытавога абслугоўвання, птушкапітомнік-прадук[illegible] [illegible]тарная гаспадарка, 6 будаўнічых арганізацый. Цяпер прамысловая зона фарміруецца ва ўсходняй частцы горада. У Іванаве 3 сярэднія, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, 4 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, 2 масавыя бібліятэкі, кінатэатр, [illegible] [illegible] Выдаецца [illegible] раённая газета «[illegible]».

Зона адпачынку — гарадскі парк.

Літ.: Егоров Ю. А. Градостроительство Белоруссии. — М., 1954; Жучкевич В. А., Малышев А. Н., Рогозин Н. Т. [illegible] [illegible] Белорусской ССР. Историко-географические очерки. — Мн., [illegible]

У. Варанец, А. [illegible], М. [illegible]

599. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На пл. Кастрычніка, у скверы. Пахаваны [illegible]8 воінаў і партызан, якія загінулі ў [illegible]1944 г. на тэрыторыі Іванаўскага р-на ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — [illegible] [illegible]мандзір партызанскага атрада імя М. І. Кутузава А. Н. Гамалінскі і партызанскі разведчык І. [illegible]. У брацкую магілу ў 1946 г. перанесены астанкі воінаў і партызан, што былі пахаваны ў вёсках Лісканічы, М[illegible], [illegible]гільна, Рудск, Сытава.

599. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан*

У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. На адной з мемарыяльных пліт увекавечана памяць 28 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

600. БРАЦКАЯ МАГІЛА СУПРАЦОЎНІКАЎ МІЛІЦЫІ (гіст.). Вул. Савецкая, каля сярэдняй школы № 3. Пахаваны 8 супрацоўнікаў раённага аддзела міліцыі, якія загінулі ў барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады ў 1944—50 гг. У 1980 г. на магіле пастаўлены помнік: [illegible] з паліраванага граніту [illegible] зорка ў кальцы, ад [illegible] [illegible]цеў якой узнімаюцца вертыкальныя гранёныя пілоны.

601. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ І ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). Пл. Кастрычніка, 2, [illegible] будынку райвыканкома.

Горад вызвалены ў ходзе Беларускай наступальнай аперацыі 1944 г. Войскі правага крыла 1-га Беларускага фронту да сярэдзіны ліпеня 1944 г. выйшлі на лінію Пружаны — Слонім — Пінск. Часці 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі ў складзе 9-га гвардзейскага стралковага корпуса 61-й арміі 2[illegible] ліпеня фарсіравалі ў раёне г. Пінск р. Пíну і 16.7.1944 г. авалодалі г. Іванава.

VIII. *Плошча Кастрычніка*

603. *Помнік на магілах ваеннапалонных, партызан і ахвяр фашызму*

У час Вялікай Айчыннай вайны ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Іванаўскага р-на дзейнічалі партызанскія брыгады: 99-я імя Дз. Ц. Гуляева, імя В. М. Молатава, імя Я. М. Свярдлова.

99-я партызанская брыгада імя Дз. Ц. Гуляева створана ў студзені 1943 г. ў Мінскай вобл., у снежні 1943 г. — студзені 1944 г. перадыслацыравана ў Пінскую вобл. Імя Гуляева прысвоена ў верасні 1943 г. Камандзіры Г. М. Куракоўскі (студзень — люты 1943 г.), А. Ц. Чайкоўскі (люты — верасень 1943 г.), У. І. Н[illegible] (верасень 1943 — ліпень 1944 г.), камісары А. Ц. Чайкоўскі (студзень — люты 1943 г., верасень 1943 г. — ліпень 1944 г.), М. К. Панцялеенка (сакавік — верасень 1943 г.). Партызаны ўдзельнічалі ў абарончых баях на р. Ясельда ў час наступлення гітлераўцаў на народных мсціўцаў у красавіку 1944 г. На Агінскім канале пабудавалі пераправу і ўтрымлівалі яе да падыходу часцей Чырвонай Арміі. Разам з савецкімі войскамі вызвалілі г. п. Целяханы, вёскі Азарычы, Краглевічы. 10.7.1944 г. брыгада (415 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй. На дзень злучэння ядначала атрады імя К. Я. Варашылава, імя М. Ц. Грабко, імя М. М. Воранава.

Партызанская брыгада імя В. М. Молатава створана ў красавіку 1943 г. Камандзір М. І. Герасімаў, камісар Ф. С. Кунькоў. Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгунках Брэст — Пінск, Лунінец — Баранавічы, Ковель — Брэст, на Дняпроўска-Бугскім канале. Удзельнічалі ў разгроме варожага гарнізона на чыгуначнай станцыі Вулька Іванаўскага р-на. У лютым — сакавіку 1944 г. вялі баі супраць ворага на Дняпроўска-Бугскім канале і [illegible] г. брыгада (1200 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй. На дзень злучэння ядначала атрады імя М. Ц. Шыша, імя С. Г. Лазо, імя А. В. Суворава, імя М. І. Калініна, імя П. П. Паталаха.

Партызанская брыгада імя Я. М. Свярдлова створана ў лістападзе 1943 г. Камандзір І. Н. Марынка, камісар Р. А. Дудко. Партызаны брыгады разграмілі больш за 20 апорных пунктаў ворага, валасных управ, маёнткаў. Разам з Чырвонай Арміяй удзельнічалі ў вызваленні вёсак Моталь, Ахова Іванаўскага р-на. 16.7.1944 г. брыгада (98 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй. На дзень злучэння ядначала атрады імя В. П. Чкалава, імя Я. Г. Макаровіча, імя А. А. Жданава, імя В. П. Бажкі.

У 1965 г. ў гонар савецкіх воінаў, якія вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і партызан, што дзейнічалі на тэрыторыі раёна ў час нямецка-фашысцкай акупацыі, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Буг в огне. 3-е, ус... пап... — ...вид. — Мн., 1977. *М. В. Кірэйчык*

602. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СУПРАЦОЎНІКАМ МІЛІЦЫІ (гіст.). Вул. Першамайская, 5. Устаноўлена ў 1968 г. на ўшанаванне памяці супрацоўнікаў міліцыі А. Я. Антапені[illegible], Р. Р. Дакукіна, [illegible], В. Я. [illegible], І. М. Н[illegible], Ф. Р. Са[illegible]ты, А. І. Тар[illegible], І. А. Татарчука, якія загінулі ў 1944—52 гг. у барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады.

603. МОГІЛКІ ВАЕННАПАЛОННЫХ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На вул. Пушкіна. Пахавана больш за 1000 савецкіх ваеннапалонных, партызан, мірных грамадзян, закатаваных і расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. 8 брацкіх магіл знаходзяцца абапал цэнтральнай дарожкі, якую замыкае пастаўлены ў 1968 г. абеліск.

604. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На скрыжаванні вуліц Камсамольскай і Маладагвардзейскай. Пастаўлены ў 1967 г. на ўшанаванне памяці 78 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

605. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На пл. Кастрычніцкай. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 19[illegible] г.

606. РАДЗІМА КОЛЬЧАКА Міхаіла Міхайлавіча (гіст.).

Герой Савецкага Саюза М. М. Кольчак нарадзіўся 29.6.1905 г. у сям'і селяніна. Член КПСС з 1944 г. Удзельнік грамадзянскай вайны, ліквідацыі контррэвалюцыйнага антысавецкага мяцяжу ў [illegible], басмацтва ў Сярэдняй Азіі ў 1921—25 гг. Працаваў на будаўніцтве Волхаўскай ДРЭС. Скончыў ваенную пяхотную школу ў [illegible] (1928 г.), быў камандзірам [illegible] роты. 3 студзеня 1937 г. выкладчык [illegible] «Выстрал», з 1942 г. начальнік снайперскай школы. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 22.7.1944 г. камандзір 2[illegible]-га стралковага палка 184-й стралковай Духаўшчынскай Чырванасцяжнай дывізіі 45-га стралковага корпуса 5-й арміі 3-га Беларускага фронту. Вызначыўся 15—17.8.1944 г. ў баях за выхад на граніцу з Усходняй Прусіяй. Полк пад камандаваннем палкоўніка М. М. Кольчака прарваў моцную абарону праціўніка, адбіў 10 варожых контратак, вызваліў 10 населеных пунктаў. У час баёў знішчана 11 танкаў, 13 аўтамашын, 1 бронемашына, 12 кулямётаў, 2 артылерыйскія батарэі, шмат іншай тэхнікі ворага і больш за 500 гітлераўцаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 2[illegible] 1945 г. Памёр 14.2.1959 г. [illegible]

607. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры горада. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з цэглы. Уяўляе сабой развітую прастора[illegible] кампазіцыю з шатровай званіцай і цыбуленападобным купалам. Помнік архітэктуры неаўдарускага стылю.

в. Агова, Ляскавіцкі сельсавет

608. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля шашы Брэст — Пінск. На ўшанаванне памяці 92 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

607. *Царква. Бакавы фасад*

611. *Помнік землякам*

609. ЦЭНТР МАСТАЦКІХ РАМЕСТВАЎ (гіст.). З 19 ст. мясцовыя майстры распісвалі куфры, шафы, сталы, столы. Промысел зарадзіўся ў 1920-я гады, дасягнуў росквіту ў канцы 1940 — пачатку 1950-х гадоў. Масава выраблялі куфры, у якіх хавалі адзенне, пасаг для нявесты. Куфры мелі прамавугольную форму, пукатае века, памеры 60×110×80 см, аздоблены рознакаляровай размалёўкай. Контуры малюнка наносілі праз пераводную паперу, а потым запаўнялі яркімі вытага колеру фарбамі без паўтанаў. Характэрны спалучэнні лакальных добра згарманізаваных колераў — ружовага і блакітнага, смарагдавага і жоўтага, малінавага і фіялетавага, чырвонага і жоўтага, змешчаных на цёмна-зялёным фоне сярод светла-зялёных лістоў. Лепшыя майстры вёскі распісвалі куфры без папярэдняй абводкі контуру.

За гады Савецкай улады ў сувязі з ростам дабрабыту сялян змяніўся іх побыт. Дамы калгаснікаў цяпер абсталёўваюцца сучаснай фабрычнай мэбляю. Попыт на куфры знік. З 1970-х гадоў агоўскія майстры цалкам перайшлі на роспіс сувенірных скрынак і роспіс на шкле, якое выкарыстоўваецца як панно (рамяство ўзнікла ў 1920-я гады). Характэрная прыкмета агоўскіх размалёвак на шкле — чорны контур, свабодны асіметрычны малюнак і выкарыстанне чыстых колераў без паўтанаў. Пераважаюць сюжэтныя і раслінныя кампазіцыі. Тонкія чорныя лініі акцэнтуюць розныя па колеру фарбы, раздзяляюць пялёсткі кветак, пазначаюць пражылкі лістоў, надаючы малюнкам плоскасны графічны характар. У 1978 г. ў вёсцы створаны філіял Брэсцкай фабрыкі «[illegible]».

Літ.: Тован В. Палескія фарбы // Маладосць, 1972, № 2. *М. М. Яніцкая*

в. Адрыжын, цэнтр сельсавета

610. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СУПРАЦОЎНІКАМ СЕЛЬСАВЕТА (гіст.). На будынку выканкома сельсавета. Устаноўлена ў 1970 г. на ўшанаванне памяці супрацоўнікаў Адрыжынскага сельсавета І. А. Карчагіна, К. З. Клімовіча, Р. Ц. Клімовіча, М. І. Ляшчука, У. С. Разько, М. Е. Талатынніка, С. М. Хахлачова, якія загінулі ў 1944—47 гг. ад рук ворагаў Савецкай улады.

611. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 151 аднавяскоўца, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Анадынча, Адрыжынскі сельсавет

612. МАГІЛА САВЕЦКІХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны савецкія актывісты і члены іх сем'яў (8 чалавек), забітыя ў 1945 і 1951 гг. ворагамі Савецкай улады. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.



616. *Помнік землякам*

620. *Помнік землякам*

в. Бродніца, цэнтр сельсавета

613. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў 1865 г. з дрэва. Квадратны ў плане асноўны аб'ём да якога далучаны пяціграннная апсіда і чатырохгранны прытвор з шатровай званіцай. Царква — прыклад драўлянага дойлідства з элементамі архітэктуры позняга класіцызму.

614. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На ўскраіне вёскі, насупраць сельсавета. На ўшанаванне памяці 35 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Варацэвічы, Сітаўскі сельсавет

615. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў канцы 19 ст. з цэглы. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

616. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля школы. На ўшанаванне памяці 52 аднавяскоўцаў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

617. РАДЗІМА ОРДЫ Напалеона (гіст.).

Беларускі і польскі мастак-графік і кампазітар Н. Орда нарадзіўся 11.2.1807 г. ў сям'і інжынера-фартыфікатара. Да 1823 г. вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, потым у Віленскім універсітэце. Быў членам тайнага студэнцкага таварыства «Заранне». Удзельнічаў у паўстанні 1830—31 гг., пасля яго паражэння быў у эміграцыі. Жыў у Аўстрыі, Швейцарыі, Італіі. З кан

[illegible] 1830-х гадоў вучыўся ў мастацкай [illegible] цы ў Парыжы. Зблізіўся з А. Міцкевічам і Ф. Шапэнам, напісаў некалькі музычных твораў, у асноўным паланэзаў. У 1856 г. Н. Орда вярнуўся на радзіму, жыў у Пінску, потым пераехаў на Валынь. Падарожнічаў, пералаж[illegible] [illegible] рысавальныя і акварэлі [illegible] [illegible] роды і з работ [illegible] архітэктурныя пей[illegible] [illegible] жы «Заслаўскі палац», «Дятлаўская сядзіба», «Лагойск, парк», «Ружанскі палац», «Завоссе», «Крэва», «Мір», «Іўя», «Белая вежа», «Лятанічы», «Замак Паскевічаў у Гомелі», «Мінск, Саборная плошча», «Навагрудак», «Асвея», «Гродна», «Сярэдзіна губерні» (усе 18[illegible]–70 гг.) [illegible] іх. Лішыня з іх [illegible] рамантычнай [illegible] У 1873–84 гг. па малюнках Н. Орды мастак А. Мацуровіч зрабіў каляровыя літаграфіі, якія былі выдадзены ў майстэрні М. Фаліса ў Варшаве (260 лістоў у 7 серыях). Арыгіналы мастака зберагаюцца ў нацыянальным музеі г. Кракава і б[illegible] [illegible] АН УССР імя Стафаніка ў Львове. Н. Орда памёр 20.4.1884 г. у Варшаве.

Літ.: Дробаў Л. М. Напалеон Орда — [illegible] мастак [illegible] Помнікі гісторыі [illegible] 1971. № 3; [illegible] Беларусская [illegible] XIX — пачатак XX [illegible] Л. Г. [illegible]

в. Вартыцк, Нешчаўскі сельсавет

618\. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (1[illegible] ст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія [illegible] у Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. [illegible] абеліск.

в. Гарбаха, цэнтр сельсавета

619\. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (1[illegible] ст.). [illegible] клуба. На ўшанаванне памяці [illegible] вёскі, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у [illegible] г. пастаўлены помнік (аўтар [illegible] К. Мельнічук) — прамавугольная стэла з [illegible] [illegible] барэльефамі воінаў, ордэна Айчыннай вайны і лаўровай галінкай [illegible] на адной плоскасці.

в. Глінна, Залядынскі сельсавет

620\. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (1[illegible] ст.). У скверы. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлен [illegible]



625\. [illegible] [illegible] Н[illegible]

622\. *Царква Параскевы Пятніцы. План*

в. Гнеўчыцы, Крытышынскі сельсавет

621\. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (1[illegible] ст.). У скверы. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

622\. **ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ** (арх. т.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1802 г. з дрэва.

Будынак — выцягнуты прамавугольны зруб з трохгранным алтарным прырубам, пакрыты двухсхільным дахам з вальмам і галоўкай над алтаром. Над паўднёвай часткай размешчана званіца, чацвярык якой і завяршэнне франтона галоўнага фасада і завершаны галоўкай. Сцены бакавых фасадаў прарэзаны лучковымі вокнамі, [illegible] з [illegible], упрыгожаны [illegible] [illegible]ны руставанымі лапаткамі і ўвянча[illegible]ны развітым карнізам з сухарыкамі. Інтэр'ер залы, перакрыты бэлькамі. Над уваходам хоры. На баках алтара зроблены крывалінейныя ў плане нішы [illegible] каркаснай канструкцыі.

Царква — помнік архітэктуры, у якім спалучаюцца традыцыі народнага дойлідства з элементамі класіцызму. *Т. В. Габр[illegible]*

622\. *Царква Параскевы Пя[illegible]*

в. Дастоева, цэнтр сельсавета

623\. **ПАМЯТНАЕ МЕСЦА ДАСТАЕЎСКАГА** Федара Міхайлавіча. У 1506 г.

625\. *Мікалаеўская царква*



630. *Помнік у гонар падпольнага сельскага Савета*

продкі выдатнага рускага пісьменніка Ф. М. Дастаеўскага (1821—81 г.) атрымалі грамату на права валодання гэтай вёскай. У 1971 г. імя Ф. М. Дастаеўскага прысвоена мясцовай школе, у якой арганізаваны школьны музей пісьменніка.

624. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, у парку. На ўшанаванне памяці 143 жыхароў вёсак Вулька, Дастоева, Заруддзе, Застружжа, Красіеўка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Дружылавічы, цэнтр сельсавета

625. **МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА** (арх.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1774 г. з дрэва.

Спачатку будынак складаўся з пяцізрубавых у плане асноўнага зруба і апсіды, пакрытых агульным двухсхілым дахам з вальмай над апсідай. Абапал апсіды — нізкія рызніцы. У 2-й палавіне 19 ст. з захаду была далучана трох'ярусная чацверыковая званіца, у пачатку 20 ст. да асноўнага зруба прыбудавалі бакавыя памяшканні, у выніку чаго план набыў форму крыжа. Над званіцай і ў сярэдзіне даху васьмігранныя барабаны з галоўкамі. Сцены гарызантальна ашаляваны і прарэзаны прамавугольнымі, у прыбудовах крыжападобнымі аконнымі праёмамі. Асноўны аб'ём і апсіда маюць бялёнае перакрыцце, прыбудовы — паўцыліндрычныя скляпенні. Над уваходам хоры на 2 слупках.

Царква — прыклад традыцыйнага народнага дойлідства. *Т. В. Габрусь.*

в. Загута, Крытышынскі сельсавет

626. **МЕСЦА ГІБЕЛІ КУЖАЛІНАВА** Васіля Іванавіча (гіст.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Тут 13.12.1942 г. загінуў сувязны партызанскага атрада імя С. Г. Лазо брыгады імя В. М. Молатава В. І. Кужалінаў. На ўшанаванне яго памяці ў 1977 г. пастаўлены абеліск.

в. Залядынне, цэнтр сельсавета

627. **БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН** (гіст.). За 0,2 км на ўсход ад вёскі. Пахаваны партызаны С. І. Гучаеў, М. С. Дзялун, К. Х. Кандрацёнак, [illegible] Касцянецкі, Я. Ф. Новікаў, [illegible] В. Труханаў, якія загінулі 26.3 [illegible] г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Застружжа, Дастоеўскі сельсавет

628. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН** (гіст.). На могілках. Пахаваны 30 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1952 г. на магіле пастаўлены абеліск.

629. **ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** (гіст.). Ва ўсходняй частцы вёскі, на скрыжаванні вуліц. Тут 3.11.1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі расстралялі сем'і камуністаў, дэпутатаў сельсавета і актывістаў — 97 чалавек. Сярод іх — дэпутат Пінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных Хрысціна Сцяпанаўна Бурак.

У 1968 г. на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

в. Калена, Махроўскі сельсавет

630. **МЕСЦА ДЗЕЙНАСЦІ ПАДПОЛЬНАГА СЕЛЬСАВЕТА** (гіст.). З мая 1943 г. да сакавіка 1944 г. ва ўмовах нямецка-фашысцкай акупацыі ў вёсцы дзейнічаў сельскі Савет дэпутатаў працоўных. Старшыня выканкома — М. Б. Вагатук, члены — Ф. І. Краціч, [illegible] С. Корац. Сельсавет сваёй дзейнасцю ахопліваў вёскі Баландзічы, Вулька, Краснае, Махро, Хамчава (БССР), Дольск, Пагавічы, Омыт (УССР).

У 1975 г. на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі у гонар дзейнасці падпольнага сельсавета пастаўлена стэла.

в. Канатоп, Рудскі сельсавет

631. **БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН** (гіст.). На могілках. Пахаваны партызаны атрада імя І. В. Сталіна — Т. І. Бажко і М. С. Пастушэнка, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 г. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Крытышын, цэнтр сельсавета

632. **БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН** (гіст.). На могілках. Пахаваны партызаны атрада імя С. Г. Лазо брыгады імя В. М. Молатава В. С. Мельнічук, Я. П. Мельнічук і партызанскі сувязны В. І. Кужалінаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх [illegible] у 1942 г. [illegible] пастаўлены абеліск.



635. *Помнік землякам*

633. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). На могілках. Пахаваны [illegible] Г. Лазо [illegible] імя В. М. Молатава [illegible] гітлераўцам [illegible] У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

634. **МАГІЛА БАБІЧ** Марыі Ан[illegible] (гіст.). На могілках. Пахавана настаўніца М. А. Бабіч, расстраляная

640. *Прачысценская* [illegible]

гітлераўцамі ў 1941 г. У 1974 г. на магіле пастаўлена стэла.

635. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 97 аднавяскоўцаў — савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Лучкі, Пешчаўскі сельсавет

636. БРАЦКАЯ МАГІЛА БАРСКАГА Мікалая Паўлавіча і **РАМАНАВА** Івана Мікітавіча (гіст.). На могілках. Пахаваны сакратар Іванаўскага падпольнага райкома ЛКСМБ М. П. Барскі (1920—43 гг.) і член гэтага райкома І. М. Раманаў (1921—43 гг.).

Партызаны атрада імя С. Г. Лазо брыгады імя В. М. Молатава М. П. Барскі і І. М. Раманаў у час выканання баявога задання былі акружаны гітлераўцамі каля в. Дружылавічы. Загінулі ў баі 20.8.1943 г. На магіле ў 1963 г. пастаўлены абеліск.

в. Лядавічы, Опальскі сельсавет

637. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 мірныя жыхары, расстраляныя гітлераўцамі ў 1943 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

638. МАГІЛА ПЛАКСУНОВА Спяпана Лазаравіча (гіст.). На могілках. Партызан С. Л. Плаксуноў загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 12.6.1944. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Ляскавічы, цэнтр сельсавета

639. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 115 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскай барацьбе, расстраляны нямецка-фашысцкімі акупантамі, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

640. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У заходняй частцы вёскі. Пабудавана да 1783 г. з дрэва.

Будынак складаецца з амаль квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму і

640. Прачысценская царква. Выгляд з...

640. Прачысценская царква. Звон

пяціграннай апсіды. Зрубы аб'яднаны агульным дахам, які ўтварае трохвугольныя навесы ў месцы іх злучэння. Галоўны паўночны фасад завершаны трохвугольным франтонам з паўцыркульным акном у цэнтры. В ...ным пасярэдзіне прарэзаны глухім васьмігранным барабанам з галоўкай. На баках апсіды сіметрычна размешчаны 2 нізкія прыбудовы. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, умацаваны брусамі і прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Інтэр'ер залы, перакрыцце бэлечнае, з падшыўной столлю. Дзве калоны каля ўвахода падтрымліваюць хоры.

Перад уваходам у царкву двух'ярусная званіца-брама. Ярусы падзелены прычолкам. Ніжні ярус ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, верхні скразны, накрыты чатырохсхільным дахам з галоўкай у цэнтры.

Царква — помнік манументальнага драўлянага дойлідства Палесся.

Г. В. Габрусь

641. СЯЛЯНСКІ ДВОР З НЯЗВЯЗАНЫМІ ПАБУДОВАМІ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 1920 г. з дрэва,



640. Прачысценская царква. План

у 1968 г. часткова перабудаваны (хлеў адпесены ў глыб двара).

Будынак у плане ўяўляе сабой ускладнены варыянт традыцыйнай трохкамернай пабудовы (хата + сенцы + камора). Ускладненне ідзе за кошт вылучэння кухні з жылога памяшкання і пабудовы ў сенцах варыўні. Кухня аддзелена ад хаты капітальнай сцяной. Да вуліцы будынак стаіць тарцовым фасадам. Традыцыйным для сялянскай хаты гэтай мясцовасці з'яўляецца стварэнне ўвахода ў падоўжнай сцяне з паўднёвага боку і ўваход у камору непасрэдна з сенцаў. Лакальная асаблівасць тая, што вокны прарэзаны ў 3 сценах.

Помнік адлюстроўвае пашыраны на ўсёй Беларусі тып двара з нязвязанымі пабудовамі. *У. С. Гурко*

в. Махро, цэнтр сельсавета

642. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 9 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1953 г. на магіле пастаўлены абеліск.

643. МАГІЛА САМУЙЛІК Вольгі Іванаўны, **ПОМНІК САВЕЦКІМ ПАТРЫЁТАМ** (гіст.). На могілках. Савецкая актывістка В. І. Самуйлік загублена гітлераўцамі ў 1944 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск. Надпіс на абеліску ўвекавечвае памяць В. І. Самуйлік, а таксама 9 іншых савецкіх патрыётаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

644. ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У заходняй частцы вёскі. Пабудавана ў 1792 г. з дрэва.

Будынак складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і пяціграннай алтарнай апсіды. У кампазіцыі дамінуе галоўны фасад, які вырашаны ў выглядзе шырокай пласціны, далучанай да асноўнага аб'ёму. Фасад падзелены цягамі карніза на 2 ярусы і завершаны 3 вежачкамі (бакавыя — квадратныя ў плане, цэнтральная — васьміграниая), сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. У асноўны зруб убудаваны памяшканні рызніцы і дзякоўскай. Перакрыцце бэлечнае, з плоскай столлю.

Двух'ярусная чацверыковая званіца каркаснай канструкцыі стаіць асобна.

Царква — прыклад перапрацоўкі ў драўляным дойлідстве мураванай архітэктуры стылю барока. *Т. В. Габрусь*

645. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 165 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Моладава, цэнтр сельсавета

646. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У скве-

644. *Петрапаўлаўская царква. Галоўны фасад і званіца*



644. *Петрапаўлаўская царква. План*

...ы. Пахаваны 14 воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата з вянком.

647. КАПЛІЦА (архіт.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1905—08 гг. (арх. Т. РастварОўскі) з цэглы, уваходзіла ў былы сядзібна-палацавы ансамбль (не захаваўся).

Будынак — ратонда дыяметрам 8 м з трыма порцікамі дарычнага ордэра, якія выступаюць на руставанай паверхні сцен, і прамавугольнай у плане алтарнай апсідай. Уваходны порцік — чатырохкалонны, 2 бакавыя, што абрамляюць паўцыркульныя аконныя праёмы,— двухкалонныя. Будынак накрыты сферычным купалам, апсіда — двухсхільным дахам. Тымпаны франтонаў аздоблены ляпным раслінным арнаментам. Фрыз ратонды і партал уваxода дэкарыраваны гірляндамі. Развіты карніз на мадульёнах аздоблены пояском сухарыкаў. Інтэр'ер асвятляецца 3 вокнамі з паўцыркульнымі тымпанамі.

Капліца — помнік архітэктуры малых форм у стылі неакласіцызму.

[illegible]

648. МЕСЦА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ СЯЛЯН (гіст.). 9.12.1905 г. каля 200 сялян вёскі з'явіліся да памешчыка Скірмунта і патрабавалі вярнуць захопленыя ў час рэформы 1861 г. пашы, зямлю і каля 30 дзесяцін лесу, павысіць падзённую плату. Пасля таго, як памешчык адмовіўся задаволіць іх патрабаванні, сяляне разграмілі кватэры аканома і галоўнага ўпраўляючага і спынілі работу ў маёнтку. 9, 10 і 12 снежня, нягледзячы на тое, што ў вёску прыбыў эскадрон драгунаў на чале з павятовым спраўнікам, сяляне нападалі на маёнтак. У сутычцы адзін селянін быў забіты і некалькі паранена.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы. Мн., 1955; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг.— Мн., 1962. *Э. М. Савіцкі*

649. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На могілках. На ўшанаванне памяці 142 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены абеліск.

650. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 19 ст. з дрэва. Трохзрубны храм з трох'ярусным шатром над званіцай і пяцігранным апсідай. Помнік народнага дойлідства.

в. Моталь, цэнтр сельсавета

651. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 23 воіны і партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

652. МАГІЛА КОЛЧЫНА Міхаіла Васілевіча (гіст.). На могілках. Памочнік камісара партызанскага атрада імя Я. Г. Макаравіча брыгады імя Я. М. Свярдлова М. В. Колчын загінуў у 1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле ўстаноўлена пліта.

653. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА САВЕЦКІМ АКТЫВІСТАМ (гіст.). На будынку дзіцячай бібліятэкі. Устаноўлена ў 1975 г. на ўшанаванне памяці загадчыка клуба С. А. Мацукевіча, работніка выканкома сельскага Савета А. А. Леановіча, старшыні выканкома сельскага Савета С. С. Міхновіча, якія загінулі ў 1947—50 гг. ад рук ворагаў Савецкай улады.

654. МЕСЦА ДЗЕЙНАСЦІ КАМСАМОЛЬЦАЎ - ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ (гіст.). У чэрвені 1944 г. на тэрыторыі Мотальскага сельсавета была створана падпольная камсамольская арганізацыя. Налічвала больш за

647. *Капліца*



647. *Капліца. План*

647. *Капліца. Фрагмент порціка*

60 членаў. Камітэт: Іван Міхайлавіч Калілец (сакратар), А. К. Даніловіч, Г. А. Міцюк, С. С. Міцюк, В. Г. Міронава, М. Я. Прадун, Ц. І. Хоміч. Падпольшчыкі залучалі у арганізацыю новых патрыётаў, праводзілі ў вёсках палітычную работу з сялянамі, збіралі зброю і боепрыпасы. У канцы жніўня 1941 г. яны разграмілі Мотальскую гміну, у маі 1942 г. сарвалі адпраўку моладзі на катаржныя работы ў Германію. За здрадай Іван Міхайлавіч Калілец, Г. Я. Калілец, А. С. Міховіч, С. С. Міховіч былі арыштаваны 18.7.1942 г. гітлераўцы расстралялі члена камітэта В. Г. Міронаву. Увосень 1942 г. і зімой 1943 г. былі расстраляны камсамольцы Р. А. Даніловіч, Іван Дзяркач, Якаў Звяленчыц, Сазон Кравук, Карп Ксёнда, Г. П. Куаюр, Рыгор Малевіч, Захар Міховіч, Пётр Міховіч, Міхаіл Райкевіч, Ц. І. Хоміч, Харытон Цыкалай. Астатнія маладыя патрыёты стварылі ядро партызанскага атрада імя Я. Г. Макаравіча брыгады імя Я. М. Свярдлова.

У памяць аб дзевяцці падпольшчыкаў на будынку дзіцячай бібліятэкі ў 1975 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. *Т. Р. Чуракова*

655. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка дзіцячай бібліятэкі. На ўшанаванне памяці 2185 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск. Каля абеліска ўстаноўлены 2 пліты з імёнамі загінуўшых.

656. СТАЯНКІ (археал.).

656а. Стаянка-1. За 2,5 км на поўнач ад вёскі, на схіле пясчанага ўзвышша правага берага р. Ясельда. Даўжыня 150 м. Выявіў і даследаваў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі агнішчаў, больш за 400 апрацаваных крэмняў, 100 прылад працы, абломкі ляпных гаршкоў. Стаянка адносіцца да нёманскай культуры (4—3-е тысячагоддзі да н. э.).

656б. Стаянка-2. За 3 км на поўнач ад вёскі, на паўднёвым схіле невысокага марэннага ўзвышша паміж воз. Джыдзінне і р. Ясельда. Даўжыня больш за 200 м. Выявіў і даследаваў у 1971 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод 600 знойдзеных апрацаваных крэмянёў, характэрных для макраліт тычнай культуры, ёсць пласціністыя накапечнікі, разцы, сякеры, скрэблы і інш. Адносіцца да 9—5-га тысячагоддзяў да н. э.

656в. Стаянка-3. За 4 км на паўночны захад ад вёскі, на пясчаным узгорку на паўночны ўсход ад воз. Джыдзінне. Даўжыня стаянкі 100 м. Выявіў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Адносіцца да эпохі неаліту.

656г. Стаянка-4. За 3,5 км на паўночны захад ад вёскі, на пясчаным узвышшы паўднёва-ўсходняга берага воз. Джыдзінне. Даўжыня больш за 150 м, вышыня над поплавам 2—3 м. Выявіў і даследаваў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены абломкі лейкападобных кубкаў нёманскай культуры і гаршкоў ранняга жалезнага веку.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. В. 1. Мн., 1968; его ж. Мезолит и неолит Припятского Полесья.— У кн.: Древности Белоруссии. Мн., 1966. *У. Ф. Ісаенка*

657. ЦЭНТР МАСТАЦКІХ РАМЁСТВАЎ (гіст., маст.).

Народнае ткацкае рамяство — выраб так званых «мотальскіх ручнікоў» — развіваецца з 18 ст. Вырабы мясцовых ткачых — традыцыйныя тканыя ручнікі даўжынёй 210—240 см, шырынёй 30—33 см. Выконваюцца тэхнікай «перабор» у 4 ніты і 4 папажы, снуюць у 8 або 10 пасмаў. Ручнік складаецца з трох частак: сярэдніка і 2 багата аздобленых канцоў. Кампазіцыі сярэдніка бываюць 2 відаў: у адных па аснове праходзяць 2—3 каляровыя палоскі (у сучасных 4 — чырвоная, блакітная або сіняя, зялёная і чорная), у другіх па ўтку даюцца шматкаляровыя палоскі, якія перасякаюцца з каляровымі палоскамі асновы. У выніку адны ручнікі аздоблены папярочнымі палоскамі, другія маюць клятчасты выгляд. Увесь ручнік тчэцца «ў ялочку» з чаргаваннем па сярэдзіну на фоне суравой і адбеленай ільняной пражы. Канцы аздабляюцца геаметрычным цi раслінным арнаментам шырынёй да 20—25 см. Арнаменты маюць назвы «зубы», «кветкі», «ліст», «сякач», «жучкі». Традыцыйныя мотальскія ручнікі заканчваюцца шчыльным карункамі, якія плятуць уручную з пражы асновы тэхнікай «набор». Шырыня карункаў 10—13 см.

656. *Стаянкі Моталь. План*

У гады Савецкай улады мотальскія ручнікі экспанаваліся на шматлікіх міжнародных выстаўках і кірмашах у Бельгіі, Францыі, СФРЮ, Фінляндыі, Турцыі. Экспартуюцца ў ПНР, Італію, Францыю, Бельгію. У 1977 г. у Моталі створаны ткацкі цэх Пінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

Гарбарна-кравецкае рамяства пашырана сярод жыхароў в. Моталь з даўніх часоў. З нефарбаванай адбеленай аўчыны шылі доўгія пе...ыя на талію кажухі, якія аздаблялі скураным раменьчыкамі, вышыўкай, арнаментальнай афарбоўкай асобных дэталей (крыса, падол, рукавы). Рамяство захавалася да нашых дзён. З пачатку 1970-х гадоў асобныя майстры вёскі працуюць па заказах Мастацкага фонду БССР — вырабляюць аўчыны, фарбуюць у руда-чырвоны колер і шыюць кароткія, адрэзныя па таліі кажухі. *М. М. Пятухова*

в. Опаль, цэнтр сельсавета

658. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 141 земляка — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. насыпаны Курган. На яго вяршыні пастаўлены абеліск.

659. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,2 км на поўдзень ад вёскі

656. *Крэмянёвыя прылады працы са стаянак Моталь*



661. *Крамянёвыя прылады працы са стаянак Опаль*

Пахаваны 18 мірных савецкіх грамадзян, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

660. МЕСЦА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ СЯЛЯН (гіст.).

Пад уплывам рэвалюцыйнага руху і прапагандысцкай дзейнасці бальшавікоў 22.11.1905 г. больш за 200 сялян вёсак Опаль і Лядавічы з'явіліся ў маёнтак І. К. Ялепскага і ў пісьмовай форме патрабавалі вярнуць захопленыя ў час рэформы 1861 г. сепаратыстамі 600 дзесяцін зямлі, скасаваць адпрацоўкі за пашу, вадапой, праезд па памешчыцкай зямлі да сваіх палосак, павялічыць падзённую аплату з 20 капеек да 1 рубля ў дзень і інш. Сяляне патрабавалі таксама кампенсацыі страт у суме 120 тыс. рублёў за незаконнае карыстанне памешчыкам іх угоддзямі, пагражаючы ў выпадку нявыплаты разграміць маёнтак.

24 лістапада на сходзе ў прысутнасці чыноў павятовай паліцыі сяляне пацвердзілі свае патрабаванні і заявілі: «Нашы браты паклалі свае галовы у Японіі, а мы пакладзем тут, але свайго дабёмся». Улады накіравалі ў маёнтак роту 194-га пяхотнага Мсціслаўскага палка. Нягледзячы на гэта, 28 лістапада не выйшлі на работу ўсе батракі, спыніўся вінакурны завод. Праца была аднаўлена толькі з дапамогай салдат, якія прыгналі сялян з навакольных вёсак. 9 снежня тысячны натоўп зрабіў спробу абяззброіць салдат, але гэта не ўдалося. 17 снежня рапіцай каля 700 сялян акружылі маёнтак і завод і па сігналу кінуліся на прыступ. Па загаду камандзіра роты салдаты сталі страляць, забілі 4 і цяжка паранілі 10 чалавек, з іх 2 неўзабаве памерлі. Ноччу сяляне намерваліся паўтарыць напад, іх спынілі толькі прыбыццё ў Опаль драгунаў і паўроты пяхоты.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы.— Мн., 1955; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг.— Мн., 1962. *Э. М. Савіцкі.*

661. СТАЯНКІ І КРАМЯНЁВАЯ МАЙСТЭРНЯ (археал.).

661а. Стаянка-1. За 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на першай надпойменнай тэрасе правага берага р. Ясельда. Даўжыня стаянкі каля 400 м, вышыня над поплавам ракі 2—3 м. Выявіў і даследаваў у 1971 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзена 800 вырабаў з крэменю, у т. л. 160 пласцінчатых наканечнікаў стрэл, разцоў, скрэбла, нажоў. Стаянка належыць да свідэрскай культуры і датуецца 9—5-м тысячагоддзямі да н. э. У заходняй частцы знойдзены таксама абломкі неалітычных гаршкоў, зерняцёрка, абломкі ляпной керамікі, а таксама рэшткі могільніка з трупаспаленнем ранняга жалезнага веку.

661б. Стаянка-2 і крамянёвая майстэрня. За 1,5 км на ўсход ад вёскі, на паўночным схіле і ў верхняй частцы лагчыны, якая утварылася на паверхні марэннага ўзвышша. Даўжыня стаянкі да 400 м, вышыня над поймай ракі 4—6 м. Выявіў і даследаваў у 1963 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі агнішчаў, абкладзеных камянямі, і згрупаванні буйных крамянёвых адшчэпаў і нуклеусаў. Сабрана 1400 апрацаваных крамянёў, сярод іх макраліты — буйныя трапецападобныя і авальныя сякеры, трохгранныя пікі, свідэрскія і тыпу Лінгбі наканечнікі, грубыя разцы, скрэблы, скоблі і інш. Стаянка і майстэрня адносяцца да макралітычнай культуры (7—5-е тысячагоддзі да н. э.)

661в. Стаянка-3. За 1 км на ўсход ад вёскі, на заходнім краі лагчыны. Даўжыня каля 150 м. Выявіў у 1963 г. У. Ф. Ісаенка.

Адносіцца да нёманскай культуры неаліту (3-е тысячагоддзе да н. э.).

Матэрыялы зберагаюцца ў Дзяржаўным музеі БССР і Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Мезолит и неолит Припятского Полесья // кн.: Древности Белоруссии. Мн., 1966; его ж. Неолит Припятского Полесья [illegible] *У. Ф. Ісаенка.*

662. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 18 ст. з дрэва.

Будынак — трохнефавая базіліка (у плане прамавугольнік са зрэзанымі з усходняга боку вугламі). Галоўны заходні фасад падзелены на 2 ярусы на ўзроўні карнізаў бакавых нефаў і завершаны трохвугольным франтонам. Раней галоўны фасад меў васьмікалонны порцік, які быў потым закрыты шалёўкай. Усе сцены царквы вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі і ўмацаваны сціжнымі брусамі. Галоўны неф пакрыты двухсхільным дахам і завершаны над апсідай цыбулепадобнай гранёнай галоўкай са шпілем. Бакавыя нефы маюць аднасхільныя дахі. Сцены бакавых нефаў прарэзаны высокімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі, цэнтральнага — паўцыркульнымі, размешчанымі пад дахам.

Інтэр'ер падзелены 4 слупамі на 3 нефы. Перакрыццё бэлечнае, з падшыўной пляскатай столлю. 2 слупы каля ўвахода падтрымліваюць хоры. На ўзроўні столі бакавых нефаў уздоўж сцен галоўнага нефа і алтара зроблена звязаная з хорамі вузкая галерэя, якая мае аднолькавую з хорамі разную балюстраду.

Царква — прыклад выкарыстання форм муравалай архітэктуры барока ў драўляным дойлідстве.

С. Г. Багласаў, Т. І. Чарнайская.

662. *Царква Параскевы Пятніцы*



662. *Царква Параскевы Пятніцы. План.*

в. Оўзічы, Гарбахскі сельсавет

663. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). На будынку фельчарска-акушэрскага пункта.

31.1.1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі 60 жыхароў вёскі — жанчын, дзяцей, старых. У 1972 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Пераруб, Рудскі сельсавет

664. МАГІЛА ПАЛІЎКІ Івана Андрэевіча (гіст.). На могілках.

Герой Сацыялістычнай Працы І. А. Паліўка нарадзіўся 27.1.1926 г. ў в. Пераруб у сялянскай сям'і. Заслужаны меліяратар БССР (1964 г.). Член КПСС з 1967 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з 1944 г., сапёр. У [illegible] г. скончыў курсы экскаватаршчыкаў, у 1951 г.— машыніст экскаватара Дняпроўска-Бугскага тэхучастка ў Пінску, у 1952—74 гг.— старшы машыніст

...смотра Іванаўскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі трэста «Пінскводбудмеханізацыя». Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў выкананні сельскагаспадарчых градуў... Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1970–74 гг. Чл. ЦК КПБ у 1971–75 гг. І. А. Палюўка памёр 18.8.1975 г.

Літ.: Зямныя зорэды. — Мн., 1968; Матусевіч А. Сцяг Палесся // Сельская гаспадарка Беларусі, 1966, № 13; Дубоўскі І. Пакаранне ... загартоўка. — Маладосць, 1976, № 6. [illegible]

в. Полкацічы, Дастоеўскі сельсавет

665. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 55 жыхароў весак калгаса «Савецкі», якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены абеліск.

в. Пешчава, цэнтр сельсавета

666. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 33 жыхары вёскі, забітыя гітлераўцамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

667. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «За мір». На ўшанаванне памяці 243 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Рагадашч, Крытышынскі сельсавет

668. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, у лесе. 3 насыпы. Вышыня да 1,5 м, дыяметр 7,5–10 м. Вядомы з канца 19 ст. Даследаваў у 1930 г. Ю. У. Кухарэнка. Раскопкі не праводзіліся.

в. Рудск, цэнтр сельсавета

669. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 84 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

в. Рылавічы, Бродніцкі сельсавет

670. ЦЭНТР РАМЯСТВА (гіст.).

З часоў сярэдневечча вёска вядома як цэнтр бандарнага рамяства. Вяскоўныя бондары выраблялі бочкі для патрэб каралеўскага двара. Рамяство захавалася да нашага часу. Ма-



678. Царква Аляксандра Неўскага. План

істры па заказу Пінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў робяць з ліпы 10-літровыя барылкі і кубкі з адмысловымі цыліндрычнымі формамі, чыстай апрацоўкі драва.

Літ.: Жданові ч П. Чырвоныя вяселлі. Рэпартаж. — Маладосць, 1969, № 10. М. М. Яніцкая

в. Сачыўкі, Стрыльненскі сельсавет

671. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На супраць школы. На ўшанаванне памяці 120 жыхароў весак калгаса «...», якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1972 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Святаполка,
Пешчаўскі сельсавет

672. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 2 лётчыкі, якія загінулі ў 1944 г. ў паветраным баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Снітава, цэнтр сельсавета

673. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 3 км на ўсход ад вёскі, ва урочышчы Мошкі. 1.12.1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі

678. Царква Аляксандра Неўскага

49 мірных жыхароў, у т. л. 18 дзяцей і 14 жанчын. У 1974 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых на магіле пастаўлены абеліск.

674. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 88 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

675. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На галоўнай вуліцы вёскі. Пабудавана ў пачатку 19 ст. з дрэва.

Прамавугольны ў плане будынак накрыты пакатым двухсхільным дахам з вальмай над алтаром і трохвугольным франтонам на галоўным фасадзе. У сярэдзіне вальмы — гранёная галоўка. Пры ўваходзе — тамбур



675. Успенская царква. План

675. Успенская царква і званіца



678. *Царква Аляксандра Неўскага Царскія вароты. Разьба па дрэве*

Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, на франтоне дэкаратыўная шалёўка «ў елачку». Пастаўленая асобна двух'ярусная званіца накрыта чатырохсхільным дахам, гарызантальна ашалявана.

Царква — помнік архітэктуры, у якім традыцыі народнага дойлідства спалучаюцца з элементамі класіцызму.
Т. В. Габрусь.

в. Страмец, Залядынскі сельсавет

676. **МАГІЛЫ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). За 0,25 км на паўднёвы захад ад вёскі. У 3 магілах пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. пастаўлены абеліск.

в. Стрэльна, цэнтр сельсавета

677. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі, каля 8-гадовай школы. На ўшанаванне памяці 107 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1971 г. пастаўлены абеліск.

678. **ЦАРКВА АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА** (архіт.). Пабудавана ў 1800 г. з дрэва, перароблена ў 1930-я гады.

Царква аднazрубная, з трохграннай алтарнай часткай, накрыта двухсхільным дахам з вальмай над алтаром і трохвугольным франтонам на галоўным фасадзе. Вільчык фасада прарэзаны чацверыковай вежай, завершанай шпілем. Сцены гарызантальна ашаляваны. Вокны прамавугольныя і з паўцыркульнымі імпастамі. У інтэр'еры захаваліся размалёўка столі і разны іканастас.

Царква — помнік драўлянага дойлідства з элементамі архітэктуры стыляў класіцызму і ампір.
Т. В. Габрусь

в. Тышкавічы, Мотальскі сельсавет

679. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 57 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены абеліск.

680. **СТАЯНКІ** (археал.)

680а. Стаянка-1. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на ўсходнім беразе воз. Мульнае. Даўжыня 250 м, вышыня над узроўнем вады 4 м. Культурны пласт часткова разбураны. Выявіў у 1962 г. і даследаваў у 1971 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — наканечнікі стрэл, пласцінападобныя нажы, абломкі глінянага посуду нёманскай культуры.

680б. Стаянка-2. За 1 км ад вёскі, на паўднёва-ўсходнім беразе воз. Мульнае. Даўжыня больш за 200 м. Выявіў у 1962 г. і даследаваў у 1971 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены крамянёвыя прылады працы і абломкі гаршкоў. Адносяцца да неаліту і бронзавага веку.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. В. 1, 3 — Мн., 1968; Его же. Неолит Припятского Полесья — Мн., 1976.
У. Ф. Ісаенка

в. Франопаль, Рудскі сельсавет

681. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). На могілках. Пахаваны 2 воіны, якіх загубілі ворагі Савецкай улады ў 1945 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

682. *Двор аднараднага пагоннага тыпу на адной сядзібе. Пачатак 20 ст. План. 1 — сенцы (а — варыўня, б — жорны); 2 — кухня (а — запечак, б — печ, в — стол, г — лава); 3 — хата (а — грубка, б — ложкі, в — услон, г — стол, д — куфар, е — лава, ж — покуць); 4 — камора; 5 — хлеў*

в. Шчакоцк, Лясковіцкі сельсавет

682. **ДВАРЫ АДНАРАДНАГА ПАГОННАГА ТЫПУ НА АДНОЙ СЯДЗІБЕ** (архіт.). Сядзіба ў цэнтры вёскі. Набудавана ў пачатку 20 ст.

Складаецца з 2 двароў: першы каля вуліцы, арыентаваны да яе тарцовым фасадам, другі — за 40 м ад яе, у глыбіні сядзібы. Абодва двары — аднараднага пагоннага тыпу: усе жылыя і гаспадарчыя пабудовы на кожным двары пастаўлены ў адзін рад пад агульным дахам. Жылы будынак на першым двары — варыянт традыцыйнай трохкамернай пабудовы (хата + + сенцы + камора), ускладнены тым, што кухня вылучана з жылога памяшкання, а ў сенцах знаходзіцца варыўня (мясцовая асаблівасць). Інтэр'ер хаты традыцыйны. Печ пастаўлена ў левым куце кухні насупраць уваход і вусцем павернута да падоўжанай сцяны. Вокны ў хаце прарэзаны з трох бакоў. Другі двор падобны на першы і мае тыя ж планіровачныя і канструкцыйныя асаблівасці.

Помнік адлюстроўвае пашыраны па паўднёвым Захадзе Беларусі тып пагоннага двара.
У. С. Гуркоў

в. Юхнавічы, Бродніцкі сельсавет

683. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). Каля клуба. Пахаваны 24 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1961 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Ячкавічы, Бродніцкі сельсавет

684. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.) У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 67 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.



ІВАЦЭВІЦКІ РАЁН

Помнікі і месцы нацыянальна-вызваленчага руху

Помнікі і месцы рэвалюцыйнага руху (Рэвалюцыя 1905–07 гг., Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, Грамадзянская вайна, барацьба працоўных Заходняй Беларусі)

Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (месцы баёў, магілы савецкіх воінаў і партызан, Курганы Славы, помнікі землякам і інш.)

Палацы, сядзібы, асабнякі

Адміністрацыйныя, грамадскія збудаванні

IX. ІВАЦЭВІЧЫ

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны на правым беразе р. Грыўда, за 136 км на паўночны ўсход ад Брэста. Чыгуначная і аўтобусная станцыі на лініі Брэст — Мінск.

Івацэвічы ў пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаюцца ў 1519 г. Належалі Юндзілам. З 1654 г. вядомы як маёнтак. З 2-й палавіны 16 ст. ў Слонімскім павеце Навагрудскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У канцы 18 ст. ў маёнтку Івацэвічы пабудаваны бровар і смалакурня. З 1795 г. ў складзе Расіі. З пракладкай чыгункі Масква — Брэст (1871 г.) побач з маёнткам Івацэвічы ўзнікла невялікае паселішча, якое з развіццём лесарасапрацовак расло. У канцы 19 ст. тут былі бровар, цагельня (200 рабочых на пачатак 20 ст.), сукнавальня, ваўняныя млын.

У 1-ю сусветную вайну Івацэвічы былі акупіраваны германскімі войскамі (1915—18 гг.), у 1919—20 гг.— войскамі буржуазнай Польшчы. Савецкая ўлада ўстанаўлена ў ліпені — жніўні 1920 г. У 1921—39 гг. Івацэвічы ў складзе буржуазнай Польшчы — мястэчка ў Косаўскім павеце Палескага ваяводства. У 1935 г. каля 1500 жыхароў. Дзейнічала падпольная ячэйка КСМЗБ. Летам 1929 г. баставалі рабочыя шклоатачнага завода. З 1939 г. Івацэвічы ў складзе БССР, з 1940 г. у Косаўскім р-не Брэсцкай вобл. У Вялікую Айчынную вайну з 24.6.1941 г. да 12.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1947 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна. У 1959 г. 5,2 тыс. жыхароў. У 1962—1965 гг. у Бярозаўскім р-не. З 1966 г. горад.

Сучасная забудова Івацэвіч ажыццяўляецца паводле генеральнага плана, распрацаванага ў інстытуце «Белдзяржпраект» у 1968 г. Горад развіваецца ў паўночна-заходнім напрамку. Чыгунка падзяляе яго на 2 зоны: паўночную — жылую і паўднёвую — прамысловую. Жылая квартальная забудова сфарміравалася ўздоўж магістралі паміж р. Грыўда і чыгункай. На скрыжаванні галоўнай восевай магістралі — вул. Леніна з вул. Камсамольскай складуся адміністрацыйна-грамадскі цэнтр з будынкамі Дома Саветаў, гандлёвага цэнтра, гасцініцы і інш. На вул. Леніна, Чарткова, Кірава і інш. размешчаны кінатэатр, універмаг, рэстаран, 2—5-павярховыя жылыя дамы.

Прамысловасць горада звязана галоўным чынам з перапрацоўкай драўніны і сельскагаспадарчай сыравіны. Дзейнічаюць вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне, завод жалезабетонных вырабаў, спіртзавод, ільнозавод, маслазавод, хлебакамбінат, лесгаспрамгас, камбінат бытавога абслугоўвання, раённае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі. Ёсць метэастанцыя.

Працуюць 2 сярэднія, рабочай моладзі, музычная і дзіцячая юнацкая спартыўная школы, Дом піянераў і школьнікаў, 5 дзіцячых дашкольных устаноў, кінатэатр, Дом культуры, 3 бібліятэкі, бальніца. Выдаецца газета «Кастрычнік». У горадзе 2 скверы — на вуліцах Камсамольскай і Савецкай. Помнік У. І. Леніну, на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.

Зона адпачынку — на р. Грыўда.

Літ.: Богданович А. В., Сидоров П. А. Города Белоруссии. Краткий экономический очерк. Мн., 1967; Жучкевич В. А., Малышев А. Н., Рогозин Н. Е. Города и сёла Белоруссии (Р. [illegible]). Мн., 1951.

У. В. Алсёнкін, М. У. Варонін.

685. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Вул. 60 год Кастрычніка, на могілках. Пахаваны 102 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1944 гг. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

686. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Савецкай, у скверы. Пахаваны 60 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных воіны 20-га стралковага корпуса 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі 12.7.1944 г. пры вызваленні Івацэвіч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобл. ў Вялікую Айчынную вайну Канстанцін Дзям'янавіч Талочка.

К. Дз. Талочка нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Падстарынь Івацэвіцкага р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1926 г. Удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (1939 г.) старшыня Івацэвіцкага пасялковага Савета. З ліпеня 1941 г. ў партызанах: камандзір групы, з верасня 1943 г. камісар партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі Брэсцкага партызанскага злучэння. 1.11.1943 г. загінуў у баі супраць гітлераўцаў у в. Бялаўшчы Івацэвіцкага р-на. Яго імем названа вуліца ў Івацэвічах.

У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. *Г. І. Дубёба.*

686. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

687. ПОМНІК КЛЮТКО Віктару Сцяпанавічу (гіст.). На скрыжаванні вуліц Савецкай і Клютко, каля сквера. Тут у маі 1942 г. гітлераўцы павесілі сакратара Ялевіцкай падпольнай камсамольскай арганізацыі, партызана сувязнога В. С. Клютко. Пахаваны ў в. Ялевічы Івацэвіцкага р-на. Гл. артыкул № 771 «Магіла Клютко Віктара Сцяпанавіча».

У 1968 г. на месцы гібелі пастаўлены стэла.

688. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Клютко. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1961 г.

в. Аброва, цэнтр сельсавета

689. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (арх.). На паўночнай ускраіне вескі.

IX. *Забудова вуліцы Леніна. Фрагменты.*

688. *Помнік У. І. Леніну*

Пабудавана ў 1860 г. з дрэва. Складаецца з асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму з трохграннай алтарнай часткай і пастроеная вежы-званіцы злучаных нізкім пераходам. Дахі асноўнага аб'ёму і тамбура двухсхільныя, з вальмамі над алтаром. Сцены вертыкальна ашаляваныя. Асноўнае кампазіцыйнае завяршэнне — барокавым сядленем.

Царква — помнік архітэктуры, у якім выкарыстаны традыцыі народнага драўлянага дойлідства.

Г. Я. Малых

в. Альба, Вераскоўскі сельсавет

690. ЮР'ЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі побач з могілкамі. Пабудавана ў 1790 г. з дрэва; званіца прыбудавана ў пачатку 20 ст.

Прамавугольны ў плане асноўны аб'ём і пяціграннага алтарны зруб пакрыты агульным двухсхільным гонтавым дахам з вальмамі над алтарнай часткай. Дах над алтаром завяршае чацвярковай з шатровым бабанне. З заходняга боку да асноўнага аб'ёму прылягае зрубная чацверыковая вежа-званіца, убудаваная ў яго на палавіну сваёй шырыні. Званіца завершана шатровым дахам з галоўкай. Аконныя праёмы арачныя. Сцены гарызантальна ашаляваныя. Асноўны аб'ём мае сапраўдную раўніцу. Хоры раскрыты ў прастору асноўнага памяшкання складаным па

689. *Міхайлаўская царква. План*

канфігурацыі праёмам. Алтарная частка аддзелена разным іканастасам.

Царква — пераходны тып храма ад двухзрубнага да трохзрубнага, у якім адлюстраваліся тэндэнцыі выкарыстання ў драўляным дойлідстве форм манументальнай мураванай архітэктуры.

С. Ф. Самбук

в. Альшаніца.
Вераскоўскі сельсавет

691. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.)

691а. Могільнік-1. На паўднёвай ускраіне вёскі. 3 курганы вышыней 1,2—2 м, дыяметрам 6—9 м. Выявіў у 1960 г. Ю. У. Кухарэнка, абследаваў у 1970 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

691б. Могільнік-2. За 0,7 км на поўдзень ад вёскі, у лесе. 9 курганоў вышыней 1—1,5 м, дыяметрам 7—8 м. Выявіў у 1960 г. Ю. У. Кухарэнка, абследаваў у 1970 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

в. Амяльная, Коланскі сельсавет

692. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 30 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. насыпаны Курган.

в. Бабровічы.
Выганашчанскі сельсавет

693. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля клуба. У верасні 1942 г. атрад гітлераўцаў уварваўся ў вёску. Фашысты спалілі жывымі 676 жыхароў і ўсе пабудовы. У 1953 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ўстаноўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

694. СТАЯНКА (археал.). На паўночна-ўсходнім беразе воз. Бабровіцкае (у старажытнасці Вядскае), на маленькім узгорку. Акружана з усіх бакоў балотамі. Даўжыня каля 300 м. Частка стаянкі моцна пашкоджана. Выявіў у 1953 г. і даследаваў у 1971 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі



690. *Юр'еўская царква. План*



689. *Міхайлаўская царква*

з пагоншчаў, абкладзеныя камянямі. Зараз іх сабрана больш за 1000 крамянёвых прылад працы і 1000 апрацаваных крамянёў, у т. л. лістападобныя наканечнікі стрэл, свярдзёлкі, скрабкі, ножападобныя праколкі, зробленыя з пласцінак, нажы з пласцінак з бакавой рэтушшу і паглыбленнямі, звужаныя на канцы, накірочна рэтушаваныя разцы, масіўныя камяныя скрабкі, сякеры, якія адносяцца да свідэрскай культуры. Трапляюцца таксама тыповыя для мезалітычнай культуры масіўныя грубыя разцы, прылады, якімі seклі, міндалепадобныя сякеры або разакі, вастрыі яніславіцкага тыпу. Датуецца 10—6-м тысячагоддзямі да н. э.

690. *Юр'еўская царква. Галоўны фасад*

696. Успенская царква

696. *Успенская царква. Фрагмент галоўнага фасада*

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолит При[illegible]

В. Ф. Ісаенка

в. Бусяж, цэнтр сельсавета

695. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 3 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны 4 жыхары вёскі, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1952 г. на магіле пастаўлены абеліск.

696. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Размешчана ў паўднёва-заходняй частцы вёскі. Пабудавана ў 1779 г. з цэглы.

Складаецца з прамавугольных у плане галоўнага аб'ёму, пакрытага двухсхільным дахам, з атыкамі ў тарцах і прыбудаванай да яго з поўначы апсіды. Галоўны (паўднёвы) фасад падзелены развітым антаблементам на 2 ярусы. Над парталам галоўнага ўвахода лучковае акно, абапал яко-



696. *Успенская царква. План*

га 2 глыбокія нішы са сферычнымі конхамі. Верхні ярус завершаны гранёнай вежачкай. Сцены бакавых фасадаў расчлянёны сдвоенымі пілястрамі і прарэзаны аконнымі праёмамі з лучковым завяршэннем. Інтэр'ер зальны. Над уваходам невялікія хоры, абрамленыя аркай.

Царква — помнік архітэктуры барока. *С. Ф. Самбук*

в. Быцень, цэнтр сельсавета

697. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі, у скверы. Пахаваны 63 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941 г. і 10.7.1944 г. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

698. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 19[illegible] г.

699. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 17 ст. з цэглы як капліца базыльянскага кляштара.

Кампактны прамавугольны ў плане аб'ём, пакрыты вальмавым дахам з васьмігранным барабанам па вазьме рыку. Галоўны (заходні) фасад падзелены лапаткамі на 3 роўныя часткі. У цэнтры над уваходам размешчана акно з паўцыркульным завяршэннем, па баках — 2 плоскія прамавугольныя нішы. Сцены бакавых фасадаў раскрапаваны лапаткамі і прарэзаны паўцыркульнымі аконнымі праёмамі, ссунутымі ў бок алтара. Інтэр'ер расчлянёны масіўнымі слупамі на 3 нефы. Цэнтральны неф значна шырэйшы за бакавыя, перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі.

У царкве ўвасоблены рысы архітэктуры рэнесансу і ранняга барока.

С. Ф. Самбук



699. *Успенская царква. План*

в. Бялавічы, Косаўскі гарадскі Савет

700. ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА СА ЗВАНІЦАЙ (архіт.). У паўночнай частцы вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 18 ст. з дрэва на месцы пастаўленай у 1630 г. царквы, мураваная званіца у 1885 г.

Царква — адназрубны прамавугольны ў плане аб'ём з двухгранным алтарным завяршэннем, пакрыты двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром. Франтон галоўнага (заходняга) фасада завяршае невысокая квадратная ў плане вежачка з васьмігранным купалком і галоўкай. З боку ўвахода да асноўнага зруба прылягае адпольканы з ім па вышыні каркасны тамбур. Звонку будынак вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікам, умацаваны сцяжкамі і прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Інтэр'ер зальны з бэлечным перакрыццем. Бакавыя сцены раскрапаваны вузкімі пілястрамі з маленькімі капітэлямі. У заходняй частцы над уваходам размешчаны хоры.

Перад царквой стаіць мураваная трох'ярусная чацверыковая званіца, завершаная шатровым дахам. Ніжні ярус прарэзаны арачным праёмам і ўмацаваны контрфорсамі. Яго сцены, складзеныя з бутавага каменю, кантрастуюць з атынкаванымі плоскасцямі верхніх ярусаў. У архітэктурным афармленні званіцы выкарыстаны класіцыстычныя элементы: лапаткі, руст, філёнгі і лучковыя праёмы.

У архітэктуры помніка спалучаюцца рысы традыцыйнага народнага дойлідства і асобныя элементы барока і класіцызму. *С. Ф. Самбук*

701. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.).

701а. Могільнік-1. За 0,3 км на паўночны захад ад царквы. 4 авальныя ў плане паўсферычныя па форме насыпы вышынёй 0,5—0,7 м, дыяметрам 6—8 м. Выявіла і абследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Раскопкі не праводзіліся.

701б. Могільнік-2. На паўднёва-ўсходняй ускраіне могілак. 4 насыпы, блізкія па памерах да курганоў могільніка-1. Вядомы з канца 19 ст. Абследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Раскопкі не праводзіліся. *В. С. Вяргей*

702. ПОМНІК БАБРОВУ Івану Іванавічу, **ТАЛОЧКУ** Канстанціну Дзям'янавічу **І ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Брэсцкай вобл., сакратара Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б І. І. Баброва, камісара партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі К. Дз. Талочкі, якія 1.11.1943 г. загінулі ў Бялавічах ў баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў, а таксама 91 жыхара

... Івацэвічы і Запольле і то ... пулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Верашкі, цэнтр сельсавета

703. БРАЦКІЯ МОГІЛКІ ПАРТЫЗАН І САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст., маст.). За 13 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гута Міхалін. Пахаваны 130 партызан і савецкіх воінаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных — удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскай барацьбы ў Брэсцкай вобл. ў Вялікую Айчынную вайну І. П. Урбановіч, юны партызан брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага М. В. Гоцвых (гл. таксама артыкул № 748 «Помнік Гоцвыху Міхаілу Васілевічу»).

З восені 1941 г. ў Гута Міхалінскіх лясах дзейнічала каля 10 партызанскіх груп, якія восенню 1942 г. аб'ядналіся ў партызанскія атрады. З лета 1943 г. ва ўрочышчы базіравалася партызанская брыгада імя П. К. Панамарэнкі, створаная ў чэрвені 1943 г. Камандзіры І. П. Урбановіч (чэрвень — ліпень 1943 г.), М. У. Селькін (ліпень 1943 г. — ліпень 1944 г.), камісары С. П. Пацяруха (чэрвень — ліпень 1943 г.), К. Дз. Талочка (верасень — лістапад 1943 г., загінуў), М. І. Хрысціфаровіч (лістапад 1943 г. — ліпень 1944 г.). Праз Гута Міхалінскія лясы праходзілі савецкія разведчыкі і рэйдавыя фарміраванні беларускіх партызан. Тут у лістападзе 1943 г. адбыўся жорсткі бой з гітлераўцамі.

У 1948 г. ў цэнтры могілак пастаўлены помнік (скульптары А. і І. Сурскія, бетон; вышыня 12 м). Шырокая лесвіца вядзе да 7-метровага пастамента, на ім скульптурная група: стары партызан з узнятым угару аўтаматам і воін Чырвонай Арміі. Абедзве фігуры паказаны ў імклівым руху, які падкрэслены жэстам узнятых рук. На пастаменце — барэльефная выява ордэна Айчыннай Вайны і надпіс «1941 — 1944». На 4 плітах высечаны імёны загінуўшых. Пляцоўка вакол помніка выкладзена бетоннымі плітамі. Амаль на кожнай магіле пастаўлены абеліск.

Помнік сімвалічна ... партызанскага ... у розны час барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

... Mn 1977. ... І. Г. ...
У. С. ... А. А. ...

704. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці ... аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлена стэла.

в. Волька, цэнтр сельсавета

705. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). За 1,5 км на ўсход ад вёскі, з правага боку дарогі на Дабро... Пахаваны ... воінаў, якія загінулі ў 1941 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

706. ПОМНІК БАЯВОЙ СЛАВЫ (гіст.). Каля будынка сельсавета. 9.7.1944 г. недалёка ад вёскі з часцямі Чырвонай Арміі злучыўся 36-ы атрад (камандзір П. А. Кудраўцаў, камісар Ц. М. Івацкі) 8-й брыгады Брэсцкага партызанскага злучэння. 12.7.1944 г. атрад удзельнічаў у вызваленні г. Івацэвічы. У 1975 г. у гонар гэтых падзей пастаўлена стэла.

в. Выганашчы, цэнтр сельсавета

707. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У цэнтры вёскі. Курган насыпаны ў 1967 г. на ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну. На вяршыні Кургана пастаўлены абеліск.

в. Вяда (не існуе). Выганашчанскі сельсавет

708. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Вяда знаходзілася за 4 км на паўночны захад ад в. Бабровічы, на беразе воз. Бабровіцкае. Першыя звесткі пра яе адносяцца да 1483 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы было 217 жыхароў, 87 двароў.

У ... 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі праводзілі ў партызанскай зоне карную аперацыю «Балотная ліхаманка — Паўднёвы Захад». Яны палілі і рабавалі вёскі, знішчалі мірнае насельніцтва. 15.9.1942 г. атрад гітлераўцаў спаліў Вяду разам з жыхарамі. Вёска не адрадзілася.

На ўшанаванне памяці загінуўшых у 1965 г. недалёка ад спаленай вёскі пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Каласейкін У. Я. ... 1965. М. І. Але...

в. Вялікая Гаць. Святавольскі сельсавет

709. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 45 жыхароў вёскі, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх



709. *Ільінская царква. План*

703. *Помнік на ...*

... захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Гічыцы, Ягалевіцкі сельсавет

710. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі.

У 1944 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 42 жыхароў і спалілі вёску (121 двор). У 1967 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашысцкага тэрору на магіле пастаўлены абеліск.

в. Горталь, цэнтр сельсавета

711. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ ... У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 88 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Гончава, Стайкаўскі сельсавет

712. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Каля дарогі на г. Косава. Пабудавана ў 1838 г. з дрэва.

Складаецца з квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму з трох ...

709. *Ільінская царква. Званіца брамы*

712. *Крыжаўзвіжанская царква*

[illegible] і купала пра[illegible]мавугольнага бабінца, да якога прыл[illegible]ягае тамбур. Асноўны аб'ём пакрыты пакатым двухсхільным дахам, які над алтаром мае 3 схілы і васьмігранны барабан з купалам у цэнтры. Над ба[illegible] [illegible] васьмігранная [illegible] вежы н[illegible]ваках. Сцены гарызантальна вшаляваны дошкамі і аздоблены разьбой. Аконныя праёмы прамавугольныя, на галоўным (заходнім) фасадзе — паў[illegible]цыркульныя. Уваход падкрэслены падвойнымі калонкамі ганка. Інтэр'ер залы, перакрыты бочкай. У заходняй частцы размешчаны хоры на 4 калонках. Над асноўным аб'ёмам — мураваная крыпта.



712. [illegible]

Царква — помнік архітэктуры, які вызначаецца своеасаблівай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй, выкарыстаннем прыёмаў народнага драўлянага дойлідства. *А. Л. Міхай[illegible]*

713. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці [illegible] аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 19[illegible] г. пастаўлены абеліск.

в. Грыўда, Бусяжскі сельсавет

714. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км на ўсход ад вёскі, у лесе. Пахаваны 27 жыхароў в. Буда[illegible], якіх у 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія акупанты. У 1971 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Добромысль, цэнтр сельсавета

715. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне [illegible] [illegible] загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 197[illegible] г. пастаўлены абеліск.



712. *Крыжаўзвіжанская царква. План.*

в. Дабрынева, Дамашаўскі сельсавет

716. СТАЯНКА (археал.). За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе р. Грыўда, на пясках. Даўжыня каля 1 км, шырыня 200 м. Выяўлена ў 1963—64 гг. В. Ф. Супрун, даследавалася ў 1967 г. М. М. Чарняўскім. На [illegible] [illegible] культурны пласт шэрага колеру. Сярод знаходак [illegible] пуансоны, крамянёвыя прылады працы [illegible], наканечнікі стрэл, [illegible], а таксама абломкі арнаменталаваных [illegible] з [illegible] у іх сценках. Стаянка адносіцца да мезаліту і ранняга этапа [illegible] культуры.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР. [illegible] Чарняўскі М. М. [illegible] Беларусі [illegible] (1966 г.). Мн., 19[illegible] *М. М. Ч[illegible]*

в. Дамашава, цэнтр сельсавета

717. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). За 1,5 км на [illegible] каля [illegible]. Пахаваны 2[illegible] якія загінулі ў баях супраць [illegible]



713. [illegible]

гаўцаў у 1942—44 гг. У 1965 г. на магіле пастаўлена стэла.

718. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У сквеце, каля чыгуначнай станцыі. Пахаваны 85 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

719. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 9 жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1942 г. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

720. МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны савецкі воін, які загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Жытлін, цэнтр сельсавета

721. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У скверы. Пахаваны 72 воіны і партызаны брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — адзін з арганізатараў партызанскага руху на Брэстчыне, камандзір партызанскага атрада брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага Аляксей Пятровіч Чарткоў. Восенню 1941 г. антыфашысцкі камітэт Косаўскага раёна стварыў адну з першых баявых груп, якая ў красавіку 1942 г. вырасла ў партызанскі атрад № 112 (пазней імя В. М. Молатава). Камандзір лейтэнант А. П. Чарткоў. Да снежня 1943 г. атрад дзейнічаў асобна, потым у складзе брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага. У жніўні 1942 г. атрад разграміў фашысцкі гарнізон на чыгуначнай станцыі Святая Воля, дзе партызаны захапілі зброю, боепрыпасы, абмундзіраванне, медыкаменты, прадукты харчавання.

Камандаванне атрада стала вядома, што 11.10.1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі маюць намер знішчыць жыхароў вёсак Ваўзлічы, Дробаты і інш. Для выратавання насельніцтва каля дарогі з в. Гутава ў лесе была зроблена засада. Як толькі калона фашыстаў параўнялася з засадай, партызаны адкрылі агонь. Завязаўся цяжкі бой. Партызаны захапілі гармату і павярнулі яе супраць ворага. Калона была разгромлена. У гэтым баі загінуў А. П. Чарткоў, камісар атрада М. Ф. Зарэцкі, партызаны Гурэвіч, Зверау, Мультан, Якаўлеў, Янкоўскі і інш. Яны пахаваны ў вёсцы. Імя А. П. Чарткова было прысвоена аднаму з атрадаў партызанскай брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага.

У 1965 г. на брацкай магіле воінаў і партызан пастаўлены помнік-скульптура воіна. Імем А. П. Чарткова названа вуліца ў г. Івацэвічы.

Літ.: Бур и ргие... Ўспаміны... І вад.— Мн., 1977. *В. Б. К.*

722. ПОМНІК У ГОНАР ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ Ф. Э. ДЗЯРЖЫНСКАГА (гіст.). У цэнтры вёскі. Брыгада імя Ф. Э. Дзяржынскага Брэсцкага партызанскага злучэння створана ў снежні 1943 г. Базіравалася ў в. Жытлін і навакольных лясах. Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Бярозаўскага, Косаўскага і Целяханскага раёнаў. Камандзір В. М. Манахаў, камісар П. І. Какоўеў. Партызаны брыгады рабілі дыверсіі на камунікацыях ворага, знішчалі яго жывую сілу і тэхніку, вялі палітычную работу сярод насельніцтва. Пусцілі пад адхон 225 варожых эшалонаў ... 1800 р... ... брыгада ўдзельнічала ў аперацыі «Бдзітаўская абарона». 12.7.1944 г. брыгада ў складзе 4 атрадаў (імя В. М. Молатава, імя М. Ф. Сальніцкага, імя А. П. Чарткова, імя М. І. Калініна; 1030 партызан) злучылася з часцямі Чырвонай Арміі.

У 1962 г. ў гонар брыгады пастаўлены абеліск.

Літ.: Ковальский Н. М. В брестских лесах. За лесом партизана.— Мн., 1970; Неоконченная Белоруссия. Боевая ... статьи о ... партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.).— М., 1983. *Г. І. Дулебы*.

в. Заполле, Косаўскі гарадскі Савет

723. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 22 жыхары вёскі, якіх загубілі нямецка-фашысцкія акупанты ў 1943 г. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Зацішша (не існуе), Ялеўліцкі сельсавет

724. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Зацішша знаходзілася за 0,5 км на паўднёвы ад в. Гарадзішча. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 125 жыхароў і спалілі вёску (37 двароў). Вёска не адрадзілася. У 1967 г. на месцы былой вёскі пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

в. Зыбаілы, Ялеўліцкі сельсавет

725. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны больш за 200 жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 10.3.1943 г. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Квасевічы, Вераніковіцкі сельсавет

726. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля канторы саўгаса «Зара». На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлена стэла.

729. *Мемарыяльны комплекс на месцы базіравання Брэсцкіх падпольных абкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба Брэсцкага партызанскага злучэння. Нямецкі знак*.

в. Козікі, цэнтр сельсавета

727. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ І ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 27 жыхароў вёскі, загубленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1944 г., і 26 аднавяскоўцаў — воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Корачын, Жытлінскі сельсавет

728. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Каля вёскі, ва ўрочышчы Бор. 2 курганы вышынёй 1,5 і 1,8 м, дыяметрам 4 і 5 м. Вядомы з канца 19 ст. Абследаваў у 1970 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

729. МЕСЦА БАЗІРАВАННЯ БРЭСЦКІХ ПАДПОЛЬНЫХ АБКОМАЎ КП(б)Б І ЛКСМБ. ШТАБА БРЭСЦ-

729. *Мемарыяльны комплекс на месцы базіравання Брэсцкіх падпольных абкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба Брэсцкага партызанскага злучэння. Хата, ... знаходзіўся Брэсцкі падпольны абкам КП(б)Б і штаб злучэння*.



729. Мемарыяльны комплекс на месцы базіравання Брэсцкіх падпольных абкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба Брэсцкага партызанскага злучэння. Зямлянкі

КАГА ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ (гіст.) За 3 км на поўдзень ад [illegible] урочышча Хаван[illegible] [illegible] 1943 [illegible] [illegible] абкомы КП(б)[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] «Заря» — орган Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б.

Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б дзейнічаў з красавіка 1943 г. да вызвалення Брэстчыны (ліпень 1944 г.). [illegible] [illegible] партызанскім рухам у вобласці. Сакратары С. І. [illegible] [illegible] Ф[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] работу па мабілізацыі савецкіх людзей на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Пад яго кіраўніцтвам дзейнічалі падпольныя 2 міжрайкомы, 10 райкомаў, Брэсцкі падпольны гарком [illegible] [illegible] пярвічных партарганізацыі. У партыйнай арганізацыі вобласці налічвалася 12[illegible]8 камуністаў. Абком рэгулярна выпускаў баявыя лісткі, адозвы, зводкі Саўінфармбюро і інш., выдаваў газету «Заря» (пачатак мая 1943 г. — ліпень 1944 г., рэдактар В. Ф. Калбераў).



729. Мемарыяльны комплекс на месцы базіравання Брэсцкіх падпольных абкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба Брэсцкага партызанскага злучэння. Хата, [illegible] [illegible] падпольнага абкома КП(б)Б.

Брэсцкі падпольны абком ЛКСМБ быў створаны пад кіраўніцтвам Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б. Дзейнічаў з красавіка 1943 г. да ліпеня 1944 г. Сакратары Ф. Дз. Рома, М. М. Лыжын. Брэсцкая абласная падпольная камсамольская арганізацыя налічвала 18 райкомаў (1944 г.), Брэсцкі гарком, 3[illegible]3 пярвічныя арганізацыі, каля 3,5 тыс. камсамольцаў.

Брэсцкае партызанскае злучэнне было створана паводле рашэння Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б у канцы красавіка 1943 г. Камандзір С. І. Сікорскі («Сяргей»), начальнік штаба П. В. Пралягін. У час злучэння з Чырвонай Арміяй (ліпень 1944 г.) Брэсцкае партызанскае злучэнне злучала 11 брыгад, 10 асобных [illegible] 12 [illegible] [illegible] цы наносілі ўдары па камунікацыях ворага, знішчылі больш як 60 тыс. гітлераўцаў, падарвалі больш за 26 тыс. рэек, 2120 чыгуначных эшалонаў, 644 масты на чыгунках і шашэйных дарогах, разграмілі 110 гарнізонаў і [illegible] табоў ворага, правялі многа іншых баявых аперацый.

У 1971 г. ва урочышчы Хаваншчына створаны мемарыяльны комплекс: 4 драўляныя хаты, 2 зямлянкі, калодзеж, «лясная школа» (некалькі самаробных сталоў, лавак і школьная дошка на каржакаватым ствале дрэва). Устаноўлены шчыт з тэкстам «Прысягі беларускага партызана» і вялікі валун з памятным надпісам.

Літ.: Непокоренная Белоруссия: Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.). — М., 1963; Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. — Мн., 1959; Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944). — Мн., 1975; Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944). — Мн., 1976; Ромма Ф. Мужала молодость в боях. — Мн., 1974.

Г. І. Дулеба

Х. КОСАВА

[illegible] [illegible] [illegible] [illegible]

Косава [illegible] (паміж [illegible] [illegible] годдзях). У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1494 г. ў прывілеі вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Аляксандра, які падараваў яго маршалку І. Хрептовічу [illegible] магнатам [illegible] з 1611 г. Сапегам, у 2-й палавіне 18 ст. Пуслоўскім. З 1795 г. Косава ў складзе Расіі — мястэчка Слонім-

729. Мемарыяльны комплекс на месцы базіравання Брэсцкіх падпольных абкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, [illegible] [illegible] Шыталь



729. Мемарыяльны ком[illegible]лекс на месцы біз[illegible]равання Брэсцкіх падпольных аб[illegible]комаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба Брэсц[illegible] [illegible] партызанскага [illegible] дзе размяшчаўся Брэсцкі падпольны абком ЛКСМБ

скага павета Слонімскай, з 1797 г. [illegible] гоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губ[illegible] [illegible] Уз'яднанне з Расіяй садзейнічала развіццю мя[illegible] [illegible] 1-й палавіне 19 [illegible] былі адкрыты 2 суконныя ма[illegible]нуфактуры [illegible] (памешчыка [illegible] 18[illegible] [illegible] 200 рабочых. [illegible] устаноўлена [illegible] [illegible] 19 [illegible] [illegible] крамы. Да [illegible] [illegible] [illegible] склада[illegible] 3[illegible] [illegible] цагляныя і 807 драўляных бу[illegible] з іх 643 жылыя [illegible] народнае вучылішча, прыемныя пакоі [illegible] [illegible] мысл[illegible]ах працавалі 13 рабочых.

729. Мемарыяльны комплекс на месцы базіравання Брэсцкіх падпольных аб[illegible]комаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба Брэсц[illegible] [illegible] партызанскага [illegible]

З 1915 г. Косава акупіравана германскімі войскамі, у 1919—20 гг. войскамі буржуазнай Польшчы. З 1921 г. ў складзе Польшчы, горад, цэнтр павета Палескага ваяводства. Сялянства Косаўшчыны пад кіраўн[illegible] [illegible] вал сялянска-рабочай грамады актыўна выступала супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. 3.2.1927 г. адбылася дэманстрацыя працоўных, арганізаваная Косаўскім падпольным райкомам КПЗБ, якую расстраляла паліцыя (гл. артыкул № 737 «Помнік у памяць дэманстрацыі 1927 года»).

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. Косава ўвайшло ў склад Брэсцкай вобл. У 1940—49 гг. цэнтр раёна. У час Вялікай Айчыннай вайны з 25.6.1941 г. да 13.7.1944 г. Косава акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (чэрвень 1944 г.—12.7.1944 г.) і ЛКСМБ (1.9.1943 г.—12.7.1944 г.). 2.8.1942 г. партызаны атрадаў імя К. Я. Варашылава, імя Г. М. Дзімітрова, імя М. А. Шчорса знішчылі гарнізон акупантаў і на працягу месяца ўтрымлівалі горад.

Цяпер Косава — горад раённага падпарадкавання. Планіровачная структура яго цэнтральнай часткі — прамавугольная сетка вуліц, якія ствараюць дробныя кварталы. Генеральны план Косава распрацаваны БелНДІдзіпрасельбудам у 1972 г. і прадугледжвае яго развіццё ў сучасных межах за кошт рэканструкцыі існуючай малапавярховай забудовы, а таксама шляхам будаўніцтва шматкватэрных і індывідуальных жылых дамоў па свабоднай тэрыторыі ва ўсходняй частцы горада. Грамадскі, культурны і гандлёвы цэнтр запраектаваны на перакрыжаванні [illegible] вул. [illegible] Ленін[illegible] і 3 Лютага.

Прамысловая зона развіваецца на базе мэблевага вытворчага аб'яднання размешчанага ў паўднёвай частцы горада, з пашырэннем у перспектыве ў паўднёва-ўсходнім напрамку. Працуюць камбінат бытавога абслугоўвання, хлебапякарня.

У горадзе сярэдняя, рабочай моладзі і музычная школы, 2 дашкольныя [illegible] [illegible] Дом культуры бібліятэка [illegible] бальніца. У гарадскім скверы на вул. 3 Лютага пастаў[illegible] [illegible] у гонар дэманстрацыі [illegible] 1927 г. Зберагліся помнік архітэктуры [illegible] Троіцкі касцёл, за 2 км ад горада ва ўрочышчы Мерачоўшчына [illegible] палац 19 ст.

Зона адпачынку [illegible] парку ва ўрочышчы Мерачоўшчына.

Літ.: Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska [illegible] [illegible] wsch[illegible] [illegible] na rok 1[illegible] Warszawa, 19[illegible]5

М. І. Алексяюк, Э. М. Савіцкі, С. Ф. Самбук

730. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. 3 Лютага, у скверы. Пахаваны 68 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных — партызаны атрадаў імя К. Я. Варашылава, імя Г. М. Дзімітрова і імя М. А. Шчорса, якія загінулі 2.8.1942 г. пры разгроме фашысцкага гарнізона ў Косаве (гл. артыкул № 736 «Помнік партызанскай славы»), і воіны, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні горада.

Развіваючы наступленне на Брэсцкім напрамку, войскі 1-га Беларускага фронту 13.7.1944 г. занялі адзін з апорных пунктаў нямецка-фашысцкіх войск — г. Косава. У вызваленні горада ўдзельнічалі 19-я механізаваная брыгада (камандзір палкоўнік У. В. Яршоў), 9-ы танкавы полк (камандзір капітан М. П. Бартоўскі) і 75-ы самаходна-артылерыйскі полк (камандзір падпалкоўнік П. Я. Карпенка).

У 1960 г. на магіле воінаў і партызан пастаўлены помнік — скульптура воіна.

[illegible] ро Т. 7. М., 1965. *Г. І. Дымбо*

731. ГАРАДЗІШЧА (археал.). Ва ўрочышчы Мерачоўшчына, за 0,2 км на захад ад палаца.

У 1871—72 гг. невялікія раскопкі праводзіў Я. Завіша. Пасля Вялікай Айчыннай вайны гарадзішча даследавалі Ю. У. Кухарэнка, П. Ф. Лысенка, [illegible] Л. Побаль, Н. А. Рапапорт. Гарадзішча авальнае ў плане (60×42 м) зарасло хвойнікам. Умацавана 2 валамі вышынёй больш за 2 м. Культурны пласт 0,3 м. Знойдзены рэшткі вогнішчаў на брукаванай пляцоўцы і фрагменты ляпнога посуду. На [illegible] гарадзішча трапляюцца абломкі сярэдневяковай керамікі, зробленай на ганчарным крузе, з хвалістым арнаментам. Паводле археалагічных матэрыялаў [illegible] [illegible] (10—11 стагоддзі).

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья.— М., 1961.

Л. Д. Побаль

732. ДОМ, У ЯКІМ АДБЫВАЛІСЯ ПАСЯДЖЭННІ АНТЫФАШЫСЦКАГА КАМІТЭТА (гіст.). Вул. 3 Лютага, 71. У гэтым доме ў 1941—42 гг., у час акупацыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі адбываліся пасяджэнні Косаўскага падпольнага раённага антыфашысцкага камітэта, які [illegible] узначальваў М. Ф. Трыпда.

У 1975 г. ў гонар падпольшчыкаў на доме ўстаноўлена мемарыяльная [illegible]

733. МАГІЛА БЯЗЗУБАВА (гіст.). На вул. 3 Лютага, у скверы. Маер Беззубаў загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 г.

У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

734. МАГІЛА ПАЛЕШЧУКА Уладзіміра Іосіфавіча і **ТРЫЦЫ** Мікалая Фёдаравіча (гіст.). На вул. 3 Лютага, у скверы.

У. І. Палешчук — партызан Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у маі 1944 г. пры выкананні баявога задання.

М. Ф. Трыца нарадзіўся 24.2.1904 г. у Косаве, з рабочых. Член КСЗБ. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны польскімі буржуазнымі ўладамі, каля 8 гадоў правёў у турмах. У Вялікую Айчынную вайну адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падпольнай і партызанскай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Косаўскага р-на. З 1941 г. узначальваў Косаўскі падпольны раённы антыфашысцкі камітэт. Загінуў у баі 11.5.1944 г. Імем М. Ф. Трыцы названа вуліца ў Косаве.

У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск. *Г. І. Д[illegible]*

735. ПАЛАЦ (арх т.). На заходняй ускраіне горада, ва ўрочышчы Мерачоўшчына. Быў акружаны паркам (не збярогся), які вылучаўся дасканалай планіроўкай і кампазіцыйным дэкаратыўным складам. Праекты палаца і парку распрацаваны арх. Ф. Янчоўдам у 1838 г. У будаўніцтве прымаў удзел арх. У. Марконі. У час Вялікай Айчыннай вайны палац моцна пашкоджаны.

Палац складаецца з цэнтральнага двухпавярховага корпуса, які з'яўляецца яго кампазіцыйным ядром, і 2 бакавых крылаў, злучаных з ім ву[illegible]



735. *Палац*

737. *Помнік у памяць дэманстрацыі 1927 г.*

[illegible]мі галерэямі, прарэзанымі высокімі стральчатымі аркамі. Вуглы цэнтральнага корпуса фланкіраваны гранёнымі вежамі рознай вышыні, вуглы бакавых крылаў умацаваны вежападобнымі эркерамі. Фасады рытмічна чляняцца стральчатымі аркамі, аконнымі праёмамі, перспектыўнымі нішамі, гранёнымі вежамі. Унутраная планіроўка сіметрычная, характэрная для палацавай архітэктуры класіцызму. У цэнтральным корпусе залы групаваны вакол вестыбюля. У бакавых карпусах размяшчаліся службовыя памяшканні.

Палац — прыклад спалучэння класіцыстычных прыёмаў у планіроўцы і кампазіцыі з элементамі псеўдаготыкі ў архітэктурнай аздобе. *С. Ф. Самбук*

736. ПОМНІК ПАРТЫЗАНСКАЙ СЛАВЫ (гіст.). На вул. Чырвонаармейская, у скверы.

На досвітку 2.8.1942 г. 480 партызан атрадаў імя К. Я. Варашылава, імя Г. М. Дзімітрова і імя М. А. Шчорса пад агульным камандаваннем П. В.



735. *Палац. План*

Пранягіна атакавалі гарнізон у г. Косава, дзе было больш за 200 гітлераўцаў і паліцэйскіх. Бой працягваўся больш як 4 гадзіны. Да поўдня горад быў поўнасцю ачышчаны ад ворага. З турмы і гета партызаны вызвалілі [illegible] савецкіх грамадзян. У падрыхтоўцы аперацыі вялікую дапамогу аказалі члены Косаўскай падпольнай рабочай антыфашысцкай арганізацыі. У горадзе больш як месяц дзейнічала партызанская камендатура.

У 1955 г. ў гонар баявой аперацыі партызан пастаўлены [illegible]

Літ.: Бур[illegible] 3 изд. — Мн., 197[illegible]; Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Т. 1. — Мн., 1967.

У. С. Посэ, А. А. Фактаровіч.

737. ПОМНІК У ПАМЯЦЬ ДЭМАНСТРАЦЫІ 1927 ГОДА (гіст.). На вул. 3 Лютага, у скверы.

4.2.1927 г. Косаўскі райком КПЗБ арганізаваў дэманстрацыю сялян у знак пратэсту супраць рэпрэсій ўрада буржуазнай Польшчы Беларускай сялянска-рабочай грамады, арышту яе кіраўнікоў і актывістаў. Дэманстранты, у якой прынялі ўдзел больш за 1000 чалавек, праходзілі пад лозунгамі: «Вызваліць рабоча-сялянскіх дэпутатаў, вызваліць усіх палітвязняў!», «Няхай жыве Савецкая Беларусь!» З чырвонымі сцягамі, спяваючы «Інтэрнацыянал», сяляне прайшлі па вуліцах г. Косава. На рыначнай плошчы адбыўся мітынг. Спецыяльна прысланы атрад паліцыі адкрыў стральбу па дэманстрантах. Былі забіты С. Верабей, П. Гаўрус, М. Кутух, І. Кучук, І. Раковіч, М. Тарталай і паранены 35 чалавек. Пахаванне забітых 4 лютага вылілася ў маніфестацыю пратэсту. Расстрэл сялян выклікаў шырокую хвалю абурэння працоўных Польшчы. ЦК КПЗБ звярнуўся з адозвай да ўсіх рабочых, сялян і салдат, у якой заклікаў да барацьбы з дыктатурай Пілсудскага. Гэтыя падзеі вядомы пад назвай «Косаўскі расстрэл 1927 г.»

У 1966 г. ў памяць дэманстрацыі пастаўлены абеліск.

Літ.: Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы. Т. 1. — Мн., 19[illegible] [illegible] Беларусі (1921—1939 гг.). — Мн. [illegible]

У. С. Посэ, А. А. Фактаровіч.

738. РАДЗІМА КАСЦЮШКІ [illegible]. У былым фальварку Мерачоўшчына. Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка — палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, кіраўнік на[illegible]

Нарадзіўся 12.1746 г. ў сям'і беларускага шляхціца. У афіцыйных дакументах прозвішча Касцюшкаў пісалася Касцюшкі-Сяхновіцкія (па наз[illegible]

738. *Дом Касцюшкаў. З малюнка М. Кулешы «Мерачоўшчына» 2-й паловы 19 ст.*

радавога маёнтка Сяхновічы (цяпер на тэрыторыі Жабінкаўскага р-на). У напаўвярховы драўляны дом Касцюшкаў у Вялікую Айчынную вайну згарэў, асталіся рэшткі падмурка.

Пачатковую адукацыю Т. Касцюшка атрымаў у калегіі піяраў у Любяшове (1755—59 гг.). У 1766 г. скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, у 1769—74 гг. вучыўся ў ваеннай акадэміі ў Парыжы. Значны ўплыў на фарміраванне яго светапогляду зрабілі творы французскіх матэрыялістаў. Пасля вяртання на радзіму працаваў хатнім настаўнікам. У 1776—83 гг. Т. Касцюшка добраахвотнікам удзельнічаў у вайне за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы. Вызначыўся ў бітве пад Саратогай (1777 г.). Атрымаў чын брыгаднага генерала амерыканскай арміі. У 1784 г. вярнуўся на радзіму і заняўся гаспадаркай у Сяхновічах. З 1789 г. ў польскай арміі. Паказаў сябе здольным камандзірам у баях супраць рэакцыйнай Таргавіцкай канфедэрацыі (1792 г.). Пасля перамогі канфедэратаў выехаў за мяжу і стаў адным з кіраўнікоў польскай эміграцыі. У пачатку нацыянальна-вызваленчага паўстання (сакавік 1794 г.) Т. Касцюшка вярнуўся ў Польшчу, быў абвешчаны галоўнакамандуючым нацыянальнымі ўзброенымі сіламі і начальнікам паўстання. Пад яго кіраўніцтвам паўстанцкая армія 4.4.1794 г. пад Рацлавіцамі разбіла царскія войскі (атрад генерала Тармасава). Т. Касцюшка імкнуўся схіліць да паўстання сялянскія масы і насельніцтва гарадоў, надаць яму агульнанародны дэмакратычны характар. Аднак з-за супраціўлення шляхты і ўласнай нерашучасці галоўныя мэты яму дасягнуць не ўдалося. У час няўдалай бітвы каля Мацяёвіц 10.10.1794 г. Т. Касцюшка быў цяжка паранены і ўзяты ў палон царскімі войскамі. Па загаду Кацярыны II пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення Паўлам I (1796 г.) выехаў у ЗША, у 1798 г. зноў вярнуўся ў Еўропу. Захоўваючы вернасць дэмакратычным прынцыпам, не згадзіўся ўзначаліць польскія легіёны ў Францыі, якія контррэвалюцыйная французская Дырэкторыя збіралася выкарыстаць у сваіх мэтах. Пазней адмовіўся супрацоўнічаць з Напалеонам I (1806 г.) і з Аляксандрам I (1814—15 гг.).

Т. Касцюшка памёр 15.10.1817 г. ў Салюры (кантон Золатурн, Швейцарыя). Прах перавезены ў Кракаў і пахаваны на Вавелі. У Кракаве Т. Касцюшку пастаўлены помнік. Яго імем была названа 1-я дывізія Войска Польскага, сфарміраваная ў Савецкім Саюзе ў Вялікую Айчынную вайну (1943 г.).

Літ.: Островер Л. И. Тадеуш Костюшко. — М., 1961. — (Жизнь замечательных людей); Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym. T. 3. — Warszawa, 1846; [illegible] 1960; Tadeusz Kościuszko w historii i tradycji. — Warszawa, 1968.

М. І. Аляксеюк

739. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ (арх. т.). На вул. Леніна, у цэнтры горада. Пабудаваны ў 1878 г. з цэглы.

739. *Троіцкі касцёл. Галоўны фасад*

Складаецца з адна[illegible]фавага прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і больш нізкай пяцігран[н]ай алтарнай апсіды з 2 сакрысціямі. Асноўны аб'ём завершаны [illegible]



739. *Троіцкі касцёл. План.*

739. *Троіцкі касцёл. Выгляд з боку апсіды*

тым шатровым пакрыццём. Галоўны (паўднёва-заходні) фасад аздоблены плоскімі нішамі рознастайных форм і аконных ружай у складаным прафіляваным стральчатым абрамленні. Партал увахода завершаны вімпергам. Сцены бакавых фасадаў маюць вертыкальныя членевнні у выглядзе ступеньчатых контрфорсаў. У будынку вузкія стральчатыя вокны з вітражамі. Неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі і падпружнымі аркамі, [illegible] размалёўкай. Над уваходам — хоры на 2 калонках.

Касцёл — помнік архітэктуры неаготычнага стылю. *Г. Ф. Самбук.*

в. Краглевічы, Целяханскі пасялковы Савет

740. ПОМНІК ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ (гіст.). За 1,5 км на поўдзень ад вёскі, каля шашы Целяханы — Пінск. У гонар воінаў 48-й гвардзейскай стралковай дывізіі і партызан атрада імя А. Ф. Баруцкага партызанскай брыгады імя В. У. Куйбышава, якія 11.7.1944 г. вызвалілі в. Краглевічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у [illegible] абеліск.

в. Красніца (не існуе), Выганашчанскі сельсавет

741. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Красніца знаходзілася за 3 км на захад ад в. Выганашчы. У час карнай аперацыі «Балотная ліхаманка» — Паўднёвы Захад», якую з 12.9.1942 г. ў раёне Івацэвічы — Вострабровыкае — Дабромысль праводзілі 8-ы і 10-ы палкі 1-й пяхотнай дывізіі СС супраць партызан, фашысты акружылі Красніцу, знішчылі 90 жыхароў і спалілі ўсе 19 двароў. Вёска не адрадзілася. У 1950 г. на яе месцы пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

745. *Царква Ганны*

в. Любішчыцы, цэнтр сельсавета

742. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

743. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 21 мірны жыхар, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі восенню 1942 г. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

744. СТАЯНКА (археал.). Знаходзіцца за 0,5 км паўночны ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Грыўда, ва урочышчы Сежня. Выявіў і абследаваў у 1967 г. У. Ф. Ісаенка. Памеры 50×150 м. Усходні край стаянкі заняс хвойнік. Захаваўся культурны пласт таўшчынёй да 1 м. Сярод знаходак — рэтушаваныя пласціны з крэменю і разнастайныя крамянёвыя прылады працы: лістападобныя скрэбкі, скрабкі, разцы і праколкі. Знойдзены адна пляцоўчатыя нуклеусы, абломкі гліняна[га] посуду, найбольш ад вастрадонных ляпных гаршкоў, для вырабу якіх дамешваліся жарства і часам раслінныя рэшткі. Пад венчыкам пасудзіны былі ўпрыгожаны глыбокімі ямкамі, сценкі — паколатым арнаментам. Паселішча адносіцца да нёманскай культуры (2-я палавіна 3-га тысячагоддзя да н. э., позні неаліт). Яго блізкімі аналагі знаходзяцца на р. Шчара (Добры Бор Баранавіцкага р-на, Русакова Слонімскага р-на) і ў басейне верхняга цячэння Прыпяці (Камень Пінскага р-на).

Матэрыялы абследавання збе[рагаюцца] ў Інстытуце гісторыі АН Б[ССР]. *М. М. Чарняўскі.*

745. ЦАРКВА ГАННЫ (архіт.). Каля шашы. Пабудавана ў 1865 г. з цэглы. Да квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму з 2 бакавымі прыбудовамі далучаны пяцігранная апсіда і двух'ярусны тамбур. Асноўны аб'ём на 2 м ярусе пераходзіць у васьмігранны са шчытамі, завершаны шатром і цыбулькай галоўкамі. Прамавугольныя аконныя праёмы ў прафіляваных ліштвах. Вуглы бакавых прыбудоў дэкарыраваны пілястрамі.



745. *Царква Ганны. План*

748. *Помнік Міхаілу Гопшыку.*

Царква — узор выкарыстання ў архітэктуры стылізаваных форм старарускага дойлідства.

в. Магіліцы, Волькаўскі сельсавет

746. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса [illegible]. На ўшанаванне памяці 84 вяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

747. ПОМНІК ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. У ліпені 1944 г. 8-ы партызанскі атрад 8-й брыгады Брэсцкага партызанскага злучэння на чале з камандзірам П. А. Кудр[illegible]ым і камісарам Ц. М. Капецкім знішчылі нямецка-фашысцкі гарнізон у в. Магіліцы. У 1975 г. ў гонар баявога рэйда партызан пастаўлена стэла.

в. Міхнавічы, Станкаўскі сельсавет

748. ПОМНІК ГОПШЫКУ Міхаілу Васілевічу (гіст., маст.). На поўдзень ад вёскі, злева ад шашы Івацэвічы — Брэст.

М. В. Гопшык нарадзіўся 17.1.1927 ў в. Воля Івацэвіцкага р-на. У [illegible]ку вайны партызанскі сувязны, з 1943 г. падрыўнік партызанскай брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага. У атрадзе уступіў у камсамол. Вусцяу пад адхон 7 варожых эшалонаў. 24.4.1944 г. М. В. Гопшык з 2 таварышамі палучыла чарговае баявое заданне з мэтай падарваць варожы эшалон на участку чыгункі Івацэвічы — Брэст. Загадзя замініраваць рэйкі было немагчыма таму што прыгон узмоцнена ахоўваў нямецкі патруль. І тады М. В. [illegible] з міннай кінуўся па[illegible] ваньям, тарматамі і эшалон сплаў под адхон. Выбухам цягнік быў скінуты над адхон. Адважны юнак загінуў. Пахаваны на партызанскіх могілках ва ўрочышчы Гута Міхалін (за 13 км на поўдзень ад в. Верашкі). Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. Імем М. В.

Гойшыка названа вуліца ў Івацэвічах. Яго імя прысвоена Углевіцкай сярэдняй школе, піянерскім атрадам, дружынам у многіх школах Беларусі. У Івацэвічах ёсць школьны музей М. В. Гойшыка (вул. Дзяржынскага, 18), у Мінску — помнік.

Непадалёку ад месца гібелі М. В. Гойшыка ў 1968 г. пастаўлены помнік (скульпт. М. Рыжанкоў, арх. В. Занковіч, Л. Левін; бетон; вышыня [illegible] м) — скульптура юнага партызана на шырокім стылабаце. Постаць юнака пададзена ў рашучым руху. Лаканічнымі пластычнымі сродкамі перадаецца ўнутраная сабранасць партызана, мэтанакіраванасць і гатоўнасць да самаахвярнасці. Фонам для скульптуры з'яўляецца 8-метровая стэла.

Літ.: В памяти народной.— Мн., 1969.
У. С. Паса, А. А. Фактаровіч, Г. М. Ярмоленка.

в. Нахачава, Стайкаўскі сельсавет

749. ПАШТОВАЯ СТАНЦЫЯ (архіт.). На шашы Мінск — Брэст, якая праходзіць праз вёску. Пабудавана ў 1840-я гг. [illegible]

Е-падобная ў плане кампазіцыя комплексу складаецца з 3 аднапавярховых карпусоў: цэнтральнага і 2 бакавых, аб'яднаных сценкамі з арачнымі праездамі, што вядуць ва ўнутраны двор. Цэнтральны, квадратны ў плане, і падоўжныя бакавыя карпусы накрыты вальмавымі дахамі. Галоўны паўднёвы фасад (арыентаваны на шашу) вылучаны ў цэнтры плоскім рызалітам, які завершаны ступеньчатым атыкам. Сцены будынкаў апрацаваны плоскім рустам. Аконныя праёмы (лучковыя ў цэнтральным корпусе і прамавугольныя ў бакавых) аздоблены паўцыркульнымі і лучковымі аркамі з клінчатым рустам. Унутраная планіроўка аб'ёмаў адпавядала іх функцыянальнаму прызначэнню: у цэнтральным знаходзіліся службовыя і жылыя памяшканні для падарожных, бакавыя карпусы выкарыстоўваліся для гаспадарчых патрэб і стайні.

Будынак станцыі — помнік грамадзянскай архітэктуры позняга класіцызму. *Т. І. Чарняўская.*



749. *Паштовая станцыя. План.*

в. Падстарынь, Кушнероўскі сельсавет

750. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВАСІЛЕВІЧУ Івану Іванавічу (гіст.). На будынку Падстарынскай васьмігадовай школы.

Савецкі ваенны дзеяч, камдыў (з 1936 г.) І. І. Васілевіч нарадзіўся 18.6.1895 г. ў в. Падстарынь Івацэвіцкага р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС з мая 1917 г. У 1916 г. скончыў Чугуеўскае ваеннае вучылішча. У 1-ю сусветную вайну прапаршчык І. І. Васілевіч быў на Заходнім фронце. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. праводзіў палітычную работу сярод салдат. Удзельнічаў у барацьбе за ўстанаўленне Савецкай улады ў Тульскай губерні, потым знаходзіўся на партыйнай рабоце на Беларусі. З канца 1918 г. ў Чырвонай Арміі: камісар палка, начальнік палітаддзела дывізіі, начальнік і ваенком Аб'яднанай беларускай ваеннай школы. Кандыдат у члены ЦК КП(б)Б у 1930—32 гг. Член ЦВК БССР у 1929—32 гг. [illegible] 32 г. камендант умацаванага раёна [illegible] камандзір 26-га стралковага корпуса Асобай Далёкаўсходняй арміі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, Чырвонага Сцяга і Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР.

І. І. Васілевіч памёр 25.8.1938 г. У 1975 г. на ўшанаванне яго памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка. *Г. І. Да[illegible]*

751. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ГУЛЕВІЧУ Аляксею Антонавічу [illegible]. Устаноўлена ў 1972 г. на будынку Падстарынскай васьмігадовай школы, дзе вучыўся камсамолец А. А. Гулевіч, які ў Вялікую Айчынную вайну быў партызанскім сувязным і загінуў у барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы ў 1944 г.

752. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля школы. На ўшанаванне памяці 132 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

749. *Паштовая станцыя.*



753. *Помнік на магіле ахвяр фашызму.*

в. Рудня, Быценскі сельсавет

753. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,8 км на ўсход ад вёскі. Пахавана каля 2 тыс. савецкіх грамадзян з в. Быцень, расстраляных у 1941—42 гг. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1968 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Рэчкі, цэнтр сельсавета

754. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 101 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптуры воіна і партызана, побач — стэла з імёнамі загінуўшых.

в. Сакоўцы, Міленкаўскі сельсавет

755. РАДЗІМА ПЕСТРАКА [illegible] Сцяпанавіча (гіст.). Беларускі савецкі пісьменнік, удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, засл. [illegible] культуры БССР (1968 г.). [illegible] рак нарадзіўся 14.11.1903 г. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1926 г. У 1920—21 гг. вучыўся на эканамічным аддзяленні сацыяльна-гістарычнага факультэта Самарскага універсітэта. У 1921 г. вярнуўся на радзіму, якая была захоплена буржуазнай Польшчай. Працаваў грузчыкам на лесапільні, лесарубам, лесніком. У 1924—2[illegible] гг. служыў у польскай арміі. З 19[illegible]7 г. сакратар Косаўскага раённага [illegible] член Слонімскага акруговага камітэтаў КПЗБ, у 1933—34 гг. інструктар ЦК КПЗБ. За падпольную дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны ўладамі буржуазнай Польшчы. Амаль 11 гадоў знаходзіўся ў турмах;

754. *Помнік землякам.*

вызвалены Чырвонай Арміяй у верасні 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну [illegible] тву пры СНК БССР. У 1946—47 гг. у [illegible] пісьменнікаў БССР.

[illegible] варце» (1940 г.), «За сваю Айчыну» (1946 г.), «Падарожжае» (1962 г.), паэму «Слова пра Мінск» (1968 г.). Апублікаваў аповесць «Пачатак» (1948 [illegible] тыя ўсходы» (1951 г.), «Нясмадзяна [illegible] ак» (1957 г.), «Лясная песня» (1958 г.) [illegible] немся на барыкадах» (1951—54 гг.), [illegible] 71 гг. выдадзены «Збор тво[illegible] вайну, змагы у жыцці і свядомасці [illegible] сьва, украінскай, літоўскай і іншых моў.

[illegible] Беларусі (г. Беласток, 1939 г.), член Паўнамоцнай камісіі Народнага сходу на сесіях Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР (1939 г.). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1940—46 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1971—75 гг.

[illegible] 22.8.1978 г. [illegible] коўскай шашы. Яго імя прысвоена [illegible] творчасць. Мн., 1980. *Г. І. Дылёва*

в. Святая Воля, цэнтр сельсавета

756. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1 км ад вёскі, справа ад дарогі на в. Доўгае. 9 насыпаў вышынёй 1—1,5 м, дыяметрам да 10 м. Вы[illegible] ваў у 1970 г. В. Р. Варыжкоўскі. Раскопкі не праводзіліся.

757. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ [illegible] ўшанаванне памяці 61 жыхара вёскі [illegible] чынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Сенькавічы, Кушнероўскі сельсавет

758. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК [illegible] капліцы. На могілках. 11 насыпаў [illegible] 19 ст. У 1865 г. П. Ф. Лысенка раскапаў 4 курганы. Пахавальны абрад [illegible] курганнай яме глыбінёй 0,7—1,3 м, клалі галавой на захад, рукі — уздоўж тулава. Вынулены ямы, пасыпаныя попелам і дробным вуглем. Гэта, хутчэй за ўсё, рэшткі рытуальнага вогнішча. Пахавальны інвентар [illegible] нематаліі. Мужчыны па абрадзе на [illegible] адносіцца да 11—13 стагоддзяў.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР. [illegible]

в. Стайкі, цэнтр сельсавета

759. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 57 жыхароў сельсавета, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1978 г. пастаўлены абеліск.

в. Тупічыцы (не існуе), Выганашчанскі сельсавет

760. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Тупічыцы знаходзілася каля воз. Бабровіцкае, за 4 км на паўночны захад ад в. Бабровічы. Вядома з 1552 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны у вёсцы было 143 жыхары, 34 двары. Нямецка-фашысцкія захопнікі у час правядзення карнай аперацыі «Балотная ліхаманка — Паўднёвы Захад» 15.9.1942 г. спалілі в. Тупічыцы і загубілі ўсіх яе жыхароў.

Вёска не адрадзілася. У 1965 г. недалёка ад [illegible] абеліск. Увекавечана у мемарыяльным комплексе Хатынь. [illegible]

в. Хадакі, Жытлінскі сельсавет

761. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За [illegible] км на поўнач ад [illegible] Пахаваны жыхары вёскі А. Я. Калтун [illegible] пастаўлены абеліск.

в. Хрышчонавічы, Верашкоўскі сельсавет

762. ПОМНІК ПАРТЫЗАНАМ [illegible]. У цэнтры вёскі.

У 1942 г. ў в. Хрышчонавічы і [illegible] фашысцкіх акупантаў. У 1975 г. [illegible]

г. п. Целяханы, цэнтр пасялковага Савета

763. АГІНСКІ КАНАЛ [illegible] Літоўскага магната М. К. Агінскага [illegible] ры. Даўжыня 54 км. Пасля адкрыцця суднаходства па канале перавозілі [illegible] сама сыравіну на вотчынныя мануфактуры ў Целяханы, што спрыяла эканамічнаму развіццю мястэчка [illegible] з уладанняў Агінскага [illegible] меў 10 шлюзаў. З прычыны пяўдала

764. *Помнік на брацкіх [illegible] ... і партызан*

спраектаваная трасы ў выхуху з нізкім узровень вады нагарналася умоўнымі каналы

У час 1-й сусветнай вайны ўздоўж канала праходзіла лінія фронту, усе гідратэхнічныя збудаванні былі разбураны. Адноўлены ў 1920-я гады. Да 1941 г. канал выкарыстоўваўся для сплаву лесу і пасажырскіх суднаў паміж Пінскам і Целяханамі. Другі раз шлюзы разбураны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер канал страціў былое гаспадарчае значэнне.

[illegible] Warszawa. 1935. *М. І. Алексяюк*

764. БРАЦКІЯ МОГІЛКІ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Ленінскай, у скверы. У 10 брацкіх магілах пахаваны 41 воін і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — партызаны 99-й брыгады імя Д. Ц. Гуляева і воіны 138-га гвардзейскага стралковага палка 48-й гвардзейскай стралковай дывізіі, якія 16.7.1944 г. вызвалілі Целяханы ад ворага.

У 1952 г. на могілках пастаўлены абеліск.

Літ.: Буг в огне. [Зб. успамінаў] 2 выд. — Мн., 1977.

765. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). На заходняй ускраіне пасёлка. Курган насыпаны ў 1967 г. на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе, а таксама загубленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну.

765. *Курган Памяці.*

766. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ХАРУЖАЙ Веры Захараўны (гіст.). Вул. Савецкая, 37. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, у якім у 1939—40 гг. жыла В. З. Харужая — дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адна з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну, публіцыст, Герой Савецкага Саюза.

767. МЕСЦА ВЫСТУПЛЕННЯ ХАРУЖАЙ Веры Захараўны (гіст.). Парк культуры і адпачынку. Тут у 1939—40 гг. перад насельніцтвам выступала В. З. Харужая — інструктар Целяханскага райкома КП(б)Б. На ўшанаванне яе памяці на будынку народнага тэатра, які знаходзіцца ў парку, у 1967 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

768. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Ленінскай. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1951 г.

769. ПОМНІК ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). У парку. У студзені 1944 г. партызаны брыгад 8-й (створана ў снежні 1943 г., камандзір С. Г. Жупін, камісар В. А. Пятроў), імя Ф. Э. Дзяржынскага (створана ў снежні 1943 г., камандзір В. М. Манахаў, камісар П. Р. Кавалеў) Брэсцкага партызанскага злучэння і імя В. У. Куйбышава (створана ў лістападзе 1943 г., камандзір У. М. Антановіч, камісар Ф. С. Міхалковіч) Пінскага партызанскага злучэння разгромілі нямецка-фашысцкі гарнізон у Целяханах.

У 1949 г. ў гонар подзвігу партызан пастаўлены абеліск.

в. Яглевічы, цэнтр сельсавета

770. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 13 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941—44 г. У 1950 г. на магіле пастаўлены абеліск.

771. МАГІЛА КЛЮТКО Віктара Сцяпанавіча (гіст.). На могілках.

768. *Помнік У. І. Л[illegible]*

В. С. Клютко нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Яглевічы Івацэвіцкага р-на. З сялян. Член ВЛКСМ. У Вялікую Айчынную вайну сакратар Яглевіцкай падпольнай камсамольскай арганізацыі (1941—42 гг.), партызанскі сувязны. Збіраў зброю і боепрыпасы, дастаўляў іх партызанам, удзельнічаў у дыверсіях. У маі 1942 г. арыштаваны гітлераўцамі і пасля жорсткіх катаванняў павешаны ў Івацэвічах.

У 1950 г. на магіле В. С. Клютко пастаўлены абеліск. Яго імем [illegible] вуліца ў Івацэвічах.

769. *Помнік партызанам.*

772. *Юр'еўская царква.*



772. *Юр'еўская царква. План*

772. ЮР'ЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі, на могілках. Пабудавана ў 1760 г. з дрэва.

Трохзрубная пабудова. Да квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму прылягаюць з усходу пяцігранная апсіда, з захаду — бабінец. Асноўны аб'ём накрыты стромкім двухсхільным гонтавым дахам, да якога прымыкае шатровае пакрыццё апсіды, завершанае шасцігранным барабанам з галоўкай. Сцены зрубаў прарэзаны вялікімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі і гарызантальна ашаляваны дошкамі. Верхняя і ніжняя часткі сцен дэкарыраваны паясамі вертыкальнай шалёўкі. Галоўны фасад утварае прызмістая званіца, падзеленая карнізам на 2 ярусы і завершаная двухсхільным пакрыццём. У інтэр'еры цэнтральны аб'ём звязаны з алтарным зрубам і бабінцам вялікімі праёмамі. Хоры — на 2-м ярусе бабінца.

Царква — помнік драўлянага народнага дойлідства. *С. Ф. Самбук*

КАМЯНЕЦКІ РАЁН

XI. КАМЯНЕЦ

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны за 39 км на поўнач ад Брэста, на беразе р. Лясная, прытоку Заходняга Буга. На шашы Брэст — Камянюкі, за 28 км ад чыгуначнай станцыі Жабінка на лініі Баранавічы — Брэст.



XI. *Выгляд горада ў 13 ст. Рэканструкцыя Я. Куліка.*

Паводле летапісу, Камянец атрымаў сваю назву ад камяністай зямлі. Як паказалі археалагічныя даследаванні, тут у 10—11 стагоддзях узнікла невялікае паселішча, на месцы якога па загаду валынскага князя Уладзіміра Васількавіча (Філосафа) у 1276 г. «градаруб» Алекса разам з тутэйшымі жыхарамі заклаў умацаванае паселішча. Асновай яго абароны, апрача вала з драўлянымі ўмацаваннямі, быў 30-метровы мураваны стоўп (Камянецкая вежа, «Белая вежа»). У 1289 г. Камянец захапіў, а потым дашчэнту разбурыў драгічынскі князь Юрый Львовіч, пляменнік Уладзіміра Васількавіча.

З 1366 г. Камянец у Вялікім княстве Літоўскім. Быў ва ўдзеле князя Кейстута, потым (з 1382 г.) князя Вітаўта. Добра ўмацаваны, размешчаны на вялікім гандлёвым тракце з Брэста ў Гродна і з Кракава ў Вільню, ён стаў даволі буйным гандлёвым цэнтрам. На Камянец тройчы нападалі крыжакі. У 1375 г. яны зрабілі набег на яго ваколіцы і захапілі шмат палонных, жывёлы, у т. л. коней, а ў 1378 г. дашчэнту яго спалілі. На працягу амаль стагоддзя Камянец служыў апорным пунктам ва ўзброеных сутычках паміж Літоўскай дзяржавай і Польшчай.

У 1383 г. князь Януш Мазавецкі, выкарыстаўшы міжусобную барацьбу вялікага князя Ягайлы з Вітаўтам, захапіў Камянец. Але праз год Ягайла пасля тыднёвай асады ўзяў яго штурмам. Памірыўшыся з Ягайлам (1384 г.), Вітаўт далучыў Камянец да сваіх земель. Адсюль, а таксама з Брэста і Гродна Вітаўт рабіў напады на ўладанні Ягайлы. Гэта прывяло да таго, што ў 1390 г. войска Ягайлы захапіла Камянец, дзе адбыліся мірныя перагаворы паміж князямі. Тут жа ў 1409 г. Ягайла прымаў пасла папы рымскага. У 1413 г. Камянец стаў цэнтрам павета, спачатку ў складзе Трокскага, з 1520 г. — Падляшскага, з 1566 г. — Берасцейскага (Брэсцкага) ваяводстваў. Паводле рэестра ваенных падаткаў Вялікага княства Літоўскага Камянец і Брэст у час вайны выстаўлялі аднолькавы вайсковы кантынгент: па 50 коней і 50 коп літоўскіх грошай. Да 1506 г. Камянец атрымаў магдэбургскае права і валодаў ім да 1776 г. У пісьмовых крыніцах 16 ст. ёсць звесткі пра герб горада.

З 1596 г., калі сталіца Рэчы Паспалітай была перанесена з Кракава ў Варшаву і новы гандлёва-адміністрацыйны шлях паміж Варшавай і Вільняй абмінуў Камянец, горад паступова страціў сваё палітычнае і эканамічнае значэнне. Адной з прычын яго эканамічнага заняпаду былі частыя войны. У руска-польскую вайну 1654—67 гг. горад быў разбураны. У канцы

XI. *Плошча Леніна.*

18 ст. у Камянцы яшчэ стаяў драўляны замак, якім валодаў кухмістр вялікалітоўскі — вядомы палітык і дыпламат М. [illegible]. У 18 ст. тут дзейнічала ткацкая мануфактура Радзівілаў.

З 1795 г., пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай, Камянец у складзе Расіі, у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні. З [illegible] да 1920 г. называўся Камянец-Літоўскі. У сярэдзіне 19 ст. тут было 397 двароў, каля 2800 жыхароў, працавалі [illegible] заводы, праводзіліся 3 кірмашы на год. У 1897 г. было 3569 жыхароў, 1186 будынкаў (з іх 678 жылых), сельская лячэбніца, царкоўнапрыходская школа. У 1914 г. працавала 7 дробных прадпрыемстваў.

У 1921—39 гг. Камянец у складзе буржуазнай Польшчы — мястэчка ў Брэсцкім павеце Палескага ваяводства. У ім дзейнічаў падпольны райком КПЗБ. З 1939 г. ў складзе БССР. З 15.1.1940 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна ў Брэсцкай вобл. З 23.6.1941 да 22.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Дзейнічалі раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б (14.6—12.7.1944 г.) і ЛКСМБ (4.3—12.7.1944 г.), антыфашысцкі камітэт (май 1942 г.— ліпень 1944 г.). З 24.6.1983 г. горад.

Першы пасляваенны генеральны план г. Камянец распрацаваны Брэсцкімі абласнымі праектнымі майстэрнямі ў 1963 г. У 1975 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва створаны новы генплан, па якім Камянец развіваецца ў 4 напрамках: на поўдзень па шашы Камянец — Брэст, на ўсход і на захад. У паўднёвай частцы горада сфарміраваўся мікрараён, забудаваны пяціпавярховымі жылымі дамамі. Тэрыторыя Камянца аўтамагістраллю Брэст — Камянюкі дзеліцца на ўсходнюю і заходнюю часткі. Асновай яго планіровачнай структуры з'яўляецца радыяльная сістэма вуліц, якія сыходзяцца да грамадска-адміністрацыйнага цэнтра — пл. Леніна.

Грамадскі цэнтр Камянца сфарміраваўся на скрыжаванні вуліц Брэсцкай і Савецкай. Архітэктурнае аблічча [illegible] вызначаюць будынкі [illegible] райвыканкома, універмага, трохпавяр-

XI. *Забудова вуліцы Брэсцкай. Фрагмент.*

[illegible]ховыя жылыя дамы. Галоўная магістраль горада — вул. Брэсцкая. Асноўныя вуліцы — Пагранічная і 8 Сакавіка — забудоўваюцца шматпавярховымі дамамі. 2 помнікі У. І. Леніну, помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Захаваліся помнікі архітэктуры — Камянецкая вежа («Белая вежа», 13 ст.) і Сімяонаўская царква (пачатак 20 ст.)

Прамысловая зона знаходзіцца ў паўднёва-ўсходняй частцы горада. У Камянцы працуюць вытворчы харчовы завод Брэсцкага аблспажыўсаюза, камбінат кааператыўнай прамысловасці, раённае вытворчае аб'яднанне «Сельгасхімія», сырзавод, камбінат бытавога абслугоўвання, лясніцтва.

У горадзе Дом культуры, кінатэатр, 2 бібліятэкі, бальніца, 2 сярэднія, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, Дом піянераў і школьнікаў, 2 дашкольныя ўстановы. У Камянецкай вежы — філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. Выдаецца раённая газета «Ленінец».

На паўд.-ўсх. захад ад Камянца на беразе р. Лясная размешчаны парк культуры і адпачынку імя 50-годдзя савецкай улады (18 га).

[illegible] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1. Мн., 1936; Жукаў [illegible] А. Мальцаў А. Я. Рогозин И. Е. Города и села Белорусской ССР [illegible] Мн. [illegible] русских [illegible] М. А. [illegible] Мн. [illegible] Т. [illegible] tyczny T. 3. — Warszawa, 1848; Słown k geo[illegible] [illegible] Warszawa 188[illegible]
А. А. Мяцьоў М. А. Ткачоў

773. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН [illegible] Пахаваны [illegible] 1941 [illegible] 1944 [illegible] Героя Савецкага Саюза Фёдара Паўлавіча Хахракова.

Ф. П. Хахракоў нарадзіўся 13 [illegible] 1925 г. ў с. Югаўскае Кунгурскага р-на Пермскай вобл. [illegible] 1943 [illegible] На фронце з [illegible] 1944 [illegible] лейтэнантам Ф. П. Хахраковым у баях каля в. Відамля Камянецкага р-на падбіў 3 варожыя танкі і 6 аўтамашын. Калі гітлераўцы акружылі воінаў, ён асабіста забяспечыў адыход параненых. Загінуў у баі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 2[illegible] [illegible] Імем Ф. П. Хахракова названа вуліца ў г. Камянец.

У 1[illegible] на магіле пастаўлены помнік [illegible] скульптура воіна [illegible]



773. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан* [illegible]

[illegible] Мн. [illegible]
М. М. Казлоўская.

774. КАМЯНЕЦКАЯ ВЕЖА, Камянецкі стоўп, «Белая вежа» [illegible] арх. [illegible] Паводле летапісу [illegible] зведзена [illegible] 127[illegible] [illegible] Уладзімір Васількавіч, выбраўшы ўзвышша на р. Лясная «град», як фарпост [illegible] 17 [illegible] акружаў роў. Рэшткі землянога вала і драўлянага замка канчаткова зніклі ў 1903 г. ў час правядзення рэстаўрацыйных і земляных работ. Паводле праекта арх. В. Суслава вакол вежы быў зняты трохметровы пласт зямлі, у выніку чаго першы ярус, які раней [illegible] зямлёй [illegible] на зямляных работах бяследна зніклі старажытныя [illegible] 1 м [illegible] 2 м ярусамі, а замест [illegible] былі [illegible] рэстаўрацыі [illegible] цэглы (каля 10 тыс. штук) была заказана [illegible] С. Дзянюку. Для правядзення земляных [illegible] работ [illegible] з [illegible] А. Ар[illegible] Вакол вежы быў [illegible] [illegible] дакументы [illegible] 1903 [illegible] а падлогу забрукавалі.

Вышыня [illegible] вежы 29[illegible] м [illegible] 2[illegible] м [illegible] 1[illegible] м. [illegible] Вышыня [illegible] каля 2[illegible] м, [illegible] 1[illegible] м. [illegible] з брусаватых [illegible] (2[illegible] × 1[illegible] × 8 см) [illegible] доўжнымі палосамі ў ніжняй частцы. Мурока «балтыйская» — 2 «лажкі» паслядоўна чаргуюцца з адным «тычком». Звонку на сценах захавалася вялікая колькасць прамавугольных гнёздаў ад «пальцаў» рыштаванняў. Акрамя таго, унутры захаваліся гнёзды ад [illegible] бэлек [illegible] ярусаў. [illegible] 2-га [illegible] 3-га ярусаў былі падвойнымі. Да 1903 г. [illegible] 1 м [illegible] ярусамі [illegible] [illegible]

774. Камянецкая вежа

кметна адрозніваліся ад цэглы і раствору ў муры сцен. Сцены вежы прарэзаны байніцамі, паміж якімі ва ўнутраным баку сцяны размешчаны і плоскія нішы з паўцыркульным завяршэннем. Над 5-м ярусам захаваліся рэшткі цаглянага купальнага скляпення з нятоўшчанымі рэбрамі, якія заканчваюцца ўнізе невялікімі кранштэйнамі з вузкім пояском. Гэта скляпенне (мяркуючы па цэгле і раствору) пабудавана адначасова з вежай.

З 5-га яруса пачынаецца цагляная лесвіца-ход, што вядзе наверх да баявой пляцоўкі. Лесвіца праходзіць праз тоўшчу сцяны і асвятляецца 2 вузкімі акенцамі. Пляцоўка акружана 14 зубцамі, якія маюць скразную адтуліну, роўную па форме і велічыні палову цагліны. У 2 зубцах зроблены вузкія акнападобныя праёмы. Завяршэнне вежы акружала зубчастай стужкай парэбрыка.



774. Камянецкая вежа. Схема плана

Помніку характэрны лаканічныя раманскія і раннеготычныя формы стральчатыя вокны і праёмы, цыркульныя скляпенні на «нервюрах», паўцыркульныя плоскія нішы і байніцы. Велічны, манументальны аб'ём звужаецца ўверсе і не мае ні вертыкальных, ні гарызантальных членяванняў.

Камянецкая вежа — унікальны помнік абарончага дойлідства канца 13 ст. Яна адносіцца да тыпу так званых «валынскіх вежаў» і мае шмат агульнага з вежамі тыпу данжон, пашыранымі ў 12—13 стагоддзях у краінах Заходняй Еўропы. З 1960 г. будынак выкарыстоўваецца як філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.

Літ.: Авенариус Н. П. Башня в Каменце Литовском. Труды Общества исследователей Волыни. 1902, т. 1; Балабушевич В. Каменецкий столб - Литовские. Епархиальные Ведомости за 1881 г. — Вильна, 1881, № 24 25; Всеобщая история архитектуры. Т. 3. — Л.; М., 1966; Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись. М., 1962. Раппопорт П. А. Военное зодчество западно-русских земель X — XIV вв. — Л., 1967. — (Материалы и исследования по археологии СССР; № 140); его ж. Волынские башни. — У кн. Крепостные сооружения Древней Руси. М., 1952. (Материалы и исследования по археологии СССР, № 31). Ткачоў М. А. Замкі Беларусі (XIII — XVII ст.). — Мн., 1977.
М. А. Ткачоў.

775. МАГІЛА ДЗМІТРУК Праскоўі Фёдараўны (гіст.). На вул. 8 Сакавіка.

Удзельніца рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі П. Ф. Дзмітрук нарадзілася 15.10.1899 г. ў в. Ляскі Камянецкага р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1924 г. Батрачыла, працавала на торфараспрацоўках у Арахава Зуеве. З 1916 г. ў Маскве, прымала актыўны ўдзел у забастоўках і дэманстрацыях маскоўскага пралетарыяту. У 1920 г. вярнулася ў родную вёску, праводзіла агітацыйную работу сярод сялян. У 1926—33 гг. сакратар Гродзенскага акругкома, працавала ў Беластоцкім, Баранавіцкім, Пінскім, Брэсцкім, Віленскім і Кракаўскім акругкомах КПЗБ. Дэлегат I з'езда КПЗБ (1928 г.) ад Пінскай акруговай партарганізацыі. Выконваючы заданні ЦК КПЗБ, больш як 20 разоў пераходзіла савецка-польскую граніцу. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1933 г. была арыштавана польскімі буржуазнымі ўладамі і прыгаворана да 10 гадоў турэмнага зняволення. У верасні 1939 г. П. Ф. Дзмітрук вярнулася на радзіму, была выбрана дэпутатам Народнага сходу. Да Вялікай Айчыннай вайны і пасля да 1955 г. ўзначальвала аддзел сацыяльнага забеспячэння Камянецкага райвыканкома.



774. Камянецкая вежа. Разрэз

Памерла 22.12.1978 г. У 1982 г. на магіле пастаўлена стэла. Імем П. Ф. Дзмітрук названа вуліца ў Камянцы.
М. М. Казлоўская.

776. МАГІЛА ПІЎНЕНКІ Пятра Якаўлевіча (гіст.). У скверы. Гвардыі палкоўнік П. Я. Піўненка загінуў 24.7.1944 г. пры вызваленні г. Камянца ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск. Імем П. Я. Піўненкі названа вуліца ў Камянцы.

777. МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, АКТЫВІСТАЎ І МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ (гіст.). За 2 км на поўдзень ад г. Камянец, ва ўрочышчы Прускаўскі лес. Пахаваны 17 воінаў і каля 100 актывістаў і мірных жыхароў Камянецкага р-на, расстраляных у 1941—42 гг. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сярод іх старшыня Прускаўскага сельсавета і арганізатар антыфашысцкага руху Я. Р. Пякарскі; загадчык раённага аддзела народнай асветы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР І. Ю. Кур'янові́ч; старшыня калгаса імя К. Я. Варашылава К. В. Смалюк; брыгадзір калгаса Р. А. Гадоўскі; старшыня Камянецкага пасялковага Савета У. М. Філіповіч; савецкія партызаны В. П. Нікіцюк, Л. А. Карагода і інш. Імем Я. Р. Пякарскага названа вуліца ў Камянцы, імем К. В. Смалюка — вуліца ў в. Рачыца. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

778. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Брэсцкай, перад будынкам райвыканкома. Скульптурная фігура У. І. Леніна пастаўлена ў 1960 г.

777. *Помнік на магіле савецкіх воінаў, актывістаў і мірных жыхароў*

779. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.) Вул. Шуневіч, у скверы. Бюст У. І. Леніна пастаўлены ў 1956 г.

780. РАДЗІМА КАРПОВІЧА Міхаіла (гіст.)

Асветнік, публіцыст і палітычны дзеяч М. Карповіч нарадзіўся 4.10.1744 г. Прафесар Кракаўскай і Віленскай акадэміі. Прапагандаваў ідэі французскіх асветнікаў і матэрыялістаў. На сваіх поглядах быў радыкальным дэмакратам, прапанаваў адкрыць касы дапамогі сялянам з мэтай развіцця іх гаспадаркі. Адзін з першых на Беларусі і ў Літве выступіў з крытыкай прыгоннага права. Змагаўся за ажыццяўленне прынцыпаў Канстытуцыі 3.5.1791 г., якая павінна была садзейнічаць палітычнаму і эканамічнаму ўмацаванню Польшчы. Прымаў актыўны ўдзел у паўстанні 1794 г., якім кіраваў Т. Касцюшка, быў яго памочнікам і ўваходзіў у склад Літоўскага паўстанскага ўрада, з'яўляўся арганізатарам народных школ на Беларусі і Літве. М. Карповіч вядомы як аўтар 2 тамоў «Казанняў» (1776—78 гг.), у якіх палымяна выступаў супраць жорсткага абыходжання феадалаў з сялянамі, адстойваў роўныя правы «хлопаў» з феадаламі і шляхтай, сцвярджаў, што менавіта «хлопы» стварылі першыя ў свеце цывілізацыі і што «ўладары» выраслі з тых самых «хлопаў» і «на шкоду ім». Памёр 5.11.1803 г.

Літ.: Konopczyński W. Polscy pisarze polityczni XVIII wieku. T. 1. Warszawa, 1966; Leśnodorski B. Polscy jakobini.— Warszawa, 1960. *М. М. Янушкан*

781. СІМЯОНАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.) На вул. Гогаля, у цэнтры горада. Пабудавана ў 1912—14 гг. з цэглы.

Квадратны ў плане аб'ём, да якога па падоўжнай восі далучаюцца апсіда, невялікі прытвор і званіца. Цэнтральная частка храма пастаўлена на высокі цокаль і завершана 5 купаламі. Пяцігаловуе цэнтральнага аб'ёму дапаўняецца высокай шатровай званіцай. Ярусная кампазіцыя нарастае ад апсіды да званіцы. Форма паўцыркульнай аркі выкарыстана ў дэкоры бакавых фасадаў, аконных праёмаў, карнізаў. Уваход — арачны партал, над якім зроблена ніша такой самай формы з размалёўкай. У дэкоры фасадаў выкарыстаны какошнікі, сухарыкі, броўкі, закамары і інш. Ва ўнутранай прасторы храма пануе светлавы паўсферычны купал, акруглая ў плане апсіда з конхай мае трох'ярусны іканастас — асноўны дэкаратыўны элемент аздобы інтэр'ера.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

А. М. Камарова, А. М. Кулагін

в. Агароднікі, цэнтр сельсавета

782. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 77 воінаў і 4 партызаны, якія загінулі 26—28.7.1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

На брацкай магіле ў 1960 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны са сцягам. Помнік увекавечвае таксама памяць 43 землякоў, што загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

783. ПАСЕЛІШЧА КУСІЧЫ (археал.) На ўскраіне вёскі, на левым беразе р. Пульва (прыток Заходняга Буга). Выявіла і часткова даследавала ў 1963 г. В. Б. Каратковіч.

Таўшчыня культурнага пласта да 0,4 м. На ўскрытым участку (50 $м^2$) знойдзены рэшткі жылля няправільнай прамавугольнай формы, выцягнутай з паўднёвага захаду на паўночны ўсход (даўжыня 4,5 м, шырыня каля 4 м). Ад сцен асталіся камяні-валуны, якія ў культурным пласце залягаюць на глыбіні 0,4—0,5 м. Відаць, імі былі абкладзены сцены жылля знадворку. Падлога земляная. Каля паўднёва-заходняй сцяны знаходзіўся ачаг, дру-



781. *Сімяонаўская царква. План.*



778. *Помнік У. І. Леніну.*

781. *Сімяонаўская царква. Галоўны фасад.*

784. *Крыжаўзвіжанская царква. Бакавы фасад*

[illegible] крыху меншы [illegible] з паўднёвага боку. Абодва ачагі складзены з каменняў у круглых ямах дыяметрам каля 0,5 м. Уваход у жытло (мяркуючы па размяшчэнню каменяў) быў з усходу. У культурным пласце і першым ачагу знойдзены абломкі [illegible]ліпнога посуду. Па знойдзеных керамічных матэрыялах [illegible] датуецца 4—2 стагоддзямі да н. э. [illegible] належала плямёнам паморскай культуры.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Дзяржаўным музеі БССР.

Літ.: [illegible] В. Б. [illegible] [illegible] Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Ин-та археологии АН СССР, 1964, в. [illegible] *В. Б. Кургановіч*



784. *Крыжаўзвіжанская царква. План*

в. Амельянец, Каленкавіцкі сельсавет

784. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў канцы 19 ст. з дрэва. Раней знаходзілася ў манастыры каля воз. Белае (перавезена ў вёску ў 1925 г.).

Царква ў плане ўяўляе сабой крыж. Да галоўнага аб'ёму з усходу прылягае пяцігранная апсіда, з захаду — званіца. Сцены храма, рубленыя з астаткам, за выключэннем паўночнага фасада, ашаляваны прафіляванымі дошкамі. Галоўны фасад мае двухсхільную вавісь, якая апіраецца на фігурныя кранштэйны, утвораныя выпускам вянкоў зруба 1-га яруса званіцы, увянчанай цыбулепадобнай макаўкай. Над асноўным аб'ёмам царквы ўзвышаецца васьмерыковы светлавы барабан з шатровым дахам і вуглавыя чацверыковыя вежачкі, завершаныя галоўкамі. Алтар аддзелены ад асноўнага аб'ёму двух'ярусным іканастасам.

Архітэктура царквы склалася пад уплывам старажытнарускага дойлідства. *У. К. Філатаў*

в. Баранкі, Відамлянскі сельсавет

785. ГАРАДЗІШЧА (археал.). На поўнач ад вёскі, на левым беразе р. Лясная. З поўдня і ўсходу акружана ровам глыбінёй да 2 м, шырынёй каля [illegible] м і валам вышынёй каля 1,5 м. З боку ракі да гарадзішча падступае балоцісты бераг. Памеры пляцоўкі 115×140 м, таўшчыня культурнага пласта 0,6 м. Абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Барысава, Ратайчыцкі сельсавет

786. АНУФРЫЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1840 г. з бутавага каменю.

Да прамавугольнага ў плане сіметрычнага аб'ёму прымыкаюць апсіда і бабінец. Бакавыя фасады члянянца на роўныя плоскасці 2 руставанымі пілястрамі. Прамавугольныя вокны абрамлены ліштвамі з замковымі камянямі ўверсе. Пілястры і ліштвы атынкаваны, што добра вылучае іх на фоне бутавых сцен. Храм увянчаны васьмерыковым двух'ярусным барабанам з цыбулепадобнай макаўкай. Унутраная прастора падзелена драўлянымі слупамі на 3 нефы.

Квадратная двух'ярусная надбрамная званіца таксама складзена з бутавага каменю, накрыта шатровым дахам, увянчаным драўлянай цыбулепадобнай макаўкай.

Царква — помнік мураванай архітэктуры з [illegible] класіцызму. *У. К. Філатаў*

в. Бушмічы, Варховіцкі сельсавет

787. РАДЗІМА СТЭЛЬМАХА Уладзіміра Мацвеевіча (гіст.). Беларускі савецкі тэатральны дзеяч, пісьменнік, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1961 г.) У. М. Стэльмах нарадзіўся 15.12.1907 г. у сям'і селяніна-бедняка. Пасля заканчэння студыі пры Беларускім тэатры імя Я. Коласа (БДТ-3, 1931 г.) — акцёр Беларускага дзяржаўнага цэнтральнага тэатра рабочай моладзі, з 1937 г. — Беларускага тэатра юнага гледача імя Н. К. Крупскай. Член КПСС з 1939 г. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў

786. *Ануфрыеўская царква*

786. *Ануфрыеўская царква. План*

Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях пад Смаленскам. У 1942 г. загадчык ваеннага аддзела і аддзела прапаганды і агітацыі Рудаўскага райкома ВКП(б) Тамбоўскай вобл. У 1943—45 гг. дырэктар тэатра імя Я. Коласа, у 1945—47 гг.— Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, у 1947—51 гг.— Беларускага тэатра імя Я. Купалы. У 1951—... гг. начальнік аддзела тэатраў Міністэрства культуры БССР. У 1954 г. скончыў Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага ў Маскве. У 1955—66 гг. дырэктар Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, у 1966—71 гг. намеснік старшыні прэзідыума Беларускага тэатральнага аб'яднання.

Літаратурнай дзейнасцю займаўся з 1930 г. Аўтар п'ес «Шляхі» (1930 г.), «Фантан» (1932 г.), «Тры крыжыкі» (1932 г.), «Канец маскараду» (з Ю. Рудзько, пастаўлена ў 1938 г.). Выступаў з артыкуламі пра беларускі тэатр. Выдаў манаграфію «Народны артыст СССР Г. П. Глебаў» (1954 г.), кнігі «Вехі беларускага тэатра» (на ўкраінскай мове, 1964 г.), «Кранаючы чуткія струны душы» (1966 г.), «Тэатр і час» (1973 г.), напісаў артыкул «Старонкі жыцця» у кнізе «Вытокі песні» (1973 г.).

У. М. Стэльмах памёр 27.1.1974 г. Пахаваны у Мінску на Паўночных могілках. *Дз. У. Стэльмах*

в. Ваўковічы, Раснянскі сельсавет

788. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 144 воіны, якія загінулі 21—27.7.1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата са сцягам.

в. Войская, цэнтр сельсавета

789. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1,8 км на паўночны ўсход ад вёскі, за 0,4 км на паўднёвы ўсход ад хутара Прыходы, справа ад дарогі на в. Лісоўчыцы. Пасля раскопак захаваліся 13 пясчаных насыпаў вышынёй 0,2—0,6 м, дыяметрам 3—6 м, абкладзеных вялікімі валунамі. Выяўлены і даследаваў у 1959 г. Ю. В. Кухаранка (раскапаў 31 курган), даследавала ў 1980—81 гг. Т. М. Каробушкіна (8 курганоў). У 2 насыпах пахавальны абрад трупаспалення, у 28 — трупапалажэнне, 9 насыпаў без пахаванняў. Пахаванні адзіночныя на гарызонце ці ў прамавугольных ямах, арыентаваны галавой на захад (17) ці на ўсход (11). У 13 курганах выяўлены вырабленыя валунамі вымасткі. Знойдзены ганчарны посуд з высокім, злёгку адагнутым венчыкам, хвалістым арнаментам і рыфленнем (адзін гаршчок чорнаглянцаваны), маленькі трубчасты замок, нажы, шмат каваных цвікоў, праслы з ружовага сланцу, пацеркі (бронзавыя зярністыя, пасярэбраныя шкляныя, з ружовага сланцу, 3 белыя гліняныя), вітыя пярсцёнкі, металічнае трохпацеркавае і 7 бронзавых спіральных S-падобных скроневых кольцаў. Курганы з пахавальным абрадам трупаспалення датуюцца 11 ст., з трупапалажэннем — 12 ст. Могільнік верагодна, належаў дрыгавічам. Доказам з'яўляецца тыповы для дрыгавічоў камплект упрыгожанняў (пярсцёнкі, трохпацеркавыя скроневыя кольцы, ...ныя металічныя пацеркі і інш.). Захоўваліся язычніцкія традыцыі ў пахавальным абрадзе (каменныя вымасткі, абкладка з валуноў вакол насыпаў).

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і Інстытуце гісторыі АН БССР.

[illegible] Кухаранка Ю. В. Каменные курганы правобережья Западного Буга. [illegible] Древности Белоруссии. Мн., 196[illegible] [illegible] 1 [illegible] № 4.

Т. М. Каробушкіна

790. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Па ўшанаванне памяці 77 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з дзіцем на руках.

791. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана паміж 1751—75 гг. з дрэва. Прамавугольны зруб са зрэзанымі ў алтарнай частцы вугламі, да якога з паўночнага ўсходу прылягае адносна нізкі [illegible] на аснове бабінца. Галоўны фасад завершаны франтонам [illegible] схілам ... ў аднаго схілам асноўнага даху. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі і умацаваны

791. *Царква Раства Багародзіцы. План.*

791. *Царква Раства Багародзіцы [illegible] з боку апсіды.*

791. *Царква Раства Багародзіцы [illegible] на-брама.*

791. *Царква Раства Багародзіцы. Царскія вароты.*



794. *Троіцкі касцёл. Разрэз*

794. *Троіцкі касцёл. Фрагмент інтэр'ера.*

снячкамі. Вуглы аздоблены рагавымі накладкамі. Дах у сярэдзіне прарэзаны гранёнай вежачкай з галоўкай. Інтэр'ер залы, перакрыты бэлечнае. У алтарнай частцы зруба ўбудаваны 2 рызніцы з балконамі. У аб'ёме бабінца — хоры. Захаваліся багата аздобленыя царскія вароты.

Перад царквой стаіць двух'ярусная званіца-брама — чацверык на чацверыку. Першы ярус мураваны, з 3 лучковымі арачнымі праёмамі. ... драўляны, завершаны шатровым дахам з галоўкай.

794. *Троіцкі касцёл.*

У архітэктуры царквы спалучаны элементы народнага дойлідства і барока.

У. К. Фалітай

в. Воўчын, цэнтр сельсавета

792. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 73 воіны, якія загінулі 22.6.1941 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 27—31.7.1944 г. пры вызваленні раёна ад гітлераўскіх акупантаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

793. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 395 жыхароў вёсак Воўчын і Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна, расстраляных у 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

794. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ (арх.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 1733 г. з цэглы для князя Станіслава Панятоўскага. Васьміранная ратонда, увянчаная васьмісхільным дахам са скразной вежачкай і галоўкай. Грані будынка прарэзаны паўцыркульнымі і авальнымі аконнымі праёмамі, якія абрамлены ляпнымі гірляндамі. Фасады расчлянёны спаранымі пілястрамі карынфскага ордэра, акцэнтаваны ... і завершаны лучковымі франтонамі. На франтонах устаноўлены 4 скульптуры евангелістаў. Галоўны (заходні) уваход у храм падкрэслены маленькім арачным тамбурам.

Інтэр'ер касцёла мае цэнтрычную кампазіцыю, якая складаецца з 4-х ... паўкруглых хораў і залы. Хоры ўнутры авальнай формы выступаюць у залу трохграннымі аб'ёмамі. Столь плоская. Сцены расчлянёны шырокім антаблементам на 2 няроўныя ярусы — першы, больш высокі, раскрапаваны пілястрамі карынфскага ордэра на высокім цокалі, другі — толькі лапаткамі і аздоблены ляпнымі дэталямі, картушамі і галоўкамі путці.

Касцёл — помнік мураванай архітэктуры стылю позняга барока з элементамі ракако.

... na rok 1938. Warszawa, 1938.

С. Г. Багласаў, М. С. Кацар



794. *Троіцкі касцёл. План.*

XII. ВЫСОКАЕ

Горад, размешчаны на р. Пульва, за 30 км на паўночны захад ад Брэста. Да верасня 1939 г. — Высока-Літоўск. Цяпер гэтая назва захавалася толькі за чыгуначнай станцыяй (3 км ад горада) на лініі Брэст — Беласток.

Упершыню ў гістарычных дакументах упамінаецца ў 14 ст. пад назвай Высокі Горад. У 1494 г. атрымаў магдэбургскае права і герб (на эліпсападобным шчыце — гарадская брама з прыступкамі і 2 дрэвамі абапал). Адносіўся да вялікакняжацкіх, потым прыватных уладанняў. Належаў Едкавічам, вялікаму князю, потым феадалам Хлявіцкім, Воінам, з 1647 г. Сапегам. Апошнія пабудавалі замак, умацавалі яго насыпнымі валамі з сістэмай вадаёмаў, пасадзілі парк. Замак быў значна разбураны ў час руска-польскай вайны 1654—67 гг. і Паўночнай вайны 1700—21 гг., потым аднаўлены (захаваліся земляныя валы і брама). Пазней горад перайшоў да Патоцкіх. У 1671 г. атрымаў грамату на «вечныя» кірмашы, у 1785 г. адкрыты шпіталь на 20 [illegible]. У 16—18 стагоддзях высокаўскія майстры выраблялі шырока вядомыя дываны і палатно. З 1795 г. Высокае ў складзе Расіі — мястэчка Брэсцкага павета Слонімскай, потым Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У канцы 19 ст. тут пабудаваны Высокаўскі [illegible].

У 1897 г. ў мястэчку 3434 жыхары, [illegible]0 дамоў, працавалі канатная фабрыка, гарбарны і свечачны заводы, 2 маслабойні, 3 школы. На вялікія кірмашы прыязджалі купцы з многіх мясцін купляць коней, буйную рагатую жывёлу і свіней. У 1914 г. было 4800 жыхароў, 12 дробных прадпрыемстваў (32 рабочыя).

У 1915—18 гг. Высокае акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі, у 1919—20 гг. — буржуазнай Польшчы. У жніўні 1920 г. ўстаноўлена Савецкая ўлада, у канцы жніўня Высокае зноў захоплена белапалякамі. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. горад адышоў да буржуазнай Польшчы, уваходзіў у Брэсцкі павет Палескага ваяводства. У верасні 1939 г. вызвалены Чырвонай Арміяй і разам з заходнімі абласцямі Беларусі ўз'яднаны з БССР; налічваў 6,1 тыс. жыхароў. З 23.6.1941 г. да 28.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі; дзейнічаў падпольны райком ЛКСМБ (снежань 1943 г. — 10.7.1944 г.). У 1940—62 гг. — цэнтр раёна. У 1959 г. было 2,6 тыс. жыхароў. У сувязі з узбуйненнем раёнаў у 1962 г. далучаны да Камянецкага р-на.

Галоўная кампазіцыйная вось горада — вул. Леніна. Старажытны раён знаходзіцца на правабярэжжы р. Пульва. Асноўная жылая забудова і адміністрацыйна-гандлёвая частка сфарміраваліся на левым беразе ракі ў 19—20 стагоддзях. У гэтым раёне галоўная вуліца пераходзіць у цэнтральную прамавугольную плошчу са скверам, разбітым на месцы колішніх гандлёвых радоў. Будынкі на плошчы ў асноўным узведзены па тыпавых праектах. Уздоўж вуліц, якія радыяльна разыходзяцца ад плошчы, размешчана забудова пераважна сядзібнага тыпу.

XII. *Забудова вуліцы Савецкай. Фрагмент*

За пасляваенныя гады ў Высокім пабудаваны шэраг шматпавярховых будынкаў, на паўднёва-ўсходняй ускраіне вырас пасёлак з цагляных добраўпарадкаваных дамоў. Горад добра азелянёны. У 1977 г. Беларускім дзяржаўным навукова-даследчым і праектным інстытутам горадабудаўніцтва распрацаваны генеральны план, паводле якога жылая забудова развіваецца ў паўночна-ўсходнім напрамку.

Працуюць завод жалезабетонных вырабаў, сырзавод (філіял Брэсцкага малочнага завода). Камянецкае раённае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі, кансервавы цэх вытворчага аб'яднання «Брэстkансервавінпром», цэх Брэсцкага камбіната камплектуючых электратэхнічных вырабаў, вытворчы ўчастак Камянецкага камбіната бытавога абслугоўвання, метэастанцыя лясніцтва, сярэдняя школа, школа-інтэрнат, дзіцяча-юнацкая спартыўная і музычная школы, сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, 2 дашкольныя ўстановы, кінатэатр, Дом культуры, Дом піянераў і школьнікаў, 2 бібліятэкі, бальніца.

Літ.: Копысский З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1975. Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, [illegible] T. 3. — Warszawa, 1846. Marczak M. [illegible]

XII. *Дом культуры*

795. Помнік [illegible] брацкай магіле савецк[illegible]

797. Сядзіба. Галоўны фасад палаца

[illegible] kiego i innych krajów słowiańskich. T. 1[illegible] Warszawa, [illegible]895. — (На польск. мове). 1897

С. Барысевіч, А. М. Ку[illegible]

795. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры горада, у скверы. Пахаваны 71 воін і 2 партызаны, якія загінулі ў баях за вызваленне горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Развіваючы наступленне, войскі 42-й стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік А. Ц. Кузін) і 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр М. М. Данілаў) 28-й арміі 1-га Беларускага фронту прарвалі моцную абарону праціўніка і раніцай 28.7.1944 г. вызвалілі г. Высокае ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У 1955 г. на магіле воінаў і партызан пастаўлены абеліск.

Літ.: Буг в огне. [illegible] — Мн., 19[illegible]

796. Варварынская капліца

796. ВАРВАРЫНСКАЯ КАПЛІЦА (арх.). На паўночна-заходняй ускраіне горада на ўзвышаным правым беразе р. Пульва. Пабудавана ў 17[illegible] [illegible]



796. Варварынская капліца. План.

Невялікі васьмігранны [illegible] пакрыты шатровым дахам, [illegible] завершаны скрапной фігурнай вежачкай [illegible]. Грані аб'ему [illegible] падзелены плоскімі лучковымі [illegible] лапаткамі, [illegible] цокаля [illegible]. Унутраныя сцены аздоблены жывапісным раслінным арнаментам, рэльефнымі [illegible] дэталямі [illegible]. Над уваходам размешчаны амбо[illegible] [illegible]

Капліца — тып цэнтрычнага храма ў стылі барока.

797. СЯДЗІБА (арх.). У паўднёва-заходняй частцы горада, на [illegible] беразе р. Пульва.

Фарміраванне сядзібы пачалося ў 1678—80 гг., калі яе ўладальнікам быў М. Сапега. У гэты час закладзены замак і парк з палацам, акружаныя валамі і рвамі. Стары замак згарэў у 1784 г. (захаваліся частка [illegible] брама і склады); у 1816 г. непадалёку ад яго пабудаваны новы палац, парк пашыраны за межы вала. У 18[illegible] парк перапланаваны арх. В. Кроненбергам.

Ансамбль сядзібы складаюць мураваныя палац і 2 Г-падобныя ў плане флігелі, якія ўтвараюць прамавугольны парадны двор, а таксама службовы корпус з паўзамкнёным дваром з паўночна-ўсходняга боку ад палаца. Пейзажны парк з вадаёмам займае тэрыторыю больш за 30 га. У ім растуць хвоі (веймутава, чорная), лістоўніцы (еўрапейская, даўрская), каш-



797. *Сядзібны палац. План*



797. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — палац; 2, 3 — флігелі; 4 — службовы корпус; 5 — жылы дом*

ган (васьмітычынкавы вяргінскі) граб, туя заходняя, ясень звычайны, піхта, вольха, бяроза, дуб шырокалісты. У парку жылы дом.

Будынак палаца мае сіметрычную кампазіцыю з двухпавярховай цэнтральнай часткай і аднапавярховымі крыламі. Цэнтральная частка, накрытая двухсхільным дахам, на галоўным паўднёвым фасадзе вылучана чатырохкалонным порцікам з трохвугольным франтонам, на процілеглым дваровым — завершана ступеньчатым атыкам. Класіцыстычныя элементы дэкору выкананы з дрэва і атынкаваны. У цэнтральнай частцы палаца размешчаны вестыбюль і парадная зала з выхадам на тэрасу. Планіроўка крылаў будынка калідорная. Абапал калідора жылыя памяшканні. У інтэр'ерах захаваліся рэшткі колішняй аздобы — ляпныя арнаментальныя плафоны і прафіляваныя карнізы, мазаічная падлога. Цяпер у будынку палаца размешчана школа-інтэрнат.

Сядзіба — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры ў стылі класіцызму.

[illegible]
Т 14 Warszawa, 1895.— (На вокл., 1897)

А. М. Кулагін

798. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры горада. Пабудавана ў 1860 г. з цэглы. Прасторавая кампазіцыя складаецца з прамавугольных у плане прытвора, асноўнага аб'ёму, апсіды і шатровай званіцы. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

в. Вялікая Турна, Відамлянскі сельсавет

799. БРАЦКІЯ МОГІЛКІ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля васьмігадовай школы. Пахаваны 10 воінаў 3-га матастралковага батальёна 3-й механізаванай брыгады, якія загінулі 23.7.1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1972 г. на могілках пастаўлена стэла.

чыгуначная станцыя Вярба, Агароднікскі сельсавет

800. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,8 км на паўднёвы захад ад чыгуначнай станцыі Вярба, за 0,5 км справа ад шашы Брэст — Высокае, у хваёвым лесе. 4 насыпы вышынёй 0,5—0,7 м, дыяметрам 8—10 м. Курганы маюць сферычную форму, задзірванелыя, на асобных растуць хвоі. Абследавалі ў 1978 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся.

в. Верхавічы, цэнтр сельсавета

801. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 178 воінаў, якія загінулі 20—28.7.1944 г. пры вызваленні вёсак сельсавета ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны са сцягам у руках.

802. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1933 г. з дрэва.

Да асноўнага зруба далучаюцца шматгранная апсіда і 2 прамавугольныя ў плане бакавыя прытворы. Дамінанта кампазіцыі — стромкая вежа, завершаная шатром, якая выступае



798. *Царква. Фрагмент бакавога фасада*

797. *Сядзіба. Службовы корпус*

800. *Курганны могільнік. План*

802. *Мікалаеўская царква. Бакавы фасад*



802. *Мікалаеўская царква. Канструкцыя скляпенняў у апсідзе*



802. *Мікалаеўская царква. План*

па галоўным фасадзе. Уваход выдзелены чатырохкалонным порцікам. Двухсхільны дах цэнтральнай часткі увянчаны вежачкай-ліхтаром. Над апсідай дах паўканічны. Сцены гарызантальна ашаляваныя. Аконныя праёмы лучковыя. У асноўным аб'еме столь плоская, у апсідзе — складкаватая. Над уваходам хоры.

Царква — помнік архітэктуры з рысамі готыкі.

803. ЦАРКВА (архіт.). На паўночна-усходняй ускраіне вёскі, на мог... Пабудавана з дрэва ў пачатку 2... ст. Да асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму прыбудаваны чатырохгранная апсіда і двух'ярусная шатровая званіца. Асноўны аб'ём накрыты двухсхільным гонтавым дахам, апсіда — ...льмавым. Сцены гарызантальна ашаляваны. Помнік народнага дойлідства.

в. Гарадзянча,
Дзмітравіцкі сельсавет

804. ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудавана ў канцы 18 ст. з дрэва. Трох'ярусная званіца прыбудавана ў пачатку 19 ст. Царква двухзрубная з пяціграннай апсідай. Накрыта гонтавым дахам з галоўкай у цэнтры вальчыка. Сцены будынка вертыкальна ашаляваныя, аконныя праёмы прама-

804. *Петрапаўлаўская царква. Званіца. Фрагмент.*



804. *Петрапаўлаўская царква. План.*

вугольныя. У інтэр'еры хоры на 2 драўляных слупах. Помнік драўлянага народнага дойлідства.

п. Грымяча, Воўчынскі сельсавет

805. СЯДЗІБА (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі, на узгорку у вусце р. Пульва. Сфарміравалася да сярэдзіны 19 ст. Выкарыстоўваецца як летні піянерскі лагер.

Ансамбль сядзібы складаецца з мураванага палаца, невялікага пейзажнага парку і гаспадарчых пабудоў з бутавага каменю. Перад палацам з паўночнага боку разбіты партэр рэгулярнай планіроўкі.

Прамавугольны ў плане аднапавярховы будынак палаца накрыты двухсхільным дахам, мае жылы мансардавы паверх. Галоўны паўночны фасад у цэнтры вылучаецца чатырохкалонным порцікам і фланкіраваны рызалітамі, завершанымі атыкамі. Процілеглы дваровы фасад аднаведна раскрапаваны цэнтральным і бакавымі рызалітамі. Сцены аздоблены пілястрамі і філёнгамі, прафіляванымі ліштвамі акон і карнізам.

Унутраная планіроўка выраашана па сіметрычна-анфіладнай схеме. Цэнтральная частка занята вестыбюлем і парадпай залай з выхадам на тэрасу. У заходнім рызаліце знаходз...



805. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 палац, 2 — гаспадарчыя пабудовы*



805. *Сядзібны палац. Лесвіца на мансардавы паверх*

службовыя памяшканні і кухня, на 2-м — жылыя пакоі. Захаваліся кафляныя печы і ажурная вітая лесвіца (чыгуннае ліццё), якая вядзе на мансардавы паверх.

Сядзіба — помнік мураванай архітэктуры позняга класіцызму.

І. М. Кіла...

хутар Гуркі,
Ратайчыцкі сельсавет

806. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,2 км ад вёскі, злева ад дарогі Відамля — Высокае, на ўскрайку бярозавага гаю. 163 насыпы. Курганы паўсферычныя, вышыня 0,4—1,7 м, дыяметр 6—14 м, каля падножжаў абкладзены валунамі. Адлегласць паміж курганамі 2—6 м. Паверхня насыпаў задзірванелая, на некаторых растуць бярозы і дубы. Упершыню ў навуковай літаратуры могільнік упамінаецца Ф. В. Пакроўскім у 1895 г. 14 курганоў у 1960 г. раскапаў І. В. Біруля. У 9 з даследаваных курганоў пахаванняў і пахавальнага інвентару не выяўлена, у астатніх на ўзроўні дзённай паверхні выяўлены косці нябожчыкаў, пакладзеных на спіну галавой на ўсход або захад, рукі ўздоўж тулава. Знойдзена некалькі фрагментаў гліняных рыфленых пасудзін з адагнутым краем, зробленых на ганчарным крузе, жалезны нож і 5 чатырохгранных цвікоў. Помнік абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Могільнік адносіцца да 11—1? стагоддзяў. Належаў дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья.— М., 1961; Седов В. В. Курганы ятвягов // Советская археология, 1964, № 4. *Т. М. Каробушкіна.*

в. Данілавічы,
Дмітравіцкі сельсавет

807. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе. 29 круглых у плане насыпаў вышынёй 0,6—4 м, дыяметрам 5—18 м. Адзін курган прамавугольны, шырынёй 16 м, даўжынёй 23 м, вышынёй 4 м. Выявіў у 1968 г. Р. Супрун, абследаваў у 1970 г. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.



805. *Сядзібны палац. Атык і карніз кафлянай печы*

805. *Сядзібны палац. Фрагмент кафлянай печы*



805. *Сядзібны палац. План*

805. *Сядзібны палац. Фрагмент галоўнага фасада*

806. *Курганны могільнік*

в. Дзмітравічы, цэнтр сельсавета

808. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На могілках. На ўшанаванне памяці 103 жыхароў вёсак Бялева, Гарадзішча, Гарошкаўка, Дзмітравічы, Макавічы, Міталкі, Пядомша, Папасюкі, Стаўповіскі, Угучкі, Чвіркі, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ці закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у 1969 г. пастаўлена стэла

809. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (арх.т.) У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1786 г. з дрэва

Царква прамавугольная ў плане Зруб стаіць на бутавым падмурку Галоўны фасад завершаны франтонам з рамбічнымі акенцамі ў цэнтры Вільчык даху праразае васьмерыковы барабан, увянчаны галоўкай. Побач з галоўным уваходам у царкву знаходзіцца чацверыковая каркасная званіца. Царква — помнік народнага дойлідства. *У. К. Філатаў*

в. Доўбізна, Вярховіцкі сельсавет

810. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля клуба. Пахаваны 98 воінаў, якія загінулі 22. 287 1944 г. ў баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са схіленым сцягам

809. *Праабражэнская царква*

811. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). Каля клуба. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1958 г

в. Камянюкі, цэнтр сельсавета

812. МАГІЛА КУЛЯМЁТЧЫКАЎ (гіст., маст.). Перад будынкам музея Белавежскай пушчы. Пахаваны савецкія воіны Ж. Байсямбекаў і А. Махмудаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

23.6.1941 г. кулямётны разлік 333-га стралковага палка 49-й стралковай дывізіі уступіў у няроўны бой з ротай гітлераўцаў. Кулямётчыкі Жакен Байсямбекаў, Ілья Ганчароў і Акцюбакбар Махмудаў адкрылі агонь па нямецкіх машынах, што ішлі па лясной дарозе. Адна машына загарэлася і перагарадзіла шлях астатнім. Гітлераўцы выскачылі з машын і пачалі адстрэльвацца. Бой быў зацяжны. Ж. Байсямбекаў і А. Махмудаў загінулі. Паранены І. Ганчароў працягваў бой, пакуль не выйшаў са строю кулямет. На другі дзень мясцовыя жыхары знайшлі цяжкапараненага І. Ганчарова, схавалі працы кулямі кулямет. Пасля вайны яго устаналілі на магіле Ж. Байсямбекава і А. Махмудава



809. *Праабражэнская царква. План.*

У 1975 г. пастаўлены помнік кулямётчыкам (скульпт. В. Занковіч; сплаў, бетон; вышыня скульптуры 2,5 м пастамента 0,8 м). Ён уяўляе сабой скульптурную кампазіцыю: агаленую паясную фігуру воіна, які напружана прыпаў да кулямета, пастаўленага на невысокім прамавугольным пастаменце. Пляцоўка вакол помніка выкладзена бетоннымі плітамі

Літ.: Смірнов С. С. Брестская крепость.— М., 1970

М. М. Казлоўская, Л. Г. ...

в. Клепачы, Навіцкавіцкі сельсавет

813. МАГІЛА САВЕЦКІХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі. Пахаваны 12 актывістаў, расстраляных у жніўні 1941 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. Сярод расстраляных намеснік старшыні райвыканкома, былы сакратар Камянецкага падпольнага раённага камітэта КПЗБ К. К. Кузько, дэпутат сельсавета К. К. Купц, сакратар сельсавета Ф. І. Купц, участковы міліцыянер П. І. Матуска, інспектар райфа П. С. Мацюхевіч і яго сын — камсамолец, трактарыст П. П. Мацюхевіч, старшыня сельсавета Г. І. Нежнік. Імем К. К. Кузько названа вуліца ў Камянцы. У 1975 г. на магіле ўстаноўлена пліта

в. Коладна, Агароднiцкі сельсавет

814. СТАЯНКІ (археал.). У наваколлі вёскі, каля р. Лясная, на арагдараваным тэрасе марэннага ўзгорка вышынёй 14—15 м. Выявіў у 1926 г. З. Шміт

814а. Стаянка-1. На заходняй ускраіне вёскі, недалёка ад вусця р. Лясная. Цягнецца амаль на 300 м. Культурны пласт у некаторых месцах пашкоджаны. Знойдзена больш за 300 апрацаваных крамянёў і каля 30 крамянёвых прылад: пласціністыя наканечнікі, канцавыя скрабкі, масіўныя пласціны з бакавымі паглыбленнямі і такія ж клінападобныя разцы шматгранныя нуклеусы, пласціны і інш. Частка прылад мае макралітычны выгляд.

814б. Стаянка-2. За 0,1—0,2 км ад в. Шумакі, на правым беразе р. Лясная, на схіле марэннага ўзгорка. Знойдзена больш за 100 апрацаваных крамянёў: ножападобныя пласціны, разнастайныя скрабкі, грубыя рубільнападобныя да рэчаў са стаянкі 1. Стаянкі адносяцца да эпохі мезаліту

Матэрыялы зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР. *У. Ф. Ісаенка*

в. Крыннікі, Воўчынскі сельсавет

815. ПОМНІК ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). За 3 км на паўночны ўсход ад вёскі. У гонар подзвігу пагранічнікаў І. Р. Сяргеева і У. І. Чугрэева

ныя 22.6.1941 г. уступілі у няроўны ... з групай нямецка-фашысцкіх захопнікаў і знішчылі больш за 30 гітлераўцаў. У 1964 г. пастаўлены абеліск.

в. Кусцічы, Ратайчыцкі сельсавет

816. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Высокае. 42 насыпы. Вышыня курганоў 0,3—1,4 м, дыяметр 4—10 м, у ніжняй частцы абкладзены камянямі. Выявіў у 1957 г. К. Сасевіч, даследавалі ў 1960 г. Я. В. Ставуля, у 1981 г. Т. М. Каробушкіна. У 9 даследаваных курганах пахавальны абрад — трупапалажэнне, у трох нябожчыкі ляжалі галавой на захад. Пахавальны інвентар: гаршчок з рыфленнем, арнаментаваны на ганчарным крузе, у паўтара дзясятка скроневыя кольца з серабранага дроту, рэшткі ганчарнага посуду з лінейным арнаментам. У астатніх 6 насыпах пахаванні не знойдзены, знойдзены жалезныя цвікі, драўляны вугаль, рэшткі ганчарнага посуду з рыфленнем. Датуецца 11—12 стагоддзямі. Належаў дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Т. М. Кароб...

в. Лескі, Рэчыцкі сельсавет

817. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору. 4.3.19... нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 2.. жыхароў в. Лескі і спалілі вёску ... двары. У 19.. г. па ўшанаванне памяці ахвяр фашызму на магіле пастаўлены абеліск.

818. МЕСЦА РАЗМЯШЧЭННЯ ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ В. П. ЧКАЛАВА (гіст.). За 2 км на паўночны захад ад вёскі ... хутара Зямчыны. У ... размяшчаўся штаб партызанскага атрада імя В. П. Чкалава брыгады «Савецкая Беларусь». Атрад створаны ў сакавіку 1943 г. па ініцыятыве Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі. Камандзіры П. І. Маслаў, С. З. Астроўскі, Я. І. Калеснікаў; камісары Х. Камуратаў, А. І. Жылякоў, Я. І. ...ажняк. Да чэрвеня 1943 г. атрад ... асобна, у чэрвені — жніўні ... у складзе брыгады імя П. К. Панамарэнкі, у жніўні 1943 г. ўвайшоў у партызанскую брыгаду «Савецкая Беларусь». Дзейнічаў на тэрыторыі Жабінкаўскага і іншых раёнаў. Пры атрадзе быў сямейны лагер.

У 1965 г. каля зямлянак устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Лясоўчыцы, Войскі сельсавет

819. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.).

819а. Могільнік 1. За 1,2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, каля хутара, злева ад дарогі у в. Кашчэнікі. 10 насыпаў ...

812. *Помнік на ма...*

...чаных курганоў сферычнай формы, абкладзены валунамі. Насыпы вышынёй 0,3—0,5 м, дыяметрам 4—... м. Абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна, якая ў 1981 г. даследавала 2 курганы. У адным пахавальны абрад — трупапалажэнне галавой на захад, рукі уздоўж тулава, з частковым трупаспаленнем. Выяўлены жалезны прадмет, які нагадвае наканечнік стралы, абломкі глінянага посуду (у насыпе). У другім кургане — трупапалажэнне галавой на захад. Знойдзена 6 каваных цвікоў. Курганы датуюцца 11 ст. Верагодна, належалі дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

819б. Могільнік 2. За 1,1 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Ізябічына Гара. 4 насыпы вышынёй 0,2—0,3 м, дыяметрам 4—5 м. Раней курганы былі абкладзены валунамі, іх форма парушана. Раскопкі не праводзіліся.

Т. М. К...



821. *Царква Іаана Хрысціцеля. План.*

820. МАГІЛА КАЛГАСНЫХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны арганізатары калгаса «Новае жыццё» Н. М. Андрасюк, Г. А. Андрасюк, С. А. Грыгарук, Я. С. Заяц, Д. А. Пясцярук, І. ... Хоміч, І. М. Якаўлеў, Ф. С. Ярашук, якіх расстралялі 10.9.1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

821. ЦАРКВА ІААНА ХРЫСЦІЦЕЛЯ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 19 ст. з дрэва. Цэнтрычны аб'ём з васьмерыковай званіцай над бабінцам і трохграннай алтарнай часткай. Двухсхільны гонтавы дах з вальмамі над апсідай увянчаны галоўкай. Званіца накрыта высокім шатром. Сцены ... ашаляваны ... на ..., а ў верхняй частцы — ... У інтэр'еры асноўнага аб'ёму з боку

821. *Царква Іаана Х...*



824. *Помнік землякам*

бабінца на ўсю вышыню залы хоры, якія падтрымліваюць 2 слупы. Столь плоская.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства.

в. Любанікі, Дмітравіцкі сельсавет

822. **КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК** (археал.). За 0,8 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на урочышчы Курганы, за 0,2 км злева ад дарогі ў Гапцавічы. 19 курганоў, абкладзеных каля асновы невялікімі камянямі (ёсць насыпы, скрозь абкладзеныя камянямі). Вышыня 0,2—1,2 м, дыяметр 5—8 м. Мясцовая назва Шведскія магілы. Вядомы з 1895 г. У 1962 г. І. В. Біруля даследаваў 2 курганы. Могільнік абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Пахавальны абрад ... інвентару. Датуецца ... ст.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца

827. *Царква*

ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии. — У кн.: Труды 9 Археологического съезда в Вильне 1893. М., 1895, т. 1; Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. — М., 1961.

Т. М. Каробушкіна

в. Мартынюкі, Камянецкі сельсавет

823. **ПОМНІК КІРАВУ** Сяргею Міронавічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст С. М. Кірава ўстаноўлены ў 1960 г.

в. Міхалаева, Камянецкі сельсавет

824. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя У. І. Леніна. На ўвекавечанне памяці 40 жыхароў Камянецкага сельсавета, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1979 г. пастаўлены абеліск, за ім сцяна з імёнамі загінуўшых.

825. **ПОМНІК ЛЕНІНУ** Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя У. І. Леніна. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1970 г.

826. **ПОМНІК ЛЕНІНУ** Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля васьмігадовай школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1970 г.

827. **ЦАРКВА** (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудавана ў канцы 19 ст. з дрэва. Асноўны аб'ём, увянчаны 5 галоўкамі, злучаны з двух'яруснай шатровай званіцай. Апсіда знаходзіцца ў межах асноўнага аб'ёму. Галоўны ўваход храма выдзелены ганкам. Помнік адметны багаццем дэкору: разныя карнізы, арнаментальныя франтоны, ліштвы акон. Помнік драўлянага дойлідства псеўдарускага стылю.

в. Навасёлкі, Воўчынскі сельсавет

828. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАНА** (гіст.). Каля школы. Пахаваны 100 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў 1941 г. і ў ліпені — жніўні 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны са сцягам у руках.

в. Новая Рачна, Рачнецкі сельсавет

829. **ЗАБУДОВА ЦЭНТРАЛЬНАЙ СЯДЗІБЫ КАЛГАСА «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»** (архіт.). За 33 км на захад



827. *Царква. План*

828. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызана*

ад Камянца, 2,5 км ад чыгуначнай станцыі Высока-Літоўск.

Праект забудовы распрацаваны Беларускім дзяржаўным інстытутам праектавання сельскага будаўніцтва (1968 г., арх. А. Бальва, В. Емяльянаў). У адпаведнасці з ген. планам новае будаўніцтва праводзіцца на месцы ад сучаснай індывідуальнай забудовы. Тут фарміруецца грамадска-гандлёвая плошча, у цэнтры якой размешчаны Палац культуры (пабудаваны ў 1970 г., арх. Л. Маскалевіч, інж. С. Майсеева, В. Самашук). У мастацкім афармленні інтэр'ера палаца значнае месца займаюць рэльефная кампазіцыя з тэматыкай на ўсю сцяну фае (калектыў мастакоў пад кіраўніцтвам А. Кішчанкі), габелены, аздабленні.

Жылая зона абапал плошчы забудоўваецца двухпавярховымі жылымі дамамі секцыйнага тыпу, а таксама блакіраванымі дамамі з кватэрамі ва 2 узроўнях. У аснову праекта пакладзены групавы прынцып планіроўкі, пры якім у склад жылых груп уваходзіць па 24—28 кватэр. Гаспадарчыя пабудовы вылучаны ў агульныя блокі і размешчаны ў асноўным на ўтрыманне дробнай свойскай жывёлы.

У пасёлку пабудаваны эксперыментальны аднапавярховы чатырохкватэрны жылы дом для адзінокіх ветэранаў працы. Кожная кватэра мае самастойны ўваход і складаецца з жылога пакоя, пярэдняй з гардэробам, кухні. Дэкаратыўныя элементы, зробленыя з дрэва, надаюць будынку

выразнасць і своеасаблівасць. Тут знайшлі адлюстраванне традыцыі народнага дойлідства у сучаснай практыцы.

Архітэктурна-планіровачнае вырашэнне забудовы сядзібы ў 1970 г. адзначана на ВДНГ СССР дыпломам [illegible] ступені. *А. Я. Б[illegible]*

830. **КАСЦЁЛ** (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 18 ст. з цэглы, перабудаваны ў 19 ст. Цагляны аднанефавы аб'ём з паўцыркульнай алтарнай часткай. Перад уваходам, вырашаным у выглядзе партала, выступае магутны чатырохкалонны портык дарычнага ордэра. Па перыметры будынка праходзіць прафіляваны карніз. Сцены атынкаваны і прарэзаны высокімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Помнік архітэктуры класіцызму.

в. Награнічная, Расненскі сельсавет

831. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці [illegible] аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

832. **ПОМНІК ЛЕНІНУ** Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля Дома культуры. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1962 г.

в. Падбур'е, Каленкавіцкі сельсавет

833. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пахаваны 179 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні вёскі. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны са сцягам у руках.

в. Пнікі, Воўчынскі сельсавет

834. **УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 19 ст. з дрэва.

Будынак мае падоўжна-восевую кампазіцыю. Складаецца з прамавугольных у плане зрубаў бабінца, асноўнага аб'ёму, апсіды, трох'ярусная

829. *Палац культуры*

829. *Палац культуры. Фрагмент керамічнага панно*



829 [illegible]

чатверыковай званіцы (прыбудавана пазней). Асноўны аб'ём у цэнтры увянчаны цыбулепадобнай галоўкай на граненым барабане. Спалучэнне гарызантальнай і вертыкальнай падзелу — асноўны прыём дэкаратыўнай аздобы будынка. Мастацкая выразнасць дасягнута суладпарадкаваннем рознавялікіх аб'ёмаў, аб'яднаных у развітую ярусную кампазіцыю. Уваход у царкву праз невялікі бабінец. Унутры над уваходам хоры. Асноўная прастора храма асветлена высокімі лучковымі вокнамі. Апсіда аддзелена драўляным іканастасам.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства. А. М. Ку[illegible]

в. Пашукі, Навіцкавіцкі сельсавет

835. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з дрэва. Да асноўнага, выцягнутага ў плане аб'ёму, завершанага чатырохсхільным дахам з невялікім купалам на васьмігранным барабане, з усходу прымыкае трохгранная апсіда, з захаду — двух'ярусная званіца з шатровым пакрыццём. Галоўны ўваход вы[illegible] [illegible] мі псеўдарускага стылю.

в. Пелішча, цэнтр сельсавета

836. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Па-



830. *Касцёл. План.*

834. *Успенская царква. Выгляд з боку* [illegible]*ода.*



835. *Пр*[illegible] *царква. П*[illegible]

хаваны 9 танкістаў 19-й механізаванай брыгады 30-га гвардзейскага танкавага палка 28-й арміі, якія загінулі 21.7.1944 г. ў час прарыву варожай абароны каля вёсак Пелішча і Жыціп. У 1974 г. каля магілы на пастаменце ўстаноўлены танк.

837. КАСЦЁЛ СЭРЦА ІСУСА (архіт.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудаваны ў 1-й палавіне 20 ст. з цэглы. Прамавугольныя ў плане рознавялікія асноўны аб'ём, апсіда, [illegible] крысціі і вежа-званіца аб'яднаны ў ярусную прасторавую кампазіцыю. Званіца завершана фігурнай вежачкай. Архітэктура фасадаў вырашана плоскасна з выкарыстаннем рытму арачных акон і шырокіх лапатак. [illegible]

838. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ [illegible] ля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 62 жыхароў вёсак [illegible], [illegible], Падбрадзежаны, Пелішча, Пруска-Валгінова, [illegible]руж, Сосны, Стралі, Шчэрбава, Якубовічы, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 19[illegible] г. пастаўлены абеліск.

в. Пескі, Агародніцкі сельсавет

839. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Паміж вёскамі Пескі і Плянта, у лесе, на правым беразе ручая Люта. 6 курганоў вышынёй 0,5—1,1 м. дыяметрам 3,5—7,5 м. Выявіў у 1968 г. В. Р. Супрун, абследаваў у 1970 г. Я. Г. Звяруга. Раскопкі не праводзіліся.

в. Плянта, Агародніцкі сельсавет

840. КУРГАН (археал.). За 1,5 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Прыгаткі. Да 1965 г. было каля 10 курганоў. У 1965 г. пры будаўніцтве аб'езду на шашы Брэст — Высокае насыпы зруйнаваны, ціпер на іх месцы кар'еры. Захаваўся адзін курган вышынёй 0,7, дыяметрам 8 м. Месца-

834. *Успенская царква. План.*



835. *Прачысценская царква.*

вая назва Шведская магіла. Абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся.

в. Пруска-Валгінова, Камянецкі сельсавет

841. ПОМНІК ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ (гіст.). За 0,[illegible] км [illegible] вёскі. У гонар воінаў 50-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр А. С. Уладычанскі), якія ў ліпені 1944 г. прымалі ўдзел у вы[illegible] захопнікаў, у 1969 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Ракаць, Камянецкі сельсавет

842. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Лясная. Захаваліся 3 курганы дыяметрам ад 7 да 14 м, вышынёй ад 0,5 да 1,5 м. Курганы вядомы з канца 19 ст. Даследавалі ў 1962 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1969 г. І. П. Русанава, у 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Ва ўсіх курганах на гарызонце пад насыпам і ў насыпе ёсць прыкметы вогнішчаў. У рэштках ад[illegible]нага з вогнішчаў сярод вугалля, попелу і дробных перапаленых касцей чалавека выяўлены прамавугольнік з абгарэлых бярвенняў (2,6×3 м). Знойдзены чарапкі грубага ляпнога [illegible] вялікая колькасць абломкаў ганчарнага посуду, прамавугольная жалезная спражка. Могільнік адносіцца да 8—10 стагоддзяў і належыць да групы так званых «парных» курганоў, якія прыпісваюцца валынянам.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце археалогіі АН СССР у Маскве і Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Русанова И. П. Раскопки курганов на Волыни.— У кн.: Археологические открытия 196[illegible] г. [illegible]

Т. М. Каробушкіна

836. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

в. Ражкоўка,
Дзмітравіцкі сельсавет

843. **БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН** (гіст.). Каля могілак. Пахаваны 21 партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе 1-й Украінскай партызанскай дывізіі імя С. А. Каўпака (камандзір П. П. Вяршыгара) у сакавіку 1944 г. Партызаны знянацку ўварваліся ў в. Ражкоўка, дзе знаходзіліся часці дывізіі «Герман Герынг», і ў ходзе жорсткага бою выбілі праціўніка. Гітлераўцы акружылі іх, некалькі разоў спрабавалі зноў заняць вёску. Ноччу ўдалым манеўрам партызаны выйшлі з акружэння і працягвалі баявыя дзеянні на Палессі.

У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Брайко П. Е., Калиненко О. Вспоминая Ковпака. — 2 изд. — М., ...

844. **ХАТА** (архіт.). На галоўнай вуліцы, у цэнтры вёскі. Пабудавана (паводле надпісу на сцяне) у 1880 г.

Хата паўднёвым тарцовым фасадам арыентавана да вуліцы. Пастаўлена на падрубе з брусоў (таўшчыня 15 см) і зрублена ў вугал з астаткам. Двухкамерная пабудова (хата + сенцы), да якой прымыкае хлеў з асобным уваходам. Двухсхільны кроквенны дах пакрыты дранкай. Шчыт зашыты дошкамі «ў разбежку». Першапачаткова ў хаце была курная печ (у пачатку 20 ст. заменена печчу з комінам). Квадратнае ў плане жылое памяшканне захавала традыцыйную камбінацыю інтэр'ера: справа ад ўвахода печ, па дыяганалі ад яе — покуць, дзе злучаюцца 2 лавы, нерухома прымацаваныя да тарцовай і падоўжнай сцен хаты. У плоскай столі якую падтрымлівае сярэдняя падоўжная бэлька, насупраць печы зроблена круглая ... (дыяметр 20 см). Падлога земляная. Сенцы, плошчаю амаль роўныя хаце, выкарыстоўваліся таксама пад камору. Вокны прамавугольныя, размешчаны ў падоўжных сценах, тарцовая сцяна глухая.

Хата тып пашыранага ў эпохі феадалізму і капіталізму двухкамернага жылля, адлюстроўвае характэрныя рысы заходнепалескага жыллёвага сялянскага будаўніцтва 19 ст.

Ю. А. Якімовіч

в. Ратайчыцы, цэнтр сельсавета

845. **БЕСКУРГАННЫ МОГІЛЬНІК** (археал.). За 0,8 км на паўднёвы захад ад вёскі, справа ад дарогі на в. Мурыны. У 1929 г. ў час рамонту дарогі мясцовыя жыхары выпадкова знайшлі пахаванне па абраду трупаспалення (у вялікім гліняным сасудзе знаходзіліся перапаленыя косці чалавека і паперы з чырвонага каменю). У 1962 г. Ю. У. Кухарэнка на плошчы 76 м² даследаваў 2 пахаванні ў прамавугольных ямах. Пахавальны абрад трупапалажэнне. Знойдзена бронзавае скроневае трохпацеркавае кольца. Помнік абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Адносіцца да ранняга жалезнага веку (паморская культура) і да эпохі Кіеўскай Русі (11—12 стагоддзі).

Матэрыялы даследаванняў зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Памятники железного века на территории Полесья. — М., ...; ... памятники Полесья. — М., ...

Т. М. Каробушкіна

846. **КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК** (археал.). За 0,3 км на поўнач ад вёскі, на схіле левага берага р. Пяўка. Усходняя частка могільніка пашкоджана кар'ерам. Захаваліся 8 пясчаных задзірванелых насыпаў паўсферычнай формы вышынёй 0,2—0,7 м, дыяметрам 4—8 м. Некаторыя насыпы захавалі каменную муроўку. Вядома з канца 19 ст. Даследавалі ў 1950—60 гг. І. В. Біруля (раскапаў 29 курганоў), у 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Знойдзены ганчарныя пасудзіны, дужка ад вядра, цвікі, шыферныя праселцы, упрыгожанні з бронзы і серабра, шкляныя з пазалотай пацеркі, раканіна каўры. Датуецца 11—13 стагоддзямі, належаў дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии. — В кн.: Труды 9 Археологического съезда в Вильне 1893. М., 1895, т. 1; Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961; Бируля И. В. Курганы у дер. Ратайчицы. — В кн.: Древности ... М., 1971 ... (М. ... исследования по архе... 176).

Т. М. Каробушкіна



844. *Хата. План*



840. *Курган. План*

842. *Курганны могільнік. План*

в. Рэчыца, цэнтр сельсавета

847. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.).

844. Хата.

847. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і землякам

У цэнтры вёскі. Пахаваны 7 танкістаў, якія загінулі 22.6.1941 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. [illegible] Дубовіка, [illegible] мемарыяльных дошак.

Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці [illegible] Дубовіка [illegible] Заходняй Беларусі [illegible] КПЗБ.

С. А. Дубовік нарадзіўся [illegible] 1888 [illegible] Рэчыцкага сельсавета. Член КПСС з 1912 г. У 1909 г. ў пошуках работы выехаў у ЗША. Там прымаў удзел у рабочым руху. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1911 г. высланы з ЗША, вярнуўся ў Расію і працаваў у Сібіры. Удзельнічаў у выступленні рабочых на залатых капальнях на р. Лена (1912 г.). Двойчы (у 1914 і 1917 гг.) быў арыштаваны і сасланы у Екацярынбург. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 працаваў у Петраградзе, Маскве. У Грамадзянскую вайну [illegible] начальнік аддзела забеспячэння 2-й Украінскай брыгады, камісар палка. З 1921 г. на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля на Брэстчыне. Дэлегат II з'езда Кампартыі Польшчы (19.9—2.10.1923 г.). На I канферэнцыі КПЗБ (1923 г.) выбраны ў склад ЦК КПЗБ. У 1923—24 гг. сакратар Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ. У ліпені 1924 г. арыштаваны і засуджаны на 4 гады турэмнага зняволення. Пасля выхаду з турмы працаваў у апараце ЦК КПЗБ. З 1930 г. ў СССР на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Памёр у 1937 г. Імем С. А. Дубовіка названа вуліца ў Камянцы. Бюст пастаўлены ў 1978 г.

Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 168 жыхароў Рэчыцкага сельсавета, якія загінулі ў 1941—45 гг. у баратьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці пахаваных тут танкістаў.

Мемарыяльная дошка ў гонар першага ў раёне калгаса імя К. Я. Варашылава [illegible] Рэчыцкага сельсавета [illegible] Заходняй Беларусі з БССР. За [illegible] 1941 г. [illegible] Старшыня калгаса К. В. [illegible] С. А. Сатон [illegible] былі расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі [illegible] Пахаваны каля г.п. Камянец у Пружанскім лесе.

Мемарыяльная дошка ў гонар Камянецкага падпольнага райкома КПЗБ, які некаторы час знаходзіўся на тэрыторыі Рэчыцкага сельсавета. Былы сакратар падпольнага райкома КПЗБ К. К. Кузько ў жніўні 1941 г. расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Літ.: Полуян В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.). Мн., 1978.
Т. А. Слесарчык, М. М. Казлоўская.

в. Свіпчова, Ратайчыцкі сельсавет

848. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,1 км на паўночны ўсход ад вёскі, абапал дарогі Камянец — Высокае. Выявіў у 1937 г. К. Салевіч. У 1959 г. I. В. Бірыля раскапаў 14 насыпаў, у 1961 г. В. В. Сядоў — 7. Не даследавана 20 насыпаў.

Курганы па вонкавым выглядзе адрозніваюцца толькі памерамі. Вышыня 0,2—1,6 м, дыяметр 4—8 м. Раскопкі выявілі 2 тыпы пахавальных насыпаў: з каменным панцырам і без яго, дзе курганы толькі каля падножжа абкладзены валунамі. Нябожчыкі на мацерыку, у попельным пласце ці вышэй яго, а у некаторых выпадках [illegible] Пахаваны [illegible] кольцы. Абследавала ў 1980 г. Т. М.

848. Курганны могільнік.



850. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў

852. Помнік I. Н. Бяляеву

Гарбуцына. Помнік адносіцца да 1—13 стагоддзяў. Належаў трыба в ічам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і ў Інстытуце археалогіі АН СССР (Масква).

Літ.: Бирула И. В. Каменные курганы правобережья Западного Буга // Древности Белоруссии. Материалы конференции по археологии Белоруссии и смежных территорий (1966). Мн., 1966; [illegible] Ю. В. Средневековые па[illegible] М., 1961.

Г. М. Барабушкіна.

849. ПОМНІК КАЛІНІНУ Міхаілу Іванавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя М. І. Калініна. Бюст М. І. Калініна ўстаноўлены ў 1969 г.

в. Ставы, Воўчынскі сельсавет

850. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны пагранічнікі М. Г. Бахмецьеў, І. П. Бяляеў, М. А. Зуйкоў, В. Ф. Іваноў, В. Ф. Гулеў, С. І. Мапусцін, якія загінулі 22.6.1941 г., і 97 воінаў, што загінулі ў баях ці памерлі ад ран у 28.7.1944 г. ў час вызвалення тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

851. МЕСЦА ДЭМАНСТРАЦЫІ СЯЛЯН 1927 г. (гіст.) 1.5.1927 г. адбылася першамайская дэманстрацыя, арганізаваная масавай арганізацыяй КПЗБ. Каля 800 сялян з навакольных вёсак з чырвонымі сцягамі прайшлі па вёсцы, адбыўся мітынг з антыўрадавымі прамовамі. Пры спробе паліцэйскіх арыштаваць аднаго з сялян дэманстранты закідалі іх камянямі. Паліцэйскія пачалі страляць. 1 селянін быў забіты, 2 паранены, 26 найбольш актыўных удзельнікаў дэманстрацыі арыштаваны і аддадзены пад суд.

Літ.: Полуян В. А., Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920—1939 гг. Мн., 1962.

852. ПОМНІК БЯЛЯЕВУ Івану Пятровічу (гіст.). За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі.

У першы дзень Вялікай Айчыннай вайны 22.6.1941 г. група воінаў на чале з намеснікам палітрука І. П. Бяляевым утрымлівала абарону ў раёне пагранічнай заставы, што знаходзілася на паўночны захад ад Брэста. Сілы былі няроўныя. Пагранічнікі вымушаны былі адысці. І. П. Бяляеў, прыкрываючы адыход групы, агнём ручнога кулямёта адбіваў атакі ворага. Знясілены і паранены, ён дабраўся да хутара, але быў схоплены гітлераўцамі і расстраляны.

У 1967 г. на месцы бою пастаўлены помнік — бюст І. П. Бяляева. Яго імем названа адна з пагранічных застаў.

Літ.: Буг в огне. [illegible] [illegible] Мн., [illegible]

853. ПОМНІК САВЕЦКІМ ПАГРАНІЧНІКАМ (гіст.). За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі.



855. *Міхайлаўская царква. План*

22.6.1941 г. група пагранічнікаў на чале з старшым лейтэнантам І. І. Цыхановым трымала абарону ў раёне пагранзаставы. Больш як 4 гадзіны вялі пагранічнікі жорсткі, няроўны бой, стрымліваючы пераправу нямецка-фашысцкіх войск цераз Заходні Буг. У гэтым баі смерцю храбрых загінулі М. Г. Бахмецьеў, М. А. Зуйкоў, В. Ф. Іваноў, В. Ф. Гулеў, С. І. Машусцін. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Ставы.

На ўшанаванне іх памяці ў 1967 г. на месцы бою пастаўлена стэла.

Літ.: Буг в огне. 136. [illegible] 3 изд. Мн., 1977.

854. ПОМНІК СВЯРДЛОВУ Якаву Міхайлавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Я. М. Свярдлова. Бюст Я. М. Свярдлова ўстаноўлены ў 1973 г.

в. Такары, Агародніцкі сельсавет

855. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1816 г. з дрэва. Будынак аднazрубны з двух'яруснай званіцай на галоўным фасадзе, прамавугольнай у плане алтарнай часткай і 2 невялікімі рызніцамі з заходняга боку. Дах двухсхільны, гонтавы. Званіца (чацверык на чацверыку) завершана васьмігранным светлавым барабанам з макаўкай. Сцены царквы вертыкальна ашаляваныя. Прыклад традыцыйнага тыпу культавай пабудовы са званіцай.

**в. Трасцяніца,
Ратайчыцкі сельсавет**

856. БЕСКУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2 км на поўнач ад вёскі, на ўзгорку, справа ад дарогі на в. Ратайчыцы. Большая частка могільніка занята сучаснымі могілкамі. Могільнік адкрыў у 1937 г. К. Салевіч, даследавала ў 1962 г. В. Б. Караткевіч. Выяўлены 2 пахаванні і 22 ямы, запоўненыя попелам, камянямі і шлакамі.

У адным пахаванні на глыбіні 0,85 м выяўлена своеасаблівая каменная скрынка, сценкі якой зроблены з невялікіх валуноў у адзін ярус. Яна мела форму няправільнага прамавугольніка, выцягнута з захаду на ўсход (даўжыня 2 м, шырыня з захаду 0,95 м, з усходу 0,4 м). Рэшткі перапаленых касцей 2 нябожчыкаў знойдзены ў гліняным гаршку, што стаяў унутры скрынкі з заходняга боку.

855. *Міхайлаўская царква*

Гаршок быў накрыты гліняным накрыўкам. З усходняга боку [illegible] 4 гліняныя пасудзіны [illegible] чорнай глянцаванай [illegible] міска, [illegible] кубак [illegible]

У другім пахаванні рэшткі перапаленых касцей нябожчыка ляжалі невялікай кучкай у [illegible] на глыбіні 0,55 м. Каля касцей і над імі знойдзены абломкі вялікай гліняной пасудзіны. На касцях знаходзілася жалезная раннелатэнская фібула і драцяны пярсцёнак. Уся кераміка ляпная. Могільнік належаў плямёнам памор[illegible] культуры, што засялялі гэтую тэрыторыю ў 4—2 стагоддзях да н. э.



856. *Бескурганны могільнік. Пахаванне № 1. План і разрэз.*



856. *Бескурганны могільнік. Гліняны посуд з раскопак пахавання № 1*



856. *Бескурганны могільнік. Жалезная фібула і пярсцёнак з раскопак пахавання № 2*

Матэрыялы раскопак зберагаюцца у Дзяржаўным музеі БССР

Літ.: Никитина В. Б. Памятники поморской культуры в Белоруссии и на Украине // Советская археология. 19.. № 1; я е ж. Помнікі паморскай культуры на тэрыторыі БССР // Весці АН БССР Сер. грамадскіх навук, 1966. № ..

В. Б. Каракевіч

857. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). За 0,8 км ад вёскі, справа ад шашы Відамля — Высокае. Пахаваны 22 воіны 70-й гвардзейскай дывізіі, якія загінулі 23—31.7.1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні тэрыторыі раёна. Тут пахаваны таксама 2 партызаны. На ўшанаванне памяці загінуўшых у 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

858. КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ (археал.)

858а. М о г і л ь н і к - 1. За 0,7 км на паўночны захад ад вёскі, на сучасных могілках. Курганы цягнуцца ланцугом уздоўж могілак з поўдня на поўнач. 63 насыпы. Усе абкладзены вялікімі валунамі. Вышыня 0,4—2 м, дыяметр 4,2—12 м. Добра захаваліся, пакрыты дзёрнам. На асобных курганах сучасныя пахаванні. Вядомы з канца 19 ст. Даследаваў у 1962 г. І. В. Біруля (раскапаў 7 курганоў), абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Знойдзены гаршкі, спражкі, меч, упрыгажэнні, нажы і іншыя рэчы. Помнік датуецца 11—13 стагоддзямі. Належаў усходнім славянам, верагодна, дрыгавічам.

858б. М о г і л ь н і к - 2. За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, справа ад павароту ад шашы Відамля — Высокае. Захаваліся 4 насыпы. Вышыня 0,4—0,5 м, дыяметр 5—6 м. Вядомы з канца 19 ст. Даследаваў у 1960 г. І. В. Біруля (раскапаў 2 курганы), абследавала у 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Знойдзены гаршкі, спражкі, нажы і інш. Помнік датуецца 11—13 стагоддзямі. Належаў дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии // Труды 9 Археологического съезда. Т. 1. 1893. М., 1895; Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. — М., 1961.

Т. М. Каробушкіна

859. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з дрэва. Трохзрубная пабудова з прамавугольным у плане асноўным аб'ёмам, пяціграннай апсідай і шатровай званіцай (васьмярык). Цэнтральны аб'ём накрыты двухсхільным дахам і увянчаны галоўкай на васьмігранным барабане. Сцены вертыкальна ашаляваны. Помнік народнага дойлідства.



859. *Праабражэнская царква*

859. *Праабражэнская царква. План.*

в. Хацінава, Ратайчыцкі сельсавет

860. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,8 км на паўночны ўсход ад вёскі, справа ад шашы Відамля — Высокае. 31 курган. Адкрыў у 1957 г. К. Салевіч, даследавалі 14 курганоў у 1960 г. І. В. Біруля, у 1980 г. і 1982 г. Т. М. Каробушкіна. Насыпы круглыя ў плане, вышынёй 0,3—1 м, дыяметрам 2—8 м, задзірванелыя, каля падэшвы абкладзены валунамі. Пахаванні адзіночныя. Пахавальны абрад — трупапалажэнне, у адным — трупаспаленне (адзін курган не меў пахавання і пахавальнага інвентару). Нябожчыкі ляжалі ў прамавугольных ямах галавой на захад. Пахавальны інвентар: гліняныя пасудзіны з адагнутым краем, зробленыя на ганчарным крузе, бронзавая прамавугольная і жалезная круглая спражкі, віты бронзавы шыйны ланцужок, жалезны нож, у жаночых пахаваннях — спіральныя у паўтара абароты сярэбраныя скроневыя кольцы, біканічнае шыферное праселка. Курганы могуць быць аднесены да 11—13 стагоддзяў. Належалі дрыгавічам.



860. *Курганны могільнік. План*

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. — М.

Т. М. Каробушкіна

в. Хлевінча, Верхавіцкі сельсавет

861. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 99 воінаў, якія загінулі ў баях у ліпені — жніўні 1944 г. ў ваколіцах вёскі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны са сцягам.

в. Шастакова, Ратайчыцкі сельсавет

862. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, каля былога хутара. 8 насыпаў вышынёй 0,2—0,5 м, дыяметрам 3—6 м. Курганы абкладзены камянямі. Вылучаецца адзін насып вышынёй 0,6 м, дыяметрам 6 м, уся

паверхня якога абкладзена камянямі. Вывучаў у 1936 г. К. Салевіч. 4 курганы раскапаў у 1959 г. І. В. Бірула. Над дзёрнам выяўлена шчыльная брукоўка з камянёў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў дамавінах. Знойдзены рэшткі ганчарнай керамікі і бронзавая шпілька. Абследавала ў 1980 г. Т. М. Каробушкіна. Належаць дрыгавічам. Датуецца 11—13 стагоддзямі.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

863. МЕСЦА ЖЫЦЦЯ ГАФМЕЙСТАРА Апалінара Паўлавіча (гіст.). Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў 1840—60-я гады.

А. П. Гафмейстар нарадзіўся ў Брэсце ў 1825 г. У 1830-я гады яго бацькі пераехалі ў маёнтак Шастакова. У 1846 г. за спробу ўзняць паўстанне на Беларусі (так званая «справа Рэра») А. П. Гафмейстар арыштаваны і пасля акта грамадзянскага пакарання ў Вільні (1848 г.) адпраўлены ў арыштанцкія роты ў Орск. У канцы 1850-х гадоў вярнуўся на радзіму, займаўся гаспадаркай у Шастакове, адкрыў школу для сялян. У час паўстання 1863—64 гг. быў паўстанцкім цывільным начальнікам Брэсцкага ваяводства. У 1864 г. арыштаваны і сасланы на катаргу. Памёр у 1890 г.

Літ.: Dubiecki M. Apolin Hofmeister, [illegible] w powstaniu styczniowem. — Ateneum Wileńskie, 1923, № 2. *Г. В. Кісялёў.*

864. РАДЗІМА ТРАЎГУТА Рамуальда Людвікавіча (гіст.).

Адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 гг. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве Р. Л. Траўгут нарадзіўся [illegible] 1826 г. ў маёнтку Шастакова. Бацька яго, збяднелы шляхціц, арандаваў зямлю ў генерала Альберта Скопчыня. Скончыў Свіслацкую гімназію. У 1844 г. паступіў на ваенную службу. У Крымскую вайну 1853—56 гг. удзельнічаў у абароне Севастопаля. У 1862 г. ў чыне падпалкоўніка пайшоў у адстаўку і пасяліўся ў маёнтку Востраў Кобрынскага павета. У красавіку 1863 г., калі на Беларусі пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне супраць царызму, Р. Л. Траўгут узначаліў Кобрынскі паўстанцкі атрад, вызначыўся як таленавіты камандзір. У маі яго атрад правёў 3 баі з карнікамі каля в. Горкі. У чэрвені 1863 г. разам з Брэсцкім атрадам Я. Ваньковіча зрабіў рэйд на паўночную Валынь. 11 чэрвеня паўстанцы атрада пад кіраўніцтвам Р. Л. Траўгута ў баі пад Столінам нанеслі карнікам значныя страты. Царскія ўлады падцягнулі войскі. Р. Л. Траўгут пасля некалькіх сутычак з імі распусціў моцна парадзелы [illegible] Варшаву. У жніўні 1863 [illegible] урад прысвоіў яму званне генерала і прызначыў сваім прадстаўніком за мяжой, потым у Варшаве. З кастрычніка 1863 г. Р. Л. Траўгут узначальваў варшаўскі ўрад, фактычна быў [illegible]ком паўстання. Ён [illegible] ажывіць паўстанцкі рух, пашырыць яго сацыяльную базу. 30.4.1864 г. Р. Л. Траўгут арыштаваны і паводле прыгавору ваеннага суда 5.8.1864 г. павешаны ў Варшаўскай цытадэлі.

Імем Р. Л. Траўгута ў 2-ю сусветную вайну называлася дывізія Войска Польскага.

Літ.: Миллер И. С. Ромуальд Траугут. — У кн.: За нашу и вашу свободу. Герои 1863 года. М., 1964. — (Жизнь замечательных людей). Dubiecki M. Romuald Traugutt i jego dyktatura podczas powstania [illegible]. Poznań, 1924. *Г. В. Кісялёў.*

в. Шчэрбава.
Пелішчанскі сельсавет

865. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 33 жыхароў вёсак Бярэзнікі, Гідычы, Пелішча, Падбрадзяны, Сядруж, Страдзі, Шчэрбава, расстраляных у Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкімі акупантамі, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

КОБРЫНСКІ РАЁН
КОБРЫН
Лукі
Запруды
Шаматоўка
Дзявятк.
Гута
Стрыгава
Бяроза
Яромічы
Бярозна
Астромічы
Дзямідаўшчына
Імянін
Бухавічы
Турная
Грушава
Камень
Залессе
Магдалін
Гарадзец
Патрыкі
Кісялёўцы
Хідры
Балоты
Аніскавічы
Дубіны
Вялікія Корчыцы
Верхалессе
Хабовічы
Добрае
Бельск
Павлікі
Дывін
Восі
Станкі, паселішчы, гарадзішчы
Могільнікі (грунтавыя, курганныя), курганы
Помнікі гаспадарчай дзейнасці, прамысловая архітэктура, гідратэхнічныя збудаванні дасавецкага перыяду
Помнікі і месцы рэвалюцыйнага руху (Рэвалюцыя 1905–07 гг., Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, Грамадзянская вайна, барацьба працоўных Заходняй Беларусі)
Помнікі і месцы воінскай славы
Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (месцы баёў, магілы савецкіх воінаў і партызан, Курганы Славы, помнікі землякам і ...)
Помнікі ахвярам фашызму
Помнікі савецкага часу і будаўніцтва
Палацы, сядзібы, аг...
савецкага перыяду
Парки і садова-паркавыя збудаванні

XIII. КОБРЫН

Горад абласнога падпарадкавання (з 1963 г.), цэнтр раёна. Размешчаны на раўнінных берагах суднаходнай р. Мухавец у сутоку яе з Дняпроўска-Бугскім каналам, за 52 км на ўсход ад Брэста. Чыгуначная станцыя на лініі Брэст — Гомель, вузел аўтамабільных дарог на Брэст, Мінск, Пінск, Ковель, Маларыту, рачная прыстань.

Як сведчыць паданне, горад быў заснаваны ў 11—12 стагоддзях нашчадкам кіеўскага князя Ізяслава на месцы рыбацкага паселішча на востраве, утвораным р. Кобрынка пры ўпадзенні яе ў Мухавец. Упершыню Кобрын упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1287 г. У той час яго землі ўваходзілі ва Уладзіміра-Валынскае княства. З 1-й палавіны 14 ст. Кобрын у складзе Вялікага княства Літоўскага, у 1404—1519 гг. цэнтр Кобрынскага княства, якое ўзнікла ў выніку падзелу ўладанняў князя Федара Ратненскага (сына вялікага князя літоўскага Альгерда) паміж яго сынамі Сангушкам і Раманам. Кобрын перадаваўся «для кармлення» у пажыццёвае карыстанне польскім каралевам Боне, Ганне Ягелончы і Канстанцыі Аўстрыячцы. У 1589 г. атрымаў магдэбургскае права і герб — шчыт з выявай маці боскай і святой Ганны. У 16—18 стагоддзях быў цэнтрам Кобрынскай эканоміі. З сярэдзіны 17 да пачатку 18 ст. горад разбуралі войны, спустошвалі эпідэміі і пажары. У сярэдзіне 17 ст. ў Кобрыне каля 1700 жыхароў, каля 500 дамоў. Даведзены да заняпаду, горад у 1766 г. быў пазбаўлены гарадскога самакіравання.

З 1795 г. Кобрын у складзе Расійскай імперыі, павятовы горад Слонімскай, потым Літоўскай губерняў. У 1790-я г. ў горадзе больш за 2 тыс. жыхароў, больш як 300 дамоў. З 1801 г. Кобрын — павятовы горад Гродзенскай губерні.

У Айчынную вайну 1812 г. 15 ліпеня руская войскі атрымалі перамогу над атрадам напалеонаўскай арміі. У 1912 г. ў горадзе адкрыты помнік Перамогі 1812 г. У 1813 г. ў Кобрыне стаяў Іркуцкі гусарскі полк, у якім служыў малады карнет А. С. Грыбаедаў. У час вайны 1812 г. ў Кобрыне згарэла 548 дамоў з 636.

У 1836 г. завершана будаўніцтва шашы Масква — Варшава, якая праходзіла праз Кобрын. У пачатку 1880-х гадоў на яго паўночнай ускраіне пракладзена чыгунка. Паводле перапісу 1897 г., у горадзе 10 355 жыхароў, каля 30 дробных прамысловых прадпрыемстваў (167 рабочых). У час Рэвалюцыі 1905—07 гг. тут праходзілі забастоўкі і дэманстрацыі. У 1905 г. дзейнічаў Кобрынскі камітэт Усерасійскага саюза чыгуначнікаў. У 1914 г. ў горадзе 25 дробных прамысловых прадпрыемстваў [illegible] рабочым. У 1915 г. Кобрын акупіраваны нямецкімі [illegible] войскамі [illegible]. Пасля яго вызвалення Чырвонай Армія [illegible] 1920 [illegible] Кобрынскі павятовы рэўком, які дзейнічаў [illegible] сходзіны [illegible] да [illegible] Рыжскага мірнага дагавора [illegible] горад [illegible] да Польшчы як цэнтр павета Палескага ваяводства. [illegible] Эканамічны крызіс [illegible] працоўныя выклікалі масавую эміграцыю [illegible] павета вялі барацьбу [illegible]. Узначальвалі [illegible] раённы камітэт КПЗБ.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (1939 г.) Кобрын у складзе Брэсцкай вобл. з 15.1.1940 г. [illegible] горад быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. [illegible] акупантаў [illegible] ЦК КП(б)Б [illegible] Фашысты знішчылі ў Кобрыне [illegible] мірных жыхароў. [illegible] горад вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Планіроўка [illegible] Кобрына мае [illegible] Там, дзе р. Кобрынка ўпадае ў р. Мухавец, у старажытнасці [illegible] на якім былі пабудаваны Верхні і Ніжні замкі. [illegible] матэрыялы [illegible] замак быў абнесены [illegible] са шматярусным драўлянымі вежамі. Вакол — ровам і валам. Замкі злучаліся пад'ёмным мостам. Захаваліся рэшткі замкавага рова. На паверхні зямлі знойдзены рэшткі керамікі, якія адносяцца да 12—13 стагоддзяў. Непадалёку ад замкаў, на [illegible] рэшткі старадаўніх вуліц з брукам.

На захад ад замкаў каля 1497 г. апошні кобрынскі князь пабудаваў Спаскі манастыр (захаваўся адзін будынак). Горад забудоўваўся з усходу на захад паралельна Мухаўцу. Шырокая пойма ракі раздзяляла яго на 2 часткі. Паводле даных рэвізіі 1563 г., на левым беразе было 5 вуліц, рыначная плошча і ратуша (не захаваліся), а правым — 2 вуліцы.

У канцы 18 ст. і ў 19 ст. цэнтр горада забудоўваўся галоўным двухпавярховымі жылымі дамамі, ніжнія паверхі якіх адводзіліся пад крамы, майстэрні. У гэты час Кобрын быў абкружаны земляным валам з некалькімі кірмашамі ў год. Значную частку рыначнай плошчы займалі аднапавярховыя крамы (захаваліся часткова). Захаваліся помнікі архітэктуры: Мікалаеўская царква, Спаскі манастыр, паштовая станцыя [illegible].

У Вялікую Айчынную вайну Кобрын страціў каля 30 % жылога фонду. У першыя пасляваенныя гады вуліцы забудоўваліся аднапавярховымі, пераважна драўлянымі дамамі-катэджамі.

Сучасны Кобрын падзяляецца р. Мухавец на паўднёвы і паўночны планіровачныя раёны. Грамадскі цэнтр — пл. Леніна, ансамбль якой фарміруюць будынкі гаркома КПБ, Дома Саветаў



XIII. *Плошча У. І. Леніна.*

XIII. *Гасцініца «Беларусь»*

тасцініцы, жылыя дамы. Тут знаходзіцца [illegible] музей імя А. В. Суворава. [illegible] А. В. Суворану, па вул. Першамайскай у скверы імя Пуганава — помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў. На вул. Леніна ў скверы пастаўлены помнік Вызвалення, на ўсходняй ускраіне горада — помнік героям «Рэйкавай вайны». Рэканструкцыя цэнтральнай часткі горада пачалася ў 1960-я г. [illegible]

У 1980 г. ў Беларускім навукова-даследчым і праектным інстытуце па [illegible] рэалабудаўніцтва завершана распрацоўка генеральнага плана Кобрына [illegible]

У Кобрыне [illegible] мысловыя рады: паўночны (у паўночным [illegible]) [illegible] кагольных напіткаў, камбінат будаўнічых матэрыялаў, 2 заводы жалезабетонных вырабаў, мэблевы цэх Кобрынскага мэблевага вытворчага аб'яднання, 14 будаўнічых арганізацый, раённыя аб'яднанні Дзяржкамсельгастэхнікі і «Сельгасхімія» і інш.

У Кобрыне 8 агульнаадукацыйных і спецыяльных школ, прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў, 13 дашкольных дзіцячых устаноў, 6 бібліятэк, [illegible] кінаўстановак, Дом [illegible], Дом піянераў і школьнікаў, [illegible] філіял Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобл., ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава. Выдаецца газета «Камуністычная праца».

Зона адпачынку — парк імя А. В. Суворава і поўма р. Мухавец.

[illegible] Гродненская губерния Ч. 2.— СПб., 1863; Жучкевич В. А., Чачышев А. Я., Рогозин Н. Е. Города и сёла Белорусской ССР. Историко-географические очерки. Мн., 1959; Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись. М., 1962; Рашевский Н. А. Брестская область. Белорусская ССР. [illegible] Мн., [illegible] Кобринской экономии, [illegible] ревизором Дмитрием Сапегою, с присовокуплением [illegible] piński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym [illegible]

А. М. Мартынаў, А. А. Мінкевіч.

866. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках [illegible] 1944 г. [illegible] 1957 [illegible]

867. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Першамайскай [illegible] імя В. П. Пуганава [illegible] 12—15 км на паўночны захад ад Кобрына. Да яе далучыліся воіны 6-й і 42-й стралковых дывізій. 23.6.1941 г. ў 8 гадзін раніцы батальён фашыстаў падышоў да абарончага рубяжа. Танкісты нанеслі нечаканы франтальны ўдар з тылу і флангаў і поўнасцю знішчылі батальён. У 16 гадзін генерал-маёр В. П. Пуганаў аддаў загад зняць палкі і праз кобрынскі аэрадром выйсці на Маскоўскую шашу (Кобрын ужо быў захоплены гітлераўцамі). З аэрадрома танкі пачалі рухацца па палявой дарозе, дзе сутыкнуліся з фашысцкімі танкамі. Пачаўся жорсткі бой. Каля 30 варожых самалётаў бамбілі пазіцыі савецкіх войск. У гэтым баі гераічна загінуў В. П. Пуганаў. Яго імем названы сквер і вуліца ў Кобрыне.

А. І. Марозаў [illegible] 1922 г. [illegible] р-на Калінінскай вобл. ў сялянскай сям'і. У 1938 г. [illegible] чылішча, у 1940 г.— Батайскую ваенную школу пілотаў. На фронце з 1941 г. Намеснік камандзіра эскадрыллі старшы лейтэнант А. І. Марозаў вызначыўся ў Беларускай аперацыі 1944 г. Зрабіў 271 баявы вылет [illegible] у 33 паветраных баях асабіста збіў 13 варожых самалётаў [illegible] 9 у групавых баях [illegible] самалёты на аэрадромах, 3 чыгуначныя вагоны [illegible] шыны з грузамі. Загінуў 21.7.1944 г. ў час [illegible] Кобрына [illegible] Звание Героя Савецкага Саюза прысвоена 2.2.1945. Яго імем [illegible]

[illegible]

Літ.: Буг в огне. [illegible] Мн., 1977 [illegible]

[illegible]

868. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). [illegible] 30 воінаў [illegible] вызваленнi [illegible] нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

869. ГАРАДСКІ ПАРК ІМЯ А. В. СУВОРАВА (архіт.). На паўночнай ускраіне горада. Закладзены [illegible] пры сядзібе, якая з 1795 г. належала А. В. Суворану (уваходзіла ў маёнтак Кобрынскі Ключ). У 1808 г. перайшла да маёра Гельнга, а з сярэдзіны 19 ст. да Аляксандра Міцкевіча, брата польскага паэта Адама Міцкевіча. У 18 ст. плошча парку не перавышала 3—4 га. Парк быў абкружаны валам і ровам, у цэнтры размяшчаўся пладовы сад і сажалка. З 1948 г. парк носіць імя А. В. Суворава. У той час тэрыторыя яго складала 7,5 га, цяпер — 42 га.

Парк мае рэгулярную сістэму планіроўкі. Кампазіцыйная вось — цэнтральная алея (працяг вул. Сувора



XIII. *Забудова вуліцы Пушкіна.*

868. Помнік ... у гонар ... з войнаў і партызан.

бы, апярэшаная невялікай сажалкай, над якой раней стаяў драўляны домік А. В. Суворава (разабраны ў 1894 г.). На яго месцы ў 1950 г. устаноўлены бюст палкаводца (скульпт. І. М. Рукавішнікаў, бронза; адліўка паводле арыгінала 1904 г.). Створаны вялікі штучны валам з абводным каналам.

У парку да 70 парод драў і дэкаратыўных кустоў: ліпа, клен, дуб, ясень, таполя, акацыя і інш. Яго упрыгожваюць серабрыстая елка, воцатнае дрэва, пірамідальная і кустыстая туя, маньчжурскі явар, сібірская яблынька, в... ...руж і бэз.

Літ.: Помаранцкий А. В. ... ы А. В. Суворова ... 19...

А. В. ...

870. ДНЯПРОЎСКА-БУГСКІ КАНАЛ (гіст.). Праходзіць па Кобрынскім, Драгічынскім, Іванаўскім і Пінскім р-нах. Злучае прыток Прыпяці Піну з прытокам Буга Мухаўцом. Агульная даўжыня канала 196 км. Штучная частка шляху складае 110 км (ад Кобрына да в. Дубае на Піне). Вытокам канала умоўна лічыцца водападзельная лінія каля в. Селішча (у вусці Белаазёрскага канала), дзе ён мае 2 напрамкі — на захад і ўсход. Канал складаецца з 2 частак: адна злучае да Буга (даўжыня 52 км), другая — да Прыпяці (даўжыня 58 км). Праходзіць па плоскай забалочанай раўніне, прарэзанай старымі рэчышчамі і сеткай асушальных каналаў.

Даўны продкі па Прыпяці, Піне, Ваюцы, Мухаўцу з Дняпра дасягалі Буга. На гэтым зручным водным шляху была адна перашкода — палоса забалочанай зямлі, якую даводзілася перацягваць волакам.

Першы праект канала выканаваны каралеўскім картографам Ф. Ф. Чакі ў 1770 г. Будаўніцтва пачалося ў 1775 г. пры каралі (тады слаўе Аўгусце Панятоўскім (таму канал называўся Каралеўскім) і скончана ў 1784. Былі выпраставы звілістыя рэчышчы Піны і Мухаўца. Канал выкарыстоўваўся для сплаву лесу і праходу невялікіх суднаў. У 1837—48 гг. выкананы работы, якія дазволілі праводзіць праз канал баржы з большай асадкай. Неабходны ўзровень вады падтрымліваўся 7 драўлянымі водазаборнымі шлюзамі. У 1940 г. канал быў рэканструяваны, выпрастана частка яго трасы на ўсход ад Кобрына. У Вялікую Айчынную вайну гідратэхнічныя збудаванні былі разбураны. У 1945—46 гг. канал адноўлены. Адначасова праведзена яго рэканструкцыя, што дазволіла скарацідь агульную даўжыню і зменшыць колькасць шлюзаў з 22 да 10. Пазней драўляныя вароты гідравузлоў заменены металічнымі, устаноўлена святлавая сігналізацыя. Цяпер на канале пера... ...матэрыялы.

Днепроўска-Бугскі канал — частка Дняпроўска-Бугскага воднага шляху, які звязвае басейны Дняпра і Віслы, помнік гідратэхнічнага будаўніцтва на Беларусі.

У Кобрыне на вул. Першамайскай на гідравузле № 7 у гонар 200-годдзя з пачатку будаўніцтва канала ў 1975 пастаўлены абеліск. М. І. Алексяюк.

871. ЗАБУДОВА ПЛОШЧЫ СВАБОДЫ (архіт.). На месцы былой рыначнай плошчы — старажытнага цэнтра горада. У плане плошча — навпружаны прамавугольнік, у цэнтры якога былі размешчаны крамы і гасціны двор, а па перыметры — жылыя і грамадскія будынкі, узведзеныя ў канцы 18 — пачатку 19 ст. Першапачатковы ансамбль плошчы зменены: у 1920-я гады перабудаваны крамы, у 1960-я гады ў цэнтры пастаўлены будынак швейнай фабрыкі. Жылыя дамы (вул. Леніна 15, 17, 19, 21, у 1970-я гг. перабудаваны) размешчаны па чырвонай лініі забудовы і выходзяць на плошчу тарцовымі фасадамі, якія трактаваліся як галоўныя. Першапачатковы выгляд і планіроўку захавалі жылыя дамы № 7, 9, 12 і 13 на паўднёвым баку плошчы. З грамадскіх пабудоў уцалеў будынак аптэкі.



869. Гарадскі парк імя А. В. Суворава. Схема планіроўкі.

869. Гарадскі парк імя А. В. Суворава. Бюст А. В. Суворава.

871. *Дом № 29 на вуліцы Леніна*

Будынак гандлёвых радоў. У цэнтры плошчы. Пабудаваны ў 19 ст. з цэглы на месцы драўлянага храма 17 ст. Перабудаваны ў 20 ст. Аднапавярховы, П-падобны ў плане з вялікім гаспадарчым дваром. Пластыку фасадаў падкрэсліваюць неглыбокія нішы і 2 рызаліты з трохвугольнымі франтонамі (у заходнім і усход- нім частках), дзе знаходзіліся уезды у гаспадарчы двор. Вуглы умацаваны контрфорсамі. Захаваліся пачатковыя уваходы, галоўныя уваходы бакі гандлёвых радоў.

Жылы дом. Пл. Свабоды, 7. Пабудаваны ў канцы 18 ст. з цэглы, перабудаваны ў 20 ст. Цяпер тут гандлёвыя установы. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак, тарцовым фасадам выходзіць на плошчу, завершаны атыкам, мае прамавугольныя вокны.

Жылы дом. Пл. Свабоды, 9. Пабудаваны ў канцы 18 ст. з цэглы, перабудоўваўся ў 20 ст. Трохпавярховы прамавугольны ў плане будынак, галоўным тарцовым фасадам выходзіць на плошчу. Фасад дэкарыраваны карнізным паяском і завершаны атыкам.

Будынак аптэкі. Пл. Свабоды, 6. Пабудаваны ў канцы 18 ст. з цэглы. Перабудаваны ў 20 ст. У 1950-я гады надбудаваны 3-і паверх, зменена унутраная планіроўка. Першапачаткова будынак уяўляў сабой двухпавярховы аб'ём, у плане выцягнутай трапецападобнай формы, галоўным тарцовым фасадам выходзіць на плошчу. Плоскасць фасада рытмічна прарэзана прамавугольнымі аконнымі праёмамі і дэкарыравана 4 пілястрамі. Будынак пастаўлены на высокі цокаль. Галоўны ўваход (з боку галоўнага фасада) акцэнтаваны высокім ганкам з лесвіцай па абодвух баках.

Рэгулярная планіроўка плошчы, архітэктура жылых і грамадскіх будынкаў спалучае рысы класіцызму з элементамі барока.

І. Ю. Пятросава, Т. І. Ча[illegible]

872. КАСЦЁЛ (архіт.). На вул. Першамайскай. Пабудаваны ў 1843 г. з цэглы. Трохнефавы двухвежавы храм. Прамавугольны ў плане аб'ём накрыты двухсхільным дахам. Галоўны фасад вылучаюць 2 аднаярусныя чацверыковыя вежы. На бакавых фасадах пілястры з аркатурным поясам. Помнік архітэктуры класіцызму.

873. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ўсходняй ускраіне горада справа ад шашы Кобрын — Пінск. Пахавана больш як 200 мірных жыхароў горада, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1941—43 гг. Сярод пахаваных — былы член КПЗБ, падпольшчык К. І. Пракапчук. У 1967 г. на магіле пастаўлена абеліск.

874. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). Вул. Леніна, 6. Устаноўлена ў 1975 г. на ўшанаванне памяці членаў КПЗБ і КСМЗБ (усяго 21 чалавек), якія нарадзіліся на Кобрыншчыне і загінулі ў 19[illegible]—39 гг. у барацьбе за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне Заходняй Беларусі і ўз'яднанне яе з БССР.

875. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СУПРАЦОЎНІКАМ МІЛІЦЫІ (гіст.). Вул. 17 Верасня, 11. У першыя пасляваенныя гады ў барацьбе з ворагамі Савецкай улады загінулі 6 супрацоўнікаў Кобрынскага раённага аддзялення міліцыі: В. В. Аляксандрын, У. І. Крываль, А. А. Прудчыкаў, П. М. Сцяпанюк, А. М. Серадовіч, М. С. Слабада. У 1972 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых устаноўлена мемарыяльная дошка.

871. *Жылыя дамы № 15, 17, 19 на [illegible] Леніна*

871. *Дом № 7 на плошчы Свабоды. План 1-га паверха*



871. *Дом № 9 на плошчы Свабоды. План 1-га паверха*



871. *Будынак аптэкі. План 1-га паверха*

871. *Забудова плошчы Свабоды. Гандлёвыя рады*

876. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ТАНКІСТАМ (гіст.). Вул. Савецкая, 147. Устаноўлена ў 1975 г. на ўшанаванне памяці танкістаў 22-й танкавай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра В. П. Пуганава, якія 23.6.1941 г. вялі баі на Кобрыншчыне супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

877. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР РЭУКОМА (гіст.). Пл. Камсамольцаў, 14. Устаноўлена ў 1959 г. на доме, у якім з 31 ліпеня да 13 верасня 1920 г. знаходзіўся Кобрынскі павятовы рэвалюцыйны камітэт — першы орган Савецкай улады ў горадзе і павеце.

31.7.1920 г., на другі дзень пасля вызвалення ад белапольскіх акупантаў, у горадзе быў створаны рэвалюцыйны камітэт, да якога перайшла ўся ўлада ў Кобрынскім павеце (старшыня П. Я. Харашылаў, сакратар У. К. Карліцкі, члены Е. Бартэнбаум і Кузеў). Камітэт наладжваў паштовую сувязь і чыгуначны рух, вёў падрыхтоўку да выбараў у Саветы. Для падтрымання рэвалюцыйнага парадку была арганізавана міліцыя на чале з Ф. І. Федасюком і павятовае аддзяленне губернскай ЧК у складзе Д. Ляўчука, Г. Панцеля і Ф. І. Федасюка. 13.9.1920 г. ў сувязі з наступленнем войск буржуазнай Польшчы рэўком пераехаў у Драгічын, потым у Гомель, дзе 17.10.1920 г. расфарміраваны.

871. *Будынак ... на плошчы Свабоды*

877. *Будынак, у якім знаходзіўся раўком*

Літ.: Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению Советской [illegible] [illegible] сборник документов и матер[illegible] Мн. 1957. *А. М. Мартынаў.*

878. МЕСЦА ВЫСТУПЛЕННЯЎ ЧЫГУНАЧНІКАЎ У 1905 г. (гіст.)

Чыгуначнікі Кобрына прымалі актыўны ўдзел у Рэвалюцыі 1905—07 гг. Узначальваў барацьбу Кобрынскі камітэт Усерасійскага саюза чыгуначнікаў. Як данёсў у Віленскую судовую палату пракурор Гродзенскага акруговага суда, камітэт ставіў перад сабой «не толькі эканамічныя, але і палітычныя мэты», накіроўваў сваю дзейнасць да звяржэння існуючага ў Расіі дзяржаўнага і грамадскага ладу. Першую буйную забастоўку чыгуначнікі арганізавалі ў пачатку снежня 1905 г. 9 снежня ў падтрымку маскоўскага пралетарыяту кобрынскія чыгуначнікі абвясцілі забастоўку, дабіліся звальнення начальніка станцыі і іншых службовых асоб і ўзялі станцыю пад свой кантроль.

У памяць аб рэвалюцыйнай барацьбе кобрынскіх чыгуначнікаў на будынку чыгуначнага вакзала ў 1978 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 1 (1883—1918 гг.). — Мн., 1962; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955. *В. М. Савіцкі.*

879. МЕСЦА ЗАГУБЫ АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўднёвай ускраіне горада ў 1942—4.. гг. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі больш за 4,5 тыс. мірных жыхароў. У 19.. на ўшанаванне іх памяці пастаўлены абеліск.

880. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На правым беразе р. Мухавец. Пабудавана да 1750 г. з дрэва, часткова перабудавана ў 1860-я гады. Прамавугольны ў плане асноўны аб'ём з пяціграннай апсідай пакрыты вальмавым дахам і завершаны купалам на васьмерыковым светлавым барабане, які пастаўлены на чацверык галоўнага ўваходу. Фасад вылучаны порцікам з 2 калонкамі. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі і прарэзаны высока размешчанымі прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Чатыры слупы ў інтэр'еры пры дапамозе ветразяў падтрымліваюць барабан купала. У 4 вуглах асноўнага аб'ёму ўбудаваны невялікія дапаможныя памяшканні.

Царква — помнік архітэктуры класіцызму.

881. ПАШТОВАЯ СТАНЦЫЯ (архіт.). Вул. Савецкая, 106. Пабудавана ў 1846 г. ў сувязі з пракладкай шашы Пецярбург—Варшава. Першапачаткова складалася з 3 аб'яднаных праезнымі аркамі карпусоў: галоўнага і 2 бакавых, якія ўтваралі ўнутраны гаспадарчы двор. У 1882 г. будынак быў прыстасаваны пад ваенны шпіталь. У 1954 г. бакавыя карпусы светлавымі калідорамі злучаны з галоўным. У будынку размяшчаецца мэблевы цэх мясцовага вытворчага камбіната.

Станцыя — помнік грамадзянскай архітэктуры класіцызму.

Літ.: Сардаров А. С. История и архитектура дорог Белоруссии. Мн., 1978.

882. ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Вул. Першамайская, на могілках. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва. Кампазіцыя будынка складаецца з двух'ярусная шатровай званіцы, асноўнага аб'ёму і прамавугольнай у плане апсіды. Квадратная ў плане цэнтральная частка завершана цыбулепадобнай галоўкай. Помнік культавага драўлянага дойлідства.

880. *Мікалаеўская царква*

881. *Паштовая станцыя. Выгляд на галоўны фасад*



883. *Помнік Вызвалення*

883. ПОМНІК ВЫЗВАЛЕННЯ (гіст.). У скверы імя Марозава.

Развіваючы наступленне на Брэсцкім напрамку ў ліпені 1944 г., воіны 212-й стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік У. Г. Кучынеў), 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік Д. К. Мальцаў), 9-га гвардзейскага стралковага корпуса 61-й арміі пры падтрымцы 271-й бамбардзіровачнай дывізіі 16-й паветранай арміі пачалі бой за Кобрын. Фарсіраваўшы р. Мухавец, яны ўварваліся ў горад з поўдня і ўсходу, завязалі жорсткія вулічныя баі. Пасля 4-гадзіннага бою 20.7.1944 г. праціўнік быў выбіты з горада. 12 вайсковым часцям, якія вызвалілі горад, прысвоена найменне «Кобрынскіх».

У 1965 г. у гонар вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пастаўлена стэла.

Літ.: [illegible] 1975. *М. М. Казлоўская.*

884. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На пл. Леніна, перад будынкам гаркома КПБ. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 19[illegible] г.

885. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Вул. Пралетарская, на тэрыторыі інструментальнага завода. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1968 г.

886. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Савецкай, у скверы. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1980 г.

887. ПОМНІК ПЕРАМОГІ 1812 г. (гіст.). На вул. Леніна.

24.6.1812 г. Расія падвергласа нападзенню французскай арміі. 15.7.1812 г. войскі 3-й рускай арміі пад камандаваннем генерала А. П. Тармасава пад Кобрынам уступілі ў бой з саксонскім корпусам генерала Ж. Ранье. Чатырохгадзінныя атакі саксонцаў [illegible] было ўзята ў палон 2382 салдаты і 76 афіцэраў на чале з генералам Кленгелем. У дзень 100-годдзя з дня перамогі ў Кобрыне быў закладзены помнік (арх. Д. Маркаў).

На пастаменце з гранітных валуноў, які нагадвае скалу, устаноўлены бронзавы арол з распасцёртымі крыламі і лаўровым вянком у кіпцюрах, абапал — мартыра з пірамідкамі ядраў. На фасадных і бакавых гранях пастамента — 3 мармуровыя дошкі. На пярэдняй дошцы (шэра-зялёнага колеру) надпіс: «Рускім воінам, якія атрымалі першую перамогу над войскамі Напалеона ў межах Расіі 15 ліпеня 1812 г.», на бакавых (белага колеру) пералічаны назвы частак рускай арміі, што ўдзельнічалі ў Кобрынскай бітве, і фундатары помніка. У час 1-й сусветнай вайны былі зняты і згублены арол і бакавыя дошкі. Помнік адноўлены ў 1954 г. (скульпт. М. Керзін).

Літ.: Бескровный Л. Г. Отечественная война 1812 года. М., 1962.

884. *Помнік У. І. Леніну*

887. *Помнік у гонар перамогі 1812 г.*

888. *Помнік А. В. Суворава*

890. *Спаскі манастыр. Галоўны фасад жылога корпуса*

рускіх [illegible] з Напалеонам 1812 г. (Па [illegible] Мартынаў А. В. [illegible] Кобрыншчыны // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1971, № 4.

I. М. Мартынаў.

888. ПОМНІК СУВОРАВУ Аляксандру Васілевічу (гіст., маст.). У скверы на скрыжаванні вуліц Савецкай і Пушкіна. Адкрыты ў 1963 г. (скульпт. В. Чабатароў; бетон, чыгун; вышыня пастамента 2,2 м, фігуры 2,2 м).

Фігура А. В. Суворава ўстаноўлена на высокім чатырохгранным пастаменце ў цэнтры трохвугольнай пляцоўкі. Правай рукой палкаводзец апіраецца на шпагу, левай парывістым рухам указвае на далячынь. Дынамічны і выцягнуты сілуэт А. В. Суворава кантрастуе з масіўнай формай пастамента. Скульптура выканана ў рэалістычнай манеры і перадае абліччa генералісімуса: натхнёны твар, ударчывая фігура ў мундзіры з [illegible], [illegible] цераз плячо і высокія боты са шпорамі. На пастаменце надпіс: «А. Суворов 1730—1800».

Літ.: [illegible] А. В. [illegible] — Л., 1963.

I. М. Злотамецава.

889. САБОР АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА (архіт.). На вул. Леніна. Пабудаваны ў 1868 г. з цэглы ў гонар рускіх воінаў Айчыннай вайны 1812 г. (устаноўлена мемарыяльная дошка). Крыжова-купальны храм з васьмігранным барабанам. Сцены галоўнага фасада і трансепта завершаны трохвугольнымі франтонамі. Помнік архітэктуры позняга класіцызму.

890. СПАСКІ МАНАСТЫР (архіт.). Вул. 17 Верасня, на левым беразе р. Мухавец. Заснаваны ў 1497 г. пры драўлянай царкве Спаса. У пачатку 18 ст. манастыр меў мураваныя жылы і службовыя карпусы (на працягу 17—18 стагоддзяў неаднаразова перабудоўваліся), капліцу. Захаваўся жылы корпус (цяпер выкарыстоўваецца як адміністрацыйны будынак).

Жылы корпус — двухпавярховы мураваны [illegible] у плане будынак, накрыты ламаным дахам. Падоўжныя фасады раскрапаваны 2 рызалітамі — у цэнтры галоўнага ўсходняга фасада і па паўночна-заходнім вуглу. Цэнтральны рызаліт адзначаны [illegible] франтонам з лучковым завяршэннем і [illegible] дэкаратыўнымі элементамі. Сцены аздоблены [illegible] фігурнымі франтонамі вакол прамавугольных аконных праёмаў, завершаны развітым карнізам. Пакрыццё над паверхам' [illegible] над падвалам — цыліндрычныя скляпенні. Унутраная планіроўка будынка значна зменена. Першапачаткова цэнтральную частку займала манастырская царква. На 1-м паверсе [illegible] [illegible]. У астатніх частках будынка знаходзіліся службовыя і жылыя памяшканні.

889. *Сабор Аляксандра Неўскага*

889. *Сабор Аляксандра Неўскага. План.*

Манастыр — помнік архітэктуры барока.

На будынку ўстаноўлены 2 мемарыяльныя дошкі: у гонар перамогі рускіх войск над напалеонаўскімі і ва ўшанаванне памяці супрацоўнікаў міліцыі (гл. артыкул № 875 «Мемарыяльная дошка супрацоўнікам міліцыі»).

[illegible]

891. СЯДЗІБНЫ ДОМ СУВОРАВА Аляксандра Васілевіча (гіст., архіт.). Вул. Суворава, 16. Тут жыў вялікі рускі палкаводзец генералісімус А. В. Суворaў.

Упершыню А. В. Суворaў пасяліўся тут у 1797 г., калі трапіў у няміласць да Паўла І. Адсюль яго ў тым жа годзе саслалі ў с. Канчанскае Ноўгарадскай губерні. У пачатку 1800 г. цяжкахворы А. В. Суворaў па дарозе са Швейцарыі другі раз наведаў Кобрын, прабыў тут 2 месяцы. Пасля яго смерці маёнтак Кобрынскі Ключ распрададзены нашчадкамі. У пачатку 1860-х гадоў у гэтым доме жыў Р. Траўгут — адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 гг. у Беларусі, Польшчы і Літве.



890. Спаскі манастыр. Дваровы ... корпуса.

890. Спаскі манастыр. План 1-га па... корпуса.

Кутузаўны дом пабудаваны ў апошнім дзесяцігоддзі 18 ст., разбураны ў Вялікую Айчынную вайну. У 1948 г. дом аднаўлены, у 1980 г. праведзены рэстаўрацыйныя работы. Будынак аднапавярховы, прамавугольны ў плане, з высокім вальмавым дахам. Пры будаўніцтве выкарыстана канструкцыйная схема з сярэдняй падоўжна-нясучай цаглянай сцяной. Фасады дома сіметрычныя. Цэнтральныя часткі галоўнага і дваровага фасадаў вылучаны ганкамі з 2 парамі калон. Сцены звонку атынкаваныя. Вокны прамавугольныя. Планіроўка дома анфіладная.

У 1946 г. прынята пастанова аб рэстаўрацыі дома і стварэнні ў ім ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава. Адкрыты для наведвальнікаў 15.1948 г. Перад домам у 1948 г. устаноўлены бронзавы бюст А. В. Суворава (скульпт. Н. Кюферле), абапал ганка — 2 гарматы, адлітыя ў 1812 г.

Літ.: Петрушевский А. Генералиссимус князь Суворов. — 2 изд. — СПб., 190... Помарнацкий А. В. Портреты А. В. Суворова. Очерки иконографии. 1...

У. В. Алексеенка, А. М. Мартына...



891. ... дом А. В. Суворава...

892. ЯВАЧНАЯ КВАТЭРА (гіст.). Вул. Савецкая, 6. Тут у 1920-я гады знаходзілася явачная кватэра арганізацыі КПЗБ.

Партыйная арганізацыя ў Кобрыне дзейнічала ўжо ў 1921 г. Яна налічвала 20 чалавек і вяла работу ў горадзе і навакольных вёсках. Кіраваў арганізацыяй Г. Панцель (у жніўні 11... закатаваны ў беластоцкай турме), І. Г. Смольскі, І. Берман, Г. Тагазінскі. У 1923 г. створаны Кобрынскі райком КПЗБ (сакратар Г. Г. Смольскі). У розны час у склад райкома уваходзілі В. З. Глушчук (сакратар у 1927 г.), В. С. Селівонік, І. С. Каваль (сакратар у 1935—37 гг.), А. Кавальчук, С. З. Глушчук, А. Р. Федзюк ... кіраўніцтвам дзейнічалі таксама Кобрынскі гарком КПЗБ (у 1937 г. сакратар Ш. Камянецкі) і райком КСМЗБ (у 1931 г. сакратар Р. Глек). Пад кіраўніцтвам КПЗБ 1 Мая 1925 г. ў Кобрыне адбылася трохтысячная дэманстрацыя працоўных. Восенню 1929 г. ў Кобрынскім павеце арганізавана праведзена 2-дзённая забастоўка 600 батракоў з 7 маёнткаў. Амаль ва ўсіх вёсках і хутарах камуністы стварылі забастовачныя камітэты, а таксама агульны забастовачны камітэт, у які ўваходзілі камуністы, камсамольцы і беспартыйныя. Памешчыкі вымушаны былі павысіць плату батракам на 40—60%. Вопыт Кобрынскай партарганізацыі па кіраўніцтве забастоўкай абагулены ЦК КПЗБ у падпольным «Бюлетэні ЦК КПЗБ» у снежні 1929 г.

892. Дом, у якім знаходзілася явачная кватэра КПЗБ

25.2.1931 г. працоўныя Заходняй Беларусі адзначалі Міжнародны дзень барацьбы з голадам і беспрацоўем. Каля 1500 чалавек пад кіраўніцтвам Кобрынскага райкома КПЗБ сабраліся ў цэнтры горада і са сцягамі і транспарантамі рушылі да магістрата. На бок працоўных перайшло некалькі салдат з мясцовага гарнізона. Паліцыя адкрыла агонь. Былі паранены больш за 120 удзельнікаў выступлення, арыштаваны, жорстка збіты і пасаджаны ў казематы кобрынскай турмы. Кіраўнікі дэманстрацыі С. Жук

893. ... А. В. Суворава. Галоўны фасад.

893. *Пакроўская царква*

893. *Пакроўская царква. Інтэр'ер. Фрагмент пакрыцця асноўнага зруба*



893. *Пакроўская царква. План*

І. Літвянюк, І. С. Касабо[illegible] дзяны. Палітычная дэманстрацыя 25.1.1941 г. ў Кобрыне была адной з найбольш масавых у Заходняй Беларусі.

На доме ў 1969 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы. Т. [illegible] 1939 гг.). – Мн., 1972; Воткович Г. Б., Короткевич В. Б. Пусть помнят все: Памятники и памятные места революционной и национально-освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. Мн., 1974; Годы испытаний и мужества. Мн., 1973; Полуян В. А., Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. – Мн., 1962; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.). – Мн., 1966.

Г. Б. Воткович



894. *Помнік землякам*

в. Акцябр, Гарадзецкі сельсавет

893. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўскраіне вёскі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва.

Будынак складаецца з цэнтральнага зруба, пяціграннай апсіды, пераходнай часткі і двух'яруснай шатровай званіцы. Над пакатым чатырохсхільным дахам зруба узвышаецца васьмігранны светлавы барабан, пакрыты шатром з галоўкай. У інтэр'еры падкупальная прастора вылучаецца ступеньчатым злучэннем васьмiграннага светлавога барабана і пакрыцця асноўнага зруба.

Царква – прыклад традыцыйнага чатырохчасткавага драўлянага храма.

894. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 120 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1979 г. пастаўлена [illegible] скульптура воіна з [illegible]чынкай.

в. Арол (не існуе),
Гарадзецкі сельсавет

895. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Арол знаходзілася за 1 км на поўдзень ад в. Ліпнікі, на паўднёвым беразе Дняпроўска-Бугскага канала. У Вялікую Айчынную вайну 22.12.1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты ўварваліся ў вёску, загубілі 18 жыхароў і спалілі яе (12 двароў). У 1974 г. на месцы спаленай в. Арол пастаўлена стэла.

в. Астрамічы, цэнтр сельсавета

896. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля гандлёвага цэнтра. Пахаваны 18 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1961 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура салдата.

в. Балоты, Кісялевіцкі сельсавет

897. ПАРАСКЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў 1882 г. з дрэва.

Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя ўключае трох'ярусную званіцу, квадратны ў плане цэнтральны аб'ём з цыбулепадобнай галоўкай і чатырохгранную апсіду з бакавымі прыбудовамі. Цэнтральны і 2 бакавыя ўваходы вылучаны ганкамі з двухсхільнымі дахамі на 2 калонках. У дэкаратыўнай аздобе – разныя карнізы,

896. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*



899. *Помнік ахвярам фашызму.*

ццвы, гарызантальная і вертыкальная падзелка.

Царква — помнік архітэктуры класіцызму.

в. Барысаўка, Восаўскі сельсавет

898. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,8 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе.

Раніцай 25.9.1942 г. фашысцкія каратэлі акружылі вёску і бліжэйшыя хутары. Жыхароў выгналі з хат і расстралялі ў лесе (загінула 289 чалавек), а вёску спалілі (225 двароў). У 1978 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура маці з дзіцем.

899. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі побач са школай. На ўшанаванне памяці 206 жыхароў вёскі, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 25.9.1942, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

901. *Помнік землякам.*

в. Бельск, Навасёлкаўскі сельсавет

900. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). За 3 км на паўднёвы ўсход ад вёскі. Пахаваны каля 20 воінаў і партызан.

У снежні 1944 г. ў напрамку в. Ора вяло наступленне войны 1293-га палка 160-й стралковай дывізіі. Камандаванне дывізіі паставіла задачу партызанскаму атраду імя М. М. Чарнака брыгады імя І. В. Сталіна ўтрымаць пераправу цераз Шзаўскі канал да падыходу асноўных часцей. Першая атака праціўніка на захоп пераправы была адбіта. Вораг страціў каля 200 салдат і афіцэраў. Атрымаўшы падмацаванне, фашысты зноў ішлі ў атаку, і кожны раз партызаны адбівалі іх. На працягу 2 дзён (24 і 25 сакавіка) атрад утрымліваў пераправу да падыходу часцей 160-й стралковай дывізіі.

У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: В едином строю. Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии 1941—1944. Мн., 1970.

М. М. Казлоўская.

901. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 9 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1979 г. пастаўлены помнік — скульптура маці з дзіцем.

в. Боркі, Астроміцкі сельсавет

902. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі.

У 1942 г. гітлераўцы расстралялі 18 жыхароў, вёску спалілі (70 двароў). На ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ў 1974 г. пастаўлены помнік — 5 жалезабетонных брусоў адзін на адным.

903. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Перамога». На ўшанаванне памяці 37 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Бухавічы, цэнтр сельсавета

904. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі. Пабудавана ў 1674 г. з цэглы як касцёл дамініканаў. У 19 ст. касцёл перароблены пад царкву. У 1889 г. прыбудавана трох'ярусная званіца (верхні ярус — драўляны шатровы васьмярык), абноўлены дах і надбудавана вежа над алтарнай часткай. Трохчастковая кампазіцыя царквы ўключае званіцу, прамавугольны ў плане асноўны аб'ём над вальмавым дахам і прамавугольную ў плане апсіду з рызалітам. Канструкцыя даху кроквенная. Вуглы паўднёва-ўсходняй часткі асноўнага аб'ёму царквы і апсіды ўмацаваны контрфорсамі. Уваход фланкіруюць 2 пілоны з паўкруглымі нішамі. Асноўнае зальнае памяшканне раздзелена на 2 часткі драўлянымі упрыгожанай разьбой балюстрадай (2-я палавіна 19 ст.).



904. *Пакроўская царква. План.*



902. *Помнік ахвярам фашызму.*

904. *Пакроўская царква.*

906. *Крыжаўзвіжанская царква.*

906. *Крыжаўзвіжанская царква. Выгляд з боку апсіды*

Царква — помнік мясцовага мураванага дойлідства. *У. В. Алісейчык*

в. Быкі, Астроміцкі сельсавет

905. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1,5 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе. Пахаваны 24 жыхары



906. *Крыжаўзвіжанская царква. План*

вёскі, якіх 23.2.1943 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Бяроза, Бухавіцкі сельсавет

906. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1864 г. з дрэва.

Трохзрубны храм з пяцісценнай апсідай і двух'яруснай вежай-званіцай над бабінцам, злучаным з асноўным аб'ёмам вузкім пераходам. На баках цэнтральнага аб'ёму прыбудаваны 2 невялікія аб'ёмы, дэкарыраваныя 4 калонкамі. Галоўны ўваход вылучаны пілястравым порцікам. Сцены гарызантальна ашаляваныя. Вялікая квадратная ў плане зала перакрыта шатром, які абапіраецца на 4 слупы.

Царква — помнік народнага дойлідства з элементамі архітэктуры класіцызму.

907. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У двары школы. На ўшанаванне памяці 46 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Бярозна, Астроміцкі сельсавет

908. ПЛАНІРОЎКА І ЗАБУДОВА ВЁСКІ (архіт.). Вёска размешчана на роўнай бязлеснай мясцовасці. Упершыню ўпамінаецца ў 1563 г. Дзеліцца на старую (паўднёвую) частку і новую (паўночную), якая забудавана ў 1940-я гады.

Працягласць старой часткі вёскі 0,7 км. Асноўны тып сядзібнай забудовы — аднарадны вагон. Зямельныя ўчасткі вузкія і доўгія (шырыня 15—20 м, даўжыня да 100 м). Жылыя дамы выходзяць тарцамі на вуліцу і аддзелены ад яе невялікімі кветнікамі. У глыбіні ўчастка стаяць хлеў і адрына пад адным дахам. Адметная асаблівасць планіроўкі вёскі — выразнае запраўванне сядзібных участкаў з праходамі паміж сядзібамі (выкарыстоўваюцца ў гаспадарчых мэтах).

З дамоў (канец 19 — пачатак 20 ст.), што захаваліся, вылучаецца трохкамерная хата (хата+сенцы+камора) з калодзежам і далучанымі да яе гаспадарчымі пабудовамі.

Старая частка вёскі — узор традыцыйнага пасялення з лінейнай планіроўкай у адну вуліцу і двухбаковай забудовай.



908. *План старой часткі вёскі.*

Літ.: Ревизия Кобринской [illegible] составленная в 1563 году Королевским ревизором Дмитрием Сапегою, с присовокуплением актов Браславского земского суда [illegible] — Вильна, 1876. *У. В. Алісейчык*

в. Верхалессе. Навасёлкаўскі сельсавет

909. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з дрэва. Мае традыцыйную трохчастковую аб'ёмную кампазіцыю, якая складаецца з шатровай званіцы, асноўнага аб'ёму, завершанага цыбулепадобнай галоўкай, і прамавугольнай апсіды. У архітэктуры будынка вылучаюцца трохвугольныя франтоны, вертыкальная і гарызантальная шалёўка. Прыклад пашыранага ў драўляным дойлідстве Беларусі культавага збудавання.

910. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля школы. На ўшанаванне памяці 58 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1977 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя (партызан і партызанка).

в. Вялікія Корчыцы. Хідрынскі сельсавет

911. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На могілках. Пабудавана ў канцы 18 ст. з дрэва. Царква двухзрубная, складаецца з прамавугольных у плане асноўнага і алтарнага зрубаў, накрытых агульным гонтавым дахам. Алтарная частка увянчана галоўкай. Помнік народнага дойлідства.

912. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Сцяг перамогі». На ўшанаванне памяці 39 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Гарадзец, цэнтр сельсавета

913. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У скверы. Пахаваны 20 воінаў 12-й гвардзейскай стралко-

910. *Помнік землякам.*

вай дывізіі 61-й арміі, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ўшанаванне памяці воінаў і 78 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1958 г. пастаўлены помнік — скульптура салдата.

914. ВАЗНЯСЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі, на ўзгорку. Пабудавана ў 1799 г. з дрэва ў в. Акцябр (у 1876 г. перанесена ў в. Гарадзец).

Царква двухзрубная з прамавугольным у плане галоўным і пяцігранным алтарным зрубамі, стаіць на бутавым падмурку. Дах двухсхільны, абмежаваны на галоўным фасадзе шчытом. Над сярэдзінай узвышаецца шлемападобная галоўка. Плоскасці вертыкальна ашаляваных сцен расчляняюць прамавугольныя аконныя праёмы, дэкарыраваныя лёгкімі сандрыкамі на фігурных кранштэйнах. Інтэр'ер зальны. У бабінцы размешчаны нізкія хоры. Верхняя частка сцен аздоблена палосай арнаментальнай размалёўкі.

Царква — помнік архітэктуры з элементамі стылю барока.

915. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Ф. Э. Дзяржынскага. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1977 г.

в. Гірск, Кісялевіцкі сельсавет

916. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). За 5 км на ўсход ад вёскі. Пахаваны 32 партызаны асобна дзеючага атрада імя Р. І. Катоўскага, якія загінулі ў 1942—44 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Глінянь, Тэвельскі сельсавет

917. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 27 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 19.. г. пастаўлены абеліск.

в. Грушава, Гарадзецкі сельсавет

918. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 2 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. На ўшанаванне памяці воінаў і 96 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Дзевяткі, Тэвельскі сельсавет

919. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 37 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Дзівін, цэнтр сельсавета

920. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 74 воіны 212-й стралковай дывізіі 9-га гвардзейскага корпуса 61-й арміі і 2 партызаны, якія загінулі 21.7.1944 г. ў баях пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

921. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На тэрыторыі завода металавырабаў. Пахаваны 1450 мірных жыхароў, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1942 г. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

922. ПАСЕЛІШЧА (археал.). За ... км на паўночны ўсход ад вёскі, на ўрочышчы Бындзюга на ўсходнім беразе воз. Любань, на пясчаным узвышшы (3 м над узроўнем вады ў возеры). Плошча каля 0,5 га. Выявіў у 1981 г. М. У. Бычкоў. У агаленнях выяўлены культурны пласт магутнасцю 0,1—0,2 м, у ім знойдзены крамянёвыя прылады працы (наканечнік стралы трохвугольнай формы, 2 скоблі, 2 скрабкі і пласціны, нуклеус) і фрагменты ляпной керамікі бронзавага веку.

Матэрыялы зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

923. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва. Тып храма і трохчасткавая аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя традыцыйныя для драўлянага культавага дойлідства Беларусі. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

924. СТАЯНКА (археал.). За 5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на пясчаных узгорках каля воз. Любань, ва ўрочышчы Града (Дзівінскія пяскі). Выявілі ў 1948 г. Даніловіч і Абухоўскі, абследаваў у 1963—64 гг. У. Ф. Ісаенка. На стаянцы знойдзены наканечнікі стрэл, крамянёвыя прылады працы і кераміка. Стаянка адносіцца да мезаліту і неаліту.

Матэрыялы зберагаюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск).

Літ.: Кухаренко Ю. В. Первобытные памятники Полесья.— М., 1962; Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. В. 1.— Мн., 1968.

925. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). На галоўнай вуліцы вёскі. Пабудавана ў 1740 г. з дрэва. Перабудоўвалася ў 19 ст. З боку ад

915. Помнік Ф. Э. Дзяржынскаму

914. Вазнясенская царква



914. Вазнясенская царква. План



924. Стаянка. План

925. *Царква Параскевы Пятніцы са званіцай*

царквы размешчана драўляная званіца (2-я палавіна 19 ст.) — васьмярык на чацверыку пад гонтавым шатровым дахам.

[illegible] аб'ёмам з боку галоўнага пачатку заходняга фасада ўзвышаюцца 2 квадратныя ў плане вежы, увянчаныя трохярусымі гранёнымі галоўкамі. Шчыт даху адступае за вежы ўглыбіню і мае клеіладобны абрыс. Паўвальмавы схіл на галоўным фасадзе ствараe залом, ніжняя частка якога навісае над ганкам, раней звязаная з хорамі. Сцены вертыкальна [illegible] вянюць хоры.

Царква — помнік архітэктуры, які спалучае будаўнічыя прыёмы мясцовага драўлянага дойлідства з элементамі барока. *З. В. Ал[illegible]*

в. Дзямідаўшчына, Гарадзецкі сельсавет

926. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля школы. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск. Мемарыяльная дошка ўвекавечвае памяць землякоў, што загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

в. Дубіны, Ападаўскі сельсавет

927. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Ва ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Жухаўцы, Астромніцкі сельсавет

928. ПОМНІК АРЛОВУ Івану Іванавічу (гіст.). На абочыне шашы Масква — Брэст, каля моста цераз р. Мухавец.

І. І. Арлоў — адзін з арганізатараў партызанскага руху на Кобрыншчыне. Нарадзіўся ў Кастрамской вобл. Апынуўшыся на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі, стварыў падпольную групу, якая пачала дзейнічаць у студзені 1942 г. У красавіку 1942 г. яна разам з іншымі групамі аб'ядналася ў партызанскі атрад імя В. І. Чапаева, камандзірам якога стаў І. І. Арлоў. 27.3.1943 г. пры спробе знішчыць мост цераз р. Мухавец І. І. Арлоў загінуў. Яго імя было прысвоена аднаму з атрадаў партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева.

У 1974 г. на ўшанаванне памяці [illegible] партызана пастаўлены помнік. *М. М. К[illegible]*



928. *Помнік І. І. Арлову.*



925. *Царква Параскевы Пятніцы. План*

в. Закроепна, Залескі сельсавет

929. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЗАНАМ І АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ [illegible] ворана І. В. Марозава і К. Кавалева, а таксама 2 пасялкі, якія былі разам з партызанамі.

930. *Помнік на брацкай магіле партызан.*

933. *Помнік на брацкай магіле савецкіх ваеннапалонных*

в. Залессе, цэнтр сельсавета

930. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля Дома культуры. Пахаваны 6 партызан атрада імя А. В. Суворава, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У 1969 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. Мемарыяльная дошка ўвекавечвае памяць 28 аднавяскоўцаў, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

931. КУРГАН «ДАЙНІЦА» (археал.). За 3,3 км на паўночны ўсход ад вёскі, у лесе, за 0,35 км ад скрыжавання лясных дарог. Вышыня 0,5 м, дыяметр 8 м. Вядомы з канца 19 ст. Абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

932. ПОМНІК СУВОРАВУ Аляксандру Васілевічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст А. В. Суворава ўстаноўлены ў 1980 г.

в. Запруды, Астроміцкі сельсавет

933. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ (гіст.). Каля інстытута. Пахаваны 30 ваеннапалонных, закатаваных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

934. ГАРАДЗІШЧА (археал.). На тэрыторыі школы. Мае прамавугольную форму (144×110 м), падвойную сістэму валоў і роў. Глыбіня рова да 2,5 м, шырыня 7—8 м. Вышыня унутранага вала 1,9—2 м, знешняга 1 м. Абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Засімы, Бухавіцкі сельсавет

935. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 13 воінаў, якія загінулі 17.7.1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 26 партызан атрада імя В. І. Чапаева (камандзір І. І. Арлоў), што загінулі ў баях супраць гітлераўцаў у 1942—43 гг. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

936. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 250 м на ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Дахлоўка. Вядомы з 19 ст. Абследавалі ў 1964 г. В. В. Сядоў, у 1970 г. М. А. Ткачоў, у 1981 г. М. М. Ткачоў. Могільнік з 29 насыпаў у адзін рад цягнецца ўздоўж берага. Курганы авальныя ў плане (вышыня 1—1,5 м, дыяметр 12—15 м, самага вялікага адпаведна 1,7 м і 20 м). Насыпы пясчаныя, некаторыя зарасліхмызняком. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961.

937. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1 км ад вёскі, 7 насыпаў. Вышыня 0,5—1 м, дыяметр 8—12 м. Вядомы з канца 19 ст. Абследавалі ў 1961 г. В. В. Сядоў, у 1970 г. М. А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Ілаўск, Астроміцкі сельсавет

938. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На паўночны захад ад вёскі, злева ад дарогі, за 600 м ад павароту на вёску. 2 насыпы. Вышыня 1,1 м, дыяметр 15 м. Адкрыў і абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Імянін, Бухавіцкі сельсавет

939. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СУРЫНУ Барысу Міхайлавічу (гіст.). 22.6.1941 г. камандзір 123-га знішчальнага авіяпалка маёр Б. М. Сурын правёў 4 паветраныя баі і знішчыў 3 самалёты праціўніка. Загінуў у паветраным баі. У 1974 г. на доме, дзе жыў нарадзіўся Б. М. Сурын, устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Казінча, Бухавіцкі сельсавет

940. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля школы. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г., і партызан брыгады імя В. І. Чапаева М. Ускоў, што загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

942. *Царква. План*

936. *Курганны могільнік*

941. МАГІЛА ПЕТРУКОВІЧА Івана Арсеньевіча (гіст.). На могілках. Партызан атрада імя В. І. Чапаева І. А. Петруковіч загінуў 13.6.1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна. У 1970 г. на магіле пастаўлена стала.

942. ЦАРКВА (архіт.). На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, каля могілак. Пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. з дрэва. Да выцягнутага прамавугольнага аб'ёму далучаюцца пяцігранная апсіда і шатровая званіца. Асноўны аб'ём увянчаны купалам на васьмігранным светлавым барабане. Галоўны ўваход вылучаны трохкалонным порцікам з трохвугольным франтонам. Помнік архітэктуры з рысамі позняга класіцызму.



942. *Царква. Галоўны фасад*

943. *Помнік на магіле ахвяр фашызму*

в. Каменка, Бухавіцкі сельсавет

943. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ўсходняй ускраіне вёскі. У красавіку 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 1[illegible]2 мірных жыхароў вёскі і спалілі 58 двароў. У 1970 г. на магіле пастаўлена скульптурная кампазіцыя: маці [illegible] з дзіцем.

в. Камень, Гарадзецкі сельсавет

944. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці савецкіх воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлена стэла.

в. Кісялёўцы, цэнтр сельсавета

945. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 3 км ад вёскі, ва ўрочышчы Ямішча. 8 насыпаў. Вышыня курганоў 0,5—1 м, дыяметр 10—20 м. Выявіў у 1960 г. М. А. Салей, абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Лелікава, Дзівінскі сельсавет

946. ДЗМІТРЫЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 18 ст. з дрэва. У 19 ст. пабудаваны двух'ярусная званіца (васьмярык на чацверыку) і тамбур. Аднагрубны аб'ём царквы выцягнуты па падоўжнай восі. На фасадзе — высока размешчаныя прамавугольныя вокны і плоскія лапаткі. Будынак накрыты вальмавым дахам, які ўвянчаны масіўным васьмерыковым барабанам з галоўкай. Тамбур і званіцу абрамляюць філенгі і разныя накладкі на вуглах. Помнік драўлянага дойлідства.

947. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 39 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Лука, Астроміцкі сельсавет

948. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). На будынку клуба. На ўшанаванне памяці 30 мірных жыхароў, якіх у 1943 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі, у 1974 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Луччыкі, Астроміцкі сельсавет

949. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 6 воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 23 мясцовых жыхароў, расстраляных акупантамі, у 1957 г. пастаўлены абеліск.

в. Магдалін, Кісялевіцкі сельсавет

950. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Мазуры, Гарадзецкі сельсавет

951. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАПЛАЎСКАМУ Паўлу Нікапавічу (гіст.). На будынку сельмага. У гэтай вёсцы ў 1913 г. нарадзіўся П. Н. Паплаўскі — адзін з арганізатараў партызанскага руху на Кобрыншчыне ў Вялікую Айчынную вайну, камандзір атрада імя С. М. Кірава Брэсцкага партызанскага злучэння. Загінуў у баі ў 1943 г. У 1975 г. на ўшанаванне яго памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Малы Рудзец, Гарадзецкі сельсавет

952. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Мухаўлокі, Астроміцкі сельсавет

953. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 12 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Навасёлкі, Астроміцкі сельсавет

954. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. У 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 67 жыхароў вёскі і спалілі яе (32 двары). На ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ў 1974 г. пастаўлены помнік.

946. *Дзмітрыеўская царква са званіцай*

946. *Дзмітрыеўская царква. План*

в. Навасёлкі, цэнтр сельсавета

955. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 2 воіны, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

956. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (арх.). Пабудавана ў 19 ст. па традыцыйнай для драўлянага дойлідства планіровачнай схеме: прытвор-званіца, асноўны прамавугольны зруб і шматгранная апсіда. У кампазіцыі дамінуюць цыбуленападобныя галоўкі над шатровай званіцай і асноўным аб'ёмам. У архітэктурнай аздобе царквы — разныя фрызы, карнізы, фігурныя ліштвы, вертыкальная і гарызантальная шалёўка. Помнік народнага [illegible].

957. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. Ва ўшанаванне памяці 22 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 19[illegible] г. пастаўлены абеліск.

958. ПОМНІК УДЗЕЛЬНІКАМ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ СЯЛЯН (гіст.). У сквера.

У перыяд эканамічнага крызісу 1929—33 гг. становішча працоўных Заходняй Беларусі рэзка пагоршылася. Жорсткі сацыяльны і нацыянальны прыгнёт узмацніў барацьбу заходнебеларускіх рабочых і сялян супраць буржуазна-памешчыцкага ладу. У 1933 г. адно з буйнейшых сялянскіх выступленняў адбылося ў Кобрынскім павеце.

25.7.1933 [illegible] секвестратар і 3 паліцэйскія спагналі падаткі. За неўплату [illegible] забралі збожжа, жывёлу, рэчы хатняга ўжытку. Абураныя сяляне збілі секвестратара і паліцэйскіх. У сутычцы былі смяротна паранены [illegible] і [illegible]. Ноччу ў [illegible] быў сабраны атрад. Паліцэйская жорсткая расправа з сялянамі [illegible] не жыхарамі. Вестка аб расправе над сялянамі разнеслася па ўсім павеце. Кожную хвіліну магло выбухнуць стыхійнае выступленне сялян. Кобрынскі акруговы камітэт КПЗБ тэрмінова правёў нелегальнае пасяджэнне, у прыватнасці неспрыяльныя ўмовы, аднак выступленне зачасным. Каб накіраваць яго ў арганізаваннае [illegible], было вырашана арганізаваць 18.8.1933 г. масавы паход у маёнтак памешчыкаў [illegible] (в. Бульнова) і прымусіць іх выплачваць запазычанасць сезонным рабочым, забяспечыць хлебам і [illegible]. З жыхары вёсак Малая [illegible], Малыя Радваничы, Новы Двор, Падлессе, Пахлогаль(?), Ракітніца, Фра[illegible], Ямна і іншых рушылі да месца збору — у в. Вялікія Радваничы. На дарозе разграмілі [illegible] спада [illegible] асаднікаў, атакавалі паліцэйскі участак у Навасёлках. На дапамогу паліцэйскім з Брэста прыбылі атрады паліцыі і салдаты.

Буржуазна-памешчыцкі ўрад Польшчы аб'явіў Кобрынскі павет на асаблівым становішчы. У вёсках лютавалі карнікі, праводзіліся масавыя арышты. Улады арыштавалі арганізатараў выступлення і хацелі аддаць іх на ваенна-палявы суд. КПЗБ і Кампартыя Польшчы разгарнулі шырокую кампанію ў абарону арыштаваных. Масавыя мітынгі, маніфестацыі і дэманстрацыі працоўных вымусілі буржуазны ўрад замяніць для 8 чалавек пакаранне смерцю пажыццёвай катаргай, сакратара Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ Р. Каплан прысудзілі да 15 гадоў, 30 чалавек да розных тэрмінаў турэмнага зняволення.

У памяць аб гэтых падзеях у 1967 г. пастаўлены абеліск.

Літ.: Арэхава Л. С. Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады безапольскай акупацыі. — Мн., 1968. Почуля В. А., Потупчык В. Э. Революционное и [illegible] [illegible] палавой Белоруссии в 1920—1939 гг. — Мн., 1962. Усуровая гады падполля. Успаміны былых членаў КПЗБ [illegible] рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. — Мн., 1968. *Г. І. Данілава.*

в. Навіцкія, цэнтр сельсавета

959. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 16 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

960. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

961. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА (арх.). На ускраіне вёскі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва. Адносіцца да тыпу трохзрубных храмаў.

Асноўны аб'ём царквы ўвянчаны пяцігалоўем. Цэнтральны купал пастаўлены на васьмігранны светлавы барабан. Дамінанта кампазіцыі — трох'ярусная вежа званіцы з шатром і галоўкай. Галоўны ўваход аформлены шатром на калонках. У дэкаратыўным аздабленні храма выкарыстаны разныя пояскі, арнамент на барабанах і фрызах, разныя карнізы, гарызантальная і вертыкальная шалёўка.

Царква — помнік архітэктуры рускага стылю. *А. Ю. Пятросава.*

961. *Прачысценская царква*

961. *Прачысценская царква. Іканастас*



961. *Прачысценская царква. План*

в. Паляцічы, Батчынскі сельсавет

962. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ [illegible]. На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 33 чырвонаармейцы, якія загінулі ў баі су[illegible] [illegible] 1920 г. [illegible] атрад чырвонаармейцаў вы[illegible] [illegible] ад уланаў польскіх войск. Байцы былі ўзброены вінтоў[illegible] [illegible] у якім чырвонаармейцы загінулі. Калі Заходняя Беларусь знаходзілася пад уладай буржуазнай Польшчы, ля магілы чырвонаармейцаў моладзь навакольных вёсак наладжвала мітынгі [illegible]

[illegible] *А. М. Мартынаў.*

963. ВАЙСКОВЫЯ МОГІЛКІ (гіст.) Каля шашы Кобрын — Батчы, пры паварот[illegible] в. Паляцічы.

У чэрвені 1915 г. войскі Германіі і Аўстра-Венгрыі [illegible] наступленне на рускім фронце. У час баёў [illegible] загінула 123 салдат рускай арміі. У 19[illegible] г. на іх магілах устаноўлены надмагіллі.

У ліпе[illegible] 1920 г. воіны Чырвонай Арміі вя[illegible] бал за вызваленне тэрыторыі [illegible] ад польскіх інтэрвентаў. Каля в. Паляцічы загінула 87 чырвонаармейцаў. У 1920 г. ўстаноўлена [illegible]

964. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). У вёсцы Па[illegible] [illegible] польная камуністычная арганізацыя. Падпольныя ячэйкі дзейнічалі ў вёсках [illegible] [illegible] скага павета.

У 1925 г. жыхары Паляціч[illegible] удзельнічалі ў [illegible] у Кобрыне, 25.2.1931 г. — у дэманстра[illegible] [illegible] у в. Літвінка і інш. У 1935—37 гг. у Паляцічах знаходзіўся Кобрынскі райком КПЗБ [illegible] былі сакратарамі Кобрынскіх райкомаў КПЗБ і КСМЗБ.

У 1973 г. на доме жыхара вёскі В. [illegible] Кастылюка ў памяць аб дзейнасці Паляціцкай ячэйкі КПЗБ устаноўлена мемарыяльная дошка.

[illegible] Документы и матер[illegible] [illegible] 1939 гг.) Мн., 1972; [illegible] Успаміны былых членаў КПЗБ [illegible] у Заходняй Беларусі.— Мн., 1958.

В. Б. Кор[illegible]

в. Патрыкі, Хідрынскі сельсавет

965. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.) У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 3[illegible] аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 196[illegible] г. пастаўлена стэла.

в. Пескі, Хідрынскі сельсавет

966. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН [illegible]. На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі, каля шашы Брэст — Мінск. Пахаваны [illegible] партызан[illegible], якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible]8 г. [illegible] на магіле пастаўлены помнік [illegible] [illegible] дагічны.

967. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ТУРУ Сямёну Кандратавічу (гіст.). На будынку васьмігадовай школы.

Ураджэнец вёскі С. К. Тур [illegible] удзельнік [illegible] рэвалюцыі [illegible] у Іспаніі, камандзір аднаго з партызанскіх атрадаў на Жытоміршчыне ў Вялікую Айчынную вайну. Загінуў у 1943 г. у баі [illegible] з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яго імя прысвоена Пескаўскай школе. У 1974 [illegible] на ўшанаванне яго памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

968. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці [illegible] XX [illegible] якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

в. Плянта, Астромічскі сельсавет

969. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН [illegible]

96[illegible]. *П[illegible] кіх воінаў і партызан*



969. *Помнік на брацкай магіле партызан.*

Пахаваны партызаны брыгады імя В. І. [illegible] і А. [illegible] загінуў 3.8.1943 г., і В. П. Вашчук, што загінуў 18.7.1943 г.

[illegible] на [illegible] Абапал яе на мармуровых плітах імены 44 землякоў, якія загінулі ў барацьбе [illegible] нямецка-фашысцкіх [illegible] у Вялікую Айчынную вайну.

в. Рачыца, Бухавіцкі сельсавет

970. МЕСЦЫ ДЫСЛАКАЦЫІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ В. І. ЧАПАЕВА І ЗАГУБЫ АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.).

У наваколлі вёскі базіравалася партызанская брыгада імя В. І. Чапаева. Створана ў студзені 1944 г. паводле загада штаба Брэсцкага партызанскага злучэння. Камандзіры [illegible] С. Ганасюк (студзень — май 1944 г.), Ф. М. [illegible]аў (май — ліпень 1944 г.), камісары М. П. [illegible] (студзень — ліпень 1944 г.), М. С. Карпічонка. Партызаны брыгады праводзілі дыверсіі на чыгуначным участку Брэст — Мінск, падарвалі 7 мастоў, знішчылі 22 аўтамашыны, у аперацыі «Рэйкавая вайна» падарвалі 930 рэек, вялі баі супраць карных экспедыцый ворага. 19.7.1944 г. брыгада злучылася з Чырвонай Арміяй.

На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі пахаваны ахвяры фашызму. У верасні 1942 г. карнікі акружылі вёску, а жыхароў — старых, жанчын і дзяцей (33 чалавекі) — загналі ў адрыну і спалілі. Была спалена і вёска (41 двор).

На месцы загубы ахвяр фашызму ў 1965 г. пастаўлены абеліск. На ім прымацавана мемарыяльная дошка у памяць аб дыслакацыі партызанскай [illegible] імя В. [illegible] Чапаева.

Літ.: Бые в огне [illegible] (зб. успамінаў). 3 выд. Мн., 1977. *М. М. Казлоўская*

в. Смалярня, Астроміцкі сельсавет

971. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ [illegible] На [illegible] ускраі[illegible] Пахаваны 2 [illegible] загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Стрыгава, Тэвельскі сельсавет

972. АБЕЛІСК ПЕРАМОГІ Ў 1812 г. (гіст.). У скверы [illegible] клуба. 31.7.1812 г. каля вёсак Гарадзечна і Пaддубнае адбыўся бой паміж рускімі войскамі і аўстра-саксонскімі карпусамі напалеонаўскай арміі. 13.8.1812 г. каля в. Стрыгава 38-ы егерскі полк рускай арміі адбіў масіраванае наступленне напалеонаўскай кавалерыі. Аўстра-саксонцы панеслі вялікія страты і вымушаны былі адступіць.

У 1962 г. ў гонар 150-годдзя перамогі пастаўлены абеліск.

Літ.: Война русского народа с Наполеоном 1812 г. — СПб., 1910. Отечественная [illegible] Т. 3. М., 1912. *А. М. Мартынаў*

973. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У скверы [illegible] 3 воіны, якія загінулі у [illegible] у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Туршаў, Залескі сельсавет

974. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). За 1,5 км на поўнач ад вёскі у лесе.

Партызаны атрада імя А. В. Суворава ў 1943 г. ўзарвалі аўтамашыну з гітлераўцамі. Калі яны вярталіся з аперацыі, то былі акружаны карнікамі [illegible] Мясцовыя жыхары пахавалі іх. Тут жа пахаваны партызаны атрада імя [illegible] партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева, якія загінулі ў 1944 г. пасля [illegible]

972. [illegible] 1812 г.

973. *По[illegible] воінаў.*



974. *П[illegible] на брацкай [illegible] партызан.*

980. *Успенская царква*



980. *Успенская царква. План*

На брацкай магіле партызан у 1975 г. устаноўлены скульптура партызана (аўтар — былы партызан І. Дарафеенка) і 2 стэлы з імёнамі 22 землякоў — жыхароў вёсак Заблоціна, Прылукі, Рачкі і Турная, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

975. ПОМНІК ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі.

У Вялікую Айчынную вайну ў в. Турная дзейнічалі падпольныя антыфашысцкі камітэт (з восені 1941 г. да красавіка 1944 г.) і камсамольская арганізацыя (з 12.8.1943 г. да сярэдзіны ліпеня 1944 г.). Антыфашысцкі камітэт узначальвалі Д. С. Барысюк і Ц. М. Краўчук. У яго склад уваходзілі таксама С. У. Краўчук, Н. І. Кухараў і М. Н. Лукашук. Падпольная камсамольская арганізацыя ў канцы 1943 г. налічвала 17 членаў. Сакратаром арганізацыі быў У. А. Юхімук.

Падпольшчыкі распаўсюджвалі антыфашысцкія лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, праводзілі дыверсіі на камунікацыях праціўніка. Восенню 1943 г. камсамольцы-падпольшчыкі падарвалі 2 масты на дарогах Кобрын — Пінск і Кобрын — Івацэвічы, знішчылі і пашкодзілі больш за 2 км тэлефонна-тэлеграфнай лініі. Патрыёты збіралі разведданыя аб ворагу, здабывалі зброю, боепрыпасы, адзенне, прадукты харчавання для партызан брыгады імя В. І. Чапаева Брэсцкага партызанскага злучэння. У барацьбе супраць гітлераўцаў загінулі члены антыфашысцкага камітэта Д. С. Барысюк, Ц. М. Краўчук, С. У. Краўчук, М. Н. Лукашук і камсамольцы-падпольшчыкі М. В. Здановіч, С. І. Здановіч, Н. Н. Казлюк, Я. Ф. Марчук, У. Ф. Сахарук, У. А. Юхімук.

На ўшанаванне памяці падпольшчыкаў у 1975 г. устаноўлены скульптура воіна і 2 стэлы. *Г. І. Дулеба.*



989. *Міхайлаўская царква. Выгляд з боку апсіды.*

в. Тэўлі, цэнтр сельсавета

976. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У скверы. Пахаваны 41 воін 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

977. ВАЙСКОВЫЯ МОГІЛКІ (гіст.). За 0,5 км ад вёскі, каля вясковых могілак.

У 1-ю сусветную вайну ў жніўні 1915 г. у баях супраць войск кайзераўскай Германіі каля в. Тэўлі загінула каля 200 салдат рускай арміі. У 1916 г. на брацкіх і індывідуальных магілах устаноўлены надмагіллі.

У ліпені 1920 г. ў баях супраць польскіх інтэрвентаў каля вёскі загінула 30 чырвонаармейцаў. Яны пахаваны ў 3 брацкіх магілах. У 1920 г. ўстаноўлены надмагіллі.



989. *Міхайлаўская царква. План*

978. ДЗМІТРЫЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На могілках. Пабудавана ў 19 ст. з дрэва. Прамавугольны зруб пад двухсхільным дахам з невялікім прытворам. Помнік народнага драўлянага дойлідства.

979. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 62 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

980. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На ўскраіне вёскі. Пабудавана ў 1872 г. з цэглы. Аднааб'ёмны храм з двух'яруснай званіцай над прытворам. Асноўны аб'ём пакрыты чатырохсхільным дахам з галоўкай. Паўцыркульныя вокны аздоблены ліштвамі. Па перыметры сцен праходзіць пояс з сухарыкамі. Галоўны і 2 бакавыя ўваходы абрамляюць дэкаратыўныя арачкі з франтонамі. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

в. Хабовічы, Дзівінскі сельсавет

981. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Сярод вясковай забудовы. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з дрэва.

Традыцыйны тып праваслаўнага храма з трохчасткавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй, якая ўключае шатровую званіцу, крыжападобны ў плане асноўны аб'ём і [illegible] апсіду з бакавымі алтарамі. Над будынкам узвышаюцца 2 [illegible] светлавыя барабаны, завершаныя шатрамі з цыбулепадобнымі галоўкамі. У аздобе выкарыстаны разныя карнізы, фігурная шалёўка, вуглавыя лапаткі.

Царква — помнік народнага дойлідства.

982. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 14 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Хадынічы. Навасёлкаўскі сельсавет

983. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На могілках. Пабудавана ў 19 ст. з дрэва. Мае двухчасткавую аб'ёмную кампазіцыю: да прамавугольнага асноўнага зруба далучана пяцісценная апсіда. Дах увянчаны невялікім купалком на барабане. Помнік народнага драўлянага дойлідства.

в. Хідры, цэнтр сельсавета

984. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 2 воіны і 1 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск, на якім выбіты імёны 37 аднавяскоўцаў, што аддалі жыццё за Радзіму.

в. Худлін, Гарадзецкі сельсавет

985. **ПОМНІК ШЫШУ** Мікалаю Цімафеевічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Тут у 1908 г. нарадзіўся адзін з арганізатараў партызанскага руху на Кобрыншчыне ў Вялікую Айчынную вайну М. Ц. Шыш. Член КПЗБ. Загінуў у 1942 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Імя М. Ц. Шыша было прысвоена аднаму з атрадаў партызанскай брыгады імя В. М. Молатава. У 1974 г. на ўшанаванне яго памяці пастаўлена стэла.

в. Чараваччыцы, Батчынскі сельсавет

986. **МЕСЦА ДЭМАНСТРАЦЫІ СЯЛЯН** (гіст.). Імя У. І. Леніна было сцягам працоўных Заходняй Беларусі ў барацьбе за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Пасля смерці правадыра штогод адзначаліся ленінскія дні, у час якіх праводзіліся дэманстрацыі, забастоўкі, мітынгі. 21.1.1933 г. ў вёсцы адбылася дэманстрацыя. Яна была прымеркавана да гадавіны забойства паліцыяй 2 сялян у 1928 г. Каля 300 сялян з чырвонымі сцягамі, спяваючы «Інтэрнацыянал» і «Смело, товарищи, в ногу», пайшлі да магілы забітых таварышаў. Там адбыўся мітынг, на якім яны ўшанавалі памяць У. І. Леніна, барацьбітоў за свабоду народа.

Літ.: Ватковіч Г. Б. Дні «Трох Л» у Заходняй Беларусі.— Полымя, 1971, № 10; яго ж. КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся (1929—1933 гг.).— Мн., 1975. *Г. В. Ватковіч.*

987. **ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** (гіст.). У цэнтры вёскі. У 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 56 жыхароў і спалілі в. Чараваччыцы (18 двароў). На ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ў 1975 г. пастаўлены помнік — 5 жалезабетонных брусоў адзін на адным.

в. Шамятоўка, Астроміцкі сельсавет

988. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў — воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлена стэла.

в. Яромічы, Бухавіцкі сельсавет

989. **МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). На могілках. Пабудавана ў 1784 г. з дрэва.

Царква двухзрубная, складаецца з прамавугольных у плане асноўнага аб'ёму і апсіды. Пакрыта агульным гонтавым дахам, які пры пераходзе ад асноўнага аб'ёму да алтарнай часткі ўтварае трохвугольныя навесі. З усходу і поўдня да алтара прылягаюць прырубы з аднасхільным пакрыццём. Сцяна галоўнага (заходняга) фасада завершана шчытом. Дах каля франтона ўвянчаны васьміграннай вежачкай. Вокны высокія, паўцыркульныя. Інтэр'ер зальны, абноўлены ў 19 ст. У бабінцы размешчаны хоры, якія падтрымліваюцца 2 слупамі.

Царква — помнік архітэктуры народнага дойлідства.

У. В. [illegible]

ЛУНІНЕЦКІ
РАЁН
Вялікія Чучавічы
Бастынь
Чырвоная Воля
Дзятлавічы
Вулька 2-я
Лунін
Лобча
Палескі
Радзігерава
Бродніца
Дварэц
Любачын
Язвінкі
ЛУНІНЕЦ
Лахва
Кажан-Гарадок
Любань
Сінкевічы
Мікашэвічы
Сітніца
Стаянкі, паселішчы, гарадзішчы
Могільнікі (грунтавыя, курганныя), курганы
Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (месцы баёў, магілы савецкіх воінаў і партызан, Курганы Славы, помнікі землякам і інш.)
Помнікі ахвярам фашызму (месцы канцлагераў і лагераў смерці, месцы масавай загубы насельніцтва, спаленыя і неадноўленыя вёскі і інш.)
Помнікі і месцы, звязаныя з імёнамі савецкіх партыйных і дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў культуры, навукі і тэхнікі
Культавая архітэктура

XIV. ЛУНІНЕЦ

Горад абласнога падпарадкавання (з 1963 г.), цэнтр раёна. Вузел чыгунак на Брэст, Гомель, Баранавічы, Сарны. Знаходзіцца за 240 км на ўсход ад Брэста.

Вядомы з 1540 г. як с. Лунінец навагрудскага ваяводы Станіслава Давойны у Вялікім княстве Літоўскім. У 1588 г. меў 74 дамы, 484 жыхары, бровар і драўляную царкву. У 1662 г. Канстанцін Долмат, які валодаў Лунінцом, падараваў яго разам з прыгоннымі сялянамі Дзятлавіцкаму праваслаўнаму мужчынскаму манастыру. З 1793 г. Лунінец у складзе Расіі; у Пінскім павеце Мінскай губерні. Каля 1795 г. было 75 двароў, 624 жыхары. У 1842 г. перададзены ў казну, а жыхары пераведзены ў катэгорыю дзяржаўных сялян. Насельніцтва павялічылася нязначна (714 чалавек). Вырас Лунінец у сувязі з будаўніцтвам Палескіх чыгунак. Рух на ўчастках Вільня — Лунінец — Пінск адкрыты 30.12.1884 г., Лунінец — Ровна — 2.8.1885 г., Лунінец — Гомель — 15.2.1886 г. (пракладзены другі пуць на ўчастках Лунінец — Гомель — 15.1904 г., Лунінец — Пінск — 8.11.1907 г.). Паводле перапісу 1897 г., у Лунінцы 3167 жыхароў, 885 двароў (1908 г.). У 1890 г. заснаваны чыгуначныя рамонтныя майстэрні, у якіх у 1900 г. было 239 рабочых. Станцыя ператварылася ў буйны чыгуначны вузел, грузаабарот якога ў 1900 г. перавышаў 5,5 млн. пудоў (пераважна лесаматэрыялы). Працавалі 2 млыны. У 1860-я гады адкрыта народнае аднакласнае вучылішча, у 1890 г. на чыгуначнай станцыі — двухкласная чыгуначная школа з жаночым аддзяленнем і 2 дадатковымі класамі падрыхтоўкі хлопчыкаў у чыгуначныя вучылішчы. З лістапада 1911 г. да лютага 1912 г. у Лунінцы жыў і працаваў беларускі паэт Я. Колас.

Рабочыя Лунінца прымалі актыўны ўдзел у Рэвалюцыі 1905—07 гг. У 1-ю сусветную вайну дзейнічала падпольная бальшавіцкая арганізацыя на чале з І. Е. Любімавым. Для агітацыйнай работы сярод салдат у 1916 г. ў Лунінец прыязджаў М. В. Фрунзе. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Лунінецкую арганізацыю РСДРП узначаліў бальшавік А. І. Таганаў. У сакавіку 1917 г. створаны Лунінецкі Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Спачатку Савет быў згодніцкім, да кастрычніка 1917 г. стаў бальшавіцкім, узяў пад кантроль чыгуначны вузел і перавозку войск цераз яго, арганізаваў рэвалюцыйны камітэт, які 28.10(10.11) 1917 г. абвясціў у Лунінцы Савецкую ўладу. У лістападзе 1917 г. ў Лунінцы адбыўся 1-ы з'езд Саветаў Пінскага павета. З 18.2.1918 г. Лунінец акупіраваны кайзераўскімі войскамі, з канца 1918 г. тут дзейнічаў падпольны райком РКП(б), у ваколіцах супраць нямецкіх акупантаў і петлюраўцаў праводзілі аперацыі партызанскія атрады, найбольшы з іх — паўстанцкі камуністычны атрад А. М. Ільіна (каля 3 тыс. чалавек). Савецкая ўлада адноўлена ў студзені 1919 г. З лютага 1919 г. Лунінец стаў адным з важнейшых вузлоў абароны на Заходнім фронце ў час наступлення войск буржуазнай Польшчы. Яго абаранялі часці 17-й стралковай, з красавіка 1919 г.— 8-й стралковай дывізіі. Тут жа дзейнічаў эвакуіраваны з Пінска павятовы ваенкам, а пасля ваенкам працаваў Лунінецкі валасны ваенрэўком. 10.7.1919 г. Лунінец быў акупіраваны войскамі буржуазнай Польшчы; дзейнічала падпольная бальшавіцкая арганізацыя. У ліпені 1920 г. адноўлена Савецкая ўлада. 3.10.1920 г. польскія войскі зноў захапілі Лунінец. У складзе буржуазнай Польшчы Лунінец з лютага 1921 г. стаў горадам і цэнтрам Лунінецкага павета ў Палескім ваяводстве, налічваў 8267 жыхароў. Працаваў падпольны райком КПЗБ. Да 1924 г. у павеце дзейнічалі партызанскія атрады, якія нападалі на маёнткі паноў, паліцэйскіх. Найбольш буйныя аперацыі былі

XIV. *Жылы дом па вуліцы Гагарына*

XIV. *Будынак універмага*

XIV. *Жылыя дамы па вуліцы Савецкай*

праведзены ў маёнтку Добрае Дрэва (1922 г.) і на станцыі Парахонск (1924 г.). Некаторыя з партызан былі асуджаны і расстраляны ў Лунінцы, сярод іх — вядомы партызан Я. [illegible] Глушка (расстраляны 21.7.1925 г.).

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР Лунінец з снежня 1939 г. ў складзе Пінскай вобл. У 1939 г. 8,3 тыс. жыхароў, з 1940 цэнтр раёна. У Айчынную вайну горад з 10.7.1941 г. да 10.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у раёне дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (канец 1942 г. — 8.7.1944 г.) і ЛКСМБ (кастрычнік 1942 г.— 8.7.1944 г.), выдавалася газета «Авангард». 6 часцям і 1 злучэнню Чырвонай Арміі, якія вызвалілі горад, нададзены ганаровыя найменні «Лунінецкіх». У 1959 г. было 10,3 тыс. жыхароў, у 1970 г.— 14,3 тыс. жыхароў. За актыўны ўдзел камсамольцаў і моладзі ў меліярацыі зямель, павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і вялікую работу па выхаванню моладзі 22.4.1974 г. Лунінецкая раённая камсамольская арганізацыя ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Сучасны горад размешчаны ўздоўж чыгункі. Забудова на ўскраінах пераважна аднапавярховая, у цэнтры — шматпавярховая мураваная. Сетка вуліц, блізкая да прамавугольнай, сфарміравалася ў канцы 19 ст. і працягвала развівацца ў паўночным і паўднёвым напрамках. Галоўнымі з'яўляюцца вуліцы Чырвоная (працяг шашы на Пінск), Гагарына і Савецкая. У цэнтральнай частцы горада 2 плошчы — імя Леніна і Прывакзальная. Генеральны план Лунінца (1973 г.) прадугледжвае замену аднапавярховай забудовы 5—9-павярховай. Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр горада — пл. імя Леніна, дзе размешчаны будынак райкома КПБ і двухпавярховыя цагляныя жылыя дамы, устаноўлены помнік У. І. Леніну.

Асноўныя прамысловыя прадпрыемствы: завод электрарухавікоў для сельскай гаспадаркі, рамонтна-механічны завод, лесаматычнае дзела, завод сухога абястлушчанага малака, харчовапрацоўчы камбінат, хлебазавод. Працуюць раённыя аб'яднанні Дзяржкамсельгастэхнікі і «Сельгасхімія», вытворчае аб'яднанне «Лунінецлес», лясгас, будаўнічыя арганізацыі, 2 камбінаты бытавога абслугоўвання.

У горадзе 5 сярэдніх (у т. л. школа-інтэрнат), музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, гарадское і сельскае прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы, 8 дашкольных дзіцячых устаноў, 2 Дамы культуры, Дом піянераў і школьнікаў, 7 бібліятэк, 4 клубы, кінатэатр, гісторыка-краязнаўчы музей, 3 бальнічныя ўстановы. Выдаецца раённая газета «Ленінскі шлях».

Лунінец — радзіма Героя Савецкага Саюза генерал-палкоўніка А. В. Петрушэўскага і Героя Сацыялістычнай Працы А. Д. Паньковай.

Помнікі: У. І. Леніну, на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, Курган Бессмяротнасці, помнік у гонар асваення космасу.

Месца адпачынку жыхароў — лесапарк са штучным возерам на ўсходняй ускраіне горада і сквер на вул. Савецкай.

Літ.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918—1920 гг.: Сборник документов и материалов. Т. 1—2.— Мн., [illegible] [illegible] ...тическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Т. 1—2.— Мн., [illegible] Волости и важнейшие селения Европейской России. В. 5 [illegible] Белорусских областей.— СПб., 1886; [illegible] ...а и поселения в уездах, имеющих 2[illegible] и более жителей.— СПб., 1905; Жучкевич [illegible] ...зин И. Е. Города и сёла Белорусской ССР: Историко-географические очерки.— Мн., 1951; Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии.— Мн., 1870.— (Труды Минского губернского статистического комитета, в. 1); Памятная книжка Минской губернии... 18[illegible] [illegible] гг.— Мн., 18[illegible]—1915; Победа Советской власти в Белоруссии.— Мн., 1967; Список населённых мест Минской губернии / Сост. В. С. Ярмолович.— Мн., 1909.

С. Г. Бялясой, Э. М. Сініцкі.

990. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). Вул. Савецкая, на могілках. Пахаваны: А. Е. Харытановіч (3.9.1925—14.7.1944 гг.), партызан брыгады імя С. М. Кірава; І. В. Лімант, кіраўнік падпольнай камсамольскай дыверсійнай групы ў Лунінецкім чыгуначным дэпо, потым партызан атрада «За Радзіму» брыгады імя С. М. Кірава (загінуў 3.7.1944 г.). У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

991. БРАЦКІЯ МАГІЛЫ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Савецкай. Абапал галоўнай алеі сквера ў 2 магілах пахаваны 54 воіны 23-й і 55-й стралковых дывізій 89-га корпуса 61-й арміі 1-га Беларускага фронту і 4 партызаны з брыгады імя С. М. Кірава Пінскага партызанскага злучэння, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 9—10.7.1944 г. пры вызваленні Лунінца. У 1953 г. на магілах пастаўлены абеліскі і дошкі з імёнамі загінуўшых.

992. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У заходняй частцы горада, на скрыжаванні вуліц Піянерскай і Гагарына. Пабудавана ў пачатку

991. *Помнік на брацкіх магілах савецкіх воінаў і партызан.*

20 ст. з цэглы. Асноўны кубічны аб'ём да якога з усходу далучаецца алтарная група бона шматграннай апсіды, з захаду шатровая званіца, увянчаны чатырохсхільным шатром з заломкамі. Неатынкаваныя фасады упрыгожаны багатым дэкорам (аркатурны фрыз, плоскія фігурныя і конкавыя нішы, трохвугольныя франтоны).

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

993. **КУРГАН БЕССМЯРОТНАСЦІ** (гіст.). Вул. Бохавава, на ўсходняй ускраіне горада па дарозе ў рабочы пасёлак Мікашэвічы. Насыпаны ў 1967 г. на брацкай магіле 4474 савецкіх воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў баях за свабоду і незалежнасць Радзімы, расстраляны або закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На вяршыні Кургана пастаўлены абеліск.

994. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). На вул. Прамысловай. Пахаваны 4312 грамадзян, загубленых нямецка-фашысцкімі акупантамі ў канцлагерах і гета ў 1941—43 гг. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

995. **МАГІЛА БАГДАНАВА** Пятра Міхайлавіча (гіст.). На могілках.

Герой Савецкага Саюза П. М. Багданаў нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Дзевалесы Палкінскага р-на Пскоўскай вобл.



992. Крыжаўзвіжанская царква.

Кандыдат у члены КПСС з 1945 г. У Вялікую Айчынную вайну з 21.1.1942 г. на фронце. З 20.6.1944 г. на 1-м і 3-м Беларускіх франтах, з 20.4.1945 г. на 1-м Украінскім фронце. Вызначыўся ў баях за Берлін. 23.4.1945 г. старшы сяржант П. М. Багданаў на чале групы байцоў батальёна 66-га стралковага палка 61-й Чырвонасцяжнай стралковай дывізіі першым пераправіўся цераз канал Цельтаў, замацаваўся на плацдарме і 2 гадзіны адбіваў варожыя атакі, чым забяспечыў пераправу сваіх падраздзяленняў. У гэтым баі знішчыў больш як 60 салдат і афіцэраў праціўніка. Усяго на баявым рахунку П. М. Багданава больш за 180 забітых і 93 узятых у палон салдат і афіцэраў ворага. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 27.6.1945 г. Трагічна загінуў 24.8.1945 г.

У 1946 г. на магіле пастаўлены абеліск.

М. М. Ка...ч

996. **МАГІЛА ДАВЫДАВА** Мікалая Сяргеевіча (гіст.). Вул. Савецкая, на могілках.

Герой Савецкага Саюза М. С. Давыдаў нарадзіўся 2.11.1921 г. ў в. Вялікае Андосава Пільнінскага р-на Горкаўскай вобл. Член КПСС з 1944 г. Пасля заканчэння сямігодкі працаваў токарам на заводзе ў Варашылаўградзе, вучыўся ў авіяшколе. З 1940 г. ў Чырвонай Арміі. З сакавіка 1943 г. на Паўднёвым, 4-м Украінскім і 3-м Беларускім франтах, намеснік камандзіра, камандзір эскадрыллі 75-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка. Вызначыўся ў радах 1-й паветранай арміі пры вызваленні Віцебска, Оршы, Мінска і ліквідацыі мінскага «катла». Зрабіў 187 баявых вылетаў, знішчыў 8 танкаў, 6 артбатарэй, 1 паравоз, 17 вагонаў, 21 аўтамашыну, 200 гітлераўцаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 19.4.1945 г. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі, капітан. Загінуў у авіяцыйнай катастрофе 16.8.1949 г.

У 1969 г. на магіле ўстаноўлены абеліск. На радзіме яго імя прысвоена школе.

Літ.: Навечно в сердце народном.— 3 изд. Мн., 1984. *І. М. Паўлюкавец.*

997. **МАГІЛА ЖАЧКІНА** Сяргея Аляксандравіча (гіст.). Вул. Савецкая, на



992. Крыжаўзвіжанская царква. План.



993. Курган Бессмяротнасці.

могілках. Сакратар Лунінецкага райкома КП(б)Б С. А. Жачкін забіты ворагамі Савецкай улады у в. Цна 23.4.1939 г. У 1957 г. на магіле пастаўлена стэла.

998. **МАГІЛА ЖУКА** Аляксея Аляксандравіча (гіст.). Вул. Савецкая, на могілках.

Былы старшыня Бастынскага сельсавета Лунінецкага р-на А. А. Жук у час нямецка-фашысцкай акупацыі быў адным з арганізатараў камсамольска-маладзёжнага падполля ў Лунінцы. Пры яго ўдзеле камсамольцы збіралі інфармацыю аб ворагу, вялі работу па разлажэнню паліцэйскіх гарнізонаў, праводзілі дыверсіі на чыгунцы і ў дэпо. З мая 1943 г. ў партызанах. Камандзір разведчыкаў у атрадзе «За Радзіму» партызанскай брыгады імя С. М. Кірава. У радзе населеных пунктаў раёна стварыў дыверсійныя падпольныя камсамольскія групы. З лістапада 1943 г. член Лунінецкага падпольнага райкома ЛКСМБ. Загінуў у баі 6.12.1943 г.

У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

999. **МАГІЛА ЛОСЕВА** Івана Ільіча (гіст.). Вул. Савецкая, на могілках. Начальнік 4-й часці Лунінецкага райваенкамата І. І. Лосеў забіты вора



992. Крыжаўзвіжанская царква. Выгляд з боку апсіды.

ламі Савецкай улады 25.11.1944 г. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

1000. МАГІЛА ПЯЦЯРЫ Івана Віктаравіча (гіст.). Вул. Савецкая, на могілках.

Герой Савецкага Саюза І. В. Пяцяры нарадзіўся 26.3.1921 г. ў в. Еніселеск Мінусінскага р-на Краснаярскага краю ў сям'і селяніна. Член КПСС з 1944 г. З чэрвеня 1940 г. ў Чырвонай Арміі. Лётчык-інструктар 12-й ваенна-авіяцыйнай школы пілотаў. З ліпеня 1942 г. на Сталінградскім фронце: лейтэнант, лётчык 61-га гвардзейскага начнога бамбардзіровачнага авіяпалка 8-й паветранай арміі, зрабіў 140 баявых вылетаў. З 1943 г. лётчык-штурман, памочнік камандзіра 136-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка 1-й гвардзейскай штурмавой авіядывізіі на Паўднёвым і 4-м Украінскім франтах, прымаў удзел у вызваленні Данбаса і Крыма. З 1944 г. ў складзе той жа дывізіі ў 1-й паветранай арміі на 3-м Беларускім фронце. Вызначыўся ў баях за Беларусь і пры разгроме Усходне-Прускай групоўкі ворага, зрабіў 136 баявых вылетаў, асабіста знішчыў некалькі пераправаў, шмат танкаў, гармат, аўтамашын, сотні гітлераўцаў. Званне Героя Савецкага Саюза капітану І. В. Пяцяры прысвоена 19.4.1945 г. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі. Загінуў 5.5.1949 г.

У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. *В. М. Удальцоў*

1001. МАГІЛА ТРОШЫНА Міхаіла Пятровіча (гіст.). Вул. Савецкая, на могілках. М. П. Трошын — начальнік Лунінецкага райаддзела міліцыі. Пасля вызвалення раёна ў 1944 г. ад нямецка-фашысцкіх акупантаў — актыўны ўдзельнік аднаўлення Савецкай улады і разбуранай гаспадаркі. Загінуў 24.11.1944 г. ў в. Вялікія Чучавічы ў час правядзення аперацыі супраць банды. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1002. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ І ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). Вул. Савецкая, на будынку райвыканкома.

У час Беларускай аперацыі 1944 г. наступленне на Лунінецкім напрамку вялі злучэнні 61-й арміі (камандуючы — генерал-лейтэнант П. А. Бялоў) ва ўзаемадзеянні з Дняпроўскай ваеннай флатыліяй (камандуючы капітан 1-га рангу В. В. Грыгор'еў). Пераправіўшыся з дапамогай 1-й (камандзір капітан 1-га рангу С. М. Лялько) і 2-й (камандзір капітан 2-га рангу У. М. Міцін) брыгад рачных караблёў флатыліі цераз р. Прыпяць, часці 23-й (камандзір палкоўнік І. В. Басцееў) і 55-й (камандзір палкоўнік К. М. Андрусенка) стралковых дывізій 89-га стралковага корпуса (камандзір генерал-маёр А. Я. Янооўскі) наступалі ўздоўж берага ракі на Пінск. 9.7.1944 г. яны пры садзейнічанні партызан пачалі баі за Лунінец — адзін з моцных апорных пунктаў абароны нямецка-фашысцкіх акупантаў на Брэсцкім напрамку. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне праціўніка, 10 ліпеня горад быў вызвалены. Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 23.7.1944 г. 2-й брыгадзе рачных караблёў, 89-му, 107-му, 111-му і 117-му стралковым палкам, 239-му асобнаму лінейнаму батальёну сувязі, 73-му ваенна-будаўнічаму атраду, якія вызначыліся пры вызваленні Лунінца, былі нададзены ганаровыя найменні «Лунінецкіх».

Партызанская брыгада імя С. М. Кірава (камандзір Ф. І. Лісовіч, камісар Р. П. Швец) Пінскага злучэння, якая прымала ўдзел у вызваленні Лунінца, сфарміравана ў ліпені 1943 г., дзейнічала на тэрыторыі Лунінецкага і Ленінскага р-наў Пінскай вобл., прымала ўдзел у «рэйкавай вайне», разгроме варожых гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. 8.7.1944 г. злучылася з войскамі Чырвонай Арміі, налічвала 3 атрады (1088 партызан).

У 1964 г. ў гонар воінаў-вызваліцеляў і партызан устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Буг в огне. [Зб. успамінаў]. 3 изд.— Мн., 1977; Непокорённая Белоруссия: Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны [illegible] Белоруссия, 1944.— 2 изд.— М., 1974; Локтионов И. И. Пинская и Днепровская флотилия в Великой Отечественной войне.— М., 1958. *Г. І. Дулеба.*

1003. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАНЦЯЛЕЕВУ Сцяпану Васілевічу (гіст.). Вул. Панцялеева, 6.

С. В. Панцялееў — удзельнік вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 г. Член КПСС. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў пракурорам у Лунінецкім р-не. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны паводле рашэння ЦК КП(б)Б пакінуты на акупіраванай тэрыторыі раёна для стварэння камуністычнага падполля і арганізацыі партызанскага руху. У ліпені 1941 г. патрапіў на засаду ворага каля в. Гаўрыльчыцы (цяпер Салігорскі р-н), загінуў у баі.

У 1979 г. на ўшанаванне памяці С. В. Панцялеева на будынку Лунінецкай міжрайпракуратуры ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Адна з вуліц горада названа яго імем. *С. С. Кіткевіч.*

1004. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СУПРАЦОЎНІКАМ МІЛІЦЫІ (гіст.). Вул. Чырвонаармейская, 4.

Устаноўлена ў 1985 г. на будынку Лунінецкага раённага аддзела ўнутраных спраў на ўшанаванне памяці супрацоўнікаў міліцыі Васіля Пятровіча Грааноўскага, Аляксандра Сяргеевіча Грышчанкі, Васіля Майсеевіча Калаўра, Мікалая Мікалаевіча Пятрова, Міхаіла Пятровіча Трошына і Андрэя Васілевіча Шпонькі, якія загінулі ў барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады ў 1944—49 гг.

1005. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ПІНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА (гіст.). Вул. Гагарына, 3. Устаноўлена ў 1979 г. на будынку, дзе размяшчаўся рэўком. Пасля [illegible] Пінска (5.3.1919 г.) [illegible] буржуазнай Польшчы [illegible] та павятовага Савета эвакуіраваўся ў Лунінец, дзе 11 сакавіка быў [illegible] створаны ў Пінскі павятовы рэўком. Рэўком з'яўляўся часовым надзвычайным вышэйшым органам Савецкай улады на тэрыторыі неакупіраванай часткі Пінскага павета. Дзейнічаў да 10.7.1919 г.

1006. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ШТАБА ПАЛЕСКІХ ПАЎСТАНЦАЎ (гіст.). Вул. Гагарына, 1[illegible]. Устаноўлена ў 1978 г. на будынку, дзе размяшчаўся штаб (цяпер тут Лунінецкая вочна-завочная школа).

Пасля зрыву мірных перагавораў у Брэсце войскі кайзераўскай Германіі занялі большую частку Беларусі, усталявалі акупацыйны рэжым тэрору і насілля. Лунінец быў заняты імі 18.2.1918 г. Пінскі (у які ўваходзіў і Лунінец) і іншыя паўднёвыя паветы Беларусі акупанты перадалі ў склад гетманскай Украіны. Супраць нямецкіх акупантаў і ўкраінскіх буржуазных нацыяналістаў на тэрыторыі паўднёва-заходняй Беларусі і [illegible] па-заходняй Украіны пад кіраўніцтвам бальшавікоў разгарнуўся партызанскі рух. У кастрычніку 1918 г. ў раёне Сарны Лунінец дзейнічалі ўзброеныя паўстанскія атрады, якія [illegible] вызвалі Пінскі і Ровенскі паветы. [illegible] 1918 г. сюды прыбыў прадстаўнік ЦК РКП(б) А. М. Ільін. Былі арганізаваны цэнтральны (Палескі) і валасныя рэўкомы. Партызанскія атрады аб'ядналіся ў паўстанскія палкі. Створаны Ваенны савет паўстанскіх камуністычных войск Беларусі і Заходняй Украіны на чале з А. М. Ільіным. Ён дамогся ад нямецкіх улад перадачы Лунінецкаму рэўкому (існавала дамоўленасць паміж рэўкомам і салдацкім камітэтам нямецкай дывізіі) артылерыйскіх складоў і іншай ваеннай маёмасці былой царскай арміі, што захоўвалася на складах у раёне Лунінца. 9.1.1919 г. паўстанцы і чырвонаармейцы 153-га палка 17-й стралковай дывізіі вызвалілі Лунінец, дзе размясціўся штаб палескіх паўстанцаў. На працягу студзеня 1919 г. паўстанцы вялі ўпартыя баі з петлюраўцамі, якіх падтрымлівала нямецкае камандаванне. У адказ на гэта паўстанцы спынілі пропуск нямецкіх эшалонаў праз Лунінец, што садзейнічала вызваленню Пінска ад петлюраўцаў (25.1.1919 г.).

Літ.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов. Т. 1.— Мн., [illegible] *В. М. Удальцоў*

1011. *Помнік У. І. Леніну*

1007. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ФРУНЗЕ Міхаілу Васільевічу (гіст.). Вул. Фрунзе, 8.

М. В. Фрунзе (1885—1925) — [illegible] рэвалюцыянер [illegible]. Пасля ўцёкаў летам [illegible] Сібіры, дзе ён адбываў [illegible] [illegible] на Заходні фронт. Тут у ма[illegible] [illegible] М. А. Міхайлава ўладкаваўся [illegible] вольнаваёмным [illegible] артылерыйскую [illegible] [illegible] дагамо[illegible] гай таварыша па падпольнай рабоце Іванава-Вазнясенску І. [illegible] [illegible] камітэт Усера[illegible] [illegible] [illegible] потым намеснікам раённага загадчыка [illegible] пры 10-й арміі. Арганізаваў [illegible] падпольную бальшавіцкую [illegible] [illegible] аддзяленні [illegible] 3-й арміях. Выконваючы службовыя абавязкі, [illegible] гарнізоны, [illegible] партыйную работу. Не раз прыязджаў [illegible] тут працавала да чэрвеня 1917 [illegible] Н[illegible] [illegible] рабоце мясцовай бальшавіцкай [illegible]

[illegible] М. В. Фрунзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка [illegible] Лунінецкім р-не.

[illegible]

1008. МЕСЦА ПЕРШАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ ПІНСКАГА ПАВЕТА (гіст.). Вул. Чырвоная, пажарная часць № 1. У лютым 1917 г. ў Лунінцы, у памяшканні пажарнай часці, якое здавалася пад кінематограф, Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў адкрыў Народны дом, дзе чыталіся лекцыі, праводзіліся сходы і інш. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе Лунінецкі Савет у ноч на 28.10(10.11) 1917 г. стварыў ВРК, у рукі якога перайшла ўся ўлада у мястэчку і на станцыі. 11—12(24—25).11. 1917 г. ў памяшканні Народнага дома адбыўся I з'езд Саветаў Пінскага павета, яго старшынёй абраны А. І. Таганаў. З'езд абвясціў у павеце Савецкую ўладу, выбраў выканком павятовага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, у склад якога ўвайшоў А. І. Таганаў. Пасля заканчэння з'езда каля Народнага дома адбыўся мітынг. Яго ўдзельнікі аднадушна падтрымалі рашэнні з'езда. Быў арганізаваны атрад Чырвонай Гвардыі.

У 1966 г. на будынку пажарнай часці № 1 (на месцы Народнага дома) у гонар I з'езда Саветаў Пінскага павета устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 1—2.— Мн., [illegible]; Победа Советской власти в Белоруссии.— Мн., 1967; В памяти народной.— Мн., 1969.

1009. МЕСЦА РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ ЧЫГУНАЧНІКАЎ У 1905 г. (гіст.). Чыгуначны вакзал. 12.10.1905 г. забаставалі і ўключыліся ва Усерасійскую кастрычніцкую палітычную стачку рабочыя чыгуначнага дэпо і тэлеграфісты Лунінца. Вакзал закрылі, рух паяздоў спыніўся. Былі выбраны мясцовы камітэт Усерасійскага чыгуначнага саюза, у які ўвайшлі інжынер Крыжаноўскі, тэхнік Данілаў, слесар Антоненка і інш. 27.10.1905 г. з Лунінца накіравана 70 узброеных дружыннікаў на дапамогу пралетарыям Пінска, якія рыхтаваліся да ўзброенага паўстання. У лістападзе на мітынгах рабочых бальшавікі агітавалі за ўзброенае паўстанне. У час Снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве на Палескіх чыгунках спынены рух паяздоў (у Лунінцы 8.12.1905 г.). Для задушэння забастоўкі на Палескіх чыгунках з Вільні быў накіраваны спецыяльны поезд з карным атрадам (узмоцнены батальён). Рабочыя Лунінецкага дэпо, каб не дапусціць карнікаў і не даць магчымасці аднавіць рух, зрабілі крушэнні на чыгунцы, вывелі са строю 18 паравозаў. Задушыўшы забастоўку ў Баранавічах, карнікі позна вечарам 17.12.1905 г. прыбылі ў Лунінец, дзе да 3 гадзін ночы 18 снежня дапамагалі мясцовым уладам праводзіць арышты і вобыскі. Хваляванні сярод

1014. *Помнік у гонар асваення космасу*

працоўных Лунінца працягваліся і ў 1906 г.

У 1968 г. на будынку вакзала ў памяць аб гэтых падзеях устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы.— Мн., 1955. *М. І. Алексяюк.*

1010. ПОМНІК ДАВЫДАВУ Мікалаю Сяргеевічу (гіст.). За 1,5 км на паўночны захад ад горада, каля [illegible]. Помнік — самалёт-знішчальнік МіГ-17 — устаноўлены ў 1981 г. на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза М. С. Давыдава на месцы, дзе ён загінуў.

1011. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На пл. Леніна, перад будынкам райкома КПБ. Скульптура У. І. Леніна устаноўлена ў 1959 г.

1012. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Савецкай, у скверы. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1949 г.

1013. ПОМНІК КАРЛУ МАРКСУ (гіст.). На Прывакзальнай пл., у скверы. Стэла з умацаванай у верхняй частцы плітой з бюстам К. Маркса устаноўлена ў 1970 г.

1014. ПОМНІК У ГОНАР АСВАЕННЯ КОСМАСУ (гіст.). На Прывакзальнай пл. У 1964 г. ў гонар асваення космасу пастаўлены помнік — алегарычная скульптура жанчыны, якая увасабляе [illegible]

1015. РАДЗІМА ПАНЬКОВАЙ Алены Дзянісаўны (гіст.).

Герой Сацыялістычнай Працы А. Д. Панькова нарадзілася 8.3.1914 г. Член КПСС з 1945 г. З 1935 г. электразвар-

1026. *Пом[illegible] бра[illegible] савец-кіх воінаў і партызан*

[illegible] Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1938 г. Памерла 8.11.1964 г.

В. В. Караткевіч

в. Багданаўка, Лунінскі сельсавет

1016. МАГІЛА ГУЛЯЕВА [illegible] Пахаваны [illegible] камандзір дэсантнай групы разведчыкаў лейтэнант У. П. Гуляеў загінуў у чэрвені [illegible] У 1980 г. [illegible] пастаўлены абеліск.

1017. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). [illegible] загінулі у Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах і ў партызанах, у 1973 г. пастаўлены абеліск [illegible] загінуўшага земляка.

в. Бараны, Чучавіцкі сельсавет

1018. МАГІЛА ЖЫБУРТА Васіля Антонавіча (гіст.). На могілках.

Партызан атрада імя М. А. Шчорса 27-й партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева В. А. Жыбурт нарадзіўся ў 1923 г. у в. Кучаўшчына Ганцавіцкага р-на. Працаваў трактарыстам у мясцовым калгасе. З 1942 г. ў партызанскім атрадзе імя М. А. Шчорса. З мая 1943 г., калі брыгада вяла цяжкія баі з пераважнымі сіламі карнікаў, В. А. Жыбурт пры прарыве варожага заслона каля в. Морач Ганцавіцкага р-на быў цяжка паранены. Пераправілены партызанамі у в. Баравікі, памёр ад ран у пачатку лютага 1943 г.

У 1980 г. на магіле пастаўлены абеліск.

В. М. Удальцоў

в. Бастынь, цэнтр сельсавета

1019. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі, каля клуба. Пахаваны 66 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні [illegible] Бастынскага сельсавета 8—10.7.1944 г. У 1967 г. [illegible] скульптура салдата.

1020. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ўсход ад вёскі, каля чыгуначнага пераезда. Пахаваны 51 жыхар в. Бастынь, якіх расстралялі [illegible] магіле пастаўлены абеліск.

1021. МЕСЦА ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ АКТЫВІСТАЎ (гіст.). [illegible] кія акупанты расстралялі дэпутата Вярхоўнага Савета СССР М. С. Бушы[illegible] Пахаваны [illegible] У 1965 г. на месцы расстрэлу пастаўлена стэла.

в. Бродніца, Вулькаўскі сельсавет

1022. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На [illegible] 21 [illegible] у Вялікую Айчынную вайну у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Ветута, Бастынскі сельсавет

1023. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). [illegible] Пахаваны [illegible] ка і Данілы Аляксеевіча Кавалёнка, якія памерлі ад ран, атрыманых у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні вёскі 8.7.1944 г. [illegible] ліск, на якім увекавечана таксама памяць [illegible] калгаса «Зара», што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

1028. *Пакроўская царква*

в. Вулька 1-я, Лунінскі сельсавет

1024. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 32 аднавяскоўцаў, якія загінулі у Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлена стэла.

в. Вулька 2-я, Вулькаўскі сельсавет

1025. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). [illegible] калгаса «Світанне». На ўшанаванне памяці 45 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

в. Вялікія Чучавічы, Чучавіцкі сельсавет

1026. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). [illegible] ры, каля канторы леспрамгаса. Пахаваны 49 савецкіх воінаў і партызан, [illegible] дата.

1027. МАГІЛА РАМАНЕНКІ Настассі (гіст.). На могілках.

Партызанка атрада імя М. І. Кутузава [illegible] 1920 г. [illegible] тэхнікум, працавала фельчарам. У Вялікую Айчынную вайну Н. Раманенка [illegible] сястрой, пазней актыўна ўдзельнічала [illegible] у рукі гітлераўцаў, якія пасля катаванняў расстралялі яе. Імя Н. Раманенкі прысвоена піянерскай дружыне Вялікачучавіцкай сярэдняй школы. [illegible] ліск.

1028. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (гіст.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1850—51 гг. з дрэва, у 1908 г. прыбудавана званіца.

Пабудова трохзрубная, складаецца з прамавугольнага бабінца, квадратнага ў плане цэнтральнага і пяціграннага алтарнага зрубаў. Цэнтральны чатвяр[illegible]



1028. *П[illegible]*

1033. *Помнік землякам*

рык у другім ярусе пераходзіць у васьмярык з дапамогай ветразяў, якія відаць звонку. Васьмярык накрыты пластычным чатырохсхільным дахам і завершаны дэкаратыўным пяцігалоўем. Дах накрыты гонтай. Будынак гарызантальна ашаляваны. Сцены прарэзаны арачнымі аконнымі праёмамі. Уваходы акцэнтаваны крытымі слупавымі ганкамі. Званіца прыбудаваная да бабінца, трох'ярусная, ніжнія ярусы чацверыкі, верхні — васьмярык, завершаны шатровым дахам. У інтэр'еры вылучаецца двухсветлавы, завершаны купалам цэнтральны аб'ём, з якім злучаюцца больш нізкія бабінец і алтарнае памяшканне, аддзеленае разьбяным вызалачаным іканастасам (19 ст.).

Царква — помнік архітэктуры, які характарызуе развіццё ў 19 ст. традыцыйных для Палесся ярусных кампазіцый.

Літ.: Описание церквей и приходов Минской епархии. [illegible] Мозырский уезд. Мн., 1879. [illegible] Ю. А. Якімовіч

в. Дварэц, цэнтр сельсавета

1029. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 85 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Дзятлавічы, цэнтр сельсавета

1030. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). Каля чыгуначнага пераезда. Пахаваны 19 жыхароў вёскі, якіх расстралялі ў чэрвені 1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

1031. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (г.ст.). За 0,6 км на захад ад вёскі, каля дарогі Лунінец — Дзятлавічы. Пахаваны 4 жыхары вёскі, якіх расстралялі і спалілі ў 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

1032. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). За 0,8 км на захад ад вёскі, за чыгункай Лунінец — Дзятлавічы. Пахаваны 89 жыхароў вёскі, якіх расстралялі ў кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1967 г. пастаўлены абеліск.

1033. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). На вул. Савецкай. На ўшанаванне памяці 111 савецкіх воінаў і партызан, якія жылі на тэрыторыі Дзятлавіцкага сельсавета і загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

1034. **ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). На паўночны ўсход ад вёскі непадалёку ад р. Цна. Пабудавана ў 1823 г. з дрэва, часткова перабудавана ў 1871 г.

Кампазіцыя будынка развіта па падоўжнай восі. Да галоўнага квадратнага ў плане аб'ёму далучаны з усходу група алтарных памяшканняў (апсіда і 2 рызніцы), з захаду — бабінец з 2 бакоўкамі. Асноўны зруб завершаны купалам з васьмерыковым светлавым барабанам, накрытым шатровым дахам. Чатыры чацверыковыя вежы са складанымі барочнымі купаламі размешчаны на вуглах пабудовы і разам з цэнтральным купалам утвараюць завершаную цэнтрычную кампазіцыю. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. Прамавугольныя аконныя праёмы аздоблены ліштвамі. Трохсветлавы асноўны аб'ём злучаецца шырокімі праёмамі з бабінцам і гранёным алтарным зрубам. На паўднёвым баку царквы размешчана двух'ярусная званіца зрубна-каркаснай канструкцыі (васьмярык на чацверыку), увянчаная шатровым дахам.

Царква — прыклад драўляных культавых пабудоў з рысамі архітэктуры барока і класіцызму. *Ю. А. Якімовіч*

1034. *Праабражэнская царква. План*

1034. *Праабражэнская царква. Фрагмент скляпення*

в. Кажан-Гарадок, Гарадоцкі сельсавет

1035. **ГАРАДЗІШЧА** (археал.).

1035а. Гарадзішча-1. На ўсходняй ускраіне вёскі, з правага боку ад дарогі на Лахву, у лесе. Адкрыў і абследаваў у 1980 г. М. Ф. Гурын. Пляцоўка памерам 75×65 м на невялікім узвышшы, па краі ўмацавана валам [illegible] м [illegible] з усходу на захад паніжаецца да 2 м. Культурны пласт у месцах шурфоўкі дасягае 0,3 м. Раскопкі не праводзіліся.

1035б. Гарадзішча-2. За 0,8 км ад вёскі, з правага боку ад дарогі на Лахву, у лесе. Адкрыў і абследаваў у 1980 г. М. Ф. Гурын. Пляцоўка памерам [illegible] м па краі ўмацавана ва[illegible] м. Культурна[illegible]

1034. *Праабражэнская царква*

пласт у шурфах каля 0,4 м. Раскопкі не праводзіліся.

1035в. Г а р а д з і ш ч а 3. За 2 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Князевы Горы. Адкрыў у 1964 г. Г. В. Штыхаў, абследавала ў 1980 г. Т. С. Скрыпчанка. Плошча каля 2 га. Амаль круглае ў плане, крыху выцягнутае з паўночнага ўсходу, поўначы і паўночнага захаду ўмацавана валамі вышынёй 3,5 м. Культурны пласт дасягае 0,15 м, у ім знойдзена ляпная кераміка. Шмат рэшткаў ляпной керамікі сабрана на паверхні.



1035а. *Гарадзішча-1. План.*



1035б. *Гарадзішча-2. План.*

Адносіцца да ранняга жалезнага веку. Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

М. Ф. Гурын, Т. С. Скрыпчанка.

1036. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ўскраіне вёскі, каля могілак. Пахаваны 937 мірных жыхароў, якіх расстралялі ў 1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты. У 1971 г. на магіле пастаўлена стэла.

1037. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЯНКЕВІЧУ Пятру Антонавічу (гіст.). На будынку выканкома сельсавета. Устаноўлена ў 1967 г. для ўвекавечання памяці ўраджэнца вёскі партызана П. А. Янкевіча, які загінуў 18.3.1944 г. ў час разгрому нямецка-фашысцкага гарнізона ў в. Сінкевічы. Адна з вуліц вёскі названа яго імем.

1038. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт., маст.). У цэнтры вёскі на ўзгорку, непадалёку ад дарогі Лунінец — Мікашэвічы. Пабудавана ў 1818 г. з дрэва, перабудавана ў 1876 г., у канцы 19 ст. з заходняга боку прыбудавана трох'ярусная шатровая званіца.

Будынак крыжападобны ў плане. Да цэнтральнага васьмігранная аб'ёму з 4 бакоў прымыкаюць прамавугольныя ў плане зрубы алтара, бабінца і бакавых прыбудоў. Цэнтральны зруб мае двух'яруснае завяршэнне (васьмярык на чацверыку) з гранёнай галоўкай на барабане. Астатнія зрубы завершаны аднаяруснымі чацверыковымі вярхамі. Сцены гарызантальна ашаляваны, умацаваны лапаткамі і прарэзаны прамавугольнымі і лучковымі аконнымі праёмамі.

У інтэр'еры дамінуе трохсветлавое цэнтральнае памяшканне, з якім непасрэдна злучаюцца астатнія. Цэнтральны чацверык падтрымліваецца 4 слупамі. Пераходы паміж ярусамі зрубаў зроблены пры дапамозе ветразяў. Značнае месца ў інтэр'еры займае

1035в. *Гарадзішча-3. План.*

1038. *Мікалаеўская царква. Фрагмент алтара.*

разны арнаментальны скульптурны дэкор, выкананы народным майстрам разьбяром І. Астапчыкам. Мастацкую каштоўнасць мае двух'ярусны разны іканастас, выкананы ў тэхніцы накладной разьбы. Цэнтральны алтар зроблены ў выглядзе двух'яруснага портыка.

Царква — помнік архітэктуры з рысамі мясцовай школы дойлідства, якая склалася пад уплывам стылю барока.

А. К. Лявонава, Ю. А. Якімовіч.

1038. *Мікалаеўская царква. Фрагмент інтэр'ера. Скульптура «Апостал Пётр».*



1038. *Мікалаеўская царква. План*

1038. *М[illegible] Бокавы фасад*

1039. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.) У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. На ўвекавечанне памяці 161 савецкага воіна і партызана — ураджэнцаў сель[illegible], якія загінулі ў Вялікую Ай[illegible] вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлены помнік — скульптура [illegible].

в. Лахаўка, Лахвенскі сельсавет

1040. МАГІЛА МАКСІМОВІЧА Васіля Ігнатавіча (гіст.). На могілках. Супрацоўнік міліцыі В. І. Максімовіч расстраляны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941 г. У 1972 г. на магіле [illegible].

в. Лахва, цэнтр сельсавета

1041. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Первамайская, у скверы. Пахаваны [illegible] савецкія воіны і 11 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 г. [illegible] 1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

1042. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 300 м на паўднёвы ўсход ад канторы рыбгаса «Лахва». Пахаваны 197 мірных жыхароў — ахвяр фашызму і 283 савецкія ваеннапалонныя, якіх закатавалі нямецка-фашысцкія захопнікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1973 г. на магіле пастаўлена стэла.

1043. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,4 км на ўсход ад канторы рыбгаса «Лахва». Пахаваны 1946 савецкіх грамадзян, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1942. У 1973 г. на магіле пастаўлена стэла.

1044. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На беразе р. Смердзь. Пабудавана ў 1880-я гады на месцы колішняга манастыра (17 ст.). Мураваная. Квадратны ў плане асноўны аб'ём з паўцыркульнай апсідай і 2 бакоўкамі злучаны з масіўнай шатровай званіцай. У багатай апрацоўцы фасадаў вылучаюцца высокія [illegible] [illegible] [illegible], пер[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] ўпрыгожана [illegible] паўкруглым [illegible] з трохвугольным [illegible].

Царква — помнік архітэктуры [illegible] [illegible].

1045. СЕЛІШЧА. КУРГАН [illegible]

1045а. С[illegible] [illegible] урочышча Р[illegible] [illegible] р. Прыпяць. Ад[illegible] у 1980 г. М. Ф. Гу[illegible]. На пляцоўцы [illegible] [illegible] [illegible] з [illegible] [illegible] [illegible] пасцілі[illegible] дабаўленнем жарствы [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]. Месцамі ку[illegible] [illegible] [illegible] вышыня яго каля 2 м.

1039. *Помнік зем[illegible]*



1044. *Прачысценская царква. План*

1044. *П[illegible]*



1045а. *Селішча. План*

Селішча адносіцца да ранняга жалезнага веку. Раскопкі не праводзіліся. Матэрыялы абследавання зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

1045б. Курган. За 0,3 км на паўночны захад ад будынка выканкома сельсавета, на сядзібе калгасніцы В. Дубавец (раней тут быў курганны могільнік). Адкрыла і абследавала ў 1980 г. Т. С. Скрыпчанка. Насып круглай формы, дыяметрам каля 8 м, вышынёй каля 2 м. Курган злёгку апліўшы, у цэнтры крыху пашкоджаны ямай шукальнікаў скарбаў. Раскопкі не праводзіліся.

М. Ф. Гурын, Т. С. Скрыпчанка

в. Лугі, Чучавіцкі сельсавет

1046. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля школы.

20.2.1943 г. ў час карнай аперацыі супраць партызан, гітлераўцы акружылі вёску, спалілі ... двароў, расстралялі і спалілі жывымі 137 старых, жанчын і дзяцей. На ўшанаванне іх памяці, а таксама 31 аднавяскоўца, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах і ў партызанскай барацьбе, у 1979 г. пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

в. Лунін, цэнтр сельсавета

1047. БАРЫСАГЛЕБСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У паўночнай частцы вёскі. Пабудавана ў 1824 г. з дрэва. Вылучаецца арыгінальным кампазіцыйным вырашэннем — спалучэннем прамавугольнага зруба званіцы з васьмігранным зрубам храма.

Помнік архітэктуры з рысамі класіцызму.

1048. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Шлях да камунізма». Пахаваны 21 воін ...-й стралковай дывізіі 61-й арміі і 3 партызаны брыгады імя С. М. Кірава, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 12—13.7.1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Любань, Лахвенскі сельсавет

1049. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Залескай, каля Дома культуры. Пахаваны 6 савецкіх воінаў і партызан з брыгады імя С. М. Кірава, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні Лунінецкага р-на ў 1944 г. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск, якім ушанавана таксама памяць 101 земляка з калгаса «Новае Палессе», што загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе.

1050. МАГІЛА АНТАНОВІЧА Івана Рамановіча (гіст.). На могілках. Старшыня Лахвенскага сельсавета І. Р. Антановіч у 1942 г. забіты нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1051. МАГІЛА ШЭЎЧЫКА Івана Ігнатавіча (гіст.). На могілках. Намеснік старшыні мясцовага сельсавета І. І. Шаўчык у 1948 г. забіты ворагамі Савецкай улады. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1052. МАГІЛА ШЭЎЧЫКА Міхаіла Іванавіча (гіст.). На могілках. Старшыня мясцовага сельсавета М. І. Шаўчык у 1949 г. забіты ворагамі Савецкай улады. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Любачын, Дварэцкі сельсавет

1053. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 108 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Малыя Чучавічы, Чучавіцкі сельсавет

1054. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 54 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Мелясніца, Лунінскі сельсавет

1055. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі.

Раніцай 1.10.1943 г. атрад нямецка-фашысцкіх карнікаў загубіў 114 жыхароў вёскі і спаліў 74 двары. У 1964 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

рабочы пасёлак Мікашэвічы

1056. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Леніна, у скверы. Пахаваны 32 савецкія воіны, у т. л. воіны 23-й стралковай дывізіі 61-й арміі, якія загінулі ў баі 9.7.1944 г. пры вызваленні пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлена помнік — скульптура салдата.

1057. *Помнік У. І. Леніну*

1057. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Ленінскай, у скверы. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 19...

в. Мокрава, Сінкевіцкі сельсавет

1058. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). За 1 км на захад ад вёскі, каля чыгуначнага пераезда. Пахаваны 27 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

пас. Палескі, Лунінскі сельсавет

1059. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля цэнтральнай сядзібы Палескай доследна-меліярацыйнай станцыі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1978 г.

в. Радзігерава, цэнтр сельсавета

1060. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Запаветы Ільіча». На ўшанаванне памяці 86 землякоў з гэтага калгаса, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Ракітна, Дварэцкі сельсавет

1061. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны 83 жыхары вёскі, расстра-

1059. *Помнік У. І. Леніну.*

[illegible]бiтыя 7.12.1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 19[illegible] г. на месцы растрэлу і пахавання пастаўлены помнік — стэла з барэльефам [illegible].

в. Сінкевічы, цэнтр сельсавета

1062. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. Пахаваны 27 савецкіх воінаў і 11 партызан атрада імя І. В. Сталіна брыгады імя С. М. Кірава, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Лунінецкім р-не ў 1942 г. — ліпені 1944 г. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

1063. КУРГАН (археал.). Мясцовая назва Татарская магіла. [illegible] км на ўсход ад вёскі, у лесе ва ўрочышчы Пататусты Востраў. Адкрыў і абследаваў у 1980 г. М. Ф. Гурын. Паўсферычнай формы, дыяметр 15 м, вышыня 0,8 м. Раскопкі не праводзіліся.

1064. МАГІЛА КУЛАКЕВІЧА М[illegible] Апанасавіча (гіст.). На могілках. Член Сінкевіцкай падпольнай камсамольскай маладзёжнай арганізацыі М. А. Кулакевіч (1924—44 гг.) загінуў у Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1947 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1065. МАГІЛА ПЯТРОВА Дзмітрыя Мікалаевіча (гіст.). На могілках. Член Сінкевіцкай падпольнай камсамольскай маладзёжнай арганізацыі Дз. М. Пятроў (1920—44 гг.) загінуў у Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1947 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1066. МЕСЦА БОЮ ПАРТЫЗАН (гіст.). Чыгуначная станцыя Сінкевічы.

Напярэдадні 25-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі камандаванне партызанскага злучэння распрацавала план знішчэння варожага гарнізона на чыгуначнай станцыі Сінкевічы і чыгуначнага моста цераз р. Лань. Вёска і станцыя былі ўмацаваны дзотамі і акопамі з хадамі зносін. Падыходы да іх прыкрываліся замініраванымі агароджамі з калючага дроту. На досвітку 30.10.1942 г. партызаны атрада «Пятровіча» (камандзір А. П. Савіцкі) і атрада імя М. Ц. [illegible]на (камандзір М. І. Герасімаў) напалі на варожы гарнізон. У ходзе бою, які працягваўся каля гадзіны, гарнізон быў поўнасцю разгромлены, знішчаны 74 гітлераўцы, разбураны станцыйнае абсталяванне, [illegible] участак камендатуры. Партызаны ўзарвалі 70-метровы чыгуначны мост цераз р. Лань, спалілі маслабойню, [illegible] іх 2 чыгуначныя. У выніку рух па чыгуначным участку Лунінец — Калінкавічы быў спынены на 3 тыдні.

У 1963 г. на будынку станцыі ў памяць аб гэтым баі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Лит.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной [illegible] июль 1944): [illegible] и материалы. Т. 1. — Мн., 1967.

[illegible]

1067. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, на вул. Камсамольскай. На ўшанаванне памяці 100 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1978 г. устаноўлены помнік — на пастаменце камень з рэльефнай выявай галавы жанчыны.

1061. *Помнік на магіле ахвяр фашызму.*

1068. *Помнік [illegible]*

1068. ПОМНІК ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). Завулак Лаўскі, у скверы. У перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі ў вёсцы з лета 1941 г. дзейнічала падпольная камсамольска-маладзёжная арганізацыя, у якую ўваходзіла 20 чалавек. Камсамольцы збіралі зброю, вялі разведку, рабілі дыверсіі на шашэйных дарогах і чыгунцы. Імі падарвана і спушчана пад адхон некалькі эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, знішчана больш за 20 нямецкіх афіцэраў. У лютым 1944 г. гітлераўцы выкрылі падпольшчыкаў. Камсамольцы С. Буневіч, В. [illegible], У. М. Яроцкі і іншыя былі схоплены акупантамі і закатаваны. Астатнія падпольшчыкі прадоўжылі барацьбу з ворагам у партызанах, потым у Чырвонай Арміі.

На ўшанаванне памяці падпольшчыкаў у 1968 г. пастаўлена стэла.

В. Л. Ш[illegible]

в. Сітніцкі Двор, Сінкевіцкі сельсавет

1069. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км ад вёскі, на ўзлессі каля дарогі Сінкевічы — Лунінец. Пахаваны 380 жыхароў вёскі, якіх загубілі 12.11.1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты.

8.11.1942 г. ў вёску ўварваўся атрад карнікаў. Партызаны атрада Пятровіча (пазней імя С. М. Кірава), [illegible] якіх знаходзіліся непадалёку ад вёскі, сустрэлі карнікаў агнём. Пад націскам ворага партызаны адступілі. У час бою частка жыхароў вёскі ўцякла ў лес. 12 лістапада карнікі расстралялі 100 сямей (380 чалавек), некаторых, у т. л. і дзяцей, гітлераўцы кідалі ў яму жывымі; спалілі [illegible] двароў.

У 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

1070. ПАРТЫЗАНСКІЯ МОГІЛКІ (гіст.). За 0,5 км на поўнач ад вёскі у лесе. Пахаваны 21 партызан з брыгады імя С. М. Кірава Пінскага злучэння, якія загінулі ў 1942—44 гг. у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1960 г. на могілках пастаўлены абеліск.

в. Цна, Гарадоцкі сельсавет

1071. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На вул. 17 Верасня. На ўшанаванне памяці 55 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Чарабасава, Радзігераўскі сельсавет

1072. МАГІЛА ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, за 0,1 км ад чыгуначнага пераезда. Пахаваны члены падпольнай камсамольскай групы Р. Кужбар і былы ваеннаслужачы Чырвонай Арміі (прозвішча невядома), які, апынуўшыся ў тыле ворага, стаў падпольшчыкам, а таксама родныя Р. Кужбара (усяго 12 чалавек), расстраляныя нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1942 г.

1075. Праабражэнская царква. Выгляд з боку апсіды.

Чарабасаўская камсамольская падпольная група — частка Сінкевіцкай камсамольска-маладзёжнай падпольнай арганізацыі. Дзейнічала з чэрвеня 1941 г. да ліпеня 1942 г. (сакратар групы А. П. Дунец). Падпольшчыкі збіралі зброю, боепрыпасы, вялі палітычную работу сярод насельніцтва па арганізацыі партызанскага атрада. Летам 1942 г. падпольшчыкі пайшлі ў партызаны.

У 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск. *Т. Р. Чуракова*

в. Чырвоная Воля, Вулькаўскі сельсавет

1073. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 78 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Язвінкі, Дварэцкі сельсавет

1074. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 75 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1968 г. пастаўлены абеліск.

1075. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1910 г. з дрэва. Трохзрубны храм з двух'ярусная званіцай над прытворам. Чатырохсценная апсіда мае невялікую шатровую прыбудову. Цэнтральны зруб і апсіда накрыты паўвальмавымі дахамі, званіца — высокім шатром. На даху цэнтральнага зруба — невялікая галоўка. Сцены будынка вертыкальна і гарызантальна ашаляваны. Дэкор помніка ўключае разны аркатурны фрыз, пояскі карнізаў, накладныя разныя дэталі.

Царква — помнік народнага дойлідства з элементамі стылю «мадэрн».

ЛЯХАВІЦКІ
РАЁН
ЛЯХАВІЧЫ
Палацы, сядзібы, асабняк
Стаянкі, паселішчы, гарадзішчы

XV. ЛЯХАВІЧЫ

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны на р. Ведзьма, левым прытоку р. Шчара. За 2.. км на паўночны ўсход ад Брэста. Чыгуначная станцыя на ... Баранавічы — Лунінец.

XV. *Вуліца Леніна*

Упершыню Ляхавічы ўпамінаюцца ў дакументах 15 ст. Адносіліся да дзяржаўных уладанняў Вялікага княства Літоўскага. Мелі ў гэты час драўляныя ўмацаванні. У 1572 г. Жыгімонт II Аўгуст аддаў іх ва ўладанне магнату Вялікага княства Літоўскага Яну Хадкевічу. Пры ім пабудаваны бастыённы замак, вядомы пад назвай «Ляхавіцкая фартэцыя», які вытрымаў 8 аблог і быў адным з самых магутных умацаванняў не толькі ў Вялікім княстве Літоўскім, але і ва усёй Рэчы Паспалітай. Толькі зімою 1648 г. яго 4 разы беспаспяхова штурмавалі казацкія загоны С. Напалнага. Паводле гравюры 17 ст., Ляхавіцкі замак знаходзіўся на левым беразе р. Ведзьма, меў у плане форму чатырохвугольніка з вялікімі бастыёнамі і брустверамі. Ён быў акружаны ровам шырынёй да 15 м ... галаўнага вадой, для чаго га... ... ... Уваход у замак быў праз мураваную абарончую браму з вежай, у верхняй частцы якой ... ... Унутры двара, насупраць брамы, стаяў II падобны двухпавярховы мураваны палац. Злева і справа ад ... ... размяшчаліся розныя гаспадарчыя службы. У 1658 г. на ўзбраенні замка было 30 гармат розных сістэм, шмат ручной агнястрэльнай зброі. У 1621 г. гаспадаром замка стаў Павел Ян Сапега, які з 1656 г. быў вялікім літоўскім гетманам. У час руска-польскай вайны 1654—67 гг. замак у 1660 г. вытрымаў шасцімесячную асаду. Горад 4 разы гарэў і быў зруйнаваны. Поўнаму спусташэнню падвергліся Ляхавічы ў Паўночную вайну 1700—21 гг., быў разбураны і замак. Нейкі час горад належаў віленскаму біскупу I. Масальскаму, у 177.. г. з прычыны вялікага абарончага значэння вернуты дзяржаве. Уваходзіў у Навагрудскі, з 1791 г. — Случарскі паветы. У 1793 г. горад перайшоў да магната С. Касакоўскага, упамінаецца як цэнтр графства. З гэтага ж го... ў складзе Расіі, з 1795 г. — валасны цэнтр Слуцкага павета. У 1-й палавіне 19 ст. рэшткі замка прададзены габрэям, якія разабралі яго муроўку і ... мураваныя пабудовы. Захаваліся сляды валоў і 15-метровыя апльтушыя равы.

Будаўніцтва лініі Палескіх чыгунак Сарны — Вільня дало штуршок эканамічнаму развіццю горада. Паводле перапісу 1897 г., у ім налічвалася 5616 жыхароў. У гэты час тут былі школа, бальніца, ганчарныя майстэрні, 30 крам, бровар. Штогод праводзіліся 3 вялікія кірмашы. У 1900 г. была пошта і 91 дробнае прамысловае прад...

XV. *Жылыя дамы на ...цы Леніна*

...прыемства. У час Рэвалюцыі 1905—07 гг. адбываліся дэманстрацыі працоўных.

З 1915 г. Ляхавічы ў прыфрантавой паласе. 18.2.1918 г. акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі. Пасля выгнання нямецкіх інтэрвентаў у снежні таго ж года створаны раўком (старшыня — Я. М. Шкляюк). 17.4.1919 г. Ляхавічы захоплены войскамі буржуазнай Польшчы. У ліпені 1920 г. была аднаўлена Савецкая ўлада, але неўзабаве Ляхавічы зноў акупіравалі польскія войскі.

Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г., Ляхавічы адышлі да буржуазнай Польшчы і да верасня 1939 г. уваходзілі ў Баранавіцкі павет Навагрудскага ваяводства. Тут дзейнічаў падпольны райком КПЗБ. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР Ляхавічы ўвайшлі ў склад Баранавіцкай вобл. З 15.1.1940 г. цэнтр раёна. У 1939 г. 5,1 тыс. чалавек.

У Вялікую Айчынную вайну Ляхавічы з 26.6.1941 г. да 8.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У раёне дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (верасень 1943 г. — ліпень 1944 г.) і ЛКСМБ (кастрычнік 1943 г. — ліпень 1944 г.), выдавалася газета «Савецкі патрыёт». 8.7.1944 г. воіны 1-га Беларускага фронту вызвалілі горад. З 8.1.1954 г. у Брэсцкай вобл.

У 1972 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва распрацаваны генеральны план Ляхавіч, у 1973 г. — праект дэталёвай планіроўкі і забудовы цэнтральнай часткі горада. У аснову архітэктурна-прасторавай кампазіцыі пакладзены прынцып раскрыцця горада да ракі. На галоўнай вул. Леніна (частка шашы Баранавічы — Русінавічы) знаходзяцца будынкі саўгаса-тэхнікума, камбіната бытавога абслугоўвання, універсама. Да вул. Леніна прымыкаюць



XV. *Забудова вуліцы Леніна*

пл. Перамогі і пл. Леніна — адміністрацыйна-грамадскі цэнтр Ляхавіч. Абліччa пл. Леніна фарміруюць Дом Саветаў, Дом сувязі і банк, Дом культуры. На вул. 17 Верасня пабудаваны рэстаран і кафэ, гасцініца, магазіны. Цэнтр развіваецца уздоўж вул. Леніна да поймы р. Ведзьма, дзе запраектаваны гарадскі парк.

Прамысловасць сканцэнтравана на паўднёвы ўсход ад асноўнай жылой тэрыторыі, у раёне чыгуначнай станцыі. У Ляхавічах працуюць заводы [illegible] кансервавы і жалезабетонных вырабаў, [illegible] эксперыментальны завод мета[illegible] тары, філіял Баранавіцкага масלazавода, раённае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі, лясгас, 6 будаўнічых арганізацый.

[illegible] павялічыўся жылы фонд, створана сетка навучальных, культурных і лячэбна-прафілактычных устаноў. У Ляхавічах 2 сярэднія, 1 вячэрняя, спартыўная і музычная школы, міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат, 2 бібліятэкі, кінатэатр, Дом піянераў і школьнікаў, 2 дашкольныя дзіцячыя ўстановы, бальніца. Выдаецца раённая газета «[illegible]удаўнік камунізму».

Зона адпачынку склалася [illegible] Ведзьма і Шчара.

Літ.: Грыцкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв.: (социально-экономическое исследование истории городов) [illegible] Ткачоў М. А. Абарончыя [illegible] заходніх земель Беларусі [illegible] XVIII стст.— Мн., 1978; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod [illegible] Polska. Warszawa, 1886. *У. В. Алсейчык, М. А. Ткачоў, С. Ф. Цярохін.*

1076. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На вул. Леніна. Пахаваны 14 воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1077. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН ([illegible]). На пл. Перамогі у цэнтры горада. Пахаваны [illegible] воіны і 3 партызаны, якія загінулі ў баях у 1941—44 гг. Сярод [illegible] воіны 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі і 19-й механізаванай брыгады, што загінулі пры вызваленні Ляхавіч ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У пачатку [illegible] гвардзейская стралковая дывізія і 19-я механізаваная брыгада пад камандаваннем генерал-маёра М. М. Данілава і [illegible]оўніка У. В. Ярцова падышлі да Ляхавіч — моцнага пункта абароны праціўніка на Баранавіцкім напрамку. Гітлераўцы аказалі жорсткае супраціўленне. Падраздзяленні савецкіх войск абышлі ворага з флангаў, прарвалі яго абарону і ўварваліся ў горад, які пасля цяжкіх баёў 8 ліпеня быў поўнасцю вызвалены.

З лютага да ліпеня 1944 г. на тэрыторыі Ляхавіцкага р-на супраць гітлераўцаў змагалася 19-я партызанская брыгада імя В. М. Молатава (гл. артыкул № 1124 «Помнік у гонар 19-й партызанскай брыгады імя В. М. Молатава»).

У 1965 г. на магіле пастаўлены 2 помнікі — скульптурная група (2 воіны) і стэла. Да стэлы прымацаваны 5 мемарыяльных дошак, адна з якіх прысвечана 19-й партызанскай брыгадзе імя В. М. Молатава, на астатніх высечаны імёны пахаваных.

[illegible] 7.— М., 1945. *М. А. Багуш[illegible], Г. І. Дулеба.*

1078. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СУПРАЦОЎНІКАМ МІЛІЦЫІ (гіст.). Вул. 17 Верасня, 7. На ўшанаванне памяці 5 супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў, у 1957 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

1079. РАДЗІМА ЕЎЛАШОЎСКАГА ФЕДАРА (гіст.)

Беларускі грамадскі дзеяч [illegible] Ф. Еўлашоўскі нарадзіўся [illegible] 1546 г. ў небагатай шляхецкай сям'і. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома. Шырокія веды па матэматыцы, справаводству, юрыспрудэнцыі і філасофіі таленавіты юнак набыў шляхам самаадукацыі. Карыстаўся вялікай павагай сучаснікаў, яго выбіралі на розныя грамадскія пасады, даручалі весці судовыя справы. У 1579 г. навагрудская шляхта накіравала Еўлашоўскага ў якасці павятовага пасла на Варшаўскі вальны сейм, дзе ён удзельнічаў у выпрацоўцы 3-й рэдакцыі Статута Вялікага княства Літоўскага. На сейме ў в. Цырын (Карэліцкі р-н) у 1592 г. абраны падсудкам (адвакатам) земскага суда ў Навагрудку, дзе працаваў да канца свайго жыцця.

1076. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*

У поглядах на грамадска-палітычнае жыццё прытрымліваўся памяркоўнага лібералізму.

У гісторыю беларускай літаратуры Еўлашоўскі ўвайшоў як аўтар «Дзённіка», напісанага па багатых асабістых уражаннях, звязаных з яго дзейнасцю юрыста, а таксама жыццёвых назіраннях. «Дзённік» Федара Еўлашоўскага (апублікаваны ў 1886 г.) — самы ранні твор беларускай мемуарнай літаратуры, дае багаты матэрыял для характарыстыкі побыту, культуры, светапогляду беларускага шляхецкага саслоўя ў 16 ст.

Памёр Ф. Еўлашоў[illegible] 1[illegible].

Літ.: Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / Скл. А. Ф. Коршунаў.— Мн., 1959; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мн., 1968. *М. М. Яніцкая.*

в. Адахаўшчына. Федзюкоўскі сельсавет

1080. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. ў баях за вызваленне тэрыторыі Ляхавіцкага р-на ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Альхоўцы, цэнтр сельсавета

1081. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 10 жыхароў вёскі, расстраляных 6.7.1941 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Вадзяціна, Альхоўскі сельсавет

1082. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахава-



XV. *Ляхавіцкі замак. Рэканструкцыя паводле гравюры 17 ст.*

1084. *Помнік на брацкай магіле чырвонаармейцаў.*

[illegible]
абеліск.

в. Востраў, цэнтр сельсавета

1083. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН [illegible]



1088. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — [illegible] дом, 2 — службовы [illegible] 3 — лядоўня; 4 — аранжарэя; 5 — [illegible] 6 — дом аканома; 7 — свіран; 8 — [illegible] ровар; 9 — [illegible] 11 — [illegible] рня.*

могілках. Пахаваны 13 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—44 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены [illegible]

1084. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 6 чырвонаармейцаў 9-га пяхотнага палка, якія загінулі 2[illegible].1919 г. ў баі супраць польскіх інтэрвентаў. У 1946 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Ганцінец, Курашаўскі сельсавет

1085. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). На будынку клуба.

У 1943—44 гг. у лесе каля в. Ганцінец базіраваўся партызанскі атрад імя С. Г. Лазо, які быў створаны ў лістападзе 1943 г. Камандзіры атрада А. Ф. Астапаў, В. М. Каравы, камісар А. А. Адамаў. Спачатку знаходзіўся ў 27-й брыгадзе імя В. І. Ча[illegible] [illegible] харвіцкі р-н, дзе да студзеня 1944 г дзейнічаў асобна, потым у складзе [illegible] імя В. М. [illegible] [illegible] лосілі нямецка-фашысцкім акупантам удары на ўчастках чыгунак Баранавічы — Лунінец, Баранавічы — Слуцк, на шашэйных і грунтавых дарогах. З верасня 1943 г. да 10.7.1944 г. яны правялі больш за 90 баявых аперацый. 29.5.1944 г. на ўчастку чыгункі Баранавічы — Лунінец пусцілі пад адхон паравоз і 15 вагонаў з жывой сілай праціўніка, разбурылі 150 м чыгуначнага палатна, знішчылі семафор. Рух паяздоў быў спынены на 38 гадзін. [illegible] нае насельніцтва ад загубы і вывазу [illegible] Германію. 107 [illegible] (17 [illegible]) [illegible] чыўся з Чырвонай Арміяй.

Мемарыяльная дошка [illegible] атрада імя С. Г. Лазо ўстаноўлена ў 1960 г. *Г. І. Дулеба*

1088. *Сядзібны дом.*



1088. *[illegible]*

в. Гарадзішча, Ганчароўскі сельсавет

1086. ЗЕМЛЯНОЕ ЎМАЦАВАННЕ (археал.). Мясцовая назва Горад. На левым беразе р. Свідроўка — прытока р. Шчара, за 0,25 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, каля моста.

Круглая ў плане пляцоўка дыяметрам 30 м з усіх бакоў абнесена валам і ровам. Вышыня вала 4 м, глыбіня рова 2 м. З паўночнага боку вал не захаваўся. Культурны пласт на пляцоўцы прасочваецца вельмі слаба. Больш выразны ён на вяршыні і ў разразах вала (вугольле і рэшткі ганчарнай керамікі). Выявіў у 1969 г. В. [illegible] М. М. Чарняўскі. [illegible] та сярэдневечча.

Матэрыялы абследавання [illegible] у Інстытуце [illegible]

М. М. Чарняўскі

в. Грушаўка, Ляцкі сельсавет

1087. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Ва ўсходняй частцы вёскі. Пахаваны 40 воінаў, якія заг[illegible]



1088. *Сядзібны дом. План.*



1088. *Сядзіба. Капліца. План*

нулі ў 1941 і 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1088. СЯДЗІБА (архіт.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Сфарміравалася ў 19 — пачатку 20 ст. Тэрыторыя сядзібы каля 14 га. Ансамбль уключае жылы дом, 2 бакавыя флігелі, бровар, капліцу і іншыя гаспадарчыя пабудовы, невялікі парк і пладовы сад з вадаёмам. Кампазіцыйнай воссю з'яўляецца цэнтральная алея, якой падпарадкавана размяшчэнне ўсіх пабудоў.

Сядзібны драўляны дом сіметрычнай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі пабудаваны на рубяжы 19—20 стагоддзяў. Цэнтральны ўваход вырашаны ў выглядзе вынасной тэрасы з балконам на разных слупах. Унутры прамавугольнага ў плане дома — вялікая зала, абапал якой размешчаны анфілады жылых памяшканняў. Над залай — мансардавы паверх, на які вядзе лесвіца ў левым крыле дома. Сцены ўнутры атынкаваныя і часткова размаляваныя. Будынак мае мураваныя склепы, высокі цокаль і крывалінейныя ў плане бакавыя сходы на галоўным фасадзе.

У баку ад сядзібнага комплексу, па ўзлеску, знаходзіцца капліца-пахавальня. Пабудавана ў стылі неаготыкі ў пачатку 20 ст. Будынак прамавугольны ў плане з трохграннай алтарнай часткай і высокім шчытом на галоўным фасадзе. Праёмы ў выглядзе стральчатых арак. Унутры — нервюрныя скляпенні. Пры ўваходзе ў капліцу размешчаны сходы ў склеп.

1088. *Сядзіба. Стайня*

Сядзіба — прыклад развітага сядзібна-паркавага ансамбля, помнік эклектычнай архітэктуры. *А. М. Кулагін.*



1089. *Курганны могільнік. План*

в. Гулічы, Жарабковіцкі сельсавет

1089. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Мясцовая назва Капцы. Размешчаны за 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, недалёка ад хутара Міхалькі. Выявіў у 1969 г. В. Р. Супрун, абследаваў у 1970 г. М. М. Чарняўскі. 19 круглых у плане насыпаў, часткова пашкоджаны. Дыяметр 5—10 м, вышыня 1,5 м. Раскопкі не праводзіліся.

в. Дарава, Федзюкоўскі сельсавет

1090. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі, каля шашы Ляхавічы — Баранавічы. Пахаваны 35 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Жарабковічы, цэнтр сельсавета

1091. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 14 воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

1092. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 14 жыхароў вёскі, расстраляных летам 1941 г. гітлераўцамі. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Завінне, Малагарадзішчанскі сельсавет

1093. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Па-

1090. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

1091. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

хаваны 245 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод іх — воіны 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі, што ў пачатку ліпеня 1944 г. вызвалялі раён. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Залужжа,
Крывошынскі сельсавет

1094. МЕСЦА ДЫСЛАКАЦЫІ 20-й ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ В. С. ГРЫЗАДУБАВАЙ (гіст.). За 2 км на захад ад вёскі ў лесе ў 1943—44 гг. дыслацыравалася 20-я партызанская брыгада імя В. С. Грызадубавай Баранавіцкага злучэння.

4.5.1943 г. Беларускі штаб партызанскага руху дэсантаваў у Любанскі р-н Мінскай вобл. ініцыятыўную групу (8 чалавек) на чале з маёрам Ц. М. Сухарукавым. З гэтай групы і 103 чалавек, вылучаных Мінскім і Палескім партызанскімі злучэннямі, Ц. М. Сухарукаў стварыў атрад. На яго базе ў ліпені 1943 г. створаны атрады імя А. М. Матросава, імя М. Ф. Сільніцкага, імя В. П. Чкалава, імя Ф. С. Чарнова, «За Радзіму», аб'яднаныя ў брыгаду імя В. С. Грызадубавай (са студзеня 1944 г.— 20-я партызанская брыгада імя В. С. Грызадубавай). У верасні 1943 г. яна прыбыла на месца дыслакацыі ў Быценскім р-не Баранавіцкай вобл. У кастрычніку 1943 г. налічвала 5 атрадаў (каля 300 чалавек). На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй 12.7.1944 г. яднала 5 атрадаў (762 партызаны). Камандзіры брыгады Ц. М. Сухарукаў (ліпень — верасень 1943 г.), С. С. Жарыкаў (выконваючы абавязкі, верасень — кастрычнік 1943 г.), В. З. Іваноў (кастрычнік 1943 г.— ліпень 1944 г.); камісары М. І. Засмужац (выконваючы абавязкі, жнівень — кастрычнік 1943 г.), В. З. Іваноў (кастрычнік 1943 г.), Р. Дз. Румянцаў (лістапад 1943 г.— май 1944 г.), І. Я. Пархоўчанка (май — ліпень 1944 г.).

20-я партызанская брыгада імя В. С. Грызадубавай дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Быценскага, Ляхавіцкага і суседніх з імі раёнаў. Яна праводзіла дыверсіі на чыгуначных лініях ад Баранавіч на Брэст, Мінск, Лунінец, на шашэйных і грунтавых дарогах. Партызаны па заданню камандавання Чырвонай Арміі займаліся разведкай, правялі шэраг адкрытых і засадных баёў, удзельнічалі ў аперацыі «Рэйкавая вайна». Яны пусцілі пад адхон 30 чыгуначных эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, збілі 4 самалёты, разбурылі больш за 20 мастоў на шашэйных і грунтавых дарогах, чыгунках, падарвалі больш як 1670 рэек, знішчылі 27 аўтамашын. Пасля злучэння з Чырвонай Арміяй партызаны ўдзельнічалі ў вызваленні Быценскага р-на.

У 1967 г. на месцы дыслакацыі брыгады адкрыта мемарыяльная дошка.

Г. І. Дулеба.

1095. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 60 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

1096. ПОМНІК ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. У гонар 20-й партызанскай брыгады імя В. С. Грызадубавай, якая ў 1943—44 гг. базіравалася ў лесе за 2 км на захад ад в. Залужжа, у 1975 г. пастаўлена стэла (гл. таксама артыкул № 1094 «Месца дыслакацыі 20-й партызанскай брыгады імя В. С. Грызадубавай»).

в. Зарытава,
Жарабковіцкі сельсавет

1097. МАГІЛА КУХАРЧЫКА Майсея Амбросавіча (гіст.). На старых могілках.

Герой Грамадзянскай вайны М. А. Кухарчык нарадзіўся ў 1890 г. Скончыў Пецярбургскую школу юнгаў. Служыў на Балтыйскім флоце. У 1917 г. Кухарчык быў унтэр-афіцэрам лінкора «Петрапаўлаўск». Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. ўспрыняў з бальшавіцкіх пазіцый, стаў барацьбітом за сацыялістычную рэвалюцыю.

У Грамадзянскую вайну накіраваны на Брэстчыну для арганізацыі падпольнай і партыз. барацьбы з ворагам. У 1919 г. стварыў і ўзначаліў партызанскі атрад (140 байцоў). Атрад дзейнічаў пад Ляхавічамі. Партызаны праводзілі дыверсіі, зрывалі мерапрыемствы акупацыйных улад. Буйной аперацыяй, якую ў маі 1919 г. паспяхова правялі партызаны, быў налёт на штаб польскага кавалерыйскага палка ў в. Фляр'янава Навасёлкаўскага сельсавета 5.6.1919 г. конныя разведчыкі, сярод якіх знаходзіўся М. А. Кухарчык, натрапілі на засаду. Варожая куля абарвала жыццё мужнага барацьбіта за Савецкую ўладу.

У 1965 г. на магіле М. А. Кухарчыка пастаўлены абеліск.

Літ.: В памяти народной. Мн., 1969.
А. С. Барысевіч.

в. Канюхі, Жарабковіцкі сельсавет

1098. МАГІЛА КІЧЫЛЫ Марціна Юльянавіча (гіст.). На могілках. Удзельнік Грамадзянскай вайны М. Ю. Кічыла 4.5.1919 г. расстраляны белапольскімі акупантамі. На магіле пастаўлены абеліск.

в. Краглі, Навасёлкаўскі сельсавет

1099. РАДЗІМА РАВІНСКАГА Платона Федаравіча (гіст.). П. Ф. Равінскі — актыўны ўдзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады на Беларусі, партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР.

Нарадзіўся 23.11.1892 г. ў сялянскай сям'і. У 1909 г. ў пошуках работы выехаў у ЗША. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. ў Расіі. Член КПСС з 1917 г. У час акупацыі Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі з красавіка да лістапада 1918 г. старшыня Бабруйскага падпольнага камітэта РКП(б), одначасова з жніўня 1918 г. член Краявога камітэта камуністычных арганізацый Беларусі і Літвы. Пасля выгнання нямецкіх акупантаў узначальваў Бабруйскія павятовыя рэўком, выканкам Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У час польскай інтэрвенцыі начальнік аддзела Рэўваенсавета 16-й арміі. У 1920 г. старшыня Барысаўскага павятовага рэўкома, Бабруйскага павятовага камітэта партыі. З канца 1921 г. ў Наркамземе БССР: начальнік упраўлення і член калегіі. У 1924—26 гг. на партыйнай рабоце ў Бабруйску. Скончыў Камуністычны універсітэт імя Я. М. Свярдлова ў Маскве (1930 г.), працаваў загадчыкам аддзела ЦКК — НК РСІ БССР. У 1933—35 гг. сакратар Магілёўскага гаркома і райкома КП(б)Б. У 1936—37 гг. у Наркамаце лясной прамысловасці Беларусі. Член ЦКК і Прэзідыума ЦКК у 1933—34 гг., член ЦК КП(б)Б у 1934—37 гг. Член ЦВК БССР у 1920—21 гг., 1931—37 гг. Быў дэлегатам VII Усесаюзнага з'езда Саветаў (1935 г.). П. Ф. Равінскі памёр 19.11.1940.

Г. І. Дулеба.

в. Крывошын, цэнтр сельсавета

1100. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 57 савецкіх воінаў і 2 партызаны, якія загінулі ў 1941—44 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

1101. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 2 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны 6 жыхароў в. Залужжа Ляхавіцкага р-на, якіх у маі 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія акупан-

ры. На магіле ў 1978 г. ўстаноўлена пліта.

1102. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР РЭЎКОМА (гіст.). Устаноўлена ў 1980 г. на доме, дзе працаваў рэўком. Цяпер у будынку знаходзіцца пункт ка абласной бальніцы.

Крывошынскі валасны рэвалюцыйны камітэт (рэўком) дзейнічаў (з перапынкам) з лістапада 1918 г. да верасня 1920 г. Ён ажыццяўляў дэкрэты Савецкай улады, устанаўліваў рэвалюцыйны парадак, змагаўся з контррэвалюцыйнымі элементамі на тэрыторыі Крывошынскай воласці (гл. таксама артыкул № 1103 «Месца стварэння рэўкома»).

1103. МЕСЦА СТВАРЭННЯ РЭЎКОМА (гіст.). Дом у цэнтры вёскі. Цяпер у будынку размешчаны дзіцячы сад.

Крывошынскі валасны рэўком быў створаны ў лістападзе 1918 г. Дзейнічаў (з перапынкам) да верасня 1920 г. На доме, дзе ён быў арганізаваны, у 1980 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка (гл. таксама артыкул 1102 «Мемарыяльная дошка ў гонар рэўкома»).

1104. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі, на плошчы. Пабудавана ў 1670 г. з цэглы як касцёл езуітаў, у 1863 г. перароблены на праваслаўную царкву. У 1869 г. часткова рэканструявана: у цэнтры сярэдняга нефа ўзведзены купал, на галоўным фасадзе вежа-званіца, заменена дэкаратыўная аздоба фасада.

трохнефавая васьміслу... з паўкруглай апсідай, роўнай па вышыні з цэнтральным нефам. Галоўны фасад вылучаюць 2 двух'ярусныя вежы, завершаныя трохвугольнымі франтонамі. Паміж вежамі — высокая васьміграння званіца з шатровым пакрыццём і галоўкай. У цэнтры фасада вылучаецца паўцыркульны франтон. У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі дамінуе купал на цыліндрычным барабане, які абапіраецца на чацверык. У інтэр'еры сярэдні неф, у 2 разы шырэйшы за бакавыя, пераходзіць у апсіду. Бакавыя нефы маюць ... крыжовыя. Пры ўваходзе — хоры, якія апіраюцца на 2 слупы. У інтэр'еры захаваліся дэкаратыўная аздоба (пілястры, прафіляваныя цягі, ляпныя дэталі) і творы выяўленчага мастацтва 17—18 стагоддзяў.

Царква — помнік архітэктуры барока з элементамі псеўдарускага стылю. *А. Я. Міцкевіч.*

в. Куршынавічы, цэнтр сельсавета

1105. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,4 км ад вёскі, за чыгуначным пераездам, справа ад дарогі на в. Гайнінец, у лесе. 26 круглых насыпаў дыяметрам ад 4 да 10 м, вышынёй 0,8—1,3 м. Каля асновы курганоў праходзіць канаўкі глыбінёй 0,2 м. Выяўлены абследаваў у 1969 г. В. Р. Супрун, абследаваў у 1981 г. А. М. Мядзведзеў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Лісік, Крывошынскі сельсавет

1106. МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 2 партызаны і 9 жыхароў вёскі, якія былі расстраляны ў 1941—1944 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Мінічы, Ганчароўскі сельсавет

1107. КУРГАН СЛАВЫ (гіст.). За 2 км на поўнач ад вёскі, у бары, каля шашы Брэст — Бабруйск.

Насыпаны ў 1967 г. ва ўшанаванне памяці савецкіх воінаў 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі 3-га гвардзейскага стралковага корпуса 28-й арміі 1-га Беларускага фронту і партызан, якія загінулі ў баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. На вяршыні Кургана пастаўлены абеліск з памятным надпісам на мармуровай дошцы. Пляцоўка вакол Кургана абнесена ланцугом на слупах. На стромкім схіле Кургана пракладзена бетонная лесвіца. *М. А. Б...*

в. Мядзведзічы, Ганчароўскі сельсавет

1108. ПЕТРАПАЎЛАЎСКІ КАСЦЁЛ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудаваны з цэглы ў 1908 г. Аднавежавая трохнефавая базіліка. Цэнтральны неф падоўжаны пяціграннай алтарнай часткай. З 2 бакоў да яе прылягаюць рызніцы. Галоўны фасад мае ступеньчатую ярусную будову. Уступы па баках фасада агладжаны валютамі. Нефы перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі, упрыгожанымі дэкаратыўным арнаментам. Прыклад эклектычнай архітэктуры.

в. Набярэжная, Ганчароўскі сельсавет

1109. ГАРАДЗІШЧА (археал.). На паўночнай ускраіне вёскі, на мысе правага берага р. Шчара. Пляцоўка 54×27 м, авальнай формы. Прасочваецца вал вышынёй 1,5 м і роў глыбінёй 0,5 м. Вал разараны ў 3 месцах уваходамі, 2 уваходы з боку Шчары і 1 з боку поля. Частка пляцоўкі пашкоджана акопамі. Абарончыя збудаванні прымыкаюць да самага абрыву і ўзнімаюцца над Шчарай на вышыню каля 10 м. Выявіў і абследаваў у 1969 г. В. Р. Супрун, абследаваў у 1981 г. А. М. Мядзведзеў. Пры зачыстцы схілаў знойдзены фрагменты ганчарскай керамікі. Адносіцца да раннефеадальнага перыяду (10—13 стагоддзі).

Матэрыялы абследавання зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Штыхов Г. В. Археологическая карта Белоруссии. В. 2.— Мн., 1971.

А. М. Мядзведзеў.

1107. *Курган Славы*



1104. *Пакроўская царква. План*

1104. *Пакроўская царква*

1111. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

в. Навасёлкі, Крывошынскі сельсавет

1110. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,25 км на захад ад вёскі, злева ад лясной дарогі, што перасякае вузкакалейку. Выявіў у 1965 г. П. Ф. Лысенка, абследаваў у 1970 г. М. М. Чарняўскі. У групе было 6 курганоў, выцягнутых у лінію на адлегласці 10—20 м адзін ад аднаго. Захаваліся 2 паўсферычныя, задзірванелыя курганы (вышыня 1,5 м, дыяметр 10 м). Раскопкі не праводзіліся.

в. Навасёлкі, цэнтр сельсавета

1111. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 58 воінаў, якія загінулі ў 1944 г. Сярод іх воіны 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

1112. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 64 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Нача, цэнтр сельсавета

1113. СЯДЗІБА (архіт.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1810—15 гг. Ансамбль сядзібы мае рэгулярную планіроўку з мураваным палацам ў цэнтры, абапал якога размешчаны гаспадарчыя пабудовы. За палацам разбіты пейзажны парк, злучаны з садам і з захаду абмежаваны вадаёмам.

Прамавугольны ў плане аднапавярховы палац мае развіты цокальны паверх і накрыты двухсхільным дахам. Пазней да тарцоў будынка прыбудаваны мураваныя тэрасы. Цэнтр галоўнага фасада вылучаны шасцікалонным порцікам з драўляным франтонам. На дваровым фасадзе порціку адпавядае плоскі рызаліт. Прамавугольныя аконныя праёмы ў цэнтры маюць стральчатыя абрамленні, а ў бакавых частках — сандрыкі.

Планіроўка паверха анфіладная (цяпер зменена). У цэнтральнай частцы размешчаны вестыбюль і парадная зала, над якімі знаходзіцца мансардавы паверх. Цокальны паверх, дзе размяшчаліся службовыя пакоі, мае калідорную планіроўку з самастойнымі ўваходамі пад тэрасамі.

Сядзіба — помнік архітэктуры позняга класіцызму з элементамі псеўдаготыкі.

А. М. Кулагін



1112. *Помнік землякам*

в. Падлессе, цэнтр сельсавета

1114. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля клуба. Пахаваны 139 воінаў, што загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941 і 1944 гг. У іх ліку — воіны 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі і 19-й механізаванай брыгады,

1108. *Петрапаўлаўскі касцёл*



1108. *Петрапаўлаўскі касцёл. План*

1108. *Петрапаўлаўскі касцёл. Цэнтральны алтар*



1113. *Сядзібны дом. Галоўны фасад*

...якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні тэрыторыі Ляхавіцкага р-на. У 19..7 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

1115. ПОМНІК ЛЕНІНУ [illegible] (гіст.). Каля клуба. Скульптура У. І. Леніна пастаўлена ў 1966 г.

1116. СВЯТАДУХАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 18 ст. з дрэва.



1113. *Сядзібны дом. План.*

1113. *Сядзібны дом. Дваровы фасад*

Будынак складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і выцягнутай пяцігранай апсіды, да якой з падоўжных бакоў прыбудаваны невялікія рызніцы. Усе аб'ёмы абдзяліны двухсхільным гонтавым дахам. Галоўны заходні фасад вырашаны ў выглядзе шасцікалоннага порціка, завершанага трапецападобным франтонам. Порцік і апсіда завершаны гранёнымі фігурнымі вежачкамі. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі [illegible] гамі і прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. [illegible] па галоўным фасадзе мае паўцыркульнае [illegible] накрыццё ... адлечнае з падшыўной столлю. Над уваходам размешчаны хоры, упрыгожаныя балюстрадай.

Царква — прыклад традыцыйнай драўлянай культавай пабудовы, у архітэктуры якой выкарыстаны элементы класіцызму. *Т. В. Габрусь.*

в. Падсаколле, Малагарадзішчанскі сельсавет

1117. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 29 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. Сярод пахаваных — воіны 54-й гвардзейскай [illegible] 28-й арміі [illegible]

1113. *Сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — сядзібны дом; 2 — службовы флігель; 3 — [illegible]*



1113. *Сядзіба. Алея ў парку.*

1116. Свята[illegible]ая царква.



1116. Святадухаўская царква. План.

1120. Парк «Савейкі». Будынак санаторыя.

[illegible]гінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні Падсынолля. У 1961 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

п. Паўлюкоўшчына,
Цацкі сельсавет

1118. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны 20 савецкіх грамадзян, загубленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1974 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Рагачы, Востраўскі сельсавет

1119. МАГІЛА КУЧАРЭНКІ А. А. (гіст.). На могілках. Савецкі лётчык А. А. Кучарэнка загінуў 23.6.1941 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1947 г. на магіле пастаўлены абеліск.



1118. Помнік на магіле ахвяр фашызму.

в. Савейкі, Куршынавіцкі сельсавет

1120. ПАРК «САВЕЙКІ» (архіт.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Закладзены ў 18[illegible] г., плошча каля 10 га. Належыць санаторыю «Савейкі».

Парк пейзажнага тыпу высаджаны на 2 тэрасах. Цэнтр паркавай кампазіцыі вылучаны жывым конусам са[illegible] [illegible] фасадам [illegible] парт[illegible] [illegible] род. Перад паўночна-заходнім фасадам адкрываецца перспектыва на цэнтральную паляну парку, вакол якой густы масіў дрэў і сістэма вадаёмаў. Вялікія і малыя вадаёмы злучаны пратокамі, цераз якія пабудаваны арачныя масткі з бутавага каменю. Уздоўж вадаёмаў і кальца перыметральных пасадак — прагулачныя маршруты. У стварэнні паркавых кур[illegible] выкарыстана каля 2[illegible] в[illegible] дрэў і кустоў: е[illegible], ясе[illegible] звычайныя [illegible] [illegible]паласты, вярба белая, арэх шэры, каштан конскі, лістоўніца еўрапейская, бэз венгерскі, бузіна чорная, акацыя жоўтая і [illegible]

[illegible] [illegible] [illegible] паркавага мастацтва.

Літ.: Антипов В. П. Парки Белоруссии.— Мн., 1975. *А. М. Кулагін*

1120. Парк «Савейкі». Сажалка



1120. *Парк «Савейкі». Схема планіроўкі*

1121. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На тэрыторыі санаторыя «Савейкі». Скульптура У. І. Ленiна ўстаноўлена ў 1957 г.

в. Саватычы, Жарабковіцкі сельсавет

1122. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 25 аднавяскоўцаў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Свяціца, Крывошынскі сельсавет

1123. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 10 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

1124. ПОМНІК У ГОНАР 19-й ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ В. М. МОЛАТАВА (гіст.). У цэнтры вёскі. 19-я партызанская брыгада імя В. М. Молатава створана ў студзені 1944 г. на базе атрадаў імя С. Г. Лазо, імя Г. К. Жукава і імя М. І. Кутузава Баранавіцкага партызанскага злучэння. Вяла барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі Ляхавіцкага р-на. З лютага да ліпеня 1944 г. базіравалася ў лесе каля в. Свяціца. Камандзіры В. І. Каробкін (студзень — май 1944 г.), Я. П. Лупэнка (май — ліпень 1944 г.), камісар С. К. Дзесюкевіч. Партызаны праводзілі баявыя аперацыі на варожых камунікацыях, галоўным чынам на ўчастках чыгункі Баранавічы — Івацэвічы, Баранавічы — Лунінец, на шашэйных і грунтавых дарогах. Толькі з красавіка да ліпеня 1944 г. знішчылі і пашкодзілі больш за 30 аўтамашын, пусцілі пад адхон 14 чыгуначных эшалонаў праціўніка, правялі шэраг адкрытых і засадных баёў з акупантамі. У час аперацыі «Рэйкавая вайна» 20.6.1944 г. падарвалі больш за 400 рэек. 10.7.1944 г. брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі. На дзень злучэння ў ёй былі 3 атрады (560 партызан).

У 1975 г. ў гонар 19-й партызанскай брыгады імя В. М. Молатава пастаўлена стэла. *Г. І. Ду...*

1120. *Парк «Савейкі». Алея*

в. Туркі, Федзюкоўскі сельсавет

1125. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Ва ўсходняй частцы вёскі. Пахаваны 17 воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1944 гг. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Тухавічы, Востраўскі сельсавет

1126. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Улазавічы, Падлескі сельсавет

1127. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Урадканная, Падгасельскі сельсавет

1128. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 40 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Яцкаўшчына, Жарабковіцкі сельсавет

1129. КУРГАН (археал.). За 1,5 км на паўночны захад ад вёскі, на дарозе на г. Клецк. Вышыня 2 м, ... м. Выявіў у 1965 г. П. Ф. Лысенка, абследаваў у 1970 г. М. М. Чарняўскі. Раскопкі не праводзіліся.



МАЛАРЫЦКІ
РАЁН
Чарняны
Гарадзечна
Мачевічы
Вялікарыта
Лукава
Макраны
МАЛАРЫТА
Ляхаўцы
Хаціслаў
Радзеж
Луцкая
Олтуш
Арэхава
Помнікі сацыялістычнага будаўніцтва
Культавая архітэктура
Стаянкі, паселішчы, гарадзішчы
Центры рамёстваў

XVI. МАЛАРЫТА

Горад, цэнтр раёна. За 52 км на паўднёвы ўсход ад Брэста. Чыгуначная станцыя на лініі Брэст — Ковель.

Упамінаецца ў 1566 г. ў рэвізіі Берасцейскага старостава як каралеўская вёска Рыта Малая Палескай воласці, была ў складзе Берасцейскага павета і ваяводства Вялікага княства Літоўскага.

У 1795 г. у выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай Маларыта ўвайшла ў склад Расіі, сяло ў Брэсцкім павеце Слонімскай, з 1797 г. Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У 1897 г. тут было 1275 жыхароў, 203 двары, сельскае народнае вучылішча. Працавалі 2 лесапільні (у 1914 г.— 41 рабочы), шпалапрапітны завод (20 рабочых), цагельня (4 рабочыя), вятрак.

У 1-ю сусветную вайну Маларыта была акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1921—39 гг. у складзе буржуазнай Польшчы, цэнтр гміны Брэсцкага павета Палескага ваяводства. Тут дзейнічаў падпольны райком КПЗБ, у 1934 г. адбылася забастоўка рабочых лесапільняў. Пасля ўз'яднання ў 1939 г. Заходняй Беларусі з БССР Маларыта ў складзе Брэсцкай вобл. З 15.1.1940 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны з 22 да 27.6.1941 г. Маларыту гераічна абаранялі часці 75-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра С. І. Нядвігіна, асобныя падраздзяленні дывізіі вялі баі ў раёне Маларыты да пачатку ліпеня 1941 г. У канцы чэрвеня 1941 г. Маларыта акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія знішчылі ў гарадскім пасёлку 1200 жыхароў. У раёне дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (з 2.10.1943 г. да 25.7.1944 г.) і ЛКСМБ (з 28.11.1943 г. да 20.7.1944 г.), якія ўзначальвалі барацьбу з акупантамі. Маларыта вызвалена 20.7.1944 г. часцямі 70-й арміі (камандуючы генерал-палкоўнік В. С. Папоў) 1-га Беларускага фронту сумесна з партызанамі брыгады імя У. І. Леніна (камандзір В. В. Каткоў). З 25.12.1962 г. да 6.1.1965 г. г. п. Маларыта ў складзе Брэсцкага р-на. З 1970 г. горад.

Першы пасляваенны генеральны план Маларыты, распрацаваны ў 1959 г. ў Брэсцкіх абласных праектных майстэрнях, упарадкаваў квартальную сістэму планіроўкі і намеціў капітальную забудову цэнтральнай часткі. Паводле новага генеральнага плана 1974 г., распрацаванага ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва, рост горада вызначаны ў паўночна-заходнім напрамку [illegible] чыгункі.

На перакрыжаванні асноўных магістралей вуліц Леніна і Савецкай складваецца грамадска-адміністрацыйны цэнтр, ансамбль якога фармуюць будынкі Дома Саветаў, Дома культуры, універмага, рэстарана, кінатэатра, пошты, тэлеграфа, кааператыўнага вучылішча. Панараму забудовы ўзбагачаюць шматпавярховыя жылыя дамы.

Асноўныя прадпрыемствы: агароднінасушыльны завод, філіял Брэсцкага малочнага камбіната, хлебазавод. Працуюць раённае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі, камбінат бытавога абслугоўвання.

Зона адпачынку — на беразе р. Маларыта, дзе ў 1970-я гады закладзены парк.

У горадзе дзейнічаюць сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, кааператыўнае вучылішча, 2 сярэднія, дзіцяча-юнацкая спартыўная і музычная школы, Дом культуры, 2 бібліятэкі, 4 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, кінатэатр, Дом піянераў і школьнікаў, бальніца. Выдаецца газета «Сельскае жыццё».

Устаноўлены помнікі на брацкай магіле танкістаў, што загінулі пры вызваленні Заходняй Беларусі ў 1939 г., на магіле ахвяр фашызму, на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

XVI. *Вуліца Савецкая*

XVI. *Цэнтральная плошча*

XVI. *Будынак універмага*

XXI. [illegible]

Літ.: Богданович А. В., Сидоров [illegible] Документы [illegible] Министерства юстиции. М., 18[illegible] [illegible] 156 [illegible] 7. Санталов Л. М. [illegible] М., 19[illegible].

[illegible] Алісейчык, Э. М. Савіцкі.

1130. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ РАБОТНІКАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 8 чалавек — работнікаў партыйных, савецкіх, гаспадарчых устаноў Маларыты і [illegible] № 19, [illegible] на магіле ўстаноўлена пліта.

1131. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст., маст.). На паўднёва-заходняй ускраіне горада [illegible] Пахаваны [illegible] брыгады імя У. І. Леніна, якія загінулі ў баях за вызваленне г. Маларыта і [illegible] ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У ходзе Люблінска-Брэсцкай аперацыі часці 70-й арміі (камандуючы генерал-палкоўнік В. С. Папоў) 1-га Беларускага фронту разграмілі ў раёне Маларыты моцную групоўку праціўніка і сумесна з партызанамі брыгады імя У. І. Леніна 20.7.1944 г. вызвалілі Маларыту ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены помнік (скульпт. Д. Фішар, арх. В. Аса[illegible]коўскі; бетон; вышыня скульптурнай групы 3 м, пастамента 4,4 м). Помнік — скульптурная кампазіцыя на вертыкальным высокім пастаменце. Фігуры 2 воінаў і жанчыны з суровымі тварамі, са зброяй у руках — абагульнены вобраз абаронцаў [illegible] та прызмавая невысокая трапецападобная стэла, на якой прозвішчы (вядомыя) пахаваных савецкіх воінаў і партызан. Помнік увекавечвае таксама [illegible] Маларыты [illegible] фашысцкіх [illegible] [illegible].

Літ.: Бур[illegible] 3 вад. — Мн., 19[illegible].

М. М. Казлоўскія, Л. Г. [illegible].

1132. БРАЦКАЯ МАГІЛА ТАНКІСТАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 3 савецкія танкісты, якія загінулі ў ба[illegible] 18.9.1939 г. пры вызваленні Заходняй Беларусі. Сярод іх — камандзір 411-га асобнага танкавага батальёна 52-й стралковай дывізіі Цімафей Гаўрылавіч Песочнік. Яго імем названа вуліца ў Маларыце. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: В [illegible] Мн., 19[illegible].

1133. КУРГАН СЛАВЫ * (гіст.). [illegible] км на паўднёвы захад ад горада за ўрочышчы Мелавая Гара.

Напярэдадні Айчыннай вайны ў Маларыцкім р-не дыслацыравалася 75-я стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр С. І. Няздвецкі) 4-й арміі. 22.6.1941 г. нямецка-фашысцкія часці, прарваўшы абарончы рубеж, выйшлі на подступы да Маларыты. Каля в. Збуражж баявую пазіцыю заняў 115-ы стралковы полк. Каля Мелавай Гары бой з гітлераўцамі вёў 2[illegible]-ы артылерыйскі полк, які расстрэльваў прамой наводкай варожыя танкі. У ноч на 23 чэрвеня воіны дывізіі занялі абарону па паўднёвай і заходняй ускраінах Маларыты. 23 чэрвеня, калі наступленне ворага ўзмацнілася, 115-ы стралковы полк прыкрываў адыход дывізіі. Часці дывізіі ўтрымлівалі свае пазіцыі каля вёсак Збуражж і Гарохавічы. 24 чэрвеня нямецкія войскі акружылі дывізію. Аднак частка іх у надзвычай цяжкіх умовах вяла баі ў раёне вёсак Ляхаўцы

1131. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

Маларыты. 27 чэрвеня вялоўныя сілы [illegible] прарвалі варожае кальцо [illegible] вышлі ў напрамку воз. Лука. Падраздзяленні, якія прыкрывалі [illegible] змагаліся ў раёне Маларыты да пачатку [illegible], потым [illegible] выйшлі [illegible] з часцямі Чырвонай Арміі.

У 1970 г. на магіле 75 воінаў 75-й стралковай дывізіі насыпаны Курган. У яго стромкі схіл уразана мазаічнае панно з выявай рукі, што сціскае аўтамат. Мазаіка выканана з каляровай цэглы. Перад Курганам запалены Вечны агонь.

[illegible] 35. успамінаў [illegible] 77. Сандалов Л. М. [illegible] направлении. — М., 1971. [illegible] *М. М. Сямёнаў.*

1134. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У двары канторы саўгаса «Маларыцкі». Тут у 1941—44 гг. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 500 жыхароў г. п. Маларыта і Маларыцкага р-на. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1135. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АЛЕСІКУ Аляксею Навумавічу (гіст.). Вул. Савецкая, 48.

Актыўны ўдзельнік барацьбы за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР А. Н. Алесік нарадзіўся ў в. Мікольскае Олтушскага сельсавета ў 1915 г. У 1940—41 гг. працаваў участковым упаўнаважаным Маларыцкага раённага аддзялення міліцыі. Загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 23.1.1942 г. каля в. Хлуднева Калужскай вобл. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

У 1980 г. на ўшанаванне яго памяці на будынку раённага аддзела ўнутраных спраў устаноўлена мемарыяльная дошка.

1136. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БУГАЁВАЙ Марыі Іосіфаўне (гіст.). Вул. Савецкая, 50.

М. І. Бугаева нарадзілася ў 1909 г. у в. Буды Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Настаўніцай у Гомельскай і Віцебскай абласцях. У 1939 г. скончыла Віцебскі педінстытут, працавала завучам сярэдняй школы Маларыты. У Вялікую Айчынную вайну М. І. Бугаева — адзін з арганізатараў Маларыцкай падпольнай антыфашысцкай групы, якая дзейнічала з жніўня 1941 г. Арыштавана гестапа ў студзені 1943 г. Закатавана ў жніўні 1943 г.

У 1978 г. на ўшанаванне яе памяці на будынку сярэдняй школы № 1 устаноўлена мемарыяльная дошка.

В. М. Б.

1137. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЙНЫМ І САВЕЦКІМ РАБОТНІКАМ (гіст.). Вул. Чырвонаармейская, 3.

У 1944—50 гг. у барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады загінулі 11 работнікаў партыйных, савецкіх, гаспадарчых устаноў, супрацоўнікаў міліцыі і актывістаў Маларыцкага р-на. У 1968 г. на ўшанаванне іх памяці на будынку райкома КПБ устаноўлена мемарыяльная дошка.

1138. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА САЎЧУКУ Канстанціну Фаміччу (гіст.). Вул. Чырвонаармейская, [illegible]

К. Ф. Саўчук нарадзіўся ў 1893 г. у г. Біла-Падляска (ПНР) у сялянскай сям'і. Удзельнік [illegible] рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. За рэвалюцыйную дзейнасць супраць буржуазна-памешчыцкага ладу ў Польшчы ў 1934 быў зняволены ў турму. У Вялікую Айчынную вайну з 1944 г. у Чырвонай Арміі, на фронце быў [illegible] паранены, [illegible] Маларыцкай цэнтральнай [illegible]

1133. *Кур[illegible]*

1134. *Помнік на [illegible] ахвяр фашы[illegible]*

1950 г. забіты ворагамі Савецкай улады на хутары ў в. Сушытніца Хаціславіцкага сельсавета.

У 1978 г. на будынку Маларыцкай цэнтральнай раённай дзяржаўнай [illegible] на ўшанаванне яго памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

В. М. Бажкова.

1139. МЕСЦА БОЮ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ (гіст.). У раёне чыгуначнай станцыі. У час савецка-польскай вайны 7.9.1920 г. у баі з часцямі польскіх войск [illegible] загінулі 10 чырвонаармейцаў бронепоезда № 56 «Камунар», у т. л. камандзір бронепоезда Вальдэмар Бонтус-Аванец. На ўшанаванне іх памяці ў 1981 г. на будынку вакзала ўстаноўлены мемарыяльныя [illegible], а [illegible] вуліц горада названа вул. Камунараў.

1140. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (арх.). Пабудавана ў 2-й палове 19 ст. [illegible]

Каменны храм падоўжана-восевай кампазіцыі складаецца з асноўнага чацверыка, уваходнага ў плане зруба, пяціграннай апсіды і бабінца. Над асноўным аб'ёмам узвышаецца васьмігранны [illegible] светлавы [illegible] барабан, завершаны купалам. Над бабінцам — двух'ярусная шатровая званіца. Уваходы ганак на калонах [illegible] тарычна [illegible] ашалёўваны. Вокны аздоблены сандрыкамі.

Царква [illegible] дойлідства.

1141. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Піянерскай каля вучэбнага корпуса [illegible] прафесійна-тэхнічнага вучылішча ме[illegible]

ганізацыі сельскай гаспадаркі № 11. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1966 г.

в. Антонава, Вялікарыцкі сельсавет

1142. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1,5 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны 47 мірных жыхароў, расстраляных у 1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Арлянка, Гвозніцкі сельсавет

1143. МЕСЦА БОЮ ПАРТЫЗАН (гіст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Тут 23.9.1943 г. ў баі супраць гітлераўцаў гераічна загінулі камандзір партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна Брэсцкага партызанскага злучэння Л. П. Зяленін і 5 яго баявых сяброў. У 1975 г. на месцы бою пастаўлена стэла.

в. Арэхава, цэнтр сельсавета

1144. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БЕГЕЗУ Якаву Андрэевічу і **ЛУЦЫКУ** Івану Е... мавічу (гіст.). На будынку выканкома сельсавета. Ад рук ворагаў Савецкай улады загінулі 1.1.1947 г. старшыня Арэхаўскага сельсавета Я. А. Бегеза і 21.11.1950 г. дэпутат сельсавета І. К. Луцык. У 1980 г. на ўшанаванне іх памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка. *В. М. Баскова.*

1145. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 111 землякоў — воінаў Чырвонай Арміі і партызан, што загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1977 г. пастаўлены помнік — скульптуры воіна і жанчыны з лаўровай галінкай. Каля падножжа помніка дошка з імёнамі загінуўшых.



1140. *Мікалаеўская царква.*

1141. *Помнік У. І. Леніну*

1146. СТАЯНКІ (археал.).

1146а. Стаянка Арэхава-1. На паўночным беразе воз. Арэхаўскае, на паўднёвым схіле вялікага марэннага ўзгорка. Выявіў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Даўжыня стаянкі 300 м. Культурны пласт 0,1 м. Знойдзены крамянёвыя вырабы. Раскопкі не праводзіліся.

1146б. Стаянка Арэхава-2. За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на схіле марэннага ўзвышша. Абследаваў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак шмат нуклеусаў, пласцін, скрэбападобных прылад і іншых мікралітычных вырабаў і рэчаў, характэрных для свідэрскай культуры. Магчыма, стаянка існавала ў канцы палеаліту і ў мезаліце (10—5-е тысячагоддзі да н. э.). Раскопкі не праводзіліся. Матэрыялы абследавання зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

1146в. Стаянка Арэхава-3. На паўднёвым беразе воз. Арэхаўскае. Выявіў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья.— Мн., 1976.

У. Ф. Ісаенка.

в. Ацяты, Олтушскі сельсавет

1147. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на ўзлеску. Пахаваны 34 мясцовыя жыхары, расстраляныя 7.10.1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1961 г. на магіле пастаўлены абеліск.



1145. *Помнік землякам.*

в. Багуслаўка, Гвозніцкі сельсавет

1148. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на франтах, у партызанах ці былі закатаваны фашыстамі, у 1974 г. пастаўлена стэла.

в. Боркі, Макранскі сельсавет

1149. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 17 воінаў-разведчыкаў 160-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў баі су-

1146. *Стаянкі. План.*



1151. *Помнік ахвярам фашызму*

праць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 г. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1150. **МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ** (гіст.). На могілках. Раніцай 23.9.1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі акружылі в. Боркі. Жыхароў сагналі на вясковую плошчу, потым адвялі на могілкі і расстралялі (705 чалавек, у т. л. 372 жанчыны і 130 дзяцей). Забраўшы збожжа, жывёлу, сельскагаспадарчы інвентар і хатнія рэчы, карнікі падпалілі вёску.

У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944.— [2 изд.].— Мн., 1965.

1151. **ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** (гіст., маст.). У цэнтры вёскі.

23.9.1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі расстралялі 705 жыхароў вёскі. У 1977 г. на ўшанаванне памяці загубленых пастаўлены помнік (скульпт. Э. Астаф'еў; мармуровая крошка, бетон; вышыня стэлы 5 м). Архітэктурна-скульптурная кампазіцыя складаецца з бетоннага прамавугольнага блока з гарэльефамі і стэлы з памятным надпісам. Гарэльефныя выявы групы жыхароў вёскі высечаны ў глыбіні блока. Вырастаўшыся і ўзняўшы галаву, стаіць стары, да яго прыхінулася пажылая жанчына. Гнеўны парыў выражае фігура мужчыны, які закрывае сабою маладую маці з дзіцем. Супастаўленне вялікіх плоскасцей і буйных аб'ёмаў, неспакойны рытм кампазіцыі перадаюць драматычнае напружанне вобразаў. За 50 м ад блока з гарэльефамі размешчана стэла з памятным надпісам.

Л. Г. Лапцэвіч

в. Брадзяціц, Гвозніцкі сельсавет

1152. **КУРГАН ПАМЯЦІ** (гіст.). Непадалёку ад школы. У 1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 48 жыхароў вёскі, у 1943 г. спалілі вёску (120 двароў). У 1965 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых на магіле насыпаны Курган. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.



1153. *Помнік землякам*

1153. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст., маст.). У цэнтры вёскі.

На ўшанаванне памяці 66 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на франтах, у партызанскай барацьбе ці былі закатаваны гітлераўцамі, у 1978 г. пастаўлены помнік (скульпт. У. Булыга, арх. Ю. Казакоў; бетон; вышыня пілонаў 10 і 7 м, блока 5 м).

Паміж 2 рознавялікімі пілонамі замацаваны прамавугольны блок. На яго фасадным баку ледзь пазначаны плоскія рэльефныя выявы фігур мужчыны, жанчыны і хлопчыка. Выразна акрэслены толькі галовы. Фігуры высечаны ў абагульнена ўмоўнай манеры. Ніжэй выява зліваецца з бутнон муроўкай. На бакавой грані ... прозвішчы загінуўшых. Каля помніка ... выкладзеная бетоннымі плітамі пляцоўка.

Л. Г. Лапцэвіч

в. Вотчын, Макранскі сельсавет

1154. **МЕСЦА ПАРТЫЗАНСКАГА АЭРАДРОМА** (гіст.). За 8 км на поўдзень ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Міхерова.

У гады Вялікай Айчыннай вайны тут у 1944 г. дзейнічаў спецыяльна падрыхтаваны партызанскі аэрадром, адкуль у маі 1944 г. былі адпраўлены ў Маскву на перагаворы з Савецкім урадам 4 прадстаўнікі Краёвай Рады Народовай — часовага прадстаўнічага дэмакратычнага органа нацыянальнага фронту ў Польшчы. Аэрадром абаранялі ўкраінскія партызаны брыгады С. П. Капнуна.

У 1976 г. на месцы былога аэрадрома пастаўлены абеліск.

в. Вялікарыта, цэнтр сельсавета

1155. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 54 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг., і 11 мірных жыхароў з в. Гусак, расстраляных у 1942 г. гітлераўцамі. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У 1975 г. на пастаменце ўстаноўлена дошка, якая ўшаноўвае памяць 159 землякоў — воінаў Чырвонай Арміі і партызан, што загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

1156. **МАГІЛА АБРАМУК** Вольгі Васілеўны (гіст.). На тэрыторыі сярэдняй школы.

В. В. Абрамук нарадзілася ў 1925 г. ў в. Вялікарыта. Член ВЛКСМ з 1939 г. Працавала ў сельскім Савеце. Была сакратаром камсамольскай арганізацыі в. Вялікарыта. У Вялікую Айчынную вайну сувязная партызанскага атрада В. В. Абрамук збірала і перадавала народным мсціўцам зброю, каштоўныя звесткі пра ворага. У першыя дні акупацыі адважная камсамолка дапамагла арганізаваць уцёкі савецкіх актывістаў, арыштаваных гітлераўцамі. У кастрычніку 1942 г. яе схапілі фашысты і пасля катаванняў расстралялі ў двары школы.

У 1965 г. на яе магіле пастаўлены абеліск.

в. Вялікі Паўлопаль, Чарнянскі сельсавет

1157. **БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН** (гіст.). Каля школы. Пахаваны 37 пар-

1155. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, партызан, ахвяр фашызму і землякам*

тызан атрада імя М. В. Фрунзе брыгады імя І. В. Сталіна Брэсцкага партызанскага злучэння, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943—44 гг.

У в. Вялікі Паўлопаль і навакольных лясах дыслацыраваўся ў 1943—44 гг. партызанскі атрад імя М. В. Фрунзе. Атрад быў створаны ў лiпені 1943 г. з часткі асабовага складу атрада імя М. М. Чарнака (да чэрвеня 1943 г. называўся Старасельскі, змагаўся з ворагам з чэрвеня 1941 г. Партызанскі атрад імя М. В. Фрунзе дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Маларыцкага і суседніх з ім раёнаў Брэсцкай вобл. Камандзіры атрада П. В. Спрыдонаў, М. Б. Кадзаеў, М. А. Мартысюк, камісары А. П. Гогалеў, М. А. Саўчук. Партызаны праводзілі баявыя аперацыі на чыгуначных участках Брэст — Уладава, Брэст — Ковель, шашэйных і грунтавых дарогах. Яны ўзарвалі больш за 100 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай і іншымі грузамі, [illegible] пашкодзілі больш як 20 [illegible] правялі шэраг адкрытых і засадных баёў з гітлераўцамі. 24.3.1944 г. атрад імя М. В. Фрунзе (больш за 300 партызан) выйшаў у савецкі тыл і злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі. Разам з воінамі 1293-га палка 160-й стралковай дывізіі змагаўся супраць ворага у Любяшоўскім р-не Валынскай вобл. 25.5.1944 г. атрад зноў перайшоў лінію фронту і змагаўся ў тыле ворага. 21.7.1944 г. ў другі раз злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

У 1964 г. на магіле партызан пастаўлены абеліск.

Літ.: Бу[illegible] [illegible] 136, успаміна[illegible] [illegible] Мн., 1[illegible]. *Г. І. [illegible]*

в. Гвозніца, цэнтр сельсавета

1158. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля школы. Пахавана больш за 100 воінаў, партызан і

1164. *Царква Раства Багародзіцы*

мірных жыхароў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод іх воіны 60-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў 1941 г., а таксама камандзір партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна Леанід Пятровіч Зялевін.

Л. П. Зялевін нарадзіўся ў в. Архангельскае Баброва-Дворскага р-на Курскай вобл. у 1919 г. Член ВЛКСМ. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанах з сакавіка 1942 г. камісар атрада імя М. М. Чарнака, з ліпеня 1943 г. камандзір брыгады імя І. В. Сталіна. Загінуў у баі супраць гітлераўцаў 23.9.1943 г.

Літ.: Пронягин П. В. У самой границы. Мн., 1979. *В. М. Бась[illegible]*

1159. МЕСЦА ДЫСЛАКАЦЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ К. Я. ВАРАШЫЛАВА (гіст.). За 5 км на паўднёвы захад ад вёскі,ва ўрочышчы Клён. Тут у 1943 г. знаходзіўся лагер атрада імя К. Я. Варашылава Брэсцкага партызанскага злучэння.

Атрад імя К. Я. Варашылава створаны ў лютым 1943 г. на базе асобных партызанскіх груп, з ліпеня 1943 г. да сакавіка 1944 г. ў складзе партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна, з 24.3.1944 г.— партызанскай брыгады імя У. І. Леніна. Атрад дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Маларыцкага і Дамачоўскага р-наў Брэсцкай вобл. Камандзіры атрада В. М. Грабянёў, І. А. Верабёў, камісары І. А. Верабёў, М. П. Жукаў. Спачатку ў атрадзе было 35 партызан, на 1.6.1944 г. 641 партызан. Народныя мсціўцы [illegible] білі дыверсіі на варожых камунікацыях, вялі адкрытыя і засадныя баі, грамілі гарнізоны праціўніка. Да 1.6.1944 г. яны пусцілі пад адхон 170 паравозаў, 217 вагонаў з жывой сілай, 1008 вагонаў з баявой тэхнікай і рознымі грузамі, знішчылі 13 чыгуначных і 30 мастоў на шашэйных і грунтавых дарогах, 21 варожы склад, падарвалі каля 1700 рэек, збілі 3 самалёты ворага. 20.7.1944 г. атрад злучыўся з Чырвонай Арміяй і сумесна з войскамі вёў бай па знішчэнню брэсцкай групоўкі праціўніка.

У гонар партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава ва ўрочышчы Клён у 1965 г. насыпаны Курган, на яго вяршыні пастаўлены абеліск.

Літ.: Арзуманян С. Земля партизанская.— Мн., 1974. *Г. І. Дым[illegible]*

1164. *Царква Раства Багародзіцы. План*

в. Даранеевічы, Чарнянскі сельсавет

1160. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ І ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля васьмігадовай школы. Пахаваны 45 мірных жыхароў вёскі, расстраляных і спаленых у [illegible] 1944 г. нямецка-фашысцкімі карнікамі. У 1965 г. на магіле [illegible] пастаўлены абеліск. На абеліску прымацавана дошка, што ўшаноўвае памяць 14 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

1161. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ШВАЙКУ Івану Максеевічу (гіст.). На будынку праўлення калгаса «17 Верасня». Устаноўлена ў 1980 г. на ўшанаванне памяці І. М. Швайка [illegible] старшыні калгаса, які загінуў 29.9.1947 г. ад рук ворагаў Савецкай улады.

1162. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «17 Верасня». На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, закатаваных у 1941—44 гг. нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

1163. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «17 Верасня». Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1967 г.

1164. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 17 ст. з дрэва. З 19 ст. царква Прачыстай [illegible]. У 1902 г. з усходняга боку да царквы прыбудавана алтарная частка, будынак аналізаваны.

Царква мае падоўжна-восевую кампазіцыю. Прамавугольны ў плане ас



1164. *Царква Раства Багародзіцы. Фрагмент драўлянай агароджы*



1169. *К[illegible] ма[illegible] спаленай вё[illegible]*

[illegible] абсідам накрыты ва[illegible]мым да[illegible]хам. З захаду да асноўнага да яго прыбудавана чацверыковая [illegible], па[illegible] прычолкамі на 2 ярусы. [illegible] ніжні ярус служыць бабінцам, верхні [illegible] завершаны чатырохгранным шатром. Сцены складзены з брусоў і прарэзаны аконнымі праёмамі. Асноўнае памяшканне зальнае. Над уваходам размешчаны хоры. У [illegible] еры алтарная частка аддзелена ад а[illegible] [illegible] ным іканастасам. Царква — помнік народнага дойлідства. [illegible]

в. Забалацце, Лукаўскі сельсавет

1165. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН ([illegible]). За [illegible] км [illegible] поўнач ад вёскі, каля урочышча [illegible]. Пахаваны 2 партызаны атрада імя К. Я. Варашылава, якія загінулі ў чэрвені 1942 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх за[illegible]. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1166. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ ([illegible]). У цэнтры вёскі.

[illegible] 2[illegible]9.1942 г. фашысцкія ка[illegible] [illegible] батальёна [illegible] нямецкага паліцэйскага палка уварваліся у вёс[illegible] [illegible] памяшканне школы, потым раздзялілі на 3 групы, адвялі да загадзя выкапаных ям і рас[illegible]. [illegible] забілі 289 чалавек [illegible] 120 [illegible].

У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

[illegible]: Преступления [illegible] [illegible] 1941—1944. 2 выд.— Мн., [illegible].

в. Замшаны,
Маларыцкі гарадскі Савет

1167. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 6 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск, што ўвянчаны таксама памяць 26 землякоў, якія аддалі сваё жыццё за Радзіму ў Вялікую Айчынную вайну.

в. Збураж, Гвозніцкі сельсавет

1168. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ І ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «40 год БССР». У 1943 г. гітлераўцы расстралялі 24 жыхароў і спалілі вёску (320 двароў). На франтах і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі 54 аднавяскоўцы. У 1967 г. на ўшанаванне іх памяці пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана у мемарыяльным комплексе Хатынь.

в. Зялёная Буда (не існуе), Вялікарыцкі сельсавет

1169. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). За 1,5 км на поўдзень ад в. Баравая, каля дарогі на в. Антонава знаходзілася в. Зялёная Буда. 9.10 1942 г. гітлераўцы расстралялі 28 не жыхароў, а вёску (15 двароў) спалілі. Пасля вайны вёска не адрадзілася. У 1970 г. на месцы в. Зялёная Буда насыпаны курган, на вяршыні якога пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

[illegible]: Преступления [illegible] в Белоруссии. 1941—[illegible]. 2 выд.— Мн., 1965.

в. Ланская, Олтушскі сельсавет

1170. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. У гады Вялікай Айчыннай вайны 96 жыхароў вёсак Галёўка, Заазерная, Ланская, Ямніца загінулі на франтах, у партызанскай барацьбе ці расстраляны гітлераўцамі. У 1978 г. на ўшанаванне іх памяці пастаўлены помнік — скульптура воіна і мармуровыя дошкі з імёнамі загінуўшых.

в. Лешніца, Вялікарыцкі сельсавет

1171. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 5 км на паўночны ўсход ад вёскі. Пахаваны 20 жанчын і дзяцей — [illegible]лонаў сем'яў абаронцаў Брэсцкай крэпасці, расстраляных нямецка-фашысцкімі карнікамі восенню 1942 г. Сярод іх — сям'я (5 чалавек, у т. л. 3 дзяцей) Героя Савецкага Саюза Андрэя Мітрафанавіча Кіжаватава. У 1979 г. на магіле пастаўлены абеліск з зоркай на вяршыні.

1172. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 5 км на паўночны ўсход ад вёскі, у лесе. Пахаваны мірныя жыхары (81 чалавек), расстраляныя нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1942 г. У 1978 г. устаноўлена надмагільная пліта.

1170. *Помнік землякам.*

в. Лукава, цэнтр сельсавета

1173. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 37 воінаў [illegible] дывізіі, якая вяла бай у раёне вёскі у 1941 г., і партызан, што загінулі у 1944 г. У 1962 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. У 1977 г. на пастаменце ўстаноўлена дошка на ўшанаванне памяці 105 жыхароў сельсавета, якія загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе ў Вялікую Айчынную вайну.

1174. МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны савецкі воін і 12 мірных жыхароў, загубленых нямецка-фашысцкімі акупантамі восенню 1942 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абе[illegible].

1175. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка выканкома сельсавета. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1969 г.

1176. СТАЯНКІ (археал.).

1176а. Стаянка Лукава-1. На паўднёвым беразе воз. Лукаўскае на поўдзень ад мыса, дзе знаходзяцца вясковыя могілкі. Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Размешчана

1171. *Помнік на магіле ахвяр фашызму.*



1176. Стаянкі. План

уздоўж берага, даўжыня каля 100 м. У культурным пласце знойдзены крамянёвыя прылады працы, рэшткі ляпнога гліынянага посуду і інш. Адносіцца да позняга неаліту, датуецца 3-м тысячагоддзем да н. э.

1176б. Стаянка Лукава-2. На паўночна-заходнім беразе воз. Лукаўскае, на марэнным узгорку, за 3 км ад вёскі. Даўжыня ўздоўж берага каля 100 м. Адкрыў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак шмат нуклеусаў, пласцін, адшчэпаў, а так сама прылады працы эпох мезаліту і неаліту.

Знаходкі зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР. *У. Ф. Ісаенка*

в. Ляхаўцы, Макранскі сельсавет

1177. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 116 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод іх — воіны 75-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў 1941 г., і воіны 70-й арміі, што загінулі ў баі каля в. Макраны ў сакавіку 1944 г. У 1956 г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. У 1980 г. каля помніка ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі, якія ўшаноўваюць памяць 144 землякоў, што загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе ў Вялікую Айчынную вайну.

1178. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1713 г. з дрэва. У сярэдзіне 19 ст. значна перабудавана, перад храмам пастаўлена драўляная званіца.

Царква трохзрубная, падоўжна-восевай кампазіцыі. Складаецца з прамавугольнага асноўнага аб'ёму, апсіды, бабінца з трапецападобным тамбурам. Першапачаткова зрубы мелі самастойныя вярхі, у паўночна-заходняй частцы над бабінцам была званіца. Асноўны аб'ём і бабінец пакрыты агульным двухсхільным дахам, які пераходзіць у вальмавы над тамбурам. Алтарны зруб мае самастойнае паўвальмавае пакрыццё. Будынак звонку ашаляваны. Цэнтральны зруб прарэзаны спаранымі прамавугольнымі аконнымі праёмамі і завершаны барочнай двух'яруснай галоўкай.

Інтэр'ер зальнага тыпу. Цэнтральны аб'ём завершаны пірамідальным скляпеннем. Унутраная прастора бабінца і асноўнага аб'ёму злучана шырокім праёмам складанага абрысу. У аб'ёме бабінца ўтвораны хоры. Алтарны зруб, аддзелены іканастасам, мае таксама скляпеністае перакрыццё. З паўднёва-заходняга боку ад царквы, па адной з ёю восі, размешчана зрубная каркасная званіца, падзеленая прычолкам на 2 ярусы. Верхні ярус прарэзаны арачнымі праёмамі і завершаны шатровым пакрыццём.

Царква — помнік народнага дойлідства. *С. Ф. Сambук*

в. Макраны, цэнтр сельсавета

1179. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 0,5 км ад школы. Пахаваны партызаны і мірныя жыхары, якія загінулі ў баях, расстраляны або закатаваны гітлераўцамі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1180. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі, каля шашы Брэст — Ковель. Пахаваны 75 воінаў Чырвонай Арміі і 3 партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод іх — воіны 75-й стралковай дывізіі, што загінулі ў чэрвені 1941 г., воіны 70-й арміі, часці якой вялі баі ў раёне Макран у сакавіку 1944 г. У 1975 г. на магіле ўстаноўлена пліта з памятным надпісам.

1181. КУРГАН СЛАВЫ (гіст.). За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі. Тут у сакавіку 1944 г. воіны 70-й арміі і партызаны брыгады імя І. В. Сталіна (камандзір брыгады С. Х. Араўманян, камісар К. А. Шкварада) вялі ўпартыя баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, праявілі мужнасць і гераізм. У 1965 г. ў гонар іх подзвігу насыпаны Курган.

1182. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля шашы Брэст — Ковель. На ўшанаванне памяці 64 жыхароў Макранскага сельсавета, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна і дошкі з імёнамі загінуўшых.

1183. ПОМНІК КІРАВУ Сяргею Міронавічу (гіст.). Каля Дома культуры. Бюст С. М. Кірава ўстаноўлены ў 1967 г.

1184. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На тэрыторыі сярэдняй школы скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1972 г.

в. Малінаўка, Чарнянскі сельсавет

1185. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). За 2,5 км на захад ад вёскі, справа ад дарогі на в. Чарняны, у лесе. Тут у 1941—44 гг. нямецка-фашысцкія акупанты расстрэльвалі членаў сем'яў абаронцаў Брэсцкай крэпасці, партызан і савецкіх актывістаў. У 1967 г. ў памяць аб загубленых насыпаны Курган, у 1980 г. каля яго падножжа ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Масевічы, Вялікарыцкі сельсавет

1186. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст., маст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 60 партызан і мірных жыха-

1178. *Царква Раства багародзіцы і званіца (злева). Выгляд царквы з боку апсіды*

1178. *Царква Раства багародзіцы. План*

...оў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1975 г. на магіле загінуўшых пастаўлены помнік (скульпт. Дз. Кравец; бетон, вышыня скульптурнай групы 3 м, пастамента 1,3 м), што ўшаноўвае таксама памяць 270 землякоў з вёсак Масевічы, Новае Раматова, Нажжын, Старое Раматова, Строня, якія ў Вялікую Айчынную вайну аддалі жыццё за Радзіму.

На гарызантальна выцягнутым пастаменце-саркафагу, што ўстаноўлены на памастцы ... скульптурныя фігуры воіна і дзяўчыны з вянком у руках. Мадэліроўка форм абагульненая, рытм плаўных ліній надае кампазіцыі мастацкую выразнасць. На саркафагу высечаны імёны загінуўшых.

1187. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (архат.). За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі, побач з чыгункай. 9 курганоў: 4 вялікія вышынёй 2—2,5 м, дыяметрам 18—20 м, 5 малых вышынёй 0,7—1,3 м, дыяметрам 6—12 м. Курганы слаба задзернаваныя, зараслі хмызняком. Абследавалі ў 1961 г. В. В. Сядоў, у 1970 г. П. Ф. Лысенка. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Кухаренко Ю. В. [illegible]

в. Мельнікі
Хацiславіцкі сельсавет

1188. МАГІЛА ПАРТЫЗАНА (гіст.). За 1 км на поўнач ад вёскі, каля чыгункі. Пахаваны партызан Вялікай Айчыннай вайны, які загінуў у час баявой аперацыі па падрыву варожага эшалона ў жніўні 1943 г. У 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1189. МАГІЛА ПАРТЫЗАНА (гіст.). За 2 км на поўдзень ад вёскі, каля чыгункі. Пахаваны партызан Вялікай Айчыннай вайны, які загінуў у час баявой аперацыі па падрыву варожага эшалона ў жніўні 1943 г. У 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1190. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка васьмігадовай школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1976 г.

в. Мікольскае, Олтушскі сельсавет

1191. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Тут 27.6.1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 16 мясцовых жыхароў. У 1969 г. на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

в. Олтуш, цэнтр сельсавета

1192. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 100 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод іх — воіны 75-й стралковай дывізіі, што загінулі ў чэрвені 1941 г. У 1959 г. на магіле пастаўлена скульптура воіна.

1193. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля Дома быту. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1968 г.

1194. ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 178_ г. з дрэва. Да вызначанага ў плане аб'ёму царквы ў 19 ст. прыбудавана двух'ярусная вежа-званіца (васьмярык на чацверыку) з шатровым пакрыццем. Храм трохзрубны. Да асноўнага аб'ёму прымыкаюць з усходу трохгранная апсіда, з захаду бабінец, злучаны з вежай-званіцай вузкім тамбурам. Дахі вальмавыя над асноўным аб'ёмам, двухсхільныя над бабінцам і трохсхільныя над апсідай увянчаны фігурнымі галоўкамі. Вокны і дзверы абрамлены драўлянымі разнымі ліштвамі, сцены гарызантальна ашаляваны. У інтэр'еры асноўны аб'ём завяршаецца каробавым размаляваным скляпеннем. Над уваходам у залу размешчаны хоры з балюстрадай. Апсіда ад асноўнага аб'ёму аддзелена трох'ярусным іканастасам, аформленым разнымі пілястрамі і лапаткамі. Асаблівы цікавасць уяўляюць царскія вароты (ажурная разьба).

Царква — помнік народнага дойлідства з элементамі архітэктуры барока.

У. Н. М.

1186. *Помнік на [illegible] партызан, ахвяр фашызму і землякам*

1182. *Помнік землякам*

1194. *Праабражэнская царква. Бакавы фасад*



1194. *Праабражэнская царква. Іканастас*



1197. *Помнік на брацкай магіле паўстанцаў.*

**в. Пажажын.
Вялікарыцкі сельсавет**

1195. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля школы скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1970 г.

в. Печкі, Вялікарыцкі сельсавет

1196. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі. Пахаваны сям'я Цяцель Аляксандра Наталавіча (9 чалавек) і 2 дзяцей ваеннаслужачага з Брэсцкай крэпасці, якіх расстралялі фашысцкія карнікі 29.8.1942 г. У 1960 г. на магіле пас[illegible]лены [illegible].



1194. *Праабражэнская царква. Выгляд з боку апсіды*

в. Радзеж, Олтушскі сельсавет

1197. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАЎСТАНЦАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 4 члены КПЗБ.

У верасні 1939 г. Чырвоная Армія [illegible], [illegible] савецка-польскую граніцу. На[illegible] сялянства Заходняй Беларусі стварала паўстанцкія групы і атрады рабочых і сялян для барацьбы з акупантамі. Паўстанцкі атрад быў арганізаваны і ў в. Радзеж. У адной з сутычак атрада з палякамі загінулі 4 паўстанцы — члены КПЗБ.

У 1959 [illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

1198. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 12 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг., і 143 жыхары вёсак Пашалесе і Радзеж, расстраляныя гітлераўцамі ў лютым

1194. *Праабражэнская царква. План*

1198. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызма

мае 1944 г. У 1975 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком.

в. Струга. Вялікарыцкі сельсавет

1199. **КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК** (археал.). Мясцовая назва Валадзькія могілы. За 8 км на захад ад вёскі, у лесе, на урочышчы «Ізбыж», каля дарогі на былы хутар Халопава. 8 насыпаў (справа 7, злева 1) вышынёй 0,38—0,8 м, дыяметрам 5,8—8,2 м. Насыпы задзярнаваныя, на некаторых растуць дубы. Могільнік выявіла і абследавала ў 1980 г. С. М. Васільева, у 1982 г. абследавала, у 1983 г. раскапала 1 курган Т. М. Каробушкіна. Пахавальны абрад — трупаспаленне па-за курганам. Могільнік адносіцца да 9—10 стагоддзяў. *Т. М. Каробушкіна.*

в. Хацiслаў, цэнтр сельсавета

1200. **КУРГАН СЛАВЫ** (гіст.). За 1 км на паўночны захад ад вёскі. Часці 75-й стралковай дывізіі 4-й арміі 25 чэрвеня 1941 г. вялі бой супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, акружылі і знішчылі артылерыйскі полк гітлераўцаў. У 1967 г. на месцы бою ў гонар воінаў 75-й стралковай дывізіі насыпаны Курган, на яго вяршыні пастаўлены абеліск.



1200. Курган Славы

1202. Помнік землякам

1201. **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БЕНЕСЮКУ** Яфіму Гаўрылавічу і **ЛУКЯНЧУКУ** Івану Мікітавічу (гіст.). На будынку выканкома сельсавета. Ад рук ворагаў Савецкай улады загінулі 20.7.1946 г. старшыня Хацiслаўскага сельсавета Я. Г. Бенесюк, 2.1.1948 г. намеснік старшыні сельсавета І. М. Лукянчук. У 1967 г. у ўшанаванне іх памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

1202. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). За 0,5 км на поўнач ад вёскі, каля дарогі на Маларыту. На ўшанаванне памяці жыхароў в. Хацiслаў — 60 воінаў і партызан, 96 мірных жыхароў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і 5 актывістаў, якія аддалі жыццё ў барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

1203. **ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1798 г. з дрэва. У 1877 г. прыбудавана трох'ярусная званіца, злучаная з царквою адзіным аб'ёмам.

Будынак трохзрубны. Да асноўнага аб'ёму з усходу прымыкае пяцігранная апсіда, з захаду — трохгранны бабінец, фланкіраваны 2 вежамі, пастаўленымі над вуглом да галоўна-



1203. Праабражэнская царква. План.

1203. Праабражэнская царква. Фрагмент завяршэння.

1203. Праабражэнская царква.

1204. *Помнік на магіле ахвяр фашызм[illegible] [illegible]емлякам*

весі пабудовы. Зрубы [illegible]ольваван[illegible] цыныя пакрыты дахамі, якія маюць [illegible]схілы ў [illegible] абрысу будынка. Дахі апсіды, асноўнага аб'ёму і вежаў завершаны фігурнымі галоўкамі. Галоўны фасад і вежы падзелены карнізамі і цыбулькам[illegible] па [illegible] ярусы [illegible] [illegible]арыза[illegible]тальна [illegible]. Унутры [illegible] перакрыта карабавым скляпеннем. У верхняй частцы бабінца размешчаны хоры, [illegible] выходзяць у асноўны аб'ём [illegible] [illegible] праёмам. Алтарную частку аддзяляе шматярусны [illegible] [illegible]та.

[illegible] узор двухвежавага драўлянага храма ў стылі барока.

в. Чарняны, цэнтр сельсавета

1204. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ І ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 13 мясцовых жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—44 гг. У 1975 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя воіна з хлопчыкам і бетонны блок з імёнамі 160 жыхароў Чарнянскага сельсавета — воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

1205. ПОМНІК КРУПСКАЙ Надзе Канстанцінаўне (гіст.). Каля будынка аддзялення сувязі. Бюст Н. К. Крупскай [illegible] устаноўлены ў 1973 г.

в. Язвін, Гвозніцкі сельсавет

1206. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках пахаваны 12 мірных жыхароў, расстраляных гітлераўцамі ў кастрычніку 1942 г. У 1980 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПІНСКІ
РАЁН
Бобрык
Азарычы
Дабраслаўка
Лышча
Пагост Загародскі
Чухава
Новы Двор
Лагішын
Табулкі
Парэчча
Мерчыцы
Сошна
Вулька
Ставок
Аснежыцы
Гарадзішча
Бярозавічы
ПІНСК
Молоткавічы
Дубай
Кончыцы
Барычэвічы
Вуйвічы
Малая Вулька
Хойна
Невель
Востраў
Ласіцк
Пірэ
Ладараж
Станкі, нагавішча, гарадзішча
Цэнтры раённых
Помнікі і месцы рэвалюцыйнага руху (Рэвалюцыя 1905–07 гг., Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, Грамадзянская вайна)
Помнікі, месцы воінскай славы
Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (месцы баёў, магілы савецкіх воінаў і партызан, Курганы Славы, помнікі землякам)
Помнікі ахвярам фашызму (месцы масавай расправы)
Палацы, сядзібы, асабняки
Жылыя дамы, забудова вуліц
дасавецкага перыяду
савецкага перыяду
Культавая архітэктура
Паркі, садова-паркавыя збудаванні

XVII. ПІНСК

Горад абласнога падпарадкавання, цэнтр раёна. Размешчаны на левым беразе р. Піна каля ўпадзення яе ў р. Прыпяць, за 175 км ад Брэста. Чыгуначная станцыя на лініі Брэст — [illegible], вузел аўтамабільных дарог на Іванава, Івацэвічы, Лунінец, Столін. Рачны порт, аэрапорт. Насельніцтва 102 тыс. чалавек (1983 г.).

Пінск (летапісны Пинескъ, Пиньскъ) упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1097 г. Назва ад р. Піна. Уваходзіў у склад Кіеўскай Русі. Узнік на месцы гарадзішча. Паводле археалагічных даследаванняў насельніцтва ў 2-й пал. 11 ст. займалася рамяством, сельскай гаспадаркай, паляваннем і рыбалоўствам, мела гандлёвыя сувязі з Валынню, сярэднім Падняпроўем і Паўночным Прычарнамор'ем. Да сярэдзіны 12 ст. быў горад Тураўскага княства, потым цэнтр самастойнага Пінскага княства. З пачатку 14 ст. ў складзе Вялікага княства Літоўскага, горад у Трокскім ваяводстве, з 1539 г. цэнтр староства, з 1566 г. павета ў Берасцейскім ваяводстве. У 1581 г. горад атрымаў маг-

[illegible] звязаны з гарадамі Польшчы [illegible] у Пінску ўзнікла праваслаўнае брацтва [illegible] беларускага [illegible] над кіраўніцтвам намеснікаў [illegible] Міхайловіча [illegible] абараняліся казацка-сялянскім атрадам [illegible] Пры набліжэнні карных [illegible] Першым уварваўся ў горад [illegible] манахам-францысканцам Халеўскім [illegible] з 3 палкамі пяхоты [illegible] Мірскі асадзіў Пінск. [illegible]

[illegible] Горад вельмі пацярпеў у час руска-польскай вайны 1654—67 [illegible]

Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай [illegible] імперыі, цэнтр павета Мінскай губерні [illegible] 2 гарбарні, медзеварні [illegible] (27 [illegible]) [illegible] фанерная [illegible]



XVII. *Пінск. Набярэжная.*



XVII. *Выгляд горада ў пачатку 14 ст Рэканструкцыя.*

«[illegible]» фабрыкі, суднабудаўнічы завод, 3 лесапільні, [illegible]. Паводле перапісу 1897 г. у [illegible] было 28 368 жыхароў, у 1904 г. — 32 [illegible] жыхароў, 3 бальніцы, 1 сярэдняя навучальная ўстанова, 9 пачатковых школ.

З павелічэннем колькасці рабочых, якія жорстка эксплуатаваліся, narастала рэвалюцыйная барацьба. З 1890 г. па 18[illegible] г. у Пінску адбылося 10 стачак. Самай буйной была стачка рабочых чыгуначных майстэрняў у 18[illegible] г. У 190[illegible] г. ў горадзе [illegible] а [illegible]краўская група, якая распаўсюджвала марксісцкую літаратуру сярод рабочых. У пачатку 1905 г. аформілася Пінская група РСДРП. У 1901 г. адбыліся забастоўкі на запалкавай фабрыцы і фанерным заводзе, у 1904 г. на суднабудаўнічым заводзе Неадпаразова баставалі рабочыя ў перыяд Рэвалюцыі 190[illegible]—07 гг. У час Усерасійскай Кастрычніцкай [illegible] стачкі ў Пінску штодзённа праходзілі дэманстрацыі, узніклі баявыя групы, [illegible] узброенае паўстанне [illegible] горадзе чыгуначн[illegible] [illegible] раменсн[illegible] [illegible] партыйная работа [illegible] 190[illegible] г. адбылася [illegible]. Рабочыя горада баставалі так[illegible] [illegible] 1910 г. [illegible] [illegible] Германі[illegible]

Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне 1917 г. ў Петраградзе вы[illegible] на Піншчыне ўздым рэвалюцыйна[illegible] [illegible]ху. 11—12.11.1917 г. у [illegible] ся павятовы з'езд Саветаў, на [illegible] быў выбраны выканком Пінскага павятовага Савета. Ад кайзераўскіх акупантаў, белагвардзейскіх і іншых контррэвалюцыйных фарміраванняў горад быў вызвалены 2[illegible] 1919 г. часцямі Чырвонай Арміі [illegible]. Адразу сюды з [illegible] Па[illegible] войскі буржуазна[illegible] Польшчы. У час акупацыі тут дзейнічала бальшавіцкая падпольная арганізацыя. 23.7.1920 г. горад быў вызвалены Чырвонай Арміяй, а 26—27 верасня яго захапі[illegible] [illegible] Булак-Балаховіча, потым буржуазнай Польшчы.

З 1921 г. да 1939 г. Пінск — павятовы горад Палескага ваяводства буржуазнай Польшчы. З 1924 г. тут [illegible] пічалі акруговыя і гарадскія камітэты КПЗБ і КСМЗБ. У 1923—24 гг. праходзілі стачкі рабочых, у 1927—28 гг. баставалі рабочыя запалкавай фабрыкі, у 1930 г. адбыліся масавыя выступленне беспрацоўных. 20.9.1939 [illegible] вызвалены Чырвонай Арміяй [illegible] 1939 [illegible] цэнтр Пінскай вобл[illegible] 1940 [illegible] раёна [illegible] было [illegible] жыхароў.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР пачалося хуткае эканамічнае развіццё Пінска. З адкрыццём Днепра-Бугскай воднай сістэмы (1940 г.) павялічыўся грузаабарот рачнога порта і чыгуначнай станцыі. У 1940 г. працавалі суднарамонтны завод, 2 фанерныя заводы, запалкавая фабрыка «17 Верасня» і інш. Створана 16 прамыслова-кааператыўных арцеляў. Пачала выходзіць газета «Палеская праўда», былі адкрыты драмтэатр, [illegible], Дом партыйнай асветы, Дом народнай творчасці, Дом піянераў і школьнікаў, настаўніцкі інстытут, педвучылішча, музычная і фельчарская школы. Значна вырасла колькасць вучняў у агульнаадукацыйных школах, павялічылася колькасць лячэбных устаноў. З чэрвеня 1940 г. да ліпеня 1941 г. знаходзілася база Пінскай ваеннай флатыліі.

З [illegible] 1941 [illegible] да [illegible] 1944 [illegible] быў акупіраваны [illegible] фашысцкімі захопнікамі, якія загубілі тут 59 084 мірных жыхароў і ваеннапалонных. У горадзе дзейнічала антыфашысцкае і камуністычнае падполле. У ліпені 1941 г. створаны падпольны каміэтэт ЛКСМБ, у верасні 1943 г. падпольны гарком КП(б)Б. 18 часцям і злучэнням Чырвонай Арміі, якія вызначыліся пры вызваленні Пінска, [illegible] ганаровае найменне «Пінскіх». Адразу пасля вызвалення пачалося аднаўленне гарадской гаспадаркі. Рэстаўраваліся гідратэхнічныя збудаванні, пачаў дзейнічаць рачны порт. Аднаўляліся старыя заводы і будаваліся новыя, значна павялічыўся жылы фонд, вырасла сетка гандлёвых прадпрыемстваў, навучальных і культурна-асветных устаноў. З 8.1.1954 г. Пінск — раённы цэнтр Брэсцкай вобл.

* *
*

[illegible] аблічча сучаснага горада складвалася на працягу стагоддзяў. У 11—13 стагоддзях яго планіровачным цэнтрам было ўмацаванае дзяцінца (плошча 1,76 га) на левым беразе р. Піна. З захаду, поўначы і ўсходу яго абкружаў паўкольцам вакольны горад (плошча 2,1 га), таксама ўмацаваны сістэмай абаронных збудаванняў. Земляныя валы вышынёю 6—8 м умацоўваліся клецямі. На грэбені валоў былі пастаўлены драўляныя [illegible] сцены. На плане [illegible] паказана рэкатэ вежы, якая ўмацоўвала ўваход на дзядзінец з боку поля.

Паводле інвентароў Пінска сярэдзіны 16 ст. горад меў замак, 2 брамы, Троіцкі мост. У 15[illegible]2—[illegible] гг. было 27 вуліц (на іх размяшчалася каля 800 сядзіб), 14 праваслаўных цэркваў (у замку знаходзіліся Дзмітраўская саборная і Афанасьеўская), 2 касцёлы з кляштарамі (францысканскі заснаваны ў 1396 г., дамініканскі ў 1342 г.). Існавалі 2 праваслаўныя манастыры: адзін у горадзе, другі ў прадмесці Лешч (вядомы з 1[illegible]). Манастыр у прадмесці быў драўляны ўключаў шэраг жылых і гаспадарчых пабудоў, 2 цэрквы — «цёплую» Святога Духа з трапезнай і галоўны Успенскі храм з 5 верхамі, уваходную браму [illegible], якую [illegible] злучаўся званіцай. У 2-й палавіне 16 ст. пабудаваны праваслаўны Богаяўленскі манастыр.

Агульная тэрыторыя горада ў 16 ст. разам з прадмесцямі, урочышчамі Гарадзішча, Пабярэжжа, Вярэта і інш.



XVII. *П[illegible] [illegible]рода канца 18 ст. 1 — стары замак; 2 — [illegible]валёвая плошча і [illegible]аналёвыя рады; 3 — [illegible] касцёл і калегіум; 4 — кляштар францы[illegible]; 5 — замак Вішнявецкіх; 6 — праваслаўная царква; 7 — праваслаўны манастыр; 8 — базыльянскі манастыр; 9 — кляштар дамініканцаў; 10 — уніяцкая царква.*



XVII. *План гістарычнай часткі горада. 1 — езуіцкі калегіум; 2 — францысканскі касцёл; 3 — палац Бутрымовіча, 4 — Варварынская царква; 5 — жылая забудова 19 — пачатку 20 ст.*

дзе жылі рамеснікі, складала каля 54 га. Горад развіваўся ўздоўж ракі, вакол старога гарадзішча, на месцы [illegible] замак з адміністрацыйным [illegible] дынкам і праваслаўнымі саборамі. За замкам былі крамы і каморы. Гарадская забудова захоўвала старажытную радыяльна-кальцавую планіроўку. У 1-й палавіне 17 ст. Пінск значна пашырыўся. Горад у гэты час быў расцягнуты ўздоўж р. Піна амаль на 4 км, шчыльна забудаваны драўлянымі дамамі, колькасць якіх дасягала [illegible] тыс., меў, акрамя замка, дадатковую [illegible] ніну. З захаду і ўсходу знаходзіліся 2 брамы: Ляшчынская (ад назвы манастыра) і Паўночная, за якой [illegible] дзейнічала [illegible] 2 касцёлы з кляштарамі, 2 праваслаўныя і 5 уніяцкіх цэркваў.

XVII. *Будынак Галоўпалессеводбуда*

У 17—18 стагоддзях сфарміраваўся сучасны цэнтр горада. Паводле плана 1798 г. Пінск меў даволі складаную планіроўку. Цэнтральнае месца займаў замак з земляным валам, за ім знаходзілася гандлёвая плошча з крамамі. Важную ролю ў фарміраванні кампазіцыі горада адыгрывалі манументальныя мураваныя і драўляныя будынкі езуіцкага калегіума (1631—35 гг.), францысканскага кляштара (16—18 стагоддзі), кляштараў кармелітаў (1734 г.) і марыявітак (1746 г.). Больш позняя частка горада фарміравалася за вонкавым валам і паўтарала яго абрысы. У канцы 16 ст. на ўсход ад горада ўзнікла прадмесце — мястэчка Караліц, забудаванае па рэгулярным плане. Тут узведзены мураваны замак Вішнявецкіх з 4 вуглавымі бастыёнамі і курцінамі (разбураны войскамі Карла XII у 1706 г.). У 18 ст. у Караліне пабудаваны мураваныя касцёлы бернардзінцаў і Карла Барамея з кляштарамі.

Складзены ў 1800 г. першы план забудовы Пінска, які прадугледжваў ліквідацыю паўкальцавых магістраляй, прывядзенне ў геаметрычны парадак вулічнай сеткі, узбуйненне гарадскіх кварталаў і пракладку 2 новых радыяльных вуліц для злучэння цэнтра з дарогамі на Брэст і Нясвіж, быў ажыццёўлены ў агульных рысах. Паводле праекта 1842 г. планавалася будаўніцтва новых кварталаў і стварэнне 3 плошчаў у паўночнай частцы горада. План 1856 г. прынцыпова [illegible] ад папярэдняга, але [illegible] менш абсяг капітальнага будаўніцтва. Планавалася толькі адна плошча, прадугледжвалася рэгуляванне рэк Піны і Струменя. Да 1860-х гадоў на поўнач ад цэнтра было пабудавана некалькі новых кварталаў. Хуткі рост з 1880-х гадоў прамысловасці зрабіў уплыў на архітэктурнае аблічча горада. У 1904 г. у Пінску было 6300 жылых дамоў, у гэты час з'явілася некалькі прамысловых, канторскіх, банкаўскіх, вучэбных і іншых будынкаў, аднак забудова вялася стыхійна, была малапавярховая (2—3-павярховая ў цэнтры і аднапавярховая ў перыферыйных частках), скучаная.

У час Вялікай Айчыннай вайны жыллёваму фонду Пінска нанесены вялікія страты. Пры аднаўленні і рэканструкцыі горада былі захаваны планіроўка, якая склалася гістарычна, асноўныя помнікі архітэктуры і [illegible] забудова 19 — 1-й палавіны 20 ст. [illegible] ральнай часткі Пінска. Першы пасляваенны генеральны план распрацаваны ў 1952 г. ў інстытуце «Белдзяржпраект». Ён прадугледжваў завяршэнне існуючай радыяльна-кальцавой планіроўкі, сувязь галоўных вуліц з плошчай імя У. І. Леніна, пракладку новай магістралі, якая павінна была звязаць заходні і ўсходні загарадныя напрамкі, пашырэнне вуліц.

У цэнтры намячалася замяніць існуючую малапавярховую забудову 3—4-павярховымі дамамі. У 1950—60-я гады пабудаваны шэраг жылых і адміністрацыйных будынкаў, у дэкоры якіх выкарыстаны ордэрныя формы. Сярод іх вылучаюцца дамы па вуліцах Брэсцкай, 3, Горкага, 55, будынак гаркома КПБ.

У 1972 [illegible] Ц[illegible]ральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва распрацаваны генеральны план забудовы Пінска. Карэкціроўка зроблена ў 1974 г. Праект улічвае гістарычную планіроўку і архітэктурнае аблічча цэнтральнай часткі горада, якая фарміруецца як грамадская і адміністрацыйная культурная зона. Развіваецца і ўдасканальваецца складзеная стагоддзямі структура. У 1960-я гады галоўная плошча забудавана 5-павярховымі жылымі дамамі з магазінамі. На ёй пастаўлены помнік У. І. Леніну. Плошча раскрыта да р. Піна. У цэнтральным раёне, абмежаваным вуліцамі Брэсцкай, Завальнай, Савецкай і р. Піна, пабудаваны 2—5-павярховыя мураваныя дамы. Тут размешчаны жылыя, адміністрацыйныя, грамадскія, гандлёвыя будынкі, прадпрыемствы бытавога абслугоўвання. На вул. Леніна зберагласяя частка забудовы 19 — пачатку 20 ст., а таксама помнікі архітэктуры 16—19 стагоддзяў. З канца 1960-х гадоў у вялікім аб'ёме вядзецца жыллёвае будаўніцтва ў Заходнім, Усходнім і Паўночным мікрараёнах. Яны забудоўваюцца 5—9-павярховымі дамамі з цэглы і панелей. Тут створаны мясцовыя грамадска-гандлёвыя цэнтры.

У 1970-я гады ўзведзены новыя жылыя і грамадскія будынкі: дзевяціпавярховыя дамы на вул. Дняпроўскай флатыліі, Дом Саветаў, кінатэатр на вул. Зоі Касмадзям'янскай, Дом культуры на пл. імя Леніна, Дом культуры і бальнічны комплекс на вул. Першамайскай, дзіцячая бальніца [illegible] Цэнтральнай. Завяршаецца забудова мікрараёнаў па вул. Цэнтральнай, па вул. Фядотава, па вул. Брэсцкай, дзе пабудаваны 5—9-павярховыя жылыя дамы, гандлёвыя і дзіцячыя ўстановы.

Пінск — прамысловы і культурны цэнтр. Асноўныя галіны прамысловасці: лёгкая — камбінат верхняга трыкатажу, фабрыка трыкатажных спартыўных вырабаў, завод штучных скур, ільнозавод; харчовая — малочны завод, камбінат хлебапрадуктаў, мясакамбінат, кансервавы і вінаробчы заводы; машынабудаўнічая — суднабудаўніча-суднарамонтны, экскаватарарамонтны, ліцейна-механічны, кавальска-прэсавых аўтаматычных ліній заводы, вытворчае аб'яднанне па выпуску ліцейнага абсталявання; дрэваапрацоўчая — вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Пінскдрэў». Дзейнічаюць біяхімічны завод, камбінат



XVII. *Мікрараён Паўночны*

будаўнічай індустрыі, фабрыка мастацкіх вырабаў, хімічны камбінат.

Працуюць Усесаюзны дзяржаўны праектна-вышукальны інстытут па праектаванню меліярацыйных сістэм, Палескі комплексны аддзел Беларускага НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі, тэхнікумы мяса-малочнай прамысловасці, індустрыяльна-педагагічны, гідрамеліярацыйны, улікова-крэдытны савгас-тэхнікум, вучылішчы медыцынскае, педагагічнае, тэхнічныя трыкатажнікаў, металістаў, прафесіянальна-тэхнічнае будаўнікоў і сельскае прафесійна-тэхнічнае. У горадзе 17 агульнаадукацыйных, музычная, 2 дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, 2 цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы, 14 клубаў, 2 кінатэатры. Беларускі дзяржаўны музей сацыялістычнага пераўтварэння Палесся. Дом культуры, у якім працуюць народны ансамбль танца «Палессе», народны тэатр і народны хор «Палеская песня» і інш., 6 бальнічных і 37 дашкольных устаноў. Выдаецца газета «Полесская правда».

Месцамі адпачынку з'яўляюцца набярэжныя рэк Піны і Прыпяці, лесапаркавая зона горада, парк культуры і адпачынку, у якім размешчаны мемарыяльны комплекс, прысвечаны вызваліцелям Пінска.

Па захаванасці старажытнай планіроўкі і культурных каштоўнасцей Пінск з'яўляецца адным з унікальных гарадоў Беларусі, у якім зберагліся помнікі археалогіі, гісторыі, архітэктуры, мастацтва і месцы, звязаныя з жыццём вядомых дзеячаў навукі і культуры.

Літ.: Богданович А. В. [illegible] ров Ц. А. Города Белоруссии. Краткий экономический очерк.— Мн., 1967; Город- [illegible] т. 3.— СПб., 1863; Грушевский А. С. Города Великого княжества Литовского в XIV—XVI вв. [illegible] ну.— Киев, 1918; его ж. Пинское Полесье [illegible] Киев, 1901—03; Дунец А. П., Мартюбов Б. В. Пинск.— Мн., 1.7[illegible] ров Ю. А. Градостроительство Белорус- [illegible] экономическое развитие городов Белоруссии [illegible] XX [illegible] XX [illegible] Мн., 197[illegible] Лысенко П. Ф. Города Туровской [illegible] Керкин А. Т. Пинск. Исторический очерк [illegible] Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись.— М., 1962; Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия.— СПб., 1905; Штыхов Г. В., Лысенко П. Ф. Древнейшие города Белоруссии.— Мн., 1968; [illegible] Polska pod względem historycznym, geograficznym [illegible] statystycznym [illegible] Warszawa, 1846; Kraszewski J. I. Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy. Cz. 4 [illegible] Warszawa, [illegible] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 8.— Warszawa, 1887.

С. Г. Баелаеў, М. І. Камінек, Ю. А. Пін[illegible]

1207. **БУДЫНАК ГІМНАЗІІ** (гіст.). Вул. Леніна, 39. У гэтым будынку ў 18[illegible]8 г. была адкрыта першая на Піншчыне гімназія. З 1864 г.— рэальная гімназія, у 1872 г.ператворана ў рэальнае вучылішча. У 1882—84 гг. у вучылішчы дзейнічаў гурток марксісцкага кірунку. У 1978 г. ў памяць аб першай сярэдняй агульнаадукацыйнай навучальнай установе ў Пінску на будынку ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

1208. **ВАРВАРЫНСКАЯ ЦАРКВА** (архіт., маст.). Размешчана ў цэнтральнай частцы горада. Першапачатковы будынак узведзены ў 1718 г. з дрэва ў прадмесці Пінска Каралін як касцёл кляштара бернардзінцаў. Мураваны касцёл пастаўлены ў 1786 г., у 1830-я гады перабудаваны і ператвораны ў Варварынскую царкву. З поўдня да

1208. *Варварынская царква.*



1208. *Варварынская царква. План*

XVII. *Дом культуры*



1208. *Варварынская царква. Папярочны разрэз.*

храма прылягае двухпавярховы корпус манастыра, пабудаванага ў 19 ст., з захаду ад яго — двух'ярусная званіца ў стылі класіцызму.

Царква — аднанефавы базілікальны храм. Да прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму далучаны развіты прэзбітэрый з паўкруглай апсідай. Памяшканні перакрыты цыліндрычнымі з распалубкамі скляпеннямі на падпружных арках. Пад храмам зроблены склепы, перакрытыя 2 пралётамі масіўных крыжовых скляпенняў. У сценах трапляюцца рады плінфы. Будынак завершаны двухсхільным дахам з атыкавым франтонам складанага профілю. У дэкоры фасадаў пілястры, раскрапаваныя карнізы, [illegible] абрам[illegible].

Галоўнае заходняе памяшканне, у заходняй частцы якога знаходзяцца хоры, што апіраюцца на 2 слупы, непасрэдна пераходзіць у прэзбітэрый. Скляпенні ад сцяны аддзяляе прафіляваны карніз. У апсідзе ён пераходзіць у маляваны арнаментальны фрыз, які падзяляе выкананую ў тэхніцы грызайль у традыцыях позняга класіцызму размалёўку алтарнай часткі на 2 ярусы. У ніжнім ярусе імітуюцца архітэктурныя формы карынфскага ордэра (паўратонда з 2 галерэямі, якія разыходзяцца ў 2 бакі). Столь паўратонды арнаментавана кесонамі. Адпаведны дэкор — на падпружных арках залы гэтага памяшкання. У конхе над лучковымі вокнамі, якія абрамляе стылізаваны раслінны арнамент, намаляваны [illegible]

1208. *Варварынская царква. Размалёўка конхі.*

1208. *Варварынская царква. Абраз «Маці боская з дзіцем».*

фоны. Памяж імі — размалёўка «Маці боская з дзіцем» (пачатак 20 ст.).

Царква — помнік архітэктуры, якая склалася пад уплывам барока.

[illegible] В похо[illegible] [illegible] innych krajów słowiańskich. T. 5. Warszawa, 1884.

Ю. А. Я[illegible], Г. М. [illegible]

1209. **ГАРАДЗІШЧА** (археал.). У цэнтры сучаснага горада, на левым беразе Піны, насупраць колішняга месца ўпадзення ў яе [illegible].

Складалася з дзядзінца і вакольнага горада. Дзядзінец размяшчаўся ў межах сучасных вул. Чапаева і колішняй рыначнай плошчы, прылягаў з паўднёвага боку да Піны. Паводле плана 1794 г. меў авальную форму: 80 сажняў з захаду на ўсход і 55 з поўначы на поўдзень (плошча 1,76 га). На плане паказаны абарончыя валы з усіх бакоў дзядзінца, акрамя таго, што прымыкаў да ракі. Ад вакольнага горада дзядзінец аддзяляўся паўкруглым ровам, які меў шырыню 60—80 м і глыбіню 3—4 м. З поўначы роў поўнасцю засыпаны, засталася толькі паўночна-заходняя частка.

Вакольны горад старажытнага Пінска ў 11—13 стагоддзях абкружаў дзядзінец з захаду, поўначы і ўсходу (плошча 2,1 га), падыходзячы ў 2 месцах да Піны. [illegible] яго тэрыторыя абмяжоўвалася з захаду і поўначы

вул. Ленiна, а ўсход яе мяжа праходзiць па ўсходняй частцы пл. Ленiна. Абарончыя збудаваннi (роў i вал) выяўлены ў час земляных работ. Спроба даказаць, што на тэрыторыі дзядзiнца i вакольнага горада існавала больш старажытнае гарадзішча, зроблена ў 1960 г. А. І. Мілавідавым. Раскопкі дзядзінца і тэрыторыі вакольнага горада праводзілі ў 1955—64 гг. Т. Н. Раўдзіна, Б. В. Мураноўаў, Я. Г. Рабаў, П. Ф. Лысенка. Культурны пласт захаваўся не добра, захаваліся рэшткі жылых і гаспадарчых пабудоў, часткі вуліц, дваровыя надмосткі. У асобных выпадках у раскопах ускрыта ад 6 да 9 ярусаў аднатыпных пабудоў розных характару. Знойдзены рэшткі 2 вуліц, якія ішлі ў радыяльным напрамку ад замка да знешніх умацаванняў. Яны перасякаліся 2 паўкальцавымі вуліцамі, паралельнымі абарончаму валу. Сядзібы складаліся з жылых і гаспадарчых пабудоў і абгароджваліся частаколам. Асноўным тыпам жылля былі наземныя аднакамерныя зрубныя пабудовы прамавугольнай формы плошчай каля 16 м², якія рубіліся ў вугал з астаткам, мелі драўляную падлогу і глінабітныя печы. Вуліцы масціліся ўпоперак тонкімі бярвёнамі або дошкамі. Будынкі і вуліцы доўгі час размяшчаліся на адным месцы.

1209. *Гарадзішча Пі...*



1209. *Рэчы з раскопак гарадзішча.*

Рэчы, знойдзеныя пры раскопках (прылады працы, збраю, упрыгожанні, прадметы побыту і прыладзе і хатняга ўжытку), сведчаць аб тым, што насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рамёствамі (жалезаапрацоўчым, ювелірным, касцярэзным, ганчарным, гарбарным, шавецкім, дрэваапрацоўчым, бандарным і г. д.), паляваннем, рыбалоўствам. Для ўпрыгожання жылля выкарыстоўвалася рознакаляровая керамічная плітка. Знаходкі прывазных рэчаў сведчаць аб гандлёвых сувязях з Кіевам, Валынню, Паўночным Прычарнамор'ем. Найбольш цікавыя археалагічныя знаходкі ў Пінску — фрагмент амфары з надпісам «(Я) ...полчевичо», шыферная праслiца з надпісам «ЧасвенNо прасьлNъ», мініяцюрны каменны абразок з выявай Хрыста.

Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі дазволілі вызначыць узнікненне старажытнага Пінска ў апошняй трэці 11 ст. Тэрыторыя гарадзішча з'яўляецца археалагічным запаведнікам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (г. Пінск) і ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Лысенко П. Ф. Города Туровской земли. Мн., 1974. *П. Ф. Лысенка.*

1210. ДОМ, ДЗЕ ЖЫЎ ЯКУБ КОЛАС (гіст.). Вул. Чкалава, 63 (ранейш. вул. Водаправодная). Тут, у кватэры чыгуначнага фельчара А. А. Балевіча, у 1912—15 гг. жыў народны паэт Беларусі Я. Колас (К. М. Міцкевіч). Ён працаваў настаўнікам у 3-м пачатковым вучылішчы. У Пінску напісаў творы Я. Колас напісаў ... ні «Батрак», «Як Янка забаўляўся» і інш., выдаў зборнік апавяданняў «Родныя з'явы» (1914 г.), працаваў над паэмай «Сымон-музыка».

У 1964 г. на будынку, дзе жыў Я. Колас, устаноўлена мемарыяльная дошка.

...

1210. *Дом, дзе жыў Я. Колас.*

1211. ЕЗУІЦКІ КАЛЕГІУМ (гіст., арх.). ... у гістарычным цэнтры горада, на пл. Леніна. Разам з касцёлам (не захаваўся) складаў ансамбль кляштара езуітаў. Пабудаваны ў 1631—35 гг., у 1648 і ... знаходзілася езуіцкая філасофская

1211. *Будынак езуіцкага калегіума.*

тэалагічная школа. У 18 ст. працавалі друкарня (з 1729 г.) і аптэка. З 1787 і будынак займалі базыльяне, з 1800 і у ім знаходзіўся праваслаўны мужчынскі Богаяўленскі манастыр. Цяпер у будынку размешчаны адміністрацыйныя ўстановы і карцінная галерэя.

Трохпавярховы Г-падобны ў плане будынак паўднёвым фасадам арыентаваны да набярэжнай р. Піна. Планіроўка 1-га паверха галерэйна-калідорная. Тут размяшчаліся класы, трапезная, службовыя памяшканні. 2-і і 3-і паверхі сплануваны па калідорнай сістэме з трохпралётнай схемай перакрыццяў. Крыжовыя скляпенні абапіраюцца на масіўныя падоўжныя сцены (таўшчыня ў ніжніх паверхах 1,5—2 м). Тут былі жылыя і рабочыя памяшканні. Над збудаваннем зроблены склепы. Рытм фасадаў ствараецца аконнымі праемамі з ляпнымі абрамленнямі і крокам пілястраў 2 ніжніх ярусаў. Паўднёва-заходні вугал фланкіруе шасцігранная вежа-контрфорс, што ўмацоўвае сцены пры паніжэнні рэльефу да ракі. Будынак завершаны двухсхільным дахам з заломам. Яго тарцы ўпрыгожаны складанымі франтонамі з дэкаратыўнымі валютамі.

Калегіум — прыклад манастырскага збудавання стылю барока.

Літ.: Мараш Я. Н. Ватикан и католическая [illegible] Белоруссии (1569—1795). — Мн., 1971; [illegible] zja Mińska. Warszawa, [1912]; Słownik [illegible] T. 8. Warszawa, 1887. Ю. А. Якімовіч.



1211. Езуіцкі калегіум. Вуглавая вежа-контрфорс.

1211. Езуіцкі калегіум. Бакавы фасад.

1212. ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ ЛЕНІНА (архіт.). Уключае дамы № 2, 4, 5, 8, 10, 14, 24, 38—40, пабудаваныя ў 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. і размешчаныя па «чырвонай лініі» вуліцы.

Дом № 2. На скрыжаванні вуліцы і плошчы Леніна. Пабудаваны ў 1925—28 гг. з цэглы. Пры будаўніцтве выкарыстаны прыёмы архітэктуры «мадэрн». Трохпавярховы будынак пад вальмавым двухсхільным дахам мае ў плане форму чатырохвугольніка. Крылы дома ўтвараюць вузкі ўнутраны дворык, у які вядзе праезд з боку вуліцы. Архітэктура будынка характарызуецца абмежаванай колькасцю дэкаратыўных дэталей (міжпаверхавы прафіляваны поясок, расшыўка тынкоўкі пад руст, плоскія ліштвы праёмаў, ажурныя балконныя рашоткі). Пластычнасцю дэкаратыўнага вырашэння вызначаецца вуглавы эркер.

Дом № 4. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы. Прымыкае да дома № 2 пры дапамозе крытага праезду ва ўнутраны двор. Двухпавярховы аб'ём выцягнуты ўбок двара і выходзіць на вуліцу вузкім тарцовым фасадам, расчлянёным прамавугольнымі аконнымі праемамі і вуглавымі лапаткамі. Планіровачна будынак падзелены на 2 па[illegible] з самастойнымі ўваходамі з боку вуліцы і праезду.

Дом № 5. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы ў стылі канструктывізму. Выцягнуты ўздоўж вуліцы двухпавярховы аб'ём у плане блізкі да прамавугольніка. Будынак мае калідорную сістэму планіроўкі з выхадам у двор і лесвіцай на 2-і паверх. Часткова выкарыстоўваецца гандлевымі прадпрыемствамі.

Дом № 8. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Невялікі аднапавярховы будынак з мансардавым дахам. У плане мае форму прамавугольніка і падзелены на дзве кватэры. Галоўны вулічны фасад расчлянёны 4 прамавугольнымі лучковымі вокнамі і простым карнізам, вуглы дэкарыраваны лапаткамі. Дом мае 2 уваходы з двара.

Дом № 10. Пабудаваны на рубяжы 19—20 стагоддзяў з цэглы. Аднапавярховы жылы будынак у плане блізкі да квадрата. [illegible] падзелены на 2 па[illegible]. Двухсхільны мансардны дах мае тарцовыя фігурныя шчыты. Галоўны і дваровы фасады сіметрычнай кампазіцыі з 3 лучковымі вокнамі і дзвярамі. Пры ўваходзе — лесвіца на мансарду.



1212. Забудова вуліцы Леніна. Дом № 2.

1212. Забудова вуліцы Леніна. Дом № 5.

1212. Забудова вуліцы Леніна. Дамы № 8, 10, 12, 14.



1212. *Фрагмент забудовы вуліцы Леніна з домам № 24*



1212. *З[illegible] вуліцы Леніна. Дамы № [illegible]*

Дом № 14. На скрыжаванні вуліц Леніна і Камсамольскай. Пабудаваны ў 1920—30-я гады з цэглы пад уплывам архітэктуры «мадэрн». Двухпавярховы невялікі будынак мае Г-падобны план. З боку двара да яго пры-



1213. *План 1-га паверха дома № 2 па вуліцы Савецкай*



1213. *План 1-га паверха дома № 4 па вуліцы Савецкай*

будаваны аб'ём лесвічнай клеткі. Уваходы ў дом праз праезд з боку вул. Камсамольскай. Вулічныя фасады расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праемамі, маюць 2 балконы, дэкарыраваны круглаватым атыкам, вялікім карнізам простага профілю, лапаткамі.

Дом № 24. Пабудаваны ў 1922 г. з цэглы. Аднапавярховы будынак вузкім тарцовым фасадам выходзіць у бок вуліцы. Завершаны пластычным шчытом мансарднага паверха. Прамавугольны ў плане, выцягнуты ў глыбіню двара, з боку якога знаходзяцца прыбудовы ўваходных тамбураў. Выкарыстоўваецца пад жыллё.

Дом № 38—40. На скрыжаванні вуліц Леніна і Нікалаева. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы. Будынак двухпавярховы, складаецца з 2 частак, аб'яднаных адным праездам. Вугал дома на скрыжаванні вуліц зрэзаны і вылучаны грацёным эркерам, які нависае над уваходам. У завяршэнні вугла — фігурны шчыт у форме кабошніка, дэкарыраванага філёнгамі і арнаментам з цаглянай муроўкі. Пластыку фасадаў узбагачаюць фігурныя ліштвы акон, лапаткі, філёнгі, пілястры, руст. Уваходы рызаліт завершаны ступеньчатым атыкам.

Жылая забудова на вул. Леніна з'яўляецца характэрным для 2-й палавіны 19 — пачатку 20 ст. гарадабудаўнічым ансамблем. У яго архітэктуры ўвасобіліся эклектычныя рысы.

А. М. Кулагін.

1213. ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ САВЕЦКАЙ (архіт.). Уключае дамы № 2, 4, 5, 6, 7, 8, 11, 13 — фрагмент якой забудовы 19 — пачатку 20 ст.

Дом № 2. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы, на скрыжаванні вуліц Савецкай і Кулікова. Двухпавярховы дом вузкім тарцовым фасадам выходзіць на вул. Савецкую. Сіметрычна-восевая кампазіцыя фасада падкрэслена ў цэнтры ўваходным рызалітам, завершаным фігурным атыкам з шпаклямі. Уваход вылучаны лучковым франтонам. Пластыка фасада ствараецца вуглавымі лапаткамі, лучковымі і шчапападобнымі аркамі аконных праёмаў, прафіляваным карнізам з аркатурным фрызам. Уваход на 2-і паверх — з боку двара праз самастойную лесвічную клетку. У архітэктуры выкарыстаны пластыка арнаментальныя акасці цаглянай муроўкі. У будынку размяшчала гандлёвае прадпрыемства.

Дом № 3. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Невялікі кампактны будынак уяўляе сабой аднапавярховы, прамавугольны ў плане аб'ём з шчытавым мансардавым дахам. Карніз аформлены сухарыкамі.

Дом № 4. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Развіты ў глыбіню двара, вузкім тарцовым фасадам выходзіць на вуліцу. Вулічны фасад аформлены лапаткамі, падаконнымі прафіляванымі паясамі, карнізамі простага профілю. Лесвічная клетка прыбудавана да тарцовага дваровага фасада.

Дом № 5. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Значна выцягнуты ў глыбіню двара, аднапавярховым тарцовым фасадам выходзіць на «чырвоную лінію» вуліцы. Атынкаваны галоўны фасад мае прамавугольныя вокны і завершаны фігурным мансардавым шчытом з балконам у цэнтры. У пластычнай апрацоўцы выкарыстаны вуглавыя лапаткі, руст, прафіляваныя карнізы з

1213. *Забудова вуліцы Савецкай. Дамы № 2, 4, 6*

1213. Забудова вуліцы Савецкай. Дамы № 5, 7



1213. План дома № 5 па вуліцы Савецкай

сухарыкамі. Капітальнымі сценамі і перагародкамі дом падзелены на кватэры, аб'яднаныя вакол лесвіцы, якая вядзе на мансардавы паверх.

Дом № 6. Пабудаваны ў стылі канструктывізму ў 1928 г. з цэглы. Яго двухпавярховы аб'ём мае выцягнуты прамавугольны галоўны фасад, на якім выступае плоскі ўваходны рызаліт з атыкавым завяршэннем і вертыкальнай стужкай шкла лесвічнай клеткі. Шырокія аконныя праёмы аб'яднаны доўгімі балконамі з завяршальным магутным парапетам. Мае калідорную планіроўку з 2 міжпаверхавымі лесвіцамі.



1213. План 1-га паверха дома № 6 па вуліцы Савецкай



1213. План дома № 7 па вуліцы Савецкай

Дом № 7. Цагляны аднапавярховы дом пабудаваны ў пачатку 20 ст. Складаны ў плане аб'ём з двухсхільным дахам. Вулічны фасад вырашаны плоскасна і расчлянёны лучковымі аконнымі праёмамі. У яго дэкоры выкарыстаны прафіляваны карніз, вуглавыя лапаткі. Унутры дом падзелены перагародкамі на шэраг пакояў. Уваход з боку двара. У будынку размяшчаецца медустанова.

Дом № 8. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы на скрыжаванні вуліц Савецкай і Астроўскага. Прамавугольны двухпавярховы будынак пад пакатым двухсхільным дахам падоўжным фасадам выцягнуты ўздоўж вул. Савецкай. Вулічныя фасады апрацаваны багатым архітэктурным і скульптурным дэкорам (раслінны арнамент, капітэлі, разеткі, руст, лапаткі, балясіны і інш.). 1-ы паверх расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі і руставанымі лапаткамі, 2-і — дэкараваны пластычным, арнаментальна насычаным фрызам і ляпнымі ліштвамі акон. Дом падзелены на 2 палавіны з самастойнымі ўваходамі і лесвіцамі.

Дом № 11. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Складаны ў плане, развіты ў бок двара будынак. Атынкаваны галоўны фасад сіметрычна-восевай кампазіцыі рытмічна расчлянёны лучковымі аконнымі праёмамі і філёнгамі. Вокны аформлены ліштвамі, фасады — лапаткамі і прафіляваным карнізам. Уваходы [illegible] з двара і бакавых фасадаў.

1213. Забудова вуліцы Савецкай. Дом № 8



1213. План 1-га паверха дома № 8 па вуліцы Савецкай

1213. План дома № 11 па вуліцы Савецкай

Дом № 13. На скрыжаванні вуліц Савецкай і Астроўскага. Пабудаваны ў канцы 19 ст. з цэглы. Двухпавярховы будынак з планам блізкім да прамавугольніка, пакрыты пакатым двухсхільным дахам. Фасады аформлены карнізамі, філёнгамі, рустам. Лучковыя вокны аздоблены фігурнымі ліштвамі з сандрыкамі. Дом выкарыстоўваецца гандлёвай установай, падзелены на гандлёвую і жылую часткі з самастойнымі ўваходамі.

Архітэктурны воблік забудовы вул. Савецкай мае эклектычны характар.

А. М. Кулагін.

1214. КАСЦЁЛ КАРЛА БАРАМЕЯ (архіт.). Размешчаны на ўсход ад цэнтра горада, па вул. Кірава. Пабудаваны ў 1770—82 гг. з цэглы, у былым прадмесці Пінска Каралін, на месцы старога [illegible] касцёла пастаўленага ў [illegible] г.



1213. Забудова вуліцы Савецкай. Дом № 13



1213. План 1-га паверха дома № 13 па вуліцы Савецкай

1214. Касцёл Карла Барамея.



1214. Касцёл Карла Барамея. План.

1215. [illegible] К[illegible]

Пабу[illegible] фасад[illegible] [illegible]ным трансептам. Алтарная частка не вылучана, сакрысціі размешчаны за за[illegible] алтарнай сцяной. Над ка[illegible] [illegible] двух'ярусная [illegible] шатровым дахам і купалам. У [illegible] [illegible] хоры. Характэрнай асаблівасцю [illegible] моцныя канструкцыі сцен, таўшчыня якіх у асобных месцах больш за 2 м.

Бакавыя сцены прарэзаны невялікімі арачнымі аконнымі праёмамі і расчлянёны лапаткамі. Нешматлікія элементы барочнай аздобы (пілястры, [illegible] палескі, абрамленні акон і інш.) вылучаны [illegible] колерам у аздобе. Інтэр'ер — зальны [illegible] У [illegible] высокім крыжовым скляпеннем [illegible] сцен. Дэкаратыўная аздоба інтэр'ера не захавалася.

Касцёл — помнік архітэктуры з элементамі барока.

Літ.: Nasze kościoły Diecezja Mińska. — Warszawa, 1912. *Ю. А. Якімовіч.*

1215. КЛЯШТАР ФРАНЦЫСКАНЦАЎ (архіт., маст.). Размешчаны ў цэнтры



1215. К[illegible]ел. План.

1215. Кляштар францысканцаў. Агульны выгляд.

1215. [illegible] францысканцаў. Фрагмент [illegible]



1215. *Кляштар францысканцаў. Касцёл. Галоўны алтар*

1215. *Кляштар францысканцаў. Касцёл. Бакавы алтар*

горада, паміж р. Піна і вул. Леніна.

Драўляныя кляштар і касцёл заложаны ў 1390 г. для манахаў францысканскага ордэна. У 1510 г. на месцы драўлянага касцёла збудаваны мураваны. Будынкі апошняга пашкоджаны ў час паўстання 1648 г., перабудоўваліся. У 1712—30 гг. узведзены мураваныя карпусы кляштара і зноў перабудаваны касцёл. Пры гэтым рэканструкцыі выкарыстаны муры 16 ст. У 18[illegible] перад касцёлам пастаўлена трох'ярусная мураваная званіца (арх. К. Камепска), 4-ы ярус якой дабудаваны ў пачатку 20 ст. Карпусы кляштара перабудаваны ў 1920-я гады (арх. Г. Гай).

Чатыры ўзаемна перпендыкулярныя двух- і трохпавярховыя карпусы кляштара разам з касцёлам утвараюць некалькі дворыкаў. Пабудовы маюць плоскасныя фасады, рытм якіх ствараецца прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Тарцы завершаны барочнымі франтонамі складанага профілю. Планіроўка калідорная, перакрыцці паверхаў сялепістыя.

Галоўная пабудова ансамбля — касцёл Успення дзевы Марыі — адзінанефавы храм з прыбудаванымі да яго капліцамі. Цэнтральны неф і крыжовыя выступаючая за яго паўкруглая апсіда з [illegible] накрыты стромкім [illegible] дахам, які ў месцы злучэння аб'ёмаў завершаны граненай вежачкай. Вузкія бакавыя нефы, утвораныя капліцамі, накрыты аднасхільнымі дахамі.

Заходні (галоўны) фасад расчлянёны на 3 ярусы і завершаны складаным франтонам з 2 вежамі па баках. Фасад дэкарыраваны пілястрамі, раскрапаванымі карнізамі, філёнгавымі нішамі і паяскамі. Бакавыя фасады раскрапаваны лапаткамі. Сцены бакавых нефаў прарэзаны паўцыркульнымі аконнымі праёмамі, цэнтральнага нефа і апсіды — прамавугольнымі праёмамі з лучковым завяршэннем. Галоўны неф і прэсбітэрыум перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі на распалубках.



1215. *Кляштар францысканцаў. Касцёл. Скульптурная [illegible] Гаўрыла*



1215. *Кляштар францысканцаў. Касцёл. Папярочны разрэз*



1215. *Кляштар францысканцаў. Касцёл. Падоўжны разрэз*



1215. *Кляштар францысканцаў. Касцёл. Амбон*

У інтэр'еры [illegible] аныя пазалочаныя алтары 18 ст. (6 драўляных і 1 сц[illegible] навы). У іх складаныя кампазіцы уключана шмат драўлянай скульпту ры і дэкаратыўная арнаментальная разьба, выкананая ў стылі барока.

Найбольш багата афармлены галоў ны алтар, які замыкае перспектыву інтэр'ера храма. Першы яго ярус аздабляюць скульптуры апосталаў Пятра і Паўла, завяршае антабле мент з разарваным франтонам, дзе размешчана гарэльефная кампазіцыя «Стыгматызацыя св. Францыска». Урачысты лад галоўнага алтара падкрэсліваюць бакавыя алтары з драўлянымі скульптурамі святых і разным абрамленнем алтарнага жыва пісу. На грацях разнога амбона — рэльефныя выявы 4 евангелістаў з атрыбутамі. Балдахін амбона, аздоблены ажурнай глыбокай разьбой раслінных матываў, завершаны статуяй архангела з вагамі. Дэкаратыўная разьба, драўляныя скульптуры апосталаў, пуцці і іншыя фігуры пазалочаны і пасярэбраны, што надае інтэр'еру ўрачысты і багаты выгляд.

У 1909 г. мастак С. Рудакескі расмаляваў арнаментальнымі матывамі скляпенні і падпружныя аркі, мастак Б. Вішнеўскі на сценах прэсбітэрыума напісаў 2 фрэскі «Зняцце з крыжа» і «Пакладанне звестунаў».

Касцёл — адзін з буйнейшых архітэктурных ансамбляў Беларусі стылю барока.

Літ.: Baliński M., Lipiński T. [illegible] ... dnik po Polesiu — Brześć nad Bugiem, 35; Morelowski M. Studia i materjały do historji stosunków artystycznych Polski z Zachodem a w szczególności z ziemią Leodyjską i z dawnemi Niderlandami [illegible] ... nik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 8 — W[illegible]

Л. Г. Лапцэвіч, Ю. А. Якімовіч

1216. МАГІЛА КАНАРЭЕВА Уладзіміра Рыгоравіча (гіст.). На вул. [illegible], гарадскія могілкі.

[illegible]рой Савецкага Саюза У. Р. Канарэеў нарадзіўся 12.6.1915 г. на станцыі Сафіеўка Вальнянскага р-на Запарожскай вобл. Член КПСС з 1940 г. У 1939—42 гг. працаваў на заводзе «Строммашына» ў Свярдлоўску. На фронце з 1942 г. У час вызвалення Беларусі старшына 2-й станцыі У. Р. Канарэеў у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі ўдзельнічаў у пекальных дэсантных аперацыях. Пры вызваленні г. Пінска група дэсантнікаў на чале з У. Р. Канарэевым знішчыла 2 дзоты, вызваліла каля 200 савецкіх ваеннапалонных і разам з іншымі часцямі адбіла шматлікія контратакі ворага. За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баях, У. Р. Канарэеву 7.3.1945 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Да 1968 г. служыў у Савецкай Арміі, потым жыў у г. Пінску. Памер 26.11.1973 г.

У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Навечно в сердце народном.— 3 изд.— Мн., 1984. *М. В. Кірэйчык*

1217. МАГІЛА МІНЕЕВА Дзмітрыя Міхайлавіча (гіст.). На вул. Спакойнай, гарадскія могілкі.

Герой Савецкага Саюза Дз. М. Мінееў нарадзіўся 24.10.1916 г. ў г. Горкім. Член КПСС з 1943 г. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з сакавіка 1943 г. Да верасня 1944 г. старшы лейтэнант 175-га штурмавога авіяцыйнага палка 305-й штурмавой авіяцыйнай Паўлаградскай Чырванасцяжнай дывізіі Дз. М. Мінееў зрабіў 9[illegible] баявых вы[illegible], 10 варожых самалётаў, знішчыў 8 танкаў, 38 аўтамашын, 17 [illegible] кулямётных кропак, [illegible] з гаручым і боепрыпасамі, 2 паравозы, 22 вагоны. За мужнасць і адвагу ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў Дз. М. Мінееву 23.2.1945 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саю[illegible] [illegible]я вайны жыў у Пінску. Памёр [illegible] г.

У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

1218. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ (гіст.). Вул. Астроўскага, насупраць будынка Пінскага індустрыяльна-педагагічнага тэхнікума.

У гонар савецкіх воінаў 61-й і 28-й арміі, Дняпроўскай ваеннай флатыліі 1-га Беларускага фронту і партызан, [illegible] 1944 г. ўдзельнічалі ў [illegible] Пінска, у 1964 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

1219. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА РКП(б) (гіст.). Вул. Першамайская 2. Устаноўлена ў 1951 г. на будынку, у якім у студзені — сакавіку 1919 г. знаходзіўся Пінскі павятовы камітэт РКП(б). Створаны пасля вызвалення Пінска ад нямецкіх захопнікаў, пачаў працаваць у підполлі пасля захопу горада польскімі лэгіянерамі і белагвардзейцамі 25.1.1919 г.

Літ.: Нетыльскіх А. Т. Пинск. Исторический очерк.— Мн., 1961.

1220. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ШТАБА 4-й АРМІІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ (гіст.). Вул. Леніна [illegible]. Устаноўлена ў 1951 г. на будынку, у якім 2[illegible]—20.9.1920 г. размяшчаўся штаб [illegible] арміі (2-га фарміравання) Заходняга фронту.

4-я армія сфарміравана паводле загада камандавання Заходняга фронту [illegible].8.1920 г. на базе Мазырскай групы войск. Камандуючы А. Дз. Шуваеў, з 17.10.1920 г. М. Я. Кацугын; члены РВС Я. І. Вегер, І. І. Межлаук, К. І. [illegible] начальнік штаба Вятвін[illegible] з 20.9.1920 г. С. А. Межанінаў, з 17.10.1920 г. К. К. Шіф. У склад арміі ўваходзілі: 1-я, 10-я, 1[illegible], [illegible]-я 57-я стралковыя, 17-я кавалерыйская дывізіі, 142-я стралковая брыгада, 2-я асобная і 13-я кавалерыйскія Сры[illegible]ходны атрад і асобныя запасныя ба[illegible]. З 2.9.1920 г. часці і злучэнні арміі вялі баявыя дзеянні ў раёне гарадоў Пружаны, Кобрын, Целяханы, Пінск і іншых за пераправы цераз р. Прыпяць і яе прытокі. Расфарміравана 18.10.1920 г., часці і злучэнні арміі перададзены ў 16-ю армію Заходняга фронту, штаб пераведзены на Паўднёвы фронт для фарміравання новай 4-й арміі для барацьбы з войскамі Урангеля.

Літ.: Какурин Н. Е. Р[illegible] кампания 1918—1920.— М., 1[illegible]; Какурин Н. Е., Меликов В. А. Война с белополяками 1920 г.— М., 1925; Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918—[illegible] Т. 2.— Мн., 1971; Директивы командования фронтов Красной Армии (1917—1922 гг.): [illegible] документов. Т. 4.— М., 1978; Сафчанка М. Л. На зямлі Пінішчыны // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1979, № 4.

М. І. Камінскі

1221. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ШТАБА ДНЯПРОЎСКАЙ ВАЕННАЙ ФЛАТЫЛІІ (гіст.). Вул. Дняпроўскай флатыліі, 39. Устаноўлена ў 1978 г. на будынку, у якім з 28.7.1944 г. да 3.2.1945 г. знаходзіўся штаб Чырванасцяжнай ордэна Ушакова 1 ступені Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

1222. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР ШТАБА ПАЎСТАНСКАГА ПАЛКА (гіст.). Вул. Леніна, 38. Устаноўлена ў 1974 г. на будынку, у якім пасля вызвалення горада ад германскіх войск у студзені — сакавіку 1919 г. размяшчаўся штаб 2-га Пінскага паўстанскага камуністычнага палка.

Полк сфарміраваны ў канцы лістапада 1918 г. з партызанскіх атрадаў вёсак Вітчаўскай, Лемяшэвіцкай, Мачулаўскай і Радчыцкай валасцей Пінскага павета, якія вялі барацьбу су-

1219. *Будынак, дзе знаходзіўся павятовы камітэт РКП(б)*

1223. *Будынак былога Пінскага абкома КП(б)Б, дзе працавала В. З. Харужая.*

праць акупантаў з лета 1918 г. Асабовы састаў у асноўным быў укамплектаваны ўдзельнікамі 1-й сусветнай вайны [illegible] барацьбы. Полк удзельнічаў у ліквідацыі варожых гарнізонаў і устаноў у Пін[illegible] [illegible] [illegible] [illegible] снежня 1918 г. на вызваленую партызанамі [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] часці Чырвонай Арміі 23.1.19 г. час[illegible] Чырвонай Арміі пачалі баі за [illegible] 25 студзеня вызвалілі горад [illegible]. Пінскі полк спачатку ўвайшоў у склад Пінскага гарнізона, потым у склад 17-й стралковай дывізіі Заходняй Арміі і вёў баі ў раёне Антопаля, Драгічына, Іванава, удзельнічаў у абароне Пінска. Пасля Грамадзянскай вайны полк расфарміраваны: частка яго байцоў дэмабілізавана, частка ўключана ў склад працоўнай арміі.

В. В. Маралюбаў.

1223. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ХАРУЖАЙ Веры Захараўны (гіст.). Вул. В. Харужай, 12.

У 1939—41 гг. інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі Пінскага абкома КП(б)Б працавала В. З. Харужая — Герой Савецкага Саюза (1960 г.). У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны В. З. Харужая і яе муж С. Г. Карнілаў уступілі ў створаны Пінскім абкомам КП(б)Б партызанскі атрад, які ўзначаліў В. З. Корж.

У 1964 г. на будынку, у якім працавала В. З. Харужая, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Новиков И. Г. Вера Хоружая (Очерк о жизни и деятельности пламенной коммунистки). — М., 1962.

1224. МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ (гіст., маст.). У цэнт[ральным парку] культуры і адпачынку.

[1]3.7.1944 г. часці Чырвонай Арміі выйшлі да Пінскіх балот. Нямецка-фашысцкія войскі выкарысталі цяжка праходныя поймы Прыпяці, Піны, Ясельды і стварылі моцную лінію абароны. У ноч з 11 на 12.7.1944 г. па паўднёва-ўсходняй ускраіне Пінска з караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі быў высаджаны дэсант — 1326-ы стралковы полк 415-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту і атрад маракоў. Дэсантнікі выбілі ворага з прыбярэжных умацаванняў і пачалі рухацца да цэнтра горада. Завязаліся жорсткія баі. Асабліва цяжкае становішча склалася ў палаце 2-га батальёна, калі варожыя танкі, самаходныя ўстаноўкі і пяхота прарваліся да Піны. На дапамогу дэсантнікам прыйшлі маракі бранякатэраў. Бранякатэр № 92, які вёў агонь з адкрытай пазіцыі, адрэзаў пяхоту фашыстаў, хоць сам трапіў пад моцны абстрэл ворага. У гэты час часці 55-й гвардзейскай Іркуцкай стралковай дывізіі 28-й арміі, якія прайшлі па [illegible] паўдзень, каля в. Вулька далучыліся да 61-й арміі і разам пачалі наступаць [illegible] Прыпяць, Ясельду, Піну і раніцай 1[4] [illegible]

[illegible]

1224. [illegible]

[illegible] скульпт. А. Шмакаў). Планіроўка [illegible] № 12 [illegible]

1224. *Мемарыяльны комплекс вызваліцелям. Фрагмент.*



1224. *Н[illegible] А. Ц. К[illegible]*

[illegible]ць да двухмаршавай лесвіцы. Паміж маршамі зроблены парапет з прымацаванымі да [illegible] [illegible] ам[illegible] [illegible]. Лесвіца [illegible] асноўнай кампазіцыйнай часткі комплексу — бетоннай стэлы з бронзавымі барэльефамі матроса, салдата і жанчыны. Каля падножжа стэлы — Вечны агонь. З 2 бакоў стэлы ўстаноўлены абеліскі на магілах Герояў Савецкага Саюза Ціхана Ігнатавіча Калініна і Аляксея Цімафеевіча Кулікова.

Ц. І. Калінін нарадзіўся 6.8.1916 г. ў сяле Смышляеўка Кузаватаўскага р-на Ульянаўскай вобл. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1939 г. Закончыў Горкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча імя Фрунзе ў 1941 г. У Чырвонай Арміі з жніўня 1937 г. Удзельнік баёў у раёне воз. Хасан (1938 г.) і савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1941 г.: камандзір бронепоезда № 30, намеснік камандзіра, камандзір 47-га знішчальнага процітанкавага артылерыйскага дывізіёна, з жніўня 1943 г. — камандзір 62-га асобнага гвардзейскага знішчальнага процітанкавага артылерыйскага дывізіёна [illegible] стралковай дывізіі. Удзельнічаў у баях за вызваленне Каўказа, Кубані, Крыма, Беларусі. Праявіў гераізм пры вызваленні Пінска 13.7.1944 г. Дывізіён на чале з гвардыі маёрам Ц. І. Калініным фарсіраваў р. Ясельда, захапіў плацдарм на другім беразе ракі і адбіў некалькі варожых контратак. Загінуў у гэтым баі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 25.9.1944 г. Яго імем названа вуліца ў Пінску.

А. Ц. Кулікоў нарадзіўся ў 1924 г. ў сяле Горная Пралейка Балашоўскага р-на Саратаўскай вобл. Член ВЛКСМ. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працаваў на заводзе ў Сталінградзе. На фронце з 1942 г. Удзельнічаў у баях за вызваленне Украіны і Беларусі. Вызначыўся восенню 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра. Разведчык роты А. Ц. Кулікоў адным з першых пераправіўся цераз раку, прабіўся ў стан фашыстаў, знішчыў 7 варожых агнявых кропак, разведаў сістэму абароны праціўніка і даставіў разведданыя савецкаму камандаванню. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.10.1943 г. Гвардыі матрос А. Ц. Кулікоў загінуў 12.7.1944 г. ў баі за вызваленне Пінска. Яго імем названа вуліца ў Пінску.

Літ.: В памяти народной. Мн., 1969 [illegible] Лінская и Днепро[illegible] [illegible] Великой Отечественной войне. — М., 1958. Двушин[illegible] П. Б. Мо[illegible]

[illegible] *Дудзбо, Б. В. Мірадзюбаў.*

1225. МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ДОШКІ Ў ГОНАР ПАЛЕСКАГА РЭЎКОМА І ПІНСКАГА ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКОМА (гіст.). Вул. Першамайская, 37 (цяпер сярэдняя школа № 6). Дзве мемарыяльныя дошкі ўстаноўлены ў 1979 г. на будынку, дзе размяшчаліся Палескі рэўком і Пінскі павятовы выканком. Тут з 25.1 да 20.2.1919 г. знаходзіўся Палескі рэўком, у склад якога ўваходзілі Р. М. Астроўскі (старшыня), М. С. Кавалевіч, А. Г. Палхоўскі, К. Ф. Русакоў, Капліп, Паўловіч, Сохнік, Нагорны, М. Ц. Лазапуха. У снежні 1918 г. на з'ездзе партызанскіх камандзіраў Палесся ў Століне створаны Палескі рэўком. [illegible] 1919 г. Пінск быў вызвалены ад нямецкіх войск, белагвардзейцаў і петлюраўцаў, улада перайшла да Палескага рэўкома, які 31 студзеня пастанавіў склікаць з'езд Саветаў. 20.2.1919 г. з'езд Саветаў Пінскага павета выбраў Пінскі павятовы выканком, які пачаў ажыццяўляць рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Але 5.3.1919 г. горад захапілі войскі буржуазнай Польшчы. Павятовы выканком пераехаў у Лунінец. 11 сакавіка ён быў пераўтвораны ў Пінскі павятовы рэўком.

1224. *Мемарыяльны комплекс вызваліцелям. Брынякатэр*

1225. *Будынак, дзе знаходзіўся Палескі рэўком і Пінскі павятовы выканком*

[illegible] торжестве идей марксизма-ленинизма [illegible] [illegible] [illegible] ский очерк. Мн., [illegible]

А. Г. Шчарбатаў.

1226. МЕСЦА ВЫСТУПЛЕННЯ ЧЫГУНАЧНІКАЎ У РЭВАЛЮЦЫЮ 1905—07 гг. (гіст.). Пасля падзей «Крывавай нядзелі» 1905 г. група рабочых сацыял-дэмакратаў Пінска выдала адозву «Да ўсіх рабочых Пінска» з заклікам да ўсеагульнай забастоўкі, узбраення і звяржэння самадзяржаўя. Па гэтаму закліку 29 студзеня ўсе 1500 рабочых галоўных чыгуначных майстэрняў спынілі работы. Пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратаў яны выпрацавалі і прад'явілі адміністрацыі шэраг патрабаванняў (увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня, паляпшэнне ўмоў працы, павелічэнне заработнай платы, [illegible] правоў чыгуначнікаў, выплаты зарплаты за час хваробы і інш.). Забастоўка працягвалася і ў лютым, [illegible] Палескіх чыгунак не [illegible] частку патрабаванняў забастоўшчыкаў.

Найвышэйшага размаху рэвалюцыйны рух сярод чыгуначнікаў [illegible] у час Кастрычніцкай [illegible] палітычнай стачкі і Снежаньскага ўзброенага паўстання 1905 г. У авангардзе працоўных у кастрычніцкія дні 1905 г. ішлі рабочыя галоўных чыгуначных майстэрняў. 11 кастрычніка яны аб'явілі палітычную забастоўку. Да іх далучыліся рабочыя іншых прадпрыемстваў, рамеснікі, прыказчыкі, навучэнцы. Неўзабаве жыццё горада было поўнасцю паралізавана. Для кіраўніцтва барацьбой быў [illegible] стачачны камітэт, які [illegible] баявыя дружыны, кантраляваў работу чыгуначнай станцыі, [illegible] дапамогу забастоўшчыкам, падтрымліваў рэвалюцыйны парадак у горадзе. На дапамогу працоўным Пінска прыбыў узброены атрад рабочых з Лунінца.

У падтрымку пралетарыята Масквы 9 снежня чыгуначнікі спынілі работу, да іх далучыліся рабочыя прамысловых прадпрыемстваў. На чале быў каапцыйны забастовачны камітэт з

членаў Пінскай групы РСДРП, Бунда, эсэраў, беспартыйных чыгуначнікаў. Як паведамляў 13 снежня ў дэпартамент паліцыі памочнік начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення, чыгуначнікі аб'ядналіся з гараджанамі рабочымі, узброілася каля 10 тыс. чалавек. Былі разбураны лініі тэлеграфа, рабочыя намагаліся захапіць станцыю, дзе засеў атрад войск. Але ў рашаючы момант забастовачны камітэт па прапанове прадстаўнікоў Бунда вырашыў 20 снежня спыніць забастоўку. Барацьбу працягвалі толькі чыгуначнікі. Іх выступленні былі задушаны 23 снежня атрадам карнікаў.

У 1974 г. на будынку вакзала ў гонар пінскіх чыгуначнікаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў Рэвалюцыі 1905—07 гг., устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955. *Э. М. Савіцкі*

1227. МЕСЦА, ДЗЕ ПРАЦАВАЎ ЯКУБ КОЛАС (гіст.). Вул. Чыгуначная, 7. Тут у 1912—15 гг. у 3-м прыходскім вучылішчы працаваў настаўнікам народны паэт Беларусі Я. Колас (К. М. Міцкевіч). Цяпер у будынку размяшчаецца сельская прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 28. У 1952 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Лужанін М. Колас расказвае пра сябе.— Мн., 1964; Міцкевіч У. А. З роднага кута.— Мн., 1984.

1228. МЕСЦА ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН (гіст.). Каля аэрапорта. Тут у 1942—43 гг. нямецка-фашысцкія захопнікі сістэматычна расстрэльвалі мірных савецкіх грамадзян, падпольшчыкаў і ваеннапалонных. Масавыя расстрэлы адбыліся ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада 1942 г. Усяго загублена больш за 30 тыс. чалавек. Перад прыходам Чырвонай Арміі гітлераўцы, каб знішчыць сляды свайго злачынства, раскапалі магілы, спалілі трупы, а ямы і равы заравалі. На ўшанаванне памяці загінуўшых у 1964 г. ў скверы перад будынкам аэрапорта пастаўлена стэла.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, 1941—1944.— Мн., 1965. *Г. І. Дулеба*

1229. МЕСЦА ПРАЦЫ АНАНІІ (гіст.). Вядомы беларускі рэзчык па дрэве 2-й паловы 15 — пачатку 16 ст. Ананія працаваў пры двары пінскага князя Фёдара Яраславіча. Стварыў для яго (паміж 1456—1505 гг.) на пальмавай дошцы разны абраз «Премудрость созда себе дом» на тэму прытчаў Саламонавых.

Літ.: Художники народов [illegible] слонарь. Т. 1.— М., 1 [illegible] ство стран и народов мира [illegible] дожественная энциклопедия. Т. [illegible] 1962; Уваров А. С. Резная икона «Премудрость созда себе дом»...— У кн.: Древности. Археологический вестник. М., 1868, т. 1; Вестник общества древнерусского искусства.— М., 1874, № 1—. *Г. І. Барышаў*

1230. МЕСЦА РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ РАБОЧЫХ, БАРАЦЬБЫ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ, МЕСЦА ПРАЦЫ ПЯМЫТАВА Уладзіміра Рыгоравіча (гіст.). Вул. Брэсцкая, 44, цяпер прамысловае аб'яднанне «Пінскдрэў» (раней — фанера-шпілечная і запалкавая «Прагрэс-Вулкан» фабрыкі).



1227. Будынак былога 3-га прыходскага вучылішча, у якім працаваў Я. Колас.

1230а. Месца выступленняў рабочых у рэвалюцыю 1905—07 гг. У час першай рускай рэвалюцыі на фанера-шпілечнай і запалкавай «Прагрэс-Вулкан» фабрыках адбыліся масавыя выступленні рабочых. Яны прымалі ўдзел у забастоўках у лютым і сакавіку 1905 г., ва ўсеагульнай стачцы 9—23.12.1905 г., у забастоўках у лютым і 1 Мая 1906 г. У 1974 г. ў памяць аб рэвалюцыйных выступленнях устаноўлена мемарыяльная дошка.

1230б. Месца забастоўкі ў 1928 г. На пінскай запалкавай фабрыцы «Прагрэс-Вулкан» працавала больш за 500 рабочых, якія знаходзіліся пад уплывам КПЗБ.

У канцы мая 1928 г. па патрабаванню рабочых пінскай запалкавай фабрыкі ў Варшаве была склікана канферэнцыя прадстаўнікоў усіх запалкавых фабрык Польшчы, якая прыняла рашэнне пачаць усеагульную забастоўку. Рабочыя запалкавай прамысловасці патрабавалі павелічэння заработнай платы і паляпшэння ўмоў працы. Адміністрацыя «Прагрэс-Вулкана» адмовілася весці перагаворы, і тады забастовачны камітэт аб'явіў забастоўку, якая працягвалася [illegible] месяцы. Рабочыя ў гэтай барацьбе паказалі згуртаванасць, адзінства і вытрымку. Яны не дазволілі выкарыстаць на фабрыцы штрэйкбрэхераў, дапамагалі грашовымі сродкамі найбольш бедным. Пінская арганізацыя КПЗБ правяла збор сродкаў і прадуктаў харчавання сярод рабочых і сялян для забастоўшчыкаў. Дапамагалі і салідарныя рабочыя з іншых гарадоў. Рабочыя перамаглі. Адміністрацыя была вымушана павялічыць на 17 % зарплату, заплаціць за ўвесь час забастоўкі, плаціць за звышурочную работу, забяспечыць кожнага рабочага спецвопраткай.

1230в. Месца барацьбы падпольшчыкаў у 1941—43 гг. З першых дзён акупацыі Пінска нямецка-фашысцкімі захопнікамі працоўныя горада ўзяліся за барацьбу. З [illegible] расня 1941 г. да снежня 1943 г. дзейнічала камуністычнае падполле. Сярод першых былі створаны падпольныя групы на запалкавай фабрыцы і фанерным заводзе. Падпольшчыкі вялі палітычную агітацыю сярод насельніцтва, збіралі зброю, медыкаменты, выводзілі са строю станкі і механізмы. Летам 1943 г. яны падарвалі электрастанцыю на заводзе і падпалілі цэх на фабрыцы, у верасні 1943 г. — вадакачку і семафор на чыгуначнай станцыі. У канцы 1943 г. большасць падпольшчыкаў пайшла ў партызаны.

1230г. Месца працы Пямытава Уладзіміра Рыгоравіча. На адміністрацыйным будынку прамысловага аб'яднання «Пінскдрэў» у памяць аб былым рабочым, дэпутаце Вярхоўнага Савета БССР, упаўнаважаным ЦК КП(б)Б па Пінскай вобл. партызане У. Р. Нямытаве ў 1974 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. Загінуў 30.12.1942 г. ў баі з карнікамі. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у в. Малоткавічы Пінскага р-на.

Літ.: Полуян В. А., Полуян И. В. Революционное и нац[illegible] сии в 1920—1939 гг. [illegible] выя гады падполля: Успам[illegible] наў КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.— Мн., 1958. *В. В. Караткевіч.*

1231. МЕСЦА СТВАРЭННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ПІНСКАЙ ГРУПЫ РСДРП (гіст.). Першы рэвалюцыйны гурток узнік у Пінску ў 1882 г. ў асяроддзі навучэнцаў рэальнага вучылішча. Яго члены ўстанавілі сувязь з польскай рабочай партыяй «Пралетарыят», праводзілі прапаганду сярод мясцовых рамеснікаў. Масавыя арышты членаў гуртка ўлетку 1884 г. не спынілі сацыял-дэмакратычнай прапаганды сярод працоўных горада. У 2-й палавіне 1890-х гадоў узнік сацыял-дэмакратычны рабочы гурток, на базе якога пасля І з'езда РСДРП пачала складвацца Пінская сацыял-дэмакратычная група. Члены групы наладзілі сувязі з сацыял-дэмакратамі Гомеля, Варшавы і іншых гарадоў, атрымлівалі і распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, у т. л. брашуру У. І. Леніна «Тлумачэнне закона аб штрафах, якія бяруцца з рабочых на фабрыках і заводах», газету «Искра», выданні Арганізацыйнага камітэта па скліканню II з'езда РСДРП, падрыхтавалі і выдалі ўласныя адозвы і пракламацыі «Да ўсіх грамадзян горада Пінска», «Да рабочых параходскіх майстэрняў О'Брыена дэ Ласі», «Да ўсіх пінскіх рабочых і работніц» і інш.

Пад уплывам дзейнасці сацыял-дэмакратаў у Пінску ў пачатку 20 ст. па[illegible] рабочы рух. 3—4.4.1901 г. адбылася забастоўка 100 работніц за-

палкавай фабрыкі Гальперына, якія патрабавалі скарачэння рабочага дня павелічэння заработнай платы і паляпшэння ўмоў працы. Дзень гадавіны забойства Аляксандра II (1.3 1903 г.) рабочыя адзначылі мітынгам на якім прысутнічала каля 3 тыс. чалавек. Мітынг ахоўваўся баявой дружынай і прайшоў пад лозунгамі «Далоў Раманавых!» «Няхай жыве канстытуцыя!». Праз месяц рабочыя напалі на паліцэйскі ўчастак і вызвалілі арыштаваных сацыял-дэмакратаў, пасля чаго мінскі губернатар накіраваў у Пінск 2 роты казакоў. У верасні 1904 г. баставалі рабочыя (154 чалавек) суднабудаўнічага завода, у жніўні і верасні рабочыя горада выступілі з пратэстамі супраць забойства царскімі ўладамі 2 палітычных ссыльных у Якуцку і расстрэлу рабочага мітынгу ў Беластоку.

У пачатку 1905 г. напярэдадні III з'езда партыі Пінская група РСДРП канчаткова аформілася і ўвайшла ў Паўночна-Заходні камітэт і ЦРП. У канцы 1905 г., паводле сведчання газеты «Северо-Западный край» (№ 775 ад 1.12.1905 г.), на чале арганізацыі стаяла цэнтральная партыйная група з 7 чалавек. Пры ёй працавалі калегія прапагандыстаў з 6 чалавек і 2 групы агітатараў. Былі створаны 3 раённыя (тытунёвы — 70, фабрычна-заводскі — 60 і рамесны — 50 членаў партыі) і 2 падраённыя камітэты. Пры раённых арганізацыях дзейнічалі бібліятэкі прапагандысцкай літаратуры. У Рэвалюцыю 1905—07 гг. група кіравала выступленнямі рабочых і сялян, выдавала лістоўкі, вяла прапаганду сярод рабочых, сялян, вучнёўскай моладзі, пашырыла свой уплыў на Брэст. Буйнейшыя выступленні працоўных Пінска пад кіраўніцтвам групы РСДРП адбыліся ў час Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачкі і Снежаньскага ўзброенага паўстання 1905 г. У гэтыя дні фактычная ўлада ў горадзе належала стачачнаму камітэту, баявыя дружыны рабочых здабылі зброю, ім на дапамогу прыбыў узброены атрад з Лунінца. Упартая барацьба працягвалася да 23.12.1905 г. Пасля паражэння рэвалюцыі Пінская група РСДРП была разгромлена царскімі ўладамі, большасць яе членаў арыштавана.

Літ.: История Коммунистической партии Советского Союза. Т. 1. 2. — М., 1964. [illegible] Белоруссии. Ч. 1. 2 изд. — Мн., 1968; КП(б)Б у рэзалюцыях. Ч. 1 (1903—1921 гг.). — Мн., 1934. Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы. — Мн., 1955. [illegible] в Белоруссии в 1883—1903 гг. — [illegible] Кувшинов А. А. На пути к Октябрю: Из истории партийного строительства в Белоруссии 1884—1917 гг. — Мн., 1970. *Э. М. Савіцкі.*

1232. МЕСЦА СТВАРЭННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА В. З. КАРЖА (гіст.). Вул. Заслонава, 8.

1232. Будынак, [illegible] арганізацыйнай нарадзе [illegible] рашэнне аб стварэнні партызанскага атрада В. З. Каржа.

Пінскім абкомам КП(б)Б 26.6.1941 г. быў створаны адзін з першых на Беларусі партызанскі атрад з 60 партыйна-савецкіх работнікаў і камсамольцаў г. Пінска. Камандзір атрада — загадчык сектара Пінскага абкома КП(б)Б, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1922—[illegible] гг. і нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі ў 1936—37 гг. В. З. Корж (псеўданім Камароў), камісары М. І. Бандаравец, В. Ц. Меркуль. У ліпені — жніўні 1941 г. ў атрадзе змагалася В. З. Харужая — Герой Савецкага Саюза (1960 г.). У сакавіку 1943 г. на базе атрада В. З. Каржа створана партызанская брыгада імя С. М. Будзённага Пінскага партызанскага злучэння, якая змагалася супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі Ленінскага р-на Пінскай вобл. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй (14.7.1944 г.) брыгада налічвала 1078 чалавек (3 атрады). За баявыя заслугі ў Вялікую Айчынную вайну камандзіру атрада, пазней камандзіру Пінскага партызанскага злучэння В. З. Каржу 15.8.1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1964 г. на доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны [illegible] Т. 1. — Мн., 1967; Калинин П. З. Партизанская республика. — 2 изд. — Мн., 1968; Непокорённая Белоруссия: Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.). — М., 1963. *Г. І. Дулеба.*

1233. ПАЛАЦ БУТРЫМОВІЧА (архіт.). Вул. Леніна, на левым беразе р. Піна. Пабудаваны ў канцы 18 ст. з цэглы. Цяпер у ім Палац піянераў і школьнікаў.

Аднапавярховы будынак з высокім паўпаверхам мае сіметрычны П-падобны план. Галоўны паўночна-заходні фасад, арыентаваны да вуліцы, вылучаны ў цэнтры арачным эркерам з каланадай і невялікай тэрасай. Цэнтральны ўваход на дваровым фасадзе падкрэслены пабудаваным у пачатку 19 ст. тамбурам, завершаным франтонам. Тарцы бакавых крылаў выраашаны порцікамі з падвоенымі калонамі. Сцены расчлянёны пілястрамі і завершаны развітым антаблементам з трыгліфамі. Цокаль і тамбур апрацаваны рустам. Прамавугольныя

1233. Палац Бутрымовіча. Дваровы фасад.



1233. *Палац Бутрымовіча. Галоўны фасад.*

1233. *Палац Бутрымовіча. Папярочны разрэз.*



1233. *Палац Бутрымовіча. Падоўжны разрэз бакавога крыла.*

аконныя праёмы аздоблены франтонамі, у цэнтральнай частцы ёсць паўцыркульныя эмпасты. У інтэр'еры выкарыстаны анфілады і калідоры з заламі, размешчанымі па [illegible] ну, разнастайных па форме і памерах. У цэнтры па восі сіметрыі знаходзяцца тамбур, вестыбюль і парадная авальная зала з выхадам на тэрасу, па баках — анфілады малых залаў і кабінетаў. Гаспадарчыя і службовыя памяшканні вынесены ў цокальны паверх. Аздоба інтэр'ераў не захавалася.

Палац — помнік архітэктуры позняга барока з элементамі класіцызму.

І. М. Кілаг

1234. ПОМНІК АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1812 г. (гіст.). У гарадскім парку.



1233. *Палац Бутрымовіча. План*

1233. *Палац Бутрымовіча. Аксанаметрыя*

У ліпені 1812 г. 3-я руская армія пад камандаваннем генерала А. П. Тармасава вяла баі з 7-м саксонскім корпусам генерала Ж. Рэнье, асноўныя войскі якога стаялі ў Пружанах, а асобныя атрады — у Брэсце, Кобрыне, Янаве і Пінску. А. П. Тармасаў вырашыў знішчыць непрыяцеля ў гэтых пунктах, а потым працягваць барацьбу ў тыле ворага. Створаныя ім атрады пад камандаваннем К. В. Ламберта і А. Р. Шчарбатава павінны былі рознымі шляхамі падысці 13 ліпеня да Брэста, аб'яднацца і атакаваць ворага, потым рухацца на Кобрын для злучэння з арміяй А. П. Тармасава; дзеянні 3-га атрада пад камандаваннем А. П. Мелісіно павінны былі стварыць уражанне, быццам уся 3-я армія трымае кірунак на Пінск. Гэты план быў выкананы. Корпус Ж. Рэнье, уведзены ў зман атрадам А. П. Мелісіно, з Пружан пайшоў да Янава. Атрад А. Р. Шчарбатава 12 ліпеня прыбыў пад Брэст і, не чакаючы атрада К. В. Ламберта, захапіў горад. Рухаючыся да Янава, А. П. Мелісіно накіраваў у Пінск атрад на чале з палкоўнікам Жавахавым, які разбіў там французаў і ўзяў у якасці трафея гарматы.

1234. *Помнік у гонар разгрому рускімі войскамі атрада французскіх войск у ліпені 1812 г.*

У 1978 г. ў памяць аб гэтай падзеі ўстаноўлены помнік — гранітная глыба з гарматай каля падножжа.

Літ.: Михайловский-Данилевский [А. И.] Описание Отечественной войны в 1812 году. Ч. 1. — СПб., 1839.

Г. Шчорбата

1235. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На плошчы Леніна (скульпт. М. Альтшулер, арх. М. Ма[illegible]даў; бронза, граніт; вышыня фігуры 6,5 м). Адкрыты ў 1970 г. На развітым бетонным стылабаце з выразна акрэсленымі квадратамі пліт асіметрычна размешчаны гранітная глыба і невысокі гарызантальна выцягнуты пастамент з бронзавай фігурай Ільіча. Энергічны крок, крыху расхінутае паліто, адкінутае назад ветрам, характэрны паварот галавы ствараюць рамантычна ўзнёслы вобраз правадыра рэвалюцыі. Помнік арганічна завяршае забудову галоўнай плошчы горада ў паўночнай яе частцы, з боку р. Піна.

Помнік вылучаецца манументальнай пластыкай фігуры, выразным сілуэтам, удала знойдзеным маштабам.

1236. ПОМНІК МАРАКАМ ДНЯПРОЎСКАЙ ВАЕННАЙ ФЛАТЫЛІІ (гіст.). На вул. Брэсцкай, у садзе каля матроскага клуба.

Маракі Дняпроўскай ваеннай флатыліі вызначыліся ў баях за вызваленне Пінска ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у ліпені 1944 г. За гэту аперацыю флатылія была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга, 11 воінам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, сотні матросаў і афіцэраў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, асобным часцям і злучэнням флатыліі нададзены ганаровыя найменні «Пінскіх». У гонар маракоў у 1964 г. пастаўлены мармуровы абеліск (аўтар У. Усцінецка). Імем Дняпроўскай флатыліі названа вуліца ў Пінску.

Літ.: Локтионов И. И. Пинская и Днепровская флотилии в В[illegible]. — М., 1958.

1237. ПОМНІК У ГОНАР БУДАЎНІЦТВА ШАШЭЙНАЙ ДАРОГІ ПІНСК — БРЭСТ (гіст.). На заходняй ускраіне горада на вул. Брэсцкай.

У 1935 г. пачалося будаўніцтва першай на Палессі шашэйнай дарогі Пінск — Брэст. Усе работы за мізэрную плату выконваліся былымі беспрацоўнымі (іх колькасць у 1936 г. ў Заходняй Беларусі складала больш за 25 тыс. чалавек). 8.11.1938 г. будаўніцтва дарогі, якая праходзіла праз багну палескіх балот, было скончана. У памяць аб гэтай падзеі ў 1938 г. быў адкрыты помнік — на бетонным чатырохвугольным пастаменце пастаўлены



1235. *Помнік У. І. Леніну*

8 баявых сцягоў. У 1974 г. на помніку ўстаноўлена дошка з памятным надпісам.

1238. ПОМНІК ХАРУЖАЙ [illegible] (маст.). У [illegible] вуліц Леніна і В. Харужай. Устаноўлены ў 1974 г. у гонар Героя Савецкага Саюза (1960 г.), дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адной з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну, партызанкі, публіцыста В. З. Харужай (скульпт. [illegible], арх. М. Ткачук, бетон, мармуровая крошка, вышыня помніка 4,5 м). Пабудаваны на сродкі, сабраныя камсамольцамі і моладдзю горада.

Помнік — вертыкальная трохгранная стэла са скульптурным партрэтам Харужай. Натхнёны твар поўны энергіі і сілы. Фонам скульптуры з'яўляецца цэнтральная грань стэлы. Стэла размешчана ў глыбіні асіметрычнай шматвугольнай у плане пляцоўкі, якая выкладзена бетоннымі плітамі.

[illegible]

1239. РАДЗІМА ЖАЛТОЎСКАГА Івана Уладзіслававіча (п. т.)

Рускі савецкі архітэктар, [illegible] архітэктуры (1909 г.), правадзейны член Акадэміі архітэктуры СССР (1939—56 гг.), Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР (з 1956 г.), ганаровы акадэмік АН БССР (з 1947 г.), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1932 г.), заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1944 г.). І. У. Жалтоўскі нарадзіўся 15.11.1867 г. У 1887—98 гг. вучыўся ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Вывучаў архітэктуру ў Італіі (у 1910-я гады і ў 19[illegible]—26 гг.). З 1898 г. жыў і працаваў у Маскве, займаўся праектнай, практычнай і педагагічнай дзейнасцю. Выкладаў у мастацкіх ВНУ, Інстытуце аспірантуры Акадэміі архітэктуры СССР. З 1934 г. узначальваў архітэктурную майстэрню (школу) інстытута «Маспраект».

І. У. Жалтоўскі — адзін з буйнейшых прадстаўнікоў неакласіцызму ў рускай і савецкай архітэктуры. Сярод яго работ у Маскве найбольш вядомыя — дом былога Скакавога таварыства на Скакавой алеі (1903—05 гг.), дом (былы асабняк Тарасава) на вул. А. Талстога (1909—10 гг.), жылыя дамы для рабочых завода АМО (191[illegible] г.). У 1918—23 гг. І. У. Жалтоўскі ўдзельнічаў у складанні плана рэканструкцыі Масквы, быў аўтарам праекта генплана і плана па шэрагу павільёнаў Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі 1923 г. Яму належаць праекты будынкаў Дзяржбанка (1927—29 гг.), жылых дамоў на праспекце Маркса (1933—34 гг.). За праекты жылых дамоў на Ленінскім праспекце (1949 г.) у 1950 г. прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. І. У. Жалтоўскі з'яўляецца аўтарам праекта жылых

1236. *Помнік маракам Дняпроўскай ваеннай флатыліі*

дамоў каля Смаленскай плошчы (1950 г.), на праспекце Міру (1957 г.), будынка іпадрома (1951—55 гг.), а таксама павільёна СССР на Міжнароднай выстаўцы ў Мілане (1925 [illegible] гг.), адміністрацыйных будынкаў у Махачкале (1927—28 гг.) і ў Сочы (1934—36 гг.). У 1941 г. пад кіраўніцтвам І. У. Жалтоўскага распрацаваны першы праект драматычнага тэатра ў Гомелі, у 1944 г. ён прымаў удзел у распрацоўцы плана аднаўлення і рэканструкцыі цэнтра горада. І. У. Жалтоўскі памёр 16.7.1959 г. ў Маскве.

Літ.: И. В. Жолтовский. Проекты и постройки.— М., 1955. *С. Г. Баг* [illegible]

1238. *Помнік В. З. Харужай*

1240. РАДЗІМА КОРБУТА Пятра Юльянавіча (гіст.).

Герой Савецкага Саюза П. Ю. Корбут нарадзіўся 29.9.1908 г. ў сям'і рабочых. Член КПСС з 1928 г. У Чырвонай Арміі з 1931 г. У 1932 г. скончыў Арлоўскую бранятанкавую школу, у 1941 г.— Ваенную акадэмію механізацыі і матарызацыі Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Паўднёвым, 4-м Украінскім франтах. З жніўня 1943 г. гвардыі палкоўнік П. Ю. Корбут — камандзір 37-й гвардзейскай танкавай брыгады. Вызначыўся ў лютым 1944 г. ў баях на Нікапальскім плацдарме. Танкавая брыгада пад камандаваннем П. Ю. Корбута прарвала абарончы рубеж праціўніка, знішчыла 310 салдат і афіцэраў, 59 гармат, [illegible] 6 танкаў, 22 аўтамашыны [illegible] у баі 4.2.1944 г. Пахаваны ў г. Мелітопалі. Брыгадзе за паспяхова праведзеную аперацыю было нададзена ганаровае найменне «Нікапальская», а яе камандзіру П. Ю. Корбуту 19.3.1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Літ.: Навечно в сердце [illegible] 3 изд.— Мн., 1984. [illegible]

1241. ЦАРКВА НА МОГІЛКАХ (арх.). На [illegible] Пабудавана ў 18[illegible] Драўляная, [illegible] Асноўны зруб, аднолькавы па шырыні з бабінцам, пераходзіць у пяцігранную апсіду. Зрубы накрыты агульным дахам. Над бабінцам узвышаецца чацверыковая званіца з галоўкай. Фасады ўпрыгожаны пілястрамі. Пры ўваходзе — ганак з 2 калонамі.

Царква — помнік архітэктуры ў рысах класіцызму.

1241. *Царква на могілках.*



1241. *Царква на могілках. План.*

в. Азарычы, Валішчанскі сельсавет

1242. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля клуба. Пахаваны 68 жыхароў вёсак Азарычы, Клятная, Сакалоўка, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск з 2 дошкамі: на першай — імёны ахвяр фашызму, на другой — імёны 40 воінаў-землякоў, [illegible] загінулі ў баях за Радзіму ў 1941—45 гг.

в. Альшанка, Парэцкі сельсавет

1243. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 9 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1979 г. пастаўлены абеліск.

в. Аснежыцы, цэнтр сельсавета

1244. БЮСТ РАЛЬКО Уладзіміра Антонавіча (гіст., маст.). У цэнтры вёскі, у скверы. Устаноўлены ў 1981 г. ў гонар двойчы Героя Сацыялістычнай Працы, гаспадарчага дзеяча, старшыні калгаса «Аснежыцкі» У. А. Ралько.

У. А. Ралько нарадзіўся 30.7.1922 г. ў в. Падарэсе Старадарожскага р-на Мінскай вобл. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1950 г. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у партызанскім руху на Беларусі. У 1944—50 гг. працаваў старшым інспектарам ЦСУ Пінскага р-на. З 1950 г. старшыня калгаса «Аснежыцкі» Пінскага р-на. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена 18.1.1958 г. за дасягненні ў развіцці жывёлагадоўлі і павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў, другім залатым медалём «Серп і Молат» быў узнагароджаны 23.2.1976 г. за выдатныя заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці і актыўную грамадскую дзейнасць. Член ЦК КПБ з 1976 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1966—70 гг. і з 1974 г., Вярхоўнага Савета БССР у 1959—63 гг.

Пагрудны бронзавы бюст пастаўлены на прамавугольным гранітным пастаменце (скульпт. І. Міско, арх. Ю. Казакоў; вышыня бюста 1,1 м, пастамента 2,9 м), ніжняя частка якога дэкарыравана рэльефным арнаментальным поясам з каласоў. У партрэце падкрэслена мэтанакіраванасць, валявы характар. Зрэзы плячэй, гарызантальныя і дыяганальныя заломы драпіровак адзення надаюць вобразу ўнутраную дынамічнасць. На грудзях — выявы 2 медалёў «Серп і Молат». На пастаменце — інфармацыйны надпіс.

А. Г. Шчарбатаў, Г. М. [illegible]



1244. *Бюст У. А. Ралько.*

1245. ЗАБУДОВА ЦЭНТРАЛЬНАЙ СЯДЗІБЫ КАЛГАСА «АСНЕЖЫЦКІ» (арх.).

У в. Аснежыцы — цэнтры калгаса «Аснежыцкі» — фарміруецца новы архітэктурны ансамбль пасёлка гарадскога тыпу. Сядзіба забудоўваецца з 1970-х гг. паводле праекта, распрацаванага ў 1968 г. Белдзіпрасельбудам (арх. В. М. Хандогін). Спраектаваны як адміністрацыйны і культурна-бытавы цэнтр 6 навакольных вёсак і пасёлка нафтавікоў, якія абслугоўваюць участак нафтаправода «Дружба».

Асноўная архітэктурна-планіровачная арганізацыі сядзібы — галоўная вуліца, вырашаная ў выглядзе шырокага бульвара і звязаная з грамадскім цэнтрам. Уздоўж яе пабудаваны трохпавярховыя васьмікватэрныя [illegible] жылыя дамы. Іх архітэктурнае аблічча ствараецца рытмам аконных праёмаў, балконаў, лоджый, лесвічных клетак, чырвонай і жоўтай абліцоўкай. Участак бульвара разбіты на газоны, кветнікі, баскеты, асветлены свяцільнямі-ліхтарамі, абнесены чыгуннай арнаментальна-дэкаратыўнай агароджай. Тут устаноўлены бюст двойчы Героя Сацыялістычнай Працы У. А. Ралько (гл. артыкул № 1244 «Бюст Ралько Уладзіміра Антонавіча»). Сквер звязвае плошчу з зонай адпачынку і вадаёмам.

Грамадскі цэнтр размешчаны на высокім узгорку і максімальна раскрыты ў бок галоўнага ўезду і бульвара. Уключае Дом культуры, гандлёвы комплекс, адміністрацыйны буды-



1245. *Жылая забудова цэнтральнай сядзібы калгаса «Аснежыцкі»*

пак, жылыя дамы. За грамадскім цэнтрам створаецца парк ландшафтнай планіроўкі са спарткомплексам. У агульны ансамбль сядзібы ўключана існуючая малых дуальная забудова, развіццё жылой зоны праектуецца на свабоднай тэрыторыі з паўднёва-усходняга боку вёскі. Вытворчая зона размешчана адасоблена на паўночна-заходняй ускраіне. *А. М. Кулагін*

в. Астравічы. Гарадзішчанскі сельсавет

1246. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі 12.7.1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1[illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

1247. СЕЛІШЧА (археал.). За 2 км на паўночны захад ад вёскі на плошчы больш за 4 га. Займае ўчастак другой надпоплаўнай тэрасы левага берага р. Ясельда. Выявіла і абследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Культурны пласт 0,1—0,2 м. Сабраны фрагменты ляпнога посуду з дамешкай жарствы ў цесце і насечкамі па краі венчыка, [illegible] цоўкі. Датуецца 3 ст. да н. э. — 2 ст. н. э., адносіцца да зарубінецкай культуры ранняга жалезнага веку.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

в. Ахова, цэнтр сельсавета

1248. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На могілках. Пабудавана ў 1738 г. з дрэва, перабудавана ў 18[illegible].

[illegible] цэнтраванага алтарнага і прамавугольнага цэнтральнага зрубаў і невялікага тамбура-бабінца, які аб'яднаны з цэнтральным у адзіны аб'ём. Алтарны зруб мае 2 рызніцы. Будынак звонку ашаляваны і накрыты агульным гонтавым вальмавым дахам з залобкам на галоўным фасадзе. Над бабінцам узвышаецца вежа-званіца, завершаная барочнай галоўкай. Сцены апрацаваны шалёўкай з [illegible], умацаваны лапаткамі, завершаны карнізам, вокны аздоблены ліштвамі. Галоўная і алтарная па[illegible] маюць [illegible] плоскай столі і [illegible] паміж сабой. Такой жа вышыні і бакоўкі, размешчаныя каля алтарнага памяшкання. У інтэр'еры [illegible] разьбы алтар 18 ст.

Царква — помнік архітэктуры з [illegible] ментамі барока. *[illegible]*



1247. *Селішча. План.*



1248. *Крыжаўзвіжанская царква. План.*

1249. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы каля клуба. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Бакінічы, Парахонскі сельсавет

1250. СТАЯНКА (археал.). За 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на пясчаным узгорку на правым беразе р. Бобрык. Даўжыня 150 м, культурны пласт 0,3 м. Выявіў у 1964 г. і даследаваў у 19[illegible]—67 гг. У. Ф. Ісаенка. Пры раскопках трапляюцца ранненеалітычныя знаходкі (5—4-е тысячагоддзі да н. э.; абломкі гаршкоў з расчэсанымі рыштамі ў сценках пасудзін, [illegible]падобныя прылады працы, пласцінчастыя прылады працы з крэменю) і познанеалітычныя (3-е тысячагоддзе да н. э.) прадметы, характэрныя для [illegible].

Матэрыялы [illegible] захоўваюцца ў Інстытуце [illegible] АН [illegible].

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья.— Мн., [illegible].

в. Барычавічы, цэнтр сельсавета

1251. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (г.ст.). Каля школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1962 г.

в. Бобрык, цэнтр сельсавета

1252. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Перад клубам. На ўшанаванне памяці 106 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, а таксама ад рук ворагаў Савецкай улады, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

1253. ПОМНІК ЧАПАЕВУ Васілю Іванавічу (гіст.). Насупраць будынка праўлення калгаса імя В. І. Чапаева. Бюст героя Грамадзянскай вайны В. І. Чапаева ўстаноўлены ў 1[illegible].

1249. *Помнік землякам.*

в. Ботава, Павадворскі сельсавет

1254. СТАЯНКІ (археал.)

1254а. С т а я н к а 1. За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на паўночным беразе воз. Нагосцкае, на марэнным узгорку вышынёй да 4—6 м. Даўжыня да 100 м. Выявіў і даследаваў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены больш за 300 апрацаваных крамянёў і крамянёвых прылад працы, абломкі ляпных гаршкоў. Датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н. э., існавала да эпохі бронзы.

1254б. С т а я н к а - 2. За 3 км на паўднёвы захад ад вёскі, на паўночным беразе воз. Нагосцкае, на схіле марэннага ўзгорка вышынёй 2—4 м. Даўжыня больш за 120 м. Адкрыў у 1962 г. і даследаваў у 1967—70 гг. У. Ф. Ісаенка. Выяўлены рэшткі 3 агнішчаў. Сярод знаходак — 1250 апрацаваных крамянёў, каля 200 крамянёвых прылад працы (наканечнікі стрэл, сярпы, сякеры, нажы, скрабкі і інш.), абломкі амаль 20 ляпных гаршкоў. Належыць да нёманскай культуры эпохі неаліту і культуры шнуравой керамікі бронзавага веку, ёсць рэчы ранняга жалезнага веку.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: И с а е н к о В. Ф. Неолит Припятского Полесья. — Мн., 1976. *У. Ф. Ісаенка.*

в. Ваўнюча, цэнтр сельсавета

1255. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка выканкома сельсавета. Па ўшанаванне памяці 76 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1971 г. пастаўлены помнік — абеліск з выявамі воіна і партызана і стэла з высечанымі ў граніце імёнамі загінуўшых землякоў.

1256. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя У. І. Леніна. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1967 г.



1255. Помнік землякам

1256. Помнік У. І. Леніну

в. Веляніца, Мерчыцкі сельсавет

1257. ПОМНІК СПАЛЕНЫМ ВЁСКАМ (гіст.). Побач з клубам. У лютым 1944 г. вёскі Веляніца і Рудка былі спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1968 г. ў памяць аб спаленых вёсках пастаўлены абеліск.

в. Востраў, Лясніцкі сельсавет

1258. ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1720 г. з дрэва. Часткова перабудавана ў 1869 г. Аб'ём храма пакрыты двухсхільным дахам, які на галоўным фасадзе ўтварае усечаны франтон з чацверыковай вежай і барабанам з галоўкай над ім. Вальмавы схіл над алтаром вянчае маленькі чацверыковы барабан з высокім шлемам. Перад царквой — трох'ярусная зрубна-каркасная вежа-званіца, пакрытая шатровым дахам.

Царква — помнік народнага дойлідства.

1259. СТАЯНКІ (археал.)

1259а. С т а я н к а - 1. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля моста на правым беразе р. Стыр. Займае астанец першай надпоймавай тэрасы. Даўжыня 60 м. Выявіў і даследаваў у 1965 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — грубаабабітыя сякеры, трохвугольныя наканечнікі стрэл, абломкі гліняных пасудзін. Датуецца 3-м тысячагоддзем да н. э.

1259б. С т а я н к а - 2. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Стыр, на пясчаным узгорку. Даўжыня 150 м. Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены 300 апрацаваных крамянёў, абломкі ляпнога посуду. Датуецца 5—3-м тысячагоддзямі да н. э.

1259в. С т а я н к а 3. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на пясчаных узгорках вышынёй 1—3 м над поймай левага берага р. Стыр. Даўжыня 80 м. Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — рэшткі 2 жытлаў, грубаапрацаваныя клінападобныя сякеры, пласцінчатыя наканечнікі стрэл, скрабкі, мікралітычныя вырабы, абломкі гаршкоў нёманскай культуры. Датуецца 5—4-м тысячагоддзямі да н. э.

1259г. С т а я н к а 4. За 0,5 км на ўсход ад вёскі, уздоўж дарогі на Лясніцк. Даўжыня 200 м. Выявіў і даследаваў у 1973 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены крамянёвыя прылады працы, абломкі ляпных гаршкоў з чэрнай бугрыстай паверхняй. Датуецца 3—2-м тысячагоддзямі да н. э. і раннім жалезным векам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: И с а е н к о В. Ф. Неолит Припятского Полесья. — Мн., 1976. *У. Ф. Ісаенка.*

в. Вуцвічы, Барычавіцкі сельсавет

1260. ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У паўночна-заходняй частцы вёскі. Пабудавана ў 1788 г. з дрэва, часткова перабудавана ў 1937 г.

Першапачаткова была трохзрубная, складалася з прамавугольнага бабінца, квадратнага цэнтральнага і гранінага алтарнага зрубаў. Цэнтральны зруб быў вылучаны шатровым дахам з галоўкай на глухім барабане, бабінец меў двухсхільны, а алтарны зруб — вальмавы дахі. Пры перабудове над цэнтральным зрубам зроблены высокі васьмерыковы верх на ветразях

1258. Прачысценская царква і званіца

1258. Прачысценская царква. План



1260. *Ільінская царква. Бакавы фасад*

1260. *Ільінская царква. Выгляд з боку [illegible]*



1260. *Ільінская царква. План*

(накрыты шатровым дахам), да яго бакавых сцен прырублены гранёныя прыбудовы, бабінец ператвораны ў трох'ярусную званіцу. У выніку перабудовы кампазіцыя царквы стала асіметрычнай.

Прамавугольныя вокны аздоблены ліштвамі. Масіўная трох'ярусная званіца завершана сферычным шатрыкам з галоўкай. Яе трэці ярус расчлянёны праёмамі на 2 часткі.

У інтэр'еры вылучаецца двух'ярусны цэнтральны аб'ём, у які раскрываюцца шырокімі праёмамі астатнія памяшканні. Ва ўсходняй частцы званіцы зроблены хоры, злучаныя з цэнтральным зрубам.

Помнік адлюстроўвае пераемнасць традыцый архітэктуры мясцовай школы 18 ст. і пачатку 20 ст.

Ю. А. Якімовіч

в. Вулька, Гарадзішчанскі сельсавет

1261. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 116 жыхароў вёскі, загубленых гітлераўцамі ў маі — чэрвені 1943 г., у 1979 г. пастаўлены помнік. Цэнтральная частка помніка ўяўляе сабою стылізаваныя рэшткі печы спаленай хаты, у комін якой умантаваны звон, у ніжняй частцы — барэльефная выява бацькоў, якія падтрымліваюць параненага сына. Абапал цэнтральнай часткі — дзве гарызантальныя стэлы з барэльефнымі выявамі твараў мірных жыхароў у жалобе, савецкіх воінаў і партызан і імёнамі загінуўшых землякоў.



1261. *Помнік ахвярам фашызму*

в. Вылазы, Парахонскі сельсавет

1262. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі 12.7.1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1263. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Мясцовая назва Шведскія капцы. За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, за 50 м улева ад дарогі на Ста[illegible]аселле. 5 курганоў вышынёй 0,5—0,6 м, дыяметрам 8—15 м. Насыпы паўсферычныя, расплывістыя. Вядомы з 1928 г., абследаваў у 1970 г. В. Б. Караткевіч, у 1980 г. Л. У. Дучыц. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Археологические открытия 1970 года. — М., 1971.

1264. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1887 г. з дрэва. Двухзрубная пабудова з прамавугольным галоўным і гранёным алтарным зрубамі з усходу (да сярэдзіны 19 ст. мела бабінец з званіцай). Сцены звонку ашаляваны гарызантальна, у ніжніх частках — вертыкальна. Высока размешчаныя прамавугольныя вокны аздоблены ліштвамі. Кожны зруб накрыты асобным шатровым дахам. Цэнтральны аб'ём завяршаецца масіўным чацверыковым са зрэзанымі вугламі барабанам, аздобленым падзёўкай «ромбам» і увянчаным барочным званападобным каўпаком, алтарны аб'ём — галоўкай на двух'ярусным барабане. Памяшканні маюць плоскую бэлечную

1264. *Царква Раства багародзіцы і званіца*

1264. *Царква Раства багародзіцы. План*

столь адпольвалі вышыні і пенагрэд-[illegible] тучаны паміж сабой вялікім праё-мам. [illegible] частка аддзелена іка-настасам.

Званіца, размешчаная з захаду ад царквы, пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. З'яўляецца традыцыйнай для Палесся двух'яруснай зрубна-каркаснай пабудовай, накрыта шатровым гонтавым дахам. Царква — помнік народнага дойлідства, у архітэктуры якога адлюстраваны працэс фарміравання храмаў ярусnай кампазіцыі.

Літ.: Описание церквей и приходов [illegible] Мн., 1879. *Ю. А. Якімовіч.*

в. Высокае, Гарадзішчанскі сельсавет

1265. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА САВЕЦКІМ ВОІНАМ (гіст.). На будынку школы. Устаноўлена ў 1979 г. на ўшанаванне памяці экіпажа браняkатэра БК-134 Днепроўскай ваеннай флатыліі (6 чалавек), які загінуў 12.7.1944 г. [illegible] бай супраць пяменка фашысцкіх захопнікаў пры высадцы дэсанта ў в. Пачапава.

в. Вяз, Навадворскі сельсавет

1266. СТАЯНКІ (археал.).

1266а. Стаянка-1. За 0,5 км на захад ад [illegible], на паўднёвым беразе [illegible] Пагосцкае. На пясчаным узвышшы [illegible] даўжыня 220 м, шырыня 80 м. Культурны пласт да 0,2 м. Выявіў і даследаваў у 1969 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі жытлаў, 270 крамянёвых прылад працы, абломкі каля 20 гліняных ляпных гаршкоў і інш. Датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н. э. У сувязі са стварэннем вадасховішча стаянка апынулася пад дамбай.

1266б. Стаянка-2. За 1 км на захад ад вёскі. На востраве сярод вадасховішча. Даўжыня 60 м. Выявіў і даследаваў у 1970 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — 300 апрацаваных [illegible] 3[illegible] крамянёвых прылад працы. Адносіцца да эпохі мезаліту.

Матэрыялы раскопак абераrаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья. Мн., 1976. *У. Ф. Ісаенка.*

в. Вяляцічы, Плешчыцкі сельсавет

1267. РАДЗІМА САВІЧА Францішка Андрэевіча (гіст.). Беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, паэт і публіцыст. Ф. А. Савіч нарадзіўся ў 1815 г. ў сям'і уніяцкага святара. У 1833 г. скончыў Пінскае павятовае вучылішча і вучыўся ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі (1833—38 гг.). У Вільні стварыў нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю «Дэмакратычнае таварыства». Таварыства арганізавала тайны гурток рабочых і рамеснікаў Вільні [illegible] Я. [illegible] Савіч [illegible] у Пінску [illegible] студэнцкім [illegible] у Чэрнігаве [illegible] Тарэзу [illegible] у жніўні 1837 г. з кіраўніком тайнага

1268. *Помнік на месцы першага бою партызанскага атрада В. З. Каржа*

таварыства «Садружнасць польскага народа» Ш. Канарскім. Галоўнай мэтай «Дэмакратычнага таварыства», як вызначаў яго статут «Прынцыпы дэмакратызму», складзены Ф. А. Савічам, было распаўсюджванне ідэй [illegible] братэрства паміж народамі, [illegible] да прыгнятальнікаў і надрыхтоўка паўстання, якое, на думку аўтара, павінна знішчыць дэспатызм, вызваліць сялян з-пад прыгону, надзяліць іх зямлёю, усталяваць роўнасць паміж усімі людзьмі. Далейшае развіццё поглядаў Ф. А. Савіча знайшло адлюстраванне ў пракламацыі «Заўвагі аб маральнай вайне народа з дэспатызмам».

[illegible] 1838 [illegible] паліцыя [illegible] Ф. А. Савіча [illegible] 1838 [illegible] суда ён быў [illegible] і сасланы на Каўказ [illegible] 1842 [illegible] ўцёк, але быў схоплены на румынскай граніцы і каля 2 гадоў зняволены ў

1271. *Манастырскі будынак. Тарцовы фасад*

Цірааспальскай турме. Уцёк другі раз, працаваў урачом пад імем Адам Гельтег у мястэчку Янушпаль (цяпер пасёлак Іванапаль Чуднаўскага р-на Житомірскай вобл.). Памёр каля 1845 г. Пахаваны ў Астрожку на Украіне.

З літаратурна-публіцыстычнай спадчыны Ф. А. Савіча да нас дайшлі беларускі верш «Там бліз Пінска, на шырокім полю», успаміны «Споведзь грэшніка, што каецца», напісаныя ў віленскай турме, успаміны, а таксама ліст да доктара Ф. Шаламіцкага ў Слуцк.

Літ.: Александрович С. Х. Страницы братской дружбы.— Мн., 1960; Смирнов А. П. Франц Савич.— Мн., 196[illegible] [illegible] руссии в 30—40-е годы XIX в. Мн., [illegible] *С. Ф. Цярохін.*

в. Галева, Асвежыцкі сельсавет

1268. МЕСЦА БОЮ ПАРТЫЗАН (гіст.). На паўночнай ускраіне в. Галева. Тут у пачатку Вялікай Айчыннай вайны адбыўся першы бой Пінскага партызанскага атрада В. З. Каржа.

Раніцай 4.7.1941 г. разведка атрада паведаміла, што па шашы з Лагішына на Пінск рухаецца кавалерыйскі эскадрон варожай разведкі. Узброеныя ручнымі кулямётамі, гранатамі і вінтоўкамі 60 партызан на чале з камандзірам атрада В. З. Каржом зрабілі засаду. У час бою было знішчана 17 конікаў і 2 танкеткі ворага, загінула [illegible] партызан, у т. л. камандзір аддзялення С. Г. Карпілаў.

У 1960 г. на месцы бою пастаўлены абеліск з памятным надпісам.

Літ.: Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941—1944 гг.). Сб. воспоминаний. Мн., 1961; Андрющенко П. К. Народное ополчение Белоруссии. Мн., 1980. *Г. І. Ду[illegible]*

в. Ганькавічы, Ахоўскі сельсавет

1269. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Ф. Э. Дзяржынскага. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1977 г.

в. Гарадзішча, цэнтр сельсавета

1270. ГАРАДЗІШЧА (археал.). На высокім мысападобным выступе берага воз. Палескае, каля вёскі. Пляцоўка памерам 40×20 м, не ўмацавана валамі. Абследавалі ў 1928 г. Р. Гарашкевіч, у 1961 г. Ю. У. Кухарэнка, у



1271. *Манастырскі будынак. План 1-га паверха.*

1964 г. Л. Д. Побаль, у 1970 г. В. Б. Караткевіч, у 1981 г. В. С. Вяргей. У агаленнях культурнага пласта на пляцоўцы выяўлены ляпная кераміка мілаградскага, зарубінецкага, пражскага тыпаў і ганчарная кераміка раннефеадальнага часу. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання зберагаюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск). *В. С. Вяргей*

1271. **МАНАСТЫРСКІ БУДЫНАК** (архіт.). На схіле берага вол. Палескае. Пабудаваны ў канцы 18 ст. з цэглы на тэрыторыі старажытнага праваслаўнага манастыра. Прамавугольны

1272. *Троіцкая царква. Агульны выгляд.*



1272. *Троіцкая царква. План*

1272. *Троіцкая царква. Бакавы фасад*



1273. *Помнік землякам*

ў плане двухпавярховы будынак (ніжні паверх часткова цокальны) пакрыты вальмавым дахам. Уваход на 2-і паверх праз высокі ганак. Фасады спіла аздоблены плоскімі нішамі. Над 1-м паверхам перакрыцці крыжовыя, над 2-м бэлечныя. См. стр 21

Будынак — узор манастырскай пабудовы з элементамі позняга барока.

в. Дабраслаўка,
Бобрыкаўскі сельсавет

1272. **ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). У цэнтры вёскі, каля дарогі Ганцавічы — Лагішын. Пабудавана ў 18 ст. з дрэва.

Першапачаткова была трохзрубная, складалася з асноўнага памяшкання, вузкага бабінца і алтарнай часткі, пакрытых вальмавым гонтавым дахам. У 19 ст. з захаду прыбудавана званіца. Сцены ўмацаваны лапаткамі і вертыкальна ашаляваны. Невялікія прамавугольныя вокны размешчаны высока і аздоблены ліштвамі. Сцяна галоўнага фасада завершана ўсечаным шчытом з прычолкам. Гонтавы дах пры пераходзе да алтарнага зруба паўтарае абрыс плана. Цэнтр даху над асноўным памяшканнем увенчвае двух'ярусны глухі барабан з шатровым пакрыццём.

У інтэр'еры царквы асноўнае залавае памяшканне вылучана па вышыні. У заходняй частцы аб'ёму зроблены хоры. Алтарная частка з 2 бакавымі памяшканнямі шырока адкрыта ў храм.

Царква — помнік народнага дойлідства.

Літ.: Описание церквей и приходов Минской епархии. В. 6. Пинский уезд. Мн., 1879. Ю. А. Якімовіч.

в. Дамашыцы,
Малоткавіцкі сельсавет

1273. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 30 жыхароў вёсак Дамашыцы, Жабчыцы, Залессе і Малоткавічы, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Дубай, цэнтр сельсавета

1274. **ПАРК «ДУБАЙ»** (архіт.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Закладзены як сядзібны парк у сярэдзіне 18 ст. У 1-й палавіне 19 ст. пашыраны ў паўночным напрамку і набыў пейзажную кампазіцыю. Большасць сядзібна-паркавых пабудоў не захавалася.

Парк спланаваны на квадратным участку плошчай каля 11 га, абмежаваным каналамі і сажалкамі. Асноўны зялёны масіў, які знаходзіцца за былым палацам, разам з лінавымі алеямі быў фонам для манументальных пабудоў парадыага партэра. Абапал яго былі зафлігельныя прамавугольныя баскеты з пладовым садам. Пачатковая планіроўка парку мела сіметрычна-восевы характар. Прынцыпу рэгулярнасці падпарадкоўвалася размяшчэнне палаца, жылых флігеляў, капліцы, фантанаў, кветкавых баскетаў. У паркавы ландшафт былі ўключаны араўкарыі, цыпрысы, масты і інш. Цэнтральны ўезд у сядзібу ўпрыгожвалі 2 руставанымі пілонамі, якія падкрэслівалі падоўжную вось



1274. *Парк «Дубай». Схема планіроўкі: 1 — палац; 2 — флігелі; 3 — капліца; 4 — гаспадарчыя пабудовы.*

1274. *Парк «Дубай». Капліца*

ансамбля. 2 бакавыя пад'езды праходзяць па ліпавых алеях. Планіровачна прасторавая кампазіцыя заснавана на чаргаванні адкрытых прастораў палян і вадаёмаў з цяністымі прысадамі. Прагулачныя маршруты праходзілі па алеях, уздоўж каналаў і дамб. У парку растуць мясцовыя пароды дрэў: дуб, ліпа, таполя, бяроза, хвоя, ясень, а таксама піхта, лістоўніца, тсуга канадская, каштан, валоскі арэх.

Прынцыпу рэгулярнасці падпарадкавана і арганізацыя воднай сістэмы парку. на восі палаца знаходзяцца круглая (дыяметр каля 30 м) сажалка і шэраг прамавугольных вадаёмаў. На паўднёва-заходняй ускраіне сядзібы былі рыбныя сады, якія з дапамогай дамб стваралі перапад вады і жывілі паркавыя сажалкі і фантаны.

Ад комплексу сядзібных пабудоў захавалася капліца, размешчаная на паўднёвы ўсход ад былога палаца. Васьмігранасць архітэктурнага аб'ёму, вуглавая крапоўка пілястрамі, складанасць абломаў, шлемападобнае фігурнае завяршэнне з гранёным ліхтаром надаюць капліцы барочную пластычнасць. Інтэр'ер упрыгожаны фрэскавай размалёўкай.

Парк «Дубай» — рэдкі помнік садова-паркавага мастацтва т. зв. «французскага» рэгулярнага тыпу план. роўкі 18 ст.

Літ.: Антипов В. Г. Парки Белоруссии. - Мн., 1975. *А. М. Кулагін*

1275. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Іскра». На ўшанаванне памяці 28 жыхароў вёсак Бяркозы, Дубай, Сасновічы, Стаховічы, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

1276. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт., маст.). На паўночнай ускраіне вёскі, каля шашы Брэст — Пінск. Пабудавана ў 1811 г. з цэглы.

Складаецца з цэнтрычнага васьміграннага асноўнага аб'ёму і аднолькавых прамавугольных у плане апсіды і бабінца (па восі ўсход - захад). Асноўны аб'ём пакрыты гранёным купалам, завершаным галоўкай на глухім васьмігранным барабане. Двухсхільныя дахі над алтарнай часткай і бабінцам утвараюць на фасадах трохвугольныя франтоны. Паўночная і паўднёвая плоскасці фасадаў завершаны ступеньчатымі атыкамі. Сцены апсіды, бабінца і вуглы будынка руставаныя. Вялікія вокны з паўцыркульным завяршэннем. Дэкаратыўныя дэталі вылучаны белым колерам.

Васьміграная форма асноўнага аб'ёму добра акрэслена ў інтэр'еры. Хоры падтрымліваюць 2 драўляныя калоны. На сценах захавалася размалёўка (1885 г.), выкананая ў тэхніцы грызайль, якая імітуе архітэктурныя дэталі.

Царква помнік мураванай архітэктуры класіцызму.

Літ.: Товаров А. В. Историко-статистическая ... Минской епархии. — Мн., 1903. *Г. М. Ярмоленка*



1276. *Царква Раства Багародзіцы. План.*

1276. *Царква Раства Багародзіцы. Бакавы фасад.*

в. Жабчыцы,
Малоткавіцкі сельсавет

1277. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). Каля дарогі на Пінск. Пабудавана ў 1788 г. з дрэва, капітальна адрамантавана ў 1863 г. Складаецца з 3 роўных па вышыні зрубаў. Асноўны амаль квадратны ў плане і пяцігранны алтарны зруб пакрыты агульным дахам з вальмам над алтаром і васьмігранай вежай. Зруб бабінца падзелены на 2 ярусы і пакрыты двухсхільным дахам. На другім ярусе размешчана званіца. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікам.



1277. *Царква Параскевы Пятніцы. План.*



1277. *Царква Параскевы Пятніцы. Агульны выгляд (злева), бакавы фасад.*

царква ... помнік ... народнага [illegible] ... краю.

Т. В. Гаўрысь

в. Жоўкіна, Ласіцкі сельсавет

1278. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 41 воін, партызан і мірны жыхар, якія загінулі ў 1941—44 гг. У 1967 г. на ўшанаванне іх памяці і памяці 69 землякоў, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, пастаўлены абеліск.

в. Житнавічы, Малоткавіцкі сельсавет

1279. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці [illegible] жыхароў вёсак Вялікая Вулька, Житнавічы, [illegible], якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Заполле, Аснежыцкі сельсавет

1280. СЯДЗІБА (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Сядзібны дом, пабудаваны ў 1920-я гады з дрэва, акружаны невялікім паркам пейзажнага [illegible] тыпу. На тэрыторыі сядзібы пракладзены 2 узаемна перпендыкулярныя алеі. [illegible] частцы парку [illegible] сад.



1280. *Сядзіба. Схема планіроўкі.*



1280. *Сядзібны дом. План.*

Дом [illegible] прамавугольны ў плане аб'ём, накрыты фігурным мансардавым дахам. Уваходы на галоўным і дваровым фасадах выдзелены чатырохкалоннымі порцікамі таскан[скага] ордэра. Выразнасць кампазіцыі дасягаецца спалучэннем нераўназначных [illegible] плана[мернай] формай мансардавага даху і манументальнымі порцікамі. У планіроўцы дома выкарыстана анфіладна-калідорная сувязь памяшканняў. У цэнтральнай частцы двухсветлавы вестыбюль, [illegible] злучаецца з парадный залай. У крылах размешчаны службовыя памяшканні з асобнымі бакавымі уваходам.

Сядзіба [illegible] характэрным для пачатку 20 ст. прыкладам [illegible] у архітэктуры форм барока [illegible]

[illegible]

в. Калбы, Лапацінскі сельсавет

1281. КАПЛІЦА (архіт., гіст.). У [illegible] ры вёскі.

Пабудавана ў 19 ст. Васьмігранны ў плане будынак з барочным купалам, вяршыню якога ўвянчае цыбулепадобная галоўка на глухім васьмігранным барабане. Уваход выдзелены навесам з трохвугольным франтонам. Сцены цагляныя, [illegible] з дрэва, пакрыццё металічнае. Знадворку [illegible] [illegible].

Каплі[ца] — помнік архітэктуры [з] рысамі барока і класіцызму.

У вёсцы з 11.8 па 3.9.1916 г. [illegible] рускі паэт Аляксандр Блок, які знаходзіўся на ваеннай службе, удзельнічаў у будаўніцтве [illegible]. Пра гэты перыяд свайго жыцця А. Блок пісаў у лістах да маці А. А. [illegible]

1281. [illegible]

1280. *Сядзібны дом.*

[illegible] Петух і [illegible] Д. Менд[зел]еевай-Блок. [illegible] вызначыў паэт [illegible] малюнак [illegible] капліцы.

в. Камень, Загародскі сельсавет

1282. СТАЯНКІ (археал.)

1282а. Стаянка 1. На [illegible] ускраіне вёскі, на пясчаных нагорках [illegible] да 1,0 м. Выявіў і даследаваў у 1960 г. У. Ф. Ісаенка. Культурны пласт часткова пашкоджаны [illegible]. Сярод знаходак — больш за 150 крамянёвых прылад працы. Адносіцца да эпохі мезаліту (8—5-е тыс. да н. э.).



1282. *Стаянкі. План.*



1282. *Стаянкі. Крамянёвыя прылады працы.*

1282б. Стаянка-2. За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе левага берага р. Бобрык. Займае тэрыторыю памерам 200×60 м. Даследаваў у 1967—80 гг. У. Ф. Ісаенка. Культурны пласт 0,6 м падзяляецца на 2, месцамі на 3 гарызонты. Дзякуючы высокаму ўзроўню грунтавых водаў і вапнавому складу глебы захаваліся вырабы з рогу і косці. Ускрыта 8500 м² плошчы. Выяўлены рэшткі наземных жытлаў, агнішчаў, абкладзеных камянямі, сабрана больш за 4 тыс. касцей, якія належалі, відаць, не менш як 200 жывёлам (дзік — 30 %, лось — 10 %, конь, тур, алень высакародны — да 7 %, мядзведзь, бабёр, казуля, бык свойскі — 20 %, свіння 7 %). Косці быка трапляюцца ў ніжнім гарызонце разам з ранненеалітычнымі знаходкамі, гэта першыя звесткі аб свойскай жывёле на тэрыторыі Беларусі. Па колькасці знаходак стаянка займае выключнае становішча на Палессі: каля 40 тыс. апрацаваных крамянёў (у т. л. 8 тыс. прылад працы), 20 тыс. абломкаў 250—300 гаршкоў неалітычных гаршкоў нёманскай і ... культур. З прылад працы ... сякеры, ... скрэблы, скрабкі, ... трохвугольныя наканечнікі стрэл і коп'яў, нажы і інш. Прылады працы, зробленыя з рогу і касцей жывёлы (70 экземпляраў — сякеры, цёслы, долаты, кліны і інш.), да раскопак стаянкі былі вядомы на Палессі толькі па выпадковых знаходках. Стаянка адносіцца да неаліту і бронзавага веку (5—2-е тысячагоддзі да н. э.).

1282в. Стаянка-3. За 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, паблізу хутара Шаламіцкага. Займае заходні схіл пясчанага ўзгорка вышынёй 5—7 м на левым беразе р. Бобрык. Даўжыня 80 м. Даследаваў у 1967—80 гг. У. Ф. Ісаенка. Пры раскопках знойдзены 700 апрацаваных крамянёў, 192 прылады працы (трохвугольныя наканечнікі стрэл, крамянёвыя серп, ... абломак матыкі беларуска-літоўскага тыпу, плітка для шліфавання і інш.), абломкі 15 ляпных гаршкоў. Датуецца 4—2-м тысячагоддзямі да н. э.

1282г. Стаянка-4. За 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на паўночна-заходнім схіле ўзгорка каля хутара Шаламіцкага. Даўжыня 200 м. Даследаваў у 1967—71 гг. У. Ф. Ісаенка. Культурны пласт 0,2 м. Знойдзены 1000 апрацаваных крамянёў, у т. л. каля 200 прылад працы (пласцініістыя ... скрабкі ... і інш.), абломкі ... посуду. Адносіцца да мезалітычнай і неалітычнай культур (9—4-е тысячагоддзі да н. э.).

1282д. Стаянка-8. На захад ад вёскі і р. Бобрык, абапал пратокі ... Нагосціяе. Даўжыня да 100 м. За час раскопак (1977—78 гг. У. Ф. Ісаенка) ускрыта 400 м². Культурны пласт 0,3—0,5 м. Знойдзены рэшткі агнішчаў, косці жывёл, вырабы з косці, рогу і крэменю, шліфаваныя пліткі і абломкі посуду эпох неаліту і бронзавага веку, іглападобныя наканечнікі дроцікаў (6), рыбалоўныя кручкі (20), сякеры, нажы з расшчэпленых пласцін дзіка, унікальны сэрцападобны амулет, праколкі, кінжалы і інш., некалькі вырабаў з медзі і бронзы.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР, Дзяржаўным музеі БССР і Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Літ.: Исаенко В. Ф. Некоторые черты неолитической эпохи Полесья.— У кн.: Археологические открытия 1969 года. М., 1970; я г о ж. Неолитическое поселение Камень в верховьях Припяти.— У кн.: Вопросы истории. Мн., 1969; я г о ж. Неолит Припятского Полесья.— Мн., 1976; я г о ж. Изучение Полесья.— У кн.: Археологические открытия 1978 года. М., 1979.
У. Ф. Ісаенка.

1283. *Царква.*



1283. *Царква. План.*

1283. ЦАРКВА (архіт.). На могілках на левым узвышаным беразе р. Бобрык. Пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. з дрэва.

Прамавугольны ў плане асноўны аб'ём з прырубленай невялікай пяцісценнай апсідай і трох'яруснай званіцай. Асноўны аб'ём завершаны двухсхільным гонтавым дахам. Пакрыццё над апсідай асобнае вальмавае. Званіца ўвянчана нізкім шатром з барабанам і макаўкай.

Царква — помнік драўлянага дойлідства.

в. Клятная,
Валішчанскі сельсавет

1284. ПОМНІК САВЕЦКІМ АКТЫВІСТАМ (гіст.). За 300 м на паўднёвы ўсход ад вёскі. Тут у ліпені 1941 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 12 актывістаў калгаса імя Карла Маркса. У 1967 г. на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

в. Кнубава, Плешчыцкі сельсавет

1285. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 70 жыхароў вёсак Вялікія Дворцы, Вяляцічы, Дворцы, Кнубава, Сярнікі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Кончыцы, Дубайскі сельсавет

1286. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 37 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Купяцічы,
Гарадзішчанскі сельсавет

1287. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. 19.3.1943 г. фашысты расстралялі 8 сем'яў савецкіх актывістаў (33 чалавекі). У 1958 г. на магіле ўстаноўлена мемарыяльная пліта.

XVIII. ЛАГІШЫН

Гарадскі пасёлак (з [illegible] г.) у Пінскім р-не (з 1962 г.). Знаходзіцца за 28 км ад Пінска і 203 км ад Брэста, па аўтамабільнай дарозе Пінск — Івацэвічы.

Упершыню упамінаецца ў пісьмовых крыніцах у 1552 г., уваходзіў у Пінскі павет Вялікага княства Літоўскага. У 17 ст. мястэчка, цэнтр старoства, якім валодалі Радзівілы. У 1643—1776 гг. меў магдэбургскае права і герб.

У 1795 г. пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай Лагішын увайшоў у склад Расійскай імперыі; мястэчка Пінскага павета Мінскай губерні. У першую сусветную вайну быў акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі. У 1921—39 гг. у складзе буржуазнай Польшчы, цэнтр гміны Пінскага павета Палескага ваяводства. Тут дзейнічала падпольная арганізацыя КПЗБ. Пасля ўз'яднання ў 1939 г. Заходняй Беларусі з БССР Лагішын у складзе Пінскай вобл., з 15.1.1940 г. да 1962 г. цэнтр раёна. З чэрвеня 1941 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія знішчылі ў Лагішыне і раёне 1952 жыхароў. У раёне дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (16.7.1943 г.— 10.7.1944 г.) і ЛКСМБ (май 1943 г.— 10.7.1944 г.), якія ўзначальвалі барацьбу з акупантамі, дыслацыраваліся партызанскія брыгады імя В. У. Куйбышава, імя В. М. Молатава і 208-ы партызанскі полк імя І. В. Сталіна. Вызвалены 15.7.1944 г. часцямі 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр А. П. Турчынскі) 28-й арміі 1-га Беларускага фронту сумесна з партызанамі 208-га партызанскага палка імя І. В. Сталіна (камандзір Я. М. Бяспояскаў).

Забудова пасёлка ўпершыню ўпарадкавана генеральным планам 1958 г. Новы праект развіцця Лагішына створаны ў 1973 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва. Сучасная планіровачная структура характарызуецца акрэсленай прамавугольнай сістэмай вуліц і развіваецца ў паўднёвым напрамку. Асноўныя транспартныя артэрыі — вуліцы Тамілава і Ленінская, якія падзяляюць пасёлак на 4 жылыя раёны з квартальнай сістэмай планіроўкі. На вул. Ленінскай сканцэнтраваны ўстановы гандлёва-бытавога абслугоўвання: магазіны, гасцініца, універмаг, кафэ, камбінат бытавога абслугоўвання, аўтастанцыя, шэраг двухпавярховых мураваных дамоў. Кампазіцыйным цэнтрам гэтай часткі пасёлка з'яўляецца сквер. Ансамбль цэнтра пасёлка ўключае кінатэатр, Дом культуры і 2 помнікі архітэктуры 19 — пачатку 20 ст.— Петрапаўлаўскі касцёл і Троіцкую царкву. У скверы пастаўлены помнік У. І. Леніну і помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан. Фарміраванне новага грамадскага цэнтра прадугледжана на скрыжаванні вуліц Ленінскай і Савецкай.

Асноўныя прамысловыя прадпрыемствы: вытворчы ўчастак Пінскага гарадскога малочнага завода, маслазавод, вапнавы завод, хлебапякарня, каўбасны цэх. Працуюць аддзяленне Дзяржкамсельгастэхнікі, камбінат бытавога абслугоўвання.

У пасёлку сярэдняя і музычная школы, яслі-сад, Дом культуры, кінатэатр, 2 бібліятэкі, бальніца.

Зонай адпачынку з'яўляецца парк і тэрыторыя ўздоўж берагоў р. Ясельда.

А. М. Кулагін

XVIII. *Забудова вуліцы Ленінскай.*

1288. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан*

1288. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У скверы на вул. Ленінскай. Пахаваны 34 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Пры набліжэнні часцей Чырвонай Арміі 2 батальёны 208-га партызанскага палка імя І. В. Сталіна спрабавалі вызваліць Лагішын. У ноч на 9 ліпеня яны атакавалі яго з 3 бакоў. Пачаўся жорсткі бой. Нягледзячы на колькасную перавагу сіл праціўніка, асобныя групы партызан прарваліся ў цэнтр пасёлка. Раніцай на дапамогу фашыстам падышло падмацаванне з Пінска, і партызаны адступілі. У час баёў загінулі 25 партызан. 11.7.1944 г. партызанскі полк злучыўся з часцямі 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі 28-й арміі і 15.7.1944 г. разам з воінамі ўдзельнічаў у вызваленні Лагішына.

У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

М. М. Казлоўская

1289. ПЕТРАПАЎЛАЎСКІ КАСЦЁЛ (архіт.). На вул. Тамілава. Пабудаваны ў 1907—09 гг. з цэглы. Да асноўнага прамавугольнага аб'ёму па падоўжнай восі прылягаюць пяцігранная апсіда прэсбітэрыя і чатырох'ярусная званіца, з боку апсіды — некалькі дапаможных памяшканняў. Усе аб'ёмы маюць стромкія высокія дахі. Сцены расчлянёны контрфорсамі, вокны стральчатыя.



1289. *Петрапаўлаўскі касцёл. План.*

1289. *Петрапаўлаўскі касцёл.*

1289. *Петрапаўлаўскі касцёл Званіца*

Касцёл — помнік архітэктуры і готычнага стылю

1290. **ПОМНІК ЛЕНІНУ** Уладзіміру Ільічу (гіст.). У скверы, па вул. Ленінскай. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1957 г.

1291. **ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). На вул. Камсамольскай, у скверы. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Да асноўнага квадратнага ў плане аб'ёму, які завершаны 5 галоўкамі, далучаны чатырохгранная апсіда і праз невялікі пераходны аб'ём — трох'ярусная званіца.

Агульная кампазіцыя і дэкаратыўная аздоба помніка выкананы у псеўдарускім стылі

в. Ладараж, Ласіцкі сельсавет

1292. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 14 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Лапацін, цэнтр сельсавета

1293. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 21 воін, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на тэрыторыі сельсавета. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск. На мемарыяльных дошках увекавечана памяць 97 жыхароў вёсак Калбы, Капюхі, Лапацін, Ласічы, Полхава, Хлябы, што загінулі на франтах і ў партызанах, а таксама закатаваны гітлераўцамі

1294. **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БЛОКУ** Аляксандру Аляксандравічу (гіст.). На будынку Дома культуры Устаноўлена ў 1980 г. ў гонар паэта, які ў час ваеннай службы у 1916 г. жыў у в. Лапацін. У Доме культуры ў 1980 г. адкрыты музей Экспануюцца творы паэта на рускай мове, пераклады яго твораў на мовы народаў СССР і замежныя, літаратура і дакументы аб жыцці і творчым шляху, шматлікія фотаздымкі А. Блока і яго сучаснікаў

1295. **СТАЯНКА** (археал.). За 1 км на паўдзень ад вёскі, на пясчаным узгорку каля р. Стыр. Даўжыня ўздоўж берага ракі 80 м, вышыня над поймай 5—8 м. Даследаваў у 1970, 1980 гг. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены рэшткі 2—3 агнішчаў, больш за 200 крамянёвых прылад працы, абломкі посуду эпохі неаліту і бронзавага веку

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

в. Ласіцк, цэнтр сельсавета

1296. **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КАВАЛЕВІЧУ** Мікалаю Сцяпанавічу (гіст.)

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на Палессі ў Грамадзянскую вайну. М. С. Кавалевіч нарадзіўся ў 1891 г. ў сялянскай сям'і. Чл. КПСС з 1917 г. Батрачыў у памешчыкаў. У 1915 г. арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць. У 1918 г. старшыня Вытчаўскага валаснога рэўкома, член Палескага рэўкома, з студзеня 1919 г. камендант г. Пінск. У 1919—22 гг. на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. У ліпені 1941 г. прызначаны камандзірам партызанскага атрада «Смерць фашызму». Загінуў пры выкананні баявога заданія ў зоне дзейнасці атрада.

У 1979 г. на ўшанаванне яго памяці на Доме культуры ўстаноўлена мемарыяльная дошка. *А. Г. Шчарбатак*

1297. **ПОМНІК ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ І ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 61 земляка, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1978 г. пастаўлены абеліск. Побач устаноўлены 2 пліты з імёнамі 74 воінаў 369-га стралковага палка 212-й стралковай дывізіі 61-й арміі, што загінулі пры вызваленні вёскі ў 1944 г.

1298. **СТАЯНКА І ПАСЕЛІШЧА** (археал.)

1298а. С т а я н к а - 1 За 1 км на поўнач ад вёскі, на левым беразе р. Стыр. Займае ўсходнюю схіл пясчанага ўзвышша Даўжыня каля 150 м Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены крамянёвыя прылады працы і абломкі ляпнога посуду Датуецца 5—4-м тысячагоддзямі да н. э.

1298б. П а с е л і ш ч а 2 За 2 км на захад ад вёскі, на левым беразе р. Стыр. Займае цэнтральную частку пясчанага ўзвышша Даўжыня да 100 м. Выявіў і даследаваў у 1964 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзена больш за 1000 апрацаваных крамянёў, 90 прылад працы (наканечнікі стрэл, скрабкі, скоблі і інш.), абломкі гліняната посуду. Адносіцца да эпохі неаліту і ранняга жалезнага веку

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР

Літ.: И с а е н к о В. Ф. Некоторые черты неолитической эпохи Полесья // Археологические открытия 1969 года. М., 1970 *У. Ф. Ісаенка*



1290. *Помнік У. І. Леніну*

1291. *Троіцкая царква. Фрагмент бакавога фасада.*



1291. *Троіцкая царква. План*



1293. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*

в. Лемяшэвічы, цэнтр сельсавета

1299. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Непадалёку ад царквы. Пахаваны 367 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую [illegible] вайну на тэрыторыі [illegible]савета. Сярод пахаваных — воіны [illegible] палка 415-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, што загінулі ў баях 10—12.7.1944 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1300. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2 км [illegible] ад вёскі у хваёвым лесе, абапал дарогі на Марозавічы. 29 насыпаў паўсферычнай формы, круглых і авальных у плане, вышын[illegible] 2 м, дыяметрам ад 8 [illegible] да 14—16 м. Абследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Насыпаны на месцы селішча ранняга жалезнага веку. Раскопкі не праводзіліся.

1301. СЕЛІШЧА (археал.). За 2,5—3 км на поўнач ад вёскі, на правым беразе р. Прыпяць, на пясчаным узвышшы, якое з усіх бакоў акружана балотамі. [illegible] і абследаваў у 1963 г. У. Ф. [illegible] у 1980 г даследавала В. [illegible] Знойдзены крамя[illegible] [illegible] і стрэл, каменныя сякеры, фрагмент крамянёвага сярпа, нажы, праколкі, ляпная і ганчарная кераміка. На паўночнай ускраіне селішча ў 1980 г былі закладзены 2 раскопы агульнай плошчай 500 м². Культурны пласт 0,30—0,38 м. Выяўлены ляпная кераміка, вялікая колькасць гліняных грузілаў, праслiц, грузікаў, бронзавыя літая прамавугольная спражка, фрагменты фібулы, арнаментаванага бранзалета і пласцінкі, 2 скіфскія наканечнікі стрэл і завушніца, вырабы з жалеза (спражка, нажы, цвікі, абломак сярпа і г. д.). Селішча адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку (6 ст. да н. э.— 4 ст. н. э.), знаходзіцца на месцы стаянкі неаліту і бронзавага веку.

Матэрыялы даследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.
В. С. Вяргей.

1302. СТАЯНКА (археал.). За 3 км на паўднёвы захад ад вёскі, на схіле пясчанага ўзгорка, які падыходзіць з захаду да воз. Святое. Даўжыня 150 м, вышыня над узроўнем вады 3—4 м. Выявіў і абследаваў у 1963 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — трохвугольныя наканечнікі стрэл, валынскі серп з чорнага крэменю, скрабкі, пласцінкі, разцы, абломкі гліняннага посуду часткова з раслiннымі дамешкамі. Адносіцца да ранняга і позняга неаліту.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

1303. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 188[illegible] г. з дрэва. Асноўны квадратны ў плане зруб накрыты чатырохсхільным дахам з накошнікамі і чацверыковай галоўкай у цэнтры. Прамавугольная апсіда, сярэдні аб'ём і бакавыя прыбудоўкі надаюць царкве крыжападобны план. Пры ўваходзе — трох'ярусная шатровая званіца.

Царква — узор архітэктуры псеўда[illegible].

в. Лісяцічы, Мерчыцкі сельсавет

1304. ПОМНІК СПАЛЕНАЙ ВЕСЦЫ ([illegible]). На [illegible] ускраіне вёскі. У [illegible] 1944 г. вёска была цалкам спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вайны адноўлена. У 1968 г. ў памяць аб спаленай вёсцы пастаўлены абеліск.

в. Лышча, цэнтр сельсавета

1305. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 40 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

1306. ПОМНІК КІРАВУ Сяргею Міронавічу (гіст.). У цэнтры вёскі каля клуба. Бюст С. М. Кірава ўстаноўлены ў 1971 г.



1303. *Царква Раства багародзіцы План.*



1301. *Селішча. План*



1302. *Стаянка План.*

в. Любель, Аснежыцкі сельсавет

1307. МЕСЦА ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН (гіст.). На [illegible] ускраіне вёскі [illegible] фашысцкія захопнікі [illegible] вайну расстралялі 8 жыхароў в. Любель. У 1977 г. на ўшанаванне памяці

1303. *Царква Раства багародзіцы*

1309. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

ахвяр фашызму на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

в. Любель-Поль, Аснежыцкі сельсавет

1308. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. У чэрвені 1943 г. ў Любель-Поль уварваўся фашысцкі карны атрад. Акупанты расстралялі 140 жыхароў, у т. л. дзяцей, жанчын і старых, а вёску спалілі. Пасля вайны адноўлена. У 1963 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму на магіле пастаўлены абеліск.

в. Малоткавічы, цэнтр сельсавета

1309. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У скверы. Пахаваны 95 воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных — Шая Іосіфавіч Бяркові ч і Уладзімір Рыгоравіч Нямытаў.

Ш. І. Бяркові ч нарадзіўся 14.3. 1918 г. ў г. Барысаў у сям'і рабочага. Член КПСС з 1942 г. Скончыў Ленінградскі тэхнікум чыгуначнага транспарту (1938 г.). З 1938 г. інжынер Упраўлення Беларускай чыгункі ў г. Гомелі. З 1939 г. сакратар, з верасня 1940 г. першы сакратар Пінскага гаркома ЛКСМБ. З ліпеня 1941 г. сакратар пінскіх падпольных абкома і гаркома ЛКСМБ, адначасова з лістапада 1942 г. камісар партызанскага атрада імя С. Лазо. Загінуў у баі 30.12. 1942 г.

У. Р. Нямытаў нарадзіўся ў 1898 г. на Арлоўшчыне ў сям'і рабочага. Кандыдат у члены КПСС. Да Вялікай Айчыннай вайны працаваў на Пінскай запалкавай фабрыцы імя 17 Верасня. 24.3.1940 г. быў выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, стаў партызанам. З ліпеня 1942 г. камандзір узвода партызанскага атрада імя С. Лазо, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Пінскай вобл. Загінуў у баі 30.12.1942 г. У чэрвені 1943 г. адпаму з партызанскіх атрадаў брыгады імя В. М. Молатава прысвоена імя У. Р. Нямытава. Яго імем названа вуліца ў Пінску.

У 1967 г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

М. В. Кірэйчык

в. Мерчыцы, цэнтр сельсавета

1310. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Побач са школай. На ўшанаванне памяці 48 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

1311. СЕЛІШЧА (археал.). За 0,3 км на захад ад вёскі, на правым беразе р. Ясельда. Памеры 500×280 м. Адкрыла і абследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Сабраны крамянёвыя адшчэпы, грубаляпная гладкасценная кераміка з дамешкамі жарствы ў цесце, рэшткі ганчарнай керамікі, абломак цёмна-зялёнага шклянога бранзалета. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі. Раней на месцы селішча была стаянка каменнага веку.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

В. С. Вяргей

в. Месткавічы, Плесніцкі сельсавет

1312. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1875 г. з дрэва. Царква чатырохзрубная, крыжовакупальная. Пры ўваходзе — зруб бабінца са званіцай на другім ярусе. Светлавы васьмігранны барабан на

1312. *Троіцкая царква. Фрагмент бакавога фасада.*

сярэдкрыжжы накрыты шлемападобным купалам. Такі ж купал над званіцай завершаны шпілем. Сцены гарызантальна ашаляваны і аздоблены разьбой (пілястры, кранштэйны і сухарыкі карнізаў, падзоры, лиштвы).

Царква — помнік архітэктуры з рысамі класіцызму.

в. Мясцічы, Барычавіцкі сельсавет

1313. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1794 г. з дрэва.

Мае трохзрубную падоўжна-восевую кампазіцыю. Да прамавугольнага ў плане цэнтральнага аб'ёму з захаду прымыкае прамавугольны бабінец, з усходу — пяцігранны алтарны зруб. Цэнтральны аб'ём спачатку меў пірамідальны верх (ліквідаваны пры перабудовах 19—20 стагоддзяў), цяпер вылучаны шатровым дахам, увянчаным галоўкай на барабане. Над астатнімі аб'ёмамі пакрыццё вальмавае. Сцены гарызантальна ашаляваны дошкамі, умацаваны лапаткамі, прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі.

У інтэр'еры ўсе памяшканні маюць плоскую бэлечную столь аднаго ўзроў



1311. *Селішча. План.*

1312. *Троіцкая царква.*



1312. *Троіцкая царква. План.*

ню, злучаюцца паміж сабой вялікімі праёмамі. Алтарнае памяшканне аддзелена невысокім іканастасам. У заходняй частцы бабінца зроблены хоры. На поўнач ад храма на масіўных падрубах стаіць двух'ярусная зрубна-каркасная званіца, накрытая гонтам. Ярусы падзелены развітым прычолкам. Сцены ніжняга і ніз другога яруса ашаляваны

Царква і званіца — помнікі драўлянага дойлідства Прыпяцкага Палесся

Ю. А. Якімовіч

в. Невель, Хоінскі сельсавет

1314. ВАЙСКОВЫЯ МОГІЛКІ (гіст.). Каля калгаснага двара. Тут пахаваны рускія і нямецкія салдаты, якія загінулі ў 1-ю сусветную вайну. У 1936 г. каля ўваходу на могілкі пастаўлена стэла з надпісам на рускай і нямецкай мовах: «Сябры і ворагі, смерцю аб'яднаныя».

1315. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля калгаснага двара. Пахаваны 188 жыхароў вёскі, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 12.12.1942 г. У 1949 г. на магіле пастаўлена стэла.

1316. СТАЯНКІ (археал.)

1316а. Стаянка-1. За 1,5 км на захад ад вёскі на схіле пясчанага ўзгорка. Даўжыня каля 40 м. Выявіў у 1966 г. і даследаваў у 1969, 1979 гг. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — прылады працы з крамянёвых пласцінак, прылады працы тыпу свідэр эпохі мезаліту і неаліту.

1316б. Стаянка-2. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на паўднёвым схіле пясчанага ўзгорка над рачной пратокай. Даўжыня да 120 м. Выявіў у 1966 г. і даследаваў у 1969 гг. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены крамянёвыя нажы, скрабкі, трохвугольныя наканечнікі стрэл, сякеры. Датуецца эпохай неаліту (3-е тысячагоддзе да н. э.).

1316в. Стаянка-3. За 0,5—1 км на поўнач ад вёскі, на рачной тэрасе ... схілах уздоўж за пратокай, на ўзроўні 3—6 м над вадой. Даўжыня больш за 200 м. Выявіў у 1970 г. і даследаваў у 1973, 1980 гг. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — крамянёвыя прылады працы (скрабкі, кобкі, нажы і іншыя вырабы), рэшткі глінянага посуду. Помнік адносіцца да неаліту, трапляюцца рэчы і больш позняга часу.



1313. *Царква Параскевы Пятніцы. План.*



1316. *Стаянкі. План*

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР

У. Ф. Ісаенка

в. Новы Двор, цэнтр сельсавета

1317. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 60 жыхароў вёсак калгаса «Камунар», якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск

1318. СТАЯНКІ (археал.)

1318а. Стаянка-1. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, на заходнім беразе воз. Пагосцкае, на паўднёвым схіле ўзвышша ніжэй вусця р. Вісліца. Даўжыня 120 м. Выявіў і даследаваў у 1967 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак — 110 крамянёвых прылад працы (пласціністыя разцы, наканечнікі стрэл, скрабкі, праколкі). Адносіцца да эпохі мезаліту (9—5-е тысячагоддзі да н. э.).

1318б. Стаянка-2. За 1 км на ўсход ад вёскі, за прыазёрным балотам, на пясчаных узгорках на заходнім беразе воз. Пагосцкае. Даўжыня амаль 150 м. Выявіў і даследаваў у 1967 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены 60 прылад працы, у т. л. тронкавы наканечнік кап'я. Адносіцца да эпохі неаліту (3-е тысячагоддзе да н. э.)

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

У. Ф. Ісаенка

1319. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

в. Пагост-Загародскі, цэнтр Загародскага сельсавета

1319. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на вул. Леніна. Пахаваны 11 воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя (салдат і дзяўчынка).

1320. МЕСЦА ЖЫЦЦЯ БЛОКА Аляксандра Аляксандравіча (гіст.). Тут у ліпені 1916 г. ў час вайсковай службы жыў рускі паэт А. А. Блок

1321. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.) У цэнтры вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 61 воіна, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і 34 жы-

1313. *Царква Параскевы Пятніцы і званіца.*

1321. *Помнік землякам*

хароў вёскі — ахвяр фашызму ў 1968 г. пастаўлены абеліск.

1322. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі, у скверы. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 19..8 г.

1323. СТАЯНКІ (археал.)

1323а. Стаянка-1. За 2 км на захад ад вёскі, на ўсходнім беразе воз. Пагосцкае. Даўжыня 80 м. Выявіў у 1967 г. У. Ф. Ісаенка. У 1978 г. засыпана дамбай.

1323. *Стаянкі. План*

1323. *Стаянкі. Крамянёвыя прылады працы.*

1323б. Стаянка-2. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе правага берага р. Бобрык. Даўжыня 300 м. Выявіў і даследаваў у 1967 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены крамянёвыя прылады працы, абломкі ляпнога посуду. Адносіцца да нёманскай культуры неаліту (5—3-е тысячагоддзі да н. э.) і ранняга жалезнага веку.

1323в. Стаянка-3. За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, за могілкам сярод сасняку. Даўжыня 200 м, паверхня пашкоджана эрозіяй. Выявіў і даследаваў у 1966 г. У. Ф. Ісаенка. Большая частка крамянёвых прылад працы, знойдзеных на стаянцы, адносіцца да эпохі мезаліту.

1323г. Стаянка-4. За 1 км ад вёскі, на паўднёвым беразе воз. Пагосцкае. Даўжыня 300 м, культурны пласт 0,2 м. Даследаваў у 1967—70 гг. У. Ф. Ісаенка. Выяўлены рэшткі жылля, больш за 110 прылад працы, 800 апрацаваных крамянёў, абломкі гаршкоў, шліфаваныя каменныя сякеры. Адносіцца да нёманскай культуры.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

У. Ф. Ісаенка

1324. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі на скрыжаванні вуліц. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Асноўны васьмігранны аб'ём накрыты купалам з галоўкай. Да яго прылягаюць пяцігранная апсіда, прамавугольны сярэдні аб'ём і двух'ярусная званіца (васьмярык на чацверыку) з купалам. Вокны ў асноўным маюць паўцыркульныя ілюстры. Сцены завершаны карнізам з сухарыкамі.

Царква — помнік архітэктуры з рысамі позняга класіцызму. *Т. В. Габрусь*

в. Паняцічы,
Бярозавіцкі сельсавет

1325. МЕСЦА ЗАГУБЫ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі, за 700 м ад чыгункі. Тут фашысцкія карнікі ў Вялікую Айчынную вайну расстралялі 13 жыхароў в. Беркалы. У 1967 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

в. Парахонск, цэнтр сельсавета

1326. МЕСЦА ЖЫЦЦЯ БЛОКА Аляксандра Аляксандравіча (гіст.). Тут у



1324. *Царква. План*

1322. *Помнік У. І. Леніну*

жніўні 1916 г. і студзені 1917 г. жыў рускі паэт А. Блок. У ліпені 1916 г. ён быў прызваны ў армію і накіраваны ў штаб 13-й інжынерна-будаўнічай дружыны Усерасійскага земскага саюза, якая размяшчалася ў раёне Пінска. 1.8.1916 г. штаб пераехаў у в. Парахонск. Дружына, дзе служыў А. Блок, праводзіла дарожныя і фартыфікацыйныя работы. У час пасадак у атрады, размешчаныя за некалькі

1324. *Царква*

дзесяткаў кіламетраў ад асноўнай базы, паэт пазнаёміўся з жыццём і бытам беларускіх сялян. Адсюль А. Блок перапісваўся з Л. Андрэевым і іншымі рускімі пісьменнікамі, а 16.1.1917 г. у Парахонску сустрэўся з пісьменнікам А. М. Талстым. 19.3.1917 г. А. Блок выехаў з Беларусі. Захаваліся лісты паэта з Парахонска да маці.

З. З. Бянько.

в. Пар, Ласіцкі сельсавет

1327. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Побач са школай. На ўшанаванне памяці [illegible] аднавяскоўцаў, якія загінулі [illegible] супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1969 г. пастаўлены абеліск

в. Парэчча, цэнтр сельсавета

1328. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У скверы, каля школьнай майстэрні. Тут пахаваны 4 воіны і партызаны, якія



1329. *Парк «Парэчча». Схема планіроўкі: 1 — крухмальны [illegible] гаспадарчыя пабудовы.*



1329. *Парк «Парэчча». Фрагмент.*



1330. *Царква Раства Багародзіцы. План.*

загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

1329. ПАРК «ПАРЭЧЧА» (архіт.). На правым беразе р. Ясельда, займае плошчу каля 60 га. Закладзены пры сядзібе Скірмунтаў, якая ўключала суконную фабрыку (1837 г.), цукровы завод (1860 г.), бровар (1905 г.), крухмальны завод і іншыя гаспадарчыя пабудовы. У 2-й палавіне 19 ст. адзін з старых фабрычных будынкаў перабудаваны пад палац. На астраўку, утвораным Ясельдай і яе прытокам Ясенам, быў насаджаны пладовы сад. Парк мае рэгулярную планіроўку. Яго тэрыторыя падзелена дарогай Маталь — Лагішын на паўночную і паўднёвую часткі. Выразная геаметрычная сетка ўзаемна перпендыкулярных алей гарманіруе з ландшафтам зарэчнай часткі. Перад будынкам крухмальнага завода быў размешчаны газонны партэр, абмежаваны з 2 бакоў радамі высокіх лістоўніц.

У парку каля 30 відаў дрэў, а таксама шэраг экзатычных насаджэнняў, якія ў значнай меры вызначаюць яго аблічча. Сярод іх — піхты (белая, сібірская, аднакаляровая), елкі (канадская, Энгельмана), дугласіі (шызалістая і блакітная), лістоўніца еўрапейская і інш. Каля сажалкі, на паўночнай ускраіне парку, расце адзіны ў рэспубліцы экземпляр залацістай [illegible]. Каштоўнымі пародамі з'яўляюцца унікальны экземпляр кіпарыса балотнага і 5 цюльпанавых дрэў. З мясцовых парод — [illegible] дуб чырвоны, клён, каштан, бук, арэхавыя дрэвы З.бальда, пладаносныя экземпляры дуба шарлахавага. Паўднёвая частка парку — дуброва, дзе растуць пераважна чырвоны дуб і белая акацыя. Значны ўчастак парку заняты пад пладовы сад.

Парк «Парэчча» — узор рэгулярнага парку з каштоўным дэндралагічным складам.

І. А. Сіткевіч.

1330. *Царква Раства Багародзіцы.*

1330. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1912 г. з дрэва. Асноўны чацверыковы зруб мае трох'ярусную кампазіцыю і завершаны галоўкай. З 4 бакоў да яго прылягаюць [illegible] бакавыя алтары і пяцігранная апсіда, якія надаюць будынку крыжападобны план. Пры ўваходзе — трох'ярусная шатровая званіца. У аздобе фасадаў выкарыстана дэкаратыўная разьба (карнізы, ліштвы, вуглавыя накладкі).

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

в. Пінкавічы, Аснежыцкі сельсавет

1331. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 197 воінаў 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі 20-га

1331. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

стралковага корпуса 28-й арміі 1-га Беларускага фронту і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у ліпені 1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

1332. МЕСЦА ПРАЦЫ КОЛАСА Якуба (гіст.). У в. Пінкавічы з жніўня 1904 г. да студзеня 1906 г. ў народным вучылішчы працаваў настаўнікам Я. Колас (К. М. Міцкевіч). Ён распаўсюджваў рэвалюцыйную літаратуру сярод насельніцтва, дапамог выпрацаваць патрабаванні да мясцовага памешчыка Скірмунта аб свабоднай лоўлі рыбы ў 2 азёрах, адмове ад незаконнага захопу сялянскіх угоддзяў і аб уступцы сервітутнага ўчастка зямлі. У вёску прыбылі ўзброеныя казакі і разагналі сялян, якія выступілі супраць памешчыка. Я. Колас у парадку пакарання быў пераведзены ў Верхменскае народнае вучылішча. Гэты перыяд даў матэрыял для апісання жыцця жыхароў в. Выганы ў аповесці «У глыбі Палесся» (1927 г.).

На будынку школьнага музея ў 1962 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

1333. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1830 г з дрэва.

Трохзрубная царква складаецца з прамавугольнага бабінца, васьмерыковага цэнтральнага і пяцісценнага алтарнага зрубаў. Цэнтральны зруб выцягнуты па папярочнай восі, што стварае кампактную цэнтрычную кампазіцыю. Ён завершаны шатровым дахам, з якім злучаецца вальмавы дах алтарнага памяшкання і двухсхільны бабінца. Над бабінцам узвышаецца завершаная шатровым дахам чацверыковая званіца. Сцены звонку апалякваны гарызантальна. Высока размешчаны прамавугольныя вокны аздоблены ліштвамі. Усе 3 памяшканні злучаюцца паміж сабой вялікімі праёмамі і перакрыты пірамідальнымі ўсечанымі зверху скляпеннямі. У бабінцы зроблены хоры.

1333. *Пакроўская царква. Бакавы фасад.*



1335. *Помнік камсамольцам-падпольшчыкам.*

Царква — помнік драўлянага дойлідства з элементамі стылю барока.

Ю. А. Якімовіч

в. Пласкінь,
Бобрыкаўскі сельсавет

1334. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 64 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, і 15 мірных жыхароў — ахвяр фашызму ў 1970 г. пастаўлены абеліск.

в. Плончава,
Калавуравіцкі сельсавет

1335. ПОМНІК КАМСАМОЛЬЦАМ-ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці камсамольцаў-падпольшчыкаў вёскі, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлена стэла.



1333. *Пакроўская царква. План.*

в. Рудка, Мерчыцкі сельсавет

1336. СЕЛІШЧА (археал.). За 0,2 км ад вёскі, на правым беразе р. Ясельда. Памеры 600×350 м. Адкрыла і абследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Сабраны крамянёвы інвентар (адшчэпы, пласціны, нажы, скрабкі, разцы і інш.), некалькі фрагментаў грубаляпных пасудзін з дамешкамі жарства ў цесце і шмат ганчарнай керамікі з штрыхаваным і хвалістым арнаментам. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і сярэднявечча. Раней на месцы селішча была стаянка каменнага веку.

Матэрыялы абследавання зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

в. Стытычава, Плешчыцкі сельсавет

1337. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Р. І. Катоўскага. На ўшанаванне памяці 74 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1978 г. пастаўлены помнік з барэльефнымі выявамі твару савецкага воіна, ордэна Айчыннай вайны і імёнамі загінуўшых землякоў.

в. Сушыцк,
Гарадзішчанскі сельсавет

1338. СТАЯНКІ (археал.).

1338а. С т а я н к а - 1. За 1 км на захад і паўночны захад ад вёскі, абапал дарогі на вёскі Кліш і Гарадзішча, што пракладзена ўздоўж надпоплаўнай тэрасы р. Ясельда, паміж пясчаных узгоркаў. Даўжыня да 300 м. Выявіў у 1962 г. і даследаваў у 1966 г. У. Ф. Ісаенка. Сабраны крамянёвыя прылады працы эпохі неаліту, абломкі глінянага посуду. Частка знаходак адносіцца да ранняга жалезнага веку.

1338б. С т а я н к а - 2. За 0,5—1 км на ўсход ад вёскі, на пясчаных узгорках, уздоўж надпоплаўнай тэрасы р. Ясельда. Даўжыня каля 200 м. Выявіў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка, даследавала ў 1980 г. В. С. Вяргей. Знойдзены скрабкі, пласціны, разнастайныя наканечнікі стрэл, абломкі гаршкоў эпохі неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў.

1338в. С т а я н к а - 3. За 1,2 км на ўсход ад вёскі, уздоўж дарогі, якая праходзіць па краі надпоплаўнай тэрасы р. Ясельда. Даўжыня да 400 м.



1336. *Селішча. План.*



1337. *Помнік землякам.*

Культурны пласт захаваўся часткова. Выявіў і даследаваў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, праколкі і прылады працы, якімі секлі, абломкі ранненеалітычнага посуду, кераміка позняга неаліту, ранняга бронзавага і жалезнага вякоў.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

У. Ф. Ісаенка.

в. Табулкі, Парэцкі сельсавет

1339. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 21 аднавяскоўца, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Хваросна, Валішчанскі сельсавет

1340. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля клуба. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1950 г.

в. Цвярдоўка, Мерчыцкі сельсавет

1341. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Насупраць школы. На ўшанаванне памяці 13 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1979 г. пастаўлены абеліск.

в. Церабень, Лемяшэвіцкі сельсавет

1342. СТАЯНКІ (археал.).

1342а. Стаянка 1. За 2 км на ўсход ад вёскі, побач з прыстанню. Даўжыня каля 200 м. Выявілі ў 1957 Ю. У. Кухаранка і Б. В. Міралюбаў, даследавалі ў 1963 г. У. Ф. Ісаенка, у 1980 г. В. С. Вяргей. Знойдзены крамянёвыя прылады працы, каменныя сякеры, рэшткі 2 зямлянак, 4 пахаванні ранняга жалезнага веку. Большасць знаходак адносіцца да позняга неаліту і бронзавага веку.

1342б. Стаянка 2. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, на пясчаным узгорку ў левабярэжжы Прыпяці. Даўжыня 200 м, культурны пласт збярогся часткова. Выявіў і даследаваў у 1975 г. У. Ф. Ісаенка. Сярод знаходак вялікая колькасць апрацаваных крамянёў (у т. л. наканечнікі стрэл, нажы, скрабкі, сякеры, разцы і інш.), абломкі гліпянага посуду, рэшткі агнішчаў, посахападобная шпілька. Адносіцца да позняга неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР і Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск).

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолит Припятского Полесья.— Мн., 1976; Кухаренко Ю. В. Первобытные памятники Полесья.— М., 1962.

У. Ф. Ісаенка.

в. Чамярын, Парэцкі сельсавет

1343. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 18 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены абеліск.

в. Чухава, Навадворскі сельсавет

1344. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны 6 чырвонаармейцаў, якія загінулі ў сакавіку 1919 г. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1345. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 47 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

1346. СТАЯНКА (археал.). За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на паўночным захадзе беразе воз. Пагоскае. Займае ўзгорак вышынёй 3–5 м. Даўжыня 120 м. Выявіў і даследаваў у 1966 г. У. Ф. Ісаенка. Культурны пласт да 0,3 м. Сярод знаходак — 700 апрацаваных крамянёў, 150 прылад працы і абломкі амаль 10 ляпных гаршкоў. Датуецца 4–3-м тысячагоддзямі да н. э.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.



1338. [illegible] План.



1342. *Стаянкі. План.*



ПРУЖАНСКІ РАЕН

- Могільнікі (грунтавыя, курганныя), курганы
- Цэнтры рамёстваў
- Помнікі і месцы рэвалюцыйнага руху (Рэвалюцыя 1905–07 гг., Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, Грамадзянская вайна, барацьба працоўных Заходняй Беларусі)
- Помнікі і месцы воінскай славы
- Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (месцы баёў, магілы савецкіх воінаў і партызан, Курганы Славы, помнікі землякам і інш.)
- [illegible] фашызму [illegible] насельніцтва, спаленыя і неадноўленыя вёскі [illegible]
- Помнікі і месцы, звязаныя з імёнамі савецкіх партыйных, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў культуры, навукі і тэхнікі
- [illegible] абарончыя збудаванні (замкі, [illegible], крэпасці, форты і інш.)
- Палацы, сядзібы, [illegible]
- [illegible]
- Адміністрацыйныя і грамадскія збудаванні [illegible]
- Помнікі манументальнай скульптуры і жывапісу

XIX. ПРУЖАНЫ

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны на р. Мухавец, за 89 км на паўночны ўсход ад Брэста, 13 км ад чыгуначнай станцыі Арапчыцы (на лініі Баранавічы — Брэст). Вузел аўтамабільных дарог на Брэст, Высокае, Шарашова, Слонім, Кобрын.

Першае ўпамінанне аб Пружанскай воласці адносіцца да 1433 г. Пружаны вядомы з 1487 г. пад назвай Дабучын. Да 1519 г. ў Кобрынскім княстве. Пасля смерці кобрынскага князя Івана Сямёнавіча Пружаны перайшлі ва ўладанне да яго жонкі Фядоры, у 1519 г. па прывілеі вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога — да маршалка В. Касцевіча, уваходзілі ў Кобрынскае староства. З 1520 г. ў Кобрынскім павеце Падляшскага ваяводства, з 1566 г. ў Брэсцкім павеце і ваяводстве. Каралева Рэчы Паспалітай Бона, якая ў 16 ст. некаторы час валодала Пружанамі, дала гораду герб: на сярэбраным полі [illegible] вужака паглынае малое дзіця. У 1589 г. горад, які на гэты час быў даволі буйным гандлёвым цэнтрам, атрымаў магдэбургскае права, за ім замацавалася назва Пружаны. Тут праводзіліся 4 кірмашы ў год. Паводле інвентару 1563 г., у Пружанах было 1250 жыхароў, 7 вуліц, 278 гаспадарак. У час войнаў сярэдзіны 17 — 1-й паловы 18 ст. горад моцна разбураны. У 1776 г. пазбаўлены магдэбургскага права. Да канца 18 ст. адноўлены, у 1791 г. 2054 жыхары. З 1795 г. Пружаны ў складзе Расіі, горад, цэнтр павета Слонімскай, з 1797 г. Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У 1852 г. ў прадмесці Горкі пабудавана капліца, у 1861—65 гг. у цэнтры Пружан — сабор Аляксандра Неўскага, у 1875—78 гг. Спаса-Праабражэнская царква. У 1-й палове 19 ст. былі гарбарны, піваварны, цукровы і маслабойны заводы. У час паўстання 1863—64 гг. на Пружаншчыне дзейнічалі атрады Р. Рагінскага, С. Сонгіна і [illegible]. 3.2.1863 г. яны занялі горад.

Адмена прыгоннага права станоўча адбілася на эканамічным развіцці горада. Паводле перапісу 1897 г. ў Пружанах 7633 жыхары (43,4 % пісьменных), 14 дробных прадпрыемстваў, павятовае і двухкласнае прыходскае вучылішчы. У час Рэвалюцыі 1905—07 гг. у Пружанах адбыліся забастоўкі рабочых тытунёвай фабрыкі.

З жніўня 1915 г. горад акупіраваны нямецкімі, з 30.1.1919 г. да ліпеня 1920 г. польскімі войскамі. З 27.7 да 19.9.1920 г. ў горадзе існавала Савецкая ўлада, дзейнічаў павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Паводле Рыжскага мірнага дагавора ў 1921—39 гг. Пружаны ўваходзілі ў склад буржуазнай Польшчы, павятовы горад Палескага ваяводства. Барацьбу працоўных за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне [illegible] арганізацыі КПЗБ, КСМЗБ, Беларуская сялянска-рабочая грамада.

З канца 1939 г. Пружаны ў складзе БССР, з 15.1.1940 г. цэнтр раёна Брэсцкай вобл. 23.6.1941 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1942 г. дзейнічаў падпольны антыфашысцкі камітэт, з 23.11.1943 г. да 11.7.1944 г. падпольны райком КП(б)Б, з 1.9.1943 г. да 11.7.1944 г. падпольны райком ЛКСМБ. Акупанты нанеслі гораду вялікія страты, жыллёвы фонд быў разбураны на 70 %. 17.7.1944 г. Пружаны вызвалены войскамі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту.

У 19[illegible] г. у абласных праектных майстэрнях г. Баранавічы распрацавана схема планіроўкі Пружан, якая ўпарадкоўвала нерэгулярную сетку вуліц. У 1974 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва складзены генеральны план горада.



XIX. *Вуліца Камуністычная*

У горадзе 3 планіровачныя раёны: паўднёвы, заходні і ўсходні. Планіровачная структура вызначаецца цэнтральнай восевай магістраллю (вуліцы Савецкая, Кобрынская, Кастрычніцкая), перпендыкулярнымі да яе вуліцамі Леніна, Камуністычнай, Чырвонаармейскай і звілістым абрысам поймы р. Мухавец. Гістарычным цэнтрам горада з'яўляецца Савецкая пл., дзе зберагліся помнікі архітэктуры 19 ст.: гандлёвыя рады і сабор Аляксандра

XIX. *Вуліца Леніна. Фрагмент забудовы канца 19 — пачатку 20 ст.*

XIX. *Цэнтральная плошча*

XIX. *Забудова вуліцы Юбілейнай*

Неўскага. Новы адміністрацыйна-грамадскі цэнтр Пружан склаўся па вуліцах Камуністычнай і Савецкай. У забудове вылучаюцца Дом Саветаў, гасцініца, жылы дом з крамамі. Цэнтральная частка горада і цэнтр усходняга раёна забудаваны шматпавярховымі жылымі дамамі. Узніклі новыя мікрараёны ў паўночнай частцы горада і на вул. Кастрычніцкай.

Асноўныя прамысловыя прадпрыемствы: агародніна-кансервавы камбінат, масласырзавод, кансервавы завод, хлебазавод, ільнозавод, камбінат будаўнічых матэрыялаў. Працуюць раённае аб'яднанне Дзяржкамсельгастэхнікі, раённае вытворчае аб'яднанне бытавых паслуг і інш., ёсць мотастанцыя.

У Пружанах дзейнічаюць саўгас-тэхнікум, 4 сярэднія (у т. л. школа-інтэрнат), музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, 7 дашкольных устаноў, 2 Дамы культуры, 2 кінатэатры, 2 бібліятэкі, бальніца, Брэсцкая абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя, занальная аграхімлабараторыя. Выдаецца газета «Зара камунізму».

Помнікі: У. І. Леніну, В. З. Харужай, лётчыку С. М. Гудзімаву, савецкім лётчыкам, абеліск на брацкай магіле савецкіх воінаў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Гарадская зона адпачынку знаходзіцца ў заходняй частцы Пружан каля штучнага вадаёма і звязана р. Мухавец з паркам у паўночнай частцы горада, дзе захаваўся помнік архітэктуры — гарадская сядзіба 19 ст.

Літ.: Богданович А. В., Сидоров П. А. Города Белоруссии. Краткий экономический очерк.— Мн., 1967; Жучкевич В. А., Малышев А. Я., Рогалев Н. Е. Города и сёла Белорусской ССР. Историко-географические очерки.— Мн., 1959; Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.— М., 1965; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, [illegible] i statystycznym. T. [illegible] Warszawa, 18[illegible]; Wysłouch S. Rozwój granic i terytorium pow[i]atu [illegible] do [illegible] XX wieku. Wi[lno], 19[illegible] (Odbitka z «Ateneum Wileńskiego» 1929, rocznik 6, zesz. 3—4); M. F., U. R. Prużana i jej okolice — Ziemia, 1911, t. 2, № 47.

У. В. Аляксейчык, С. Ф. Цярохін.

1347. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАНА (гіст.). Вул. Кафанава, на могілках. Пахаваны 250 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных — воіны 50-й і 96-й гвардзейскіх стралковых дывізій і іншых часцей 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні г. Пружаны і Пружанскага р-на, а таксама лётчыкі 33-га знішчальнага авіяпалка, воіны 30-й танкавай і 205-й матарызаванай дывізій, што загінулі ў чэрвені 1941 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск з барэльефам воіна.

Літ.: Буг в огне. [Сб. успамінаў]. 3 изд.— Мн., 1977.

1348. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ (гіст.). Вул. Кафанава, на могілках. Пахаваны 26 чырвонаармейцаў, якія загінулі ў барацьбе за Савецкую ўладу ў 1920 г. На магіле ўстаноўлены 3 пліты.

1349. ГАНДЛЁВЫЯ РАДЫ (архіт.). У цэнтры горада, на Савецкай пл. Пабудаваны ў 1896 г. з цэглы (арх. Міхайлоўскі і Савіч). Выкарыстоўваюцца як гандлёвае прадпрыемства.

Прамавугольны ў плане будынак складаецца з 2 радоў гандлёвых ячэек, накрыты двухсхільным дахам з франтонамі на тарцах. Падоўжныя фасады аформлены масіўнымі аркадамі, якія ствараюць адкрытыя галерэі. Кожнаму інтэрвалу паміж слупамі арак дакладна адпавядае неглыбокая прамавугольная ніша ў сцяне. У нішах размешчаны дзверы і вітрыны гандлёвых памяшканняў. Больш шырокі праезд пасярэдзіне падкрэслены трохпралётнымі рызалітамі, аформленымі пілястрамі і завершанымі фігурнымі франтонамі. Франтоны маюць крывалінейныя і ступеньчатыя абрысы і разам з карнізам раскрапаваны пілястрамі.

1347. *Помнік на брацкай магіле [illegible] і партызана.*



1349. *Гандлёвыя рады.*

1350. *[illegible]*

1350. *Сядзібны дом.*

Гавдлёвыя рады — помнік грамадзянскай архітэктуры.

Літ.: Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии — 2 изд — Мн., 1977
У. В. Алісейчык

1350. ГАРАДСКАЯ СЯДЗІБА (архіт.). На паўночнай ускраіне горада, у парку. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. паводле праекта арх. Ланці. Цяпер тут размешчана дашкольная ўстанова.

Ансамбль сядзібы ўключае мураваныя дом, да якога з боку горада вядзе шырокая алея, 2 флігелі і парк пейзажнага тыпу. Сядзібны дом складаецца з 2 груп рознавялікіх аб'ёмаў, аб'яднаных аднапавярховым корпусам. Заходні кампактны двухпавярховы аб'ём з эркерам пакрыты двухсхільным дахам, да яго прылягае квадратная у плане вежа і аднапавярховая прыбудова з паўкруглай верандай, усходні — Г-падобны ў плане, двухпавярховы, утварае на галоўным фасадзе неглыбокі рызаліт, які завершаны шчытом. Дваровы фасад павернуты ў бок парку вялікай тэрасай на 2 калонах. Аконныя праёмы прамавугольныя, з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі. Планіроўка асабняка анфіладная. Памяшканні 1-га паверха маюць плоскую столь з падугамі і аздоблены прафіляванымі лепнымі карнізамі. Каміны і дзверы дэкарыраваны тонка прарысаванымі дэталямі. Паверхі звязаны паміж сабой вузкімі драўлянымі лесвіцамі.

Сядзіба — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры стылю «мадэрн».
У. В. Алісейчык



1350. *Гарадская сядзіба. Схема планіроўкі: 1 — сядзібны дом, 2, 3 — флігелі.*



1350. *Сядзібны дом. Фрагмент аздобы дзвярэй.*

1351. ДОМ, У ЯКІМ РАЗМЯШЧАЎСЯ ШТАБ АВІЯЦЫЙНАГА ПАЛКА (гіст.). Вул. Чырвонаармейская, 34. У гэтым будынку ў 1941 г. знаходзіўся штаб 33-га знішчальнага авіяпалка 10-й мяшанай авіядывізіі. Полк у чэрвені 1941 г. прымаў удзел у абарончых баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Брэсцкай вобл. У 1977 г. ў гонар палка на доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Буг в огне: [Зб. успамінаў]. — 3 изд.— Мн., 1977. *Г. І. Дулеба.*

1352. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВОІНАМ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ І ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). Вул. Савецкая, 11 на будынку універмага. Устаноўлена ў 1967 г. ў гонар вызвалення горада савецкімі воінамі і баявой дзейнасці партызан брыгады імя П. К. Панамарэнкі.

17.7.1944 г. войскі 28-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант А. А. Лучынскі) 1-га Беларускага фронту ў выніку двухдзённых баёў вызвалілі Пружаны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У баях удзельнічалі 50-я і 96-я гвардзейскія стралковыя дывізіі (камандзіры генерал-маёр А. С. Уладычанскі і генерал-маёр Г. М. Кузняцоў), 65-ы асобны танкавы полк (камандзір падпалкоўнік В. Ф. Абіх), 1898-ы самаходны артылерыйскі полк (камандзір маёр В. В. Багамолаў), 5-я гаўбічная артылерыйская брыгада (камандзір палкоўнік К. А. Папа) і 157-я пушачная артылерыйская брыгада (камандзір палкоўнік Ц. К. Крылаў).

У час вайны на тэрыторыі раёна дзейнічала партызанская брыгада імя П. К. Панамарэнкі, арганізаваная ў чэрвені 1943 г. на базе атрадаў імя Г. М. Дзімітрова, імя С. М. Кірава, імя А. В. Суворава, імя В. П. Чкалава, «Савецкая Беларусь» і дыверсійнай групы М. Ф. Новіка. Камандзіры брыгады І. П. Урбановіч (да ліпеня 1943 г.), М. У. Сенькін (ліпень 1943 г.— ліпень 1944 г.); камісары С. П. Пацірука (да ліпеня 1943 г.), К. Дз. Талочка (верасень — лістапад 1943 г., жнівень 1943 г.), М. Е. Крыштафовіч (лістапад 1943 г. — ліпень 1944 г.). Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгуначных і шашэйных дарогах, разбуралі ўмацаванні ворага, вялі адкрытыя і засадныя баі з акупантамі, ахоўвалі насельніцтва ад вывазу на катаржныя работы ў Германію. 11.7.1944 г. брыгада злучылася з войскамі Чырвонай Арміі. На час злучэння налічвала 4 атрады (1537 партызан). Разам з часцямі Чырвонай Арміі вызваляла Пружаны.

Літ.: Буг в огне: [Зб. успамінаў]. — 3 изд.— Мн., 1977; Сообщения Советского Информбюро. Т. 7.— М., 1945. *Г. І. Дулеба.*

1353. *Дом, у якім размяшчаўся рэўком.*

1353. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР РЭЎКОМА (гіст.). Вул. Савецкая, 10. Устаноўлена ў 1967 г. на будынку, дзе ў ліпені — верасні 1920 г. размяшчаўся павятовы рэўком.

27.7.1920 г. Чырвоная Армія вызваліла Пружаны ад войск буржуазнай Польшчы. 28.7.1920 г. мясцовыя камуністы разам з прадстаўнікамі ваенных часцей стварылі Пружанскі павятовы рэўком. Старшыня Р. І. Зосім, з 10.8.1920 г. А. М. Віна[illegible]. У загадзе № 6 ад 12.8.1920 г. павятовы рэўком [illegible] аб арганізацыі пры ім аддзелаў: [illegible], харчовага [illegible] кіравання, фінансавага, народнай асветы, працы, аховы здароўя і камунальнай гаспадаркі. Гарнізон [illegible] падтрымліваў рэвалюцыйны парадак, узначальваў П. В. Горын (Каляда). 19.9.1920 г. Пружаны зноў захапілі польскія войскі.

Літ.: Революционные комитеты Б[illegible]
[illegible]
Т. [illegible]

1354. ПОМНІК ГУДЗІМАВУ Сцяпану Мітрафанавічу (гіст.). На вул. Чырвонаармейскай, у скверы імя 50-годдзя піянерыі.

Лётчык-знішчальнік С. М. Гудзімаў нарадзіўся ў 1913 г. ў с. Ягаднае Камышынскага р-на Валгаградскай вобл. У Чырвонай Арміі з 1934 г. З мая 1938 г. служыў на Беларусі штурманам эскадрыллі 33-га знішчальнага авіяпалка, у верасні 1939 г. ўдзельні-

1355. Помнік У. І. Леніну



1357. Помнік савецкім лётчыкам

час у вызваленні Заходняй Беларусі (чэрв. 1941 г.).

Раніцай 22.6.1941 г. пад прыкрыццём знішчальнікаў на аэрадром у Пружанах наляцелі варожыя бамбардзіроўшчыкі. У паветраным баі лейтэнант С. М. Гудзімаў збіў адзін самалёт, другі тараніў, але і яго самалёт быў пашкоджаны. Лётчык выкінуўся з парашутам, але стропы парашута зачапіліся за абломкі нямецкага самалёта, і Гудзімаў загінуў. 15.2.1968 г. пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны 2-й ступені.

У 1972 г. на ўшанаванне памяці С. М. Гудзімава пастаўлены абеліск. На фасаднай плоскасці помніка ўмацаваны трохлопасцевы прапелер самалёта, пад ім — дошка з памятным надпісам.

Літ.: Буг в огне. [Зб. успамінаў]. — 3 изд. — Мн., 1977.

І. І. Дземба, С. Ф. Дарохін.

1354. Помнік С. М. Гудзімаву.

1355. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст., маст.). Вул. Камуністычная, на невялікай плошчы перад будынкам райкома партыі. Пастаўлены ў 1977 г. (скульпт. Я. Гумілеўскі, арх. М. Ткачук; бронза, граніт; агульная вышыня 8 м, вышыня фігуры 4,5 м).

Аснова кампазіцыі помніка — гранітны стылабат з асіметрычна размешчаным невысокім пастаментам з ружовага граніту, на якім узвышаецца фігура У. І. Леніна. Вобраз правадыра трактаваны ва ўрачыста-рамантычным плане. Творчая энергія і валявая сканцэнтраванасць, духоўная мэтанакіраванасць адлюстраваны ў паставе, жэсце, стрыманай мадэліроўцы аб'ёму. У. І. Ленін стаіць, крыху падаўшыся наперад, у паліто, крысо якога адкінуў вецер. Пластычнае вырашэнне помніка ўзбагачае сіламетровая бронзавая стэла, размешчаная за фігурай, якая сваёй канфігурацыяй нагадвае лунаючыя сцягі. Яна развівае асноўную тэму помніка: Ленін — правадыр рэвалюцыі, яе сцяг.

1356. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Кастрычніцкай каля сярэдняй школы № 3. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1966 г.

1357. ПОМНІК САВЕЦКІМ ЛЕТЧЫКАМ (гіст.). На паўночна-ўсходняй ускраіне горада, непадалёку ад шашы на Ружаны.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны каля Пружан дыслацыраваўся 33-і знішчальны авіяполк 10-й змяшанай авіядывізіі. На світанні 22 чэрвеня 1941 г. на пружанскі аэрадром, дзе ў гэты час знаходзілася рэзервовая эскадрылля, наляцела 20 бамбардзіроўшчыкаў і некалькі знішчальнікаў праціўніка. У паветраным баі савецкія лётчыкі збілі 5 варожых самалётаў.

У 1971 г. ў памяць аб гераічным подзвігу савецкіх лётчыкаў пастаўлены помнік — самалёт-знішчальнік на пастаменце. На 2 мармуровых дошках высечаны памятны надпіс і словы з «Песні пра Сокала» М. Горкага.

1358. ПОМНІК ХАРУЖАЙ Веры Захараўне (гіст.). На вул. Кастрычніцкай, каля будынка сярэдняй школы № 1.

Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі В. З. Харужая ў 1924 г. вяла ў Пружанскім павеце падпольную работу: распаўсюджвала забароненую літаратуру, арганізоўвала сходкі, мітынгі, заклікала працоўных да барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Помнік В. З. Харужай — бюст на прамавугольным пастаменце (скульпт. З. Азгур) — пастаўлены ў 1963 г.

1359. САБОР АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА (архіт.). На рагу вул. Камуністычнай і Савецкай пл. Пабудаваны ў 1861—66 гг. з цэглы.

Будынак складаецца з 3 частак. Прамавугольны ў плане асноўны трохнефавы аб'ём пакрыты двухсхільным дахам. Над тамбурам узвышаецца званіца (васьмярык на чацверыку), за

1358. *Помнік В. З. Харужай*

вершаная купалам з галоўкай. Асаблівасцю будынка з'яўляецца паўкруглая ў плане трох'ярусная алтарная частка, верхні ярус якой — светлавы барабан з люнетамі, пакрыты вялікім купалам. Сцены раскрапаваны пілястрамі і завершаны спрошчаным антаблементам. Аконныя і дзвярныя праёмы з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі маюць [illegible] абрамленні. Уваходы ў будынак з бакоў падкрэслены франтонамі [illegible] пілястры першага яруса апсіды на другім ярусе прадоўжаны лапаткамі, на трэцім — спаранымі пілястрамі. Унутраная прастора асноўнага аб'ёму 6 квадратнымі ў плане слупамі падзелена на 3 нефы. Цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем, бакавыя — крыжовымі. Скляпенні ўмацаваны падпружнымі аркамі.

Сабор — помнік архітэктуры позняга класіцызму. *У. Н. Алесечык*

1359. [illegible]



1359. *Сабор Аляксандра Неўскага. План.*

1360. ЦЭНТР РАМЯСТВА (гіст.). З 16 ст. Пружаны вядомы як цэнтр па вырабу паліванага посуду і кафлі, а таксама задымленага і чорнагляцаванага посуду. [illegible] выраблялі міскі, глякі, гаршкі, макатры, [illegible] друшлякі гладкія і аздобленыя рэльефным арнаментам беларускага узорыстага ткацтва і вышыўкі, расліннымі матывамі, пакрытыя карычневай, зялёнай і сіняй палівамі. Кафля аздаблялася рэльефным раслінным арнаментам і традыцыйнымі для Беларусі матывамі вазона, потым пакрывалася той жа гамай каляровых паліў. Частка задымленага посуду аздаблялася глянцаваным сеткаватым, рамбічным, паласатым, спіралепадобным або [illegible] рысункамі, якія наносіліся [illegible] перад абпальваннем, пасля [illegible] посуд набываў чорна-шэры металічны бляск.

Традыцыі вырабу пружанскай керамікі развіваюцца і цяпер. Пружанская кераміка зберагаецца ў Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах (філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР), Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і Музеі мастацкага промыслу АН УССР (г. Львоў).

Літ.: Города России...— СПб., 1906—14. *М. М. Я[illegible]цкая*

1361. ЯВАЧНАЯ КВАТЭРА (гіст.). Вул. Сацыялістычная, 7. У гэтым доме з 1923 г. да 1938 г. знаходзілася явачная кватэра КПЗБ.



1359. *Сабор Аляксандра Неўскага.*

1361. *Дом, у якім знаходзілася явачная кватэра КПЗБ*

Падпольная камуністычная арганізацыя ў Пружанах існавала ўжо ў 1921 г. Пасля стварэння КПЗБ (1923 г.) партыйныя арганізацыі пачалі ўзнікаць і ў вёсках Пружанскага павета. У 1924 г. па 5—7 чалавек налічвалі ячэйкі ў Залессі, Калядзічах, Піняпах, Смалянах, Хараве, Шанях і інш. вёсках. У Пружанах у гэты час знаходзіўся райком КПЗБ, у Хараве, Шанях, Шарашове — падрайкомы. Вясковыя партыйныя ячэйкі вялі палітычную прапаганду, збіралі сродкі на дапамогу палітзняволеным, распаўсюджвалі лістоўкі і падпольныя газеты. Пружанскі райком КПЗБ друкаваў лістоўкі (на шапірографе).

З 1927 г. да 1930 г. Пружанскі падпольны райком КПЗБ знаходзіўся ў в. Варотнае, з 1930 г.— у Хараве. У розны час яго сакратарамі былі А. Чатырбок, С. П. Папяруха, М. Е. Крыштафовіч. Пад кіраўніцтвам райкома ў Пружанах у 1928 г. быў створаны агульнагарадскі прафсаюз. У сакавіку 1932 г. ў 29 з 30 вёсак павета дзейнічалі ячэйкі КПЗБ. Роля КПЗБ як арганізатара барацьбы працоўных яскрава праявілася ў час забастоўкі рабочых лясных промыслаў у Белавежскай пушчы (15.10.1932 г.— [illegible] 1933 г.). У [illegible] чалі 4 тыс. рабочых [illegible] заметных поспехаў [illegible] ролю ў яе перамозе (павялічана зарплата, паменшаны рабочы дзень і інш.) адыграў Пружанскі райком КПЗБ, сакратар якога С. П. Папяруха быў адным з кіраўнікоў забастоўкі.

На доме, дзе была явачная кватэра КПЗБ, у 1968 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.).— Мн., 1966; У суровыя гады падполля.— Мн., 1958. *В. Д. Каратковіч*

в. Аранчыцы, Ліноўскі сельсавет

1362. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На заходняй ускраіне вёс-

кі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. в прогалы. Будынак прамавугольны ў плане, з пяціграннай апсідай і двух'ярусная шатровай вежай на галоўным фасадзе. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

1363. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 50 жыхароў в. Аранчыцы і суседніх вёсак, загубленых нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941—44 гг. У 1971 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Байкі (не існуе), Крыніцкі сельсавет

1364. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Байкі знаходзілася за 1,5 км на ўсход ад в. Крынкі. У 1941 г. спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі (8 двароў). Пасля вайны не адрадзілася.

в. Байкі, Ружанскі сельсавет

1365. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У паўднёвай частцы вёскі, каля калгаснага саду. Пахаваны мірныя жыхары, ахвяры нямецка-фашысцкага тэрору.

22.1.1944 г. атрад карнікаў акружыў в. Байкі і сагнаў усіх жыхароў у хлявы. Мужчын расстралялі, жанчын спалілі жывымі, на дзяцей нацкавалі аўчарак. Пакалечаныя дзіцячыя целы [illegible] агонь. Усяго было загублена 987 жыхароў, спалена 120 двароў.

У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. Вёска ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, 1941—1944. [illegible] М., [illegible]

У. С. Пасэ, А. А. Фактаровіч

1366. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 8 жыхароў вёскі, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1944 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1367. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БАРАНУ Ціхану Максімавічу (гіст.). Устаноўлена ў 1967 г. на доме, дзе ён нарадзіўся і жыў.

Піянер-герой, удзельнік барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў Ціхан Баран нарадзіўся 4.4.1932 г. Збіраў для партызан боепрыпасы, зброю, харчы, звесткі аб ворагу, распаўсюджваў сярод насельніцтва антыфашысцкую літаратуру. З чэрвеня 1943 г. партызан атрада імя С. М. Кірава брыгады імя П. К. Панамарэнкі Брэсцкай вобл. 22.1.1944 г. ў час расправы над жыхарамі в. Байкі, дзе Ціхан знаходзіўся па заданню камандавання атрада, гітлераўцы захапілі яго ў палон і загадалі паказаць месца дыслакацыі партызан. Юны патрыёт паўтарыў подзвіг І. Сусаніна: завёў карнікаў у непраходнае балота. Раз'юшаныя акупанты расстралялі Ц. Барана.

Літ.: Пионеры-герои.— [3 выд.].— Мн., 1972; Орлята Великой Отечественной.— Мн., 1972. В [illegible] Г. Малюнак па снезе. Дакументальн[illegible] М., 1969.

Г. І. Дулеба

1368. ПАДПОЛЬНАЯ ДРУКАРНЯ (гіст.). На сядзібе селяніна М. І. Барана ў зямлянцы ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі знаходзілася падпольная друкарня Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта. Зямлянку выкапалі браты М. І. і Л. І. Бараны. У ёй знаходзіліся часовы прытулак падпольшчыкаў і партызанская сувязная. Зімой 1942—43 гг. у зям[лянцы] абсталявалі друкарню Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі, рэарганізаваны ў 1943 г. ў Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт. За гады вайны ў друкарні надрукаваны 168 тыс. экземпляраў газет, лістовак, адозваў, зводак Саўінфармбюро на беларускай, рускай, польскай і нямецкай мовах.

У 1967 г. зямлянка адноўлена. На доме М. І. Барана ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Бут в огне [Зб. успамінаў] [illegible] Мн., 1[illegible] В [illegible] М. [illegible]

[illegible] Фактаровіч

в. Бакуны, цэнтр сельсавета

1369. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя В. І. Чапаева. На ўшанаванне памяці 137 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—45 гг., у 1973 г. пастаўлены помнік — скульптура партызана і дзяўчыны.

1370. ПОМНІК ЧАПАЕВУ Васілю Іванавічу (гіст.). Каля будынка клуба. Бюст героя Грамадзянскай вайны В. І. Чапаева ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Бакуны, Вялікасельскі сельсавет

1371. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН, МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС САВЕЦКІМ ВОІНАМ, ПАРТЫЗАНАМ І ЗЕМЛЯКАМ (гіст., маст.). У цэнтры вёскі. У брацкай магіле пахаваны 77 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных — воіны 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі.

У 1968 г. на ўшанаванне памяці савецкіх воінаў, партызан і землякоў, што загінулі ў Айчынную вайну, створаны мемарыяльны комплекс (скульпт. І. Краўчанка, арх. Ю. Казакоў; бетон; вышыня скульптурнай групы 3,5 м, пастамента 1,75 м). Дамінантай комплексу з'яўляецца скульптурная група у маўклівай жалобе застыла жанчына з апушчанымі рукамі і воін у паходнай форме, які абдымае яе за плечы. Справа ўзвышаецца стэла з графічнай выявай зоркі і надпісам-прысвячэннем, злева — Сцяна памяці (даўжыня 6 м) з імёнамі 119 загінуўшых землякоў.

Г. І. Дулеба, Л. І. Лапцэвіч



1371. *Мемарыяльны комплекс савецкім воінам, партызанам і землякам. Фрагмент.*

в. Барысікі, Лыскаўскі сельсавет

1372. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ўскраіне вёскі. Пахаваны 80 воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.



1375. *Царква Аляксандра Неўскага. План.*

1375. *Царква Аляксандра Неўскага.*

в. Блізная, Ружанскі сельсавет

1373. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахавана 23 воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1374. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 10 жыхароў вёскі, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—44 гг. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1375. ЦАРКВА АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА (архіт.). У паўночнай частцы вёскі, на могілках. Пабудавана ў 1888 г. з бутавага каменю і цэглы. Складаецца з асноўнага прамавугольнага аб'ёму з трохграннай апсідай і квадратнай у плане званіцы [illegible] шатром [illegible] з цыбулепадобнай галоўкай. Аконныя праёмы арачныя з простымі ліштвамі. Царква — узор мясцовай трактоўкі культавай архітэктуры.

в. Брады, Шчарчоўскі сельсавет

1376. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 55 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных — начальнік штаба партызанскага атрада імя В. П. Чкалава брыгады «Савецкая Беларусь» Брэсцкай вобл. лейтэнант М. З. Храбрых.

У 1970 г. на магіле пастаўлены помнік — трохгранная стэла з барэльефнымі выявамі галоў воіна, партызана і жанчыны-маці. Перад стэлай — пліта з імёнамі пахаваных. На гранях стэлы — дошкі, на якіх высечаны імёны 110 аднавяскоўцаў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе.

в. Барэзніца, Паўлаўскі сельсавет

1377. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Каля вёскі, на урочышчы Цель. 4 насыпы. Вышыня 1 м, дыяметр 10—12 м. У плане круглыя. Видомы з канца 19 ст. Абследаваў у 1970 г. А. Р. Мітрафанаў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Варанілавічы, цэнтр сельсавета

1378. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). За 0,8 км на поўнач ад вёскі, каля дарогі на Ружаны. Пахаваны воіны і партызаны, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1379. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка выканкома сельсавета. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1968 г.

1376. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

в. Варотнае, Ліноўскі сельсавет

1380. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля клуба. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1965 г.

хутар Выдзерка (не існуе), Ліноўскі сельсавет

1381. МЕСЦА СПАЛЕНАГА ХУТАРА (гіст.). Хутар Выдзерка знаходзіўся за 4 км на поўдзень ад в. Аранчыцы. У 1943 г. спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі (35 двароў). Пасля вайны не адрадзіўся.

в. Вяжное, Шчарчоўскі сельсавет

1382. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У паўднёва-заходняй частцы вёскі. Пабудавана да 1791 г. з дрэва.

Выцягнуты прамавугольны ў плане будынак з трохграннай апсідай накрыты двухсхільным гонтавым дахам з вальмамі над алтаром. З боку галоўнага заходняга фасада над асноўным аб'ёмам узвышаецца двух'ярусная шатровая званіца (васьмярык на чацверыку). Пірамідальная грань чацверыка супадае з плоскасцю франтона. Званіца і дах завершаны галоўкамі. Сцены гарызантальна ашаляваны і ўмацаваны брусамі. Аконныя праёмы прамавугольныя. Асноўнае памяшканне зальнае. Пры ўваходзе — тамбур з хорамі.

У архітэктуры царквы выкарыстаны прыёмы традыцыйнага народнага дойлідства. *А. В. Ліхачова* [illegible]

1382. *Мікалаеўская царква. План.*

в. Вялікае Сяло, цэнтр сельсавета

1383. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 54 воіны і 2 партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Гарадзечна, цэнтр сельсавета

1384. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На школьным двары. Пахаваны 133 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 28 мірных жыхароў, расстраляных гітлераўскімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1385. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1825 г. з цэглы. Прамавугольны ў плане будынак з невялікім [illegible] над уваходам. Асноўны трохнефавы аб'ём накрыты двухсхільным дахам, над якім узвышаецца драўляны васьмігранны светлавы барабан. На галоўным фасадзе накладны порцік. Вокны абрамлены простымі ліштвамі. У архітэктуры царквы выкарыстаны элементы класіцызму.

1386. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Фелiксу Эдмундавічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса імя Ф. Э. Дзяржынскага. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

1382. *Мікалаеўская царква.*

1385. *Пакроўская царква*

в. Жабін, Гарадзечанскі сельсавет

1387. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Заполле, Ружанскі сельсавет

1388. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1944 гг. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1389. ПОМНІК КАМСАМОЛЬЦАМ-ПАДПОЛЬШЧЫКАМ (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі.

З жніўня 1941 г. да ліпеня 1944 г. ў в. Заполле дзейнічала падпольная камсамольская арганізацыя. У 1942 г. ў ёй было 16 камсамольцаў-падпольшчыкаў. Сакратары: Я. І. Гардзей (жнівень 1941 г. — май 1943 г.), У. В. Прадка (чэрвень — жнівень 1943 г.), І. М. Мальчык (жнівень 1943 г. — ліпень 1944 г.). Юнакі збіралі зброю, боепрыпасы, разведдацыя аб праціўніку, удзельнічалі ў дыверсіях, распаўсюджвалі сярод жыхароў Заполля і навакольных вёсак лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро. Летам 1942 г. падпольшчыкі мелі друкарню. У барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі І. В. Дзйка,



1385. *Пакроўская царква. План*

А. А. Куніца, І. А. Куніца, У. В. Прадка і іншыя члены падпольнай арганізацыі.

На ўшанаванне памяці камсамольцаў-падпольшчыкаў у 1975 г. пастаўлены абеліск.

Літ.: Ромма Ф. Мужала молодость в боях. — Мн., 1974.

в. Засімавічы, Шанеўскі сельсавет

1390. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (арх т.). На паўднёва-усходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1814 г. з цэглы. Невялікі прамавугольны ў плане аб'ём з трохгранным алтарным часткай накрыты двухсхільным тоітаным дахам абмежаваным з заходняга боку дашчаным франтонам. У апрацоўцы сцяны галоўнага фасада выкарыстаны рустыка. Помнік архітэктуры класіцызму.

в. Зельва, Зеляневіцы сельсавет

1391. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На заходнім ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1878 г. з цэглы. Складаецца з прамавугольнага асноўнага аб'ёму, выцягнутага у папярочным напрамку, і апсіды. Асноўны аб'ём накрыты двухсхільным дахам, завершаным галоўкай. Пры ўваходзе да асноўнага аб'ёму прыбудаваны тамбур, з паўночнага боку да апсіды — рызніца. На восі царквы стаіць званіца, з вежавая з буту двух'ярусная званіца з вальмавым дахам. Помнік эклектычнай архітэктуры.

в. Зеляневічы, цэнтр сельсавета

1392. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У парку, каля будынка канторы саўгаса «Зеляневічы». На ўшанаванне памяці 18 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1972 г. пастаўлена стэла.

1390. *Мікалаеўская царква*



1390. *Мікалаеўская царква. План*

1393. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля клуба. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1975 г.

в. Кавалі, Паўлаўскі сельсавет

1394. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля будынка канторы саўгаса «Кавалі». Пахаваны 18 воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Казлы, Мокраўскі сельсавет

1395. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 180 мірных жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 17.7.1942 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Калазубы, Варашлавіцкі сельсавет

1396. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 70 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Канстанцінава (не існуе), Ружанскі сельсавет

1397. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). На поўнач, недалёка ад сучаснай в. Воля Ружанскага сельсавета знаходзілася в. Канстанцінава, якая была знішчана разам з жыхарамі 8.7.1944 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі (175 жыхароў, 35 двароў). Населены пункт не адраджаўся. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

в. Кацёлкі, Шанеўскі сельсавет

1398. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 100 м на поўнач ад школы абапал дарогі Шані — Абруб, у лесе. 6 насыпаў. Вышыня 1,5–3,5 м, дыяметр 6–11 м. У плане курганы круглыя, насыпы пясчаныя, стромкія. У 1960 г. 2 курганы раскапалі члены гістарычнага гуртка Пружанскай сярэдняй школы № 1. Пахавальны абрад — трупапалажэнне галавою на захад. Каля асновы насыпаў выяўлена попельна-вугальная праслойка таўшчынёй каля 7 см. Пры раскопках знойдзены гаршчок, абломкі керамікі, праслицы, цвікі, сярэбраны S-падобны пярсцёнак, залачоная шкляная біснічная пацерка. Могільнік датуецца 11—13 стагоддзямі. Належаў дрыгавічам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў музеі школы № 1 г. Пружаны.

в. Качаны (не існуе), Крынiцкі сельсавет

1399. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Качаны знаходзілася за 3 км на захад ад в. Крыніца. Спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі. ў

1941 г. (4 двары). Пасля вайны не адрадзілася.

в. Козі Брод, Шанёўскі сельсавет

1400. МЕСЦА ДЫСЛАКАЦЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ В. П. ЧКАЛАВА (гіст.). У 1943—44 гг. у вёсцы і навакольных лясах дыслацыраваўся партызанскі атрад імя В. П. Чкалава.

Атрад створаны ў сакавіку 1943 г. на базе груп П. І. Масалова, С. Г. Бокшы, «Віктара», Я. Г. Бе... Х. Камуратава. Атрад дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Пружанскага, Ружанскага і суседніх з імі раёнаў Брэсцкай вобл., да чэрвеня 1943 г. асобна, потым у складзе брыгады імя П. К. Панамарэнкі, са жніўня 1943 ў складзе брыгады «Савецкая Беларусь». Камандзіры П. І. Масалаў, С. З. Астроўскі, Я. К. Калеснікаў, камісары Х. Камуратаў (загінуў), А. І. Жыльцоў, Я. Г. Беражняк. Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгуначных і шашэйных дарогах, удзельнічалі ў «рэйкавай вайне», грамілі варожыя гарнізоны, паліцэйскія участкі, апорныя пункты. Яны падарвалі 77 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, 88 паравозаў, 340 рэек, знішчылі і пашкодзілі 7 шашэйных мастоў. У зоне дзеяння атрада знаходзіўся сямейны лагер, дзе мясцовыя жыхары ратаваліся ад тэрору акупантаў. У сярэдзіне ліпеня 1944 г. атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі. На час злучэння ў ім налічвалася 380 партызан.

У 1975 у памяць аб баявой дзейнасці атрада імя В. П. Чкалава за 6 км на поўнач ад в. Козі Брод, каля шашы Пружаны — Брэст пастаўлены абеліск. *Г. І. Далеба.*

в. Краснае, Мокраўскі сельсавет

1401. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 224 мірныя жыхары вёсак ...ленавічы, Краснае, Ліхачоўцы, Ліхаты, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі 17.7.1942 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1391. *Крыжаўзвіжанская царква. План.*

в. Крыніца, цэнтр сельсавета

1402. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі, каля шашы Пружаны — Каменюкі. 27.7.1920 г. каля в. Крыніца паміж часцямі Чырвонай Арміі Заходняга фронту і польскімі войскамі адбыўся бой, у якім загінулі 12 чырвонаармейцаў. На рашэнні Пружанскага раўкома (1920 г.) на магіле герояў быў пастаўлены помнік — кулямет «Максім» на невялікім бетонным пастаменце (не захаваўся). У 1967 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых воінаў пастаўлена стэла.

Літ.: В памяти народной. Мн., 1968. *М. Н. Клімов.*

1403. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 13 км на захад ад вёскі, у Белавежскай пушчы. Пахаваны каля 120 жыхароў навакольных вёсак, забітых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ... 1941.

Карная аперацыя па «эвакуацыі» жыхароў населеных пунктаў Белавежскай пушчы праводзілася 25.7—19.8.1941 г. 322-м паліцэйскім батальёнам ротай «Штутгарт». Гітлераўцы выселілі амаль 7 тыс. жыхароў ... каля 40 населеных пунктаў ..., каля 6 тыс. галоў жывёлы. У ходзе аперацыі карнікі расстралялі больш як 490 чалавек, у т. л. усіх ... камуністаў, савецкіх работнікаў і актывістаў, а таксама членаў іх сем'яў.

У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск. *У. С. Паеў, А. А. Фактаровіч.*

1404. ПОМНІК КАФАНАВУ Рыгору Ільічу (гіст.). За 13 км на паўночны захад ад в. Крыніца, у Белавежскай пушчы. Пагранічнік Р. І. Кафанаў загінуў 19.9.1939 г. пры выкананні баявога задання. Бюст устаноўлены ў 1972 г. Імя Р. І. Кафанава прысвоена пагранзаставе, дзе ён служыў.

1405. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Куляны, Ружанскі сельсавет

1406. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАНА (гіст.).

1391. *Крыжаўзвіжанская царква. Званіца.*



1402. *Помнік на брацкай магіле чырвонаармейцаў.*

У цэнтры вёскі. Пахаваны 744 воіны і 1 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. З іх 692 воіны загінулі ў чэрвені 1941 г., 52 воіны — пры вызваленні раёна ў ліпені 1944 г. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1407. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 14 мірных жыхароў вёскі, расстраляных у 1944 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Купічы, Крыніцкі сельсавет

1408. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 36 воінаў і 3 партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск, які ўвекавечвае таксама памяць 115 аднавяскоўцаў, што аддалі жыццё за свабоду і незалежнасць Радзімы.

в. Куплін, Смалявіцкі сельсавет

1409. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1834 г. з цэглы. Прамавугольны ў плане будынак. У архітэктуры выкарыстаны прыёмы класіцызму.

в. Кутнавічы, Бакунскі сельсавет

1410. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 50 воінаў і пар-

1415. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*

тызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Лазкі (не існуе), Крыніцкі сельсавет

1411. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Лазкі знаходзілася за 4 км на ўсход ад в. Крыніца. У 1941 г. спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі (14 двароў). Пасля вайны не адрадзілася.

в. Ліпова, цэнтр сельсавета

1412. КАСЦЁЛ (архіт.). На вул. Школьнай. Пабудаваны ў 1-й палавіне 19 ст. з дрэва. Выразнасць прамавугольнага ў плане аб'ёму дасягнецца высокім двухсхільным дахам. Помнік драўлянага дойлідства з элементамі неагатычнага стылю.

1416. *Кляштар місіянераў. Троіцкі касцёл*

1413. МАГІЛА САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны каля 400 савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1971 г. ў памяць аб загінуўшых пастаўлены 2 абеліскі.

1414. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Лыскава, цэнтр сельсавета

1415. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 302 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. і пры вызваленні Пружанскага р-на ў ліпені 1944 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены скульптура воіна і абеліск, дзе ўшанавана таксама памяць 100 аднавяскоўцаў, што загінулі ў барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы.

1416. КЛЯШТАР МІСІЯНЕРАЎ (архіт.). У цэнтры вёскі на ўзгорку. Складаецца з Троіцкага касцёла і размешчанага насупраць яго жылога корпуса.

Троіцкі касцёл узведзены ў 1763—85 гг. з цэглы. У 1818 г. перабудавана вежа. У 1866 г. касцёл перароблены ў праваслаўную царкву. У 1883—84 гг. пад наглядам арх. П. І. Залатарова праводзіліся работы па аднаўленню храма, які абгарэў у 1881 г. (выкладзены новыя скляпенні, заменены драўляныя канструкцыі даху, закрыццё і інш.). Касцёл крыжовы ў плане, аднавежавы, з прамавугольнай алтарнай часткай і 2 сакрысціямі. Вежа чатырох'ярусная, галоўная, выступае на асноўнай плоскасці галоўнага заходняга фасада. Карніз дзеліць вежу на 2 часткі: ніжнюю, сумешчаную ў адзіным аб'ёме з асноўнай часткай храма, і верхнюю, якая ўяўляе сабой дамінуючае ў сілуэце двух'яруснае завяршэнне. Ніжняя частка вежы разам са сцяной



1416. *Троіцкі касцёл. План*

1416. *Будынак жылога корпуса кляштара місіянераў*

асноўнага аб'ёму падзелена прафіляванай цягай на 2 ярусы; ніжні выкананы ў выглядзе масіўнага цоката, верхні расчлянёны пілястрамі і завершаны франтонам у пярэдняй грані. Верхняя частка вежы дэкарыравана слаба развітымі валютамі. Вуглы вежы закруглены і раскрапаваны пілястрам.

Асноўнае памяшканне касцёла зальнае, перакрыта цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі. Скляпенні ўмацаваны падпружнымі аркамі, якія апіраюцца на багата прафіляваныя імпасты і пераходзяць у пілястры сцен. Паміж пілястрамі размешчаны вялікія арачныя вокны. Над імі — прамавугольныя аконныя праёмы, аддзеленыя прафіляванай паласой фрыза. Алтарная частка перакрыта цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, бакавыя крылы трансепта і сакрысціі — крыжовымі. Размалёўка паўночнага крыла трансепта імітуе архітэктурную ордэрную пластыку.

Жылы корпус — двухпавярховы П-падобны ў плане будынак, пастаў



1416. *Троіцкі касцёл. Фрагмент інтэр'ера*



1416. [illegible] жылога корпуса кляштара. План

ены ў 2-й палавіне 18 ст. Сцены расчлянёны па перыметры пілястрамі. Галоўны ўсходні фасад з цэнтральным рызалітам павернуты да касцёла. Выступы рызаліта змякчаны вязкамі пілястраў. Бакавыя часткі фасада падзелены карнізам на 2 ярусы. Пілястры ніжняга яруса апрацаваны рустам. Вокны 1-га паверха размешчаны ў арачных нішах, вокны 2-га абрамлены простымі ліштвамі. Планіроўка галерэйная. Калідор перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, астатнія памяшканні — крыжовымі скляпеннямі. На 1-м паверсе паўднёвага крыла знаходзіліся кухня і трапезная. Цяпер у будынку размешчана бальніца.

Кляштарны комплекс — помнік архітэктуры барока. *[illegible]*

1417. МАГІЛА КАРПІНСКАГА Францішка (гіст.). У цэнтры вескі, каля касцёла.

Польскі паэт і драматург Ф. Карпінскі нарадзіўся ў 1741 г. ў в. Галаскоў ([illegible] вобл. УССР). Вучыўся ў калегіуме ў Станіславе (Івана-Франкоўск) і Львоўскай езуіцкай акадэміі. Атрымаў ступень доктара філасофіі і свабодных навук. З 1780 г. жыў у Варшаве. З 1793 г. арандаваў фальварак Краснік (Карпін) у Пружанскім павеце, дзе замяніў паншчыну на чынш (грашовая рэнта). У 1819 г. набыў фальварак Хораўшчыну каля в. Лыскава, адкрыў там народную школу. Сваю бібліятэку падарыў Свіслацкай гімназіі. Ф. Карпінскі — пачынальнік паэзіі польскага сентыменталізму. Найбольшага поспеху дасягнуў у жанрах ідыліі і элегіі. У некаторых творах («Да Станіслава Малахоўскага», «Чынш») заклікаў палепшыць долю прыгонных сялян. Зрабіў уплыў на творчасць беларускага паэта і драматурга В. І. Дуніна-Марцінкевіча. Памёр 16.9.1825 г. у Хораўшчыне.

У 1827 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Краткая литературная энциклопедия. Т. 3. М., 1966; Kostkiewiczowa T. [illegible]

1418. РЭШТКІ КАРАЛЕЎСКАГА ЗАМКА (гіст.). За 0,5 км ад вескі, ва ўрочышчы Гарадзішча, каля дарогі на в. Майсеевічы, на балоцістым правым беразе невялікай рэчкі Шчыбы (Мухі) знаходзяцца рэшткі замка 15—17 стагоддзяў, земляныя ўмацаванні якога і цяпер уражваюць сваёй магутнасцю.

На перыметры квадратнага ў плане (68×68 м) замчышча — насыпныя валы. Заходні вал, які параўнальна добра захаваўся, узвышаецца над пляцоўкай замка на 2,5—3 м, каля падножжа мае шырыню 10 м, на яго вяршыні — пляцоўка шырынёю каля 2 м, пасярэдзіне — уезд у замак. Прыкладна такія ж параметры і паўднёвага вала. Ад усходняга вала асталіся участкі вышынёй да 2 м. На вуглах замчышча стаялі круглыя драўляныя вежы дыяметрам каля 8 м (не зберагліся). Замак быў абкружаны ровам, які захаваўся з заходняга і паўднёвага бакоў (шырыня 10 м, глыбіня 4,5 м). За ровам знаходзяцца рэшткі другога вала вышынёй 1—1,5 м і шырынёй да 4 м (захаваўся з захаду і поўдня). Яшчэ адзін дугападобны вал (вышыня да 3 м, шырыня каля падножжа да 11 м, у цэнтры — сляды уезду) і роў (глыбіня да 5 м, шырыня 10—12 м) знаходзіліся на адлегласці каля 90 м ад замчышча і абкружалі замак з поўначы, захаду і поўдня. Дуга ўмацавання замыкалася з усходу балоцістымі берагамі ракі.

Даследавалі ў 19 ст. Ф. В. Пакроўскі, у 1970 г. М. А. Ткачоў. Выяўлены культурны пласт да 40 см. Знойдзены дробныя фрагменты налёванай кафлі керамікі 15—17 стагоддзяў, кавалкі бажаніцы, аскепкі з ваннаў і гліняная абмазка. На перадзамчышчы захаваліся сляды паселішча. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Рэшткі замка — помнік абарончага дойлідства.

Літ.: Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии // Труды девятого археологического съезда в Вильне. 1893. М., 1895, т. 1; Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978. *М. А. Ткачоў*



1418. *План умацавання каралеўскага замка.*

1419. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вескі.

Пабудавана ў 1930 г. з дрэва. Крыжападобны ў плане будынак. Над сярэдкрыжжам на чацверыку ўзвышаецца масіўны васьмігранны барабан з купалам, увянчаным галоўкай. Алтарны зруб накрыты вальмавым дахам. Зруб бабінца завершаны двух'ярусным [illegible] з купалам. Дахі над бакавымі алтарамі і рызніцамі ўтвараюць своеасаблівую кампазіцыю.

У архітэктуры царквы адчуваецца ўплыў традыцый народнага драўлянага дойлідства.

1419. *Царква Раства багародзіцы. План.*

в. Магілеўцы,
Зэльвянецкі сельсавет

1420. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На могільках 8 насыпаў. Вы-

1419. *Царква Раства багародзіцы. Фрагмент.*



1429. [illegible]

[illegible] м [illegible] Мет[illegible] Уладзімір Кругалья. [illegible] 1970 [illegible] Мітрафанаў [illegible]

1421. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру [illegible] У цэнтры [illegible] Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 196[illegible]

в. Мачокі, Ружанскі сельсавет

1422. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 287 воінаў і пар[illegible] [illegible] у баях [illegible] праціў нямецка-фашысцкіх захопнікаў [illegible] У 19[illegible] на магіле [illegible] [illegible] абеліск.

в. Манчакі, Ружанскі сельсавет

1423. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны 1[illegible] [illegible] жыхароў вёскі, якіх забілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1941 [illegible] У [illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

в. Мокрае, цэнтр сельсавета

1424. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На [illegible] [illegible] сярод [illegible]. Пахаваны [illegible] і партызан, [illegible] у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] камянёвай [illegible]

1425. ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

1426. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1965 г.

в. Мурава, Сухопальскі сельсавет

1427. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На будынку Дома культуры. На ўшанаванне памяці [illegible] жыхароў вёскі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Німковічы, Мокраўскі сельсавет

1428. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у лесе. Пахаваны 58 жыхароў вёсак Німковічы і Пасталова, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 17.7.1942 г. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Паддубна, Гарадзечанскі сельсавет

1429. МЕСЦА БОЮ 1812 г. (Гарадзечанская бітва, гіст.). Ва ўрочышчы Высокая Гара, за 2 км на поўнач ад вёскі.

У Айчынную вайну 1812 г. рускай арміі (каля 18 тыс. чалавек) пад камандаваннем генерала А. П. Тармасава 31.7.1812 г. вялі бой з аўстрыйскім корпусам К. Шварцэнберга і саксонскім корпусам Ж. Л. Ранье (каля 40 тыс. чалавек). У гэтым баі вораг страціў 6 тыс. салдат і афіцэраў.

На месцы бітвы пабудавана мураваная капліца (закладзена ў 1912 г.). На яе сценах былі высечаны прозвішчы рускіх часцей, якія ўдзельнічалі ў бітве, і імёны загінуўшых воінаў.

Афіцыйнае адкрыццё помніка не адбылося ў сувязі з пачаткам 1-й сусветнай вайны. У 1915 г. каля капліцы хавалі загінуўшых рускіх салдат. У Вялікую Айчынную вайну капліца была разбурана, захаваўся шасцігранны цокаль. На яго фасадзе — металічная пліта з памятным надпісам.

У 1912 г. з нагоды 100-годдзя бітвы на 22-м км шашы Пружаны – Высокае, каля павароту на в. Паддубна пастаўлены сям метровы [illegible] стала.

Літ.: Война русского народа с Наполеоном 1812 г. – СПб., 1910; Михайловский-Данилевский А. И. Описание Отечественной войны 1812 г. [illegible] [illegible] [illegible] І. М. М[illegible]

1430. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Фелі[illegible]ксу Эдмундавічу (гіст.). Каля клуба. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Пашлёва, Сухопальскі сельсавет

1431. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 1[illegible]8 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

1432. ПОМНІК КАЖАЎНІКАВУ Рыгору Піліпавічу (гіст.). За 2 км на захад ад вёскі. Чырвонаармеец Р. П. Кажаўнікаў загінуў 28.6.1941 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На месцы гібелі ў 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Параслявы, Пружанскі сельсавет

1433. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 61 воін і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941–44 гг. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Паўлава, цэнтр сельсавета

1434. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На [illegible] ускраіне вёскі. Пахаваны 10 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941–44 гг. У 19[illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

в. Плябанцы, Пружанскі сельсавет

1435. ПОМНІК САВЕЦКІМ ТАНКІСТАМ (гіст.). У заходняй частцы вёскі.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны воіны Чырвонай Арміі аказалі ўпартае супраціўленне нямецка-фашысцкім захопнікам у раёне г. Пружаны. Тут з 23 да 25.6.1941 г. жорсткія абарончыя баі вяла 30-я танкавая дывізія (камандзір палкоўнік С. І. Багдана[illegible]). Пагледзячы на вялікую перавагу праціўніка ў жывой сіле і тэхніцы, воіны дывізіі стрымлівалі націск гітлераўцаў, адбілі шэраг атак ворага і нанеслі яму страты.

У 1977 г. ў гонар баявых подзвігаў танкістаў 30-й танкавай дывізіі ўстаноўлены абеліск.

Літ.: Буг в огне. [illegible] 3 изд. – Мн. 1977.

в. Роўбіцк, цэнтр сельсавета

1436. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У паўднёва-ўсходняй частцы вёскі. Пахаваны 45 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск, побач — пліты з імёнамі 73 землякоў, якія загінулі ў 1941–45 гг.

1437. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА БРЫТУНУ Арсенію Ямяльянавічу і **ШЧЭРБЕ** Ігнату Сцяпанавічу (гіст.). У памяшканні былога будынка сельсавета. Устаноўлена ў 1969 г. на ўшанаванне памяці першых старшыні і сакратара Роўбіцкага сельсавета А. Я. Брытуна і І. С. Шчэрбы, расстраляных у чэрвені 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

1438. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КЛІМЦУ Паўлу Антонавічу (гіст.)

На будынку праўлення калгаса «Шлях Леніна». Устаноўлена ў 1969 г. ва ўшанаванне памяці арганізатара і першага старшыні калгаса П. А. Клімава, які трагічна загінуў у 1953 г.

1439. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (скулпт.). Каля школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1972 г.

в. Рудпікі. Мокраўскі сельсавет

1440. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАНА (гіст.). У заходняй частцы вёскі. Пахаваны 58 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1963 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

1441. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Каля скрыжавання дарог Рудпікі — Замошша і Селянічы — Пакацверкі. Каля 50 насыпаў. Вышыня 0,6—1,3 м, дыяметр 8—11 м. Выяўлены і абследаваны ў 1968 г. В. Р. Супрун. Раскопкі не праводзіліся.

ХХ. РУЖАНЫ

Гарадскі пасёлак у Пружанскім р-не, на р. Ружанка. За 45 км на паўночны ўсход ад Пружан, 140 км ад Брэста, 38 км ад чыгуначнай станцыі Івацэвічы, на скрыжаванні аўтамабільных дарог Брэст — Слонім і Ваўкавыск — Косава.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб Ружанах (Ражанах) адносіцца да 1552 г. Мястэчка належала Тышкевічам, з 1598 г. — Сапегам. Уваходзіла ў Слонімскі павет Вялікага княства Літоўскага. У 1637 г. Ружаны атрымалі магдэбургскае права. Кампазіцыйным цэнтрам пасёлка — замак і плошча — абуджоўваліся паралельныя вуліцы. У 17 ст. ў Ружанах больш за 400 дамоў, піўзавод і паташны заводы, базыльянская школа, 2 манастыры, царква, касцёл. У 18 ст. створаны палацавы ансамбль, адкрыты прыгонны тэатр, працавалі папярня, суконная і палатняная мануфактуры, выраблялі ся дываны, мастацкія паясы і інш.

З 1795 г. Ружаны ў складзе Расіі, мястэчка, цэнтр воласці Слонімскага павета і губерні, з 1797 г.— Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерняў. У 1831 г. за ўдзел Сапегаў у паўстанні 1830—31 гг. канфіскаваны і перададзены ў казну. Каля Ружан у 1863 г. адбыўся бой паўстанцаў з царскімі войскамі. У 19 ст. ў мястэчку 2 гарбарныя заводы, палатняная і 1 суконная фабрыкі. Паводле перапісу 1897 г. было 5016 жыхароў, 609 будынкаў, 5 дробных прадпрыемстваў (у т. л. 2 вадзяныя млыны), народнае вучылішча, прыёмны пакой. У 1914 г. 6815 жыхароў, 30 дробных прадпрыемстваў (341 рабочы). У час Рэвалюцыі 1905—07 гг. баставалі рабочыя суконнай фабрыкі. У 1-ю сусветную вайну з 1915 г. Ружаны акупіраваны нямецкімі, у 1919—20 польскімі войскамі. У ліпені 1920 устаноўлена Савецкая ўлада. У 1921—39 гг. у складзе буржуазнай Польшчы, цэнтр гміны Косаўскага павета Палескага ваяводства. Дзейнічаў Ружанскі райком КПЗБ. У 1924 г. баставалі рабочыя.

Пасля ўз'яднання ў 1939 г. Заходняй Беларусі з БССР Ружаны з 15.1.1940 г. гарадскі пасёлак, цэнтр раёна. З 23.6.1941 г. былі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі; дзейнічаў падпольны антыфашысцкі камітэт. На тэрыторыі раёна — Пружанскі падпольны райком КП(б)Б, з 1.8.1943 г. па 15.7.1944 г. Ружанскі падпольны райком ЛКСМБ. 13.7.1944 г. Ружаны вызвалены войскамі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту. З 1962 г. у Пружанскім р-не.

Гістарычная структура пасёлка стала асновай яго сучаснай планіроўкі і забудовы. У Ружанах 2 планіровачныя раёны, падзеленыя поймай ракі і звязаныя паміж сабою вул. Савецкай, якая з'яўляецца кампазіцыйнай воссю пасёлка. Генеральны план распрацаваны ў 1974 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва. Адміністрацыйна-гандлёвы цэнтр знаходзіцца на месцы былой рыначнай плошчы (цяпер пл. 17 Верасня), дзе сыходзяцца вуліцы Леніна, Савецкая і Чырвонаармейская. Захаваліся помнікі архітэктуры 17—19 стагоддзяў — Троіцкі касцёл і Петрапаўлаўская царква.

ХХ. *Дом культуры*

Значную ролю ў фарміраванні сучаснага аблічча Ружан адыгрываюць палацавы комплекс 16—18 стагоддзяў. Забудова вуліц Леніна, Савецкай, Чырвонаармейскай мураваная ў асноўным 2- і 3-павярховая. На вул. Чырвонаармейскай сфарміраваны комплекс шматпавярховых жылых дамоў.

Прамысловая зона размешчана ў заходняй частцы. Дзейнічаюць мэблевая фабрыка, майстэрні бытавога абслугоўвання, цэхі бялізнавай фабрыкі, Пружанскага камбіната будаўнічых матэрыялаў, вытворча-харчовы камбінат, хімлесаўчастак.

У Ружанах працуюць сярэдняя і музычная школы, 2 дашкольныя ўстановы, Дом культуры, Дом піянераў і школьнікаў, 2 бібліятэкі, 2 бальніцы. Помнікі У. І. Леніну, І. П. Урбановічу, на брацкай магіле савецкіх воінаў

ХХ. *Вуліца Савецкая*

1443. К[illegible]

[illegible] партызан[illegible], што загінулі ў 1941 [illegible]. Курган Славы ва мат[illegible] воінаў, [illegible] у баях у чэрвені 1941 г.

[illegible]

Зона адпачынку [illegible] Ха[illegible] На [illegible] па паўноч[illegible] ахвяр[illegible] прыгожымі [illegible] масівамі.

Літ.: Бобровский П. [illegible] географии и статистики России [illegible] Гродненская губерния [illegible] СПб., 1863; Всеобщая история архитектуры. Т. 6. М., 1968; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym [illegible] T. [illegible] Warszawa, 1845; Lorentz S. Wycieczki Słonimskie [illegible]

1444. Манастыр базыльян. Петрапаў[illegible]

[illegible]

[illegible] Р. А. Баслер[illegible]

1442. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАНА (гіст.). На пл. 17 Верасня, у скверы. Пахаваны 89 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг.

У 1-й палавіне ліпеня 1944 г. войскі 1-га Беларускага фронту, пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, падышлі да г. п. Ружаны. Часці 9-га гвардзейскага Бабруйскага Чырвонасцяжнага танкавага корпуса (камандзір генерал-маёр Б. С. Бахараў) і конна-механізаванай групы (генерал-лейтэнант І. А. Пліеў) прарвалі варожую абарону і 13.7.1944 г. вызвалілі Ружаны.

У 19[illegible] на магіле пастаўлены аб[illegible]

Літ.: Бул[illegible]

1443. КУРГАН СЛАВЫ (гіст.). За 2 км на поўнач ад гарадскога пасёлка, каля шашы на Ваўкавыск.

На подступах да Ружан у чэрвені 1941 г. у жорсткіх абарончых [illegible] савецкія воіны [illegible] значныя страты нямецка-фашысцкім захопнікам. Тут змагаліся 22-я (генерал-маёр В. [illegible] Пуганаў) і 25-я (палкоўнік [illegible] М. [illegible]) танкавыя дывізіі. Да 30 чэрвеня воіны стрымлівалі [illegible], знішчылі некалькі дзесяткаў варожых танкаў. Астанкі загінуўшых 127 савецкіх воінаў былі перазахаваны ў брацкай ма[illegible].

У 1967 г. на магіле насыпаны Курган Славы (вышыня [illegible] м). Побач да [illegible] абеліскам на [illegible] устаноўлены танк Т-34. Вяршыню кургана ўпрыгожвае пяцікантовая зорка. На пастаменце і на схіле насыпу ўмураваны мемарыяльныя дошкі з памятнымі надпісамі і імёнамі (вядомымі) пахаваных. На схіле Кургана — урна з тэкстам клятвы сучаснікаў на вернасці служэння Радзіме.

[illegible] Ч. Н. К[illegible]

1444. МАНАСТЫР БАЗЫЛЬЯН [illegible] ст., маст.). На пл. 17 Верасня. Уключае Петрапаўлаўскую царкву і жылы корпус.

Петрапаўлаўская царква выходзіць галоўным усходнім фасадам на плошчу. Пабудавана як уніяцкая ў 1675 г. з цэглы. У 1784—88 перабудавана (арх. Я. С. Бекер). Будынак адзінанефавы, адзінаапсідавы, з нізкай паўкруглай апсідай, накрыты шатровым двухсхільным дахам, які над апсідай пераходзіць у конусападобны і завяршаецца галоўкай. У месцы злучэння нефа з апсідай па баках сіметрычна размешчаны 2 квадратныя ў плане невысокія рызніцы, накрытыя трохсхільнымі дахамі. Галоўны фасад з рызалітам у цэнтры завершаны развітым антаблементам і двухярусным атыкам з трохвугольным франтонам у ніжнім ярусе. Другі ярус атыка з'яўляецца асновай для пяцісценнай чацвярыковай вежы-званіцы, накрытай крыжападобным дахам з 4 франтончыкамі і галоўкай у цэнтры. Галоўны фасад аздоблены спарнымі пілястрамі, прафіляванымі цягамі, нішамі і філёнгамі. Сцены бакавых фасадаў раскра[illegible]

1444. П[illegible]



1444. *Петрапаўлаўская царква. План.*



1444. *П[illegible] [illegible]*

...павалы пілястрамі і завершаны раз[illegible] [illegible] [illegible]. Вуглы і паў[illegible] завяршэннем маюць прафіляваныя [illegible]. У [illegible] фасада размешчаны лесвіцы, якія вядуць на хоры і ў вежу-званіцу. Інтэр'ер залы з люстраным скляпеннем [illegible] атынкаваны абсяг... [illegible] размалёўка на тэму «Праабражэнне» (пашкоджана пажарам у 1895 г., аднаўлена у пачатку 20 ст.). У конхе апсіды размешчана кампазіцыя «Бог Саваоф». На паўночнай і паўднёвай сценах (каля іканастаса) у медальёнах выявы Пятра і Паўла. Жывапіс выкананы ў сухаватай акадэмічнай манеры. У агульнай каларыстычнай гаме, пабудаванай на багацці сініх тонаў, пераважаюць прыглушаныя цёплыя адценні (карычнева-чырвоныя, [illegible]).



1444. *Будынак жылога корпуса манастыра базыльян. План 1-га і 2-га паверхаў.*

Жылы корпус пабудаваны ў 178[illegible]—88 гг. з цэглы (арх. Я. С. Бекер) з паўднёвага боку царквы. Будынак прамавугольны ў плане, двухпавярховы, з вальмавым дахам. Галоўны ўваходны фасад сіметрычны, кампазіцыя трохчастковая. Цэнтральная частка вылучана невялікім рызалітам, бакавыя падзелены пілястрамі, паміж якімі размешчаны вокны з філёнгамі. Рызаліт і вуглы будынка апрацаваны падвоенымі пілястрамі. Цэнтральны [illegible] уваход [illegible] арачны паўцыркульны, акон[illegible] прамавугольныя, дэкараваныя трохвугольнымі і паўцыркульнымі сандрыкамі на 1-м паверсе. Дваровы і бакавыя фасады без архітэктурнага ўбрання. Будынак мае канструкцыйную схему з 3 падоўжнанясучымі сценамі. Уздоўж корпуса размешчаны [illegible] праход з лесвіцай. Планіроўка 1-га паверха анфіладная, 2-га — калідорная. 1-ы паверх перакрыты крыжовымі скляпеннямі на падпружных арках, перакрыццё 2-га паверха плоскае. Цяпер тут размешчана [illegible].

Манастыр — помнік архітэктуры барока.

Літ.: Бобровский П. Материалы [illegible]
[illegible]
[illegible]
1968; Lorentz S. Wycieczki Słonimskie. Krótki przewodnik krajoznawczy po Słonimie [illegible]
[illegible]
Zaw[illegible]

У. В. Алісейчык, В. В. Цярэнцьева.

1445. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА УРБАНОВІЧУ Іосіфу Паўлавічу (гіст.). [illegible] на ўшанаванне памяці ўдзельніка рэвалюцыйнага і нацыянальна-[illegible] [illegible] раўнікоў камуністычнага падполля [illegible] у Вялікую Айчынную вайну І. П. Ур...

1444. *Петрапаўлаўская царква. Інтэр'ер. Размалёўка алтара.*

1444. *Будынак жылога корпуса манастыра базыльян.*



1446. *Палацавы комплекс. Схема планіроўкі: 1 — галоўны корпус; 2 — усходні корпус (тэатр); 3 — аркады; 4 — уязная брама з флігелямі.*

бановіча, які працаваў тут старшынёй Ружанскага пасялковага Савета ў 1941—44 гг. Гл. артыкул № 1448 «Помнік Урбановічу Іосіфу Паўлавічу».

1446. ПАЛАЦАВЫ КОМПЛЕКС (арх. пом.). На высокім узгорку ў паўднёва-ўсходняй частцы гарадскога пасёлка. У 16 ст. пабудаваны двухпавярховы крыжападобны ў плане мураваны палац з 3 вежамі. Дзве з іх былі квадратныя ў плане: пры ўваходзе з боку галоўнага паўднёвага фасада і на тарцы левага заходняга крыла. На паўночна-ўсходнім вугле будынка размяшчалася шасцігранная вежа. У цэнтральнай частцы палаца, якая выступае на падоўжных фасадах глыбокімі рызалітамі, знаходзіліся парадныя залы і вестыбюль з чатырохмаршавай лесвіцай, у бакавых частках — жылыя пакоі, кабінеты, архіў, бібліятэка. Унутраная планіроўка анфіладная. Памяшканні на 1-м паверсе мелі скляпеністыя, на 2-м — бэлечныя перакрыцці. Пад будынкам вялікія двухпавярховыя скляпеністыя падвалы.

1446. *Руіны галоўнага корпуса палаца.*

Палац быў значна разбураны войскамі канфедэратаў у 1698 г. і ў час Паўночнай вайны 1700—21 гг., аднаўляўся ў 1-й палавіне 18 ст., у 1784—88 гг. перабудаваны (арх. Я. С. Бекер). Вежы на галоўным фасадзе і вуглавая былі разабраны, а тарцовая забудавана, у выніку палац стаў сіметрычным у плане. Да галоўнага фасада прыбудавалі [illegible] порцік з падвоенымі калонамі і пілястрамі, завершаны высокім трохвугольным франтонам са скульптурай.

Адначасова створаны палацавы комплекс з некалькіх згрупаваных вакол параднага двара карпусоў, з паркам, садамі і аранжарэяй. Сіметрычныя ўсходні і заходні карпусы размешчаны перпендыкулярна палацу, злучаліся з ім паўцыркульнымі ў

1446. *Руіны палацавага комплексу.*

1446. *Руіны ўсходняга корпуса палацавага комплексу*

[illegible]ваная аркадамі. Ва ўсходнім корпусе быў тэатр, у заходнім (не збярогся) — карцінная галерэя. Паралельна пала[illegible]цу на восі сіметрыі вялікага парадна[illegible]га двара размешчана ўязная брама, якая злучае 2 двухпавярховыя жылыя флігелі. Брама вырашана ў выглядзе трохпралётнай трыумфальнай аркі, упрыгожана разнымі геральдычнымі картушамі з морэнага дуба. У апрацоўцы фасадаў будынкаў палацавага комплексу выкарыстаны руставаныя пілястры, ляпныя гірлянды, скульптуры, разнастайныя абрамленні вокнаў.

Дварцовы комплекс пашкоджаны ў 1914 г., часткова рэстаўрыраваны ў 1930 г., у 1944 г. разбураны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Захаваліся



1446. *Галоўны корпус палаца. План 1 паверха*

асноўныя забудовы (галоўны і ўсходні карпусы, аркады, уязная брама і флігелі), фрагменты аздобы інтэр'ераў і канструкцыі перакрыццяў.

Комплекс — адзін з буйнейшых помнікаў палацавай архітэктуры Беларусі 16—18 стагоддзяў, у якім спалучаюцца рысы позняга барока і класіцызму.

Літ.: Всеобщая история архитектуры. Т. 6. М., 1968; Ходыко Т. Я. Дворцово-парковый [illegible] // Строительство и архитектура Белоруссии, 1974, № 3; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. 2 изд.— Мн., 1977; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska [illegible] Warszawa, 1886; [illegible] Zdzięciole i Żyrowicach. Słonim, 1933.

Т. В. Габрусь

1447. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. 17 Верасня, у цэнтры пасёлка. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1958 г.

1448. ПОМНІК УРБАНОВІЧУ Іосіфу Паўлавічу (гіст.). На вул. Савецкай, у скверы.

Актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобл. ў Вялікую Айчынную вайну. І. П. Урбановіч нарадзіўся 21.3.1907 г. ў в. Шэнічы Пружанскага р-на. Член КПСС з 1928 г. З 1930 г. сакратар Баранавіцкага, потым Брэсцкага акруговых камітэтаў КПЗБ. У 1931 г. засуджаны польскімі буржуазнымі ўладамі на 6 гадоў турмы. У 1934 г. выпушчаны пад залог.

1447. *Помнік У. І. Леніну*

У [illegible] г. узначальваў старшыню Ружанскага [illegible] выканкома. Саветаў. У жніўні 1941 г. па рашэнню ЦК КП(б)Б І. П. Урбановіч накіраваны праз лінію фронту ў Ружанскі р-н для арганізацыі партызанскага руху

1446. *Палацавы комплекс Сапегаў. Уязная брама* [illegible]

1446. [illegible]

1448. [illegible]

1450. Тр[illegible]

[illegible]ым сакратаром Ружанскага райённага [illegible] антыфашысцкага камітэта, з 1942 г. сакратар міжрайённага [illegible], які ў 1943 г. рэарганізаваны ў [illegible] абласны антыфашысцкі камі[illegible]. У чэрвені—ліпені 1943 г. камандзір партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі Брэсцкай вобл. Загінуў [illegible] 1944 г. Пахаваны ў партызанскіх [illegible] каля ўрочышча Гута Міхалін, за 11 км на поўдзень ад в. Верашкі [illegible].

[illegible] Сурскі; бетон, мар[illegible] [illegible] 2 м).

У. С. [illegible], А. А. Фактаровіч.

1449. СІНАГОГА (архіт.). У цэнтры [illegible]. Пабудавана ў канцы 18 ст. [illegible] Фасады [illegible] прафіляванымі лапаткамі. [illegible] класіцызму.

1450. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ (архіт. [illegible]). На пл. 17 Верасня. Мураваны [illegible] закладзены ў 1615 г. (на месцы [illegible]). У 1768 г. прыбу[illegible] У 1787 г. капліца св. Варвары і зроблены купал над апсідай (арх. Я. С. Бекер). Рэканструкцыя 1860 г. надала архітэктурнаму дэкору касцёла рысы класіцызму. Касцёл аднаўлены пасля пажару [illegible].

[illegible] адзінанефавы, аднавежавы [illegible] паўцыркульнай апсідай прыбудаванай [illegible] прамавугольнага ў плане нефа [illegible] сіметрычна крыльцамі [illegible] да апсіды [illegible]. Пры ўваходзе [illegible] вежа высокім гранёным шатром [illegible]

[illegible]ральным, бакавымі прасценкамі. Сцены бакавых фасадаў аздоблены пілястрамі, паміж якімі прарэзаны высокія акны з лучковым завяршэннем і люкеты. Па франтону ў нішы сол[illegible] за апосталы скульптуры св. Дамініка. Неф касцёла перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі [illegible] [illegible] арках. Бакавыя [illegible] прасторы перакрыты крыжовымі скляпеннямі. Над уваходам у заходняй частцы будынка размешчаны хоры на [illegible]ах, укладзеных крыжападобных у плане слупах з развітымі фігурнымі кранштэйнамі.

Інтэр'ер касцёла багата ўпрыгожаны архітэктурнай пластыкай, скульптурай і жывапісам. Амбон, скапцэнніі і падсвечнікі [illegible]кладзеныя арнаментам раслінага характару. Прастору прэзбітэрыя замыкае тэтыкалонны галоўны алтар з ляснянавальным лучковым франтонам [illegible] упрыгожаны скульптурамі анёлаў, лінеаны арнамент і герб Сапегаў. Уздоўж калон размешчаны драўляныя поліхромныя скульптуры св. Пятра і [illegible]. Прэзбітэрый ад нефа аддзяляе каваная агароджа 18 ст., камянцы [illegible] [illegible] ваз, [illegible] валют, кветак і манаграмы фундатара касцёла. Адначасова з [illegible] часткі ўпраўлены ўваходы ў бакавыя [illegible]амянкі [illegible] капліцы. Стукавая і драўляная скульптура галоўнага алтара і бакавых капліц работы скульптара І. Пруквера.

У архітэктуры помніка выкарыстаны элементы ранняга барока, у аздобе інтэр'ера [illegible] позняга барока. У выніку шматлікіх перабудоў помнік набыў некаторыя рысы класіцызму.

В. В. Церашчатава, М. М. Яніцкая

в. Сасноўка,
Гарадзечанскі сельсавет

1451. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Сілічы. Мокраўскі сельсавет

1452. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 41 мірных жыхароў, расстраляных 17.7.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вёска (56 два[illegible]



1450. [illegible]

роў) была спалена [illegible]. [illegible] пастаўлены абеліск.

в. Слабудка. Пружанскі сельсавет

1453. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 180 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1944 гг. У 19[illegible] на магіле пастаўлены абеліск.

1454. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 1 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе. Пахавана больш за 400 савецкіх ваеннапалонных, падпольшчыкаў і мірных жыхароў, растраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. на магіле пастаўлена абеліск.

в. Сянімцы. Пружанскі сельсавет

1455. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У парку. На [illegible] памяці [illegible] 3 [illegible] аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1972 г. пастаўлены абеліск.

в. Смаляніца. Хараўскі сельсавет

1456. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На могілках. Пахаваны 70 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1457. ПОМНІК У ГОНАР БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА АНТЫФАШЫСЦКАГА КАМІТЭТА, ПРУЖАНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б І ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ П. К. ПАНАМАРЭНКІ (гіст.). За 5 км на ўсход ад вёскі, каля шашы Пружаны — Ружаны. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Ружанскай пушчы размяшчаліся Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт, Пружанскі [illegible] падпольны райком КП(б)Б і штаб брыгады імя П. К. Панамарэнкі.



1450. *Троіцкі касцёл. Алтар [illegible] капліцы.*

1450. *Троіцкі касцёл. Хоры.*

1450. *Троіцкі касцёл. Галоўны алтар*

1450. *Троіцкі касцёл. Фрагмент інтэр'ера. Каванне агароджы.*

У кастрычніку 1942 г. па нарадзе кіраўнікоў антыфашысцкіх арганізацый і груп Брэсцкай вобл. быў створаны Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі, які ўзначаліў антыфашысцкі рух на тэрыторыі паўночных і цэнтральных раёнаў Брэсцкай вобл., а таксама суседніх раёнаў Баранавіцкай і Беластоцкай абласцей. Паводле рашэння ЦК КП(б)Б у ліпені 1943 г. Камітэт барацьбы рэарганізаваны ў Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт. Раённыя антыфашысцкія арганізацыі Баранавіцкай і Беластоцкай абласцей былі перададзены ў падпарадкаванне падпольных міжраёнкомаў і райкомаў КП(б)Б. Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт дзейнічаў пад кіраўніцтвам Брэсцкага падпольнага абкома КП(б)Б. У ліпені 1944 г. аб'ядноўваў 11 раённых арганізацый, 122 ячэйкі, 893 падпольшчыкі. На чале яго стаялі І. П. Урбановіч, М. Е. Крыштафовіч, І. І. Жышка, Я. М. Афанасьеў і інш. Камітэт ствараў антыфашысцкія арганізацыі і групы, кіраваў іх баявой дзейнасцю, праводзіў масава-палітычную работу па мабілізацыі працоўных на барацьбу з акупантамі. У ліпені 1942 г. пачала працаваць друкарня камітэта, якая выпускала адозвы, звароты, зводкі Саўінфармбюро і іншыя матэрыялы на беларускай, рускай, польскай і нямецкай мовах, са снежня 1943 г. — газету «За Родину». Пад кіраўніцтвам камітэта былі створаны і дзейнічалі партызанскія атрады (да кастрычніка 1942 г. створаны 7 атрадаў, 1000 чалавек), на базе якіх летам 1943 г. арганізаваны брыгады імя П. К. Панамарэнкі і «Савецкая Беларусь».

Пружанскі падпольны райком КП(б)Б створаны 23.11.1943 г., працаваў да 11.7.1944 г. Яго дзейнасцю кіраваў Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б. Сакратаром Пружанскага райкома КП(б)Б быў дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі С. П. Пацяруха. Райком узначальваў камуністычнае падполле ў раёне, кіраваў партызанскім рухам, вёў палітычную і арганізатарскую работу сярод насельніцтва. Падпольшчыкі праводзілі дыверсіі на камунікацыях ворага, здабывалі і перадавалі партызанам зброю, харчы, медыкаменты, вялі разведку, распаўсюджвалі сярод насельніцтва антыфашысцкую літаратуру.

Партызанская брыгада імя П. К. Панамарэнкі Брэсцкай вобл. створана ў чэрвені 1943 г. Дзейнічала на тэрыторыі Бяроза ўскага, Косаўскага, Пружанскага, Ружанскага р-наў Брэсцкай і Слонімскага р-на Баранавіцкай абласцей. Камандзіры брыгады І. П. Урбановіч (чэрвень — ліпень 1943 г.), М. У. Сенькін (ліпень 1943 г. — ліпень 1944 г.), камісары С. П. Пацяруха (чэрвень — ліпень 1943 г.), К. Д. Тачочка (верасень — лістапад 1943 г. і пасля), М. Е. Крыштафовіч (лістапад 1943 г. — ліпень 1944 г.). Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгуначных і шашэйных дарогах, разбуралі варожыя ўмацаванні, вялі засадныя баі з праціўнікам, знішчалі яго жывую сілу і тэхніку. У лютым 1944 г. разбілі гарнізон у в. Карчыкі Слонімскага р-на. 11.7.1944 г. брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі. На дзень злучэння налічвала 4 атрады (1367 партызан).

У памяць аб дзейнасці Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта, Пружанскага падпольнага райкома КП(б)Б і партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі ў 1975 г. пастаўлены абеліск.

Літ.: Бу[illegible] ... у памяць ... 3 изд. Мн., 1977.

Г. І. Далеба, А. А. Фонтал[illegible]

1458. ПОМНІК ХАРУЖАЙ Веры Захараўне (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1960 г.) В. З. Харужай, якая ў жніўні 1924 г. выступала на мітынгу ў в. Смалянічы. У 1970 г. пастаўлена стэла.

1459. ЦАРКВА (архіт.). На заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў пачатку 19 ст. з цэглы. У яе трохчастказан аб'ёмнай кампазіцыі дамінуюць шатровая званіца і цыбуленадобны шлем на граняным барабане. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

в. Смаляны, цэнтр сельсавета

1460. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі Пахаваны 42 воіны, у т. л. 3 лётчыкі 69-га бамбардзіровачнага авіяпалка, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, і 18 мірных жыхароў, расстраляных гітлераўцамі ў 1944 г.

У 19[illegible]7 г. на магіле пастаў[illegible] помнік — скульптура воіна.

в. Стараволя, цэнтр сельсавета

1461. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. Пахаваны 35 воінаў і партызан, што загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск, які ўшаноўвае таксама памяць 103 землякоў, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

1462. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ВАЗНІШЧЫКУ Мікалаю Васілевічу (гіст.). На будынку клуба. Устаноўлена ў 1970 г. на ўшанаванне памяці старшыні выканкома Стараволькага сельсавета М. В. Вазнішчыка, забітага ворагамі Савецкай улады 27.[illegible]19[illegible]7 г.

1463. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1970 г.

в. Сухаполь, цэнтр сельсавета

1464. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 21 воін і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. [illegible] на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

1465. КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА (арх.т.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў пачатку 20 ст. з цэглы. Мае трохчасткавую кампазіцыю з шатровай вежай званіцай і шлемападобнымі купаламі над асноўным аб'ёмам. Помнік архітэктуры неоўдарускага стылю.

в. Харава, цэнтр сельсавета

1466. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КРЫШТАФОВІЧУ Васілю Емяльянавічу (гіст.). На будынку праўлення калгаса імя У. І. Леніна. Устаноўлена ў 1967 г. на ўшанаванне памяці першага старшыні калгаса В. Е. Крыштафовіча, якога ў 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі.

1467. ПОМНІК ВЫЗВАЛЕННЯ (гіст.). У цэнтры вёскі. У гонар воінаў 28-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія вызвалілі в. Харава ў ліпені 1944 г., у 1957 г. устаноўлены помнік — скульптура воіна.

1468. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ [illegible] Каля будынка праўлення калгаса імя [illegible] На ўшанаванне памяці [illegible] якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у [illegible]67 г. пастаўлены помнік [illegible]

в. Харкі, Гарадзечанскі сельсавет

1469. ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст Ф. Э. Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

хутар Хомна (не існуе), Ліноўскі сельсавет

1470. МЕСЦА СПАЛЕНАГА ХУТАРА (гіст.). Хутар Хомна знаходзіўся за 3 км на захад ад в. Ліпова. У 1943 г. спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі (21 двор). Пасля вайны не адраджаўся.

в. Чахец, Шанёўскі сельсавет

1471. МЕСЦА МІТЫНГУ СЯЛЯН (гіст.). Каля будынка школы.

Тут у жніўні 1924 г. адбыўся мітынг сялян вёсак Казі Брод, Ліпова, Ляхі, Чахец, Шані і іншых, на якім з прамовай выступіла сакратар ЦК КСМЗБ В. З. Харужая. Яна заклікала сялян да барацьбы супраць памешчыкаў і капіталістаў, непасільных падаткаў, за перадачу зямлі сялянам.

У 1970 г. ў памяць аб мітынгу на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

[illegible] У суровыя гады падполля. [illegible] былых [illegible] КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэв[illegible] руху ў [illegible] най Беларусі. Мн., 1958.

в. Шакуны, Шанёўскі сельсавет

1472. РАДЗІМА ШЫРМЫ Рыгора Раманавіча (гіст.).

Беларускі савецкі харавы дырыжор, фалькларыст, грамадскі дзеяч, народны артыст СССР (1955 г.), Герой Сацыялістычнай Працы (1977 г.). Р. Р. Шырма нарадзіўся 8.1.1892 г. з сялян. Член КПСС з 1959 г. Пачатковую адукацыю атрымаў у Пружанах, [illegible] скончыў Седлецкія настаўніцкія курсы (1918 г.). З 1912 г. настаўнік. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. З 1926 г. выкладчык беларускай гімназіі ў Вільні. На гэты перыяд прыпадае пачатак культурна-асветніцкай і грамадскай дзейнасці Р. Р. Шырмы. Ён выступаў з лекцыямі аб беларускай літаратуры і мастацтве, узначальваў хор беларускай гімназіі, стаў мастацкім кіраўніком універсітэцкага хору, хору Беларускага саюза студэнтаў у Вільні. У 1928—37 гг. сакратар прагрэсіўнай культурна-асветніцкай арганізацыі Таварыства беларускай школы (ТБШ) і рэдактар часопіса «Беларускі летапіс». Быў двойчы зняволены ўладамі буржуазнай Польшчы. Пасля ўз[illegible]нання Заходняй Беларусі з БССР Р. Р. [illegible]ма — арганізатар і мастацкі кіраўнік Беларускага ансамбля песні і танца (з 1940 г.; у 1950 г. ансамбль рэарганізаваны ў Дзяржаўны хор БССР, з 1955 г. — Дзяржаўная харавая капэла БССР, з 1957 г. акадэмічная, з 1978 г. носіць імя Р. Р. Шырмы). Пад кіраўніцтвам Р. Р. Шырмы капэла атрымала шырокае прызнанне ў нашай краіне і за яе межамі як выдатны харавы калектыў з самабытным стылем, дасканалай культурай інтэрпрэтацыі мастацкіх твораў, бездакорнай інтанацыйнай чысцінёй.

На працягу усяго жыцця ў аснове творчай дзейнасці Р. Р. Шырмы было збіранне і вывучэнне беларускага музычнага фальклору, мастацкай апрацоўкі беларускага народа. Ім запісана больш за 2000 песень розных жанраў, апублікаваных у зборніках «Беларускія народныя песні» (в. 1, Вільня, 1929 г.), «Наша песня» (Вільня, 1938 г.), «Дзевяць беларускіх народных песень» (М., 1958 г.), «Беларускія народныя песні» (т. 1—4, Мн., 1959—76 гг.). Запісы Шырмы выяўляюць характэрныя для беларускай народнай песеннай творчасці меладычныя стылі, найбольш тыповыя жанравыя і мелакальныя тыпы напеваў. Многія з гэтых запісаў выкарыстаны беларускімі кампазітарамі. Значную ўвагу аддаваў Шырма харавым апрацоўкам беларускіх песень і іх шырокай папулярызацыі. Ім складзена анталогія «Беларускія народныя песні (для хору)» (т. 1—2, 1971—73 гг.).

Р. Р. Шырма вядомы як публіцыст, музычны і літаратурны крытык (яго артыкулы і выступленні 1929—74 гг. сабраны ў кнізе «Песня — душа народа», 1976 г.). Значны ўклад зрабіў у прапаганду беларускага савецкага мастацтва за межамі рэспублікі. Сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР і старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР (1[illegible]—[illegible]8 гг.), старшыня таварыства «Радзіма». Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 1955 г. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР 1966 г. і 1974 г. Памёр 23.3.1978 г., пахаваны на могілках па Маскоўскай шашы ў Мінску. На доме, дзе ён жыў у Мінску, устаноўлена мемарыяльная дошка. Яго імя прысвоена Ружанскай музычнай школе.

[illegible]евіч Н. Г. Г. Р. Шырма [illegible] Мн., 1978.

Т. А. Дубкова

в. Шані, цэнтр сельсавета

1473. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ДЫБЕ Івану Міхайлавічу (гіст.). На будынку выканкома сельсавета. Устаноўлена ў 1969 г. на ўшанаванне памяці першага старшыні Шанёўскага сельсавета І. М. Дыбы, якога ў 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі.

1474. ПОМНІК БАХАРАВУ Барысу Сяргеевічу (гіст.). За 4 км на паўднёвы захад ад вёскі каля шашы Пружаны — Брэст.

Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну Б. С. Бахараў нарадзіўся 19.9.1902 г. ў г. п. Дзямянск Ноўгарадскай вобл. Член КПСС з 1924 г. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1932 г.). Генерал-маёр танкавых войск (1942 г.). На чале 9-га танкавага корпуса вызначыўся ў баях за Беларусь. Загінуў 16.7.1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопні

1479. *Помнік на Брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан*

каў каля в. Шакуны. Пахаваны ў Бабрунску.

У 1975 г. на месцы гібелі Б. С. Бахара пастаўлены абеліск.

1475. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У скверы. На ўшанаванне памяці 200 адпаваскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1969 г. пастаўлена стэла.

1476. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1970 г.

1477. РАДЗІМА ЗАСІМА МІКОЛЫ (гіст.). Беларускі савецкі паэт М. Засім нарадзіўся 6.11.1908 г. Гл. таксама артыкул № 58 «Магіла Засіма Мікалая Арцемавіча» (г. Брэст).

г. п. Шарашова

1478. БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На паўночнай ускраіне пасёлка. Пахаваны 28 мірных жыхароў, расстраляных у снежні 1942 г. гітлераўскімі акупантамі, і 4 партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1479. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На вул. Леніна, у цэнтры пасёлка. Пахаваны 84 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. У 1952 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. На мемарыяльнай дошцы таксама ўшанавана памяць 28 землякоў, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

1480. ЗВАНІЦА (архіт.). На вул. Савецкай, каля цэнтральнай плошчы пасёлка. Пабудавана ў 1799 г. з дрэва каля Прачысценскай царквы (1790 г., не збераглася).

Двух'ярусная квадратная ў плане званіца мае змешаную канструкцыю. Ніжні ярус зрублены з брусоў «у лапу» і аддзелены ад верхняга шырокім гонтавым адліvам. Верхні ярус — каркасны, складаецца з 8 стоек з разной дашчанай агароджай. Зверху стойкі абложаны вянком брусоў. Крывалінейныя надкосы надаюць праемам яруса арачны характар. Шатровы гонтавы дах завершаны шасціграннай вежачкай, дэкарыраванай глухімі арачнымі праёмамі. У сярэдзіне паўночнага і паўднёвага схілаў дах мае невялікія хвалі, якія ўзбагачаюць пластыку збудавання.

Званіца вылучаецца дасканаласцю архітэктурна-мастацкіх і канструкцыйных форм. *У. В. Алсейчык*

1480. *Званіца*

1481. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ГРЫШКЕВІЧУ Васілю Пятровічу (гіст.). Вул. 8 Сакавіка, 3, на будынку выканкома пасялковага Савета. Устаноўлена ў 1968 г. на ўшанаванне памяці першага старшыні выканкома В. П. Грышкевіча, якога ў жніўні 1941 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі.

1482. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры пасёлка. Пабудавана ў 1872 г. з цэглы. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

1483. ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У паўднёвай частцы пасёлка, на могілках. Пабудавана ў 1824 г. з дрэва.

Адназрубны храм з трохграннай алтарнай часткай накрыты высокім двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром. Галоўны заходні фасад вылучаны шасцікалонным порцікам з трохвугольным франтонам, які завершаны двух'яруснай вежачкай. Два рамбічныя аконныя праёмы размешчаны на франтоне сіметрычна адносна восі фасада. Дэкаратыўнае аздабленне галоўнага фасада дапаўняе паліхромная афарбоўка верхняй часткі сцяны. Забіўка франтона «ў елачку». Вокны прамавугольныя і рамбічныя. Інтэр'ер зальны, перакрыццё плоскае.

Царква — помнік драўлянага дойлідства з рысамі класіцызму.

У. В. Алсейчык

1484. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Леніна, у цэнтры пасёлка. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1954 г.

1485. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ (архіт.). У цэнтры пасёлка. Пабудаваны ў 1848 г. з цэглы. Трохнефавы прамавугольны ў плане будынак з 2 аднаяруснымі вежамі на галоўным фасадзе. Пластычнасць фасадам надаюць пілястры, арачныя нішы з абрамленнем скульптурай, лапаткі, якія абрамляюць арачныя аконныя праёмы. Помнік архітэктуры позняга класіцызму.



1480. *Званіца. Разрэз*



1483. *Петрапаўлаўская царква. План.*

1483. *Петрапаўлаўская царква.*

в. Шубічы, Шанеўскі сельсавет

1486. РАДЗІМА БАБРУКА Сяргея Антонавіча (гіст.).

Герой Савецкага Саюза, генерал-[illegible] (1955 г.). [illegible] А. Бабрук нарадзіўся [illegible] 1910 [illegible] у сялянскай сям'і. У Чырвонай Арміі з 1929 [illegible]. Член КПСС з 1929 г. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1940 г.). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з [illegible] [illegible]. Камандзір 47-й гвардзейскай стралковай Ніжнедняпроўскай дывізіі, гвардыі [illegible] А. Бабрук вызначыўся пры вызваленні [illegible] З 31.1 да 1 [illegible] за-[illegible] з С. А. Бабруком [illegible] абарону [illegible] каля 2100 гітлераўцаў, [illegible] аўтамашын, 9 танкаў і самаходных гармат, шмат іншай баявой тэхнікі, захапіла 22 гарматы, 655 аўтамашын, 14 складоў з боепрыпасамі, гаручым, прадуктамі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 19.3.1944 г. Да 1960 г. С. А. Бабрук служыў у Савецкай Арміі. Памёр 18.3.1962 г. *Г. І. Дулеба.*

в. Шчарчова, цэнтр сельсавета

1487. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 59 воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

1488. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КАВАЛЬЧУКУ Пімну Андрэевічу (гіст.). На будынку выканкома сельсавета. Устаноўлена ў 1969 г. ва ўшанаванне памяці першага старшыні Шчарчоўскага сельсавета П. А. Кавальчука, якога расстралялі ў 1941 г. нямецка-фашысцкія захопнікі.

в. Шэйпічы, Зеляневіцкі сельсавет

1489. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 19[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

1490. РАДЗІМА УРБАНОВІЧА Іосіфа Паўлавіча (гіст.). Удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобл. ў Вялікую Айчынную вайну. І. П. Урбановіч нарадзіўся 21.3.1907 г. Гл. таксама артыкул № 1448 «Помнік Урбановічу Іосіфу Паўлавічу».



СТОЛІНСКІ РАЁН

Стаянкі, паселішчы, гарадзішчы

Могільнікі (грунтавыя, курганныя), курганы

Цэнтры рамёстваў

Помнікі і месцы нацыянальна-вызваленчага руху

Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (месцы баёў, магілы савецкіх воінаў, партызан, Курганы Славы, помнікі землякам і інш.)

Помнікі ахвярам фашызму (месцы канцлагераў і лагераў смерці, месцы масавай загубы насельніцтва, спаленыя і неадноўленыя вёскі і інш.)

Помнікі сацыялістычнага будаўніцтва

Помнікі і месцы, звязаныя з імёнамі савецкіх партыйных і дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў культуры, навукі і тэхнікі

Культавая архітэктура

Паркі і садова-паркавыя збудаванні

XXI. СТОЛІН

Горад, цэнтр раёна. Размешчаны на р. Гарынь, за 245 км на ўсход ад Брэста, на аўтамабільнай дарозе Пінск — Давыд-Гарадок, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Гарынь на лініі Лунінец — Сарны.

Упершыню ў пісьмовых крыніцах упамінаецца сярод «гарадоў пагарынскіх» 12—13 стагоддзяў. З 16 ст. мястэчка. Ім валодалі магнаты Саламярэцкія, Вішнявецкія, Пацы, Солтаны, Скірмунты, Стахоўскія і інш. Уваходзіла ў Берасцейскае ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 17 ст. горад. У руска-польскую вайну 1654—67 гг. рускія войскі разбілі (1655 г.) пад Століным войска Вялікага княства Літоўскага і некалькі гадоў утрымлівалі горад. З 1792 г. цэнтр Запінскага павета Брэсцкага ваяводства. З 1793 г. ў складзе Расіі (валасны цэнтр Пінскага павета Мінскай губерні). У 1816 г. тут адкрыта першая на Беларусі школа ўзаемнага навучання, дзе выкладаліся асновы агрраноміі. У 1897 г. ў горадзе 290 двароў, 3,3 тыс. жыхароў, пачатковае вучылішча, бровар і смалакурня.

Савецкая ўлада ў Століне ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага 1918 г. да студзеня 1919 г. акупіраваны нямецкімі войскамі. У гэты час на Століншчыне разгарнуўся партызанскі рух. Быў створаны падпольны рэвалюцыйны камітэт, які кіраваў барацьбой паўстанскіх атрадаў (камандзіры — А. Ф. Разановіч і Ф. А. Казлоўскі). Савецкая ўлада аднаўлена летам 1920 г. У 1921—39 гг. Столін у складзе буржуазнай Польшчы (павятовы цэнтр Палескага ваяводства).

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР — раённы цэнтр (з 1940 г.) Пінскай вобл., з 1954 г. — Брэсцкай вобл. У Вялікую Айчынную вайну з 12.7.1941 г. да 7.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Барацьбу з ворагам узначальвалі падпольныя райкомы КП(б)Б (1.9.1943 г. — 16.2.1944 г.) і ЛКСМБ (9.8.1943 г. — 1.3.1944 г.). У студзені 1944 г. партызаны брыгады «Савецкая Беларусь» і атрадаў злучэння С. А. Каўпака разграмілі ў Століне варожы гарнізон.

У горадзе пераважае квартальная планіроўка, жылая забудова размешчана ўздоўж р. Гарынь. Паводле генеральнага плана, распрацаванага ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва ў 1970 г., вядзецца рэканструкцыя вулічнай сеткі, узбуйняюцца жылыя кварталы, фарміруецца грамадскі цэнтр. Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр — пл. Леніна, на якой пастаўлены помнік У. І. Леніну. Тут жа будынак райвыканкома. Насупраць яго, пры ўваходзе ў гарадскі сквер, помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загі

XXI. *Вуліца Савецкая*

XXI. *Вуліца Савецкая. Фрагмент жылой забудовы.*



XXI. *Будынак раённага Дома культуры.*

[illegible] у Вялікую Айчынную вайну [illegible] часты [illegible] Савецкая [illegible] [illegible] жылых [illegible] вул. [illegible]), кінатэатр вул. Леніна (1971 [illegible]), сярэдняя школа № 1 вул. Савецкая (1961 г.), і № 2, вул. Інтэрнацыянальная [illegible], Дом культуры вул. Камсамольская (1977 г.), магазін «[illegible]» вул. 17 Верасня [illegible], Дом быту вул. Леніна [illegible], Дом [illegible], вул. [illegible] [illegible], [illegible] будаўнічага комплексу [illegible] (сярэднія [illegible] інтэрнаты, жылыя дамы і інш.).

Асноўныя прамысловыя прадпрыемствы: камбінат будматэрыялаў, [illegible] хлебакамбінат, фабрыка [illegible] мэблі [illegible] кансервавы завод. Працуе камбінат бытавога [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] газета «[illegible] Палесся».

З архітэктурных помнікаў 19 [illegible] мураваны будынак [illegible] парк «Мацкевічы» [illegible] [illegible] [illegible] «Мацкевічы» [illegible]

[illegible] kiewicz R. Powiat Stoliński (Notatki historyczne).— Brześć nad Bugiem, 1930.

(*[illegible] Царохін, Т. I. Чарняўская.*)

1491. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАНА І АХВЯР ФАШЫЗМУ ([illegible]). Парк [illegible] Леніна. Пахаваны [illegible] воіны [illegible] стралковых дывізій 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі 7.7.1944 г. пры вызваленні горада. Пазней сюды перанесены астанкі камандзіра Столінскага партызанскага атрада В. Е. Каючанкова (загінуў у лютым 1941 г.) і [illegible] ахвяр фашызму. Тут жа пахаваны былы памеснік старшыні Столінскага райвыканкома І. В. Часнакоў, забіты 8.8.1944 г. ворагамі Савецкай улады. У 1975 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна і стэла з памятнымі [illegible]

1492. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Урочышча Стасінскі лес, за 3 км ад аўтабазы № 12. Пахавана больш за 12 тыс. жыхароў раёна, загубленых у Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1493. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АБАДОЎСКАМУ [illegible] ([illegible]). Вул. Савецкая [illegible] на будынку сярэдняй [illegible] № 1 [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] у Вялікую Айчынную вайну былога [illegible] школы М. А. Абадоўскага.

1494. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КРЫЖУ М[illegible] Андрэевічу ([illegible]). Вул. Савецкая [illegible] на будынку [illegible] газеты «[illegible] Палесся». Устаноўлена у [illegible], на ўшанаванне памяці былога супрацоўніка [illegible] удзельніка [illegible] барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну (загінуў у жніўні 1942 г.).

1495. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАРТЫЙНЫМ І САВЕЦКІМ РАБОТНІКАМ (гіст.). Вул. Савецкая [illegible] на будынку райвыканкома. Устаноўлена ў 1969 г.

У Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі старшыня Столінскага райвыканкома, член Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б, камандзір Столінскага партызанскага атрада І. Л. Масленнікаў, сакратар Столінскага райкома КП(б)Б Ф. І. Палавінка, сакратар Давыд-Гарадоцкага падпольнага райкома КП(б)Б, камандзір Давыд-Гарадоцкага партызанскага атрада М. А. Скарабагацька.

1496. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА САВЕЦКІМ ВОІНАМ І ПАРТЫЗАНАМ (гіст.). Вул. Леніна, 3. Устаноўлена у 1965 г. ў гонар савецкіх воінаў, якія вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, партызан брыгады «Савецкая Беларусь» і брыгады С. П. Каплуна.

У Вялікую Айчынную вайну ў час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Столінскага р-на дзейнічалі партызанская брыгада «Савецкая Беларусь» і брыгада украінскіх



XXI. *Кінатэатр.*

XXI. *Будынак сярэдняй школы № 1*

партызан С. П. Каплуна. Брыгада «Савецкая Беларусь» створана ў жніўні 1943 г. на базе атрадаў «Савецкая Беларусь» і імя М. І. Кутузава. Камандзіры В. П. Тамілаў (жнівень 1943 г.— люты 1944 г.), І. А. Смятроў (люты — чэрвень 1944 г.); камісар І. А. Смятроў. Партызаны брыгады грамілі варожыя гарнізоны ў Давыд-Гарадку (ліпень, кастрычнік 1943 г. разам з атрадам злучэння А. М. Сабурава), у Століне (студзень 1944 г. разам з атрадамі злучэння С. А. Каўпака), знішчылі сельскагаспадарчыя ўправы ў вёсках Альшаны, Ольгава, Сямігосцічы, Хароміск, 120 аўтамашын, рабілі дыверсіі на чыгунцы і шашэйных дарогах Давыд-Гарадоцкага, Столінскага і Тураўскага р-наў. У студзені 1944 г. разам з часцямі Чырвонай Арміі вялі бой каля вёсак Колбічы і Старына Давыд-Гарадоцкага р-на, у лютым 1944 г. каля в. Іванава Слабада Тураўскага р-на. У лютым 1944 г. брыгада (903 партызаны) злучылася з часцямі Чырвонай Арміі. Пасля рэарганізацыі перайшла ў складзе атрадаў імя М. І. Кутузава, імя К. К. Ракасоўскага і імя В. П. Чкалава лінію фронту і зноў вяла баявую дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі Столінскага і Давыд-Гарадоцкага р-наў. 8.7.1944 г. пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі партызанская брыгада «Савецкая Беларусь» расфарміравана.

7.7.1944 г. воіны 397-й стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік М. Ф. Андоньеў) 61-й арміі 1-га Беларускага фронту вызвалілі г. Столін.

М. В. [illegible]

1497. ПАРК «МАНЬКАВІЧЫ» (архіт.) На ўскраіне горада, каля шашы Столін — Давыд-Гарадок, на левым беразе р. Гарынь. Цяпер парк культуры і адпачынку працоўных. Плошча 27,9 га. Закладзены ў 1885 г. як сядзібны. З забудоў засталіся толькі гаспадарчыя. Цэнтрам кампазіцыі быў мураваны палац (пачатак 20 ст., арх. Венцаль; разбураны ў Вялікую Айчынную вайну), пастаўлены на насыпной тэрасе з кветнікавым партэрам. Тэраса [illegible] вышынёю да 1,5 м і нагадвае верхні сад.

XXI. *Комплекс будынкаў сельгастэхнікума.*

1491. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, партызана [illegible] і ахвяр фашызму*

1497. *Парк «Манькавічы». Схема плана: 1 — палац (не збярогся); 2 — гаспадарчыя і службовыя пабудовы; 3 — брама; 4—7 — сучасныя будынкі*

...альшая частка тэрыторыі парку на ...дным берагавым плато. Паўночна-ўсходнюю і паўночна-заходнюю част... ...і перасякаюць некалькі алей. Інтэнсіўнасць насаджэнняў змяншаецца ў напрамку ракі. У парку больш за ...ю відаў дрэў і кустоў. Апрача мясцовых парод, растуць хвоя веймутава і чорная, дуб і елка канадскія, лістоўніца еўрапейская, піхты аднаколерная і каўказская.

Парк «Манькавічы» — прыклад пейзажнага парку Беларусі 2-й паловы 19 ст.

Літ.: Horoszkiewicz R. Powiat Stoliński (Notatki historyczne)... nad Bugiem, 1930; Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych Krajów słowiańskich. T. 10. — Warszawa, 1889.

Н. С. Вадава...

1498. ПОМНІК ВЫЗВАЛЕННЯ (гіст.). На вул. Савецкай, каля ўваходу ў парк «Манькавічы». Гармата на пастаменце ўстаноўлена ў 1977 г. ў гонар воінаў 397-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія 7.7.1944 г. вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1499. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На пл. Леніна. На ўшанаванне памяці 54 жыхароў горада, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў, у 1975 г. устаноўлена стэла з барэльефным выявай галавы жанчыны і надпісам-прысвячэннем. Побач мемарыяльная дошка з імёнамі загінуўшых.

1500. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (маст.). На пл. Леніна. Пастаўлены ў 1980 г. (скульпт. С. Селіханаў, В. Паляшчук, арх. Ю. Казакоў; бронза, ружовы граніт; агульная вышыня 10,3 м, фігуры 6,2 м).

На гарызантальна развітым ступеньчатым стылабаце — трыбуна і секуты ўлева пастамент з бронзавай скульптурай У. І. Леніна. Размашысты, энергічны крок, расхінутае ветрам паліто перадаюць імклівасць, парыў. Дынаміку руху падкрэсліваюць глыбокія складкі паліто, асіметрычна зрэзаная грань пастамента. У агульную кампазіцыю помніка ўключана невялікая, выкладзеная шэрымі бетоннымі плітамі плошча, з трох бакоў абмежаваная гарадскім паркам і скверам, чацвёртым арыентавана да вул. Савецкай. Помнік — кампазіцыйны мастацкі цэнтр плошчы. *Л. Г. Лапцевіч*

1498. *Помнік Вызвалення*

1501. СІНАГОГА (архіт.). У цэнтры горада. Пабудавана ў 1792 г. з цэглы. Прамавугольны ў плане аднапавярховы двухсветлавы будынак. Унутраная прастора падзелена 2 радамі калон на 3 нефы. У архітэктуры помніка захоўваюцца рысы барока, у дэкаратыўнай аздобе інтэр'ера — класіцызму.

1502. ЦАРКВА УШЭСЦЯ (архіт.). На вул. Гарынскай. Пабудавана ў 1-й палавіне 20 ст. з дрэва. Прасторавую кампазіцыю храма фарміруюць шатровая званіца, бабінец, асноўны кубападобны аб'ём з светлавым васьміграньным барабанам і пяціграння апсіда з прыбудоўкамі. У архітэктуры царквы знайшлі адлюстраванне рысы псеўдакласіцызму.

в. Ададамічы, Рамельскі сельсавет

1503. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

в. Альшомель, Вялікамалешаўскі сельсавет

1504. ВАСКРАСЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1817 г. з дрэва.

Прамавугольны ў плане зруб накрыты двухсхільным дахам з вальмай над алтаром. Над цэнтрам узвышаецца васьміграны светлавы барабан, завершаны шатровым дахам з галоўкай. З захаду да асноўнага зруба пры...

1497. *Парк «Манькавічы». Алея.*

1500. *Помнік У. І. Леніну*

будавана чацверыковая званіца, пакрытая шатром з галоўкай. Уваход вылучаны ганкам з 2 слупамі. Сцены вертыкальна апалявааны дошкамі з [illegible] і умацаваны лапаткамі. Карніз, дапоўнены разным арнатурным фрызам, дзеліць вежу званіцы на 2 ярусы. Аконныя праёмы з лучковымі, дзвярныя — з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі. Унутры памяшканне зальнае. Алтарная частка з рызніцай аддзелена драўляным іканастасам.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства. *Ю. А. [illegible]*

в. Альманы, Стружскі сельсавет

1505. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). Каля будынка сярэдняй школы. Пахаваны 9 жыхароў вёскі, расстраляных у 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 197[illegible] г. на магіле пастаўлены абеліск.

1506. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 4 км на паўднёвы захад ад вёскі. Пахаваны 3 жыхары вёскі, расстраляныя ў 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На магіле пастаўлены абеліск.

1501. *Будынак былой сінагогі*

1507. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Савецкая Беларусь». На ўшанаванне памяці 79 жыхароў вёсак Альманы і Кашары, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 19[illegible] г. пастаўлены абеліск.

в. Альшань, Веляміцкі сельсавет

1508. УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1888 г. з дрэва.

Трохзрубны храм. Мае пірамідальную камланіцу з трохгаловым завяршэннем. Асноўны квадратны ў плане зруб завершаны васьмігранным светлавым барабанам з купалам, двухсхільныя дахі 2 больш нізкіх зрубаў (алтара і бабінца) — з аднолькавымі галоўкамі. Сцены гарызантальна ашаляваныя. У аздобе фасадаў выкарыстана накладная дэкаратыўная разьба.

У архітэктуры царквы адлюстраваны традыцыі манументальнага драўлянага дойлідства Палесся перыяду класіцызму. *Т. В. Габрусь*

в. Альшаны, цэнтр сельсавета

1509. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома культуры.

7.7.1941 г. воіны 75-й стралковай дывізіі і маракі 6-й асобнай роты марской пяхоты Пінскай ваеннай флатыліі вялі каля в. Альшаны жорсткі бой з намнога большымі сіламі нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Некалькі разоў вёска пераходзіла з рук у рукі. У баі загінулі 16 савецкіх воінаў. У 1967 г. на іх магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна ў жалобе.

1510. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 2,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Хіноўск. Пахаваны 685 мірных жыхароў, якія былі расстраляны восенню 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На магіле пастаўлены абеліск.

1511. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. Пастаўлены ў 1967 г. на ўшанаванне памяці 100 землякоў. 87 вяскоўцаў аддалі жыццё ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе. 13 расстраляны гітлераўцамі ў гады акупацыі Століншчыны. На скошанай плоскасці бетоннага блока ўстаноўлены 3 мемарыяльныя дошкі з надпісам прысвячэння і [illegible] імёнамі загінуўшых.

1512. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 19[illegible] г.

1513. ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1806 г. з дрэва.

Асноўны квадратны ў плане зруб пакрыты чатырохсхільным дахам. Да



1502. *Царква [illegible] Бакавы фасад.*

1504. *[illegible] План.*

1508. *Успенская царква.*



1508. *Успенская царква. План.*

1509. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*

яго прымыкаюць больш нізкія пяціграння апсіда і сярэдні аб'ём з самастойнымі накатымі дахамі. Да сярэдняга аб'ёму прыбудаваны бабінец, накрыты чатырохсхільным шатром, са званіцай у другім ярусе. У інтэр'еры разныя паліхромныя царскія вароты. У аздобе фасадаў выкарыстаны разьба і дэкаратыўная шалеўка.

У архітэктуры царквы традыцыйныя формы драўлянага дойлідства Палесся [illegible] рысамі [illegible] пызму.

в. Асаўцы, Вядзьборскі сельсавет

1514. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ [illegible] Каля будынка праўлення калгаса «XIX партз'езд». На ўшанаванне [illegible] ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

1515. ПОМНІК КАРЛУ МАРКСУ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «XIX партз'езд». Бюст К. Маркса ўстаноўлены ў 1971 г.

1516. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «XIX партз'езд». Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1971 г.

в. Атвержычы, Столінскі гарадскі Савет

1517. ГРУНТАВЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На паўночнай ускраіне вёскі, часткова на сучасных могілках.

Раскопкі праводзілі ў 1955, 1957 і 1962 гг. Ю. У. Кухарэнка, у 1963 і 1965 гг. К. В. Каспарава. Ускрыта 19 урнавых і 48 ямных пахаванняў (пахавальны абрад — трупаспаленне). Пахавальныя ямы блізка адна ад адной, авальнай і круглай формы, на глыбіні 0,4—0,8 м ад узроўню старажытнага гарызонта. Даўжыня авальных ям 0,7—1,4 м, шырыня 0,3—0,5 м, дыяметр круглых 0,5 м. Пры раскопках знойдзены 177 гліняных ляпных пасудзін (міскі, гаршкі, кубкі і інш.), бронзавыя і жалезныя фібулы, шпількі з бронзавага дроту з плоскаспіральнымі галоўкамі, бронзавыя пацеркі, бранзалеты, унікальны для зарубінецкай культуры паясны набор (кавалак скуранога пояса, упрыгожаны бронзавымі пласцінкамі, бляшкамі і пласцінчастай спражкай). Могільнік датуецца 2 ст. да н. э.—2 ст. н. э., нале[illegible]

Матэрыялы раскопак [illegible] Эрмітажы (Ленінград) і ў Столінскім краязнаўчым музеі.

[illegible] и поселение зарубинецкой культуры у дер. Отвержичи — Краткие сообщения Ин-та [illegible] 1964. *К. В. Каспарава.*

1518. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На правым беразе р. Гарынь, на сучасных могілках.

У групе каля 50 насыпаў паўсферычных курганоў вышынёй да 1 м, дыяметрам 5—10 м. Адзін з іх (у цэнтральнай частцы) мае дыяметр 13 м, вышыню каля 2 м. Выявіў у 1953 г. Б. В. Міралюбаў, даследаваў у 1955 і 1957 гг. Ю. У. Кухарэнка. Раскапаны 3 курганы, у т. л. самы вялікі. Нябожчыкі ляжалі на праслойках з попелу і вугалёў галовамі на захад ці паўднёвы захад. Знойдзены рэшткі спаленай драўлянай пабудовы накшталт будана і побач з імі пахаванне (пахавальны абрад — [illegible]) [illegible] ныя аздобы, дужка ад вядра, абломкі ганчарнай керамікі. Могільнік [illegible]

Матэрыялы раскопак [illegible] Столінскім краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневеко[illegible]

Я. Г. Звяруга



1513. *Царква. Царскія вароты*

1513. *Царква. Выгляд з боку апсіды.*



1513. *Царква. План.*



1517. *Грунтавы могільнік. Рэчы з раскопак: 1 — бронзавая шпілька; 2—4 — гліняны посуд; 5, 6 — бронзавыя фібулы.*

в. Белавуша, цэнтр сельсавета

1519. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 5 воінаў 347-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск. На мемарыяльнай дошцы увекавечаны таксама імёны 41 земляка, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны [illegible].

1520. ГАРАДЗІШЧА (археал.). Мясцовыя назвы Акоп, Замак. За 2,5 км на ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Гарынь. Пляцоўка авальнай формы, памерам 30×45 м. Вал гарадзішча узвышаецца над навакольнай мясцовасцю амаль на 2 м. Перад ім роў глыбінёю каля 1 м. Даследавалі ў 1957 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1961 г. П. А. Рапапорт. Культурны пласт не прасочваецца. Каля гарадзішча знойдзена кераміка 10—11 стагоддзяў. Мяркуюць, што помнік адносіцца да гэтага часу.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Столінскім краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. — М., 1961; Раппопорт П. А. Военное зодчество западно-русских земель X—XIV вв. — Л., 1967 — (Материалы и исследования по археологии СССР [illegible]).

1521. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1905 г. з дрэва. Асноўны квадратны ў плане зруб завершаны масіўным светлавым васьмерыком, накрытым купалам з галоўкай. Прамавугольныя зрубы алтара і трапезнай больш нізкія. Пры ўваходзе 3-ярусная шатровая званіца. Будынак багата дэкарыраваны разнымі дэталямі. У аздобе царквы адчуваецца ўплыў псеўдарускага стылю.

в. Беражное, цэнтр сельсавета

1522. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 21 воін 397-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі 7.7.1944 г. пры вызваленні тэрыторыі калгаса імя Леніна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1951 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. На 3 мемарыяльных дошках увекавечана памяць 87 жыхароў вёсак Беражное, Бор-Дубянецкі, Дубянец, Магільнае, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

1522. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў*

1523. МАГІЛА ЛАЗНУХІ Майсея Цярэнцьевіча (гіст.). На могілках. М. Ц. Лазнуха нарадзіўся ў 1884 г. Служыў на Балтыйскім флоце. У 1906 г. за рэвалюцыйную дзейнасць быў асуджаны на 4 гады зняволення. Пасля вызвалення вярнуўся ў родную вёску, вёў бальшавіцкую агітацыю сярод сялян. У 1916 г. зноў асуджаны. Вызвалены ў час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Удзельнічаў у штурме Зімняга палаца. Пасля вяртання на радзіму выбраны старшынёй Столінскага валаснога выканкома. У час акупацыі Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі, потым буржуазнай Польшчы ўзначальваў на радзіме партызанскую барацьбу супраць захопнікаў. 14.8.1919 г. схоплены польскімі інтэрвентамі і пасля катаванняў расстраляны. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

А. С. Барысевіч.

1524. ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана каля 1884 г. з дрэва на падмурку царквы 18 ст. Перабудавана ў 20 ст.

Спачатку была трохзрубная, складалася з размешчаных па восі ўсход — захад прамавугольнага бабінца, квадратнага цэнтральнага аб'ёму, завершанага вялікім светлавым чацверыком, і пяціграннай апсіды. Будынак гарызантальна ашаляваны, прамавугольныя вокны аздоблены ліштвамі. Зрубы аб'яднаны чатырохсхільным дахам. Пры перабудове з захаду прыбудавана двух'ярусная званіца з харамі, накрытая шатровым дахам, з поўдня — прамавугольная прыбудова, завершаная светлавым васьмерыком. У інтэр'еры дамінуе цэнтральнае двухсветлавое памяшканне з пазем вялікімі праёмамі злучаецца бабінец, алтар, бакавая прыбудова.

Царква — традыцыйны для Прыпяцкага Палесся тып трохзрубнага храма ярусная кампазіцыя з цэнтральным верхам.

Літ.: Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст. — Мн., 1978. *Ю. А. Якімовіч.*

в. Беразцы, цэнтр сельсавета

1525. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля школы. Пахаваны 10 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.



1524. *Царква Параскевы Пятніцы. План*

1521. *Троіцкая царква*



1521. *Троіцкая царква. План*

1524. *Царква Параскевы Пятніцы*



1529б. *Грунтавы могільнік Велямічы 2. Рэчы з раскопак: 1 — бронзавая шпілька; 2 — бронзавая падвеска; 3, 6—9 — гліняны посуд; 4 — … фібула; 5 — бронзавая грыўна.*

У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Вараны.

Рэчыцкі сельскі Савет

1526. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 35 жыхароў вёскі, расстраляных і спаленых жывымі 14.2.1943 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1981 г. на магіле пастаўлена стэла.

1527. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 10 савецкіх актывістаў, расстраляных 27.9.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1945 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1528. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Ленінскі шлях». На ўшанаванне памяці 70 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Велямічы, цэнтр сельсавета

1529. ГРУНТАВЫЯ МОГІЛЬНІКІ, СЕЛІШЧЫ (археал.).

1529а. Могільнік Велямічы 1. За 4 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Турска. Выяўлены 136 пахаванняў (11 з іх адносяць да 3—4 стагоддзяў н. э.).

1529б. Могільнік Велямічы 2. За 1,5 км на захад ад могільніка Велямічы 1, ва ўрочышчы Пугачэвец. Выяўлена больш за 100 пахаванняў, 2 з іх 3—4 стагоддзяў н. э. Раскопкі праводзілі ў 1953—57 гг. Ю. У. Кухарэнка, у 1957—62 гг. К. В. Каспарава. Пахаванні (пахавальны абрад — трупаспаленне) у ямах глыбінёй 0,3—1 м ад узроўню дзённай паверхні, большасць на глыбіні 0,5—0,8 м прадаугаватых (даўжыня 0,6—2,4 м, шырыня 0,5—0,8 м) і круглых (дыяметр не перавышае 0,7 м). Выяўлены таксама урнавыя пахаванні і кенатафы. Пры раскопках знойдзены гліняны лепны посуд (гаршкі, міскі, кубкі), з упрыгожанняў — валікі, шпількі з бронзавага дроту, бронзавыя трапецападобныя падвескі, жалезныя і бронзавыя пražкі, фібулы, шкляныя пацеркі і інш. Сярод прылад працы — … нажы, … тачыльныя бруски, гліняныя праселы і інш.

1530. *Ільінская царква. Званіца.*

1529в. Селішчы. У ваколіцах Велямічаў вядомы 3 селішчы зарубінецкай культуры. На адным з іх (за 0,5 км на паўночны ўсход ад могільніка Велямічы 2) праводзілі раскопкі ў 1953—57 гг. Ю. У. Кухарэнка, у … К. В. Каспарава. Селішча … , культурны пласт … 0,8 м. Выяўлены рэшткі 3 жылых пабудоў і шмат ям гаспадарчага прызначэння.

1530. *Ільінская царква.*



1530. *Ільінская царква. План.*



1531. *Помнік землякам*

Жылыя абудаванні ў плане няправільнай прамавугольнай формы (даўжыня 6—7 м, шырыня 5 м), нагадваюць паўзямлянкі. Захаваліся рэшткі глінабітнай печы. Знойдзены абломкі гліняпага посуду, каменных жорнаў, косці жывёл, кавалкі абпаленай гліны, у т. л. з адбіткамі драўляных канструкцый, жалезны серп, маленькая бронзавая пласцінчастая падвеска. Могільнік і селішча належаць плямёнам зарубінецкай культуры, датуюцца 2 ст. да н. э.— 4 ст. н. э.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным музеі СССР (Масква), у Эрмітажы (Ленінград), у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск).

Літ.: Кухаренко Ю. В. Зарубинецкая культура.— М., 1964; его же. Памятники железного века на территории Полесья.— М., 1961. *В. В. Карацкевіч.*

1530. ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). Ва ўсходняй частцы вёскі. Пабудавана ў 1881 г. з дрэва, у 1888 г. зроблены бакавыя прыбудовы.

Цэнтральнае месца ў крыжова-цэнтрычнай кампазіцыі будынка займае квадратны у плане асноўны аб'ём, да якога прылягаюць пяціграННЫ алтарны зруб, квадратны бабінец і прамавугольныя бакавыя прыбудовы. Абапал алтара нізкія рызніцы. Зрубы завершаны самастойнымі вярхамі з гранёнымі купаламі і галоўкамі: цэнтральны — васьмерыком на чацверыку, астатнія — васьмерыкамі. Уваходы ў бабінец і бакавыя прыбудовы з захаду вылучаны тамбурамі з двухсхільнымі дахамі. Сцены вертыкальна ашалёваны дошкамі з нашчыльнікамі і ўмацаваны лапаткамі. Прамавугольныя і лучковыя аконныя праёмы аздоблены ліштвамі. У інтэр'еры дамінуе цэнтральны трохсветлавы аб'ём, з якім вялікімі праёмамі злучаны астатнія памяшканні. На паўднёвы захад ад царквы трох'ярусная зрубна-каркасная званіца (васьмярык на 2 чацверыках), накрытая шатровым дахам.

Царква — помнік архітэктуры з рысамі барока.

Літ.: Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст.— Мн., 1978. *Ю. А. Якімовіч.*

1531. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя два воіны.

в. Верхні Церабяжоў, Рачыцкі пасялковы Савет

1532. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі. Пахаваны 12 воінаў 397-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну пры вызваленні вёскі ў ліпені 1944 г. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1533. ПОМНІК ДРУЖБЫ (гіст.). На паўднёвы захад ад вёскі, на граніцы БССР і УССР. Пастаўлены ў 1967 г. у гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, як сімвал непарушнага братэрства беларускага і ўкраінскага народаў. Стэла-трыпціх з барэльефнымі выявамі дзяржаўных гербаў БССР, УССР і СССР, злітых у сяброўскім поціску рук. Помнік вянчаюць дзяржаўныя сцягі СССР, БССР і УССР.

в. Вялікае Малешава, цэнтр сельсавета

1534. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1974 г. пастаўлены абеліск.

в. Вялікія Арлы, Лядзецкі сельсавет

1535. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 97 землякоў з вёсак калгаса імя Суворава, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1970 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Гальцы, Беразцоўскі сельсавет

1536. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 28 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Гарадная, цэнтр сельсавета

1537. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка выканкома сельсавета. Пахаваны 76 воінаў 212-й стралковай дывізіі 9-га гвардзейскага стралковага корпуса 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі 12.7.1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1538. ГАРАДЗІШЧА, ПАСЕЛІШЧА (археал.).

1538а. Гарадзішча. За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на беразе ручая, на мысападобным канцы вялікай пясчанай грады. Пляцоўка памерам 41×48 м, над узроўнем ручая ўзвышаецца прыкладна на 8 м. З боку поля абнесена 2 (з інтэрвалам у 30 м) дугападобнымі валамі вышынёю каля 3 м. З вонкавага боку валоў — равы глыбінёй каля 2 м. Пад жэнне мыса таксама ўмацавана валам вышынёй 2—3 м. Абследаваў у 1955 г. Ю. У. Кухарэнка. Культурны пласт не прасочваецца. Магчыма, гарадзішча было сховішчам. Пляцоўка зараснула лесам.

1538б. Паселішча. За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, адразу за валам гарадзішча, ва ўрочышчы Замкавішча. Адкрыў і абследаваў у 1955 г. Ю. У. Кухарэнка, абследаваў у 1962 г. Н. Ф. Лысенка. Займае пясчаное ўзвышша плошчай каля 0,5 га. У агаленнях прасочаны культурны пласт 0,1—0,2 м. Сабраны рэшткі ляпной керамікі. Адносіцца да тшцінецкай культуры бронзавага веку. Датуецца 15—11 стагоддзямі да н. э. Раскопкі не праводзіліся. Матэрыялы абследаванняў зберагаюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья.— М., 1961; его же. Первобытные памятники Полесья.— М., 1962.

1539. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі, непадалёку ад школы. Пахаваны 400 мірных жыхароў, якіх восенню 1942 г. загубілі ня-



1533. *Помнік Дружбы*



1538. *Гарадзішча. План*

1540. *Троіцкая царква*



1540. *Троіцкая царква. План*

мецка-фашысцкія захопнікі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1540. ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У заходняй частцы вёскі. Пабудавана ў 18 ст. з дрэва, перабудавана ў 1930-я гады.

Будынак складаецца з 2 зрубаў квадратнага ў плане асноўнага і пяціграннага алтарнага. Зрубы аднолькавай шырыні, аб'яднаны ў суцэльны аб'ём, накрыты высокім вальмавым дахам. Вяршыні схілаў тарцовых вальмаў даху завершаны грановымі галоўкамі. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. Высока размешчаныя прамавугольныя вокны аздоблены ліштвамі. З захаду да царквы ў 1930-я гады прыбудавана двух'ярусная званіца (чацверык на чацверыку), накрытая шатровым дахам з галоўкай. Ніжні ярус аднолькавай вышыні з асноўным аб'емам, аддзелены ад верхняга шырокім прычолкам. Унутры галоўны і алтарны зрубы злучаны вялікім прамавугольным праёмам. Кожны зруб перакрыты скляпеннем у выглядзе васьмігранная ўсечанай піраміды. Хоры — у аб'ёме званіцы. Алтарная частка аддзелена драўляным іканастасам.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства.

Літ.: Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст. Мн., 1978. *Ю. А. Якімовіч.*

1541. ЦЭНТР ГАНЧАРНАГА РАМЯСТВА (гіст.). З старажытнасці на мясцовай сыравіне — абязтлушчаных светлых (пры абпальванні даюць ружовы чарапок) і тлустых цёмных глінах — у вёсцы існавала вытворчасць ганчарных вырабаў, якія атрымалі назву «гарадноўская кераміка». У 17 ст. в. Гараднае мела статут горада. Тут існавала цэхавая арганізацыя ганчароў. Посуд (мясцовыя назвы «мамзель», «пяюзнак», «пададзінец», «злівач», «булька») рабілі шара-, амфара-, яйцападобнай і біканічнай формы, аздаблялі ангобнай размалёўкай чырвонага колеру на светла-жоўтым ці ружовым фоне, геаметрычным арнаментам, які складаўся з прамых, хвалістых і зубчастых канцэнтрычных паясоў, свабоднай расліннай размалёўкай (стылізаваныя расліны з кручкаватым завяршэннем лістоў).

З 1930 г. ў вёсцы пашырыўся выраб паліванага посуду. З канца 1960-х гадоў ганчары працавалі надомнікамі ад Пінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў, з 1980 г. — Кобрынскага камбіната будаўнічых матэрыялаў. Цяпер вырабляюць толькі паліваны посуд. Гаршкі, глякі, міскі, макатры, вазоны, дробная пластыка вызначаюцца самабытнасцю традыцыйных форм.

Літ.: Елатомцева И. М. Художественная керамика Советской Белоруссии. Мн., 1966; Жданові ч В. Чароўныя вясёлкі Рэчыцкая. Маладосць, 1969, № 11. *И. М. Яницкая.*

в. Ганіка, цэнтр сельсавета

1542. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На цэнтральнай сядзібе калгаса «1 Мая». Устаноўлены ў памяць 34 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў барацьбе супраць ворагаў Савецкай улады. У 1965 г. пастаўлены абеліск.

XXII. ДАВЫД ГАРАДОК

Горад. За 35 км на паўночны ўсход ад Століна, 280 км ад Брэста, 41 км ад чыгуначнай станцыі Гарынь на лініі Лунінец — Сарны. Прыстань на р. Гарынь. Аэрапорт. Злучаны са Столінам і Пінскам аўтамабільнай магістраллю.

Узнік у пачатку 12 ст. як горад Кіеўскай Русі. Мяркуюць, што яго заснавальнікам быў унук Яраслава Мудрага валынскі князь Давыд Ігаравіч, які ў 1100 г. атрымаў у валоданне Пагарынне і землі ў сутоку рэк Гарыні і Прыпяці крэпасць. З канца 14 ст. горад у Вялікім княстве Літоўскім, з 1551 г. належаў Радзівілам. Паводле ўскосных звестак, меў магдэбургскае права. З 1579 г. — цэнтр арцынацыі, у 1586 г. быў далучаны да Клецкай, у 1875 г. — да Нясвіжскай ардынацыі. Жыхары Давыд-Гарадка ўдзельнічалі ў вызваленчай вайне беларускага і ўкраінскага народаў 1648—54 гг., трымалі пад сваім кантролем Гарадоцкую воласць і суседнюю частку Пінскага павета. У рускапольскую вайну 1654—67 гг. горад разбураны і спалены. У 2-й палавіне 17—18 ст. знамянальна аднавіўся. З 1793 г. ў складзе Расіі, з 1795 г. павятовы горад Мінскай губерні. З 1796 г. мястэчка ў Мазырскім павеце. З перакладам жыхароў Давыд-Гарадка ў саслоўе мяшчан (1836 г.) ажыўлялася яго эканамічнае жыццё. Пачала дзейнічаць суднаверф, пашырыліся гандлёвыя сувязі з Вільняй, Варшавай, гарадамі Валыні і Бесарабіі. У 1897 г. было 7815, у 1907 г. — 13 217 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага 1918 г. акупіраваны немцамі, у 1919—20 гг. — польскімі войскамі. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. адышоў да буржуазнай Польшчы, мястэчка Столінскага павета Палескага ваяводства. Дзейнічаў падпольны райком КПЗБ. З 1939 г. ў складзе БССР, з 15.1.1940 г. цэнтр раёна Пінскай вобл.

У Вялікую Айчынную вайну з 7.7.1941 г. да 10.7.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Барацьбу супраць ворага ўзначальвалі падпольныя райкомы КП(б)Б (ліпень 1941 г. — 13.9.1941 г., 16.7.1943 г. — 12.2.1944 г.) і ЛКСМБ (11.8.1943 г. — 12.2.1944 г.). З 1954 г. раённы цэнтр Брэсцкай вобл. З 1961 г. ў складзе Столінскага раёна.

З поўдня на поўнач горад перасякае р. Гарынь, якая дзеліць яго на левабярэжную (заходнюю) і правабярэжную (усходнюю) часткі. У структуры горада вылучаюцца 3 планіровачныя раёны — заходні, цэнтральны і ўсходні, звязаныя мастамі. Галоўная вось — магістраль Пінск — Тураў. Паводле генеральнага плана, распрацаванага ў 1974 г. ў Мінскім філіяле Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва з улікам перспектывы росту насельніцтва, прадугледжана ўпарадкаваць архітэктурна-планіровачную структуру горада без значнага павелічэння яго тэрыторыі. У выніку работ па ўмацаванню берагоў Гарыні пад забудову будзе выкарыстана тэрыторыя, якая цяпер затапляецца ў час веснавых паводак. Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр развіваецца ўздоўж галоўнай восі, што кампазіцыйна падкрэслівае яе значэнне.

Асноўныя прадпрыемствы размешчаны ў паўночна-ўсходняй частцы горада. Працуюць філіял Кобрынскага інструментальнага завода, камбінат бытавога абслугоўвання, цэх № 2 Столінскага хлебазавода. У горадзе 2 сярэднія, музычная, дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, яслі-сад, Дом піянераў і школьнікаў, Дом культуры, кінатэатр, 2 бібліятэкі, бальніца. У гістарычным цэнтры, на правым беразе Гарыні, знаходзіцца гарадзішча 11—12 стагоддзяў. На ўсходняй ускраіне горада — помнік драўлянага дойлідства 18 ст. (па іншых звестках канца 17 ст.) Георгіеўская царква. У скверы, на рагу вул. Школьнай і

Калініна, помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан

Літ.: Богдановича А. В., Сидоров П. А. Города Белоруссии. Краткий экономический очерк.— Мн., 1967; Грушевский А. Пинское Полесье. [illegible] Ч. 1. [illegible] нашего отечества. Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПб., 1905; Лысенко П. Ф. Города Туровской земли.— Мн., [illegible] (Notatki historyczne). Brześć nad Bugiem, 1930; Morczak M. Przewodnik po Polesiu.— Brześć nad Bugiem, 1935; Jakimowicz R. Dawidgródek. Pińsk, 1939. *Ю. А. Якімовіч*

1543. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На вул. Школьнай, каля дома № 4. Пахаваны 40 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у т. л. воіны 397-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1544. ГАРАДЗІШЧА (археал.). На тэрыторыі сучаснага горада, на правым беразе р. Гарынь, за 14 км ад упадзення яе ў Прыпяць, за 0,2 км ад моста цераз [illegible].

Займае ўзгорак вышынёй 3—5 м, якому штучна нададзена амаль круглая ў плане форма (дыяметр 100—110 м); невялікі выступ — у паўночна-заходнім напрамку. Абарончыя валы праходзілі па ўсім перыметры гарадзішча (збярогся толькі на асобных участках; вышыня да 2 м). На поўдні, паводле чарцяжоў канца 18 — пачатку 19 ст., працякала р. Нярпаўда (пераcохла), якая ўпадала ў Гарынь. Гарадзішча абкружаў абарончы роў, падножжа яго было ўмацавана некалькімі радамі пакладзеных гарызантальна драўляных брусоў.

У 1937—39 гг. раскопкі праводзіў Р. Якімовіч, у 1967 г.— П. Ф. Лысенка. Культурны пласт каля 3,5 м дзеліцца на 5 стратыграфічных пластоў. З іх юбра збярогліся прадметы арганічнага і неарганічнага паходжання. Ускрыты рэшткі 15 жылых і гаспадарчых пабудоў, 6 будаўнічых ярусаў. Памеры будынкаў 2,4×2,4 да 4,6×4,8 м, яны рубленыя з сасновых бярвенняў у вугал з астаткам. Падлога переважна з дошак, печы — глінабітныя. Выяўлены вулічныя насцілы, абарончы вал, які меў драўлянае ўмацаванне. Пры раскопках знойдзены і наканечнікі коп'яў і стрэл, свінцовыя булавы, кавальскія абцугі, прабойнік, сякера, долата, бандарная пілка, разец дзьякар, нажы, нажніцы, жорны, касцяныя іголкі для вязання сетак, драўляны точаны і выдаўбаны посуд, верацёны, лыжкі, шавецкія калодкі, рэшткі бандарнага і гліпянага посуду, скуранога абутку, кісларыя ўпрыгожанні, праслiцы, брускі, абломкі шкляных бранзалетаў, касцяныя вырабы, косці свойскіх і дзікіх жывёл. У культурным пласце выяўлены пахаванні ў дамавінах-калодах. Гарадзішча датуецца 12—14 стагоддзямі.

1543. *Помнік на [illegible] ветэра[illegible] пар[illegible].*

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў музеях ПНР і ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Лысенко П. Ф. Города Туровской земли.— Мн., 1974; Jakimowicz R. Dawidgródek. Pińsk, 1939. *П. Ф. Лысенка*

1545. ГЕОРГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт., маст.). На старых могілках. Пабудавана ў 1724 г. (па іншых звестках у канцы 17 ст.) з дрэва.

Будынак трохзрубны. Усе зрубы пакрыты чатырохсхільнымі шатрамі, якія утвараюць трохверхую кампазіцыю. Алтарны і асноўны зрубы ў плане блізкія да квадрата, бабінец — падоўжаны прамавугольнік. Асноўна зруб вылучаны рэзкім чацверыком 2-га яруса. Вярхі і шатроў над бабінцам і алтаром трушаны з геаметрычных цэнтраў плоскаў. Каркасныя тамбур і разгіца з паўночнага боку прыбудаваны пазней. Сцены гарызантальна ашаляваны, ужадаваны шырокімі лапаткамі і сіметрычна прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Асноўнае памяшканне двухсветлавое, злучана з бабінцам і алтарнай часткай шырокімі праёмамі. Перакрыццё ва ўсіх зрубах бялёнае падшыўной столлю. Чацверык 2-га яруса асноўнага зруба падтрымліваюць бэлькі. Хоры размешчаны у бабінцы над уваходам. Драўляныя гала[illegible] ны пладярусны [illegible] — помнік манументальнага дэкаратыўнага мастацтва 18 ст. Яго памеры, форма і аздабленне арганічна звязаны з архітэктурай храма. Ярусы іканастаса раздзяляюць пастаўкі карнізы, паўкалонкі аздоблены рэльефнай разьбой.

Побач з царквой каркасная двух'ярусная званіца (чацверык на чацверыку), накрытая шатровым дахам і вертыкальна ашаляваная дошкамі з на[illegible].

Царква — помнік традыцыйнага народнага дойлідства, вызначаецца выразнасцю аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, арыгінальным спосабам архітэктурнага вырашэння і дэкаратыўнага афармлення інтэр'ера.

Літ.: Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVI— XIX стст.— Мн., 1978.

Э. І. Нецер, Т. В. Габрусь

1546. ГРУНТАВЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2 км на паўночны ўсход ад горада, на правым беразе р. Гарынь, на урочышчы «Леваноўшчына». Выяўлены ў 1979 г. на глыбіні 0,7 м у час земляных работ. Абследаваў у 1980 г. Г. М. Залашка. Знойдзены 8 сасудаў, ляпная пахавальная урна (з кальцавымі праванымі касцямі) з светла-жоўтай гліны з дамешкам жарствы і пяску, 2 міскі (1 чорнагланцаваная), 4 гаршкі з ручкамі (1 чорнагланцаваны з абадком), невялікі сасуд светла-жоўтага колеру. Могільнік адносіцца да [illegible].



1544. *Гарадзішча. План.*



1544. *Гарадзішча.*

1545. *Георгіеўская царква*

1545. *Георгіеўская царква. План*

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Столінскім краязнаўчым музеі.
Г. М. Залашка

1547. МАГІЛА ЮРЧАНКІ Якава Іванавіча (гіст.). На гарадскіх могілках. Камандзір Чырвонай Арміі Я. І. Юрчанка загінуў 19.9.1939 г. пры вызваленні Заходняй Беларусі. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1548. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). На вул. Савецкай, каля кінатэатра «Зара». Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1953 г.

1549. ПОМНІК У ГОНАР 40-ГОДДЗЯ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ (гіст.). Вул. К. Маркса, у гарадскім скверы. Устаноўлены ў 1957 г. Скульптура чырвонаармейца пастаўлена на высокі прамавугольны пастамент. На фасаднай грані помніка — дошка са словамі У. І. Леніна: «Наша сацыялістычная рэспубліка Саветаў будзе стаяць моцна, як факел міжнароднага сацыялізма і як прыклад перад усімі працоўнымі масамі».

в. Дубай, Відзіборскі сельсавет

1550. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 1 км на поўдзень ад вёскі, на ўрочышчы Задубенне, на пясчаным узвышшы каля забалочанага луга.

28 курганоў (раней было да 60) вышынёй 0,2—2 м, дыяметрам 6—25 м. Насыпы сферычныя, [illegible] [illegible]. [illegible] у 19[illegible] г. і 19[illegible] [illegible] раскапаны [illegible] насыпаў [illegible] Кухарэнка. У большасці курганоў пахаванні на ўзроўні старажытнага гарызонта, у 3 — у [illegible] прамавугольных ямах. Нябожчыкаў клалі на спіну, галавой на паўднёвы ўсход.



1545. *Георгіеўская царква. Чорцёж іканастаса.*



1545. *Георгіеўская царква. Падоўжны разрэз*

у 2 насыпах выяўлены рэшткі спаленых прамавугольных зрубаў з пахаваннямі. Ва ўсіх курганах знойдзены гліняны ляпны посуд, у 5 — жалезныя наканечнікі коп'яў, у іншых — жалезныя нож, залатая завушніца і інш. Могільнік датуецца 6 — пачаткам 5 ст. да н. э., належаў плямёнам мілаградскай культуры.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск), Столінскім краязнаўчым музеі.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Памятники железного века на территории Полесья. М., 1961. *В. Б. Каратневіч*

1551. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На могілках. Пахаваны савецкія патрыёты М. А. Сувораў (нарадзіўся ў 1897 г.) і яго сын Л. М. Сувораў (нарадзіўся ў 1920 г.), якіх 9.8.1941 г. расстралялі нямецка-фашысцкія акупанты. У 1965 г. на магіле пастаўлены стэла.

1552. МЕСЦА ГІБЕЛІ ПРУСА Авакума Лазаравіча (гіст.). Вул. Чкалава, 20. Тут 9.8.1941 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі калгаснага актывіста А. Л. Пруса. На месцы яго гібелі ў 1978 г. пастаўлены абеліск.

1553. МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1900 г. з дрэва. Асноўны зруб завершаны чатырохгранным купалам з галоўкай у цэнтры і 4 меншымі галоўкамі па вуглах. З усходу да асноўнага зруба прымыкае пяцігранная апсіда з вальмавым дахам. Над уваходам шмат'ярусная шатровая званіца, якая злучана з асноўным зрубам роўным з ім па вышыні аб'ёмам, пакрытым пакатым двухсхільным дахам. Фасады аздоблены разнымі драўлянымі дэкаратыўнымі элементамі, рустам, какошнікамі і інш.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. *Т. В. Габрусь*

1554. ПОМНІК АКТЫВІСТАМ (гіст.). Каля будынка пошты.

У жніўні 1949 г. ад рук ворагаў савецкай улады загінулі сакратар партыйнай арганізацыі калгаса «Світанне», дырэктар мясцовай школы Рыгор Апанасавіч Зайцаў і сакратар камсамольскай арганізацыі Васіль Андрэевіч Малей. У 19[illegible] г. на ўшанаванне іх памяці пастаўлены абеліск.

1555. ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ (гіст.). За 700 м на паўночны ўсход ад вёскі. Тут 9.8.1941 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі савецкіх патрыётаў М. А. і Л. М. Суворавых. На месцы іх гібелі ў 1971 г. пастаўлены абеліск.

1556. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля клуба. На ўшанаванне памяці [illegible] аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і 2 актывістаў, забітых у 1949 г. ворагамі савецкай улады, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

1553. *Мікалаеўская царква. План.*

1557. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Світанне». Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 19[illegible] г.

в. Дубенец, Бережноўскі сельсавет

1558. МАГІЛА ЮРЧУКА Цярэнція Максімавіча (гіст.). Каля клуба. Пахаваны арганізатар і першы старшыня калгаса імя Леніна Ц. М. Юрчук, якога 28.7.1949 г. забілі ворагі Савецкай улады. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1559. ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ (архіт.). У цэнтры вёскі, на скрыжаванні галоўных вуліц. Пабудавана ў 1718—20 гг. з дрэва.

Будынак трохзрубны. На падоўжнай восі размешчаны прамавугольныя ў плане цэнтральны і алтарны зрубы, бабінец, да якога з захаду прыраблена ярусная званіца. Бабінец аднолькавай шырыні з цэнтральным зрубам. З усходу да алтарнага зруба прылягае пяцісценны аб'ём рызніцы. Сцены ў верхняй частцы ашаляваны гарызантальна, у ніжняй — «у елку», умацаваны лапаткамі, завершаны карнізам. Вокны высокія, са зрэзанымі верхнімі вугламі. Бабінец накрыты двухсхільным дахам, трохсхільным гонтавым дахам. Цэнтральны аб'ём завершаны [illegible] чацверыковым барабанам са зрэзанымі вугламі, які трымаецца на 4 слупах, мае прамавугольныя вокны і купальны дах. Трох'ярусная званіца (2 ніжнія чацверыкі і 3-і верхні са зрэзанымі вугламі) завершана шатровым дахам. Галоўны ўваход вылучаны крытым ганкам. У інтэр'еры дамінуе цэнтральны аб'ём. Алтарнае памяшканне і бабінец больш нізкія і злучаны з цэнтральным аб'ёмам вялікімі праёмамі. Алтарнае памяшканне аддзелена іканастасам. Царква — помнік архітэктуры з элементамі стылю барока.

Літ.: Товаров А. В. Историко-статистическая справочная книга Минской епархии. — Мн., 1893. Описание церквей и приходов Минской епархии... [В.] 8. Пинский уезд. — Мн., 1879. Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVI — XIX стст. — Мн., 1978.
Ю. А. Якімовіч

1559. *Царква Раства Багародзіцы. План.*



1553. *Мікалаеўская царква. Фрагмент.*

в. Калоднае, Радчыцкі сельсавет

1560. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля клуба. На ўшанаванне памяці 2[illegible] землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і 6 аднавяскоўцаў, закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у 1974 г. устаноўлены мемарыяльны знак.

1561. ПОМНІК ПАЎСТАНЦАМ 1863 г. (гіст.). На паўднёвы ўсход ад вёскі, каля чыгуначнага пераезда.

У канцы мая — пачатку чэрвеня 1863 г. ў час паўстання 1863—64 гг. ў Польшчы, Літве і на Беларусі Кобрынскі атрад паўстанцаў на чале з Р. Траўгутам і Брэсцкі атрад А. Ванькові ча накіраваліся з Піншчыны на паўднёвы ўсход. Усё больш адрываю-

1559. *Царква Раства Багародзіцы.*

чыся ад сваіх баз, атрады праз лясы і балоты рухаліся ў глыбіню Палесся. Цяжкімі былі пераправы цераз рэкі, асабліва цераз Прыпяць, Стыр і інш. Пасля некалькіх дзён паходу паўстанцы ўвайшлі ў Столін. Ноччу яны пераправіліся на правы бераг Гарыні і сталі лагерам, каб аб'яднацца з валынскімі атрадамі, але апошнія ў гэты час адступілі на поўдзень, перайшлі граніцу Галіцыі. Тым часам па разгром паўстанцаў сцягваліся царскія войскі. 11.6.1863 г. паўстанцы зрабілі засаду і разбілі 3 роты пяхоты праціўніка. Царскія войскі вымушаны былі адступіць. Праз некалькі дзён страціўшы надзею аб'яднацца з валынцамі, атрады зноў пераправіліся цераз Гарынь і невялікімі групамі накіраваліся ў Брэсцкі і Кобрынскі паветы, дзе далучыліся да іншых атрадаў.

У 1981 г. па ўшанаванне памяці паўстанцаў устаноўлена стэла.

Літ.: За нашу и вашу свободу: Герои 1863 года. М., 1964.— (Жизнь замечательных людей); Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.— М., 196.

В. Б. Каратчевіч

в. Лядзец, цэнтр сельсавета

1562. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На цэнтральнай сядзібе калгаса імя Леніна. На ўшанаванне памяці 78 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком і стэла.

1563. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля школы. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1969 г.

в. Магільнае, Бережноўскі сельсавет

1564. МАГІЛА АКТЫВІСТАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны арганізатары калгаса «Чырвоны партызан» Мікалай Сяргеевіч Каральчук, Мікалай Сямёнавіч Каральчук і Кацярына Пятроўна Каральчук, якія ў 1949 г. сталі ахвярамі ворагаў Савецкай улады. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. Адна з вуліц вёскі названа імем Мікалая Сяргеевіча Каральчука.

в. Манькавічы, Столінскі гарадскі Савет

1565. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 57 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. пастаўлены абеліск.

в. Плотніца, цэнтр сельсавета

1566. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля развілкі вуліц. Пахаваны 25 воінаў 397-й [illegible] стралковых дывізіі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Плотніцкага сельсавета. У 1970 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

1567. ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1875 г. з дрэва.

[illegible] зрубы ўтвараюць [illegible] крыж, у вуглах якога ўбудаваны дапаможныя памяшканні. Усе аб'ёмы роўнай вышыні, накрыты складаным дахам з пакатымі схіламі. Васьмігранныя галоўкі ў цэнтры (на светлавым барабане) і па вуглах утвараюць пяцікупальную кампазіцыю. Царква мае 3 уваходы з ганкамі. Сцены гарызантальна ашаляваныя. Вокны аздоблены ліштвамі.

Царква прыклад цэнтрычнага культавага абудавання.

1568. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

1569. ПОМНІК КАРЛУ МАРКСУ (гіст.). Каля Дома культуры. Бюст К. Маркса ўстаноўлены ў 1968 г.

1570. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля Дома культуры. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1968 г.

в. Радчыцк, цэнтр сельсавета

1571. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «XXII з'езд КПСС». На ўшанаванне памяці [illegible] землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 31 аднавяскоўца, якія сталі ахвярамі фашысцкага тэрору, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

1572. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля Дома культуры. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1967 г.

1573. ЦАРКВА (архіт.). Пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. з цэглы. Адносіцца да тыпу [illegible] храмаў. Васьмігранны аб'ём завершаны драўляным купалам, фасады дэкарыраваны порцікамі. Царква — помнік архітэктуры [illegible].

в. Рамель, цэнтр сельсавета

1574. ГРУНТАВЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Ва ўрочышчы Лянча, на ўзвышшы за вясковымі могілкамі. Даследаваў у 1954—55 гг. Ю. У. Кухарэнка. На плошчы 196 $м^2$ выяўлены 7 пахаванняў. У 6 знойдзены рэшткі спаленых нябожчыкаў, ляпныя гаршкі, міскі, кубкі, жалезныя і бронзавыя фібулы. Могільнік належаў плямёнам зарубінецкай культуры, датуецца 2 ст. да н. э.— 2 ст. н. э.

Знаходкі зберагаюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск).

Літ.: Кухаренко Ю. В. Памятники [illegible] века на территории Полесья.— М., [illegible]

[illegible]

1575. МАГІЛА ДЗЕМКІ Пятра Мікалаевіча (гіст.). На могілках.

П. М. Дземка нарадзіўся ў 1917 г. ў в. Альшаны. Рана стаў на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Не раз быў арыштаваны ўладамі буржуазна-памешчыцкай Польшчы, зняволены ў Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер. У 1939 г. вызвалены Чырвонай Арміяй. Працаваў у органах НКУС. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны на падпольнай рабоце. У ліпені 1941 г. схоплены гітлераўцамі і закатаваны. Яго імем названа вуліца ў вёсцы. У 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск.

В. М. Удальцоў

1576. МАГІЛА УРОДНІЧА Васіля Мікалаевіча (гіст.). У цэнтры вёскі. Партызан В. М. Уродніч загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у лістападзе 1943 г. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1577. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (архіт.). У паўночнай частцы вёскі. Пабудавана ў 18 ст. з дрэва. У пачатку 20 ст. з захаду прыбудавана трох'ярусная званіца.



1567. *Пакроўская царква*



1567. *Пакроўская царква. План.*

Амаль квадратны ў плане асноўны і пяцігранны алтарны зрубы аб'яднаны агульным вальмавым дахам. Вяршыні гранцовых схілаў даху завершаны галоўкамі, у месцы злучэння зрубаў трохвугольныя застрэшкі. Сцены вертыкальна ашалёваны дошкамі з нашчыльнікамі, умацаваны лапаткамі і завершаны карнізамі з зубчастым надзорам. Высокія прамавугольныя вокны аздоблены ліштвамі. Памяшканні перакрыты бэлькамі з плоскай падшыўной столлю. Званіца трох'ярусная, чацверыковая, зрубна-каркаснай канструкцыі, накрыта шатровым дахам. У ле ніжнім ярусе хоры на 2 слупах

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства. *Ю. А. Якімовіч.*

1578. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На цэнтральнай сядзібе калгаса «Запаветы Леніна». На ўшанаванне памяці 77 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і у партызанскай барацьбе, а таксама ахвяр фашызму у 1975 г. пастаўлена [illegible]

1578. *Помнік землякам*

в. Рубель, цэнтр сельсавета

1579. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). На правым беразе р. Гарынь на сучасных могілках. У групе больш за 30 паўсферычных задзірванелых насыпаў вышынёй да 1 м. У цэнтральнай частцы 1 насып вышынёю каля 2,5 м, дыяметрам амаль 20 м. Курганы размешчаны блізка адзін каля аднаго, амаль усе пашкоджаны сучаснымі пахаваннямі. Выявіў у 1956 г. Ю. У. Кухарэнка. Раскопкі не праводзіліся.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья.— М., 1961.

1580. МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА (арх.). У заходняй частцы вёскі. Пабудавана у 1796 г. з дрэва



1577. *Міхайлаўская царква. План*

1577. *Міхайлаўская царква*



1580. *Міхайлаўская царква. Падоўжны разрэз і план*

Будынак складаецца з трох шмат'ярусных зрубаў: прамавугольнага ў плане бабінца, васьмігранная асноўнага і пяцігранная алтарнага. Асноўны зруб развіты па папярочнай восі, завершаны васьмерыком на чацверыку з граненым купалам і галоўкай, алтарны зруб і бабінец завершаны васьмерыкамі. Уваходныя тамбуры з трох бакоў прыбудаваны пазней. Сцены вертыкальна ашалёваны дошкамі з нашчыльнікамі і завершаны развітымі карнізамі. Прамавугольныя аконныя праёмы аздоблены ліштвамі. Унутры асноўнае памяшканне трохсветлавое, алтар і бабінец двухсветлавыя. У бабінцы над уваходам размешчаны хоры. Асноўнае памяшканне аддзелена ад алтара іканастасам з разнымі калонкамі. Трох'ярусная званіца размешчана на захад ад царквы, складаецца з 2 чацверыкоў і васьмерыка, накрытага граненым купалам.

У архітэктуры царквы традыцыі драўлянага дойлідства спалучаюцца з рысамі барока.

Літ.: Чантурия В. А. Архитектура Белоруссии конца XVIII — начала XIX века.— Мн., 1962; я г о ж. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период.— Мн., 1969; Я к і м о в і ч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст.— Мн., 1978.

Ю. А. Якімовіч.

1581. СЕЛІШЧА (археал.). За 3 км на поўнач ад вёскі, абапал дарогі на Давыд-Гарадок, ва урочышчы Прысава. Даследавалі ў 1956 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1962 г. К. В. Каспарава. Таўшчыня культурнага пласта 0,5 м. Выяўлены рэшткі паўзямлянкавага жылля, гліняная ліпкага посуду. Селішча [illegible] культуры, датуецца 2 ст. да н. э.— 2 ст. н. э.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Эрмітажы (Ленінград) і Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (г. Пінск).

Літ.: Кухаренко Ю. В. Памятники [illegible] М., 1961.

1582. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 45 жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну у баях су-

1580. *Міхайлаўская царква*

праць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1965 г. пастаўлены абеліск

в. Рухча 1-я, цэнтр сельсавета

1583. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі, каля клуба. На ўшанаванне памяці 131 аднавяскоўца, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, закатаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі, сталі ахвярамі тэрору ворагаў Савецкай улады, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

1584. **ПОМНІК ЛЕНІНУ** Уладзіміру Ільічу (гіст.). Каля будынка выканкома сельсавета. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1968 г.

1585. **ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ** (архіт.). У цэнтры вёскі, на скрыжаванні дарог на Столін і Плотніцу. Пабудавана ў 1730 г. з дрэва.

Будынак адназрубны, з развітай трохсценнай алтарнай часткай, накрыты вальмавым гонтавым дахам, які завяршае ссунуты ад цэнтра на ўсход васьмігранны барабан з галоўкай. Сцены гарызантальна ашаляваны, умацаваны лапаткамі. Столь плоская, бэлечная. На ўсход ад царквы двух'ярусная (чацверык на чацверыку) зрубна-каркасная званіца пад шатровым гонтавым дахам.

У архітэктуры царквы рысы стылю барока спалучаюцца з традыцыйнымі прыёмамі народнага дойлідства.

Літ.: Я к і м о в і ч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст.— Мн., 1978. *Ю. А. Якімовіч*

в. Рыбнікі, Болавушскі сельсавет

1586. **ПОМНІК КЛЮЧАНКОВУ** Васілю Елісеевічу (гіст.). У цэнтры вёскі.

В. Е. Ключанкоў нарадзіўся 29.12.1899 г. ў в. Быкавічы Мсціслаўскага р-на. У 1918—22 гг. у Чырвонай Арміі, потым на партыйнай і савецкай рабоце ў Калінінскай і Магілёўскай акругах. З красавіка 1928 г. ў органах АДПУ. З лістапада 1938 г. выконваючы абавязкі начальніка дарожнага аддзела міліцыі на Беларускай чыгунцы. У 1940—41 гг. дырэктар рыбгаса ў пас. Дубрава (цяпер в. Рыбнікі). З ліпеня 1941 г. камандзір Столінскага партызанскага атрада. У канцы ліпеня 1941 г. ў час разведкі схоплены ворагамі. Калі яго звязанага пе-

1585. *Царква Раства багародзіцы*

1587. *Помнік на [illegible] савецкіх воінаў*

[illegible] р. Гарынь, кінуўся ў [illegible]. Пахаваны [illegible].

У 1968 г. [illegible] ушанавання памяці В. Е. Ключанкова пастаўлены абеліск.

Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны [illegible]. Документы и материалы [illegible]. *[illegible]*

рабочы пасёлак Рэчыца

1587. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). [illegible] Пахаваны 101 воін 397-й стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата са сцягам.

в. Стахава, Плотніцкі сельсавет

1588. **ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА** (архіт.). Пабудавана ў канцы 19 ст. з дрэва. Адносіцца да тыпу трохчасткавых храмаў са званіцай, асноўным аб'ёмам і апсідай. Двух'ярусная званіца завершана шатром, кубападобны аб'ём храма цыбулепадобнай галоўкай. У архітэктуры царквы выкарыстаны элементы псеўдарускага стылю.

1588. *Царква Раства багародзіцы. План.*

1589. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 76 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Струга, цэнтр сельсавета

1590. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). Каля будынка школы. Пахаваны 85 воінаў 397-й і 415-й стралковых дывізій 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёсак Струга і Вікаравічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

в. Сямігосцічы, Альшанскі сельсавет

1591. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 56 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Талмачава, Вялікамалешаўскі сельсавет

1592. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 19 воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1971 г. пастаўлены абеліск.

в. Турскае, Веляміцкі сельсавет

1593. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). Каля клуба. На ўшанаванне памяці 5 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

в. Туры, Харомскі сельсавет

1594. **ГАРАДЗІШЧА** (археал.). Мясцовая назва З а м ч ы ш ч а. За 2,5 км на паўночны захад ад вёскі, ва урочышчы Барок. Адкрыў у 1963 г. Б. В. Мiралюбаў, абследаваў у 1980 г. Г. М. Залашка. Пляцоўка круглая ў плане дыяметрам 100 м. Умацавана валам вышынёю каля 5 м і шырынёю 12—13 м, моцна зарасла дрэвамі і кустамі. У выніку шурфоўкі выяўлены культурны пласт 0,1 м. Раскопкі не праводзіліся.

1595. **ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ** (гіст.). У цэнтры вёскі, каля Дома быту. На ўшанаванне памяці [illegible] аднавяскоўцаў, якія за[illegible] ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1971 г. пастаўлены помнік. Асіметрычная архітэктурна-скульптурная кампазіцыя ў выглядзе вертыкальнай сцяны з кубападобным пастаментам, на якім устаноўлена скульптурная група — партызан і жанчына.

в. Фядоры, цэнтр сельсавета

1596. **БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ** (гіст.). Каля будынка шко-



1599. Помнік землякам

ты. Пахаваны 146 воінаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі.

У ліпені 1944 г. 212-я стралковая дывізія 9-га гвардзейскага стралковага корпуса 61-й арміі 1-га Беларускага фронту сустрэла ўпартае супраціўленне ворага каля в. Фядоры. Праціўнік заняў зручную пазіцыю на вышыні. 12.7.1944 г. воіны 689-га стралковага палка ў рукапашным баі авалодалі вышынёй і вызвалілі вёску. У 1974 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

1597. ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу (гіст.). Перад будынкам выканкома сельсавета. Бюст У. І. Леніна ўстаноўлены ў 1977 г.

в. Харомск, цэнтр сельсавета

1598. ГАРАДЗІШЧА ЧОРТАВА ГАРА (археал.). За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на ўзвышшы. Пляцоўка памерам 25×50 м, вышынёй 4 м. Абследаваў у 1961 г. Н. А. Рапапорт, раскопкі праводзіў у 1980 г. Г. М. Залашка. Ускрыта і даследавана 188 м². Культурны пласт 0,25—0,3 м. Амаль на мацерыку, на вугаллі знойдзены рэшткі жалезнага нажа, крамянёвы рэтушор, біканічнае праслица, гліняныя грузілы для вертыкальнага ткацкага станка. У верхняй частцы культурнага пласта выяўлены ганчарная кераміка эпохі Кіеўскай Русі і фрагменты посуду 5—7 стагоддзяў, рэшткі ляпнога посуду ранняга жалезнага веку. Гарадзішча адносіцца да ранняга этапа зарубінецкай культуры (2 ст. да н. э. — 2 ст. н. э.) і да старажытнарускага перыяду.

Знаходкі зберагаюцца ў Столінскім краязнаўчым музеі і ў Інстытуце гісторыі АН БССР. *Г. М. Залашка*

1599. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля будынка школы. На ўшанаванне памяці 51 аднавяскоўца, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў, у 1965 г. пастаўлены абеліск.

в. Хатомель, Рубельскі сельсавет

1600. ГАРАДЗІШЧА, СЕЛІШЧА, ГРУНТАВЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі, в урочышчы Гарадзішча.

1600а. Г а р а д з і ш ч а. На заходняй ускраіне пясчанага ўзгорка. Пляцоўка авальнай формы, памерам 40×30 м. З трох бакоў абкружана балоцістай поймай і старыцай ручая. З усходу да пляцоўкі гарадзішча прылягае паселішча. Пярэшыек узгорка перасякаюць абарончы вал і роў. Раскопкі праводзілі ў 1953 г. Б. В. Міралюбаў, у 1954—57 гг. Ю. У. Кухарэнка, у 1964 г. І. П. Русанава. Таўшчыня культурнага пласта ў цэнтры каля 0,4 м, па краях 2—2,5 м. Пляцоўка абкружана карытападобнымі ямамі, паглыбленымі ў мацерыковы пясок. Ямы запоўнены вугаллем, каменнем і рэшткамі ляпной керамікі так званага «пражскага» тыпу. У адной з ям знойдзены абломак трохлопасцевай стралы аварскага тыпу. Паглыбленні ў мацерыку перакрыты праслойкай з попелу і вугалля. Выяўлены рэшткі ачагоў і ям ад слупоў наземных пабудоў. У культурным пласце, над праслойкай, знойдзены рэшткі ляпной керамікі больш развітых форм, у т. л. фрагменты посуду, зробленага на ганчарным крузе, металічныя наканечнікі стрэл розных тыпаў, абломак сярэбранага бранзалета з крыху расшыраным канцом, жалезная спражка, скроневае крамяневае кольца, косці, цуглі.

Знаходкі даюць падставу датаваць верхні гарызонт 8 — пачаткам 10 ст., ніжні — 7 ст. Гарадзішча стала не было заселена, служыла, відаць, сховішчам на выпадак небяспекі. Аднак спецыфічны набор рэчаў, выяўленых у верхнім пласце, наводзіць на думку, што ў позні перыяд магло быць грамадскім цэнтрам — месцам сходаў.

1600б. С е л і ш ч а. У 1964 г. даследавана 16 жылых пабудоў, паглыбленых у мацярык на 0,2—0,5 м. Даўжыня сцен 3—6 м. Жытло прамавугольнае у плане, з роўнай падлогай і глінабітнай печчу на драўляным каркасе. Найбольш раннія пабудовы размяшчаліся блізка ад гарадзішча. У іх знойдзена ляпная кераміка таго ж перыяду, што і у ніжнім гарызонце на гарадзішчы. Больш позція жытлы, аддаленыя ад гарадзішча, будаваліся паралельна валу ў 2 рады. У рэштках жылых пабудоў выяўлена ляпная кераміка таго самага тыпу, што і на гарадзішчы, а таксама ганчарная больш позніх часоў. Знойдзены жалезныя нарогі, нажы, восці для лоўлі рыбы, абломкі сярпоў, долата, тачыльныя брускі і праслицы.



1600. *Гарадзішча і селішча. План*

1600а. *Гарадзішча*

1600в. **Грунтавы могільнік.** За 200 м на паўднёвы ўсход ад гарадзішча. Адкрыты ў час земляных работ. На глыбіні 0,6 м знойдзены абкладзеныя камянямі перавернуты гаршчок з перапаленымі касцямі нябожчыкаў (трупаспаленне).

Археалагічны комплекс каля Хатомеля адзін з першых раннеславянскіх помнікаў 2-й палавіны 1-га тысячагоддзя н. э., даследаваных на поўдні Беларусі і ў паўночна-заходняй Украіне. Адметны спалучэннем жылога селішча, гарадзішча-сховішча і могільніка. Матэрыялы яго даследавання выкарыстоўваюцца як эталон пры датаванні іншых археалагічных аб'ектаў. Гарадзішча, селішча і могільнік належалі плямёнам пражскай культуры, пазней драўлянам.

Матэрыялы раскопак зберагаюцца ў Дзяржаўным музеі БССР, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і Беларускім дзяржаўным музеі сацыялістычнага пераўтварэння Палесся (Пінск).

Літ.: Кухаренко Ю. В. Раскопки на городище и селище Хотомель. — М., 1957. — (Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры АН СССР; в. 68); яго ж. Средневековые памятники Полесья. — М., 1961; Русанова И. П. Славянские древности VI—IX вв. между Днепром и Западным Бугом. — М., 1973.

I. П. Русанава

в. Цмень 2-я, Рухчанскі сельсавет

1601. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 400 м на ўсход ад вёскі. Пахаваны 9 жыхароў вёсак Цмень 1-я і Цмень 2-я, якіх у 1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Юнішчы, Столінскі гарсавет

1602. ГАРАДЗІШЧЫ (археал.). У ваколіцы вёскі. Абследавалі ў 1955 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1970 г. В. Б. Караткевіч, у 1980 г. Г. М. Залашка.

1602а. **Гарадзішча 1** (мясцовыя назвы **Акоп, Малое Гарадзішча**). За 1,5 км на паўночны захад ад вёскі, на ўзвышшы сярод балота. Пляцоўка амаль прамавугольнай формы (55×70 м), з поўдня, поўначы і захаду умацавана 2 валамі вышынёй 3,5—4 м. Каля асновы валоў прасочваюцца роў і абгалеўю каля [illegible] м у заходняй, паўночнай і паўднёвай частках уваходы. Культурны пласт 0,1 м.

1602б. **Гарадзішча 2** (мясцовая назва **Вялікае Гарадзішча**). За 1,5 км на поўнач ад вёскі. Квадратная ў плане пляцоўка (90×90 м) умацавана валам вышынёю 2 м і шырынёю каля 15 м.

Раскопкі гарадзішчаў не праводзіліся.

Літ.: Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. — М., 1961.

Г. М. Залашка

Антопальская гарпасялковая (Драгічынскі р-н, г. п. Антопаль, вул. Савецкая, 73).

Антопальская гарпасялковая дзіцячая (Драгічынскі р-н, г. п. Антопаль, вул. Савецкая, 7[illegible]).

Баранавіцкая гарадская цэнтральная імя В. Таўлая (г. Баранавічы, вул. Леніна, 51). Фонд 1[illegible]9,9 тыс. экз.

Баранавіцкая гарадская № 1 (г. Баранавічы, вул. Савецкая, 11). Фонд 75,8 тыс. экз.

Баранавіцкая гарадская № 2 (г. Баранавічы, вул. Камуністычная, 19 а). Фонд 26,6 тыс. экз.

Баранавіцкая гарадская дзіцячая № 1 (г. Баранавічы, вул. Камуністычная, 19 в). Фонд 46,9 тыс. экз.

Баранавіцкая гарадская цэнтральная дзіцячая № 2 (г. Баранавічы, вул. Камсамольская, 23 а). Фонд 63,7 тыс. [illegible]

Баранавіцкая раённая цэнтральная (в. Новая Мыш, цэнтр сельсавета). Фонд 82[illegible] тыс. экз.

Белаазёрская гарадская дзіцячая (Бярозаўскі р-н, г. Белаазёрск, вул. Леніна, 34).

Брэсцкая абласная імя М. Горкага (г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 48). Фонд 625,5 тыс. экз.

Брэсцкая абласная дзіцячая (г. Брэст, вул. Куйбышава, 32). Фонд 109,0 тыс. экз.

Брэсцкая раённая цэнтральная (г. Брэст, вул. Сонечная, 37). Фонд 611,4 тыс. экз.

Брэсцкая раённая дзіцячая (г. Брэст, вул. Сонечная, 37).

Брэсцкая гарадская цэнтральная імя А. С. Пушкіна (г. Брэст, бульвар Шаўчэнкі, 3). Фонд 178,0 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская дзіцячая імя А. С. Пушкіна (г. Брэст, вул. Набярэжная, 32). Фонд 65,3 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 1 (г. Брэст, вул. Маладагвардзейская, [illegible]). Фонд 23,1 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 2 (г. Брэст, вул. Беларуская, 51). Фонд 17,4 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 3 імя Я. Купалы (г. Брэст, вул. Бабуова, 4). Фонд 66,3 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 4 імя А. Гайдара (г. Брэст, вул. Ковельская, 20). Фонд 27,8 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 5 (г. Брэст, вул. Леніна, 11). Фонд 2[illegible]7 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 6 (г. Брэст, вул. Падгародская, 71). Фонд 11,0 тыс. экз.

Брэсцкая гарадская № 7 (г. Брэст, вул. Набярэжная, 32). Фонд 73,3 тыс. экз.

Бярозаўская раённая цэнтральная (г. Бяроза, вул. Савецкая, 18). Фонд 663,8 тыс. экз.

Бярозаўская раённая дзіцячая (г. Бяроза, вул. Леніна, 34).

Высокаўская гарадская (Камянецкі р-н, г. Высокае, вул. Леніна, 7). Фонд 50,0 тыс. экз.

Высокаўская гарадская дзіцячая (Камянецкі р-н, г. Высокае, вул. Савецкіх Пагранічнікаў, 13). Фонд [illegible]3 тыс. экз.

Ганцавіцкая раённая цэнтральная (г. Ганцавічы, вул. Кастрычніцкая, 5). Фонд 341,6 тыс. экз.

Ганцавіцкая раённая дзіцячая (г. Ганцавічы, вул. Заслонава, 2).

Гарадзішчанская гарпасялковая (Баранавіцкі р-н, г. п. Гарадзішча, вул. Мірская, 11).

Гарадзішчанская гарпасялковая дзіцячая (Баранавіцкі р-н, г. п. Гарадзішча, вул. 60 год Кастрычніка, 7).

Давыд-Гарадоцкая гарадская (Столінскі р-н, г. Давыд-Гарадок, вул. К. Цэткін, 3).

Давыд-Гарадоцкая гарадская дзіцячая (Столінскі р-н, г. Давыд-Гарадок, вул. Савецкая, 10).

У спісе прыведзены абласныя, раённыя, гарадскія, гарпасялковыя, пасялковыя бібліятэкі. Кніжны фонд даецца на 1.1.1983 г. па цэнтралізаваных бібліятэчных сістэмах.

Дамачоўская гарпасялковая (Брэсцкі р-н, г. п. Дамачова, вул. Кастрычніцкая, 70).

Дамачоўская гарпасялковая дзіцячая (Брэсцкі р-н, г. п. Дамачова, вул. Кастрычніцкая, 70).

Драгічынская раённая цэнтральная (г. Драгічын, вул. Леніна, 1[illegible]). Фонд 754,8 тыс. экз.

Драгічынская раённая дзіцячая (г. Драгічын, вул. Леніна, 73).

Жабінкаўская раённая цэнтральная (г. Жабінка, вул. Піянерская, 29). Фонд 380,0 тыс. экз.

Жабінкаўская раённая дзіцячая (г. Жабінка, вул. [illegible]ава, 9).

Івацаўская раённая цэнтральная (г. Івацава, вул. 17 Верасня, 6). Фонд 740,8 тыс. экз.

Івацаўская раённая дзіцячая (г. Івацава, вул. Я. Купалы, 9 а).

Івацэвіцкая раённая цэнтральная (г. Івацэвічы, вул. Савецкая, 24). Фонд 806,1 тыс. экз.

Івацэвіцкая раённая дзіцячая (г. Івацэвічы, вул. Савецкая, 24).

Камянецкая раённая цэнтральная (г. Камянец, вул. Леніна, 23). Фонд 841,2 тыс. экз.

Камянецкая раённая дзіцячая (г. Камянец, вул. Леніна, 23).

Кобрынская раённая цэнтральная (г. Кобрын, вул. Жданава, 12). Фонд 638,3 тыс. экз.

Кобрынская раённая дзіцячая (г. Кобрын, вул. Жданава, 8).

Косаўская гарадская (Івацэвіцкі р-н, г. Косава, вул. Чырвонаармейская, 1). Фонд 29,1 тыс. экз.

Лагішынская гарпасялковая (Пінскі р-н, г. п. Лагішын, вул. Леніна, 53).

Лагішынская гарпасялковая дзіцячая (Пінскі р-н, г. п. Лагішын, вул. Пе[illegible]аман[illegible]ая 2[illegible]).

Лунінецкая раённая цэнтральная (г. Лунінец, вул. Фрунзе, [illegible]). Фонд [illegible]04,6 тыс. экз.

Лунінецкая раённая дзіцячая (г. Лунінец, вул. Чырвонаа[illegible] [illegible]0).

Ляхавіцкая раённая цэнтральная (г. Ляхавічы, пл. Леніна, [illegible]3). Фонд 584,3 тыс. экз.

Ляхавіцкая раённая дзіцячая (г. Ляхавічы, пл. Перамогі, [illegible]).

Маларыцкая раённая цэнтральная (г. Маларыта, вул. Савецкая, 53). Фонд 4[illegible]5,9 тыс. экз.

Маларыцкая раённая дзіцячая (г. Маларыта, вул. Савецкая, 5[illegible]).

Мікашэвіцкая пасялковая (Лунінецкі р-н, рабочы пасёлак Мікашэвічы, вул. Чыгуначная, 7).

Мікашэвіцкая пасялковая дзіцячая (Лунінецкі р-н, рабочы пасёлак Мікашэвічы, вул. Ленінская, 8).

Пінская гарадская цэнтральная (г. Пінск, вул. Леніна, 25). Фонд 161,1 тыс. экз.

Пінская раённая цэнтральная (г. Пінск, вул. К. Маркса, 2). Фонд 875,2 тыс. экз.

Пінская раённая дзіцячая (Пінскі р-н, в. Пінкавічы, вул. Я. Коласа, 90).

Пінская гарадская № 1 (г. Пінск, вул. Першамайская, 24). Фонд 79,5 тыс. экз.

Пінская гарадская № 2 (г. Пінск, завулак Ліцейны, 3). Фонд 29,0 тыс. экз.

Пінская гарадская № 3 (г. Пінск, вул. Брэсцкая, 8[illegible]). Фонд 56,0 тыс. экз.

Пінская гарадская № 4 (г. Пінск, Крайновічы). Фонд [illegible]9,8 тыс. экз.

Пінская гарадская дзіцячая (г. Пінск, вул. Леніна, 25). Фонд 60,5 тыс. экз.

Пружанская раённая цэнтральная (г. Пружаны, вул. Савецкая, 12). Фонд 815,2 тыс. экз.

Пружанская раённая дзіцячая (г. Пружаны, вул. Камуністычная, 13)

Ружанская гарпасялковая (Пружанскі р-н, г. п. Ружаны, вул. Леніна, 10).

Ружанская гарпасялковая дзіцячая (Пружанскі р-н, г. п. Ружаны, вул. Леніна, 12).

Рэчыцкая пасялковая (Столінскі р-н, рабочы пасёлак Рэчыца, вул. Клубная, 3).

Столінская раённая цэнтральная (г. Столін, пл. Камсамольская, 1). Фонд 819,2 тыс. экз.

Столінская раённая дзіцячая (г. Столін, вул. Савецкая, 65).

Целяханская гарпасялковая (Івацэвіцкі р-н, г. п. Целяханы, вул. Савецкая, 19).

Целяханская гарпасялковая дзіцячая (Івацэвіцкі р-н, г. п. Целяханы, вул. Леніна, 37).

Шарашоўская гарпасялковая (Пружанскі р-н, г. п. Шарашова, вул. Леніна, 47).

Шарашоўская гарпасялковая дзіцячая (Пружанскі р-н, г. п. Шарашова, вул. Фаміна, 5).

МУЗЕІ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

БАРАНАВІЦКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ (г. Баранавічы, вул. Савецкая, 14). Заснаваны ў маі 1946 г. на базе Слонімскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. 3 мая 1952 г. ў Баранавічах. З 1954 г. Баранавіцкі краязнаўчы музей. У фондах музея захоўваецца на 1.1.1983 г. больш за 27 тыс. экспанатаў. Аддзелы: прырода краю, гісторыя дасавецкага перыяду, гісторыя савецкага перыяду.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПЕРАЎТВАРЭННЯ ПАЛЕССЯ (г. Пінск, вул. Леніна, 27). Заснаваны ў студзені 1979 г. на базе Пінскага краязнаўчага музея. Вядзецца работа па стварэнню новай экспазіцыі. У фондах на 1.1.1983 г. каля 52 тыс. экспанатаў. Дзеючае экспазіцыя: прырода краю, Піншчына ў перыяд феадалізму і капіталізму, уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, Піншчына ў Вялікую Айчынную вайну.

БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ-ГЕРОЯ МУЗЕЙ (г. Брэст, на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці). Адкрыты ў лістападзе 1956 г. на базе гарнізоннага пакоя-музея. У фондах і 11 экспазіцыйных залах на 1.1.1983 г. больш за 35 тыс. экспанатаў. Аддзелы: гісторыя Брэсцкай крэпасці (19 ст. — верасень 1939 г.); гарнізон Брэсцкай крэпасці перад Вялікай Айчыннай вайной; вераломны напад фашысцкай Германіі на СССР, прыгранічныя баі ў раёне Брэста; гераічная абарона Брэсцкай крэпасці; асноўныя этапы Вялікай Айчыннай вайны і ўдзел у ёй абаронцаў крэпасці; Брэсцкая крэпасць-герой — усенародная школа патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання.

БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ (г. Брэст, вул. Леніна, 34). Заснаваны ў 1950 г., адкрыты ў чэрвені 1957 г. У музеі і яго філіялах на 1.1.1983 г. амаль 108,5 тыс. экспанатаў. Аддзелы: прырода, гісторыя дасавецкага перыяду, гісторыя савецкага грамадства. Філіялы: Камянецкая вежа (помнік архітэктуры абарончага дойлідства 13 ст., г. Камянец), археалагічны музей «Бярэсце» (археалагічны помнік 11—13 стагоддзяў, на Шпітальным востраве Брэсцкай крэпасці), Музей партызанскай славы (на ўрочышчы Хаванішчына Івацэвіцкага раёна, дзе ў 1943—44 гг. размяшчаліся Брэсцкія падпольныя абкомы КП(б)Б, ЛКСМБ і штаб партызанскага злучэння).

БЯРОЗАЎСКІ ГІСТОРЫКА-РЭВАЛЮЦЫЙНЫ МУЗЕЙ (г. Бяроза, вул. Леніна, 69). Заснаваны ў чэрвені 1961 г. Адкрыты ў лістападзе 1965 г. На 1.1.1983 г. ў фондах і 6 экспазіцыйных залах каля 15 тыс. экспанатаў. Аддзелы: рэвалюцыйна-вызваленчы рух на Беларусі; 1-я сусветная вайна; Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і Грамадзянская вайна; КПЗБ — кіруючая сіла ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, канцлагер Бяроза-Картузская; 2-я сусветная вайна, вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, уз'яднанне беларускага народа ў адзінай сям'і, першыя крокі Савецкай улады на Бярозаўшчыне, Вялікая Айчынная вайна, зверствы нямецка-фашысцкіх акупантаў на Бярозаўшчыне, партызанскі рух у краі, вызваленне Бярозаўскага раёна войскамі Чырвонай Арміі 16.7.1944 г.; аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі ў пасляваенныя гады; перыяд развітога сацыялізма.

КОБРЫНСКІ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ ІМЯ А. В. СУВОРАВА (г. Кобрын, вул. Суворава, 16). Заснаваны ў чэрвені 1946 г., адкрыты ў маі 1948 г. Размешчаны ў доме, дзе ў 1797 г. і 1800 г. жыў А. В. Сувораў. У фондах на 1.1.1983 г. каля 6,4 тыс. экспанатаў. Экспазіцыя прысвечана жыццю і дзейнасці А. В. Суворава.

ЛУНІНЕЦКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ (г. Лунінец, вул. Савецкая, 16). Заснаваны ў 1978 г. Вядзецца работа па збору матэрыялаў і стварэнню экспазіцыі, якая раскажа пра гісторыю краю, яго мінулае і сучаснасць.

СТОЛІНСКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ (г. Столін, сядзіба «Манькавічы»). Заснаваны ў 1954 г. Адкрыты ў лістападзе 1955 г. У фондах на 1.1.1983 г. больш за 7,5 тыс. экспанатаў. Аддзелы: прырода, археалогія, гісторыя дасавецкага перыяду, гісторыя савецкага грамадства, Вялікая Айчынная вайна, перыяд развітога сацыялізма.

АРХІВЫ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ (г. Брэст, вул. Савецкіх пагранічнікаў, 34). Створаны паводле пастановы СНК БССР ад 11.2.1940 г. Зберагаюцца дакументы ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў (1920 г.), арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў Палескага ваяводства, Баранавіцкага павета Навагрудскага ваяводства буржуазнай Польшчы (да 1939 г.), абласных, раённых, гарадскіх і сельскіх арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў Брэсцкай (з 1939 г.), а таксама Баранавіцкай, Пінскай (1939—54 гг.) абласцей, тэрыторыі якіх уключаны ў Брэсцкую вобл., асобныя дакументы савецкіх устаноў за 1939—41 гг., дакументы мясцовых савецкіх абласных, раённых і сельскіх устаноў і арганізацый пасляваеннага часу.

Мае філіялы ў Баранавічах (вул. Леніна, 12), Кобрыне (вул. Леніна, 18), Пінску (вул. Астроўскага, 42). Зберагаюць дакументы савецкіх устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў пасляваеннага часу, а таксама асобныя дакументы савецкіх устаноў за 1939—41 гг.

ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК

У імянны паказальнік вынесены прозвішчы ўсіх асоб, пра якіх ёсць асобныя артыкулы ці якія ўпамінаюцца ў тэкстах артыкулаў і ў подпісах пад ілюстрацыямі, у бібліяграфіі, а таксама прозвішчы аўтараў падпісаных артыкулаў. Лічбы паказваюць нумар артыкула, з якога вынесена прозвішча.

ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК

У геаграфічны (адрасны) паказальнік вынесены ўсе [illegible] пункты, [illegible] помнікі [illegible] ... [illegible] паказваюць нумары артыкулаў пра помнікі, якія знаходзяцца ў гэтым населеным пункце.

ХРАНАЛАГІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК

У храналагічным паказальніку [illegible] помнікі згрупаваны [illegible] пакажаюць нумар артыкула пра помнік.

ПАЛЕАЛІТ

МЕЗАЛІТ

НЕАЛІТ

БРОНЗАВЫ ВЕК

ЖАЛЕЗНЫ ВЕК

РАННІ ФЕАДАЛЬНЫ ПЕРЫЯД

НЕДАТАВАНЫЯ ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ

11—13 ст.

13—17 ст.

18 ст.

19 ст.

1900—1917 гг.

1917—1920 гг.

1920—1941 гг.

1941—1945 гг.

ЗМЕСТ

СУПРАЦОЎНІКІ СЕКТАРА «ЗБОР ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ» ІНСТЫТУТА МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ АН БССР, ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ ТОМА

Заг. сектара: член-карэспандэнт АН БССР, доктар гістарычных навук С. В. Марцэлеў (да 1977 г.— член-карэспандэнт АН БССР, доктар мастацтвазнаўства У. І. Нячёд).

Ст. навук. супрацоўнікі: кандыдаты гістарычных навук М. Б. Батвіннік, У. Дз. Будзько, Г. І. Дулеба, В. Б. Караткевіч, Э. М. Савіцкі; кандыдаты архітэктуры Т. В. Габрусь, Т. І. Чарняўская, Ю. А. Якімовіч; кандыдаты мастацтвазнаўства Г. І. Барышаў, Л. Г. Лапцэвіч, В. В. Церашчатава, М. М. Яніцкая; кандыдат філалагічных навук І. Ф. Кудраўцаў.

Мал. навук. супрацоўнікі: У. В. Алісейчык, С. Г. Багласаў, В. М. Баскова, У. У. Бянько, Э. І. Венер, І. М. Гатоўчыц, М. М. Казлоўская, М. В. Кірайшык, Г. П. Коблік, М. К. Ковалеў, А. М. Кулагін, Т. С. Кухарава, В. М. Ладзіс, А. М. Лапкоўская, А. А. Мацвееў, А. А. Міцянін, А. Ю. Патросава, С. Ф. Самбук, В. В. Семянюк, В. М. Удальцоў, Т. Р. Чуракова, А. Г. Шчарбатаў, Л. І. Шэйко, В. Л. Шаціля, Т. М. Ярмоленка.

Лабаранты: Т. В. Басалыга, П. І. Пятровіч, Г. Ф. Раманаў, Л. М. Рыткіна; мастакі С. М. Андрэйчык, Н. П. Вараб'ёва, Н. С. Ліхтаровіч, М. У. Мікалаеў.

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ, ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ ТОМА

Заг. рэдакцый: А. І. Марозава, В. С. Паваліхіна, Н. А. Русак, С. П. Самуэль, кандыдат архітэктуры Ю. А. Якімовіч.

Ст. навук. рэдактары: Я. К. Габец, В. В. Гетаў, А. Дз. Зубар, М. І. Камінскі, З. П. Кузьмічэнка, Г. Р. Шыкунова, У. М. Якунін.

Навук. рэдактары: В. М. Барадуліна, Л. В. Календа, М. А. Маўзон, Т. П. Панчанка, кандыдат філасофскіх навук Дз. П. Радзюк, Л. В. Сакалова, Л. А. Суднік, Н. А. Ясінская.

Рэдактары: В. В. Казлова, Р. А. Ларчанка, Л. І. Пяўловіч.

Карты-схемы раёнаў выканалі картографы Г. Р. Шыкунова і П. П. Явід, чарцёжніца Л. А. Панцялеева.

У томе змешчаны фотаздымкі У. Ф. Варварына, У. Б. Жарко, П. М. Захаранкі, В. В. Сасноўскага.

СВОД ПАМЯТНИКОВ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ БЕЛОРУССИИ

Брестская область

На белорусском языке

Минск, издательство «Белорусская Советская Энциклопедия» имени Петруся Бровки

У томе змешчана 19 карт, 1015 ілюстрацый, з іх 199 каляровых.

Афармленне і мастацкае канструяванне *У. М. Якуніна.*
Мастацкія рэдактары *С. П. Русак, У. М. Якунін.*
Тэхнічны рэдактар *А. У. Шаметавец.*
Карэктары: *В. І. Багдановіч, Р. Р. Блашко, В. С. Бугаёў, С. А. Крукава, А. А. Федасеева, М. К. Хадыка.*

ІБ № 33
Здадзена ў набор 27.10.82. Падпісана да друку 14.09.83 г. АТ 21182. Фармат 84×108$^{1}/_{16}$. Папера меласаная. Гарнітура звычайная новая. Друк высокі. Фіз. друк. арк. 23,0. Ум. друк. арк. 38,64. Ум. фарба-адбіткаў 281,4. Ул.-выд. арк. 55,18. Тыраж 6000 экз. Зак. 2447. Цана 8 руб. 00 кап.

Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя П. Броўкі Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, вул. Акадэмічная, 15а.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МППО імя Я. Коласа. 220005. Мінск, Чырвоная, 23.

ЗБОР ПОМНІКАЎ

ГІСТОРЫІ
І КУЛЬТУРЫ
БЕЛАРУСІ

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ